ОРША
АРШАНСКІ РАЁН

У 2 кнігах
Кніга 1-я

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
1999

УДК 947.62
ББК 63.3 (4 Беи)
П 15

Рэдакцыйная калегія:

Г.П.ПАШКОЎ (галоўны рэдактар), Т.Г.ІГНАЦЬЕВА, Г.А.КАРАЛЁЎ, А.С.НІЧЫПАРУК, В.Ц.ОСІПАЎ, П.Ц.ПЕТРЫКАЎ, С.П.САМУЭЛЬ, Б.В.УЛЬЯНКА, Г.А.ФАТЫХАВА, А.К.ФЯДОСАЎ, Б.Ф.ШАЛУХА, І.А.ЯРШОЎ

Гарадская і раённая камісіі па стварэнні гісторыка-дакументальнай хронікі:

горад Орша: А.І.КАЛУГА (старшыня), В.М.СІДНЯКОВА (намеснік старшыні); Аршанскі раён: У.Т.ЛЯВОНАЎ (намеснік старшыні), М.А.ДУДАЛЕЎ, Ю.А.НАГОРНЫ, В.І.ПЯТРУШЫН, Г.Г.ВРУБЛЕЎСКАЯ

Арганізацыйна-метадычны цэнтр па выданні гісторыка-дакументальных хронік Памяці Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку:

Б.В. УЛЬЯНКА (кіраўнік цэнтра), У.І.ЛЕМЯШОНАК (галоўны рэдактар), М.З.БАШЛАКОЎ (галоўны метадыст), Р.А.ЧАРНАГЛАЗАВА (рэдактар)

Рэдакцыя гісторыка-дакументальных хронік «Памяць»:

С.П.САМУЭЛЬ (заг. рэдакцыі), Р.Р.БЛАШКО, І.У.КОСЦІНА, М.А.МАЎЗОН, Н.П.РАКІЦКАЯ, Л.У.ЯЗЫКОВІЧ

Укладальнікі:

Т.Г.ІГНАЦЬЕВА, Г.А.КАРАЛЁЎ, С.П.САМУЭЛЬ, І.А.ЯРШОЎ

Мастак: Э.Э.ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі: В.А.РАГАЛЕВІЧА

ISBN 985-11-0156-7

© Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі, 1999
© Э.Э.Жакевіч. Афармленне, 1999

Орша. Агульны выгляд замчышча.

1067 г., 10 ліпеня	Пад гэтай датай Орша ўпершыню згадваецца ў "Аповесці мінулых гадоў"
1113 г.	Оршай, якая на той час належала Смаленскаму княс-тву, завалодаў мінскі князь Глеб Усяславіч
1116 г.	Оршу ўзяў прыступам, адабраўшы яе ў мінскага кня-зя Глеба Усяславіча, сын Уладзіміра Манамаха - сма-ленскі князь Вячаслаў
1392 г.	Створана Аршанскае намесніцтва з прамым падпа-радкаваннем яго вялікаму князю літоўскаму Вітаўту
1398 г.	У Оршы пачалося ўзвядзенне мураванага замка

Орша. Святадухаўская царква Куцеінскага Богаяўленскага мужчынскага манастыра. Пабудавана ў1-й палавіне17 ст. Рэстаўрыравана ў 1992 г.

1460 г.	Вялікі князь літоўскі Казімір IV узвёў у Оршы, на левым беразе Дняпра, драўляную Ільінскую царкву
1500 г.	Вялікі князь літоўскі Аляксандр акружыў Оршу драўлянай сцяной
1514 г., 8 верасня	Пад Оршай, на берагах Дняпра і Крапівенкі, адбылася бітва паміж войскамі Вялікага княства Літоўскага і Маскоўскай дзяржавы
1518 г.	Барань згадваецца як уладанне князя К.І.Астрожскага
1560 г.	Складзены інвентар Аршанскага замка
1564-1566 гг.	Утвораны Аршанскі павет Віцебскага ваяводства

Орша. Ільінская царква. 1880 г.

1567 — 1587 гг. Аршанскім старостам быў Ф.С.Кміта-Чарнабыльскі

1573 г. У Оршы з дазволу караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта III з'явіліся езуіты, якія зрабілі яе апорным пунктам сваёй экспансіі на ўсходніх тэрыторыях Беларусі

1578 г. Аршанскім падстаростам быў Васіль Цяпінскі

1590 г. Канцлер Вялікага княства Літоўскага Леў Сапега заснаваў у Оршы езуіцкі касцёл

1592 г., 15 кастрычніка У Оршы заснавана праваслаўнае брацтва

Орша. Вадзяны млын. 1902 г.

1598 г., 30 кастрычніка	У прывілеі гетмана Вялікага княства Літоўскага Крыштофа Радзівіла паведамляецца аб заснаванні ім мястэчка Барань
1604 г.	Канцлер Вялікага княства Літоўскага Леў Сапега заснаваў у Оршы езуіцкі калегіум
1620 г.	Патрыярх ерусалімскі Феафан выдаў Оршы грамату на заснаванне праваслаўнага мужчынскага манастыра
1620 г., 13 снежня	Кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт III надаў Оршы магдэбургскае права

Орша. Будынак былога рэальнага вучылішча. Пачатак 20 ст.

1620 г.	Орша атрымала герб: на блакітным полі ўнізе залаты паўмесяц, вышэй — сярэбраны крыж
1621 г., 23 сакавіка	Аршанцы прынялі ўласны статут — «Вілкер места яго каралеўскай міласці Оршы»
1623 г.	Пачата будаўніцтва Куцеінскага праваслаўнага мужчынскага манастыра
1626 г.	У Смалянах завершана будаўніцтва мураванага замка
1630 г.	Пераезд у Оршу з Кіева друкара Спірыдона Собаля

Орша. Чыгуначны вакзал.

1631 г. Спірыдон Собаль надрукаваў у Куцейне знакаміты "Буквар" - "Букварь сиречь, начало учения детем, начинающим чтению извыкати"

1635 г. Кіеўскі мітрапаліт Пётр Магіла асвяціў драўляны Богаяўленскі сабор Куцеінскага манастыра

1648 г. У Куцейне адкрыта брацкая школа

1649 г. У Оршы пабудаваны касцёл Святога Іосіфа Абручніка

1655 г. Пераезд Куцеінскай друкарні ў Іверскі манастыр пад Ноўгарадам

Помнік Янку Купалу ў Ляўках.

1693 г.	У езуіцкім калегіуме створаны рукапісны зборнік драм і інтэрмедый - "Аршанскі кодэкс"
1704 г.	У Барані ўзведзена драўляная Спаса-Праабражэнская царква
1706 г., люты	У Оршы знаходзіўся рускі цар Пётр I
1772 г.	У выніку 1-га падзелу Рэчы Паспалітай Орша ўвайшла ў склад Расійскай імперыі
1778 г.	Зацверджаны план забудовы Оршы

Мемарыяльны комплекс «Кацюша». Фрагмент.

1781 г.	Зацверджаны новы герб Оршы: уверсе - палавіна герба Расійскай імперыі, унізе - 5 залатых стрэлаў
1781 г.	Копысь атрымала новы герб: чорны заяц на зялёным полі
1783 г.	Складзены атлас і карта Аршанскага павета Магілёўскай губерні
1791 г.	У Оршы адкрыта двухкласнае народнае вучылішча
1812 г., 6 ліпеня	Войскі Напалеона ўвайшлі ў Оршу
1812 г., лістапад	Адступаючы з Масквы, Напалеон з гвардыяй знаходзіўся ў Оршы

Орша. Помнік на магіле К.С.Заслонава.

1812 г., 9 лістапада	Орша вызвалена ад французаў казакамі корпуса атамана М. Платава
1812 г.	У Оршы знойдзена знакамітае Аршанскае евангелле - беларускі рукапісны зборнік канца 12 - пачатку 13 ст.
1813 г.	Капітан-інжынер расійскай арміі Гозіуш склаў карту Оршы
1820 г., май	Па дарозе ў паўднёвую ссылку на Аршанскай паштовай станцыі спыняўся вялікі рускі паэт А.С.Пушкін
1848 г., лістапад	Цар Мікалай I зацвердзіў план забудовы Оршы

Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў у в. Якаўлевічы.

1869 г.	У Оршы адкрыта тэлеграфная станцыя
1871 г.	На станцыі Орша пабудаваны драўляны чыгуначны вакзал
1873 г.	У Барані заснаваны драцяна-цвіковы завод
1881 г.	Пачалася параходная сувязь па Дняпры паміж Оршай і Магілёвам
1881 г.	Паяўленне ў Оршы першых нарадавольскіх гурткоў
1881 г.	У Оршы адкрыты вапнавы завод З.Пузрына

У асартыментным кабінеце Аршанскага льнокамбіната.

1883 г.	У Оршы адкрыты піваварны завод
1890 г.	У Оршы заснавана друкарня Я.Падземскага
1899 г.	У Оршы адкрыта гарадская публічная бібліятэка імя А.С.Пушкіна
1900 г.	У Оршы пачалі працаваць механічныя і жалезаліцейныя майстэрні Ясінскага і Славінскага
1900 г.	У Оршы створаны сацыял-дэмакратычны гурток
1902 г.	У Оршы ўзведзены мураваны вадзяны млын

Дом культуры ў калгасе «Ударнік».

1902 г.	Орша стала чыгуначным вузлом
1904 г.	У Оршы створана арганізацыя Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі
1905 г.	У Оршы створаны Ваенна-рэвалюцыйны камітэт
1909 г.	У Оршы створана аддзяленне спартыўнай арганізацыі "Сокал"
1911 г.	У Оршы пачала дзейнічаць жаночая настаўніцкая семінарыя

Птушкафабрыка ў в. Бабінічы.

1915 г., 10 лютага	У Оршы стала выходзіць штодзённая газета "Оршанский вестник"
1917 г., 8 сакавіка	На сходзе прадстаўнікоў рабочых, рамеснікаў і служачых Оршы была прынята пастанова аб стварэнні Савета рабочых дэпутатаў
1917 г., 28 кастрычніка	У Оршы ўсталявана Савецкая ўлада
1918 г.	У Оршы адбыўся мяцеж левых эсэраў
1924 г., 7 ліпеня	Пастановай ЦВК БССР створана Аршанская акруга

Помнік У.С.Караткевічу ў Оршы.

1925 г., 7 лістапада	Уведзена ў эксплуатацыю чыгуначная лінія Орша - Лепель
1926 г.	У Оршы адкрыты акруговы краязнаўчы музей
1927 г., 11 ліпеня	Пачата будаўніцтва БелДРЭС
1928 г.	Пачата будаўніцтва Аршанскага мясакамбіната
1930 г.	У Оршы пачата будаўніцтва сілікатнага завода
1937 г.	Пабудавана 1-я чарга Аршанскага льнокамбіната

Орша. Помнік воінам-землякам, якія загінулі ў Афганістане.

1937 г.	Адкрыты Аршанскі настаўніцкі інстытут
1941 г., 13 ліпеня	Оршу пакінулі войскі Заходняга фронту
1941 г., 14 ліпеня	У баях пад Оршай батарэя рэактыўных мінамётаў пад камандаваннем І.А.Флёрава здзейсніла першы залп
1941 г., ліпень	Пачало дзейнічаць Аршанскае патрыятычнае падполле
1942 г., 14 лістапада	У баі каля в. Купаваць загінуў К.С.Заслонаў

Дзень беларускага пісьменства. Орша. 6 верасня 1998 г.

1944 г., 27 чэрвеня	Войскі 3-га Беларускага фронту вызвалілі Оршу ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў
1952 г.	Створаны Аршанскі завод швейных машын
1967 г., 1 ліпеня	Орша ўрачыста адсвяткавала сваё 900-годдзе
1984 г., 22 снежня	Орша ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені
1998г., 5-6 верасня	У Оршы адбылося свята "Дзень беларускага пісьменства"

Да чытача

Прыгожая і гасцінная аршанская зямля. Сасновыя бары і бярозавыя гаі, пагоркі і яры, рэкі і блакітныя азёры ва ўсе поры года вабяць вока чалавека. А на Дняпры стаіць горад, старажытны і малады, з багатай гістарычнай спадчынай.

За сваю амаль тысячагадовую гісторыю Орша была сведкам многіх гістарычных і культурных падзей. Ва ўсе часы тут жылі працавітыя і таленавітыя людзі. Аршаншчына дала свету таленавітых пісьменнікаў і паэтаў, мастакоў і артыстаў, вучоных і дзяржаўных дзеячаў.

Аршаншчына заўсёды была гасцінная для сяброў. З ворагам змагаліся мужна, упарта, пагеройску. Горад Орша размешчаны на скрыжаванні важнейшых транспартных шляхоў, з'яўляўся арэнай жорсткай барацьбы з захопнікамі. Асабліва разбуральнай яна была ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Усё, што створана папярэднімі пакаленнямі, было ахоплена полымем гэтай вайны. Таму назаўсёды будзе захаваны ва ўдзячнай памяці аршанцаў бяспрыкладны подзвіг тых нашых землякоў, якія аддалі сваё жыццё ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Наша гісторыя — гэта не толькі сівая даўніна, але і падзеі тых часоў, сведкі якіх жывуць сярод нас. Каб адлюстраваць багатую гістарычную і культурную спадчыну розных пакаленняў аршанцаў, расказаць пра людзей — яе стваральнікаў, людзей-працаўнікоў, ушанаваць памяць тых, каго ўжо няма з намі, і выходзіць кніга «Памяць», прысвечана Оршы і Аршанскаму раёну.

Праведзеная вялікая пошукавая работа дазволіла адлюстраваць гісторыю Оршы ад старажытных часоў да нашых дзён. Змешчаны звесткі пра падзеі, што адбываліся тут у сярэдневяковыі і часы, калі тэрыторыя раёна ўваходзіла ў склад Расійскай імперыі. Ёсць матэрыялы пра развіццё эканомікі, культуры, адукацыі ў гады Савецкай улады. У кнізе пайменна ўвекавечаны тыя людзі, якія беспадстаўна рэпрэсіраваны ў 1920—30-я гады.

Значнае месца ў кнізе адведзена падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Тут змешчаны дакументы, успаміны ўдзельнікаў падзей пра подзвігі землякоў на франтах, нямецка-фашысцкі акупацыйны рэжым, партызанскі рух на Аршаншчыне, а таксама спісы воінаў-землякоў, партызан, падпольшчыкаў і мірных жыхароў. На старонках кнігі можна таксама знайсці звесткі пра вёскі, біяграфіі знакамітых землякоў і інш.

У кнізе выкарыстаны матэрыялы і дакументы архіваў гарадоў Мінска, Масквы, Санкт-Пецярбурга, фондаў музеяў, працы айчынных і замежных гісторыкаў, напрацоўкі мясцовых краязнаўцаў.

Стваральнікі кнігі, выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі ўдзячныя прадстаўнікам грамадскасці, супрацоўнікам архіваў, музеяў, бібліятэк, арганізацыям і прыватным асобам — усім, хто прымаў удзел у пошуку, зборы і падрыхтоўцы матэрыялаў, садзейнічаў выданню гэтай кнігі.


ОРША
ВІЦЕБСК
СМАЛЕНСК
ЛЕПЕЛЬ
ЛЕПЕЛЬ
МІНСК
МАГІЛЁЎ
КРЫЧАЎ
Дняпро
вул. Новая
вул. Шаўночная
вул. Дэпоўская
вул. Шклоўская
вул. Ленінская
вул. Смаленская
вул. Молакава
вул. Міру
вул. Чырвонаармейская
вул. Ленінградская
вул. Пушкіна
вул. Ленінскага
вул. Першамайская
вул. Маякоўскага
вул. Гарэцкая
вул. Дубровенская
вул. Мінская
вул. Чарняхоўскага
вул. Маскоўская
вул. Флёрава
вул. Бялінскага
вул. Чарнышэўскага
вул. Шаўчэнкі
вул. Сяліцкага
вул. Зарэчная
вул. Аршанка
пер. 2-і Першамайскі
пер. 1-ы Бялінскага
вул. Энгельса
вул. Пралетарская
вул. Ленінградская
вул. Камсамольская
вул. Кастрычніцкая
вул. Кірава
вул. Лагерная
вул. Савецкая
вул. Чырвонаармейская
вул. 11-га Ліпеня
вул. Ліпеня
вул. Дастаеўскага
вул. Чарняхоўскага
вул. Ціміразева
вул. Стаханаўская
вул. Чырвонаармейская
вул. Ленінградская
вул. Пралетарская
вул. Пачтовая
вул. Міру
вул. Пограничная
вул. Ленінскага
вул. Ленінградская
вул. Ленінская
вул. Ленінградская
вул. Ленінскага
вул. Ленінградская
вул. Ленінскага
вул. Ленінградская
вул. Ленінскага



ноў, 5 бальнічных устаноў на 1450 ложкаў, 7 паліклінік. У горадзе размешчаны шматлікія Палацы і Дамы культуры, музеі, бібліятэкі, працуе выставачная зала.

АРШАНСКІ РАЁН размешчаны на паўднёвым усходзе Віцебскай вобласці ў вярхоўях Дняпра. Мяжуе на поўначы з Сенненскім і Лёзненскім, на ўсходзе — з Дубровенскім, на захадзе — з Талачынскім раёнамі Віцебскай вобласці, на поўдні — са Шклоўскім і Горацкім раёнамі Магілёўскай вобласці. Утвораны 17.7.1924 г. Плошча 1,7 тыс. км^2. Насельніцтва 47,2 тыс. чал. (1998), сярэдняя шчыльнасць 26,4 чал./км^2, гарадскога 12%. Населеных пунктаў — 263, у т.л. гарады Орша (цэнтр раёна), Барань, гарадскія пасёлкі Арэхаўск, Копысь, 19 сельсаветаў: Андрэеўшчынскі, Балбасаўскі, Барздоўскі, Вусценскі, Высокаўскі, Дубраўскі, Забалацкі, Задроўеўскі, Запольскі, Зубаўскі, Клюкаўскі, Крапівенскі, Межаўскі, Панізоўскі, Першамайскі, Пішчалаўскі, Смалянскі, Стайкаўскі, Якаўлевіцкі.

Размешчаны ў межах Аршанскага ўзвышша і Аршанска-Магілёўскай раўніны. Паўночная частка занята Лучоскай нізінай. Паверхня пераважна ўзгорыстая і платопадобная. Пераважаюць вышыні 180—220 м,

найвышэйшы пункт 237,5 м (на паўночным захадзе ад в. Стайкі). Карысныя выкапні: торф, даламіт, пясчана-жвіровы матэрыял, будаўнічыя пяскі, легкаплаўкія гліны. Сярэднегадавая тэмпература студзеня -7,8 °С, ліпеня 18 °С. Ападкаў выпадае 627 мм за год. Вегетацыйны перыяд 184 дні. Па тэрыторыі раёна цякуць рэкі: Дняпро з прытокамі Аршыца і Адроў (справа), Крапівенка і Лешча (злева). Гушчыня натуральнай рачной сеткі 0,43 км/км^2. Азёры: Вялікае Арэхаўскае, Дзевінскае, Перавалачна, Кузьміно, Карэсіна. Пад лесам занята 23% тэрыторыі раёна, пераважаюць хваёвыя і яловыя, трапляюцца бярозавыя, асінавыя і альховыя лясы. Агульная плошча балот 4,2 тыс. га. Глебы сельгасугоддзяў: дзярнова-падзолістыя (67,7%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (23,3%), дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалочаныя (3%), тарфяна-балотныя (3%), поймавыя (2,5%); паводле механічнага складу — сугліністыя (84,9%), супясчаныя (11,4%), тарфяныя (3%), пясчаныя (0,7%). Пад сельгасугоддзямі 107 тыс. га, з іх асушаных 11,7 тыс. га. На тэрыторыі раёна размешчаны 22 калгасы, 8 саўгасаў, 2 аграфірмы, птушкафабрыка, 2 эксперыментальныя базы, камбінат «Цяплічны». Развіты льнаводства, малочна-мясная жывёлагадоўля, свінаводства і птушкагадоўля. Вырошчваюць збожжавыя і кармавыя культуры, бульбу, агародніну. Прадпрыемствы па вытворчасці будаўнічых матэрыялаў (кафля, цэгла, жалезабетонныя вырабы), металаапрацоўцы (лёгкае машынабудаванне, станкабудаванне), лёгкай (тэкстыльная, швейная), харчовай прамысловасці. БелДРЭС. Здабыча торфу. По тэрыторыі раёна праходзяць чыгункі ад Оршы на Мінск, Магілёў, Крычаў, Смаленск, Віцебск, Лепель. Найбольш значныя аўтадарогі Брэст—Масква і Магілёў—Віцебск. Магістральны газаправод Таржок—Мінск—Івацэвічы і нафтаправод на Наваполацк (адгалінаванне ад нафтаправода «Дружба»). У раёне Смалянскі саўгас-тэхнікум, Высокаўскае СПТУ, 26 сярэднеагульнаадукацыйных, 7 базавых, 4 пачатковыя, 2 пачатковыя школы-сады, 4 музычныя школы, дзіцяча-юнацкая спартыўная школа, школа-інтэрнат, 38 дашкольных устаноў, школа рабочай моладзі, 47 бібліятэчных устаноў, 19 Дамоў культуры, 17 клубаў, 6 бальніц на 475 ложкаў, 8 урачэбных амбулаторый, 25 фельчарска-акушэрскіх пунктаў. Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Ляўкі». Архітэктурныя помнікі ў в. Смаляны: касцёл дамініканцаў (18 ст.), руіны замка (17 ст.), Спаса-Праабражэнская (18 ст.) і Аляксееўская цэрквы (19 ст.). Помнікі прыроды — Высокаўскі і Межаўскі паркі. Выдаецца «Аршанская газета».

Населеныя пункты Аршанскага раёна

Горад Орша, г. Барань

Андрэеўшчынскі сельсавет (да 1985 Кудаеўскі): Андрэеўшчына, Анібалева, Берасценава, Вялікая Міцькаўшчына, Кудаева, Міцькаўшчына, Прыдняпроўе (да 1965 Кабылякі), Солаўе.

Арэхаўскі пасялковы савет: гарадскі пасёлак Арэхаўск, Брухава.

Балбасаўскі сельсавет: пасёлак Балбасава, Барсукі.

Барздоўскі сельсавет: Бабічы, Барздоўка, Баяры, Браздзечына, Будзішча, Гараны, Есіпава, Загарэльскія, Крашына, Кушэўка, Лявонаўка, Макараўка, Маркавічы, Печышча, Прыгузкі, Пугляі, Сідараўка, Суднікі, Турлаі, Чурылава.

Вусценскі сельсавет: Барань, Бараўцы, Вусце, Вязавая, Ліпкі, Малінаўка, Марозаўка, Навасёлкі, Сасноўка, Селішча, Тарчылава, Целянцеева, Чырвоны Бераг, Чэрвіна, ст. Чэрвіна, Яромкавічы.

Высокаўскі сельсавет: Абухава, Барсукі, Верацея, Вусы, Высокае, пасёлак Высокае, Вялікае Бабіна, Грышаны, Івашкава, Калатоўкі, Карабішчы, Краснабель, Купелка, Людкаўшчына, Малое Бабіна, Пісаршчына, Рагазіна, Селішча, Селякта, Сядрычына, Халмы, ст. Хлусава, Чапеліна.

Дубраўскі сельсавет: Дубраўка, Зубрэвічы, Казекі, Прокшына (да 1979 Таргоўцы), Хімы.

Забалацкі сельсавет: Арлоўшчына, Горная Веравойша, Грабянёва, Даўжаніцы, Дачная, Забалацце, Зайцава, Заслонаўка, Ламачына, Ніжняя Веравойша, Новае Хорабрава, Падгайшчына, Пузырова, Стар, Старое Хорабрава, Татарск, Туравічы.

Задроўеўскі сельсавет: Дроздава, Дубавое, Жалезнякі, Задроўе, Зайцава, Засеклі, Казлова, Пагост, Пагосцік, Панізоўе, Рагазіна, Роскі Сялец, Хлусава.

Запольскі сельсавет: Азярок, Баякоўшчына, Глінішча, Гразіна, Заполле, Зоськава, Ізмайлава, Лагі, Малотынь, Рубашына, ст. Смаляны, Ферма.

Зубаўскі сельсавет: Зубава, Краснапольцы (да 1963 Амерыка), Лешча, Ляўкі, Садовая, Светачаўка, Смётанка.

Клюкаўскі сельсавет: Арашкі, Дзевіна, Замасточча, Іванькава, Клюкаўка, Лісоўскія, Рамальдава, Сафіёўка, Семахі, Старына.

Копыскі пасялковы савет: гарадскі пасёлак Копысь.

Крапівенскі сельсавет: Барадуліна, Брылі, Гацькаўшчына, Гразіўка, Загарадная, Згарда, Крапіўна, Ларынаўка, Пашына, Рымкі (да 1952 Засценкі-Міхачэўскі), Савішчана (да 1977 Рукліншчына), Стахоўка, Сяглава, Шатравіна, Шугайлава.

Межаўскі сельсавет: Дубраўка, Зарэчча, Казечкі, Казечына, Кашына, Мальжонкава, Межава, Мядзведнікі, Новае Сяло, Стаўбуны, Чаркасава, Шэмберава, Юрцава.

Панізоўскі сельсавет: Антонаўка, Бабінічы, Зорная, Марозава, Нарэйкава, Панізоўе, Руміна, Свісцёлкі, Стаўры, Сцяпкова, Харкаўка, Чарное, Чырвоная Харкаўка.

Першамайскі сельсавет: Балотавічы, Барэйшава, Белева, Бранцава, Вярхоўе, Дзят-

лава, Клюшнікава, Ленькавічы, Лісуны, Мацнова, Мезінава, Навасе́лле, Тумінічы, Хадулы, Хімінічы.

Пішчалаўскі сельсавет: Антавіль, Асінаўка, Багрынава, Барадзіно, Гадавічы, Гародня, 10-ы блок пост, Дрыбіна, Еліна, Ерашэвічы, Корава, Ліпкі, ст. Мажэеўка, Малыя Ліпкі, Масееўка, Машкова, Муханава, Немерава, Папоўка, Пішчалава, Слабада, Хлусава.

Смалянскі сельсавет: Агранамічная, Бабрамынічы, Васнева, Вязьмічы, Ганьшава, Гаравыя Паршні, Жвікава, Казённыя Паршні, Камякі, Карпаўшчына, Кучына, Масюкі, Паркавая, Парэчча, Працоўная, Руклі, Рэпухава, Смаляны, Соманава, Спаскае, Ступавое (да 1931 Б у х а ў ц ы), Субачава, Сялец, Ціханы (да 1931 Ю р а ў ш ч ы н а), Цюльпін, Шанькава, Шыбекі.

Стайкаўскі сельсавет: Аланцьева, Дубніцы, Каменка, Канавалава, Лужкі, ст. Лужкі, Ляснічыя, Монькава, Сармацк, Свістуны, Слабада, Стайкі, Стапурэва, Чарняўскія.

Якаўлевіцкі сельсавет: Засценкі, Казловічы 1-я, Казловічы 2-я, Лешча, Люціны, Лямна, Магераўка, Раманаўка, Якаўлевічы, пасёлак Якаўлевічы.

Населеныя пункты Аршанскага раёна, якія не існуюць

Андрэеўшчынскі сельсавет: Кабылякі, Малая Міцькаўшчына.

Арэхаўскі пасялковы савет: Выдрыца, Каралінава, Рудня.

Барздоўскі сельсавет: Есіпава-Земянскае, Лучыншчына, Раз'езды № 17,20, Чырвонае Есіпава.

Вусценскі сельсавет: Гарбацэвічы, Іванаўка, эксперыментальная база «Вусце», Новае Тарчылава.

Высокаўскі сельсавет: Балыкова, Ганусін Бор.

Дубраўскі сельсавет: Альхоўка, Вялікія Яркі, Зарэчча, Застружжа, Малыя Яркі, Панізоўе, Раз'езд Прокшына, Таргоўцы.

Забалацкі сельсавет: Васькаўшчына, пасёлкі Вясёлы, Добры, вёска Чырвоная Ніва.

Запольскі сельсавет: Бортнікава.

Зубаўскі сельсавет: Амерыка, Ліпкі.

Клюкаўскі сельсавет: Івашня, торфапрадпрыемства «Дзевінскі мех», пасёлак Смолзавод.

Крапівенскі сельсавет: Вялікае Крапіўна, Горнае Крапіўна, Заложжа, ст. Крапіўна, Малое Крапіўна, Засценкі-Міхачэўскі, Рукліншчына.

Кудаеўскі сельсавет.

Межаўскі сельсавет: Запруддзе, пасёлак ДЭУ-803, эксперыментальная база «Межава», Раз'езды № 66, 67, 69, 70, 72, Слабодка, Шапкі.

Панізоўскі сельсавет: пасёлак Бабінічы, Паддубцы.

Першамайскі сельсавет: Аляксандрава, Балбасава, Белая Ферма, Галавачова, Гарані, Зямцы.

Пішчалаўскі сельсавет: Васкрасеншчына, Гразінец, Езупоўшчына, Залеглава, Махонава, Шахава.

Смалянскі сельсавет: Бухаўцы, Юраўшчына.

Стайкаўскі сельсавет: Кураўшчына, Пясчанка, пасёлак Стайкі, Чарніцы.

Якаўлевіцкі сельсавет: Крывуша, Якаўлевічы 1-я, Якаўлевічы 2-я.

З гісторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу Аршанскага раёна

Адно з першых упамінанняў аб Аршаншчыне як самастойнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы адносіцца да 16 ст., калі ў складзе Вялікага княства Літоўскага па рэформе 1564—66 гадоў утвораны Аршанскі павет Віцебскага ваяводства. З 1569 г. ён стаў паветам Рэчы Паспалітай.

У 1772 г. адбыўся першы раздзел Рэчы Паспалітай, па якому з Расіяй уз'ядналася ўсходняя частка Беларусі, у тым ліку тэрыторыя сучаснага Аршанскага раёна. Згодна з указам сената ад 23 кастрычніка 1772 г. ў складзе ўтворанай Магілёўскай губерні была выдзелена Аршанская правінцыя. У 1777 г. Магілёўская губерня была раздзелена на паветы, сярод якіх лічыліся Аршанскі і Копыскі.

У 1778 г. адбылося перайменаванне Магілёўскай губерні ў намесніцтва з захаваннем таго ж дзялення на паветы. У 1796 г. Магілёўскае намесніцтва разам з Полацкім утварыла Беларускую губерню з цэнтрам у Віцебску.

Па новым губернскім раздзеле Расіі 1801 г. зноў была ўтворана Магілёўская губерня, у склад якой па-ранейшаму ўваходзілі Аршанскі і Копыскі паветы. У 1861 г. тэрыторыя Копыскага павета ўвайшла ў склад Горацкага.

Напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Аршанскі павет уваходзіла 16 воласцей: Бараньская (цэнтр в. Барань), Высоцкая (в. Юрцава), Высачанская (в. Высокае), Дабрамысленская (в. Дабрамыслі), Коханаўская (в. Коханава), Лёзненская (мяст. Лёзна), Любавіцкая (в. Любавічы), Мікулінская (в. Мікуліна), Машкоўская (в. Машкова), Наватухінская (в. Наватухіна), Руднянская (в. Рудня), Серакаратнянская (в. Серакаратня), Смалянская (мяст. Смаляны), Старасельская (в. Старасельле), Стараталачынская (в. Талачыно), Хлыстоўская (в. Хлыстоўка).

З устанаўленнем Савецкай улады Аршанскі павет у складзе Магілёўскай губерні ўвайшоў у Заходнюю вобласць (з верасня 1918 г. — Заходнюю Камуну), цэнтр якой спачатку знаходзіўся ў Мінску, а затым, у сувязі з наступленнем войск кайзераўскай Германіі, перамясціўся ў Смаленск.

1 студзеня 1919 г. Аршаншчына ў складзе Магілёўскай губерні ўвайшла ў Беларускую ССР, а з лютага 1919 г. ў сувязі з утварэннем аб'яднанай Літоўска-Беларускай ССР адышла да РСФСР.

У красавіку 1919 г. ў складзе РСФСР была ўтворана Гомельская губерня, у якую ўвайшлі ўсе паветы ліквідуемай Магілёўскай губерні, у тым ліку і Аршанскі. Тады ж у Аршанскі павет з Горацкага была перададзена Пугляеўская воласць, а ў чэрвені 1919 г. з Сенненскага павета перададзена Зарэчнаталачынская воласць.

Загадам Народнага камісарыята ўнутраных спраў РСФСР ад 6 верасня 1919 г. быў зацверджаны пераход 4 валасцей (Лёзненскай, Дабрамысленскай, Высачанскай і Серакаратнянскай) у склад Віцебскай губерні і яшчэ 4 валасцей (Любавіцкай, Мікулінскай, Руднянскай і Хлыстоўскай) у склад Смаленскай губерні.

Па хадайніцтву Аршанскага паветвыканкома і Віцебскага губернскага ваеннага рэвалюцыйнага камітэта дэкрэтам ВЦВК і СНК РСФСР ад 18 лістапада 1920 г. Аршанскі павет Гомельскай губерні быў пераведзены ў склад Віцебскай губерні, якая таксама ўваходзіла ў РСФСР. У той час павет складаўся з 10 валасцей: Баранскай, Высокскай, Зарэчнаталачынскай, Коханаўскай, Машкоўскай, Наватухінскай, Пугляеўскай, Смалянскай, Старасельскай, Стараталачынскай.

У лютым 1923 г. ў сувязі з ліквідацыяй Сенненскага павета 5 яго валасцей (Бобрская, Высокагарадзецкая, Какоўчынская, Абчугская і Раснянская) далучыліся да Аршанскага павета. Тады ж адбылося ўзбуйненне валасцей і колькасць іх скарацілася да 9: Баранская (цэнтр г. Орша), Бобрская (с. Бобр), Вяліка-Коханаўская (с. Коханава), Вялікасельская (с. Вялікае Сяло), Высокская (с. Юрцава), Новатухінская (с. Новатухіна), Абчугская (с. Абчугі), Старасельская (с. Стараселле), Талачынская (с. Талачыно).

У сакавіку 1924 г. беларускія паветы Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў РСФСР, у тым ліку і Аршанскі, перададзены БССР. Пастановай другой сесіі ЦВК БССР 6-га склікання ад 17 ліпеня 1924 г. «Аб адміністрацыйна-гаспадарчым дзяленні БССР» былі ліквідаваны паветы і воласці і ўстанаўлівалася дзяленне рэспублікі на акругі і раёны. Пазней былі вызначаны і мясцовыя адзінкі — сельсаветы. Створаная Аршанская акруга ўключала 10 раёнаў: Аршанскі (г. Орша), Багушэўскі (цэнтр — ст. Багушэўск), Горацкі (мяст. Горкі), Дубровенскі (мяст. Дуброўна), Дрыбінскі (мяст. Дрыбін), Копыскі (мяст. Копысь), Коханаўскі (мяст. Коханава), Круглянскі (мяст. Круглае), Лядненскі (мяст. Ляды), Талачынскі (мяст. Талачын).

Пастановай ЦВК і СНК БССР ад 21 жніўня 1925 г. тэрыторыя раёнаў Аршанскай акругі падзялялася на 110 сельсаветаў, у тым ліку Аршанскі раён — на 14: Баранскі (цэнтр — с. Барань), Браздзечынскі (с. Браздзечына), Веравойшанскі (в. Веравойша-Горная), Высокаўскі (хут. Высокае), Яромкавіцкі (в. Яромкавічы), Крапівенскі (с. Крапіўна), Кудаеўскі (в. Кудаева), Межаўскі (с. Межава), Машкоўскі (в. Машкова), Пішчалаўскі (в. Пішчалава), Панізоўскі (в. Панізоўе), Пугляеўскі (с. Пугляі), Рудкаўшчынскі (в. Рудкаўшчына), Шапкаўскі (в. Шапкі). У склад Копыскага раёна Аршанскай акругі ўвайшлі 9 сельсаветаў: Александрыйскі (с. Александрыя), Вялікаславенскі (с. Вялікія Славені), Дубраўскі (мяст. Дубраўка), Зубаўскі (в. Зубава), Копыскі (мяст. Копысь), Маслакоўскі (с. Маслакі), Нікіцініцкі (в. Нікіцінічы), Старасельскі (мяст. Стараселле), Якаўлевіцкі (с. Якаўлевічы).

У чэрвені 1927 г. да Аршанскай акругі былі далучаны: Чарэйскі раён (цэнтр — мяст. Чарэя) ліквідаванай Барысаўскай акругі, Мсціслаўскі (г. Мсціслаўль) і Расненскі (мяст. Расна) раёны ліквідаванай Калінінскай акругі, Крупскі раён (мяст. Крупкі) Мінскай (раней Барысаўскай) акругі.

Такім чынам, па стану на 1 студзеня 1930 г. Аршанская акруга складалася з 14 раёнаў і 147 сельсаветаў.

У чэрвені 1930 г. пастановамі ЦВК і СНК СССР і БССР дзяленне на акругі было ліквідавана і ўстанаўлівалася адзінае дзяленне на раёны. Усе правы і абавязкі акруговых выканкомаў перадаваліся райвыканкомам, а ў горадзе Оршы — гарвыканкому. Раёны непасрэдна падначальваліся цэнтральным рэспубліканскім органам — ЦВК і СНК БССР.

У 1931 г. Аршанскаму раёну былі перададзены 6 сельсаветаў ліквідаванага Багушэўскага раёна (Багушэўскі, Какоўчынскі, Клюкаўскі, Лядневіцкі, Астапенскі, Стайкаўскі),

5 сельсаветаў ліквідаванага Коханаўскага раёна (Гальцэвіцкі, Малотынскі, Роска-Сялецкі, Тумініцкі, Шыбецкі), 3 сельсаветы ліквідаванага Копыскага раёна (Дубраўскі, Зубаўскі, Якаўлевіцкі), а таксама Будскі сельсавет Дубровенскага раёна, Копысь і Смаляны.

Іншыя сельсаветы ліквідаванага Копыскага раёна перадаваліся Шклоўскаму (Александрыйскі, Вяліка-Славенскі, Нікіцініцкі), Горацкаму (Маслакоўскі) і Талачынскаму (Старасельскі) раёнам.

У ліпені 1935 г. да катэгорыі рабочых пасёлкаў былі аднесены Барань, Арахі-Выдрыца і Якаўлевічы, а да катэгорыі мястэчак — Копысь і Смаляны.

У 1935 г. Горацкаму раёну быў перададзены Рудкаўшчынскі сельсавет, а зноў утворанаму Багушэўскаму раёну — 6 сельсаветаў, уключаных у 1931 г. ў склад Аршанскага раёна.

15 студзеня 1938 г. 1-я сесія Вярхоўнага Савета СССР утварыла на тэрыторыі БССР новую буйную адміністрацыйна-тэрытарыяльную адзінку — вобласці. Пастановай Прэзідыума ЦВК СССР ад 20 лютага 1938 г. Аршанскі раён уключаўся ў склад утворанай Віцебскай вобласці.

У верасні 1938 г. рабочымі пасёлкамі былі зацверджаны Барань, Арахі-Выдрыца, Аршанскі-чыгуначны, Асінторф і Якаўлевічы, гарадскім пасёлкам — Копысь. Тады ж мястэчка Смаляны было аднесена да катэгорыі вёсак і зноў утворан Смалянскі сельсавет.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 22 жніўня 1940 г. з адміністрацыйна-гаспадарчага падначалення Аршанскага райвыканкома быў выдзелены Аршанскі чыгуначны пасёлак, які ўключаўся ў рысу горада Орша.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны Аршанскі раён уключаў 23 сельсаветы: Баранскі, Браздзечынскі, Будскі, Веравойшанскі, Высокаўскі, Гальцаўскі, Дубраўскі, Зубаўскі, Крапівенскі, Кудаеўскі, Межаўскі, Малотынскі, Машкоўскі, Панізоўскі, Пішчалаўскі, Пугляеўскі, Роска-Сялецкі, Смалянскі, Тумініцкі, Шапкаўскі, Шыбецкі, Якаўлевіцкі, Яромкавіцкі.

Пасля вызвалення тэрыторыі Аршанскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ён аднавіў існаванне ў ранейшых межах.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 11 ліпеня 1946 г. рабочы пасёлак Арахі-Выдрыца быў перайменаваны ў гарадскі пасёлак Арэхаўск.

У верасні 1946 г., у сувязі з утварэннем у Віцебскай вобласці новых раёнаў, са складу Аршанскага раёна былі выдзелены: у Коханаўскі раён Гальцаўскі, Роска-Сялецкі, Смалянскі, Тумініцкі, Шыбецкі сельсаветы; у Арэхаўскі — Будскі, Высокаўскі, Межаўскі і Шапкаўскі, Арэхаўскі гарпассавет і рабочы пасёлак Асінторф.

У 1954 г. Яромкавіцкі сельсавет быў перайменаваны ў Ліпкаўскі.

У 1956 г. ў сувязі з ліквідацыяй раёнаў былі перададзены Аршанскаму раёну: з Коханаўскага — Сальнікскі, Смалянскі і Тумініцкі сельсаветы; з Арэхаўскага — Будскі, Высокаўскі, Межаўскі і Шапкаўскі сельсаветы, Арэхаўскі гарпассавет і рабочы пасёлак Асінторф.

У сакавіку 1957 г. з Дубровенскага раёна ў Аршанскі быў перададзены Халмоўскі сельсавет.

У 1960 г. з ліквідаванага Багушэўскага раёна у склад Аршанскага былі пераведзены Клюкаўскі і Стайкаўскі сельсаветы.

У 1960—61 гадах у Аршанскім раёне былі ліквідаваны Будскі, Баранскі, Шапкаўскі, Машкоўскі, Пугляеўскі і Халмоўскі сельсаветы, населеныя пункты якіх перадаваліся ў суседнія сельсаветы.

На аснове Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 25 снежня 1962 г. «Аб узбуйненні сельскіх раёнаў БССР» у склад Аршанскага раёна ўвайшла тэрыторыя ліквідаванага Дубровенскага раёна. Тады ж Малотынскі, Сальнікскі і Тумініцкі сельсаветы Аршанскага раёна былі перададзены ў склад Талачынскага раёна.

У студзені 1963 г. быў утвораны Першамайскі сельсавет, а гарадскі пасёлак Арэхаўск і рабочы пасёлак Барань перададзены ў падначаленне Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных.

У студзені 1965 г. зноў утворанаму Дубровенскаму раёну былі перададзены сельсаветы, якія ў 1962 г. перайшлі ў Аршанскі раён. Тады ж Аршанскаму раёну былі вернуты з Талачынскага Малотынскі і Сальнікскі сельсаветы, а гарадскі пасёлак Арэхаўск перададзены Аршанскаму раённаму Савету дэпутатаў працоўных.

11 верасня 1965 г. Сальнікскі сельсавет перайменаваны ў Задроўеўскі сельсавет.

У адпаведнасці з рашэннем Віцебскага аблвыканкома ад 2 лютага 1982 г. Браздзечынскі сельсавет перайменаваны ў Барздоўскі, Веравойшанскі — у Забалацкі, Ліпкаўскі — у Вусцянскі, Малотынскі — у Запольскі.

У маі 1984 г. Кудаеўскі сельсавет перайменаваны ў Андрэеўшчынскі.

Цяпер у Аршанскі раён уваходзяць 19 сельсаветаў, Копыскі і Арэхаўскі гарпасялковыя Саветы.

Орша з'яўляецца горадам абласнога падначалення і раённым цэнтрам. У адміністрацыйным падначаленні Аршанскаму гарадскому Савету дэпутатаў знаходзіцца г. Барань, якому статут горада прысвоены ў маі 1972 г.

А.М.Кудзін.

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Першабытныя паселішчы Аршаншчыны

У валдайскі позналедавіковы перыяд на тэрыторыі Беларусі ўтварыліся тысячы азёр, у басейне р. Днепр завяршылася фарміраванне ўступа першай надпоймавай тэрасы. Гэты перыяд у Беларускім Падняпроўі суадносіцца з так званай грэнскай археалагічнай культурай. Суровыя кліматычныя ўмовы спрыялі таму, што людзі пачалі будаваць жытлы з касцей мамантаў. Яны былі наземнымі, акруглай формы, з агнішчам у цэнтры пабудовы. Маманты былі галоўным аб'ектам паляванне верхнепалеалітычнага чалавека. На тэрыторыі Аршаншчыны пры распрацоўцы кар'ераў знаходзілі біўні, косці і зубы мамантаў. Аснову гаспадаркі складалі паляванне і збіральніцтва. Пачатковай формай родавага ладу быў патрыярхат. Удасканаленне паляўнічай зброі, выкарыстанне спецыяльных землякопных прылад зрабілі магчымым павелічэнне запасаў мяса, скуры для абутку, адзення і будаўнічага матэрыялу для жытлаў. Чалавек стаў здабываць таксама дробную жывёлу, птушак. Выкарыстоўвалі і розныя рыбалоўныя прылады.

Шчыльнасць засялення была вельмі нізкай. Таму першабытныя стаянкі знаходзяць рэдка. У Аршанскім раёне ў 1984 г. выяўлена стаянка рубяжа позняга палеаліту і ранняга мезаліту, якая адносіцца да ранняга этапу грэнскай культуры. Датуецца яна 9—8 тысячагоддзем да н.э. Знаходзіцца стаянка за 500 м на захад ад в. Берасценава на першай надпоймавай тэрасе правага берага Дняпра. У 1987—88 гг. У.П.Ксяндзоў выявіў тут рэшткі гаспадарчых пабудоў, крамянёвыя прылады працы і інш.

Паміж 9-м і 5-м тысячагоддзямі да н.э. на тэрыторыі Беларусі распаўсюдзіўся мезаліт. Рэльеф і рачная сетка наблізіліся да сучаснага выгляду, таксама як расліны і жывёлы. У гэты час на тэрыторыі Беларусі з'явіліся першыя абарыгены. Склаліся асобныя культурна-гістарычныя рэгіёны, што адрозніваліся крамянёвым інвентаром. Гэта сведчыць аб наяўнасці племяннoй арганізацыі ў людзей. Мезалітычныя плямёны складаліся з некалькіх мацярынскіх абшчын з кроўнымі сувязямі. Побач з удасканаленымі вядомымі прыладамі працы выкарыстоўваліся лук, сякера. Узрасло значэнне рыбалоўства.

Да 4—2 тысячагоддзя да н.э. адносяцца неалітычныя паселішчы. Павялічылася колькасць насельніцтва, таму стаянак гэтага часу больш. У познім неаліце ажыццяўляецца пераход да жывёлагадоўлі і земляробства. Пры апрацоўцы крэменю ўжываецца шліфаванне і свідраванне. Выкарыстоўваюць прылады працы з косці і рогу. У неаліце пачалі карыстацца гліняным посудам. У цеста гліны дабаўлялі жарству, тоўчаныя ракавіны, раслінныя дамешкі. Донцы посуду былі завостранымі, сценкі аздабляліся багатым арнаментам. Ён



Крамянёвыя прылады працы грэнскай культуры са стаянкі каля в. Берасценава. Раскопкі У.П.Ксяндзова.

наносіўся з дапамогай грэбеня, меў магічнае і рытуальнае значэнне.

На Аршаншчыне ў гэты час распаўсюдзілася так званая верхнедняпроўская археалагічная культура з грабеньчата-ямкавай керамікай. Яе паселішчы размяшчаліся на першай надпоймавай тэрасе, па берагах азёр, у поймах рэк. Жытлы былі акруглай формы, заглыбленыя ў зямлю. Унутры змяшчаліся адкрытыя агнішчы. У Оршы на левым беразе р. Днепр насупраць вуліц Бялінскага і Крылова ў 1988 г. У.П.Ксяндзоў выявіў і даследаваў паселішча верхнедняпроўскай неалітычнай культуры.

У канцы неаліту ўнутры радавой мацярынскай абшчыны выдзяляюцца асобныя сем'і, якія яшчэ звязаны паміж сабой.

З 2-га тысячагоддзя да н.э. на тэрыторыі Беларусі пачаўся бронзавы век. Побач з каменнымі з'яўляюцца прылады працы з медзі і бронзы. Жывёлагадоўля і земляробства займаюць галоўнае месца ў гаспадарцы. На змену матрыярхату прыходзіць патрыярхат. Шматлікія знаходкі каменных шліфаваных сякер-кліноў сведчаць аб высяканні лясоў для падсечна-лядавага земляробства. Сярпы былі крамянёвымі, зерняцёркі — каменнымі. На Аршаншчыне распаўсюдзілася так званая сярэднедняпроўская археалагічная культура, якая паглынула мясцовыя неалітычныя стаянкі. Жытлы былі наземнымі, слупавой канструкцыі з каменнымі агнішчамі ў цэнтры. Посуд акруглабокі з закругленым ці плоскім донцам і выцягнутай шыйкай. Арнамент адбіты вяроўкай, лінейны, або зроблены зубчатым штампам.

У 1928 г. А.М.Ляўданскі знайшоў у Оршы на старажытным гарадзішчы побач з матэрыяламі сярэдневякоўя каменныя клінападобныя сякеры, крамянёвыя адшчэпы, касцяную сякеру. Трапляліся арнаментаваныя рэшткі керамікі эпохі бронзы. *В.М.Ляўко.*

Першабытныя стаянкі ў Оршы

На паўночнай ускраіне Оршы аўтарам гэтага артыкула яшчэ ў 1978 г. на ворыве былі знойдзены некалькі дзесяткаў разбітых крамянёў. Сярод іх былі адшчэпы, пласціны, нуклеусы — рэчы, што выраблялiся толькі першабытным чалавекам. Яны і паслужылі падставай для меркавання, што ў гэтым месцы знаходзіцца помнік каменнага веку. Відаць, у той далёкі час узровень вады ў Дняпры быў вельмі высокі, што прымусіла першабытнага чалавека сяліцца так далёка і на такой вышыні.

У 1987 г. археалагічны атрад Інстытута гісторыі АН БССР пачаў раскопкі помніка. Было ўскрыта 300 м^2, знойдзены першабытныя прылады працы. Залягалі яны на глыбіні да 0,4 м ад сучаснай паверхні, частка была вырана плугамі на паверхню. Прылады выраблялiся з крэйдавага крэменю. Усяго было знойдзена каля 3 тысяч вырабаў, сярод іх скрабкі, якімі здымалі рэшткі мяса са скур

жывёлы. Скуры затым выкарыстоўваліся для перакрыцця і ўцяплення будынападобных жытлаў, з іх выраблялі абутак і адзенне.

Сведчаннем апрацоўкі і вырабу прылад з косці з'яўляюцца разцы. На стаянцы былі знойдзены праколкі, скоблі, нажы, выраблены з пласцін і адшчэпаў. Аднак найбольшую цікавасць для археолагаў прадстаўляюць наканечнікі стрэл. Па іх можна меркаваць аб узросце стаянкі. На жаль, знойдзены толькі адзін наканечнік, выраблены з пласціны. Сыравінай для вырабу прылад працы служылі таксама дрэва і косць, але да нашага часу такія ўзоры не захаваліся. Асноўным заняткам старажытнага чалавека, мяркуючы па знаходках, былі паляванне на птушак і дзікіх жывёл, рыбалоўства.

У 1988 г. ў Оршы быў выяўлены яшчэ адзін помнік каменнага веку. Знайшоў яго школьнік Сяргей Кузняцоў. Знаходзіцца помнік таксама на беразе Дняпра, каля вады, на ўзроўні 8 м над ёй. Археолагі сумесна з вучнямі школы № 17 правялі даследаванне першабытнай стаянкі. Было ўскрыта 168 м^2 глебы на глыбіню каля 1 м. У раскопе знойдзена вялікая колькасць каменных прылад працы і адходаў іх вытворчасці — 1858 адзінак. Выраблялiся яны з вельмі якаснага крэйдавага крэменю чорнага або шэрага колеру. Сярод прылад нуклеусы, праколкі, скрабкі, наканечнік стралы, сякера. Разам з імі знойдзены рэшткі ляпной пасудзіны. Датуецца стаянка канцом неалітычнай эпохі, гэта значыць, канцом 3-га тысячагоддзя да н.э.

У.П.Ксяндзоў.

Археалагічныя помнікі Аршаншчыны жалезнага веку

Пачатак вывучэння помнікаў археалогіі Аршанскага Падняпроўя адносіцца да 19 ст. Частка з іх (гарадзішчы каля вёсак Кучына, Рагазіна і інш.) узгадваецца ўжо ў «Сведениях 1873 г. о городищах и курганах». Асабліва паспяховая праца па выяўленні помнікаў, якія ўтрымлівалі матэрыялы жалезнага веку і ранняга сярэдневякоўя, была праведзена ў 1920-я гг. беларускімі археолагамі А.М.Ляўданскім, С.А.Дубінскім, І.А.Сербавым. У 1928 г. С.А.Дубінскім праводзіліся раскопкі на гарадзішчы каля в. Чаркасава, атрыманыя матэрыялы былі апублікаваны. У паслявоенны перыяд звесткі, атрыманыя археолагамі ў 1920-х гг., былі праверaны і істотна дапоўнены Л.В.Аляксеевым. Сярод новых помнікаў, выяўленых даследчыкам, можна адзначыць гарадзішчы каля вёсак Вярхоўе і Баркі. Шэраг новых помнікаў быў адкрыты Л.Д.Побалем (гарадзішчы каля вёсак Барадзіно, Забалацце, доўгі курган каля в. Запруддзе і інш.), Л.А.Міхайлоўскім (гарадзішча каля в. Барэйшава), невялікія раскопкі на гарадзішчы каля в. Ляўкі праводзіліся Г.В.Штыхавым. Пачынаючы з 1987 г., вялікія археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Аршанскага раёна праводзіць В.М.Ляўко. Матэрыялы жалезнага веку і ранняга сярэдневякоўя былі выяўлены на гарадзішчах каля вёсак Чаркасава (1989 г., раскрытая плошча 60 м^2), Вусце (1990—91 гг., раскрытая плошча 166 м^2), курганная група № 2 на воз. Арэхаўскае (1990 г.). Значную працу па выяўленні новых помнікаў, складанні апісанняў і картаграфаванні праводзяць аршанскія краязнаўцы А.М.Шынкевіч, Э.Э.Навагонскі, Ю.А.Копцік.

На тэрыторыі Аршанскага раёна налічваецца больш за 30 археалагічных помнікаў (гарадзішчаў, селішчаў, курганных могільнікаў), якія ўтрымліваюць матэрыялы жалезнага веку і ранняга сярэдневякоўя.

У перыяд ранняга жалезнага веку тэрыторыя Аршанскага Падняпроўя з'яўлялася кантактнай зонай насельніцтва дзвюх роднасных усходнебалцкіх культур: штрыхаванай керамікі і днепрадзвінскай. Сюды ж з тэрыторыі Магілёўскага Падняпроўя траплялі і прадстаўнікі мілаградскай, а пазней і зарубінецкай культур. Насельніцтва культур штрыхаванай керамікі і днепрадзвінскай жыло невялікімі радавымі калектывамі, выбіраючы для паселішчаў (гарадзішчаў) узвышаныя ўчасткі па берагах рэк і азёр. Для таго, каб зрабіць уваход на пляцоўку гарадзішча цяжкадаступным, яго схілы, як правіла, эскарпіраваліся, а ўздоўж краю пляцоўкі будавалася драўляная агароджа. Жылыя пабудовы размяшчаліся на некаторай адлегласці ад агароджы, таксама ўздоўж краю пляцоўкі. На раннім этапе развіцця культур штрыхаванай керамікі і

днепрадзвінскай яны ўяўлялі сабой падоўжаныя наземныя дамы слупавой канструкцыі, падзеленыя ўнутранымі перагародкамі на невялікія памяшканні з адкрытымі агнішчамі, якія абкладваліся камянямі ў цэнтры. У канцы 1-га тысячагоддзя да н.э. доўгія дамы змяняюцца невялікімі прамавугольнымі ў плане пабудовамі, таксама слупавой канструкцыі. Унутраная будова жытлаў застаецца ранейшай. Захоўваецца таксама і прынцып кальцавой забудовы ўздоўж краю пляцоўкі гарадзішча. Такая планіроўка жылых пабудоў была выяўлена, у прыватнасці, на Чаркасаўскім гарадзішчы, пра што сведчыла вялікая коль-

касць слупавых ям і развалы каменных агнішчаў, якія канцэнтраваліся ўздоўж краю пляцоўкі. Цэнтральная частка паселішчаў, якая заставалася незаселенай, выкарыстоўвалася для грамадскіх патрэб, тут жа размяшчаліся і гаспадарчыя пабудовы. Культурны слой у цэнтральнай частцы паселішчаў, як правіла, нязначны па магутнасці і ўтрымлівае мала знаходак.

Найбольшую колькасць знаходак, выяўленых на паселішчах таго часу, складае кераміка. Керамічны комплекс штрыхаванай і днепрадзвінскай культур малапрадстаўнічы і абмяжоўваецца гаршкамі слоікавых і слабапрафіляваных форм. Для культуры штрыхаванай керамікі, апрача гэтага, характэрна наяўнасць гаршкоў так званай рабрыстай формы, якія маюць выразна бачны перагіб у выглядзе рабра ў месцы пераходa венчыка да тулава ў верхняй трэці вышыні. Арнаментацыя посуду нескладаная. Для керамікі днепрадзвінскай культуры характэрна наяўнасць ямкавых уціскання або навылётных адтулін пад венчыкам, ад якіх адходзяць прачэрчаныя вострай палачкай перакрыжаваныя лініі. Штрыхаваная кераміка, якая дала назву культуры, выдзяляецца па наяўнасці своеасаблівых слядоў, якія заставаліся на тулаве пасля загладжвання паверхні пасудзін пучком травы перад абпальваннем. Аб занятках насельніцтва жывёлагадоўляй і земляробствам сведчаць шматлікія знаходкі касцей буйных і дробных жывёл (коней, кароў, свіней і інш.), сельскагаспадарчыя прылады (сярпы, серпападобныя нажы, зерняцёркі). У цесце посуду знаходзяць сляды ячменю, проса, пшаніцы. Аб занятках насельніцтва ткацтвам сведчаць знаходкі прасліцаў бочачкападобных і акруглабокіх форм. Апрача жалезных прылад працы на паселішчах (асабліва тых, якія адносяцца да ранняга этапу) прысутнічаюць прылады працы і ўпрыгожанні з косці (праколкі, наканечнікі стрэл, амулеты з зубоў буйных жывёл), зрэдку сустракаюцца каменныя сякеры.

Пачынаючы з мяжы нашай эры — 1-га стагоддзя н.э. ў жыцці насельніцтва Верхняга Падняпроўя адбыліся змены, якія прывялі да поўнай змены аблічча матэрыяльнай культуры і, напэўна, этнічнага складу насельніцтва. Міграцыя насельніцтва позняга этапу зарубінецкай культуры з абласцей Сярэдняга і Верхняга Падняпроўя ахапіла вялікія тэрыторыі ад Падзесення і Северскага Данца на ўсходзе ад Паўднёвага Буга і Верхняга Паднястроўя на захадзе і да абласцей Верхняга Падзвіння на поўначы.

У 3—4 стагоддзях н.э. на паўночным усходзе Беларусі атрымліваюць распаўсюджанне паселішчы кіеўскай культуры (тыпу Абідні), якія завяршаюць працэс міграцыі з поўдня ўздоўж Дняпра і Друці, пачаты позназарубінецкімі плямёнамі.

Прышлае насельніцтва рассялялася на паселішчах, ужо занятых штрыхавікамі і днепрадзвінцамі (Чаркасава), і ўтварала самастойныя паселішчы (Вусце). У 3—4 ст. н.э. асноўным тыпам паселішчаў становяцца невялікія неўмацаваныя пасёлкі — селішчы, размешчаныя, як правіла, на першай або другой надпоймавай тэрасе па берагах рэк і азёр (селішчы каля вёсак Задроўе, Забалацце, каля г. Барань). Гэта паселішчы позняга этапу зарубінецкай і кіеўскай культур, якія аб'ядноўваюць некалькі патрыярхальных сем'яў. Апошнія, у сваю чаргу, складаліся з невялікіх сем'яў, якія ўключалі бліжэйшых сваякоў. Пры раскопках гарадзішча каля в. Вусце быў выяўлены жыллёва-гаспадарчы комплекс, што складаецца з трох жылых пабудоў і размешчаных побач з імі гаспадарчых ям і агнішчаў. Жытло № 1 слупавой канструкцыі размяшчалася на паўднёвым участку гарадзішча. Да яго паўночнай сценкі прымыкалі дзве жылыя пабудовы зрубна-слупавой канструкцыі. Усе тры пабудовы з'яўляліся наземнымі прамавугольнымі ў плане збудаваннямі, арыентаванымі па кірунках свету. Памеры пабудоў 3—3,6 × 3,8—4 м. У цэнтры жытла размяшчаліся каменныя агнішчы, збудаваныя ў ямах. Такія ж агнішчы размяшчаліся за 0,5 м на поўнач ад жытлаў № 2, 1, 3. З усходу і захаду да жытлаў прымыкалі гаспадарчыя ямы. Аналагічным чынам, як відаць, размяшчаліся пабудовы на паўночным участку гарадзішча. Тут сляды пабудоў удалося прасачыць па рэштках агнішчаў аналагічнай вышэйапісанай канструкцыі. Такім чынам, наяўнасць жыллёва-гаспадарчых комплексаў на паўночным і паўднёвым участках гарадзішча дазваляе меркаваць, што пасёлак належыў абшчыне, што складалася з дзвюх ці болей патрыярхальных сем'яў, якія вялі самастойную гаспадарку.

З прыходам новага насельніцтва з паўднёвых абласцей Верхняга Падняпроўя ў 1-й

Гарадзішча Чаркасава. Агульны выгляд.

чвэрці 1-га тысячагоддзя атрымліваюць распаўсюджанне новыя формы посуду. З'явіліся моцнапрафіляваныя гаршкі зарубінецкага выгляду, арнаментаваныя зашчыпамі і пазногцевымі ўцісканнямі па краі венчыка міскі. Частка керамікі гэтых форм першапачаткова мела штрыхаваную паверхню. Распаўсюджанне новых форм посуду ў асяроддзі мясцовага насельніцтва днепрадзвінцаў і штрыхавікоў насіла паступовы характар, як відаць, адлюстроўваючы працэс інфільтрацыі, а затым і асіміляцыі апошніх прышлымі прадстаўнікамі паўднёвых славянскіх культур. У ніжніх напластаваннях культурнага слоя Чаркасаўскага гарадзішча (мяжа нашай эры — 1-е ст. нашай эры) прафіляваныя формы керамікі позназарубінецкага выгляду суседнічаюць з формамі, тыповымі для культуры штрыхаванай керамікі. У керамічным комплексе гарадзішча Вусце (1—2-е ст. н.э.) уплыў апошніх прасочваецца толькі па наяўнасці штрыхоўкі на некаторай частцы посуду позназарубінецкай прафіліроўкі. У 3—4 ст. н.э. з прыходам у Аршанскае Падняпроўе носьбітаў кіеўскай культуры (тыпу Абідні) атрымлівае распаўсюджанне арнаментацыя ў выглядзе расчосаў, якія наносіліся на тулава пасудзін пры дапамозе грабянца ці завостранай палачкі. Вядучымі формамі посуду становяцца гаршкі акруглабокіх, цюльпанападобных і рабрыстых абрысаў, патэльні. Формы посуду, характэрныя для культур штрыхаванай керамікі і днепрадзвінскай, у керамічных комплексах паселішчаў гэтага часу не выяўлены.

Сярод прылад працы, распаўсюджаных у 1-й чвэрці 1-га тысячагоддзя н. э. трэба адзначыць нажы з гарбатай спінкай, крыху пазней з'яўляюцца сярпы з кручком, вядомыя знаходкі вузкалязовай правушнай жалезнай сякеры і жалезнай матыкі (Вусце). Да ліку масавых знаходак, выяўленых на паселішчах, адносяцца біканічныя прасліцы з шырокай адтулінай.

Археалагічныя помнікі Аршаншчыны 5—7 ст. прадстаўлены гарадзішчамі, селішчамі, курганнымі могільнікамі. Пачатак 3-й чвэрці 1-га тысячагоддзя н. э. адзначаны нарастаннем міжабшчынных супярэчнасцей. У гэты час зноў адраджаюцца гарадзішчы, якія пачынаюць выконваць новыя функцыі — гарадзішчаў-сховішчаў, дзе хавалася насельніцтва з бліжэйшых адкрытых паселішчаў у час ваеннай небяспекі. Як паказалі матэрыялы раскопак на Чаркасаўскім гарадзішчы, у гэты час будуецца магутная сістэма ўмацаванняў: на месцы першапачатковай драўлянай агароджы насыпаецца вал, які мае складаную ўнутраную драўляную канструкцыю. Зверху насыпу вала ўстанаўліваецца драўляная агароджа. Яшчэ адзін вал вышынёй да 2 м будуецца з поўначы з боку поля, побач з ім прасочваюцца сляды заплыўшага рова. Падобная структура ўмацаванняў назіраецца і на шэрагу іншых помнікаў Аршаншчыны: гарадзішчах каля вёсак Забалацце, Горная Веравойша, Барадзіно, Вялікае Бабіна і інш. Разам з тым, у гэты ж час працягваюць функцыяніраваць і сельскія паселішчы адкрытага тыпу, якія ўзнікаюць у 2-й чвэрці 1-га тысячагоддзя н.э. (Задроўе, Барань), прычым плошча іх значна павялічваецца. Апошняе можа сведчыць аб пэўнай культурнай пераемнасці і складанні адносна стабільнай структуры засялення тэрыторыі рэгіёна. Культурная пераемнасць прасочваецца і ў абліччы матэрыяльнай культуры. У керамічным комплексе гарадзішча Чаркасава (сярэдні гарызонт культурнага слоя) прысутнічаюць формы посуду (рабрыстыя, акруглабокія, цюльпанападобныя), якія развіліся з форм посуду кіеўскай культуры. Тыпалагічна матэрыялы гарадзішча Чаркасава аналагічныя матэрыялам гарадзішчаў Кісялі (Талачынскі раён), Нікадзімава (Горацкі раён). З гэтых помнікаў паходзяць знаходкі бронзавых масіўных бранзалетаў з патоўшчанымі канцамі, пальчатых фібул, спражак і да т.п., якія маюць прамыя аналогіі ў старажытнасцях калочынскай культуры Беларусі і Украіны.

З помнікамі калочынскай культуры на тэрыторыі Аршанскага Падняпроўя суседнічалі помнікі банцараўска-тушамлінскай культуры, распаўсюджаныя ў 5—7 ст. н.э. на тэрыторыі сярэдняй і паўночнай Беларусі, у Смаленскім Падняпроўі. Да ліку помнікаў банцараўскай



Знаходкі з курганоў (могільнік № 5) каля г.п. Арэхаўск (воз. Перавалочна).

Той же зимы князь Светислав Смоленский совет сотвори со князем Андреям Полоцким: он в Литву, а князь Светислав ко Орши, на миру много зла сотвориша християнам, нечеловеческы и нехристиянскы и мучиша християн, иже ни в поганых ратех то не слышах таковых мук. Мучаще християн сбираху и запираху во избах и зажигаху. А другии велики храмы очень подимаху и пленников под стены кладаху главами и зажигаху. А иные жёны и дети на коле тыкаху. А иныи мук над християны их же скаредно не писахом, яко же ни Онтиох Сирскый, ни Ульян Законопреступник тех мук не сотвори над християны. Граду же Орши ничего не вспеша и паки возвратися восвояси.

Друкуецца па кн.: Беларускія летапісы і хронікі. Мн., 1997. С. 55.

Вучоныя мяркуюць

З артыкула Дз.І.Даўгялы «Орша (1250—1683 гг.)»

Какому князю принадлежала Орша, чьим пригородом была она после Мономаха до конца 13 века, когда мы ее находим, уже под властью Литвы — это один из тех темных вопросов нашей местной истории, над которыми нужно много еще поработать; всякое новое основание для суждения об этом древнем времени заслуживает особой цены. Поэтому мы решаемся высказать свои соображения.

Мы полагаем, что отошедшая от Полоцкой земли Орша стала пригородом города Турова. По крайней мере, необходимо принять за исторически несомненный факт, что в 13 веке Орша находилась под владением туровского князя. Так следует полагать на основании вновь открытого нами документа, который приведен ниже. Здесь сказано, что в г. Орше построена церковь во имя св. пр. Ильи княжною Софьей, женою князя Дмитрия Юрьевича. С этим именем известен только один князь — туровопинский (около 1292 г.), при котором литовцы окончательно отняли это княжество у потомков Рюрика. Отсюда с большой вероятностью можно заключить, что и город Орша был во власти туровопинских князей.

Могилевские губернские ведомости. 1900. Вып. 1.

Аршанскае Евангелле

Вельмі многія помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў загінулі ў часы ваенных ліхалецця. Яны страчаны назаўсёды. Не менш, а, па ацэнках некаторых навукоўцаў, нават больш рукапісаў, кніг, карцін апынуліся ў выніку розных абставін за межамі Беларусі, аселі ў буйных музеях, бібліятэках, сховішчах шэрагу заходнееўрапейскіх краін і блізкага замежжа. Такі ж горкі лёс напаткаў і каштоўны помнік сярэдневякоўя, які ведае ўвесь адукаваны свет, — Аршанскае евангелле.

Жудаснае відовішча адкрылася рускім воінам, якія вызвалілі Оршу ад напалеонаўскай арміі ў лістападзе 1812 г. Толькі папялішчы хат ды абвугленыя дрэвы нагадвалі гарадскія вуліцы і завулкі. Не пашкадавалі захопнікі і культавыя ўстановы. Яны абрабавалі ўсе аршанскія цэрквы і касцёлы. З храмаў Куцеінскага манастыра былі выкінуты шматлікія культавыя рэчы, паламаны іканастасы. Іконамі з абадранымі аправамі быў запоўнены ўвесь манастырскі двор. У лужах валяліся кнігі з пачарнелымі ад часу драўлянымі і скуранымі вокладкамі. Сярод іх было і Аршанскае евангелле. А праз 62 гады яго, прайшоўшага, відавочна, не праз адны рукі, памешчык І.Мельяноўскі перадаў музею Кіеўскага царкоўна-археалагічнага таварыства.

Ні адзін сур'ёзны гісторык рукапіснай усходнеславянскай кнігі не абмінуў у сваіх даследаваннях гэты помнік, які сінтэзаваў усе вядомыя ў час яго стварэння мастацкія каштоўнасці. Адносна часу яго напісання ўсе даследчыкі сышліся на адным: 2-я палавіна 13 ст. Аднак аб месцы напісання спрэчкі не сціхаюць па сённяшні дзень. Так, вядомы даследчык старажытнай славянскай рукапіснай кнігі мінулага стагоддзя Т.Крыжаноўскі лічыў, што помнік створаны на поўдні. Яго сучаснік, не менш вядомы даследчык кнігі Ф.Цітоў аднёс рукапіс да ліку беларускіх. Думку апошняга падзяляюць украінскія гісторыкі савецкага часу, якія знаходзяць у тэксце «заходнерускія» моўныя асаблівасці. Катэгарычны адносна беларускага паходжання

Аршанскае евангелле. Ініцыялы.

евангелля мастацтвазнавец В.Шматаў. Ён сцвярджае, што кніга створана на Полаччыне.

Аршанскае евангелле мае 142 лісты пергаменту, кожны памерам 26,4 на 19,4 см. Пачатак і канец кнігі страчаны. На думку даследчыкаў, не хапае 35 лістоў.

Рукапіс меў вокладку, зробленую з дубовых дошак. Захавалася толькі задняя дошка, і то занадта пашкоджаная. Магчыма, Аршанскае евангелле мела каштоўную аправу. На задняй дошцы пераплёта надпіс: «В сей пергаментной рукописи 142 пронумерованных листа. Нумерация — внизу листов. Секретарь церковно-археологического общества Н.Петров. 1 декабря 1874 года».

Аршанскае евангелле напісана старажытным уставам. Даследчыкі адзначаюць упэўнены і бездакорны каліграфічны почырк перапісчыка. Разам з тым ён не механічна перапісваў тэкст, а рабіў уласныя папраўкі, калі, на яго погляд, у арыгінале сустракаліся памылкі.

Кніга афармлена з вялікім мастацкім густам. У дайшоўшым да нашага часу тэксце налічваецца 310 ініцыялаў, 2 застаўкі і 2 мініяцюры евангелістаў Лукі і Мацвея. Выявы Івана і Марка былі, відаць, на тых лістах, якія страчаны. Як лічаць даследчыкі, ініцыялы выкананы самім перапісчыкам, а гэта вельмі рэдкі выпадак у гісторыі рукапіснай кнігі. Звычайна рукапісная кніга — вынік калектыўнай працы. Над ёй, як правіла, працавалі не менш трох чалавек. Спачатку перапісчык рабіў тэкст, пакідаючы месца для ініцыялаў, застовак і мініяцюр. Затым за справу браўся мастак. Апошняя аперацыя ў стварэнні рукапіснай кнігі выконвалася майстрам-пераплётчыкам. Кожны з 310 ініцыялаў Аршанскага евангелля — гэта невялічкі мастацкі цуд. Выкананыя цёмна-чырвонымі фарбамі і дапоўненыя штрыхоўкай бледна-сіняга колеру, яны выклікаюць у чытача мануметальна-ўрачыстае ўспрыняцце тэксту. У кампазіцыі ініцыялаў і застовак дамініруе візантыйскі стыль з матывамі ўмоўных раслін, дробных паўкарункаў, рысачак, раменных перапляценняў. Шмат ініцыялаў выканана ў выглядзе чалавечага твару, птушак, вужак. Так, на лісце 43 літара «Р» нагадвае галаву чалавека ў профіль у спалучэнні з раслінными завіткамі. На лісце 56 добра праглядваецца выява ваяра з дроцікам. Вяршыняй мастацкага афармлення Аршанскага евангелля з'яўляюцца мініяцюры евангелістаў Лукі (ліст 42) і Мацвея (ліст 124), зробленыя чырвонымі, мякка-зялёнымі і жоўтымі фарбамі з вялікай колькасцю золата. На жаль, захаваліся яны дрэнна. Відавочна, пэўны час мініяцюры знаходзіліся ў менш спрыяльных умовах, чым рукапіс. Добра відаць, што яны былі выразаны з тэксту, а пазней устаўлены зноў. Выявы евангелістаў з аршанскага рукапісу даюць падставу сцвярджаць, што мастак быў добрым партрэтыстам, які здолеў стварыць далёка не кананізаваныя вобразы святых.

Дакладна адказаць на пытанне, калі згаданае евангелле трапіла ў Оршу, бадай, немагчыма. Але відавочна, што куцеінскія першадрукары, якія пачалі сваю справу ў 1-й палавіне 17 ст., ужо былі знаёмы з гэтым рукапісным творам. Больш таго, у графічным афармленні сваіх кніг яны арыентаваліся на мініяцюры рукапісу, пераймалі прыёмы старажытнага кніжнага мастацтва.

Унікальны помнік духоўнай культуры беларускага народа Аршанскае евангелле (так, дарэчы, названае па месцы адкрыцця) захоўваецца сёння за межамі рэспублікі, у бібліятэцы Акадэміі навук Украіны. Здаецца, што было б больш справядліва, калі б ён зноў стаў уласнасцю калі не горада, назву якога носіць, то хоць бы дзяржавы, дзе знаходзіцца гэты горад. Кожнага сумленнага беларуса не павінна пакідаць надзея на вяртанне Аршанскага евангелля на Радзіму. *І.А.Яршоў.*

«...а цар яго жыве ў Артыі»

Чым старажытней тое ці іншае паселішча, тым цяжэй дакладна высветліць час яго заснавання. Археолагі, як правіла, вызначаюць гэту дату даволі прыблізна, наколькі дазваляюць іх метады. Дастаткова рэдкія выпадкі, калі даследчыкам трапляюцца дакументы, дзе дакладна называецца гэта дата (і тое, што датычыцца паселішчаў, якія заснаваны не раней 14 ст.). Прыняты сёння за аснову метад вызначэння ўзросту горада па яго першаму

ўпамінанню ў летапісных крыніцах, на погляд многіх даследчыкаў, вельмі недасканалы. Па-першае, далёка не ўсе старажытныя летапісы да нас дайшлі (верагодней за ўсё, што якраз большая іх частка ці загінула ў полымі шматлікіх войнаў, ці, можа быць і такое, яшчэ не знойдзена). Па-другое, няма ніякай гарантыі, што ўпамінанне таго ці іншага горада ў вядомым нам летапісе з'яўляецца менавіта першым. Па-трэцяе, «першае ўпамінанне» далёка не заўсёды тычыцца заснавання горада, як гэта было ў выпадках з Віцебскам, ці Барысавам, а часцей за ўсё якой-небудзь, падкрэслім, важнай падзеі, што звязана з горадам (прыклады — Полацк, Мінск, тая ж Орша) і можа быць аддалена ад даты яго заснавання на невядомы тэрмін.

Звернемся да прыкладаў, якія пацвярджаюць гэту выснову...

Не так даўно сусветная супольнасць, згодна з рашэннем ЮНЕСКО, шырока адзначыла 1500-годдзе Кіева. А між тым, у рускіх летапісах ён вядомы толькі з 862 г. Перасунуць дату заснавання горада больш чым на тры стагоддзі назад дазволілі, па-першае, шматгадовыя археалагічныя раскопкі, што вяліся ў горадзе, і, па-другое, думаецца, адсутнасць у украінскіх даследчыкаў залішняй сціпласці. Яны мелі смеласць навукова пацвердзіць верагоднасць легенды аб заснаванні Кіева братамі Кіем, Шчэкам і Харывам і перанеслі «дзень нараджэння» ўкраінскай сталіцы з 9 у 6 ст.

Як вядома, у «Аповесці мінулых гадоў» наш Полацк згадваецца таксама пад 862 годам — у сувязі з захопам яго Аскольдам і Дзірам. Згодна гэтай крыніцы, у сёлетнім годзе гэты, як лічыцца, самы старажытны горад Беларусі будзе адзначаць сваё 1135-цігоддзе. Але даследчыкам вядома Ісландская «Сага аб Дзітрыку Бернскім», каралі остготаў, які жыў у 493—526 гг. У гэтым творы згадваецца полацкі князь Уладзімір, які абараняў Полацк ад войска саюзніка правадыра гунаў Атылы, конунга готаў Тэадорыка (Дзітрыка). Гэта здагадка перасоўвае магчымую дату заснавання Полацка на мяжу 5—6 стст. і робіць яго, па меншай меры, равеснікам Кіева.

Але пойдзем далей... Да апошняга часу ў айчыннай гістарыяграфіі ўпарта замоўчвалася так званая «Вялесава кніга», якую аднадушна абвясцілі фальсіфікацыяй. Кнігу гэту напісалі на драўляных брусочках язычніцкія жрацы ў Ноўгарадзе ў 9 ст. Яе выратаваў ад знішчэння ў часы грамадзянскай вайны белагвардзейскі палкоўнік Ізенбек і вывез за мяжу. Вось што пісалася ў «Вялесавай кнізе» пра рассяленне славян: «За 1500 год да Дзіра (9 ст. — А.С.) прадзеды нашы дайшлі да Карпацкай гары і там яны аселі... І так жылі 500 год, а потым пайшлі на ўсход сонца, і ішлі да Непры (Дняпра — А.С.)... І там мы пасяліліся (за 1000 гадоў да Дзіра, значыць, на мяжы 1-га ст. да н.э. і 1-га ст. н.э., а не ў 6 ст., як вынікае з версіі, што пануе сёння. — А.С.)».

Аналізуючы «Вялесаву кнігу», некаторыя даследчыкі прыходзяць да высновы, што той жа Полацк узнік ужо ў 1 ст. н.э. як племянны цэнтр крывічоў.

Пакуль што гэты погляд не з'яўляецца пераважаючым сярод гісторыкаў. Але гэта зусім не азначае, што ён памылковы і не мае права на жыццё. Магчыма, беларускім даследчыкам проста не хапае смеласці, якой у свой час хапіла іх украінскім калегам...

Полацк — не адзіны беларускі горад, наконт даты заснавання якога можна спрачацца. Возьмем, напрыклад, Слонім. Афіцыйнай датай «нараджэння» гэтага горада лічыцца 1242 г., калі ён упершыню згадваецца ў Іпацьеўскім летапісе. Але ці адпавядае гэта рэчаіснасці? Паводле другіх гістарычных крыніц, каля Слоніма адбылася бітва войска кіеўскіх князёў з моцнай літоўскай заслонай, пасля чаго былі надоўга, да сярэдзіны 13 ст., спынены паходы паўднёва-рускіх дружын на беларускія землі. Цікава, што падзея гэта адбылася ў 1103 г.

Далей — больш... Працуючы над старымі хронікамі, у прыватнасці, над летапісамі храністаў 15 ст., некаторыя даследчыкі (М.Балінскі, Т.Ліпінскі, Бр.Александровіч) звярнулі ўвагу на такі гістарычны факт: кіеўскі князь Яраслаў Уладзіміравіч, «спаткаўшыся на палях слонімскіх з літвінамі, перамог іх так, што затым, пераехаўшы ўласна Літву да самага Нёмана, прымусіў яе да падпарадкавання на час...».

Заўважым, што гэта ўзброенае спатканне «на палях слонімскіх» адбылося ў 1040 г. Такім чынам, Слонім, атрымліваецца, старэйшы за свой «афіцыйны» ўзрост мінімум на два стагоддзі.

Дарэчы, існаванне гэтага горада ўжо ў 11 ст. пацвярджаюць і археалагічныя раскопкі.

Ці яшчэ прыклад... У гэтым годзе збіраецца адзначыць адметны юбілей Пінск. З «Аповесці мінулых гадоў» вядома, што ў 1097 г. уладзімірскі (на Валыні) князь Давыд Ігаравіч папярэдзваў кіеўскага князя пра захоп яго тураўскіх уладанняў: «Пабачыш, зойме гарады твае Тураў і Пінск і другія, тады памянеш мяне». Такім чынам, грунтуючыся на згаданым вышэй летапісе, пінчукі збіраюцца шырока адзначыць 900-годдзе свайго горада. І мала хто звяртае ўвагу на пярэчанні мясцовага краязнаўца Ігара Раманчука, які ў другіх летапісных крыніцах знайшоў сведчанні, што Пінск ужо існаваў больш чым на стагоддзе раней.

На карысць гэтай версіі сведчаць і апошнія даследаванні археолага Алега Іова, які выказвае меркаванне аб магчымасці існавання папярэдніка Пінска на гарадзішчы 8—10 ст., што знаходзіцца ў 12 км ад сучаснага горада.

Ці возьмем Навагрудак... У тым жа Іпацьеўскім летапісе ён упершыню згадваецца пад 1252 годам у сувязі з паходам галіцка-валынскіх князёў Данілы і Васілька Раманавічаў у панёманскія землі. Але ж ёсць летапісныя згадкі, звязаныя з Наваградкам, пазначаныя 1235, 1119, 1116 і нават 1044 годам, калі горад, як лічыцца, заснаваў кіеўскі князь Яраслаў Мудры.

Але настаў, нарэшце, час, прааналізаваўшы згаданыя вышэй аналогіі, звярнуцца да Оршы...

Адразу папярэдзім: нічога не збіраемся адназначна сцвярджаць, а ўзгадаем сабраныя па розных крыніцах звесткі і факты, якія могуць прывесці да высновы, што і Орша, магчыма, старэйшая, чым гэта прынята сёння лічыць...

Як вядома з археалагічных даследаванняў, у 11—8 тысячагоддзях да н.э. на тэрыторыі сучаснай Аршаншчыны жылі плямёна грэнскай культуры (культура гэта атрымала назву ад стаянкі старажытнага чалавека Грэнск, якую археолагі выявілі паблізу в. Ворнаўка Кармянскага раёна). Плямёны гэтыя засялілі Аршаншчыну, прасоўваючыся на поўнач услед за адступаючым пад націскам пацяплення ледавіком.

У 1984 г. археолаг Уладзімір Ксяндзоў выявіў, а ў 1987—1988 гг. даследаваў найбольш старажытную на Аршаншчыне стаянку чалавека каменнага веку (грэнскай культуры). Яна знаходзілася за 500 м на захад ад в. Берасценава. Яшчэ раней, у 1978 г., той жа Ксяндзоў выявіў аналагічную стаянку за 500 м на поўдзень ад Оршы, на правым беразе Дняпра. Стаянкі гэтыя датуюцца 9—8 тысячагоддзямі да н.э.

Ён жа ў 1980 г. знайшоў на ўскраіне Оршы, на левым беразе Дняпра, стаянку чалавека верхнедняпроўскай археалагічнай культуры, датаваную 5 — пачаткам 2-га тысячагоддзя да н.э.

На думку археолага А.Ляўданскага, у канцы 3 — пачатку 2-га тысячагоддзя да н.э. на тэрыторыі Аршанскага гарадзішча існавала стаянка чалавека эпохі бронзы.

Цікавым з'яўляецца меркаванне гомельскага даследчыка А.Рогалева, які лічыць, што прыкладна ў гэты ж час паўночны ўсход Беларусі, у тым ліку і Аршаншчыну, насялялі плямёны угра-фінаў. Вельмі верагодна, што тапонім «Орша» — фіна-угорскага паходжання і абазначае «праточная вада, рака, або вада, якая цячэ ў рэчышчы». Так лічыць і аршанскі краязнавец Э.Э.Навагонскі, які знайшоў у Марый Эл (былая Марыйская АССР) сем населеных пунктаў і адну раку з назвай «Орша». Наогул, у марыйскай мове, якая адносіцца да фіна-угорскіх моў, — «ор»— гэта рэчышча, а «ша» — рачны суфікс, які азначае ваду.

Ёсць меркаванне, якое, хутчэй, носіць легендарны, чым навуковы характар, што Оршу заснавалі... скіфы, чые сляды археолагі іншым разам знаходзяць на поўдні Беларусі, у тым ліку ў Падняпроўі. У «Жывапіснай Расіі», 12 тамоў якой выйшлі ў свет у 1881—1901 гг. пад рэдакцыяй знакамітага вучонага П.Сямёнава-Цяньшаньскага, так апісваецца герб Оршы, нададзены ёй у 1781 г.: «...у блакітным полі пяць стрэл, таму што горад пабудаваны яшчэ старажытнымі скіфамі, якія такой зброяй пахвальна валодалі...»

Наўрад ці скіфскі след у гісторыі Оршы можна абмяркоўваць усур'ёз, хаця некаторыя даследчыкі лічаць ранніх славян, у першую чаргу ўсходніх, спадкаемцамі скіфаў. Давайце лепш перанясемся ў 6 ст., калі ўжо існаваў Кіеў і, як ужо было адзначана, вельмі верагодна, быў Полацк...

У 1873 г. на паўночна-ўсходняй ускраіне в. Чаркасава (15 км на паўночны ўсход ад Оршы), на левым беразе ракі Пачаніца, ва ўрочышчы з сімвалічнай назвай Замчышча

(ці Гарадок) было знойдзена старажытнае гарадзішча, якое пазней было дэталёва абследавана (у 1928 г. — С.Дубінскім, у 1971 г. — Л.Побалем і ў 1989 г. — В.Ляўко). Гарадзішча мела магутны культурны пласт больш за 3 м і датавалася 6—8 ст.

У Чаркасава мы яшчэ вернемся, а пакуль адзначым два факты: адзін — малавядомы, а другі — вядомы дастаткова. У 6—9 ст. па тэрыторыі крывічоў і радзімічаў (па Заходняй Дзвіне і Дняпры) праходзіў так званы «Austrvegr» — «усходняя дарога», або «еруслімскі шлях», па якім паломнікі са Скандынавіі і Англіі падарожнічалі ў Святую зямлю. Паломніцкія «дэлегацыі» часам налічвалі па некалькі тысяч чалавек. Цэлых пяць стагоддзяў да хрышчэння нашых продкаў пілігрымы бесперапынна рухаліся па мясцінах, дзе сёння стаяць Полацк, Віцебск, Орша, Магілёў, Рагачоў. Вядомы факт, што ў 1103 г. па «ўсходняй дарозе» ішлі на поўдзень крыжакі на чале з дацкім каралём Эрыхам Добрым.

Недзе ў прамежку паміж 800 і 830 гадамі пачаў актыўна дзейнічаць Вялікі водны шлях з «варагаў у грэкі», які праходзіў па ўжо згаданым вышэй маршруце. У рэгіёне паміж Віцебскам і Оршай у той час існавалі волакі, якія злучалі Заходнюю Дзвіну і Дняпро. Вядома, што ў свой час вышэй Оршы, па Дняпры, у бок Гнёздава цягнуліся на ўсход парогі. Такія ж парогі ішлі па Заходняй Дзвіне, на ўсход ад Віцебска. Такім чынам, Віцебск і Орша кантралявалі абодва канцы (дзвінскі і дняпроўскі) найбольш зручнага волака, які з Заходняй Дзвіны — праз Лучосу і Аршыцу — вёў у Дняпро. Пра актыўную дзейнасць шляху з «варагаў у грэкі» ў ваколіцах Оршы сведчыць, напрыклад, арабскі манетны скарб 8 ст., знойдзены паблізу в. Засценкі, і назва возера Пярэвалачна ў басейне Аршыцы.

Прыведзеныя вышэй факты даюць падставы сцвярджаць, што ўжо з 6 ст. мясцовасць, дзе сёння знаходзіцца Орша, была даволі бойкім рэгіёнам, дзе, вядома ж, існавалі буйныя паселішчы.

Упамінанне аб існаванні Оршы ўжо ў сярэдзіне 9 ст. сустракаецца ва Усевалада Ігнатоўскага, які пісаў у «Кароткім нарысе гісторыі Беларусі», што «яшчэ да закліканьня вядомых нам князёў-ворагаў (862) пачалі тут складацца воласьці-княствы». Сярод згаданых у летапісе валасцей Ігнатоўскі назваў і Аршанскую. На жаль, невядома, які летапіс меў на ўвазе слынны вучоны, але, па Ігнатоўскаму, ужо ў сярэдзіне 9 ст. Орша існавала і была цэнтрам удзельнага княства.

Яшчэ да Ігнатоўскага, у 1910 г., гэты ж гістарычны момант разглядаў у «Кароткай гісторыі Беларусі» Вацлаў Ластоўскі, які сцвярджаў, што Аршанскае княства згадвалася, сярод іншых, ужо ў 10 ст.

У 1021 г. кіеўскі князь Яраслаў Мудры ўступіў полацкаму князю Брачыславу Ізяслававічу Віцебск і Усвяты. Якое дачыненне мае гэта падзея да аршанскай мінуўшчыны? Некаторыя даследчыкі, напрыклад, лічаць, што менавіта ў гэты час Брачыслаў мог заснаваць Оршу як адзін з памежных фарпостаў на ўсходзе Полацкага княства. М.Ермаловіч звязвае пачатак гісторыі Оршы з 1060 г., калі, як ён лічыць, полацкі князь Усяслаў Брачыславіч (Чарадзей) прыняў удзел у паходзе кіеўскіх князёў на торкаў — угорскае качавое племя, за што князі, магчыма, перадалі ў яго валоданне Оршу і Копысь.

І вось, нарэшце, 10 ліпеня 1067 г. «Аповесць мінулых гадоў» так апісвае падзеі гэтага дня: «...месяца ліпеня ў 10 дзень, Ізяслаў, Святаслаў і Усевалад (сыны Яраслава Мудрага — А.С.), цалаваўшы крыж святы да Усяслава, гаварылі яму: «прыдзі да нас, і не творым табе зла». Ён жа, спадзеючыся на цалаванне крыжа, пераехаў у ладдзі Дняпро. Да Ізяслава ў шацёр прыйшоў, і там схапілі Усяслава на Ршы каля Смаленска, перастуліўшы крыж. Ізяслаў жа прывёў Усяслава ў Кіеў, пасадзіў у поруб з двума сынамі...»

Летапісец даволі прыблізна вызначыў месца, дзе Усяслаў з сынамі быў узяты ў палон. Як вядома, ад сучаснай Оршы да Смаленска прыблізна 110 км. Напрыклад, аўтар знакамітай «Гісторыі дзяржавы Расійскай» М.Карамзін лічыў, што ў летапісе ідзе гаворка аб больш блізкай да Смаленска мясцовасці, якая мае назву Аршанскі Ям і знаходзіцца каля Краснага.

Вядомы расійскі гісторык В.Таціщчаў, у сваю чаргу, пісаў, што Усяслаў «прыехаў лодкаю па Дняпры да Оршы, дзе Яраславічы стаялі». На думку ж расійскага вучонага І.Барсава, Усяслаў каля вусця Аршыцы, дзе знаходзіўся дзядзінец Оршы, пераправіўся на левы бераг Дняпра, да стану Яраславічаў, і тут быў схоплены іх дружыннікамі.

Нечаканым з'яўляецца меркаванне сучаснага даследчыка А.Мяцельскага, які лічыць, што ў 1067 г. горада Оршы наогул... не было: на яго месцы знаходзілася невялікае неўмацаванае паселішча, якое, толькі ў 12 ст. пачало пераўтварацца ў горад.

Тут трэба зазначыць, што археалагічныя раскопкі Аршанскага гарадзішча, праведзеныя ў 1928 г. А.Ляўданскім, у 1964 г. — Г.Штыхавым, у 1965—68 гг. — Ю.Драгуном і ў 1987—89 гг. — В.Ляўко, сведчаць: тут з 12 ст. існавала паселішча. Але, напрыклад, той жа Штыхаў лічыць, што яно і сапраўды было невялікім.

А як жа тады сведчанні Ігнатоўскага і Ластоўскага аб Оршы, якая ў 9—10 ст. была цэнтрам княства?

Давайце паразважаем на гэты конт. А пачнем з равесніка Оршы — Менска, які згадваецца ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 3 сакавіка 1067 года, калі адбылася знакамітая бітва на Нямізе, пасля якой Усяслаў якраз і накіраваўся пад Оршу, на сустрэчу з Яраславічамі.

Па версіі Э.Загарульскага, Мінск узнік у 11 ст. ў сутоцы Нямігі і Свіслачы. Але ёсць і другое, менш вядомае меркаванне, якое належыць беларускаму гісторыку А.Ясінскаму і падтрымліваецца Г.Штыхавым і маскоўскім археолагам Л.Аляксеевым. Ясінскі лічыць, што Мінск быў перанесены з гарадзішча на рацэ Менка, што знаходзіцца ў 16 км на паўднёвы захад ад Менскага замчышча, пасля таго, як у 1084 г. Уладзімір Манамах разбурыў горад, той, што знаходзіўся не на Нямізе, а на Менцы. Такім чынам, сучасная сталіца Беларусі — як бы працяг даўнейшага Мінска.

А пры чым тут Орша — спытаеце вы... Вельмі нават пры тым, калі ўспомніць ужо згаданае гарадзішча 6—8 ст. у Чаркасаве, а яшчэ — звярнуцца да арабскай геаграфічнай літаратуры. Каля 920 г. арабскі вучоны Аль-Істархі, спасылаючыся на не дайшоўшыя да нас крыніцы 8—9 ст., называў 3 раннефеадальныя цэнтры старажытнай Русі 8—9 ст. — Куявію (Кіеўскую зямлю), Славію (наўгародскіх, ці ільменскіх славян) і, нарэшце, Артанію, або Арсанію ці Арту. Вось што пісаў Аль-Істархі: «...Яшчэ племя завецца Артаніяй, а цар яго жыве ў Артыі». З гэтай самай Артаніі людзі «спускаюцца па вадзе» (верагодна, па Дняпры) у Куяву (Кіеў). Патрапіць у Артанію вельмі цяжка, бо тутэйшыя насельнікі забіваюць іншаземцаў.

Дзе ж знаходзілася легендарная Артанія — Арсанія? Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што ў міжрэччы Заходняй Дзвіны і Дняпра, паміж Славіяй і Куявіяй, і атаясамліваюць яе з Полацкай зямлёй. Паводле апісанняў арабскіх географаў, цэнтр Арсаніі — Арта, ці Арса, — знаходзіўся недзе ў басейне Дняпра. Арабскія і персідскія аўтары па-рознаму перадаюць назву гэтага горада: першыя — як «Ар-са», другія — як «У-ртаб». «Арса» — «Орша» — сугучча вельмі паказальнае, якое наводзіць на пэўныя развагі. А ці не Орша была той самай легендарнай Арсай 8—9 ст.?

Сучасная Орша, размешчаная пры зліцці Аршыцы з Дняпром, відаць, не была, аб чым сведчаць археалагічныя раскопкі. Але ў 11 ст. (успомнім Менск) на гэта месца мог быць перанесены на дняпроўскі бераг другі горад, што да гэтага знаходзіўся ў іншым месцы. Дзе? Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што або каля в. Лучоса, якая знаходзіцца ў вярхоўях рэк Аршыца і Лучоса і дзе ў свой час былі знойдзены чатыры скарбы арабскіх дырхемаў 8—9 ст. агульнай вагой каля 40 кг, або каля згаданай ужо в. Чаркасова, дзе ў 1873 г. былі выяўлены рэшткі старажытнага ўмацаванага паселішча 6—8 ст. Вельмі верагодна, што тая ці другая Арса—Орша і была «перадыслацыравана» на бераг паўнаводнага Дняпра.

Але трэба заўважыць, што гэту версію падтрымліваюць далёка не ўсе. Ёсць даследчыкі, якія лічаць, што Арса знаходзілася далёка ад Падняпроўя і нават ад Беларусі: на поўдні Украіны ці на Паўночным Каўказе.

Падсумоўваючы ўсе прыведзеныя вышэй меркаванні, можна, на наш погляд, выказаць наступную версію развіцця падзей. Недзе ў 6—8 ст. у рэгіёне, дзе праходзілі Вялікі водны шлях з «варагаў у грэкі» і «ўсходняя дарога» паломнікаў, узнікла паселішча, якое адыгрывала важную (калі не галоўную) ролю ў кантролі над днепра-дзвінскімі волакамі. Рэгіён гэты — Полацкую зямлю — арабы называлі Артаніяй, або Арсаніяй. Арта—Орша, безумоўна, не з'яўлялася галоўным горадам зямлі (ім быў Полацк), але назву яна, магчыма, атрымала менавіта ад яе, бо была першым паселішчам, у якое траплялі купцы і паломнікі, што падымаліся ўверх па Дняпры, за Ар-

тай якраз і пачыналася Артанія. Напачатку 1020-х гадоў паміж кіеўскім князем Яраславам Мудрым і яго пляменнікам — полацкім князем Брачыславам Ізяславічам — ішла вайна за кантроль над днепра-дзвінскімі волакамі. Вельмі верагодна, што падчас гэтай вайны (ці іншага ваеннага канфлікта — іх у тыя часы было досыць) была знішчана Арса—Орша, цэнтр княства, ці воласці, што знаходзіўся каля в. Чаркасова. Дарэчы, археалагічныя даследаванні сведчаць аб тым, што ў 11 ст. тут быў моцны пажар. Магчыма, пасля гэтага паселішча і было перанесена ў сутоку Дняпра і Аршыцы, дзе сёння стаіць старажытная Орша.

Цікавымі з'яўляюцца археалагічныя даследаванні, праведзеныя ў Чаркасове В.Ляўко. Аналізуючы іх вынікі, археолаг прыйшла да высновы, што ў 11 ст. Чаркасова як цэнтр акругі ці пагоста спыніла сваё існаванне, і яго функцыі перайшлі да крэпасці, што да таго часу з'явілася ў сутоцы Аршыцы і Дняпра.

Але яна лічыць, што ў дадзеным выпадку можна гаварыць аб пераносе з паселішча каля Чаркасова ў паселішча на Дняпры менавіта адміністрацыйных (валасных) функцый, а не самаго паселішча.

Прыведзеныя вышэй разважанні аб больш сталым узросце Оршы, безумоўна, толькі гіпотэза, але, на наш погляд, яны даюць магчымасць спалучыць легенды і рэаліі і выказаць меркаванне, што Орша, вельмі верагодна, з'явілася на нашай зямлі раней, чым лічыцца сёння.

Алесь Соніч.

Беларуская мінуўшчына. 1997. № 2.

У СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

У сярэдзіне 13—14 ст. утвараецца Вялікае княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае і іншых зямель. Орша і яе ваколіца ўвайшлі ў склад гэтай дзяржавы. Вядома, што з 1345 г., калі вялікім князем стаў Альгерд Гедымінавіч, ён атрымаў у спадчыну землі Віцебскага князя (свайго цесця) разам з Оршай.

У 1385 г. Вялікае княства Літоўскае (ВКЛ) заключыла саюз з Польшчай з мэтай сумеснай барацьбы супраць Тэўтонскага ордэна — Крэўскую унію. Праз год супраць уніі выступілі полацкі князь Андрэй Альгердавіч і смаленскі князь Святаслаў Іванавіч. «Тое ж зимы князь Святослав Смоленский совет сотвори со князем Андреем Полоцким: он в Литву, а князь Святослав ко Рши й на миру много зла сотвориша христианам, нечеловечески й нехристиански мучише християн... Граду же Рши ничего не успеша и паки возвратися во свояси».

Пасля смерці Альгерда Оршай у складзе Віцебскай зямлі валодае яго ўдава Ульяна Цвярская. Яе смерць у хуткім часе пасля таго, як вялікім князем стаў Вітаўт, прыводзіць да абвастрэння міжусобнай барацьбы паміж сынамі Альгерда. Ягайла, ён жа кароль Польшчы Уладзіслаў II, паставіў у Віцебску свайго старасту Фёдара Весну. Свідрыгайла, які ўцёк у Прусію за некалькі гадоў да таго, пайшоў на Віцебск з немцамі, баярамі і казакамі, захапіў яго, «а потым добыл Орши и иншие замочки руские побрал». Вітаўт сабраў войска, захапіў Оршу і Друцк, а потым з дапамогай смаленскага князя Юрыя Святаслававіча захапіў Віцебск і паланіў Свідрыгайлу.

У выніку паходаў Альгерда і Вітаўта мяжа Вялікага княства Літоўскага адсунулася далёка на ўсход, і Орша на пэўны час страціла значэнне прыгранічнай крэпасці. За 15 ст. горад, бадай, толькі аднойчы ўзнікае на старонках летапісу — у сувязі з барацьбой праваслаўнай шляхты за палітычную роўнасць, якая вылілася ў 1430-я гады ва ўтварэнне Вялікага княства Рускага на чале са Свідрыгайлам. Пасля паражэння Свідрыгайлы пад Вількамірам летам 1436 г. «...князь великий Жигимонт собравши всю силу свою литовскую и послал сына своего князя Михаила на Русь, и придоши князь Михаил стал на Орши, и смоляне стретили князя Михаила на Орши, й здалися великому князю Жигимонту и сыну его князю Михаилу».

З самага пачатку і на працягу амаль усяго 16 ст. адбываецца практычна бесперапынная барацьба паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай за ўсходнія землі

Ліцейная формачка з бронзы з выявай архангела Міхаіла. 15 ст. Копысь.

княства, і Орша не раз становіцца ў цэнтры ваенных канфліктаў, пераходзіць з адных рук у другія, церпіць разбурэнні і рабункі.

У 1500 г. пачынаецца чарговая вайна Маскоўскай дзяржавы з ВКЛ. Пасля паражэння літоўскага войска на Ведрошы, страты Бранска, Дарагабужа, Тарапца, Белага і ўсяе Северскае зямлі вялікі князь літоўскі Аляксандр Казіміравіч усю восень 1500 г. займаецца ўмацаваннем Смаленска, Оршы, Віцебска і Полацка. У Оршы ўмацоўваецца старажытны замак ля вусця Аршыцы. Вакол самога горада была ўзведзена драўляная сцяна (астрог).

Вялікі князь маскоўскі Іван Васілевіч накіраваў да Смаленска вялікае войска на чале са сваім сынам Дзмітрыем Жылкам. Даведаўшыся пра дзеянні маскоўскага войска пад Смаленскам, Аляксандр Казіміравіч пасылае на чале літоўскага войска Станіслава Янавіча Белага, кашталяна троцкага і старосту жамойцкага, разам з набранымі іншаземнымі наёмнікамі.

Маскоўскае войска, страціўшы на беспаспяховых штурмах Смаленска мноства людзей і даведаўшыся аб набліжэнні войска ВКЛ, адыходзіць ад Смаленска. Станіслаў Белы і Ян Полак Карнкоўскі з наёмнай пяхотай пераходзяць Дняпро пад сценамі Оршы ды ідуць да Смаленска за адыходзячым праціўнікам. У 1502 г. Дзмітрый Жылка з вялікім войскам зноў з'яўляецца пад Смаленскам. Нягледзячы на тое, што Смаленск зноў захапіць не давялося, маскоўскія войскі пайшлі ў глыб ВКЛ, захапілі Оршу, выпалілі прадмесце Віцебска, а таксама ўсе паселішчы ад Мсціслава да Полацка, захапіўшы нямала палонных.

Не ясна, пры якіх абставінах была ўзята Орша, аднак можна меркаваць, што доўгай аблогі не было — ужо 23 кастрычніка Дзмітрый вярнуўся ў Маскву з усім войскам. Магчыма, нечаканасць з'яўлення маскавітаў пад сценамі горада паспрыяла поспеху: ніколі да гэтага маскоўскія войскі гэтак глыбока не заходзілі ў Літву. Не выключана таксама, што самі гараджане, незадаволеныя канфесійнай палітыкай Аляксандра і ўражаныя ваеннымі поспехамі Масквы (за год да гэтага войскі ВКЛ яшчэ раз былі разбіты пад Мсціславам), самі адчынілі вароты маскоўскім ваяводам.

У наступным, 1503 г., з вялікім княствам Маскоўскім было заключана 6-цігадовае замірэнне. У 1507 г. знатны вяльможа ВКЛ князь Міхал Львовіч Глінскі, заручыўшыся падтрымкай некаторых магнатаў (князёў Друцкіх, Мсціслаўскага), пачаў адкрытую барацьбу з уладай новага вялікага князя літоўскага Жыгімонта Казіміравіча, брата памёршага Аляксандра. Аднак абсалютная большасць магнатаў княства яго не падтрымала, з-за чаго Глінскі быў вымушаны пайсці на саюз з вялікім князем маскоўскім Васілём III. Атрымаўшы ад яго дапамогу 20 тысяч «езднага» войска — Глінскі разам з маскоўскім ваяводам Васілём Шамячычам вясною 1508 г. аблажыў Мінск і два тыдні стаяў пад ім. Аднак, даведаўшыся аб набліжэнні вялікага князя літоўскага і караля польскага Жыгімонта Казіміравіча з літоўскім і польскім войскамі і атрымаўшы загад ад Васіля III, Шамячыч і Глінскі знялі аблогу Менска і пайшлі на Оршу. Там яны знайшлі князя Данііла Шчэню, які з наўгародскімі палкамі аблажыў Оршу, а другі ваявода, Якаў Захар'евіч Патрыкееў з маскоўскімі палкамі стаяў пад Дуброўнай;

абодва разам мелі 60 тысяч войска. Злучыўшыся, Глінскі, Шамячыч і Шчэня некалькі дзён бамбардзіравалі Оршу гарматамі, але ўзяць так і не змаглі. Атрымаўшы звесткі аб набліжэнні Жыгімонта з войскамі, яны знялі аблогу Оршы і спешна пераправіліся на левы бераг Дняпра.

13 ліпеня Жыгімонт Казіміравіч з каронным гетманам Мікалаем Фірлеем і літоўскім гетманам Канстанцінам Астрожскім на чале сваіх войск падышлі да Оршы і спыніліся на правым беразе Дняпра, потым, згодна распрацаванаму імі плану, пераправіліся цераз Дняпро і нанеслі ўдар па войскам Маскоўскай дзяржавы. Маскоўскія вартавыя аддзелы апынуліся ў цяжкім становішчы, яны адбіваліся да самага змяркання, ноч дазволіла ім злучыцца з галоўнымі маскоўскімі сіламі. Апоўначы маскоўскае войска знялося з месца і, пакінуўшы абоз і трафеі, лясамі рушыла на паўднёвы ўсход, выпаліўшы пры гэтым прадмесце Мсціслава. Ацаніўшы сітуацыю, Жыгімонт адмовіўся ад пагоні. Вынікам бітвы з'явілася тое, што баявыя дзеянні былі перанесены далёка на ўсход ад Смаленска; неўзабаве пачаліся перамовы і быў заключаны «вечны мір».

У лістападзе 1512 г. маскоўскія войскі зноў рушылі на Беларусь. У гэтым жа годзе Орша была занята войскам Васіля III. У 1513 г. горад зноў стаў ахвярай ваенных дзеянняў. У 1514 г. ў наваколлі Оршы быў захоплены ў палон збегшы да Жыгімонта І Старога князь Міхаіл Глінскі, а сам горад у чарговы раз заняты рускімі войскамі.

8 верасня 1514 г. пад Оршай адбылася адна з буйнейшых бітваў вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1512—1522 гг. Неўзабаве пасля капітуляцыі перад рускімі войскамі Смаленска ў жніўні 1514 г. вялікі князь маскоўскі Васіль III паслаў 80-тысячнае коннае войска на чале з князем М.І.Булгакавым-Голіцай і І.А.Чаляднінам у напрамку Оршы і Друцка. Кароль польскі і вялікі князь ВКЛ Жыгімонт І Стары сабраў апалчэнне ВКЛ пад камандаваннем гетмана літоўскага К.І.Астрожскага (16 тыс. коннікаў), 14 тыс. польскіх коннікаў, 3 тыс. наёмнай пяхоты, атрады паноў з Малой Польшчы і шляхціцаў-добраахвотнікаў з Вялікай Польшчы (2500 коннікаў). Жыгімонт застаўся ў Барысаве з 4 тыс. войска, а асноўныя сілы (больш за 30 тыс. чалавек) на чале з Астрожскім пайшлі пад Оршу. Атрадамі войска камандавалі Ю.Радзівіл, Я.Свярчоўскі і інш. Першы бой адбыўся 27.8.1514 г. на левым беразе р. Бярэзіна ў час пераправы атрадаў ВКЛ. У гэтым баі разбіта некалькі рускіх палкоў. Потым атрады І.Б.Сапегі нанеслі паражэнне маскоўскім войскам на р. Друць. Рускае войска пераправілася на левы бераг Дняпра і стала паміж Оршай і Дуброўнай на р. Крапіўна. Тут, недалёка ад Аршанскага замка, і адбылася рашаючая бітва. Частка беларуска-літоўскай і польскай конніцы без страт пераправілася цераз Дняпро. Вышэй па цячэнні ад месца пераправы конніцы, цераз патаемна наведзены наплыўны мост, раку перайшлі пяхота, конніца і артылерыя. Пасля кароткай прамовы Астрожскі павёў у атаку конніцу і пяхоту на расцягнутыя парадкі маскоўскага войска. Пачалася жорсткая бітва з палкамі Булгакава-Голіцы. Чаляднін у бой не ўступіў, а калі ўдар абрынуўся на яго палкі, ад бою ўхіліўся Булгакаў-Голіца. Хітрым манеўрам пад выглядам адступлення Астрожскі ўцягнуў праціўніка ў пагоню і вывеў яго пад агонь сваіх замаскіраваных гармат. Пасля гэтага ён зноў нанёс удар па палках Булгакава-Голіцы, якія былі разгромлены, частка воінаў трапіла ў палон. Таксама былі разгромлены і палкі Чаляднінa. У рускім войску пачалася паніка. Многія з уцекачоў загінулі ў рэках Дняпро і Крапіўна (апошняя была запруджана целамі). Месца бітвы было ўслана забітымі. Дакументальныя звесткі пра страты супярэчлівыя: паводле рускіх летапісаў, хронік і звестак С.Герберштэйна, страты рускага войска склалі каля 40 тыс. чалавек забітымі. У палон трапілі Булгакаў-Голіца, Чаляднін і яшчэ 8 ваявод, 17 іншых военачальнікаў, 2 тыс. «дзяцей баярскіх» і больш за 2 тыс. воінаў. Пераможцам раздалі 20 тыс. трафейных коней і палавіну абозу. Дзесяткі гадоў заставаліся палонныя ў Вільні і ў розных гаспадарскіх дварах і валасцях. Чаляднін памёр у Вільні праз некалькі гадоў, Булгакаў-Голіца вярнуўся на радзіму ў 1552 г.

Перамога ў аршанскай бітве дала ВКЛ магчымасць вярнуць Дуброўну, Мсціслаў і Крычаў. Смаленск узяць не ўдалося. Апісанне бітвы з вершаванымі ўстаўкамі, прысвечанымі ёй, змешчана ў хроніцы М.Стрыйкоўскага. Пра бітву была складзена песня, якая праслаўляла князя Астрожскага. На тэму Аршанскай бітвы ў 1520—30-х гадах напісана батальная карціна (аўтар невядомы), якая зберагаецца ў Нацыянальным музеі ў Варшаве. У жніўні 1519 г. Оршу аблажыла 50-ты-

Мініяцюра з выявай Аршанскай бітвы 1514 г. з «Хронікі Польскай» Марціна Бельскага.

сячнае войска ваяводаў Васіля Шуйскага, Міхайлы Гарбатага і Сямёна Курбскага. Але аблога не мела поспеху, бо да Оршы падышло войска ВКЛ.

Не абышлі Оршу ваенныя дзеянні вайны 1534—1535 гг. У адказ на паход гетмана Радзівіла на Севершчыну і Старадубшчыну глыбокай восенню 1534 г. маскоўскія войскі

Мініяцюра з выявай Аршанскай бітвы 1514 г. з Маскоўскага летапіснага зводу.

пайшлі на ВКЛ. Перадавы полк вёў князь Іван Аўчына-Целяпнёў-Аболенскі. Маскоўскія войскі захапілі і спалілі сёлы і прадмесці Оршы, Дуброўны, Друцка, Барысава.

Зімой 1535 г. маскоўская рацъ накіравалася да Мсціслава: вялікі полк вёў Васіль Шуйскі, а перадавы — Целяпнёў-Аболенскі. Жыгімонт I Стары паслаў войскі, каб пераняць непрыяцеля, але Шуйскі не стаў затрымліваццa; аддаўшы агню ваколіцы Княжычаў, Шклова, Копысі, Оршы і Дуброўны, ён адступіў да Смаленска.

Не кінулі Оршу ваенныя дзеянні ў час Лівонскай вайны 1558—1583 гг., якая пачалася для Аршаншчыны ваеннымі спусташэннямі 1562 г. Маскоўскія войскі са Смаленска рабілі спусташальныя набегі на Дуброўна, Оршу, Копысь, Шклоў.

Па ўзяцці Полацка Іванам IV ваенныя дзеянні аднавіліся зімой 1564 г. Князь Пётр Шуйскі з 30-тысячным войскам выступіў з Полацка і павінен быў злучыцца «на палях друцкіх» пад Оршай з князем Пятром Сярэбраным-Аболенскім, які выступіў са Смаленска. Аднак найвышэйшы гетман літоўскі Мікалай Радзівіл з гетманам польным Рыгорам Хадкевічам, маючы каля 10 тысяч войска, у канцы студзеня сустрэлі Шуйскага на р. Ула пад Чашнікамі і ў кароткай бітве разбілі іх. Сам Шуйскі ды два князі Палецкія загінулі ў бітве, у палон трапілі ваяводы Захарый Іванавіч Пляшчэеў-Аўчына і князь Іван Ахлябнін. Каля 5 тысяч з войска Шуйскага з Шарамецевым прыбегла назад у Полацк; паранены Шарамецеў неўзабаве памёр у Полацку.

У гэты час князь Сярэбраны ўжо стаяў паміж Оршай і Дуброўнай на р. Крапіўна. Супраць яго рухаўся з польскім службовым войскам каронны гетман Фларыян Жэбрыдоўскі, які ўжо знаходзіўся ў Барысаве. Наперад з некалькімі тысячамі таксама быў высланы староста аршанскі Філон Кміта-Чарнабыльскі. Некаторыя аўтары ўказваюць, што Сярэбраны перахапіў ганца з лістом, дзе паведамлялася аб перамозе на Уле. Гэта адыграла сваю ролю: войска Сярэбранага ўстрывожылася і пачало адступаць. Гэта выкарыстаў Філон Кміта і пачаў граміць адступаючага праціўніка, што красамоўна апісаў яго сучаснік: «И там же вжо за Оршою, под Дубровною, сторожу Московскую, Москву и Тотар громили, и двух мурз а десять Москвитинов поймали: бо войско Московское великое кошом положилося за Дубровною».

У канцы Лівонскай вайны Аршаншчына таксама зведала немалыя ваенныя падзеі. Восенню 1579 г. Філон Кміта з войскам спустошыў Смаленшчыну. Праз год, восенню 1580 г., Кміта хацеў паўтарыць паход, аднак на гэты раз ён быў не такім паспяховым: «Филон Кмита, с девятью тысячами всадников приближился к Смоленску, в надежде сжечь его предместия; но встреченный в поле тамошними храбрыми начальниками... бежал». У в. Настасьіна на яго напалі ваяводы Іван Бутурлін «с товарищами». Кміта вечарам стаў у абозе «в крепком месте», а ноччу пакінуў яго. Бутурлін на наступны дзень пагнаўся за ім, дагнаў у 40 вярстах ад Смаленска і разбіў.

У сакавіку 1581 г. маскоўскія ваяводы князі Міхайла Каштыроў-Растоўскі, Дзмітрый Хварасцінін, Батрулін, Шчарбаты і Турэнін ад Мажайска хадзілі на Літву: «А были у Дубровны и у Орши, и у Покоси, и у Чклова, и у Могилева, и у Радомля, посады по-

жгли, и под Чкловым были бой: на том бою Литовских людей побили и язык многие поймали...».

Пасля ўзяцця горада Вітаўтам Орша ў канцы 14 ст. стала велікакняжацкай маёмасцю; цэнтрам гаспадарчага і палітычнага жыцця горада становіцца замак. Інвентар Аршанскага замка 1560 г. ўтрымлівае шмат цікавых звестак пра стан гаспадаркі і насельніцтва горада. Замак уяўляў сабой гаспадарчую адзінку, якой належалі дзве воласці — Рошская (Аршанская) і Варанцоўская з 9 вёскамі ў іх. У замку былі размешчаны будынкі каралеўскага двара, царква, млын, карчма, гасціны дом. Яшчэ адзін каралеўскі двор знаходзіўся за межамі замка. Жыхары Оршы пералічаны адпаведна павіннасцям і падаткам на карысць замка: мяшчане, якія за карыстанне ворывам павінны былі працаваць на замак, «кунічнікі», «баброўнікі», «агароднікі». 60% насельнікаў горада займалася рамяством. Для часткі рамеснікаў іх павіннасці адпавядалі спецыяльнасцям: пушкары, слесары, кушнеры, ганчары, каўшоўнікі. Прозвішчы «кунічнікаў» таксама гавораць пра іх рамесныя спецыяльнасці: Кравец, Шапавал, Калачнік, Васкабойнік, Кажамяка, Сядзельнік, Кушнер, Залатар, Чабатар, Скамарох, Аўчыннік, Мылнік, Кузнец, Гладыш, Жалезнік, Рымар.

Горад павінен быў выплачваць агульныя плацяжы. Так, у 1501 г. Оршы належала выплаціць «два поставы трицких» ардыншчыны, у 1551 г. — дваццаць коп грошай сярэбшчыны. Поўны пералік павіннасцей і плацяжоў аршанскіх мяшчан у канцы 16 ст. выглядаў так: чынш за валокі — 40 грошай, ад прыгону — 12 грошай, на падводы з валокі — 3 грошы, «бирчого и пищого» з валокі — 12 пенязей і г.д.; акрамя таго, яны павінны былі рамантаваць замак, даваць у замак вартаўнікоў, сачыць за станам узводнай ямы, даваць на замак ланцугі. Для ўсіх мяшчан было абавязковым «...в час небеспечности замковой от неприятеля господарского стрельбу вшелякую, то есть гаковницы, ручницы и сагайдаки, и иную оборону, то есть рогатина, и што иного ку той обороне належить, у домех свои имети, а без обороны таковое в дому своем не мешкать».

На працягу 16 ст. аршанскія мяшчане неаднаразова звярталіся да вялікіх князёў за наданнем гораду вольнасцей. І амаль кожны раз, падкрэсліўшы, што аршанцы — людзі «ўкраінныя» і шмат церпяць ад ваеннага ліхалецця, вялікія князі гэтыя вольнасці зацвярджалі. У 1551 г. аршанцам было дазволена гандляваць па ўсім Вялікім княстве Літоўскім бязмытна на 10 год. У інвентары Аршанскага замка 1560 г. адзначаецца, што кароль дазволіў гораду мець гасціны двор і атрымліваць даходы з яго. У 1570 г. Стафан Баторый у адказ на зварот аршанскіх мяшчан забараніў аршанскаму старосце Філону Кміце-Чарнабыльскаму прымушаць іх даваць падводы для паслоў і ганцоў без аплаты. У 1577 г. аршанцы дабіліся права мець у горадзе гасціны двор і васкабойню, а даходы з іх пускаць на «потребы местские». З гэтых і шматлікіх наступных дадзеных аршанцам прывілеяў прасочваецца працэс выдзялення горада («места») у асобную грамаду са сваёй агульнагарадской маёмасцю і падаткамі на «потребы местские». У дакументах зафіксаваны нават асобны статус членаў гарадской грамады: «Мещане в месте мають вжо от того часу перестати розрубов и разметов класти на мещан господарских». Адначасова аршанскія мяшчане дабіваюцца спачатку абавязковага ўдзелу ў выкананні замкавых павіннасцей тых жыхароў горада, якія знаходзіліся пад юрысдыкцыяй феадалаў, а потым і ўвогуле пазбаўляюцца залежнасці ад замкавай адміністрацыі і выканання павіннасцей на замак. Горад ператвараецца ў асобную гаспадарчую і адміністрацыйную адзінку, а гэта патрабавала стварэння ўласнай гарадской адміністрацыі, органаў самакіравання. Ёсць сведчанні аб наяўнасці ў Оршы войта ў 1551-м і ў пазнейшыя гады 16 ст. Паколькі войта мелі толькі гарады з магдэбургскім правам, то з гэтага вынікае, што Орша атрымала так званае малое магдэбургскае права да 1551 г. Існаванне магдэбургскага права ў горадзе пацвярджаецца таксама наступнымі словамі з ліста аршанцаў да вялікага князя 1559 г.: «...Просили Петра Дмитровича Корсака, старосты Оршаньского, абы его милость рачил ласку свою учинить и печать приложити и руку подписати к сему нашому листу; ...и местскую печать к сему листу нашому приложити». Значыць, у горада была свая пячатка, асобная ад пячаткі старосты. А пячатка можа быць неабходнай толькі пры наяўнасці самакіравання і канцылярыі, тады, калі горад пачынае існаваць як юрыдычная асоба.

На працягу 14—17 ст. на падставе норм магдэбургскага права ў Оршы сфарміраваўся своеасаблівы статут гарадскога саслоўя — так званае аршанскае права. Паводле пісьмовых крыніц, у 1562 г. вялікі князь ВКЛ Жыгімонт II Аўгуст задаволіў просьбу аршанцаў прызнаць законным выбранне на сходзе 1.2.1559 г. войтам горада М.Мыльнікава. У склад гарадскога самакіравання было выбрана яшчэ 6 чалавек. Сход даручыў ім адміністрацыйныя і судовыя функцыі і абавязаў штогод рабіць справаздачу, а калі гораду будзе нанесена шкода, «каждый мает дати подлуг маетности своее не ровняючы богатого ку ўбогому». Адзін з пунктаў пастановы патрабаваў, каб: «И стого шлюбу нашого не мает жадин выступить, одно маит один за другого стояти». Парушальніка чакала канфіскацыя ўсёй маёмасці.

31.8.1577 г. вялікі князь ВКЛ зацвердзіў пастановы гараджан і права горада на самакіраванне. Адначасова па просьбе аршанцаў вызваліў іх ад павіннасці «для пашни замковае на пригон сохою, на жниве з серпом, на сеножаць з косою... ходити». Як сведчыць велікакняжацкая грамата да 24.11.1593 г., аршанцы ўдасканалілі прынцыпы магдэбургскага самакіравання ў горадзе. Паводле аршанскага права яно складалася з войта і 4 сотнікаў, якія «будут вместо лавников». Аршанцы хоць і наблізілі функцыі абраных у самакіраванне да магдэбургскай тэрміналогіі, аднак захавалі традыцыйныя назвы пасад. У 1620 г. горад атрымаў грамату на поўнае магдэбургскае права, якое аршанцы выкарысталі для таго, каб скласці ў сакавіку 1621 г. ўласны статут, што рэгуляваў жыццё горада і адносіны паміж гараджанамі. З тэксту статута відаць, што гараджане аспрэчвалі юрыдычны аўтарытэт магдэбургскага права і былі нязгодныя з шэрагам яго норм. На іх думку, у ім недакладна вызначаны прынцып падзелу маёмасці. Не згадзіліся яны і з тым, каб пасяджэнні гарадскіх судоў праводзіліся (з улікам святочных дзён) паводле каталіцкіх канонаў, і тлумачылі гэта тым, што «... в месте оршанском все обыватели места того — русь, наследовцы религии закону греческого послушенства церкви восходнее, межи которыми отчасти знайдутся люди римского закону». Не было, на іх думку, у гэтым праве «дэкларацыи досконалое» аб меры пакарання за паклёп і хлуслівае сведчанне на судзе. Адхілялі яны не толькі пэўныя нормы магдэбургскага права, якія не адпавядалі ўмовам жыцця беларускага горада 17 ст., але і састарэлыя нормы вечавога права. Патрэбныя нормы яны бралі ў Статуце Вялікага княства Літоўскага 1588 г., статутах «головным мест Кракова и Вилна», пастановах сеймаў, з асабістага вопыту. Аршанскі статут змяшчаў 23 раздзелы, кожны з якіх складаўся з норм, што рэгулявалі дзейнасць гарадской рады, яе судовыя функцыі, маёмасныя і асабовыя адносіны жыхароў горада. У адносінах да таго, хто ўзніме руку на прадстаўніка гарадскога самакіравання, прадугледжвалася жорсткае пакаранне. Як сведчыць грамата караля Рэчы Паспалітай Жыгімонта III Вазы ад 16 студзеня 1627 г., яшчэ ў 1619 г. сваю самастойнасць у арганізацыі гарадскога жыцця аршанцы пашырылі і на рэлігійныя адносіны. У розныя часы гісторыі Аршаншчыны паміж прадстаўнікамі цэнтральнай улады і мясцовым самакіраваннем існаваў пэўны баланс сіл і пэўнае размеркаванне абавязкаў.

Пасля прамога падпарадкавання Воршы (Оршы) вялікаму князю ВКЛ Вітаўту ў 1392 г. было створана Аршанскае (Рошскае) намесніцтва. Верагодна, яно ўваходзіла ў склад Віцебскай зямлі і падзялялася на шэраг валасцей. У 15 — пач. 16 ст. значная іх частка шляхам велікакняжацкіх пажалаванняў перайшла ва ўласнасць буйных феадалаў (пераважна праваслаўных князёў). Князі Друцкія-Пуцяцічы набылі Басею, Горкі, Горы, Шышава, князі Друцкія-Бабічы — Брухава, Куцейна, Ламачын, Мошкава, Прыхабы, Судзілавічы, Сялец, князі Адзінцэвічы — Гальцова, Рэпухаў. Воласці Копысь (з Баранню) і Раманава перайшлі да князёў Гальшанскіх. Каталіцкім панам Гаштольдам належаў Шклоў, Глябовічам — Дуброўна і Расасна. Маёнткам Межава валодаў пан П.Фурс, потым князі Заслаўскія. У падпарадкаванні аршанскага намесніка да пачатку 16 ст. засталіся Бабіна, Баева, Дзевіна і Заазер'е. Велікакняжацкай уласнасцю заставаліся Смаляны, пакуль у 1543 г. каралева Бона не прамяняла іх князю Сангушку. З 16 ст. пад уплывам Польшчы пачалі ўжывацца тэрміны «павет», ці «староства». Намеснікамі-старостамі Аршанскага павета былі князі Ф.І.Заслаўскі (1501—38), В.Ю.Друцкі-Талачынскі (1538—



Фрагмент талеркі 17 ст. Надняпроўскі пасад у Оршы. Раскопкі В.М.Ляўко.

46), А.І.Друцкі-Азерацкі (1546—51, больш верагодна, да сваёй смерці ў 1558), П.Д.Корсак (1559), А.С.Адзінцэвіч (1560—66). Пасля ўключэння Смаленскай зямлі ў склад Расіі Аршанскі павет стаў пагранічным і неаднойчы быў тэатрам ваенных дзеянняў паміж войскамі ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы.

Паводле адміністрацыйнай рэформы ВКЛ 1565—66 гг. памеры Аршанскага павета былі значна павялічаны. У яго ўвайшлі б. Лукомскае княства з буйным маёнткам Чарэя, Барысаўскае староства (да р. Бярэзіна), паўднёвая частка б. Аболецкага павета з Алексінічамі, Беліцай і Палоннам, уся тэрыторыя Друцкага княства ад Бабра да Стараселля, далучаны таксама Магілёўскае староства, Любашанская і ўсходняя частка Свіслацкага дзяржаўных валасцей, шэраг прыватнаўласніцкіх маёнткаў уздоўж Дняпра (Баркалабаў, Буйнічы, Быхаў, Новы Быхаў) і на захад ад яго (Цяцерын з Бялынічамі, Галоўчын з Княжыцамі). У ваенных адносінах шляхецкае апалчэнне (харугва) Аршанскага павета падпарадкоўвалася віцебскаму ваяводу, буйныя магнаты выстаўлялі свае атрады асобна. Сцягам Аршанскага павета была харугва зялёнага колеру з выявай «Пагоні», аднолькавая з харугвай Віцебскага павета. У канцы 16 — 1-й пал. 17 ст. на тэрыторыі павета сфарміравалася латыфундыя паноў Сапегаў, якім належалі часткі Лукомскага княства, Чарэя з Худавам, Талачын і Стараселле з вялікай часткай Друцкага княства, Цяцерын з Бялынічамі і Круглым, часткі Басеі, Гор, Горак і Шышава, Аршанскае і Магілёўскае староствы, Любашанская дзяржаўная воласць. Буйнымі землеўладальнікамі былі князі Галоўчынскія (Галоўчын, Княжыцы, Новы Быхаў), Друцкія (частка Друцка, Горы, Саколіна), Зіноўевічы (Беліца), Лукомскія (частка Лукомля, Мялешкавічы, Шчыдуты), Сангушкі (Абольцы, Брухава, Крупкі, Смаляны), Сцяцкевічы-Заверскія (Баркулабаў, Любавічы, Расасна, Чаркасаў), паны Глябовічы (Беліца, Дуброўна, Расасна), Радзівілы (Барысаўскае староства, Барань, Копысь, Раманава), Хадкевічы (Бобр, Быхаў, Шклоў). Акрамя таго, у Аршанскім павеце налічвалася некалькі дзесяткаў дробных маёнткаў мясцовай шляхты. На тэрыторыі павета здаўна існавалі Чарэйскі Святатроіцкі і Магілёўскі Пячэрскі праваслаўныя манастыры. У 1620-я гады створаны Куцеінскі (каля Оршы), Буйніцкі і Баркулабаўскі праваслаўныя манастыры. Адначасова ўзнікалі (пераважна ў маёнтках магнатаў) каталіцкія касцёлы і кляштары. Так, Сапегі заснавалі каталіцкія кляштары ў Быхаве (каля 1620), Бялынічах (1623), Чарэі і Беліцы. З'явіліся каталіцкія кляштары і ў Оршы: базыльянскі (1642), дамініканскі (1650), бернардзінскі (1653). З канца 16 ст. існаваў кляштар у Лукомлі, з 1653 — у Чавусах. Касцёлы ўзніклі ў большасці мястэчкаў, што дазволіла стварыць у складзе Віленскага біскупства асобны Аршанскі дэканат (ахопліваў Аршанскі павет і суседні Мсціслаўскі павет). У 1612 быў заснаваны Аршанскі езуіцкі калегіум з вялікімі зямельнымі ўладаннямі.

Гандлёва-рамеснымі цэнтрамі павета былі прыватнаўласніцкія мястэчкі Бобр, Быхаў, Бялынічы, Галоўчын, Горы-Горкі, Копысь, Лукомль, Раманава, Стараселле, Талачын, Шклоў, пазней Крупкі, Халопенічы, Чавусы. Пасля адміністрацыйнай рэформы ВКЛ 1565—66 гг. пасады старосты займалі Ф.Кміта-Чарнабыльскі (1566—87), А.І.Сапега (1588—1611), А.Д.Сапега (1613—35), Р.Ю.Друцкі-Горскі (1635—50) і яго сын М.Друцкі-Горскі

(1650—51), К.Л.Сапега (1651—56); падстаростамі былі В.Цяпінскі (1578), П.Кубліцкі (1599), А.Падбярэзскі (1614), Я.Друцкі-Любецкі (1625—34), П.Галімскі (1651); павятовымі маршалкамі — П.Ю.Друцкі-Саколінскі (1569—75), Ц.Ю.Друцкі-Саколінскі (1575—85), Р.Падбярэзскі (з 1585), Б.А.Лукомскі (1591), М.Друцкі-Саколінскі (1591—1605), Я.Друцкі-Горскі (1605—19), Я.Курч (1619), С.Сангушка (1620), Я.Ю.Друцкі-Саколінскі (1622—48), П.Галімскі (1653); павятовымі харунжымі — Я.В.Сцяцкевіч-Заверскі (1629—31), Ю.Горскі (1639), С.Галоўчынскі (1640—44), М.Галоўчынскі (1644—58); земскімі суддзямі — Б.А.Лукомскі (1580—91), А.В.Варапай (1599—1615), І.Б.Лукомскі (1620—25), Я.Цеханавіцкі (1635), М.Баратынскі (1638—42).

А.П.Грыцкевіч, З.Ю.Капыскі, Ю.А.Копцік, В.Л.Насевіч, В.М.Сцяпанаў.

Аршанскі замак

Абароназдольнасць сярэдневяковага горада грунтавалася на яго ўмацаваннях, ядром якіх заўсёды быў замак. Не была выключэннем і Орша. «Інвентар Аршанскага замка» ад 12 ліпеня 1560 г. дакладна раскрывае структуру абарончых умацаванняў аднаго з галоўных аб'ектаў стратэгічна важнага напрамка ў сістэме абароны ўсходніх межаў Вялікага княства Літоўскага. Інвентар дае апісанне замка ў лепшы перыяд яго існавання і не ўтрымлівае амаль ніякіх звестак аб гісторыі яго ўтварэння і этапах развіцця. Іншыя пісьмовыя крыніцы, даследаванні гісторыкаў даюць магчымасць больш-менш падрабязна прасачыць гісторыю Аршанскага замка.

Першую дакладную вестку аб Оршы як умацаваным месцы дае Іпацьеўскі летапіс. У ім пры апісанні вайны Уладзіміра Манамаха з Глебам Усяславічам Менскім гаворыцца, што Вячаслаў, сын Манамаха, «взя Ръшу и Копысь». Гэта падзея адбылася ў 1116 г.

Васкрасенскі летапіс упэўнена называе Оршу як горад «камен».

У 1820 г. ў Лейпцыгу ўбачыла свет праца, прысвечаная вялікаму князю літоўскаму Свідрыгайлу. У дадатку даецца спіс беларускіх гарадоў, якія знаходзіліся пад кіраваннем вялікага князя. Сярод іх і Орша. Яна азначана як мураваны замак. Спіс датуецца канцом 14 ст.

На думку гісторыка Дз.Даўгялы, у старажытны час Аршанскі замак займаў «толькі заходнюю частку замкавае плошчы, якая ляжыць паміж рэчкамі Дняпро і Аршыца». Яго тэрыторыя складала 0,53 га, умацаванні былі драўлянымі. Пра гэта сведчыць план Аршанскага замчышча, зроблены ў 1781 г. На ім выразна бачны роў, які дзеліць замкавую тэрыторыю на больш «старую» частку і «новую». «Стары замак» меў 3 вежы: 1-я знаходзілася на мысе ў месцы ўпадзення Аршыцы ў Днепр; 2-я — у кутку паміж Аршыцай і штучным ровам; 3-я — паміж Дняпром і гэтым жа ровам. Памеры «старога замка» былі невялікія. Па методыцы падліку, прапанаванай Дз.Даўгялам, сцяна, якая ішла ўздоўж Дняпра, мела каля 110 м; сцяна ўздоўж штучнага рову — каля 80 м. Крыху даўжэйшай была сцяна, якая ўзвышалася над Аршыцай. Яна складала каля 120 м.

Замеры на мясцовасці пацвердзілі правільнасць методыкі, прапанаванай Дз.Даўгялам. Такі замак адпавядаў патрэбам свайго часу.

У час княжання Альгерда Гедымінавіча, у 1-й палавіне 14 ст., адбываецца першая буйная рэканструкцыя Аршанскага замка. Яго плошча пашырылася да 3,15 га. Але гэта не вырашала праблемы ўзмацнення абароны. Драўляныя сцены не змаглі супрацьстаяць гарматам, якія з'явіліся на ўзбраенні армій шэрагу краін Еўропы.

У пачатку 16 ст., у час кіравання вялікага князя літоўскага Аляксандра Ягелончыка, была завершана другая рэканструкцыя Аршанскага замка. У выніку ён прыняў той выгляд, які дае нам інвентар 1560 г. З інвентару бачна, што «замак с каменя мураваны» меў 5 вежаў. 1-я вежа знаходзілася на мысе, у месцы ўпадзення Аршыцы ў Днепр, і была «неабмурована з дерева роблена». Яна мела ўязную браму з пад'ёмным мостам на ланцугах. Вежу ўмацоўваў «птарас деревянный», засыпаны зямлёй і каменнямі, а «на ганку при об-

Рэканструкцыя Аршанскага замка паводле інвентару 1560 г.



лонках звон велікій, клепало железное». Яго зычны гук не аднойчы папярэджваў жыхароў горада і навакольля аб набліжэнні ворага. Ад гэтай вежы ўверх па цячэнні Аршыцы цягнулася каменная сцяна да другой вежы, зробленай з дрэва і «по половицы около муром абмурована». Далей зноў ішла сцяна, і прыкладна праз 110 м стаяла 3-я вежа, «з дерева роблена, до половіцы около муром обмурована». Ад яе каменная сцяна крута паварочвала ў напрамку Дняпра. У кутку, паміж штучным ровам і Дняпром, стаяла 4-я вежа — «до половицы муром обмурована». Побач з гэтай вежай быў «тайник деревом фундованый для вады ў Днепр». Прыкладна на аднолькавай адлегласці ад чацвёртай і першай вежы каменную сцяну, якая ішла ўздоўж Дняпра, падзяляла 5-я вежа — «до половицы муром обмурована».

Такім чынам, з 5 вежаў Аршанскага замка 4 былі да палавіны мураваныя. Перыметр замка складаў прыкладна 900 м. Гэта быў адзін з самых вялікіх замкаў на ўсходзе Беларусі. Вышыня сцен была неаднолькавай. Сцены з боку Дняпра і Аршыцы былі вышынёй крыху больш за 5 м. Самым слабым месцам Аршанскага замка быў напрамак з боку штучнага рову, таму сцяна тут мела вышыню да 8 м. Шырыня замкавых сцен дасягала 2 м. Вышыня вежаў складала ад 16 да 20 м. «Інвентар Аршанскага замку» 1560 г., іншыя пісьмовыя крыніцы ўтрымліваюць не толькі падрабязнасці замкавай фартыфікацыі, але і звесткі аб яго ўзбраенні. Уваход у браму ахоўвала вялікая бронзавая гармата. На 2-ім ярусе ўязной вежы знаходзілася невялічкая жалезная гармата. Такія ж жалезныя гарматы выглядвалі з акон астатніх веж. Сярод узбраення, якое знаходзілася ў цэйхгаузе (ён змяшчаўся ў 3-й вежы), згадваюцца гакаўніцы, аркебузы, жалезныя гарматы, вялікі запас гарматных ядраў, куль, пораху і іншая амуніцыя. Унутры замка «почавши от вежы воротные» да сцен прымыкала 101 гародня, дзе ў часы аблог гараджане і сяляне хавалі свой скарб.

У замку быў двор кароля з мноствам жылых і гаспадарчых пабудоў, драўляная царква, 11 «землянскіх», 8 «мяшчанскіх» і 9 «жаўнерскіх» хат.

Апошняя рэканструкцыя Аршанскага замка праводзілася ў 17 ст. Акрамя работ па дадатковым умацаванні вежаў і падыходаў да ўязной брамы і капітальнага рамонту ўмацаванняў з боку Дняпра, над сценамі былі ўзведзены каменныя зубцы.

Такая замкавая пабудова, умацаваная тагачаснай зброяй, была цяжка пераадольнай перашкодай. Ваенная гісторыя Аршанскага замка ведае не адну яго аблогу як з боку Рускай дзяржавы, так і з боку Вялікага княства Літоўскага. У выніку замкавыя ўмацаванні разбураліся, але ўпарта адраджаліся тымі, хто валодаў замкам. Гэта — вынік важнейшага стратэгічнага становішча Оршы.

Але зменлівы час вынес прыгавор замку. Пасля разбурэння замка рускімі войскамі ў гады Паўночнай вайны 1700—1721 гг. ён больш не аднаўляўся. Калі на плане 1781 г. яшчэ бачны рэшткі ўмацаванняў, то на плане 1869 г. іх ужо няма. Цераз абарончы роў, які злучаў Аршыцу і Днепр, быў пабудаваны мост. Замкавую тэрыторыю з поўначы на паўднёвы захад перасякала вуліца з пабудовамі далёка не ваеннага прызначэння. *І.А.Яршоў.*

Дакументы сведчаць

ІНВЕНТАР АРШАНСКАГА ЗАМКА

12 ліпеня 1560 г.

В этом замку двор короля его милости: Напервей светлица, при земли, деревяная, добрая, в ней окон отвористых 6 на завесах, оболоны скляные, дверы не на завесах, защепок нет, стол дубовый, лавы добры, печ белая кафлей простых. При той светлице сени, в них комин глиною обмурован, дверы двое не на завесах и защепок нет. При сенях комора, в ней комин деревяный, глиною обмурован, окон отвористых 4, на завесах, оболоны скляные, дверы не на завесах и защепок нет. У боку тое комори сени малые, с тех сеней светлічка малая, новая, в ней печь белая кахлев простых, окон отвористых 4 на завесах, в них оболоны простые, скураные, стол округлый, добрий, лавы добри, двери не на завесах и защепок нет. Другая светлица вечаная при земли, окна 4 и двери 1, не на завесах, печь белая кахлев простых, добра и лавы добри. С тое светлицы сени, двери не на завесах и защепок нет. Пекарня, в ней печи 2, окон 5, при ней сени, двери двои не на завесах и защепок нет. Кузня вечаная, в ней комин глиною облеплен, с тое кухни изба чорная, в ней печь, окон 2, двери, защепок нет. Изба чорная, малая, в ней печь, окон 2, лавы добри, двери, защепок нет.

Браня з Оршы

Её нашли сто с лишним лет назад. В небольшом белорусском городке Орше ремонтировали один монастырь. В стене случайно открылась давно замурованная ниша. А там лежала груда заржавленных железных колец. Оказалось, что кольца переплетены между собой и образуют целую рубаху с короткими рукавами.

Находку отправили в крупнейший в тех местах Музей древностей при Виленской публичной библиотеке. В Вильно вещь определили точнее. Это была броня из крупных плоских железных колец, скреплённых гвоздями или заклёпками. Каждое кольцо было высечено специальным штампом из цельного листа железа почти в миллиметр толщиной. Диаметр кольца достигал семнадцати миллиметров, ширина его ободка — около трёх миллиметров. Такие кольчатые брони назывались на Руси байданами (или боданами). Слово это арабского происхождения, как, вероятно, и сам этот вид кольчуги. Но байданы делались обычно с длинными (ниже локтей) рукавами и подолом, почти достигавшим колен. А найденная в Орше броня много короче, и рукава её не достигают локтей. Зато и весит она всего 31 фунт, или около тринадцати килограммов. Наши предки называли бы эту броню полубайданой (или полубоданьем), как короткую шубу они называли полушубком.

На кольцах заметны были какие-то надписи русскими буквами, среди которых прочли обычные заклинания: «Мати божия буди с нами» и «Бог с нами никто же на ны» (то есть: «С нами бог, а против нас никого»). Решили, что это сделано в подражание арабским байданам, на кольцах которых нередко помещали, например, стихи из Корана. Тем и ограничилось изучение оршанской находки.

Впрочем, в 1875 г., когда Вильно должен был посетить царь Александр II, и думали, что, может быть, он заинтересуется коллекциями Музея древностей, попытались выяснить поточнее происхождение брони. Но к тому времени оказались уже забытыми и сами обстоятельства её находки. Никто не помнил даже, в каком именно монастыре или церкви города Орши открыли ту замурованную нишу.

Так что не только не удалось получить никаких новых сведений, но и то, что было уже известно, как бы вновь подёрнулось дымкой.

Так и лежала броня в музее, пока ею не заинтересовался молодой археолог Павел Сергеевич Рыков. А было это уже незадолго до войны 1914 года. Рыков ещё не один раз внимательно осмотрел каждое колечко и установил две важные вещи. Во-первых, надписи на кольцах были сделаны тем шрифтом, каким писали примерно четыреста лет назад, в 16 веке. А во-вторых, среди этих надписей были

не только заклинания бога и богородицы, но и совсем другие слова.

«Ивана Грьевича Выроткова», — прочёл Рыков на одних кольцах. «...ванова Грьевича Вырдкова», — читалось на других.

Это были, безусловно, имя, отчество и фамилия Ивана Григорьевича (в древности можно было сокращённо писать «Грьевича» Выроткова или Выродкова).

Может быть, на кольцах стояло клеймо мастера, как это было на многих вещах, о которых вы уже прочитали? Может быть, Иван Григорьевич Выродков — ремесленник-оружейник, или, как тогда говорили, «бронник», сделавший это броню?

Но против этого говорило многое. Прежде всего то, что имя стояло в родительном падеже, а не в именительном, как ставили его обычно ремесленники («Коста делал», «Мастер Аврам», «делал Андрей Чохов»). А надпись «...ванова» («Иванова») прямо говорит о принадлежности брони Ивану. Да и то, что Иван назван не только по имени, не только по фамилии, но даже и по отчеству (Иван Григорьевич), говорит, что это был не простой мастер-ремесленник, а какой-то знатный человек. В 16 веке ремесленник бывал доволен, если его называли полным, а не уничижительным именем («Андрей», а не «Ондрюшка»). Куда уж там отчество.

Итак, ясно: Иван Григорьевич Выродков — это заказчик, человек, для которого безымянный мастер сделал броню, её первый владелец. Но нельзя ли узнать получше, что это был за человек?

Исследователь начинает искать Ивана Григорьевича Выродкова или Выроткова среди имён, встречающихся в документах 16 века (ведь надписи были сделаны шрифтом 16 века, значит, и мастер, и заказчик жили именно в это время). Он искал в различных изданиях, развязал и просмотрел множество архивных связок. Вот, наконец, описание каких-то дворцовых бумаг. О некоторых из них сказано, что это «грамоты Ивана Выродкова». Конечно, удача, но только наполовину. Ведь мог быть и другой Иван Выродков. Надо найти именно Ивана Григорьевича! Но вот на другой грамоте, 1542 года, стоит подпись: «Ивана Васильевича государя всея Руси диак Иван Григорьевич Выродков».

Это уж бесспорно он! Государев дьяк!

Ещё одна грамота говорит о том, что в 1538 году дьяк Иван Григорьевич Выродков, «ближний человек» государя, послан с важным поручением к ногайскому мурзе Кошуму. Через девять лет молодой Иван Васильевич принимает титул царя. А дьяк Иван Григорьевич Выродков служит в одном из приказов. Тогда сложная система управления Московским государством ещё только создавалась. Приказами ведали знатнейшие бояре, но всю работу вели разрядные дьяки — люди менее знатного происхождения, но зачастую более образованные и способные.

О выдающихся способностях дьяка Ивана Выродкова говорят дальнейшие записи в разрядных книгах, летописях и иных документах, которые были известны историкам и раньше.

В 1550 г. царь дал «дьяку своему Ивану Григорьевичу сыну Выродкову» ответственное и опасное поручение — построить поблизости от самой столицы татарского ханства Казани крепость, которая могла бы быть опорным пунктом русских войск при осаде Казани.

В летописи есть даже рисунок, изображающий, как тогда было принято, сразу и царский приказ, и его исполнение. За два месяца Выродков организовал в углицких лесах изготовление всех частей будущей крепости, погрузил их на баржи и, спустив вниз по реке, быстро «смонтировал», как мы сейчас говорим, крепость на глазах врагов. Это и был знаменитый Свияжск, постройка которого предрешила падение Казани.

Чтобы руководить такой работой, нужно было недюжинное знание военной и строительной техники и талант организатора.

После этого около года Выродков снова выполняет важные дипломатические поручения, на этот раз при казанском хане. А потом, когда русское войско во главе с самим царём осаждало Казань, Выродков руководил осадными работами на решающем участке, где была возведена «тура» — башня, причинившая немало забот осаждённым.

После взятия Казани военный инженер вновь становится чиновником. Выродков снова разрядный дьяк. Но через несколько лет его посылают воеводой в Астрахань. Не всё шло гладко в служебной карьере Выродкова. В 1560 г. он даже подвергся царской опале. Но уже в следующем году Выродков снова

воевода, на этот раз у западных пределов Московского царства — в Торопце. Сейчас Торопец не очень значительный городок. Но тогда значение его было велико. Царь готовился к борьбе за выход к Балтийскому морю. И в самом деле, уже в следующем году, когда началась известная Ливонская война, мы видим бывшего торопецкого воеводу осаждающим древний русский город Полоцк. После успешной осады Полоцк был взят и возвращён Московскому государству.

Как же сложилась жизнь Ивана Григорьевича Выродкова в дальнейшем? Об этом есть только отрывочные сведения. Так, в Загорске, в бывшем Троице-Сергиевом монастыре, имеются записи о значительных подарках, сделанных в 1565 г. Иваном Выродковым. Тут и земли, и крестьяне. А почти двадцать лет спустя, в 1583 году, Иван Грозный заказал в Кирилл-Белозерском монастыре очередную панихиду. Среди «опальных, избиенных, потопленных и сожжённых с жёнами их», которых набожный царь велел поминать на этой панихиде, встречаем и нескольких Выродковых, в том числе двух Иванов. Рыков предполагает, что это Иван Григорьевич и его сын. Наверное, этот талантливый и деятельный сподвижник молодого царя, немало сделавший для усиления государства, оказался в числе первых жертв опричнины.

Такова поистине трагическая история русского военного инженера и дипломата, восстановленная учёным, сначала заинтересовавшимся лишь его боевым доспехом — бронёй.

А какова история самой брони? Как попала она в Оршу? Трудно сказать, когда именно заказал себе Выродков эту байдану. Из того, что мы узнали о нём, видно, что броня была ему нужна всегда.

Возможно, что уже в тридцатых годах 16 века московский мастер выбивал из железного листа кольца этой байданы. Особыми штампами, на которых были вырезаны надписи, начеканивал он на раскалённых кольцах и слова молитвы и имя заказчика. Наверное, байдана побывала со своим хозяином и в землях ногайских орд, и на строительстве Свияжска, и под Полоцком. Тяжёлое вооружение в ту пору старались надевать лишь перед самым боем. Брони в специальных ящиках обычно возили в обозе. И нет ничего удивительного в том, что когда на берегу реки Улы под городком Оршей литовский гетман Радзивилл нанёс поражение русскому войску (в котором под командой князя Петра Ивановича Шуйского был и Выродков со своим отрядом) и захватил обозы, то среди добычи оказалась и байдана Выродкова. Может быть, Выродков не успел даже надеть своей брони, а могло быть и так, что у него была ещё и другая; так или иначе, хозяин остался пока жив и на свободе, а байдана его была захвачена врагами. Возможно, потом часть добычи сложили в церквах или монастырях Орши, а байдана Выродкова так там и пролежала двести с лишком лет, пока её случайно не нашли строители.

Друкуецца па кн.: Рабинович М.Г. Судьбы вещей: Рассказы. М., 1974.

У СКЛАДЗЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

1 ліпеня 1569 г. быў прыняты акт Люблінскай уніі, які аб'яднаў Каралеўства Польскае і Вялікае Княства Літоўскае ў адзіную федэрацыю — Рэч Паспалітую.

У студзені 1582 г. ў выніку перамір'я паміж Маскоўскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай Орша і наваколле адышлі да апошняй. Але адносіны паміж суседнімі дзяржавамі заставаліся напружанымі. У пачатку 17 ст. руская і беларуская гісторыя зазналі такую з'яву, як «самазваншчына». Польскі кароль дазволіў Ілжэдзмітрыям вербаваць войскі ў межах ВКЛ. Месцам збору войск самазванцаў, якія накіроўваліся ў Маскву, была абвешчана Орша. Як пісаў А.С.Дэмбавецкі, Орша ў той час была «исходным пунктом всех предприятий польско-литовского правительства, всех мирных и враждебных отношений его к Москве».

Няспынныя войны, а разам з імі хваробы, галеча і жабрацтва значна падарвалі эканоміку горада. Прыйшлі ў заняпад рамяство і гандаль. У 1611 г. ўлады Рэчы Паспалітай былі вымушаны вызваліць жыхароў Оршы ад падаткаў і павіннасцей на чатыры гады. У 1620 г. Орша атрымала магдэбургскае права. Каля

1620 г. было закончана будаўніцтва аршанскага замка, які захоўваў сваё абарончае значэнне. Увогуле ж у 1-й палавіне 17 ст. Орша мела тры лініі абароны: гарадскія драўляназемляныя ўмацаванні з Дняпроўскай, Віцебскай і Магілёўскай брамамі; мураваны пяцівежавы замак, аддзелены ад горада ровам з вадою; драўляны замак на мысе, які займаў тэрыторыю старажытнага дзядзінца. Значную ролю ў фарміраванні гарадскіх умацаванняў адыграла тое, што ў сувязі з заключэннем у 1596 г. Брэсцкай царкоўнай уніі і наступленнем контррэфармацыі ажыўляецца дзейнасць каталіцкіх манаскіх ордэнаў і створанага ў 1617 г. уніяцкага базыльянскага. Дзякуючы грашовай і палітычнай падтрымцы з боку каталіцкай і уніяцкай шляхты манахі гэтых ордэнаў перабудоўваюць старыя драўляныя кляштары на мураваныя або ўзводзяць новыя. Мураваныя кляштары звычайна будаваліся на скрыжаваннях галоўных вуліц, агароджваліся моцнымі мураванымі сценамі і з'яўляліся як бы ўнутраным каркасам абароны горада і дадатковым моцным заслонам замка.

Пачатае ў 1648 г. на Украіне казацкае паўстанне на чале з гетманам Багданам Хмяльніцкім хутка перарасло ў вялікую вызваленчую вайну. Пісьмы, якія гетман пасылаў на беларускія землі, заклікалі сялян узбройвацца ды пачынаць наступ на паноў. Сацыяльная глеба для паўстання ў Беларусі была вельмі прыдатная, таму казацкі рух перакінуўся і сюды. Жыхары Аршаншчыны актыўна ўключыліся ў барацьбу, якая насіла ярка выражаны антыфеадальны і народна-вызваленчы ў пэўнай ступені рэлігійны характар. Гэта прыводзіла да шматлікіх ахвяр.У запісцы царскага ганца дзяка Кунакова цару Аляксяю Міхайлавічу, напісанай у сакавіку 1648 г., гаварылася: «А около Орши... на полях многие люди, а ине на колье четвертованые...». Орша і Аршаншчына моцна пацярпелі ў выніку вайны Маскоўскай дзяржавы з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг. Пасля Пераяслаўскай рады 8(18).1.1654 г., якая прыняла рашэнне аб далучэнні Украіны да Маскоўскай дзяржавы, вайна стала непазбежнай.

У маі 1654 г. тры вялікія групоўкі маскоўскай арміі пачалі наступленне. З паўночнага захаду на раёны Полацка і Віцебска вяла наступленне групоўка В.Шарамецева, з усходу галоўныя рускія сілы, якія ўзначальвалі Я.Чаркаскі, М.Адоеўскі і інш., ішлі на Смаленск, а з паўднёвага захаду ў напрамку Рослава, Мсціслава і Барысава рухалася армія А.Трубяцкога.

Галоўнай мэтай кампаніі 1654 г. рускае кіраўніцтва ставіла далучэнне Смаленска і тэрыторыі Беларусі ў раёнах Дняпра і Заходняй Дзвіны. У выпадку поспеха войскі Маскоўскай дзяржавы захоплівалі важнейшыя гарады: Смаленск, Віцебск, Магілёў, Оршу, Мсціслаў.

Рэч Паспалітая была не падрыхтавана да вайны. Памежныя гарады і замкі на Дняпры і Дзвіне, у тым ліку і Орша, былі не падпраўлены. Войска, сабранае вялікім гетманам Янушам Радзівілам, не перавышала 15 тысяч чалавек.

Спачатку чэрвеня 1654 г. Смаленск быў абкладзены рускімі войскамі. Але рускае ваеннае кіраўніцтва не рашалася браць яго прыступам, пакуль з тылу пагражалі войскі Я.Радзівіла. Атрымаўшы вестку аб пераходзе рускімі войскамі мяжы, Я.Радзівіл з Краснага адступіў да Оршы, куды прыбыў у сярэдзіне чэрвеня. З-пад Оршы Радзівіл накіраваў атрады для дыверсій супраць рускіх войск. Так, 1 ліпеня 1654 г. ён накіраваў паўтараты-сячны атрад падпалкоўніка Ганскага пад Смаленск, які здзейсніў напад на спячы лагер М.Адоеўскага і ў час бою, які цягнуўся дзве гадзіны, нанёс рускім вялікія страты. Здзейсніўшы напад, атрад Ганскага адступіў да Оршы.

Рускае кіраўніцтва вырашыла накіраваць супраць Я.Радзівіла значныя сілы. Да Оршы былі накіраваны войскі з розных палкоў пад агульным кіраўніцтвам Я.Чаркаскага. Даведаўшыся аб тым, што вялікія рускія сілы рухаюцца на Оршу, Радзівіл адступіў да Копысі. Орша без вялікай цяжкасці была ўзята маскоўскім войскам.

З Мсціслава ў напрамку Копысі пачалі рухацца войскі на чале з А.Трубяцкім. Да Копысі падышлі таксама перадавыя атрады групоўкі Я.Чаркаскага. Выціснутыя з Копысі войскі Я.Радзівіла адышлі да Шклова. 1 жніўня 1654 г. рускія войскі авалодалі Копыссю. 12 жніўня пад Шкловам адбылася бітва войск Я.Радзівіла з войскам Я.Чаркаскага. У выніку Радзівіл быў вымушаны адвесці свае войскі да Барысава.

23 верасня 1654 г. Смаленск быў здадзены. Маскоўскае войска ўвайшло ў горад. Глыбокай восенню скончыліся баявыя дзеян-

ні першага года вайны. Маскоўскія войскі занялі ў Беларусі 33 гарады, тэрыторыю на ўсход ад Дняпра і на поўнач ад Дзвіны.

Каб выклікаць лаяльнасць мясцовага насельніцтва, цар Аляксей Міхайлавіч пакідаў гарадам магдэбургскае права, раздаваў ахоўныя граматы. Новыя ўлады імкнуліся ўмацаваць і пашырыць у Беларусі праваслаўную царкву. Уніяцтва апынулася па-за законам, а каталіцкі культ дазваляўся толькі ў прыватных дамах шляхты і мяшчанства.

Нярэдкімі былі вылазкі рабаўніцтва мясцовага насельніцтва з боку маскоўскіх войск. Таму жыхары Оршы і навакольля пачалі накіроўваць шматлікія скаргі цару.

Спрабуючы вярнуць страчаныя землі, гетман Я.Радзівіл зімой 1654—55 гг. арганізаваў контрнаступленне. У студзені 1655 г. ён заняў Оршу. Але 11 мая 1655 г. войскі пад камандаваннем рускага стольніка З.Лявоньева і казакі палкоўніка І.Залатарэнкі зноў узялі горад.

З «Отписки...» Лявонцьева можна даведацца, што ў Оршы яго сустракалі «с хлебом немногие люди», што ў горадзе было каля тысячы «посацкіх людей» і што яны пры набліжэнні рускіх «розбежались по лесам». А ў Копысі Лявонцьеву паведамілі, што мяшчане, якія паўцякалі з горадоў, занятых рускімі, у тым ліку з Оршы, сабраліся ў атрад колькасцю 15 тысяч чалавек у Талачыне. У канцы мая рушылі ў паход галоўныя рускія сілы. У пачатку чэрвеня разам з вялікім войскам Оршу заняў баярын Я.Чарскі. Увосень таго ж года рускія захапілі большую частку беларускіх зямель. Да 1661 г. Орша трапіла пад уладу рускага цара.

Ваенныя дзеянні прынеслі вялікую шкоду гораду і насельніцтву. У 1661 г. Варшаўскі сейм быў вымушаны вынесці спецыяльную пастанову аб прадастаўленні льгот гораду па прычыне яго разарэння ў час вайны.

Доўгія мірныя перамовы паміж двума ваюючымі бакамі нарэшце завяршыліся заключэннем у студзені 1667 г. Андрусаўскага перамір'я, па якім Орша засталася ў складзе Рэчы Паспалітай.

Горад і яго ўмацаванні былі значна разбураны. У 1650-я гады рускі ваявода М.Палуэктаў так апісваў стан аршанскага замка: «А вышиня стен городу три сажени, а инде и полчетверти, кроме зубцов. А зубцовые все обломались... А ворот у каменного города и башен ни одной нет. А острогу поставлено стоячего по мере 96 сажен, а над землю вышиня острогу полторы сажени. А башень не поставлено. Абламов нет, и подмостов и боев не делано ж, а недоделано острогу по мере 27 сажен».

***

Адміністрацыйнае становішча Оршы ў складзе Рэчы Паспалітай было сціплае: цэнтр Аршанскага павета Віцебскага ваяводства. З 1500 г. тут збіраўся правінцыйны шляхецкі сеймік, а пазней у Оршы быў размешчаны павятовы грамадзянскі суд. Паступовае развіццё горада як самастойнай сацыяльна-эканамічнай адзінкі мела сваё лагічнае завяршэнне: 13 снежня 1620 г. аршанцы атрымалі велікакняжацкую грамату на магдэбургскае права («вялікае»), а як сімвал самастойнасці — герб, які ўяўляў сабой блакітны шчыт з сярэбраным крыжам і залатым паўмесяцам пад ім. Магдэбургскае права — гэта звод законаў, якія вызначалі адносіны горада і феадальнай дзяржавы. Па магдэбургскім праве адмянялася ўлада і суд над мяшчанамі дзяржаўцаў-намеснікаў, ваявод і іншых службовых асоб велікакняжацкай адміністрацыі. Гараджане вызваляліся ад феадальных павіннасцей, ім гарантаваліся свабодныя заняткі гандлем, рамёствамі і земляробствам, яны маглі ствараць рамесныя аб'яднанні — цэхі, выбіралі свае органы ўлады — магістрат і суд. Самі гарады патрабавалі магдэбургскага права яшчэ і таму, што ў расстаноўцы сіл у самой гарадской грамадзе адбываліся карэнныя змены — уплыў і ўлада пераходзілі ад гараджан-землеўладальнікаў, якія былі апорай вечавога ладу, да купцоў і багатых рамеснікаў. Выдзяленне купецтва як найбольш уплывовай групы было характэрна для сярэдневяковага горада, а характар большасці прывілеяў, якія надаваліся аршанскім мяшчанам, пачынаючы з першага вядомага — 1551 г., аб бязмытным гандлі на працягу 10 гадоў, з'яўляецца найбольш спрыяльным менавіта для купецтва. Купцы з Оршы дастаткова часта ўзгадваюцца ў дакументах, якія адлюстроўваюць памежны гандаль з Рускай дзяржавай.

Ніжэйшыя прыступкі сярод гарадскога саслоўя займалі дробныя рамеснікі і гандляры, падмайстры, вучні і г.д. У 17 ст. адзначаецца наяўнасць у горадзе цэхаў. У 1612 г. быў прыняты статут аршанскіх краўцоў, пастрыгачоў і кушнераў, які быў пацверджаны

ў 1633 г. Статут патрабаваў, каб усе рамеснікі гэтых спецыяльнасцей, незалежна ад юрысдыкцыі, працавалі толькі ў цэху. Адміністрацыя цэха — старшыні — павінны былі выбірацца на год на спецыяльнай, галоўнай сходцы, якая працягвалася два тыдні. Выбіралі таксама «шафараў» — казначэяў. Цэху дазвалялася браць з прыезджых краўцоў і кушнераў па паўгроша з кожнай адзінкі тавару.

У грамаце на магдэбургскае права вялікі князь загадваў жыхарам Оршы трымацца законаў, якія існавалі ў іншых гарадах. Так, «прикладом города Могилева» аршанцы павінны былі выбіраць у дзень Новага года 24 выбаршчыкаў, каб тыя выбіралі ўсю гарадскую раду — 2 бурмістраў, 2 радцаў і 6 лаўнікаў (суддзяў). Як у Полацку, усе жыхары Оршы, у тым ліку і тыя, што знаходзіліся пад прыватнай юрысдыкцыяй, падпарадкоўваліся суду гарадскога самакіравання. Нарэшце, «прикладом Киевского права» грамата патрабуе, каб кожны новы жыхар Оршы, прымаючы аселасць і гарадское права, прынёс у ратушы прысягу і заплаціў колькі трэба ў гарадскі скарб. Але па многіх важных пытаннях магдэбургскае права не давала дакладных адказаў, і таму аршанцы склалі свой адмысловы статут, які датуецца 23 сакавіка 1621 г. і называецца «Вилкер места его королевское милости Орши».

Склаўшы свой статут, аршанцы не сталі чакаць, пакуль вярхоўная ўлада яго ўхваліць, а адразу пачалі ім карыстацца. Праз два гады вярхоўная ўлада зацвердзіла гораду яго статут спецыяльнай граматай. Па гэтай грамаце Орша дабілася такіх шырокіх правоў гарадскога самакіравання, якіх не было нават у сталіцы ВКЛ Вільні. У прыватнасці, у Оршы быў скасаваны падзел на войтаўска-лаўніцкі бурмістраўска-радзецкі суды (такім чынам, гарадскім лаўнікам сталі падсудныя і крымінальныя справы), пад юрысдыкцыю гарадской рады падпадалі жыхары юрыдык.

У час акупацыі земляў ВКЛ рускімі войскамі ў беларускіх гарадах, занятых імі, захоўваліся органы самакіравання і суда, бюджэт горада складаўся з мясцовых паступленняў.

У 1650-я гады ў гарадах і вёсках усходняй Беларусі шырока рассяліліся ўкраінскія казакі. Вялікую колькасць казакоў складалі таксама мясцовыя жыхары, сяляне і мяшчане, якія «аказачваліся». У 1657 г. царскі ўрад загадваў ваяводу С.Змееву з невялікім атрадам выселіць казакоў з некалькіх паветаў, у тым ліку з Аршанскага, з горада Оршы. С.Змееў у задачу якога таксама ўваходзіла набраць добраахвотнікаў у драгунскія палкі, сутыкнуўся з поўным заняпадам беларускіх гарадоў. Па яго справах, у Оршы, Магілёве і паветах не было «гулящих вольных людей», а тым, якія былі, нельга было даверыць зброю, бо запісвацца яны будуць толькі «от скудости», дзеля грошай. У тым жа 1657 г. рускі ваявода ў Оршы М.Палуэктаў пісаў цару, што «мещане Орши-города, которые и жили не больши ста люди, и те были от всяких проезжих людей... в большом изгнанье, а боронить было их некому. А ныне слуша твою великого государя милость ото всех стран оршанцы хотят на старину приходить и селиться. А сказывают про себя, что бедность их большая». Нездарма і каралём Рэчы Паспалітай, і рускім царом прымаліся граматы аб вызваленні жыхароў Оршы ад падаткаў.

Да 1660—70-х гг. у Оршы заставаўся замак з гарнізонам і сваёй адміністрацыяй. Адносіны паміж горадам і замкам былі складаныя. Так, у 1646 г. каралеўскім судом разглядалася справа аб нападзе аршанскіх мяшчан колькасцю да 2 тыс. чалавек на замак. На падставе дакументаў аб гэтай справе ў Оршы жыло на той час каля 5 тыс. чалавек. Але ў канцы 18 ст., у час далучэння да Расійскай імперыі, у горадзе заставалася толькі 793 жыхары. Можна меркаваць, што па нацыянальным складзе горад заставаўся беларускім, але прозвішчы некаторых жыхароў гавораць аб іх паходжанні з Рускай дзяржавы. Ёсць звесткі аб існаванні ў Оршы ў пачатку 17 ст. яўрэйскага кагала, сінагогі і школы.

Паўднёвая частка Аршанскага павета, цэнтрам якога з'яўлялася Орша, была арэнай баявых дзеянняў казацкіх загонаў у час паўстання С.Налівайкі (1594—1596 гг.) і антыфеадальнай, вызваленчай вайны. У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг. у 1654 г. амаль увесь павет быў заняты рускімі войскамі і заставаўся ў іх руках да 1660—61 гг. У 1655 г. каля мяст. Шапялевічы рускія разбілі войска ВКЛ. У 1660 г. на р. Бася адбылася бітва, у якой войска ВКЛ на чале з П.Я.Сапегам і С.Чарнецкім разбіла маскоўскае войска князя Далгарукава. Вайна прынесла Аршанскаму павету моцнае спустошэнне. Да канца 17 ст. яе вынікі былі ў ас-

ноўным пераадолены. З'явіліся новыя кляштары ў Дуброўне (1674), Галоўчыне і Княжыцах (1681), Оршы (1680, францысканскі). Колькасць касцёлаў у межах Аршанскага павета да 1669 г. дасягнула 17. Да канца 17 ст. старыя магнацкія латыфундыі ў асноўным распаліся, за выключэннем уладанняў Сапегаў, якія ахоплівалі Стары і Новы Быхаў з Тайманавам, Баркулабаў з Буйнічамі, частку Галоўчына, Беліцу, Бобр, Горы з Горкамі, Чарэю з Мялешкавічамі. Частка спадчыны князёў Галоўчынскіх (Галоўчын, Княжыцы) перайшла да Пацаў. Акрамя таго, мелася каля 150 шляхецкіх маёнткаў (буйнейшыя ўладальнікі — Баратынскія, Галімскія, Кміцічы, Падбярэзскія, Халецкія і інш.) і вялікія дзяржаўныя воласці (староствы) — Барысаўскае, Любавіцкае, Магілёўскае, Любашанскае, Свіслацкае. З пачатку 18 ст. Аршанскі павет зноў стаў арэнай ваенных дзеянняў спачатку паміж магнацкімі групоўкамі К.Я.Сапегі і Р.Агінскага (1700), потым паміж войскамі шведскага караля Карла XII і рускага цара Пятра I (1705—08). Адбыліся і ўзброеныя выступленні сялян у Дуброўне (1701) і Быхаве (1702). Сярод землеўладальнікаў Аршанскага павета ў 18 ст. па-ранейшаму дамінавалі Сапегі, у 2-й палавіне 18 ст. значную маёмасць набылі князі Агінскія (Барысаўскае староства, Бобр, Бялынічы, Свіслач, Цяцерын). У выніку 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) большая частка Аршанскага павета (да р. Друць) адышла да Расіі, дзе была ўтворана Аршанская правінцыя. Астатняя частка павета (з цэнтрам у Халопенічах) праіснавала да 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793).

У культуры і асвеце Оршы і яе акругі ў гэты перыяд адлюстроўвалася канфесійная сітуацыя, якая існавала ў ВКЛ. У 16 ст. край спазнаў хуткае пранікненне і ўсталяванне уніяцтва. Суіснаванне канфесій суправаджалася канфліктамі і сутыкненнямі, але разам з гэтым Аршаншчына зазнала і росквіт асветы і мастацтва, выкліканы спаборніцтвам паміж канфесіямі з дапамогай мірных сродкаў — асветніцтва і літаратурнай палемікі.

У 1555 г. ў Оршы быў кальвінскі (пратэстанцкі) збор, заснаваны Мікалаем Радзівілам Чорным. Пры зборы была школа. Даследчыкамі падкрэсліваецца, што якасць адукацыі ў кальвінскіх школах была вышэйшая, чым у іншых, існаваўшых у той час. У літаральным сэнсе на грунце кальвінскага збору і школы ў перыяд Контррэфармацыі ў Оршы ўсталёўваецца вышэйшая навучальная ўстанова ордэна езуітаў. Вялікі канцлер літоўскі Леў Сапега напрыканцы 16 ст. купіў у кальвіністаў месца, дзе размяшчаўся іхні збор, пабудаваў там езуітам у 1604 г. касцёл і кляштар, а ў 1616 г. быў адчынены Аршанскі езуіцкі калегіум. Пры ім для адукацыі свецкай моладзі была заснавана пяцікласная публічная школа. Кароль Рэчы Паспалітай і Вялікі князь ВКЛ Жыгімонт III Ваза ў 1621 г. надаў аршанскім езуітам манаполію на адукацыю свецкай моладзі. У 1690 г. кароль Ян Сабескі пабудаваў мураваны касцёл св. Міхаіла і мураваны ж двухпавярховы будынак калегіума, а таксама падарыў езуітам вёску Фашчаўку з 2 тыс. сялян. У калегіуме былі адкрыты 3 класы: граматыкі, рыторыкі і філасофіі. Езуіты клапаціліся, каб іх выхаванцы раслі фізічна моцнымі, таму шмат часу адводзілася верхавой яздзе, плаванню, фехтаванню, танцам. Для дзяцей збяднелай шляхты і гараджан існавала бурса (інтэрнат). Бурсакі знаходзіліся на поўным утрыманні езуітаў, наведвалі публічную школу і дадаткова вучыліся музыцы, дзеля чаго калегіум утрымліваў на пансіёне выкладчыкаў-музыкантаў. Бурсакі абавязаны былі бясплатна граць у «музыцы касцельнай», спяваць у хоры, удзельнічаць у працэсіях, тэатральных спектаклях і інш. Напэўна, да гэтай навучальнай установы адносіцца паведамленне аб адкрыцці ў Оршы першай музычнай школы.

Пры калегіуме з канца 17 ст. дзейнічаў школьны тэатр. Тут быў створаны рукапісны зборнік драматычных твораў, вядомы як «Аршанскі кодэкс». Ён быў напісаны ў 1693 г. і ўключаў 4 польскія барочныя драмы з беларускімі інтэрмедыямі (дзе адна або дзве асобы гавораць па-беларуску).

На працягу існавання калегіума ў ім выкладалі такія буйныя навукоўцы, як ураджэнец Аршанскага павета, прафесар архітэктуры Францішак Караў (1731—1802), які вучыўся ў гэтым калегіуме, выкладаў філасофію і матэматыку і кіраваў кафедрай архітэктуры ў Полацкім калегіуме, быў рэктарам Полацкага, а потым і Аршанскага калегіума, а ў канцы жыцця стаў генеральным вікарыем езуітаў на Беларусі. Выкладаў у Оршы архітэктар Уладзіслаў Дзягілевіч. Выпускнікамі Аршанскага калегіума былі такія значныя асобы, як Францішак Дзеружынскі (1779—

1850), які прыняў значны ўдзел у арганізацыі школьнай сістэмы ордэна ізуітаў у ЗША; вядомы ў Расіі ў 1860-я гады паэт-сатырык і артыст П.В.Шумахер (1817—1891); уніяцкі біскуп Ян Красоўскі; прафесар філасофіі і выкладчык тэалогіі і царкоўнага права ў Варшаве, Навагрудку, Вільні Станіслаў Шадурскі (1726—1786); расійскі дзяржаўны дзеяч, міністр народнай адукацыі ва ўрадзе Аляксандра I Пётр Завадскі (1739—1812).

Езуіцкі ордэн быў забаронены ў Расіі ў 1820 г., аднак у 1820-я гады ў Оршы яшчэ заставалася 199 езуітаў. Іх кляштар быў канчаткова закрыты ў 1831 г., касцёл разабраны, а ў будынку калегіума зрабілі турму. Кароль Уладзіслаў IV пабудаваў у Оршы мураваны касцёл і вялікі мураваны будынак для манахаў-бернардзінцаў. У гэты ж перыяд былі ўзведзены францысканскі манастыр, мураваны касцёл для манахаў-трынітарыяў і два жаночыя каталіцкія манастыры — марыявіцкі і базыльянскі. Манастыры былі размешчаны ва ўсіх канцах горада і валодалі значнымі багаццямі. Кожны з іх меў па некалькі вёсак.

Своеасаблівай формай арганізацыі грамадскага, рэлігійнага і культурнага жыцця жыхароў беларускіх гарадоў у сярэдневякоўі былі праваслаўныя брацтвы. Яны сталі своеасаблівым працягам рэфармацыйнага руху; стварэнне брацтваў было рэакцыяй на нізкі маральны ўзровень, прагу да ўзбагачэння і неадукаванасць праваслаўных духоўных асоб. Аршанскае брацтва было зацверджана ў 1592 г. Жыгімонтам III. Прывілей даваў аршанскім мяшчанам права на два сходы ў год — на Вялікдзень і Раство Хрыстова — з пачастункамі. Для гэтых сходаў і іншых спраў існаваў спецыяльны будынак — «дом брацкі». У 1649 г. ў Оршы пачала працаваць брацкая праваслаўная школа. У брацкіх школах, апрача іншага, навучалі спевам, да таго ж, у асяроддзі братчыкаў быў пашыраны звычай спявання духоўных кантаў і псалмоў.

Пасля скасавання ў Магілёве шэрагу праваслаўных цэркваў і Спаскага манастыра на сродкі і па хадайніцтву Магілёўскага праваслаўнага брацтва на зямлі магната Багдана Статкевіча пад Оршай быў заснаваны Куцеінскі Богаяўленскі мужчынскі манастыр. Ён засноўваўся як лаўра і павінен быў стаць цэнтрам праваслаўя на ўсходзе Беларусі. У 1630 г. па запрашэнні і на грошы Б.Статкевіча асветнік і кнігадрукар з Кіева Спірыдон Собаль заснаваў у Куцейне друкарню і разгарнуў бурную кнігадрукарскую дзейнасць, якую працягваў пасля ад'езду С.Собаля ігумен Іаіль Труцэвіч. За кароткі час Куцеінская друкарня стала буйнейшай на Беларусі. Тут да 1654 г. было выдадзена каля 20 кніг царкоўна-палемічнага, навучальна-асветніцкага і свецкага характару. У іх ліку адзін з першых буквароў «Буквар» С.Собаля, вызначаўся невялікім аб'ёмам і быў вельмі зручны ў параўнанні з іншымі падручнікамі па навучанні грамаце.

З кнігадрукаваннем звязаны росквіт куцеінскай школы гравюры, якую вызначае блізкасць да традыцый беларускага народнага мастацтва. Галоўную ролю ў фарміраванні гэтай школы адыграў С.Собаль. Сапраўдным багаццем куцеінскіх выданняў з'яўляюцца ініцыялы, упрыгожаныя малюнкамі птушак, звяроў, чалавечымі фігурамі. Па стылі гэтыя загалоўныя літары ўзыходзяць да скарынаўскіх. Шэдэўрам кніжнага мастацтва на Беларусі стаў куцеінскі «Трэфалагіён». На гравюрах гэтага выдання — жанравыя шматфігурныя сцэны, персанажы якіх моцна індывідуалізаваны. Гравюры «Трэфалагіёна» былі вельмі папулярныя сярод беларускіх майстроў-іканапісцаў, выкарыстоўваліся імі ў якасці рысавальных дапаможнікаў. На жаль, імёны куцеінскіх гравёраў засталіся невядомымі. Можна толькі меркаваць, што асобныя выданні аздобіў майстар Паісій.

З развіццём мастацтва кніжнай гравюры звязана майстэрства куцеінскіх манахаў — разьбяроў па дрэве, імён якіх вядома болей: Іпаліт, Восіп Андрэеў, Андрэй Фёдараў, Старац Арсеній. Вядома, што ў Куцеінскім манастыры авалодваў майстэрствам разьбы па дрэве славуты Герасім Укулаў з Дубровны.

Да сярэдзіны 17 ст. Куцеінскі манастыр быў буйнейшым цэнтрам кнігадрукавання і мастацтваў на Беларусі. У 1655 г. ў сувязі з вайной Маскоўскай дзяржавы з Рэччу Паспалітай, Куцеінская друкарня разам з майстрамі была перавезена ў Іверскі манастыр пад Ноўгарадам, праз 10 гадоў яна апынулася ў Нова-Іерусалімскім манастыры на Істры, рэзідэнцыі патрыярха Нікана, а пасля ссылкі Нікана пераведзена ў Маскву пад нагляд Сімяона Полацкага, які быў прызначаны галоўным распарадчыкам новай друкарні, што размясцілася ў Крамлі і вядома пад назвай «Верхняя друкарня».

Такі ж быў лёс і куцеінскіх, і іншых майстроў. Вывезеныя ў Расію, яны пакінулі шматлікія ўзоры свайго майстэрства, вядомыя пад назвай «беларускай рэзі».

Гісторыя захавала таксама імёны куцеінскіх мастакоў Рыгора і Арцемія. Магчыма, яны прымалі ўдзел у стварэнні 38 роспісаў на трох сценах драўлянага Богаяўленскага сабора. Кампазіцыі былі выкананы на біблейскія і евангельскія сюжэты. Незвычайным было ўключэнне ў сістэму гэтых роспісаў карціны на гістарычную тэму, якая адлюстроўвае сустрэчу духавенствам і гараджанамі воінаў-вызваліцеляў на фоне гарадскога краявіду.

Куцеінскі манастыр таксама пакінуў свой след у гісторыі музычнага мастацтва. Вядома, што Спірыдон Собаль друкаваў у Куцейне кнігі з нотнымі запісамі. Старажытная сістэма спеваў у праваслаўнай царкве, т.зв. «знаменны распеў», мела некалькі варыянтаў, сярод якіх маецца «куцеінскі распеў».

У жыцці гараджан у сярэднія вякі важную ролю адыгрывалі царкоўныя гадавыя святы — фэсты, якія праводзіліся дастаткова пышна. Святочны рытуал строга рэгламентаваўся, вялікае значэнне надавалася тэатралізаваным пастаноўкам і шэсцям. Прадстаўнікі розных веравызнанняў адзначалі свае святы асобна. У 1640 г. аршанская гарадская рада забараніла на свята каталіцкага Раства ўпрыгожваць вуліцы, а цэхам — удзельнічаць у працэсіі.

Спецыфічнай праявай гэтага часу можна лічыць узнікненне гарадскога фальклору, аб чым, у прыватнасці, сведчыць знойдзены А.Мальдзісам рукапісны «аршанскі зборнік», напісаны ў канцы 17 ст. Гэта кніжка песеннай лірыкі, створаная, відаць, вандроўнымі шкалярамі, акцёрамі і музыкантамі. Сярод песень няма ніводнай на рэлігійную тэму. Прызначаліся яны як для шляхты, так і для гараджан і сялян.

Кірмашы і гарадскія святы былі месцамі выступленняў тагачасных прафесійных артыстаў, чые спецыяльнасці называюцца ў лісце караля Рэчы Паспалітай і вялікага князя ВКЛ Жыгімонта II Аўгуста за 3 студзеня 1566 г. аршанскаму старосту Андрэю Адзінцэвічу: «медведники», «дудники», «скрипки» і інш. Вядома, што на аршанскія кірмашы прыязджалі вандроўныя акцёры, акрабаты і лялечныя камедыянты і пазней.

Увогуле ж ваенныя падзеі сярэдзіны 17 ст., калі ў горадзе часам заставалася не болей за сотню жыхароў, пазнейшыя падзеі Паўночнай вайны не спрыялі развіццю культуры.

В.Л.Насевіч, В.М.Сцяпанаў, І.А.Яршоў.

Сельская гаспадарка

У 14—16 ст. у Беларусі вядучай галіной эканомікі з'яўлялася сельская гаспадарка. Пераважным па колькасці, асноўным вытворчым саслоўем феадальнага грамадства з'яўлялася сялянства. Асноўнай сельскагаспадарчай вытворчай адзінкай была гаспадарка селяніна — дым.

У сялянскай гаспадарцы на Аршаншчыне галоўную ролю адыгрывала раслінаводства. Сяляне вырошчвалі жыта, авёс, грэчку, ячмень, пшаніцу, проса, а таксама бабовыя і тэхнічныя культуры. Ураджайнасць асноўных зерневых культур у сялянскай гаспадарцы складала прыкладна 4 цэнтнеры з гектара. Разам з раслінаводствам у сялянскай гаспадарцы развівалася жывёлагадоўля. Яна забяспечвала насельніцтва харчаваннем і сыравінай, а гаспадарку цяглавай сілай і арганічнымі ўгнаеннямі.

У 14—16 ст. сяляне выконвалі разнастайныя феадальныя павіннасці. Па свайму зместу яны ўяўлялі сабой 3 тыповыя для феадалізму формы зямельнай рэнты: прадуктовую, адработачную і грашовую. У шэрагу маёнткаў пасля аграрнай рэформы 1565—1566 гг. разам са звычайнымі відамі і нормамі павіннасцей па-ранейшаму захоўваліся асобныя віды старажытных павіннасцей. Так, у 1573 г. ў маёнтку Я.Хадкевіча Бобр Аршанскага павета чыншавыя сяляне плацілі чынш памерам 50—60 грошаў, па адной бочцы жыта і аўса, па 1,5 пуда мёду, а таксама павінны былі рамантаваць двор, масты, гаці і млыны.

Узрастаючыя гандлёвыя інтарэсы памеснай гаспадаркі пашыралі павіннасныя абавязкі сялян далёка за межамі панскага двара. Так, працу ў рудні выконвалі сяляне маёнтка Шалекты Ашмянскага павета. Асабліва адрывала селяніна ад працы ў сваёй гаспадарцы, адымала шмат часу і сіл падводная павіннасць. У 1-й палавіне 17 ст. рост ставак чыншу працягваўся і дасягнуў 3 і больш коп грошаў за надзел. У маёнтках Сакольня і Ірцішчава ён дарос нават да двухзначнай сумы злотых.

Вынікам складанай сацыяльна-эканамічнай сітуацыі з'явілася збядненне сялянства, рэзкае абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей, што праявілася ў розных формах пратэсту — ад падачы скаргаў да адкрытага непадпарадкавання. Так, у 22 кнігах гродскіх і земскіх судоў Браслаўскага, Віцебскага, Гарадзенскага, Менскага, Аршанскага, Слонімскага паветаў утрымліваюцца 604 акты аб пошуках сялян, якія ўцяклі з 301 уладання.

Сялянская беднота склала ядро паўстанцкіх атрадаў пад камандаваннем С.Налівайкі. Асноўныя сілы Налівайкі ў 1594—1596 гг. дзейнічалі ў межах Магілёўскай воласці, але яго атрады падыходзілі і да сцен Оршы. Паўстанне пад кіраўніцтвам Налівайкі пацярпела паражэнне, але барацьба працягвалася. Так, 28 верасня 1598 г. гетман найвышэйшы К.Радзівіл папярэдзіў шляхту Аршанскага павета аб магчымым паяўленні атрада ў некалькі тысяч паўстанцаў, якія ідуць знізу ўверх па Дняпры і займаюцца «справамі налівайкаўскімі».

Але працэс аднаўлення спыніла Паўночная вайна 1700—1721 гг. Усходняя Беларусь у гэтай вайне з'яўлялася асноўным тэатрам баявых дзеянняў рускай і шведскай армій. Цераз гэтыя землі праходзіў галоўны шлях Карла XII і корпуса Левенгаўпта. Іх рух суправаджаўся масавымі грабяжамі мясцовага насельніцтва. З красавіка 1708 г. А.Меншыкаў у лісце да Пятра I паведамляў, што шведы «катуюць, нішчаць,... мужыкоў ... каб ямы хлебныя паказвалі». У Копыскім графстве колькасць заселеных дымоў у 1710 г. ў параўнанні з 1694 г. скарацілася на 43%. У Смалянскім графстве ў канцы 1710 г. пуставала каля 90 валок. Катастрафічна знізілася колькасць рабочай жывёлы. Так, калі ў канцы 17 ст. толькі па вёсках Копыскага графства налічвалася 1399 коней, то ў 1710 г. ва ўсім уладанні, уключаючы і горад, іх засталося ўсяго 279, г.зн. на 80% менш. У такіх умовах зямельныя ўласнікі былі вымушаны даваць сялянам ільготы ў павіннасцях, што садзейнічала аднаўленню сельскай гаспадаркі і росту колькасці насельніцтва. Асабліва гэта праявілася ў Смалянскім графстве. У Дубровенскім графстве колькасць дымоў з 1722 па 1775 гг. павялічылася з 743 да 1509. Ужо да сярэдзіны 18 ст. ў асобных маёнтках Копыскага графства даваенны ўзровень развіцця сельскай гаспадаркі быў нават перакрыты.

Для буйных дзяржаўных уладанняў галоўным прынцыпам узнаўлення гаспадаркі пасля разбуральных войнаў сталі адмова ад фальварка і паншчыны і перавод сялян на грашовы чынш. Таму на ўсходзе Беларусі ў дзяржаўных уладаннях пераважала грашовая рэнта. Так, у 1783 г. на «голым» чыншы, г.зн. без іншых павіннасцей, «сядзелі» сяляне ўладання Сморкі Аршанскага павета.

У менш разбураных маёнтках працягвалася інтэнсіўнае вядзенне фальварковай гаспадаркі, што асабліва было характэрна для маёнткаў дробнай і сярэдняй шляхты. У прыватнаўласніцкіх маёнтках захоўвалася паншчына, норма якой змянялася ў бок павелічэння. Так, у маёнтку Сабінскага Пашкаўшчызна Аршанскага павета ў 1748 г. падданыя адпрацоўвалі 12 дзён паншчыны на тыдзень з валокі.

Узмацненне эксплуатацыі выклікала з боку сялянства адпаведную рэакцыю. Нярэдкай з'явай стала адмова плаціць падаткі, выконваць паншчыну. У адным з дакументаў таго часу гаварылася, што ў Капыскім графстве «ёсць нямала свавольных сялян, якія, прадаўшы пяньку і схаваўшы хлеб, не хочуць выплачваць чынш». У 1670-я гады ў Аршанскім павеце адбываліся выступленні сялян, якія суправаджаліся разарэннем сядзіб феадалаў і ўзброенай расправай з адміністрацыяй і яе служыцелямі. Так, у чалабітнай князя В.С.Друцкага-Саколінскага гаварылася, што сяляне вёскі Крывы Канец узбунтаваліся, забілі прыказчыка Яна Жылінскага, разарылі і разрабавалі панскі двор, спалілі свае хаты і пайшлі ў Смалянскі павет.

Напярэдадні далучэння Беларусі да Расіі галоўнай перашкодай удасканалення вытворчых сіл у земляробстве заставалася панаванне паншчыны — прыгонніцкай эксплуатацыі. Крызіс феадальнай эканомікі наспяваў. Большасць феадалаў бачыла выйсце з крызісу ва ўмацаванні эксплуатацыі сялян. З гэтай нагоды фальваркова-паншчынная сістэма гаспадарання, якая была традыцыйна распаўсюджана на захадзе Беларусі, у 2-й палавіне 18 ст. ўсё больш інтэнсіўна стала ўводзіцца на ўсходзе. Так, сяляне фальварка Шылава Аршанскага павета, якім валодалі паны Агінскія, былі абавязаны з цяглай валокі акрамя выплаты 25 злотых чыншу, здачы прадуктовай рэнты, яшчэ і адрабіць 8 дзён на тыдзень паншчыны, дзесяць згонаў на год, 3 разы выйсці на сенакос.

У 2-й палавіне 18 ст. ва ўмовах агульнага эканамічнага ажыўлення развіваліся і рыначныя сувязі сялянскай гаспадаркі. Сяляне маёнткаў, дзе панавала грашовая рэнта, каб разлічыцца з феадалам за зямельны надзел, павінны былі ўнесці чынш і іншыя грашовыя выплаты. Таму ўсё часцей і часцей яны вымушаны былі звяртацца да рынка. Пісьмовая крыніца 2-й палавіны 18 ст. сведчыць, што «розным хлебам і іншымі вясковымі прадуктамі» гандлявалі сяляне ў базарныя дні ў Копысі. У дакуменце ад 1785 г. адзначаецца, што аршанскія купцы «гандль маюць у пакупцы ад вясковых жыхароў пянькі, канаплянага і льнянога семені прыкладам да чатырох тысяч рублёў».

Сувязі сялянскай гаспадаркі з рынкам не замыкаліся толькі на продажы прадуктаў сельскай гаспадаркі. Сяляне набывалі на ўнутраным рынку тавары гарадской рамеснай вытворчасці, у прыватнасці, прылады працы, абутак, адзенне, прылады хатняга ўжытку і г.д.

І.А.Яршоў.

Пётр Вялікі руку прыклаў...

У пачатку Паўночнай вайны тэрыторыя Беларусі стала арэнай ваенных дзеянняў. Рускімі войскамі тут камандаваў непасрэдна сам Пётр І. Ён двойчы, у 1706 і 1708 гг. быў на Аршаншчыне.

Адносіны мясцовага насельніцтва да рускіх войскаў і цара не былі адназначнымі. Прадстаўнікі пануючага класа былі спакойныя за сваё становішча, бо помнілі прымаўку: «Воран ворану вока не выклюе». Што датычыць простага народа, то царова войска не несла яму ні нацыянальнага, ні сацыяльнага вызвалення. Расія выступала як саюзніца Рэчы Паспалітай у барацьбе са шведамі. На адносіны да рускіх уплывалі такія фактары палітыкі польскіх улад, як паланізацыя, прымусовае акаталічванне, штучнае стварэнне спрыяльных умоў для распаўсюджвання уніяцтва, абмежаванне дзейнасці праваслаўнай царквы.

Пётр І да ўсіх груп насельніцтва адносіўся аднолькава. Аб гэтым сведчаць шматлікія дакументы. Так, у адным з іх сказана: «Того же 1706 года, февраля 20 дня, московский государь Петр Алексеевич был в Орше. К его царскому величеству тогда Могилевского магистрата чиновники ездили в Оршу, прося монаршей милости... Государь принял магистратских чиновников ласково и обещал во всем милость и снисхождение оказвать городу Могилеву. В то время, при бытности в Орше могилевских магистратских членов приходили к его царскому величеству Петру Алексеевичу два ксендза-бернардиры оршанские просить милостини, говорили перед царем, что они бедные римско-католичекие законники, не имеют из чего жить, кроме из одной только милостини. Тогда государь спросил их: «Много ли вас?» Они отвечали, что всех их в кляшторе находится шесть, тогда государь сказал: «Бог всю Вселенню питает, а вас шестерых не может пропитать» и, вынявши из кормана горсть копеек, дал бернардиру».

У сучаснай гістарычнай літаратуры Пётр І у час яго знаходжання на беларускіх землях падаецца як асоба жорсткая і бязлітасная. У пацвярджэнне прыводзіцца факт разбурэння аршанскіх умацаванняў, якія былі спалены атрадам рускіх войск. Але ж вядома: знішчаліся, спальваліся багацці не толькі беларускай, а ўласна рускай зямлі.

Армія Пятра Вялікага прымусіла шведскага караля амаль месяц прастаяць у Магілёве ў поўным бяздзеянні, дзе шведы, па словах перабежчыкаў, «голод имеют великий». Карл XII чакаў абоз Левенгаўпта. Быў выпадак, калі апошні ледзь не аб'яднаўся з каралём. Пераправіўшыся цераз Днепр у раёне Шклова, ён падаслаў да рускіх правакатара з даручэннем распаўсюдзіць чуткі аб тым, што яго корпус мае намер рухацца да Оршы. Таму і загарэліся аршанскія ўмацаванні, бо горад, на думку Пятра І, мог быць выкарыстаны шведамі ў якасці базы для наступлення. Аналізуючы дзеянні шведаў, рускі цар прыйшоў да высновы, што яны могуць пачаць наступленне ў раёне Копысі. Таму, як сведчыць магілёўскі летапіс Трубніцкага, у студзені 1708 г. «цар Пётр быў у Копысі», дзе асабіста кіраваў надбудовай існаваўшых умацаванняў і ўстаноўкай гармат.

Са знаходжаннем рускага цара на Аршаншчыне звязана гісторыя так званай хаткі Пят-

ра I, якая, па сведчаннях старажылаў, знаходзілася ля цвінтара Праабражэнскай царквы. Упершыню на факт існавання гэтай хаткі ўлады звярнулі ўвагу ў пачатку 1830-х гадоў. Копыскі гараднічы ў рапарце ад 12 жніўня 1832 г. даносіў магілёўскаму губернатару, што «в доме копысской мещанки Токаронковой соизволили квартировать блаженной памяти государь император Петр I и вырезал в оном своеручно какую-то надпись».

Праз два гады магілёўскі губернатар накіраваў расійскаму ўраду план хаткі Такаронкавай. У 1835 г. на імя міністра ўнутраных спраў Расійскай імперыі ад магілёўскіх улад паступіла папера, у якой гаварылася: «Во исполнение предложения вашего сиятельства от 10 декабря прошлого года представляю при сем вновь составленный план дома копысской мещанки Токаронковой, с рисунком слов, вырезанных на потолочной балке означенного дома». Далей паведамлялася аб нездавальняючым стане будынка.

Наступныя дакументы сведчаць, што цікавасць расійскага ўрада да пятроўскай хаткі паступова аслабела. На помнік гісторыі зноў звярнулі ўвагу ў канцы 1870-х гадоў, калі па ініцыятыве А.С.Дамбавецкага збіраліся матэрыялы для апісання Магілёўскай губерні. Стан будынка да таго часу аказаўся настолькі нездавальняючым, што бэльку з надпісам «БЛАГОСЛОВИ Г-ДИ ДОМ СЕЙ И ЖИВУЩИХ В НЁМ», які мог быць зроблены Пятром Вялікім, палічылі мэтазгодным даставіць у Магілёўскі губернскі музей. У ліпені 1881 г. гістарычная бэлька, да якой прыклаў руку Пётр I, заняла цэнтральнае месца ў экспазіцыі музея.

У 1890-я гадах пачалася рэстаўрацыя хаткі, і бэльку вярнулі з музея, уманціравалі на старое месца. Варта заўважыць, што памеры хаткі былі даволі сціплыя — 6 на 5 метраў, а вышыня 2 метры 10 сантыметраў. Над рэстаўрыраваным будынкам быў узведзены павільён. Зімой для аховы ад завеяў павільён з усіх бакоў завешваўся парусінай. Дзякуючы прынятым мерам разбурэнне помніка было прыпынена. Але далейшы лёс яго быў такім жа трагічным, як і тысяч іншых. У час другой сусветнай вайны пятроўская хатка згарэла. Яшчэ ў 1960-я гады копыскія старажылы і краязнаўцы сцвярджалі, што перад самым прыходам фашыстаў у Копысь частка бэлькі з аўтографам рускага цара была выпілена і, хутчэй за ўсё, зноў адпраўлена ў Магілёў. Што сталася з ёй пасля, устанавіць, на жаль, не ўдалося. *І.А.Яршоў.*

Дакументы сведчаць

З ГРАМАТЫ КАРАЛЯ СІГІЗМУНДА III АБ ПАЦВЕРДЖАННІ ПРАВОЎ І ПРЫВІЛЕЯЎ МЯШЧАНАМ ОРШЫ

26 ліпеня 1596 г.

Жигимонт III.

Ознаймуем сим нашим листом всим вобец и каждому заособна, нынешним и напотом будучым, иже били нам чолом Василий Михайлович, войт нашего Оршанского а Федор Захаревич сами от себя и от всех мещан наших оршанских и покладали перед нами лист продка нашего, славной памяти короля е.м. Стефана, в котором листе яко стороны обраные меж ними мещаны войта, так свободы, яко и волности, до того листа нашого Оршанского належачые, и повинности их вшелякие шырей и достаточней описаны и доложоны суть.

Подпис руки господарское.

Матей Война, писар.

Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў, ф. 389, кн. 78, л. 37—38.

ГРАМАТА КАРАЛЯ СІГІЗМУНДА III ЖЫХАРАМ МАПЛЁВА І ОРШЫ Ў СУВЯЗІ З ІХ АДМОВАЙ ПАДПАРАДКАВАЦЦА УНІЯЦКАМУ АРХІЕПІСКАПУ СЯЛЯВЕ І АБ ЗАСНАВАННІ ІМІ ПРАВАСЛАЎНАГА КУЦЕІНСКАГА МАНАСТЫРА

18 сакавіка 1627 г.

... А вы дей упорне спротивляючысь зверхности нашое, от нас порадке упривилеваному пастыру своему духовному отцу Антонему Селяве, неслушие с послушенства его выламуючысь, але згодна порозумевшыся з мещаны нашыми оршанскими, также з урожоным Богданом Стецкевичом и з малжонкою его, княжною Геленою Соломерецкою, власне за свои мо-

гилевские и оршанские грошы, на имя того Стецкевича и маложонки его, купивши вечностью именя, названое Кутейна, и село Поддубцов у потомков небощыка Каспера Швейковского, над р. Днепром, вы дей, могилевцы, з оршаны и з урожоным Стецкевичом и з малжонкою его, без ведомости и позволения нашого и без благословенства пастыра своего архиепископа, там, в Кутейне, монастыр и церковь своволную, менечы заложения св. духа...

У того листу печать е.к.м. Вел. кн. Лит. притеснена есть, а подпис руки короле е.м. тыми словы.

Сигизмунд король.

Кршитоф Корвин Кгносевский, писар.

З ЗАПІСКІ ЦАРСКАГА ГАНЦА ДЗЯКА КУЛАНАВА ЦАРУ АЛЯКСЕЮ МІХАЙЛАВІЧУ ПРА ВЫЗВАЛЕНЧУЮ ВАЙНУ

не раней 26 мая 1648 г.

А как гонец ехал в Краков, и в Орше, и в Борисове, и в Менску, и в Новогрудку, и в Слониме, и в Пружане, и во всех городах и в местах королевских и в весях лежат жолнеры и пустошат; А около Орши, и Минска, и Новогродка, и Слонима, и Бресте-Литовской на полях многих люди, а иные на колье четвертованные; а сказывали тех мест мещане, что все то кажнены мещане из животов и бедные люди невинные, и всех королевских мест мещане и пашенные люди от жолнеров в конечном разоренье.

ЧАЛАБІТНАЯ ЖЫХАРОЎ ОРШЫ ЦАРУ АЛЯКСЕЮ МІХАЙЛАВІЧУ АБ ВЫДАЧЫ ІМ ДАРЧАЙ ГРАМАТЫ

20 жніўня 1654 г.

Государю царю и вел. кн. Алексею Михайловичю...[Т], бьют челом холопи твои Ворши города Федка Васильев сын, бурмистр, да Васка Сущ, да ермошка Ракушин.

В нынешнем, государь, во [7]162 [1654] г. выехали мы, холопи твои, на твое царьское имя служити тебе, государю, верою и правдою. Милосердый государь царь и вел. кн. Алексей Михайлович ...[Т], пожалуй нас, холопей своих, вели, государь, нам жить на старых своих юртишках и о том дать нам свою государеву жаловалную грамоту, чтобы нам, холопем твоим, и женишкам и детишкам нашим от твоих государевых ратных людей налоги, и истеснения, и разорения не было.

Царь государь, смилуйся.

На обороте: [7]162 [1654] г. августа в 20 день, государь пожаловал, велел им всему городу дать оберегалную грамоту.

АХОЎНАЯ ГРАМАТА ЦАРА АЛЯКСЕЯ МІХАЙЛАВІЧА ЖЫХАРАМ ОРШЫ

25 жніўня 1654 г.

Божею милостию, от великого государя царя и вел. князя Алексея Михаиловича...[Т], н.ц. вел. бояром и воеводам и всяким приказным людем.

Били челом нам, великому государю, н.ц. вел., гор. Орши бурмистры, и райцы, и лавники, и все мещане посполито: в нынешнем де во [7]162 [1654] г. учинилися они под н.ц. вел. высокою рукою и веру нам, великому государю, по святой евангельской заповеди в Орше перед н.ц. вел. бояры и воеводы, перед ближним нашим боярином перед кн. Яковом Куденетовичем Черкаским с товарыщи, в подданстве учинили на том, что им, оршаном, быти под н.ц. вел. высокою рукою в вечном подданстве и служити нам, великому государю, верою и правдою; и нам бы, великому государю, н.ц. вел., пожаловати их, поволити им в Орше жити на прежних их местах, и что бы им с женами и с детьми от наших ратных людей налоги и никакова утеснения и разорения не было, и о том дати им н.ц. вел. оберегательную грамоту. И мы, великий государь и вел. кн. Алексей Михайлович...[Т], бурмистров, райцов, и лавников, и всех посполито гор. Орши посадских людей пожаловали, на прежних их местех жити им поволили и ото всяких людей оберегать и разоренья над ними никакова чинити не велели. И по нашей государской милости н.ц. вел. бояром и воеводам и всяким приказным людем гор. Орши бурмистром, и райцом, и лавником, и всем посполито посадским людем на прежних их местех жити велети и от н.ц. вел. ратных и ото всяких людей велети их оберегать, и разоренья никакова над ними чинити и жон их и детей в полон имати отнюдь никому не велети. А кто, за нашею государскою милостию, учнет над ними какое разоренье или грабеж чинити, или учнут из розгоняти, или в полон самих или их жон и детей имати, или какое-нибудь насилие над ними чинити, и тем людем за тое от нас, великого государя царя и вел. кн. Алексея

Михаиловича ...[Т], быти в великом жестоком наказанье и в казни безо всякой пощады. А прочитая сю н.ц. вел. грамоту, отдавали б есте бурмистром, и райцом, и лавником, и мещаном.

Дана ся н.ц. вел. оберегалная грамота в н.ц. вел. походе на стану под Смоленском лета от создания миру 7162 [1654] г. месяца августа 25 дня.

Друкуецца па кн.: Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1960. Т. 2. С. 76—77.

З гісторыі Аршанскай мытні

Але спачатку, да апісання, што ж уяўляў ён, Аршанскі павет, больш за два стагоддзі таму, а дакладней у 1765 годзе?

«Мяжуе з Масковіяй на ўсходзе, а з Мсціславам па р. Сожу, з Рэчыцкім пав. на поўдні, з Мінскім ваяв. па р. Барэзіне, а з захаду на поўнач з Полацкім і Віцебскім ваяв.».

«Мытныя пункты: Галоўная мытня ў Магілёве, 1-ы ў Чавусах, 2-і ў Барысаве, 3-і ў Бялынічах, 4-ы ў Быхаве, 5-ы, новаўстаноўлены, у мяжы Ляды, што знаходзіцца на самай маскоўскай граніцы, дзе р. Мярэя аддзяляе Масковію ад Аршанскага пав., на якой млын і мост, да палавіны належачы Масковіі. За мостам, на Маскоўскім баку, шэлегаўская карчма, пры якой фарпост і мытня, дзе пропуск для купцоў, што едуць з Масковіі ў польскія краі.

Аднак не ўсе маскоўскія купцы там праходзяць, бо іншыя ў в. Гусіны Дубровенскага ўладання, якое знаходзіцца ў 4-х мілях ад Ляд над Дняпром, ля Маскоўскай мяжы па дагаворанасці з мясцовым гусінскім арандатарам, без уплаты ў казну ўпотай правозяць на лодках тавары ў в. Гусіна, а потым транспарціруюць па Дняпры да гор. Дуброўна. Той жа гусінскі арандатар скупляе ў Аршанскім і Віцебскім пав. гарэлку ў бочках па некалькі тысяч, якую ў начны час прадае маскавітам, прычым распрадае за адну ноч 7 і больш бочак гарэлкі. Казне ж ад гэтага ён нічога не плоціць».

...У той час «купцы звычайна як летам, так і зімой праходзяць употай, абыходзячы мытні, а таксама мытныя пункты...» і, «...увайшоўшы ў змову з тамашнімі мяшчанамі, складваюць у іх тавары і, там знаходзячыся, прадаюць. А ў час кірмашоў яны раз'язжаюць па розных гарадах і мястэчках, развозяць тавары і ў казну нічога не плоцяць...»

Вось «Найменаванне відаў замежнага заморскага тавару, правазімага кантрабандным шляхам...»: «...медзь, латунь у лістах — забаронены тавар, жалеза сібірскае і дзямідаўскае, жалезныя патэльні таго ж роду, чай, мыла, воск, сала, юфтавыя скуры, дарагія футры, саболі, чарнабуркі — шкуркамі, куніцы, чорныя лісіцы, пясцы белыя, пясцы чорныя» і г.д. і да т.п.

Аднак у гэтым пераліку і рэчы па сенняшніх часах проста экзатычныя: «...расамахі цэлыя і рысі, звычайныя маскоўскія мядзведзі, белыя сібірскія мядзведзі, медзведзяняты, воўчыя шкуры звычайныя, шкуры белыя сібірскіх ваўкоў, асетр, карп, шчупак, судак вэнджаны...»

А далей зноў быццам не дзвесце гадоў таму спіс складаўся, а сёння: «палатно маскоўскае, хусткі вязаныя, шапкі, пальчаткі» і да таго падобнае.

«Апісанне гандлевых шляхоў, кірмашоў, мытняў і тавараў, правозімых кантрабандна з-за мяжы ў Аршанскім павеце»

Вучоныя мяркуюць

Старорусская православная фамилия Стеткевичей в XVI и XVII веках владела обширными поместьями в Оршанском повете, известна своими представителями на разных служебных постах, преимущественно в Белоруссии, по своим родственным связям с кня-

жескими фамилиями Друцких-Горских, Огинских, Саломерецких, особенно по своей преданности православию и благотворениям в пользу православной церкви.

Белоруссия и Литва. СПб., 1890.

Генваря в 18 день (1699 г.). Приехал в город Оршу, от Переволочики 6 миль польских. Город Орша место было немалое, замок был каменный, а ныне развалился, и в городе всё пусто.

Путевые заметки стольника П.А.Толстого о Могилевской губернии в 1697—1699 гг. // «Могилевские губернские ведомости». Могилев-губернский, 1900. Вып. 1.

В 1755 году умирает Иероним Вольчанский. 20 августа 1755 года Киевским митрополитом в сан Белорусского епископа посвящен Георгий Конисский.

Летом 1759 г. он посетил г. Оршу с целью ободрения находившихся здесь православных монастырей и церквей. Здесь же в это время находилась католическая миссия. Георгий Конисский служил в Кутеенском монастыре и сказал поучение народу, который предостерегал от «волков». На служении был один з переодетых миссионеров вместе со своими учениками. Когда Георгий Конисский, по окончании службы, отправился из монастыря в город, толпы католических миссионеров, шляхтичей и солдат сопровождали его насмешками, неистовыми криками и ругательствами, запретили православным звонить в колокола и разогнали городские цехи, вышедшие с хоругвями на встречу своему епископу.

Однажды во время богослужения католические миссионеры с разною чернью напали на церковь, где служил Георгий Конисский, били людей и, ставши перед епископом, надевали шапки и кричали «попе, хлопе, схизматику», произнося и другие оскорбительные ругательства. Георгий Конисский вынужден был прекратить службу и, спасая свою жизнь от разъяренной толпы, приказал положить себя в крестьянскую телегу с навозом, под которым и был тайно вывезен из города.

Титов Ф.И. Русская православная церковь в польско-литовском государстве в XVII—XVIII вв. // «Могилевские губернские ведомости». Могилев-губернский, 1900. Вып. 1.

Аршанская шляхта

Ваеннаслужачы стан (саслоўе) — шляхта — панаваў у Вялікім княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай. Толькі шляхціц мог займаць дзяржаўныя пасады, удзельнічаць у павятовых сеймiках і быць абраным дэпутатам на агульнадзяржаўны сейм. Толькі шляхціцу гарантавалася асабістая свабода і вызваленне ад падаткаў і павіннасцей (за выключэннем вайсковай службы і падаткаў на вайну). Толькі шляхціц мог свабодна купляць і прадаваць маёнткі, валодаць сялянамі, без аплаты мыта вывозіць за мяжу на продаж прадукты, вырабленыя ў сваёй гаспадарцы. Шляхта рабіла гісторыю дзяржавы.

Шляхецкая годнасць, званне шляхціца перадавалася выключна па мужчынскай лініі рода, «па мечы». Атрымаць шляхецтва мог і чалавек ніжэйшага стану. Можна было атрымаць шляхецтва праз пасынаўленне, але толькі тады, калі на гэтае пасынаўленне згаджаецца ўвесь род і сейм. Шляхецкую вартасць мог дараваць і кароль.

Паводле Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г. (раздзел IV, артыкул 20) шляхецтва надавалася нашчадкам ад шлюбу шляхціца і прасталюдзінкі (таксама, як і ёй самой). Але ў выпадку другога яе шлюбу з чалавекам нешляхецкага паходжання прыналежнасці да шляхты пазбаўлялася сама жанчына і яе нашчадкі ад гэтага шлюбу.

Асноўным абавязкам шляхціцаў была вайсковая служба. Таму ў памежных землях, дзе існавала пагроза нападу суседніх дзяржаў, жыла вялікая іх колькасць. Шмат жыло і на Аршаншчыне. Немалая частка аршанскай шляхты (як і ўвогуле беларускай) была незаможнай. Пра беднасць тутэйшай шляхты хадзіла легенда (зафіксаваная нават дакументальна): стаміўшыся выбіраць багатых шляхціцаў дэпутатам на сейм, аршанская галота выбрала пасланца са сваіх шэрагаў. Справіўшы яму за грамадскі кошт каня і добрае адзенне, выдалі грошы на дарогу і паслалі ў Новагрудак. Прыехаўшы за некалькі дзён да пачатку сейму, аршанскі дэпутат прапіў у

корчмах і шынках усе грошы, каня ды адзенне. П'яны, расхрыстаны шляхціц заваліўся ў залу, дзе ішло пасяджэнне, і з парога закрычаў: «Veto», скарыстаўшыся правам шляхціца на забарону рашэння сейму.

У «Аршанскім гербоўніку» ўзгадваюцца многія вядомыя і цяпер на Аршаншчыне прозвішчы: Абрамовічы, Акшэўскія, Астроўскія, Бардзілоўскія, Бучынскія, Васілеўскія, Гатоўскія, Грушэцкія, Дадэркі, Навагонскія, Навацкія, Пашкоўскія, Пажарыцкія, Пузырэўскія, Янкоўскія і многія іншыя.

Вядомымі людзьмі на Аршаншчыне былі князі Друцкія. Род гэты даў адгалінаванні князям Горскім, Любецкім, Азярэцкім, Саколінскім, Талачынскім. Князь Андрэй Іванавіч Азярэцкі — аршанскі дзяржаўца (1551).

Князь Ян Горскі — маршалак аршанскі (1590). Князь Рыгор Горскі — староста аршанскі, ваявода мсціслаўскі; у 1648 г. напачатку казацкага паўстання разам з сынам Міхаілам мужна адганяў казакоў ад свайго павета.

Князь Міхаіл Горскі — староста аршанскі, памёр маладым.

Князі Друцкія-Саколінскія — род, які заснаваў каталіцкі дамініканскі кляштар і праваслаўную царкву Раства ў Оршы.

Князі Сангушкі-Ковельскія герба Пагоня вядуць свой род ад Любарта — аднаго з сыноў Гедыміна. Васіль Міхайлавіч Сангушка падарыў Ковель каралеве Боне, а ад яе атрымаў Смаляны, Абольцы, Горваль. Памёр у 1558 г. Яго праўнук Сямён Самуэль Сангушка збудаваў у Смалянах замак Белы Ковель. Меў сыноў — Казіміра, Гераніма, Яна. Казімір забіты ў аршанскім краі ў маёнтку маскавітамі ў 1655 г. Геранім стаў святаром, быў біскупам смаленскім, памёр у 1657 г. Ян — адважны ротмістр і палкоўнік, памёр маладым у 1652 г.

Сапегі герба Ліс — таксама вядомы ў Вялікім княстве Літоўскім род. Яны вядуць свой радавод ад аднаго з Гедымінавых сыноў — Нарымунта. Мікалай Сапега (1529—1609) — староста аршанскі, суражскі, веліжскі. Рыгор Сапега — родны брат канцлера Вялікага княства Літоўскага Льва Сапегі, падкаморны аршанскі, памёр у 1615 г. Андрэй (яшчэ адзін родны брат Льва Сапегі) быў старостам аршанскім.

Казімір-Леў Сапега (1609—1656) быў трэцім сынам Льва Сапегі. Атрымаўшы вялікую спадчыну па сваіх бяздзетных братах, сярод іншых пасад атрымаў і званне аршанскага старосты. Атрымаў адукацыю ў Віленскай Акадэміі, потым вучыўся ў Мюнхене і Нідэрландах (з 16 гадоў). Аб'ехаў усю Італію, Францыю і Германію. Валодаў 7 мовамі. Вялікі князь ВКЛ і кароль польскі Жыгімонт III вельмі любіў маладога Сапегу, прызначыў яго пісарам Вялікага княства Літоўскага (1630) і даверыў нагляд за архівам Рэчы Паспалітай. У 1638 г. Казімір-Леў Сапега стаў маршалкам надворным, а потым (у 1643 ці 1645) падканцлерам Вялікага княства Літоўскага. Фундаваў у 1648 г. дзве кафедры Віленскай акадэміі — цывільнага і царкоўнага права, аддаўшы на гэтыя мэты Пачаёвіцы, размешчаныя ў Аршанскім павеце.

Кароль Уладзіслаў IV так высока ставіў Казіміра-Льва Сапегу, што называў яго сваім душапрыказчыкам. Багацце Сапегі было настолькі вялікім, што дазволіла яму падрыхтаваць сярэбраную труну для Іасафата Кунцэвіча. Каштавала яна 63 тыс. талераў — вялікая сума на тыя часы.

Дз.В.Дзядзенка.

Аршанскія дзяржаўцы і старосты

Беларускія гарады спачатку кіраваліся згодна з вечавым правам, пазней — згодна з магдэбургскім правам.

Цэнтральную (велікакняжацкую і каралеўскую) уладу ў Оршы ў 16—18 ст. увасаблялі «дзяржаўцы» і «старосты». На жаль, вядома пра іх мала — імёны, прозвішчы і, не заўсёды, гады знаходжання на пасадзе.

Дзяржаўца ў велікакняжацкіх уладаннях (якім горад стаў з канца 17 ст.) з'яўляўся часовым уладальнікам і эканомам дзяржаўнага маёнтка і адначасова ўзначальваў мясцовае кіраванне і суд, сачыў за своечасовым зборам падаткаў, адказваў за абарону замка.

Вядомы гісторык літоўска-беларускага права Іосіф Юхо (дарэчы, наш зямляк) лічыць, што «дзяржаўца» — гэта самая дроб-

ная пасада ў мясцовым кіраванні, якая давала ўладу і даходы толькі з замка ці фальварка. Староста ж кіраваў паветам, прызначаўся вялікім князем і панамі — радай — пажыццёва і ў сваім павеце меў паўнамоцтвы, блізкія да ваяводскіх.

Першы вядомы па апублікаваных дакументах «державца Рошский» — князь Васіль Юр'евіч Талачынскі, які ўзгадваецца на гэтай пасадзе ў дакументе 1541 г. Ён належаў да аднаго з адгалінаванняў старажытнага княжацкага роду Друцкіх.

Наступны аршанскі дзяржаўца князь Андрэй Іванавіч Азярэцкі ўзгадваецца ў дакументе 1551 г. Князі Азярэцкія былі яшчэ адным адгалінаваннем роду князёў Друцкіх.

Асобна трэба адзначыць надзвычай цесную сувязь Друцкіх з Оршай.

Наступны пасля Азярэцкага аршанскі адміністратар Пётр Дзмітрыевіч Корсак у дакументе 1559 г. ўжо называецца старостам, а ў лісце вялікага князя ў 1652 г. ўзгадваецца ў якасці дзяржаўцы. Адрасат гэтага ліста, спадкаемец Корсака на пасадзе князь Андрэй Сямёнавіч Адзінцэвіч, таксама называецца ў ім «дзяржаўцам». «Інвентар Аршанскага замка», складзены ў 1560 г., якраз зафіксаваў перадачу пасады князю А.С.Адзінцэвічу пасля смерці Корсака.

Князі Адзінцэвічы таксама валодалі землямі ў межах Друцкага княства. Мяркуючы па даце прызначэння на пасаду самага вядомага з аршанскіх старостаў Філона Кмітыч-Чарнабыльскага, князь Адзінцэвіч памёр у 1567 г. Кміта быў прызначаны каралеўскім прывілеем ад 1 чэрвеня 1567 г. Ён найбольш вядомы як аўтар цікавых з гістарычнага і літаратурнага пунктаў погляду «Лістоў...». Крыху меней вядома пра яго талент ваяводы. Непасрэдна перад сваім прызначэннем, у 1564 г., ён здолеў перамагчы 80-тысячнае маскоўскае войска, якое стаяла на адлегласці 2 міль ад Оршы, з дапамогай аднаго, словамі летапісца, «фортеля».

У адным са сваіх лістоў Кміта-Чарнабыльскі сярод сваіх папярэднікаў на пасадзе аршанскага старосты называе, апрача ўжо вядомых нам Азярэцкага і Адзінцэвіча, таксама князя Заслаўскага. Філон Кміта-Чарнабыльскі заставаўся на пасадзе аршанскага старосты да сваёй смерці ў 1587 г. Дакументы 1590, 1594 і 1599 гадоў называюць аршанскім старостам Андрэя Іванавіча Сапегу. З таго часу гэтая пасада надоўга трапляе ў рукі аднаго з самых старажытных і ўплывовых родаў княства — Сапегаў, самым вядомым прадстаўніком якога быў канцлер ВКЛ Леў Сапега, аўтар «Статута» 1588 г.

У пачатку 17 ст. вялікі князь пачынае прызначаць у Оршу войта (раней войт выбіраўся мяшчанамі). У 1620 г. войтам у Оршы быў Аляксандр Сапега. Дакумент 1681 г. ўзгадвае ў якасці старосты Сапегу Аляксандра Даджыбога. Двойчы аршанскім старостам прызначаўся Сапега Казімір-Леў (1609—1656), удзельнік Палянскіх мірных перамоў у 1634 г. і вайны з Расіяй 1654—1667 гг. З 1643 г. ён быў падканцлерам Вялікага княства Літоўскага, загадваў архівам Рэчы Паспалітай.

Наступнымі аршанскімі старостамі да 1788 г. былі: Пётр Палімскі, Альбрэхт Цэханавецкі, Крышпін Кіршэнштайн, Аляксандр Межык, Хлябіцкі-Іажэфавіч, Мікалай Храпавіцкі, Літавор Іаахім Храптовіч.

В.М.Сцяпанаў.

Аршанскі староста Філон Кміта

Сярод помнікаў пісьменнасці апошняй трэці 16 ст. вялікую цікавасць выклікае служ-бовая перапіска аршанскага старосты Філона Сямёнавіча Кміты-Чарнабыльскага з членамі рады Вялікага княства Літоўскага...

Ва ўзросце 32 гадоў (нарадзіўся ён у 1530 г.) Філон Кміта меў ужо чын ротмістра і быў прызначаны адміністратарам пагранічнага з Маскоўскай дзяржавай замка Асцёр. Такая пасада не адпавядала характару маладога ротмістра і яго ўяўленням аб сваім будучым. Па прыкладу свайго бацькі, беларускага шляхціца Сямёна Кміты, які быў камандуючым кіеўскімі і чаркаскімі войскамі на Украіне, Філон прагнуў рамантыкі ваенных баталій. Таму амаль увесь свой далейшы лёс ён звязаў з небяспечнай ваеннай службай. За яго плячыма — шмат выніковых аперацый і перамог.

Аршанскі староста Ф.Кміта-Чарнабыльскі.

Гэтыя перамогі былі дасягнуты Кмітам у вельмі складаны для Вялікага княства Літоўскага час — у Лівонскую вайну 1558—1583 гг. 15 лютага 1563 г. маскоўскімі войскамі быў узяты галоўны ўсходні фарпост дзяржавы — Полацк. Жыгімонт II Аўгуст запрасіў перамір'я. Дамоўленасць была дасягнута, але перагаворы аб міры вынікаў не далі. У студзені 1564 г. ваенныя дзеянні аднавіліся. Філон Кміта з атрадам колькасцю каля 2000 чалавек прыкрываў галоўныя сілы ВКЛ, якія рухаліся да Полацка.

Філон Кміта 2 лютага 1564 г. нанёс нечаканы і моцны ўдар па атрадзе маскоўскага войска, які стаяў каля Оршы, на р. Крапіўна. Летам 1565 г. Філон Кміта, атрымаўшы некалькі перамог над асобнымі атрадамі маскоўскіх войск, вярнуўся ў Асцёр. Аб ваенным таленце маладога ротмістра загаварылі ў Вільні, Варшаве і Маскве.

Ваенныя заслугі Кміты былі высока адзначаны кіраўніцтвам Вялікага княства Літоўскага. 26 сакавіка 1566 г. кароль Рэчы Паспалітай і Вялікі князь ВКЛ Жыгімонт II Аўгуст, падараваў яму ў вечнае карыстанне землеўладанне ў Кіеўскім ваяводстве з Чарнобыльскім замкам. Ад гэтага часу Філон насіў прозвішча Кміта-Чарнабыльскі. Яшчэ праз год ён атрымаў пасаду старосты ў Оршы. З гэтага часу і да смерці, якая напаткала яго ў 1587 г., лёс Кміты быў звязаны з горадам на Дняпры.

Накіроўваючы Кміту-Чарнабыльскага ў Оршу, урад ВКЛ спадзяваўся, што арганізатарскі талент і моцная воля ротмістра дазволяць падтрымліваць парадак у гэтым вельмі важным у стратэгічных адносінах памежным горадзе. Ініцыятыва ў ваенных справах на той час поўнасцю перайшла на бок Маскоўскай дзяржавы. Ва ўмовах значнага пагаршэння становішча спадзявацца на вяртанне Смаленска было нерэальна. Аб'ектыўна Орша станавілася важнейшым памежным горадам. Больш таго, праз яе ў Маскоўскую дзяржаву ехалі паслы і іншыя важныя асобы заходнееўрапейскіх краін, а таму аршанскі староста павінен быў мець і дыпламатычныя здольнасці. Усімі гэтымі якасцямі ў поўнай меры валодаў Філон Кміта.

Ваенная ўдача не заўсёды спадарожнічала аршанскаму старосце. Пазнаў ён і горыч паражэнняў. У 1580 г. Кміта-Чарнабыльскі з атрадам уварваўся на тэрыторыю Смаленшчыны. Адбылася сутычка з маскоўскімі воінамі. Вынікам яе стаў сакрушальны разгром. Аб гэтай падзеі ў Архіве разрадных кніг ёсць такі запіс: «Приходил к Смоленску пан Филон, а с им людей 9000... пасады пожечь, да воевать Смоленские и Дорогобужские места; да сходились было с Королем (Стафанам Баторыем — І.Я.) у Лук Великих; а король, взявши Луки, ждал Филона. И как пришёл Филон от Смоленска за 7 вёрст и стал в деревне Настасине, и пришли на него из Смоленска Ив. Мих. Бутурлин, да Мих. Глеб. Салтыков, да Пётр Аф. Нащокин, да Игнат Борис. Блудов... и из стана Филона сбили; и пошёл к крепости, да у крепости стал в обозе; Воеводы Государевы к обозу не приступали, чтобы ночь заняла; и тое ночи пошёл Кмита прочь, и воеводы за ним и сошли его на Спасских Лугах, от Смоленска за 40 вёрст, и побили на голову, и знамёна и наряд поимаши, и набаты, и литавры, и трубы и шатры и колымаги... а сам Филон пеш утёк на лес, а с ним 4 человека, пришёл в Оршу на шестой день».

Жорсткае паражэнне не астудзіла ваяўнічы пыл Кміты-Чарнабыльскага. У сакавіку наступнага года ў працяглым паходзе спустошыў ваколіцы Вялікага Ноўгарада. Вярнуўся

староста непераможаным, каб надзейна абараняць аршанскія землі. За заслугі перад дзяржавай Стафан Баторый узвёў Філона Кміту ў ранг сенатара з тытулам ваяводы Смаленска. Тытул ваяводы быў чыста намінальным, бо Смаленск заставаўся горадам Маскоўскай дзяржавы. А час ішоў...

Прайшлі стагоддзі. І вось у архівах даследчыкі знайшлі лісты аршанскага старосты. Кожны меў памету «Пісана на Оршы».

Лісты Кміты-Чарнабыльскага ўяўляюць сабой службовыя данясенні аб памежных справах і намерах цара Івана IV. Сустрэчы і пачастункі паслоў як з Масквы, так і ў Маскву давалі падрабязную інфармацыю аб становішчы спраў у Маскоўскай дзяржаве і намерах цара адносна Рэчы Паспалітай.

Лісты Кміты адлюстроўваюць уласныя адносіны аўтара да падзей таго часу. Калі ў 1572 г. памёр Жыгімонт II Аўгуст, апошні прадстаўнік дынастыі Ягелонаў, было вырашана запрасіць на трон Рэчы Паспалітай іншаземца. Да гэтага часу стала відавочным, што створанае ў 1569 г. ў выніку Люблінскай уніі дзяржаўнае аб'яднанне Польшчы і ВКЛ — Рэч Паспалітая — адмоўна адбілася на эканоміцы Вялікага княства Літоўскага. Не палепшылася і яго знешнепалітычнае становішча. У вайне з Маскоўскай дзяржавай уласна Польшча аказвала княству вельмі нязначную дапамогу. Стала зразумелым, што ў складзе новай дзяржавы ВКЛ стала адыгрываць залежную ролю. Частка феадалаў Вялікага княства Літоўскага пачала арыентавацца на Маскву і лічыла больш мэтазгодным запрасіць на каралеўскі трон Івана Васілевіча або яго сына Фёдара.

Разам з гэтым у ВКЛ існавала і моцная прапольская групоўка, аснову якой складалі феадалы-католікі. На якіх пазіцыях стаяў Філон Кміта-Чарнабыльскі? Адказ на гэта пытанне даюць яго лісты.

Вядома, што прамаскоўская групоўка праз пасла ў Маскве М.Гарабурду і каралеўскага ротмістра А.Тарноўскага пачала перагаворы аб перадачы каралеўскага трона Івану IV або яго сыну. У сваіх лістах да канцлера А.Валовіча аршанскі староста асуджае іх дзеянні, у якіх, на яго думку, больш клопату аб сваіх асабістых інтарэсах, чым аб дзяржаўных. У адным са сваіх лістоў ён канстатуе: «Пан Тарноўскі не Літвы, але толькі свае аднае скуры жалаваў, калі на святога Міхаіла аднаго тырана (Івана IV — І.Я.) за караля ўзяць абяцаў. І пан Гарабурда таксама мусіў да таго масквіцяніна ехаць».

Не спачуваў Кміта і прапольскай групоўцы. У адным з лістоў ён з жахам усклікае: «Не дай бог ляху быць! Выража Літву».

Пазіцыя аршанскага старосты была адназначнай — аднаўленне суверэнітэту дзяржавы. Дзяржавы, за якую на працягу стагоддзяў клалі галовы яе сыны. Дзяржавы, служба якой стала галоўным сэнсам яго жыцця, — Вялікага княства Літоўскага.

Чым можна растлумачыць такую пазіцыю Кміты — чалавека, не абдзеленага міласцю караля Рэчы Паспалітай?

Вядома, што значны ўплыў на яго светапогляд аказаў вялікі беларускі гуманіст-асветнік, пісьменнік і кнігавыдавец Васіль Цяпінскі. Заснаваўшы ў сваім радавым маёнтку Цяпіна друкарню, ён каля 1580 г. выдае перакладзенае на беларускую мову «Евангелле». У напісанай да яго прадмове аўтар выступае як абаронца беларускага народа, яго культуры, адстойвае ідэю братэрскай дружбы ўсходнеславянскіх народаў. Цяпінскі пэўны час жыў на Кіеўшчыне. Сустрэчы Філона Кміты з Васілём Цяпінскім з часам перараслі ў моцную дружбу. З пераездам Кміты ў Оршу сустрэчы з Цяпінскім сталі сістэматычнымі. У 1567 г. Цяпінскі быў «таварышам» коннай роты аршанскага старосты. Як і Кміта-Чарнабыльскі, ён прымаў удзел у Лівонскай вайне. Шматгадовыя назіранні за жыццём простага ўкраінскага, а потым і беларускага народа зацвердзілі веру ў правату думак гуманіста і асветніка аб цяжкім, змрочным жыцці чалавека працы. Апісваючы ў адным з лістоў гаротнае жыццё селяніна, Кміта з жалем канстатуе: «Ото, государю пане, от таковых бед люди топятся! Ото с таковых нендз давятся!»

Форма дзелавой справаздачы не скоўвала аўтара лістоў. Ён часта парушаў яе. Таму данясенні Філона Кміты ажыўлены разнастайнымі сродкамі паэтычнай стылістыкі, яны дынамічныя, эмацыянальна афарбаваныя. Добры знаўца фальклору, ён удала выкарыстоўваў прыказкі, прымаўкі, параўнанні, гумар, сатыру. Гэтыя прыёмы надавалі яго ўласным думкам пераканаўчасць, высокую дакладнасць.

Працяглая служба ў памежнай Оршы, сустрэчы з простымі людзьмі, добрае веданне

жыцця гараджан і сялян наклалі адбітак на мысленне Філона Кміты. Многія лісты апісваюць рэальны быт, маляўніча раскрываюць характары людзей, паказваюць асабістыя перажыванні аршанскага старосты і яго адносіны да навакольнай рэчаіснасці. У гэтым іх вялікая літаратурная вартасць.

Даследчыкі эпісталярнай спадчыны Ф.Кміты-Чарнабыльскага падкрэсліваюць, што, адлюстроўваючы падзеі і факты сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага жыцця пэўнага адрэзку гісторыі, даючы гэтым падзеям і фактам уласнае тлумачэнне, Філон Кміта стаяў ля вытокаў мемуарнага жанру.

Цікавыя па сваёй мастацкай арнаментальнасці, лісты аршанскага старосты, абмежаваныя зададзенай тэмай, падаюць невялікую частку гістарычных падзей таго часу. Знойдзеныя дакументы ахопліваюць кароткі адрэзак гісторыі — менш за год. Нягледзячы на гэта, яны — надзвычай прыкметная з'ява ў развіцці старажытнай беларускай пісьменнасці.

Перапіска Філона Кміты, акрамя гістарычных, мае шмат этнаграфічных і геаграфічных звестак. Добры знаўца навакольля, аршанскі староста ўпамінае шмат населеных пунктаў, рэк, азёр. Многія з іх існуюць і сёння.

Літаратурная вартасць лістоў Кміты-Чарнабыльскага прыцягнула да сябе ўвагу даследчыкаў яшчэ ў мінулым стагоддзі. У 1844 г. М.Машкоўскі і А.Пшаздзецкі ў выдадзеным у Вільні зборніку змясцілі ў храналагічным парадку 29 лістоў. Другое выданне было ажыццёўлена Пецярбургскай археаграфічнай камісіяй у 1848 г. У ім колькасць лістоў была скарочана да дваццаці, але тут змешчана некалькі дакументаў, якія не публікаваліся раней.

Эпісталярная спадчына Філона Кміты — багаты матэрыял для даследчыкаў старажытнай беларускай пісьменнасці, гісторыкаў, этнографаў, геграфаў. Дакладна вядома, што лісты аршанскага старосты выкарыстоўваліся вядомым вучоным Я.Карскім пры стварэнні ім грунтоўнай навуковай працы «Беларусы».

Лісты і асоба аўтара прыцягнулі пільную ўвагу не толькі навукоўцаў, а і пісьменнікаў. Жыццё і дзейнасць Філона Кміты былі добра вядомы вялікаму польскаму пісьменніку, лаўрэату Нобелеўскай прэміі Генрыку Сянкевічу. У прадмове да свайго гістарычнага рамана «Патоп» ён падкрэсліваў, што галоўны герой твора, Анджэй Кміціч — чалавек, які некалі рэальна існаваў. Яго бацька, шырока вядомы ў той час аршанскі староста, быў надзелены мноствам станоўчых рыс, шмат з якіх пераняў яго сын.

У віншаванні аршанцам у гонар 900-годдзя заснавання горада Ул.Караткевіч, падкрэсліваючы вялікую вартасць літаратурнай спадчыны Філона Кміты, называў яго «першым сярэдневяковым пісьменнікам» Аршаншчыны.

І.А.Яршоў.

Беларуская мінуўшчына. 1997. № 1.

Куцеінскі манастыр

У 2—3 кіламетрах ад старажытнага дзядзінца Оршы, ніжэй па Дняпры, на левым яго беразе, знаходзіцца Куцеінскі Богаяўленскі манастыр. У апошнія гады ў беларускім друку ўсё часцей згадваецца пра колішнюю лаўру, таленавітых куцеінскіх майстроў, славутую друкарню Спірыдона Собаля і яе выданні, выказваюцца клопаты пра зберажэнне і рэстаўрацыю помніка даўніны, які мае цікавую гісторыю. А пачалася яна ў 1620 г., калі аршанцы атрымалі ад патрыярха Іерусалімскага Феафана, што ў той час знаходзіўся ў Кіеве, грамату на заснаванне праваслаўнага мужчынскага манастыра. Дзяржаўныя ж дакументы на будаўніцтва былі выдадзены ў Варшаве на імя праваслаўнага магната Багдана Статкевіча-Заверскага і яго жонкі Алены Саламярэцкай. Толькі ўлічваючы аўтарытэт магната і яго багацце, улады далі на тое афіцыйны дазвол. Але асноўныя сродкі на стварэнне манастыра сабралі простыя аршанцы і магілёўцы — члены праваслаўных брацтваў (дарэчы, у Оршы такое брацтва ўзнікла ў ліку першых на Беларусі — у 1592 г.).

У 1623 г. пад Оршай у маляўнічым кутку векавога лесу, там, дзе зліваліся Дняпро і Куцеінка, зазвінелі пілы, застукалі сякеры. Пачалося ўзвядзенне манастырскіх будынкаў.



Куцеінскі манастыр. Рэканструкцыя печы 17 ст.

Вось як занатавана гэта падзея ў «Житиях» патрыярха Нікана: «Слышав святейший Патриарх, яко близь славнаго града Орши, иже быть глава и начало общему житью во всей Белой России и в Литве, созданная обитель, или рещи, Лавра велика зело Святого Богоявения Господня, зовома Кутейно, юже воздвиже боголюбивый иеромонах Иоиль, иже бысть Игумен Лавры тоя, и не токмо сию едину, но ины многи своими труды и поты сооружи и иночествующих множества собра, и во своей пастве всех имеяй и благочестие во всей Белоуй России утверждаяй и удерживаяй во время гонения от развраіения униатов...»

Будаўніцтва Куцеінскага манастыра (назву пераняў ад невялічкай рачулкі Куцеінкі) узначаліў іераманах Іаіль Труцэвіч, член магілёўскага праваслаўнага брацтва і яго актыўны дзеяч (пазней стаў ігуменам лаўры). Адным з першых тут з'явіўся Богаяўленскі сабор. Амаль на сорак метраў узвышаўся над наваколлем гэты чатырохзрубны крыжова-купальны храм. Тры зрубы мелі форму пяціграннікаў, а чацвёрты, што знаходзіўся з заходняга боку, быў квадратны. Вялізны гранёны купал завяршаў сяродкрыжжа пабудовы, крыху меншымі купаламі заканчваўся кожны асобны зруб. Уваход дойліды выканалі ў выглядзе прыгожай адкрытай галерэі.

Недзе ў 1635 г. будаўніцтва сабора поўнасцю завяршылася, тады ж кіеўскі мітрапаліт Пётр Магіла асвяціў яго. Але яшчэ на працягу некалькіх гадоў рэзчыкі па дрэве, якімі ў той час славілася Орша, стваралі велічны 6-ярусны разны іканастас. Мастакі аздобілі драўляныя сцены шматлікімі роспісамі (толькі пералік іх у старым апісанні царквы займае амаль 4 старонкі).

У пачатку 20 ст. адкрылася цікавая таямніца. Аказалася, што пад падмуркам сабора некалі меўся падземны храм Уваскрэсення Праведнага Лазара. У часопісе «Наш край» (1926, № 2,3) аршанскі краязнавец Е.Цехановіч у артыкуле «Пячорная царква і падземны ход у Варшанскім Куцеінскім манастыры» паведамляў: «...не так даўно (каля 1910—1912 гг.) манахамі манастыра былі выкрыты рэшткі старадаўняй пячорнай падземнай царквы, у якую вядуць глыбока ўніз вузкія сходы. Спусціўшыся ўніз, пападаеш у крыжападобную па форме з нізкім каменным скляпеннем пячору. Пячора мае плошчу каля 11 кв. м. Алтарная сцяна пячоры каменная, з трыма праходамі, алтар мае плошчу 2 кв. м, на месцы прастола быў нізкі драўляны крыж, абкладзены каменнем. Крыжа гэтага цяпер на сваім месцы няма, як няма і вынікаў даследаў, зробленых манахамі ў паказанай пячоры.

Улева ад пячоры пачынаецца не даследаваны яшчэ нікім падземны ход, які апускаецца ўсё ніжэй і ніжэй пад Дняпро. Некаторымі вядомымі мне (Е.Ц.) асобамі былі зроблены спробы агледзець гэты падземны ход, але вільгаць, холад і нават, як яны казалі, страшэнны вецер не дапусцілі іх што-небудзь выявіць...»

Доўгі час засыпаны зямлёй храм заставаўся загадкай. Толькі ў 1988 г. пачаліся дасле-

Гербавая кафля 17 ст. з Куцеінскага манастыра.

даванні пабудоў колішняга Куцеінскага манастыра, зноў робяцца спробы раскапаць важны гістарычны помнік. Навукоўцы ўжо і сапраўды адкрылі невялікія падземныя памяшканні, перакрытыя скляпеннямі, што прымыкаюць да падмурка былога Богаяўленскага сабора. Адно з іх (з паўночна-ўсходняга боку) па памерах і планіроўцы дакладна адпавядае прыгаданаму ў часопісе «Наш край». Але гэта пакуль толькі пачатак пошукаў, і ў будучым, напэўна, з'явяцца новыя знаходкі.

Дарэчы, падземны храм накшталт упамянутага згадваецца ў апісанні Святадухаўскага манастыра ў Вільні, а на Беларусі існаванне такой царквы звязваюць яшчэ і са Смалянамі на Аршаншчыне. Але ніводнае з тых надзвычай цікавых культавых збудаванняў не вывучалася дэталёва. Вядома толькі, што ствараліся ўсе яны ў 1-й палавіне 17 ст.

На тэрыторыі Куцеінскага комплексу захавалася Святадухаўская царква — помнік архітэктуры беларускага барока. Узводзілася яна ў 1-й палавіне 17 ст. і, згодна з існуючымі звесткамі, раней была двухпавярховай. Аднак у 1762 г. (па іншых меркаваннях, у 1869-м) значна перабудавана і пераасвечана ў Троіцкую. Вядомы беларускі грамадскі, палітычны і царкоўны дзеяч Афанасій Філіповіч, які некаторы час жыў у тутэйшым манастыры, засведчыў у сваім «Дыярыушы» наступнае: «...Оршане бедные за тое, що в братстве своём новую церков збудовали, двесте червоных золотых подканцлерому за печать давали». Магчыма, менавіта Святадухаўскую царкву ён меў на ўвазе, калі пісаў гэтыя радкі. А манастырская пячатка зберагалася да нашых дзён. Выраблена яна з жалеза, рабочая частка яе мае авальную форму памерам 45 × 51,2 мм.

На абнесеным цаглянай сцяной (рэшткі стаяць з паўночнага і ўсходняга бакоў) двары манастыра ўцалеў будынак (праўда, значна перароблены). У ім калісьці акрамя келляў, дзе жылі манахі, размяшчалася вялікая трапезная, духоўнае вучылішча, недзе тут, як мяркуецца, была і славутая друкарня Спірыдона Собаля. Толькі заходняя сцяна пабудовы не страціла дагэтуль свой першапачатковы выгляд.

Часткова захавалася і маляўнічая алея з векавых ліп — ад Святадухаўскай царквы яна вяла да брамы з паўночнага боку. Уздоўж алеі раней месціліся шматлікія пахаванні, аб чым сведчаць некалькі каменных надмагілляў з ледзь прыкметнымі на іх надпісамі.

На высокім пагорку на ўсход ад Богаяўленскага манастыра знаходзіліся даўнія вялікія могілкі. Яшчэ некалькі гадоў назад спыняліся і маліліся на гэтым месцы старыя гараджане... Пагорак і «занядбаныя», як вызначылі, пахаванні на ім знесены ў 1987 г. Відовішча праяўлення сучаснага вандалізму магчыма назіраць і на правым беразе Дняпра насупраць манастыра. Будаўнічым работам не сталі перашкодай нават некалькі соцень пахаванняў 18—19 ст.: рэшткі каваных агароджаў, мноства каменных надмагілляў...

Найбольш значныя падзеі ў гісторыі Куцеінскай лаўры адносяцца да сярэдзіны 17 ст. Пра яшчэ не поўнасцю збудаваны манастыр ведалі ўжо далёка за межамі Аршаншчыны. Тут працавала майстэрня па перапісванні і пераплёце кніг. І гэта не выпадкова. У манастырскае брацтва, якое налічвала каля двух соцень чалавек, уваходзіла шмат таленавітых майстроў: мастакоў, рэзчыкаў па дрэве, чаканшчыкаў, гравёраў. Сам ігумен Іаіль Трубецэвіч быў высокаадукаваным чалавекам і добра разумеў патрэбу ў асветніцкай дзейнасці. Напэўна, яго намаганнямі ўдалося пераканаць Багдана Статкевіча-Заверскага ў неабходнасці адкрыцця пры манастыры друкарні.

Накладка на пераплёт Евангелля, знойдзеная ў Богаяўленскім саборы Куцеінскага манастыра. Каляровы метал. Раскопкі В.М.Ляўко. 1993 г.

Недахоп кніг з'яўляўся на той час адной з галоўных праблем у навучанні. Наведаўшы ў 1630 г. Кіеў, магнат бліжэй пазнаёміўся з друкарскай справай, запрасіў кніжніка Спірыдона Собаля дапамагчы стварыць і наладзіць работу друкарні пры Куцеінскай лаўры.

Куцеінскі комплекс значна пашырыўся ў 1631 г., калі маці Багдана Статкевіча-Заверскага княгіня Ганна Агінская заснавала вышэй па рацэ Успенскі жаночы манастыр. У яго ўваходзілі некалькі драўляных цэркваў і сабор (згарэў у 1635 г., праз 20 гадоў на яго месцы ўзвялі мураваны ў стылі барока), жылыя і гаспадарчыя памяшканні. На Куцеінцы быў пабудаваны вадзяны млын і мост.

Станаўленне Куцеінскай лаўры праходзіла ў складаны час. Прыхільнікі рымска-каталіцкага веравызнання варожа адносіліся да праваслаўных, асабліва з пачаткам у 1654 г. вайны Расіі з Рэччу Паспалітай. Непрыязнасць улад да мясцовых манастыроў значна ўзмацняла і тое, што ігумен Іаіль Труцэвіч і яго паплечнікі больш актыўна распаўсюджвалі думку аб неабходнасці прыналежнасці Заходняй Русі маскоўскаму цару.

Цар Аляксей Міхайлавіч, які наведаўся сюды ў 1656 г., высока ацаніў талент тутэйшых умельцаў. Па яго загадзе славутых рэзчыкаў па дрэве Арсенія і Герасіма, гравёра Паісія забралі ў Маскву, дзе яны працавалі ў Аружэйнай палаце Крамля, аздаблялі Каломенскі палац цара і цэрквы ў Ізмайлаве. Сваю дзейнасць прадоўжылі ў Маскве і колішнія куцеінскія друкары, а сярод іх — вядомы майстар па вырабе матрыц для адліўкі шрыфта Калістрат.

У канцы 18 ст. некалі знакамітая лаўра стала заштатным манастыром, які з таго часу быў вядомы ў Оршы як Загарадны, а ў 1842 г. прыпісаны да Пакроўскага (раней уніяцкага базыльянскага) манастыра. Нібы працягам пакут былога Куцейна з'явіўся пажар драўлянага Богаяўленскага сабора. Праіснаваўшы роўна два з паловай стагоддзі, летам 1885 г. ён згарэў ад удару маланкі.

Аднак шматлікія страты не спынілі зусім жыццё ў старажытным манастыры. Доўга яшчэ дзейнічала заснаванае тут у 1874 г. аднакласнае вучылішча, дзе адукаваныя манахі вучылі дзяцей беднякоў з Оршы і навакольных вёсак, а хворыя карысталіся паслугамі мясцовай аптэкі. Праводзіліся нязначныя рэканструкцыі і аднаўленне манастырскіх будынкаў. Так, у 1890 г. было завершана ўзвядзенне велічнай мураванай вежы-званіцы з шатровым дахам (разбурана ў гады апошняй вайны) замест спарахнелай драўлянай над брамай з паўночнага боку.

У пачатку 20 ст. з прыездам новага ігумена Валянціна з Кіева рабіліся спробы актывізаваць дзейнасць Куцеінскага манастыра. Але Кастрычніцкая рэвалюцыя прынесла карэнныя перамены ў край, і зусім іншыя праблемы і клопаты захапілі аршанцаў. Старажытная лаўра канчаткова страціла сваё значэнне. Будынкі яе сталі выкарыстоўвацца для гаспадарчых патрэб і ў якасці жылля.

І ўсё ж далёкае мінулае манастыра, таямніцы падземнай царквы і пячор, аповяды старажылаў і розныя паданні вабілі сюды і аматараў-краязнаўцаў, і навукоўцаў. Матэрыялы іх даследаванняў, што зрэдку падаваліся ў друку, узнімалі цікавасць да старажытных муроў. А факты з'яўляліся ўсё новыя і новыя. Так, напрыклад, з архіваў стала вядома дакладная колькасць выдадзеных у Куцейне кніг — іх налічвалася 27, а найбольшы ты-

раж складаў 520 экзэмпляраў. Адкрыліся нязведаныя старонкі грамадска-палітычнай і культурна-асветніцкай дзейнасці Куцеінскай лаўры. Менавіта таму ў апошні час пытанні захавання гэтага унікальнага помніка гістарычнага мінулага краю асабліва актуальныя. Першыя крокі ў іх вырашэнні зроблены. У 1987 г. ў Куцейна працавала сумесная экспедыцыя археолагаў з ВА «Белрэстаўрацыя» і Інстытута гісторыі АН БССР. Мэтай іх работы было даследаванне будынкаў Куцеінскага Богаяўленскага манастыра і падрыхтоўка ў далейшым праекта яго рэстаўрацыі. Побач імкліва расце мікрараён Задняпроўе, і адноўлены манастырскі комплекс дасць магчымасць атрымаць цікавае спалучэнне сучаснасці з далёкай мінуўшчынай тутэйшых мясцін. Дарэчы, пры будаўніцтве тут выяўлена мноства цікавых знаходак: ганчарная кераміка, кафля з раслінным і геральдычным арнаментам, асобныя рэчы з раскапаных старых манастырскіх могілак. Летам 1987 г. будаўнікі натрапілі на вялізныя падземныя памяшканні са скляпеннямі, што некалі існавалі пад мураванай саборнай царквой Успенскага манастыра. Відавочцы паведамляюць, нібы тады натрапілі на невялікую частку падземнага ходу, які злучаў Успенскі манастыр з Богаяўленскім. Паміж колішнімі манастырскімі пабудовамі на правым беразе Куцеінкі (цяпер амаль зусім перасохла) захаваліся рэшткі складзенай з буйных валуноў на вапнавай рошчыне плаціны тагачаснага вадзянога млына. Некалі цераз раку быў перакінуты мост.

На жаль, многае беззваротна загублена будаўнічай тэхнікай, але нават тое, што выяўлена, дазволіць скласці багатую і цікавую музейную экспазіцыю. Так, падчас раскопак на тэрыторыі Куцеінскага Богаяўленскага манастыра ў 1987—1989 гг. знойдзены шкляны і гліняны посуд, кафля, розныя ўпрыгожанні. Сярод унікальных рэчаў — невялікі авальны медальён (23 × 25 мм). Ён складаецца з дзвюх драўляных іконак, выкананых аб'ёмна-ажурнай мастацкай разьбой, у металічным абрамленні. Магчыма, нехта са славутых куцеінскіх рэзчыкаў па дрэве ўклаў свой талент у яго стварэнне. Пры ачыстцы скляпенняў вежы-званіцы Святадухаўскай царквы адшуканы невялікі нож з адмысловай касцяной рукаяццю. І дзяржальня нажа, і скураныя ножны (амаль поўнасцю спарахнелыя) аздоблены прыгожымі сярэбранымі абручыкамі.

Навуковыя даследаванні працягваюцца і, безумоўна, прынясуць плён.

Друкуецца паводле кнігі: Шынкевіч А.М. Аршанская даўніна. Мн., 1992.

Выданні Куцеінскага манастыра

Брашно духовное, напеч. Спиридономъ Соболемъ, 1630 г., въ 4-ку.

Буквар Сиречь начало учения детям начинающим чтению извыкати, 1631.

Молитвословъ, напеч. Спиридономъ Соболемъ, 1631 г., въ 12 д, 304 и 40 л.

Часовникъ, напеч. Спиридономъ Соболемъ, 1632 г., въ 4-ку, 132 л., 33 тетр.

Новый Завѣтъ со Псалтирью впереди и краткими толкованіями на поляхъ, напеч. 1632 г., въ 4-ку.

Дидаскалія или наука о таинствахъ, соч. Сильвестра Косова, напеч. въ 1632 г. (экземпляръ хорошо сохранившійся въ библіотекѣ Воскресенскаго монастыря). Это изданіе не упомянуто въ «Хронологическомъ указатель» книгъ церковной печати А.Е.Викторова.

Житіе Варлаама и Іоасафа на западно-русскомъ наръчіи, напеч. въ 1637 г., въ 4-ку, 11, 9 и 363 л.

Дидаскалія, изд. 2-ое, напеч. въ 1637 г., въ 4-ку, 4 и 31 стр.

Брашно духовное (Псалтирь со возслѣдованіемъ) изд. 2-ое, напеч. 1639 г., въ 4-ку, 4, 126, 103, 383 и 55 л.

Псалтирь, напеч. въ 1642 г., въ 4-ку, 6 и 238 л.

Шестодневъ (Октоихъ), напеч. въ 1646 г., въ 4-ку, 2 и 290 л.

Трифологіонь, напеч. въ 1647 г., въ 4-ку, 4 и 390 л.

Псалтирь, изд. 2-ое, напеч. въ 1650 г., в 4-ку, 2 и 262 л.

Діоптра, напеч. въ 1651 г., въ 12 д., 6, 342 и 64 л.

«Зняцце з крыжа» (Брашна духоўнае, Куцейна, 1639).

Новый Завътъ со Псалтирью впереди, изд. 2-ое, нап. 1652 г., въ 4-ку, 6, 126 и 500 л.

Дидаскалія, наука о 7-ми сакраментахъ (таинствахъ), изд. 3-е, напеч. въ 1653 г., въ 4-ку, 4 и 31 стр.

Лексиконъ Славяно-Россійскій, соч. Памвы Берынды, напеч. въ 1653 г., въ 4-ку, 4 и 324 стр.

Діоптра, 2-ое изданіе, напеч. въ 1654 г., въ 4-ку, 6 и 196 л.

И так, в теченіи 25 лет, напечатано 11 книг церковно-служебнаго и духовно-учительнаго содержания, из коих 4-ре: Новый Завет со Псалтирью впереди, Псалтирь, Брашно духовное, т.е. Псалтирь со возследованием и Дипотра, напеч. 2-м изданием; а Дидаскалій или наука о 7-ми таинствах, напечатано три издания. Печатание началось известным киевским типографом Спиридоном Соболем, поселившимся в 1630 г. въ Кутеине; а с 1632 г. продолжалось самими иноками Кутеинскаго монастыря, равно как и по перенесении типографскаго станка в Иверской.

Выданні куцеінскіх манахаў у Іверскім манастыры

Часословъ, напеч. въ 1657 г., въ 4-ку.

Часословъ, напеч. въ 1658 г., въ 8-ку, 4 и 128 л.

Рай мысленный, напеч. въ 1659 г., въ 4-ку, 3,77 и 30 л.

Брашно духовное (Псалтирь съ разными возслъдованіями), 3-е изданіе, означ. выше подъ №1 и 8-мъ; напеч. въ 1661 г., въ 4-ку, 6, 246, 20 и 385 л.

Молитвы на сонъ грядущимъ.

Акафисты, до 1665 года.

Святцы.

Кругъ часамъ дневнымъ и ночнымъ на большомъ листъ, напеч. въ 1665 году.

Друкуецца па кн.: Вестник Общества древнерусского искусства при Московском публичном музее. М., 1876. №1—12, отд. 4. С. 92—95.

Паэты куцеінскай школы

Да жанру эпіграмы звярталіся амаль усе беларускія паэты часоў Адраджэння і ранняга барока. Значны ўклад у развіццё старажытнабеларускай паэзіі ўнесла ў гэтым сэнсе тутэйшая літаратурная школа, прадстаўнікі якой працавалі ў знакамітай Куцеінскай друкарні. Пачэснае месца сярод паэтаў Куцеінскай літаратурнай школы займаў Іаіль Труцэвіч, які доўгі час быў ігуменам Куцеінскага манастыра, дзе пад яго кіраўніцтвам працавала дру-

«Варлаам і Іаасаф» (Гісторыя пра Варлаама і Іаасафа, Куцейна, 1637).

карня. За гэты час (з 1630 па 1654 гады) тут было выдадзена 17 кніг, прычым Іаіль Труцэвіч сам пісаў да іх прадмовы на старажытнабеларускай і царкоўнаславянскай мовах. У «Новым запавеце» 1652 г., акрамя рэлігійнага тэксту былі надрукаваны дзве яго эпіграмы: «На старажитный герб их милостей панов Горбацких епикграмма» і «На старожитный герб их милостей панов Стеткевичов епикграмма». Трэба зазначыць, што асобы, якія ўслаўляліся ў эпіграмах, былі ў свой час знакамітымі дзеячамі і цікавымі людзьмі. Напрыклад, Багдан Статкевіч быў вядомы мецэнат, прыхільнік праваслаўя, фундатар некалькіх манастыроў, у тым ліку Куцеінскага.

Архаічная лексіка робіць няпростым для разумення сучаснага чытача змест эпіграм, таму аўтар данага артыкула ўхіляецца ад залішняга цытавання. Аднак зусім без літаратурнага прыкладу немагчыма даць уяўленне пра жанр эпіграмы. Таму ўвазе чытача прапануецца невялікая па памерах і нескладаная для разумення эпіграма яшчэ аднаго прадстаўніка Куцеінскай літаратурнай школы, паэта і кнігадрукара Іосіфа Палоўкі.

На стародавный и пресветлый герб ясневелможных их милостей панов Могилов

Як небо, солнце, месяц
з светлыми звездами,
Так тот клейнот сияет з своими знаками,
Здавна светячи в дому
Могилов презацных,
Набытый з веры, цноты
и дел их отважных.
В болшой тепер оздобе тот ся оглядает,
Кгды Пётр Могила церков
верне управляет.

Як правіла, і гэта можна заўважыць у вышэй згаданым вершы, змест эпіграмы цалкам вызначаўся апісаннем герба, які звычайна меў форму шчыта з выявамі «кляйнотаў» — знакаў годнасці ўладальніка. Калі ж гаварыць пра кампазіцыйную пабудову эпіграм,

«Нараджэнне Хрыста» (Трэфалагіён, Куцейна, 1647).

то можна свабодна вызначыць тут некалькі пастаянных элементаў. Спачатку ідзе ўступзачын; пасля — зварот да памяці продкаў; цэнтральнае месца займае тлумачэнне знакаў герба і завяршае эпіграму заключэнне-пажаданне, у якім аўтары звычайна зычылі ўладальнікам гербаў доўгіх гадоў жыцця, красавання, непахіснасці веры, славы і г.д.

Паколькі абавязковы і самы галоўны элемент эпіграм на гербы — гэта вытлумачэнне сімвалічнага сэнсу знакаў, то можна прааналізаваць эпіграму як жанр менавіта з гэтага пункта погляду. У эпіграме «На герб их милостей панов Статкевичов», напісанай адным з заснавальнікаў Куцеінскай друкарні, рэктарам Магілёўскай брацкай школы Спірыдонам Собалем, мы чытаем: «Две сердца ся споили, меч их розрывает» (спалучэнне двух сэрцаў з мячом — эмблематычны знак герба Статкевічаў).

«Моц старожитных домов през то осведчает, Которым варварскія гуфы не зровнали» (моц, якую не знішчылі варожыя полчышчы). І гэткай «расшыфроўцы» падлягае далейшы змест эпіграмы, якая вымагае, безумоўна, дастатковых ведаў у галіне гісторыі і ўласна геральдыкі. Ёсць у вышэйзгаданай эпіграме і іншыя пазнавальныя знакі-сімвалы: «гелм» (шлем) — сімвал баярскай славы, «крест» — сімвал набожнасці і г.д.

Словы-сімвалы, як і сімвалы-выявы на гербе, робяцца ў складзе адпаведнай эпіграмы яшчэ адным сцвярджэннем годнасці ўладальніка герба. Заўважаецца яшчэ адна асаблівасць эпіграм беларускіх паэтаў: тлумачэнне гербавых знакаў у асобым парадку — зверху ўніз і справа налева. Такі парадак тлумачыцца пранікненнем у свядомасць тагачасных людзей рэлігійнага хрысціянскага ўяўлення пра перавагу верху над нізам, правага боку на левым (хросны знак праваслаўя — зверху ўніз, справа налева сімвалізуе адзін з элементаў другога прышэсця Хрыста; так, паводле біблейскага падання, у Судны Дзень праведныя апынуцца з правага боку ад Суддзі, грэшнікі — з левага, угару ўзнясуцца душы памілаваных, а ў пекла трапяць блюзнеры і богаадступнікі).

Увогуле ж, паводле назірання за мастацкімі асаблівасцямі эпіграм, можна зрабіць выснову, што асноўная ўвага ў іх надавалася не вынаходніцтву новага, а варыяцыям традыцыйных вобразаў. Але гэта не з'яўляецца перашкодай на шляху літаратурнага развіцця, як і тое, што змест эпіграм зводзіўся пераважна да раскрыцця сэнсу выяваў на гербе. Бо якраз творчыя магчымасці паэтаў не абмяжоўваліся нічым, хутчэй наадварот — умоўнасці жанру скіроўвалі творцаў на стварэнне непаўторных, новых і па-свойму арыгінальных вобразаў, запамінальных і яркіх. Такім чынам паступова закладаліся новыя тэндэнцыі ў літаратуры, сутнасцю якіх у далейшым, у 19—20 ст., стане імкненне да незалежнасці мыслення, ідэйнай і мастацкай адметнасці.

А.В.Сцяпанава.

Гімн майстрам

Гістарычны лёс Аршаншчыны не назавеш шчаслівым. Шмат войн і пажараў пранеслася над прыдняпроўскім краем, разбураючы тое, што стваралася гадамі і дзесяцігоддзямі, у тым ліку і цудоўныя помнікі самабытнай культуры аршанскіх майстроў: рэзчыкаў па дрэве, ганчароў, ювеліраў, збройнікаў, друкароў, пераплётчыкаў, мастакоў, будаўнікоў. Слава аб іх ішла па ўсей Русі і далёка за яе межамі.

«Поўным трыумфам драўлянай архітэктуры» лічыў царскі палац у Каломенскім вядомы даследчык мастацтва Старажытнай Русі Л.Любімаў. «Цацачкай, толькі што вынутай са шкатулачкі» назваў гэты палац іншаземец Райценфельс. Вядомы паэт-асветнік, наш зямляк Сімяон Полацкі пад уражаннем наведвання палаца напісаў паэму, якая стала своеасаблівым гімнам таленту яго стваральнікаў. Паэма заканчвалася словамі:

Нет лучшего, разве дом небесный,
Семь дивных вещей древний мир чтиме,
Осьмий див сей дом время имеет наше.

Пералік поўных захаплення водгукаў сучаснікаў можна працягваць і далей. Але якое дачыненне мае ўсё гэта да аршанскіх май-

строў? Самае непасрэднае. Сярод праектантаў і выканаўцаў работ па ўпрыгожванні царскага палаца ў Каломенскім было шмат нашых землякоў — выхадцаў з Оршы і Копысі.

Самай каларытнай у доўгім спісе стваральнікаў «восьмага цуду свету» была фігура Арсенія — рэзчыка, вялікага і тонкага знаўцы арнаментаў. Да прыезду ў Маскву Арсеній быў манахам Куцеінскага манастыра. Іканастас Куцеінскага жаночага манастыра, які рэзаў Арсеній, вельмі ўразіў рускага цара Аляксея Міхайлавіча і маскоўскага патрыярха Нікана ў час наведвання імі Оршы. Па запрашэнні Нікана Арсеній працаваў у майстэрні разьбы па дрэве Іверскага манастыра на Валдаі. Затым выконваў шматлікія работы ў новай рэзідэнцыі патрыярха ў Новаіерусалімскім манастыры на Істры. З пачатку будаўніцтва палаца ў Каломенскім вопытны майстар быў прызначаны кіраўніком арцелі разных і сталярных спраў Аружэйнай палаты. Пасля заканчэння работ у Каломенскім наш зямляк выконваў разныя работы ў саборы Раства Багародзіцы ў Суздалі. Побач з Арсеніем працаваў аршанскі майстар Восіп Андрэеў. Пасля заканчэння будаўніцтва Каломенскага палаца ён працаваў над іканастасам храмаў Новадзявочага манастыра ў Маскве. Разам са сваім майстрам Северыянам працаваў на будоўлі палаца аршанец Андрэй Фёдараў — «вялікі знаўца сталярнай справы».

Майстры з Аршаншчыны рэзалі для палаца дзверы, налічнікі акон, падзоры, слупы, карнізы, мэблю. Разныя налічнікі, карнізы, падзоры і іншыя элементы нібыта карункі ўпрыгожвалі палац звонку. Польскія паслы, якія былі на прыёме ў новай рэзідэнцыі рускага цара, адправілі на радзіму ліст, поўны захаплення і дэталёвага апісання ўбачанага: «На подворье перед хоромами врата толсты дубовые, так толсты, как дуб уродился, резные, хотя и не глубоко вырезаны, достаточно пригожи...»

Нашы землякі прынеслі ў Маскву і іншыя рускія гарады новую тэхніку разьбы па дрэве. Да гэтага часу традыцыйная руская разьба была плоскаснай. Аршанцы ж у сваіх работах шырока выкарыстоўвалі тэхніку накладной, а таксама скульптурна-аб'ёмнай разьбы. Галоўным матывам разьбы беларускіх майстроў быў раслінны арнамент. Дапоўнены фігурамі птушак, херувімаў, ваз, ён стаў асноўным упрыгажэннем разных калон, карнізаў, аконных налічнікаў, слупоў, дзвярэй. Такія ж тэхнічныя прыёмы шырока выкарыстоўваліся ў апрацоўцы іканастасаў.

Знаёмыя з еўрапейскім арнаментам, выкананым у стылі барока і рэнесансу, аршанскія чараўнікі шырока выкарыстоўвалі яго ў сваёй творчасці. Так, разныя налічнікі акон былі распісаны фарбамі і пазалочаны. Над некаторымі вокнамі палаца былі выразаны картушы, у якіх напісаны абразы.

Галоўным «прыёмшчыкам» палаца быў сам цар. Задаволены ўбачаным, Аляксей Міхайлавіч загадаў узнагародзіць кіраўніка спраў старца Арсенія «кармазінным» сукном.

Майстроў па апрацоўцы дрэва Аружэйнай палаты ўзначальваў Арсеній; палатай разцоў, якая знаходзілася ў Раманаўскім двары на Ваздвіжынцы, кіраваў яшчэ адзін наш зямляк — манах Куцеінскага манастыра Іпаліт. Майстар са сваімі памочнікамі спецыялізаваўся на рэзцы і залачэнні гербаў для царскіх карэт, шафаў, куфраў, рызніц, іканастасаў. У 1679 г. Іпаліт выканаў галоўную работу свайго жыцця — рэльефнае распяцце для Галгофы ў царкве Уваскрэсення. Ён — аўтар малюнкаў кафляных упрыгожэнняў купалаў Спаскага сабора ў Маскоўскім Крамлі. Вырабы майстроў на чале з Іпалітам уяўлялі сабой сапраўдныя творы мастацтва, і рускія цары не аднойчы дарылі іх замежным манархам.

Да 17 ст. небывалага росквіту дасягнула майстэрства аршанскіх керамістаў. У сярэдзіне 17 ст. прызнаным цэнтрам керамічнай вытворчасці Усходняй Беларусі стала Копысь. Да паслуг копыскіх майстроў сталі звяртацца вяльможы Рускай дзяржавы, у тым ліку і сам цар. Вядома, што выхадцы з Копысі С.Аляксееў, Я.Андрэеў, П.Будкееў, С.Грыгор'еў, І.Максімаў, П.Фёдараў аздабляліі кафляй культавыя і грамадзянскія пабудовы Масквы і іншых рускіх гарадоў.

Перш чым трапіць у Аружэйную палату Масквы, копыскія майстры стварылі шэраг шэдэўраў у сябе на радзіме і гарадах Расійскай дзяржавы. Так, у адным з запісаў архіва Аружэйнай палаты гаворыцца, што майстар «печнага дела Самошка Григорьев делает печи и кладёт в образцах, и сам белыя образцы делает, родом иноземец Копыси города, мещанского отца сын». Да Масквы С.Грыгор'еў працаваў у саборах Новаіерусалімскага манастыра, дзе выканаў з каляровай рэльефнай

кафлі налічнікі акон, парталы ўваходаў, карнізы, паясы з надпісамі і шмат іншага.

З актаў Валдайскага Іверскага манастыра добра вядома аб дзейнасці Ігната Максімава. Тут у 1655 г. ён арганізаваў вытворчасць кафлі для ўнутранага і знешняга аздаблення манастырскіх сабораў. Аб майстэрстве «іншаземца з Копысі» стала вядома далёка за межамі манастыра. З пісьмовых крыніц бачна, што ён атрымліваў шмат заказаў на выраб пячной кафлі. Так, у 1656 г. ігумен манастыра пісаў Нікану, што ў горад Твер было адпушчана «две печи мурамленых, с розными красками, а числом в тех печах 110 кафель, да 3 печи зелёных кафель, а числом в тех печах 387 кафель, а ко тем пяти печам послали белых простых 223 кафели». І.Максімаў аздабляў сваімі кафельнымі вырабамі новую рэзідэнцыю патрыярха — Новаіерусалімскі манастыр на Істры, а пасля пераезду ў Маскву шматлікія сталічныя храмы, у тым ліку і купал Верхнеспаскага сабора Маскоўскага Крамля. Імя таленавітага майстра з Аршаншчыны значыцца і сярод стваральнікаў сусветна вядомага помніка рускай архітэктуры — Круціцкага церама ў Маскве.

Імёны нашых землякоў ёсць і сярод лепшых майстроў «сярэбранай палаты». Так, Максім Сямёнаў з Копысі быў вялікім майстрам па вырабе меднага і сярэбранага посуду, прадметаў культавага прызначэння.

Выконваў ён і шматлікія заказы членаў царскай сям'і па вырабе сярэбраных акладаў абразоў. У 1667 г. ў ліку лепшых майстроў М. Сямёнаў быў прыцягнуты «для гасударавых сярэбраных спраў».

У 1658 г. разам з быхаўскімі збройнікамі ў Маскву прыехаў Рыгор Астаф'еў — адметны майстар тшчальнай справы. Паходзіў Рыгор Астаф'еў з Оршы. Каля паўтара дзесятка пішчаляў работы аршанскага майстра захоўваецца сёння ў сусветна вядомым музеі — Аружэйнай палаце Маскоўскага Крамля.

Шматлікія майстры розных прафесій з Аршаншчыны плённа працавалі ў вотчынах многіх рускіх вяльможаў — Трубяцкога, Куракіна, Хітраво, Марозава і інш. У творчасці нашых землякоў адлюстравана таленавітасць народа, які здолеў у цяжкіх умовах стварыць помнікі культуры, якія ўславілі родную зямлю.

І.А. Яршоў.

Іверскі манастыр

В тот же монастырь (Иверский) в 1655 г. переселились монахи оршанского Кутеинского монастыря, который, как известно, в первой половине 17 в. был одним из центров белорусского книгопечатания.

Кутеинские монахи привезли с собой из Орши в Иверский монастырь типографию («друкарский завод»), а также большое количество своих изданий, частью «голых», т.е. непереплетенных.

Вместе с оршанскими монахами в Иверский монастырь прибыли ещё одна группа ремесленников из Орши и соседних с ней городов (Копыси, Шклова, Дубровны и др.). Среди этих ремесленников были резчики по дереву, токари, столяры, переплётчики книг. По-видимому, все они на родине были тесно связаны с хозяйственной деятельностью Кутеинского монастыря и охотно вместе с монахами переселились в Русское государство. Это предположение подтверждается таким, например, фактом, что резчики, столяры, токари, прибывшие вместе с оршанскими монахами в Иверский монастырь, работали под руководством кутеинских «старцев». Несомненно, что в Орше при монастырской типографии работали и прибывшие с монахами переплётчики книг.

В Иверский монастырь потянулись «к своей братии» и другие выходцы из Белоруссии. Их расселяли в монастырских сёлах — Богородицине, Боровичах, Ведропуске и др.

Белорусские крестьяне и ремесленники работали главным образом на строительстве монастырских зданий.

Среди белорусов, живших в вотчинах Иверского монастыря, было много выходцев из г. Копыси, с давних времён славившегося производством изразцов. Они нашли около села Богородицына хорошую глину и под руководством мастера Игната Максимова начали изготовлять изразцы и черепицу.

Изразцы применялись не только для облицовки печей, но также для внутренней и наружной отделки зданий. Белорусские мастера делали как простые гладкие, так и рельефные изразцы, узор на которых оттискивался в деревянных или глиняных формах. Рельеф покрывался прозрачной зеленой поливой (изразцы «муравлёные») или различные части рельефа расписывались непрозрачной эмалью разных цветов (изразцы «ценинные»).

Многоцветными изразцами белорусские мастера богато украсили весь монастырский настоятельский корпус, а его шатровую кровлю покрыли муравленой черепицей. Широко было организовано ими и производство печных изразцов, которые не только использовались для нужд монастыря, но и вывозились в Новгород, Псков, Москву и другие города Русского государства. Так, например, в октябре 1656 г. в Тверь из Иверского монастыря было отправлено более тысячи (на 5 печей) многоцветных, муравленых и белых изразцов.

Производственный опыт белорусских ценников осваивался русскими ремесленниками, и изразцовое производство быстро распространялось по Псковской и Новгородской областям.

Из работ белорусских резчиков по дереву в Иверском монастыре сохранились покрытые прекрасной резьбой двери так называемого холодного собора.

Переселившиеся в Иверский монастырь оршанские монахи развернули широкую книгоиздательскую деятельность. В 1657 г. начала работать их типография, помещавшаяся в одной из монастырских башен. Как показывают опубликованные архимандритом Леонидом документы, в типографии был «печатный стан со всякими печатными заводы и пунцоны». Так же отливались и литеры для набора. Известно имя монаха Каллистрата, «который вырезал искосы и в чём отлиты были слова». В Иверском монастыре оршанские монахи напечатали «Часослов» (два издания — 1657 и 1658 г.), «Рай мысленный» (1659), «Брашново духовное» (1660), «Акафисты», «Святцы» и другие церковные книги.

Некоторые из этих книг были иллюстрированы гравюрами на дереве, выполненными оршанским монахом Паисием.

Книги оршанских печатников находили широкий сбыт в Москве, Новгороде и других городах Русского государства. В Новгороде на подворье Иверского монастыря была организована постоянная продажа книг, напечатанных оршанскими монахами.

Типография работала в Иверском монастыре до сентября 1665 г., а затем по распоряжению патриарха Никона была переведена в его резиденцию — Воскресенский Новоиерусалимский монастырь на Истре.

Друкуецца па кн.: Абецедарский Л.С. Белорусы в Москве XVII в.: (Из истории русско-белорусских связей). Мн., 1957.

«Аршанскі кодэкс»

Рукапісны зборнік канца 17 ст. (да 1693). Створаны ў Аршанскім езуіцкім калегіуме. Уключае 4 польскія барочныя драмы з беларускімі інтэрмедыямі, якія ставіліся ў школьных тэатрах у Полацку («Духоўнае прычасце святых Барыса і Глеба»), Оршы («Слаўная дапамога для Раміравай перамогі, учынённая анёльскімі палкамі»), Навагрудку («Містычнае прычасце ў жалю нявінных Кароля і Фрыдэрыка»), Віцебску («Містычнае вяселле прычасця Генсерыка і Трызмунда»), «Аршанскі кодэкс» змяншае 7 інтэрмедыйных тэкстаў, дзе адна або дзве асобы гавораць на беларускай мове. Захоўваецца ў бібліятэцы імя Асалінскіх у Вроцлаве (Польшча).

А.В. Мальдзіс.

«Аршанскі зборнік»

Многія падручнікі па беларускай літаратуры і нават гісторыкі літаратуры называюць 2-ю палавіну 17—18 ст. перыядам поўнага заняпаду літаратурнага жыцця на Беларусі. Але ці так бясспрэчна гэта палажэнне?

Літаратуразнаўца А.І. Мальдзіс, які займаўся даследаваннем гэтага перыяду, адкрыў шмат новых старонак у гісторыі нашай літаратуры. Ён аспрэчвае гэта палажэнне на падставе твораў таго часу, якія яму пашчасціла знайсці. Найперш, гэта творы беларускай песеннай лірыкі.

Што ж яны ўяўлялі сабой? Песні гэтыя ствараліся беларусамі і ўкраінцамі — рознымі вандроўнымі шкалярамі, акцёрамі, музыкантамі і прызначаліся для самага шырокага «спажыўца»: шляхты, гараджан (месцічаў) і нават сялян. Зборнікі з любоўнымі песнямі прадаваліся на кірмашах як своеасаблівыя «падручнікі жыцця» для моладзі.

Сюды адносіцца і так званы «Аршанскі зборнік», знойдзены А.І. Мальдзісам у бібліятэцы князёў Чартарыскіх у Польшчы ў 1971 г. Поўная назва рукапісу — «Збор вершаў польскіх і рускіх». Зборнік напісаны лацінскай мовай чатырма рознымі почыркамі, адзін з якіх амаль зусім неразборлівы. Дакладная дата рукапісу невядомая — прыблізна не раней 2-й палавіны 17 ст.

Пачынаецца зборнік польскай вершаванай пераробкай (з французскай мовы) «Вельмі пацешная гісторыя». А затым ідзе беларускі тэкст. У зборніку налічваецца 66 беларускіх і беларуска-ўкраінскіх твораў (2 з іх паўтараюцца з пэўнымі варыяцыямі). Да некаторых тэкстаў зроблены прыпіскі і ўстаноўкі на палях. У канцы рукапісу — каліграфічны надпіс: «Мосці падчашыц Аршанскі мне вельцэ міласцівы Пане і Дабрадзей». Ды яшчэ акраверш не старонках 162—164: «Падчашанка Оршанска, пан мой мілосьцівы».

Значыць, зборнік пісаўся для Оршы, для адной з аршанскіх падчашанак (а можа, і яна была адным з аўтараў зборніка?). Дарэчы, характэрна, што ў гэтым зборніку зусім няма твораў на рэлігійныя тэмы. Значыць, ён узнік у свецкім асяроддзі, прызначаўся для свецкага чытача.

Якім жа чынам свецкі «Аршанскі зборнік» трапіў у бібліятэку Чартарыскіх? Справа ў тым, што сям'і Чартарыскіх у 18 ст. належалі вялікія маёнткі каля Оршы, Шклова і Дуброўны. Адсюль у канцы 18 ці пачатку 19 ст. «Аршанскі зборнік» трапіў у бібліятэку вядомага мецэната і калекцыянера Чартарыскага. У бібліятэцы Чартарыскіх напачатку 20 ст. рукапіс адшукаў А. Брукнер. У 1911 г. ён апублікаваў некалькі вершаў — поўнасцю або ва ўрыўках — у часопісе «Паметнік літэрацкі». На жаль, якасць публікацыі невысокая. Не ведаючы жывой беларускай мовы, ён расшыфраваў «рубаткі» замест «рубашкі», «сянічанькі» замест «сунічанькі», і да т. п.

У песнях «Аршанскага зборніка» ёсць шмат агульнага. Часцей за ўсё гэта песні аб каханні: тужлівы маналог хлопца ці дзяўчыны, што скардзяцца на разлуку, радзей — дыялог двух закаханых. Часта ў песнях упамінаецца Украіна, герой заклікае гераіню ехаць з ім на Украіну. Значыць, песні ўзніклі ў Беларусі. Але ж вядома, што тагачасная беларуская і ўкраінская паэзія развіваліся ў цеснай сувязі.

У творах зборніка выразна адчуваецца блізкасць да фальклору, народныя элементы. У многіх творах лёгка праглядваецца рытміка казачка, мазуркі, кракавяка ці падвана — быў такі павольны, меланхалічны танец, прывезены з Італіі беларускімі выхаванцамі Падуанскага універсітэта.

Як сведчыў у сваіх мемуарах мінскі ваявода К. Завіша, песня «Анусю, сэрдэнька, паліш маю душу»... выконвалася ў час танцаў. Дзесьці ў 1712 г. ён быў на «старасвецкіх танцульках», дзе гралі гэту песню.

Такім чынам, перад намі адгорнута яшчэ адна старонка нашай літаратуры, нашай гісторыі. І вялікі дзякуй за гэта аўтару кнігі «На скрыжаванні славянскіх традыцый» А.І. Мальдзісу.

Дз.В. Дзядзенка.

Аршанскі езуіцкі калегіум

Да нядаўняга часу ў самым цэнтры старажытнай Оршы знаходзіўся комплекс пабудоў, аб якім не згадвалася ні ў адным з турыстычных даведнікаў. У невысокіх будынках з магутнымі мураванымі сценамі, за мураваным плотам, абнесеным калючым дротам, размяшчалася турма. Прапіску ў гістарычным цэнтры горада гэта ўстанова мела сталую — больш за паўтары сотні гадоў. Толькі ў канцы 1980-х гадоў турма была пераведзена ў іншае месца, і прыкладна тады ж «успомнілі», што размяшчалася яна ў цікавым помніку беларускага дойлідства эпохі барока — у будынках былога Аршанскага езуіцкага калегіума.

Першая праца, якая тычылася даследавання Аршанскага калегіума як помніка архітэктуры, была выдадзена ў Маскве ў 1969 г. А. Квітніцкай. У савецкі час беларускія гісторыкі архітэктуры гэтым комплексам увогуле не займаліся. Калегіум не трапіў на старонкі «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», паколькі не быў узяты пад ахову дзяржавы. Непасрэдна яго гісторыяй цікавіліся толькі мясцовыя аршанскія краязнаўцы, якія ашчадна збіралі звесткі з усіх даступных ім друкаваных і архіўных крыніц. І толькі напачатку 1990-х гадоў Аршанская калегія зрабілася аб'ектам больш грунтоўнага навуковага вывучэння. Асобныя старонкі з яе гісторыі акрэсліла ў сваёй манаграфіі «Іезуіты ў Беларусі» (Мн., 1990) Т. Блінова, за подпісам гэтай жа даследчыцы ў 1-м томе «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» з'явіўся артыкул «Аршанскі езуіцкі калегіум». У МДП «Віцебск-праектрэстаўрацыя» ў 1991—92 гг. былі праведзены комплексныя навуковыя даследаванні помніка, на падставе вынікаў гісторыка-архіўных і археалагічных росшукаў зроблены праект яго рэканструкцыі. Некаторыя старонкі адноўленай гісторыі калегіі аршанскіх езуітаў прапануюцца ўвазе шаноўнага чытача.

Ордэн езуітаў быў зацверджаны булай папы Паўла III у 1540 г. У Вялікім княстве Літоўскім першы езуіцкі калегіум узнік у 1569 г. ў Вільні. Першы візіт на тэрыторыю сучаснай Беларусі езуіты нанеслі ў 1573 г., калі накіравалі сваю місію з Вільні ў Оршу. Аднак асаблівага плёну місіянерам гэты візіт не прынёс.

У 1590 г. канцлер ВКЛ Леў Сапега набыў у самым цэнтры Оршы ў кальвіністаў пляц, на якім раней стаяў гельвецкі збор, і пабудаваў на ім першы ў горадзе каталіцкі касцёл. Разам з пробашчам новага касцёла Якубам Лаўрэнці Л. Сапега пачаў рыхтаваць адкрыццё езуіцкай калегіі ў Оршы. У 1609 г. яны прапанавалі свой план каралю Жыгімонту III, калі той прыбыў у горад. У 1610 г. кароль ахвяраваў аршанскім езуітам прыход з 11 валокамі зямлі, у 1612 г. — яшчэ 5 вёсак, у 1616 г. — вялікі маёнтак Фашчаўка, вылучаны з зямель Магілёўскай каралеўскай эканоміі. Усе гэтыя ўладанні былі зацверджаны папам Паўлам V і сеймам у 1616 г. Рэзідэнцыя езуітаў у Оршы па загадзе генерала ордэна ў тым жа годзе была ператворана ў калегіум.

Роля, якую адыграў ордэн езуітаў у гісторыі Беларусі, вымагае шматбаковай і неадназначнай ацэнкі. З'яўляючыся магутным правадніком экспансіі каталіцызму, а пазней і сродкам апалячвання мясцовага насельніцтва, езуіцкія калегіі адначасова сталі і чыннікамі пашырэння асветніцтва і адукацыі на Беларусі, трансфармацыі еўрапейскай мастацкай традыцыі пры перанясенні яе на мясцовую глебу. Менавіта на культурна-асветніцкім аспекце дзейнасці аршанскіх езуітаў мы і маем намер спыніцца больш дэталёва.

Знаёмячыся напачатку 19 ст. з «заходнімі правінцыямі» Расійскай імперыі, акадэмік сталічнай Акадэміі навук Васіль Севяргін, праехаўшы праз Оршу, занатаваў у сваім дзённіку: «Орша ёсць няправільны горад са шматлікімі дрэннымі драўлянымі будынкамі». Праз год у дадатку да сваіх «Запісак» ён вырашыў крыху ўдакладніць сітуацыю: «Галоўнае яго ўпрыгожванне складаюць манастыры, якіх тут да 10». Цэнтральнае месца сярод архітэктурных ансамбляў горада займаў комплекс мураваных пабудоў Аршанскай езуіцкай калегіі, фарміраванне якога адбывалася на працягу 17—18 ст.

Першапачаткова ўсе пабудовы калегіі былі драўлянымі. У 1621 г. рэферэндарый і пісар Вялікага княства Літоўскага Аляксандр Кор-



Аршанскі езуіцкі калегіум. План. 1 — касцёл архангела Міхаіла; 2 — калегіум; 3 — трапезная; 4 — крыты пераход; 5 — школа; 6, 7, 8 — гаспадарчыя пабудовы; 9 — аптэка; 10 — сад.

він-Гансеўскі ўласнай персонай прыбыў у Оршу дзеля таго, каб вызначыць канкрэтнае месцазнаходжанне дзялянкі лесу працягласцю 7 вёрст уздоўж Дняпра, якую ахвяраваў кароль Жыгімонт III на ўзвядзенне езуіцкага касцёла. Пажар 1680 г. знішчыў усе драўляныя пабудовы калегіі. Яны былі адноўлены на працягу 3 наступных гадоў пад кіраўніцтвам рэктара калегіі Фларыяна Рэшкі.

Першая мураваная пабудова — жыллё для манахаў, або калегіум, — была узведзена аршанскімі езуітамі ў 1690 г. з фундацыі караля Яна Сабескага. Двухпавярховы калегіум быў пабудаваны ў «дзве лініі», злучаныя паміж сабою пад прамым вуглом. Апроч жылых памяшканняў для манахаў тут размяшчаўся канвікт для вучняў публічнай школы, трапезная, бібліятэка і архіў. У больш познія часы адзін з тарцоў калегіума быў упрыгожаны фігурнай вежай з гадзіннікам, які «адбіваў на ўвесь горад гадзіны і чвэрці», а фасад на зломе «дзвюх ліній» — высокім багата дэкараваным двух'ярусным франтонам. З пэўнымі пераробкамі і значнымі стратамі вонкавага аблічча будынак стаіць і зараз.

Комплекс пабудоў Аршанскага езуіцкага калегіума размяшчаўся ў самым цэнтры горада на беразе р. Аршыца ў сутоцы з Дняпром. Уся тэрыторыя калегіума была абнесена мураванай сцяной і ў плане мела форму замкнутага няправільнага пяцікутніка. Аднак нізкая агароджа амаль не засланяла будынкаў, якія добра прагледжваліся з розных пунктаў горада. Касцёл, школа з бурсаў, калегіум, аптэка і розныя гаспадарчыя будынкі вольна размяшчаліся на пляцоўцы, абнесенай мурам, і не ўтваралі замкнутага ўнутранага двара. Тэндэнцыя раскрыцця пабудоў да горада, увасобленая аршанскімі езуітамі ўжо ў канцы 17 ст., на працягу наступнага стагоддзя стала дамінуючай для ўсяго кляштарнага будаўніцтва на Беларусі.

Мураваны касцёл аршанскія езуіты пачалі ўзводзіць у 1741 г. Праз 4 гады закладзеныя падмуркі праверыў архітэктар Фантана. Імя аўтара праекта касцёла не захавалася, а вось імя кіраўніка будаўнічых прац вядома: гэта езуіт Бенедыкт Мезмер, ураджэнец Баварыі, высокакваліфікаваны муляр, які ўзводзіў сцены езуіцкага касцёла ў Полацку. З-за недахопу сродкаў будавалі касцёл ў Оршы вельмі марудна і толькі ў 1768 г. асвяцілі ў імя архангела Міхаіла. Моцнае эмацыянальнае ўражанне пакідалі веліч і манументальнасць храма. У касцёле знаходзілася 5 мураваных алтароў, выдатная скульптура Божай Маці, зробленая з дрэва, пафарбаваная і вызалачаная, партрэты каралёў Жыгімонта III і Уладзіслава IV — фундатараў калегіі, багатая рызніца, шмат сярэбранага касцельнага начыння.

Аб жыцці насельнікаў Аршанскай калегіі да нашага часу захавалася не шмат звестак. Вядома, што ў апошняй чвэрці 18 ст. пры калегіуме звычайна жылі 20—29 манахаў. Самыя малодшыя з іх — вучні-клірыкі — мелі ўзрост ад 17 да 25 гадоў, астатнія — ад 23 да 73. Апрача выканання патрэб рэлігійнай дзейнасці маладыя манахі навучаліся розным рамёствам пад кіраўніцтвам дасведчаных майстроў (звычайна яны ўдасканальваліся ў тых прафесіях, што мелі да паступлення ў ордэн). Пры Аршанскай калегіі існавалі кравецкая майстэрня, кузня і сталярня.

Кіраўнікамі сталярнай майстэрні ў 17 ст. працавалі езуіты Мікалай Гурбіловіч і Себасцьян Яцкоўскі, у канцы 18 ст. — Андрэй Сальцэвіч. Сталярня знаходзілася ў двухпавярховым мураваным флігелі на беразе Аршыцы, у якой апроч таго размяшчаліся саладоўня, бровар, пякарня і памяшканні для чэлядзі.

Пры калегіуме «з даўных часоў» у невялікім аднапавярховым мураваным будынку размяшчалася аптэка. Як паведамлялася ў адным з актаў візітацый, створана яна была «як для хуткага паратунку пры патрэбе асобаў

манаскіх, так і навучэнцаў, уласных падданых і ўбогіх». Пры гэтай першай ў горадзе аптэцы жыў зацверджаны ўрачэбнай управай правізар, які меў ад езуітаў стол і пенсію. Зёлкі і карэнні для аптэкі вырошчваліся тут жа на калегіумным двары ў «батанічным агародзе». Апроч таго, пры калегіі меўся вялікі сад са значнай колькасцю фруктовых дрэў, якія былі пасаджаны «у лініі» і даглядаліся садоўнікамі. Пладоў, што давалі дрэвы, хапала езуітам для забеспячэння ўласных патрэб, і нават сёе-тое трапляла на продаж.

У важнейшыя хрысціянскія святы езуітамі звычайна праводзіліся пышныя набажэнствы ў касцёле або наладжваліся шэсці-працэсіі па вуліцах горада. Шырока адзначаліся таксама нараджэнні, шлюбы, імяніны і пахаванні знакамітых магнатаў. Так, 25 лістапада 1764 г. ў Оршы святкавалі дзень «шчаслівай каранацыі» апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Як паведамляў пазней «Варшаўскі кур'ер», ягамосць Мікалай Сава Храпавіцкі, пілвінскі староста, паручнік пяцігорскі ў войску Вялікага княства Літоўскага, каптуровы маршалак Аршанскага павета напачатку ўрачыстасцей загадаў «надворным жаўнерам» паліць у гонар караля з гармат і ручной зброі. Потым пан Храпавіцкі «з цэлай кампаніяй» адбыў на набажэнства да айцоў-езуітаў, якія з нагоды свята прамаўлялі ў сваім касцёле ўрачыстую пропаведзь. Пазней пан староста запрасіў усіх гасцей да сябе на абед, які завяршыўся балем.

Асноўнымі апорнымі пунктамі езуітаў апроч калегіі з'яўляліся рэзідэнцыі і місіі, якія адчыняліся імі ў навакольных вёсках і фальварках. Рэзідэнцыя звычайна рабілася месцам пастаяннага знаходжання езуітаў і была пераходнай ступенню да стварэння калегіі. Місіі часцей за ўсё адкрываліся ў аддаленых вёсках, якія належалі калегіі, дзеля рэлігійнага абслугоўвання мясцовага насельніцтва. Звычайна ў іх жылі 2—3 манахі.

Аршанскія езуіты адкрылі сваю місію ў в. Пагост, рэзідэнцыю — у маёнтку Фашчаўка, дзе ўзвялі мураваны касцёл У Імя Прасвятой Дзевы Марыі. Будаваць яго пачалі ў 1738 г., аднак у хуткім часе адбылося нечаканае здарэнне, якое надоўга перапыніла працу: на рыштаваннях касцёла ўдарам маланкі быў забіты кіраўнік будаўніцтва езуіт Юры Шык. Цела яго часова пахавалі пад старым драўляным касцёлам, а ў верасні 1754 г. перанеслі да крыпты новага храма. Будаўніцтва касцёла было працягнута толькі пасля 1746 г., кіраўніком работ быў прызначаны ўжо згаданы вышэй Бенедыкт Мезмер (адначасова ён кіраваў будаўніцтвам трох касцёлаў: у Фашчаўцы, Оршы і Мсціславе). Касцёл быў ужо амаль гатовы, калі ў 1757 г. «па віне архітэктара» абрынуліся толькі што збудаваныя мураваныя хоры. Дакладная дата заканчэння і асвячэння Фашчаўскага касцёла невядомая. Напачатку 19 ст. пры ім утрымліваўся шпіталь для састарэлых, бяздомных, хворых і сірот.

Місія аршанскіх езуітаў у в. Пагост дзейнічала пры ўзведзеным там драўляным касцёле. «Фальваркавым коштам» пры касцёле таксама ўтрымліваўся невялікі шпіталь.

Ордэн езуітаў быў першай з каталіцкіх арганізацый, якія прысвяцілі сябе справе выхавання юнацтва. Ва ўсіх калегіях апрача выхавання і навучання манахаў-клірыкаў заўсёды займаліся і адукацыяй свецкай моладзі. Дзеля гэтага спецыяльна ствараліся публічныя школы. 5-класная публічная школа існавала і пры Аршанскім калегіуме. Манаполію на адукацыю шляхецкай моладзі ў горадзе і ва ўсім Аршанскім павеце езуіты атрымалі ад караля Жыгімонта III яшчэ ў 1621 г.

Езуітамі была распрацавана цэлая сістэма навучання, у якой запазычаныя ад ідэі гуманізму знешнія формы былі напоўнены схаластычным зместам. Мэтай адукацыі была абвешчана «вучоная і красамоўная пабожнасць». Кожны навучэнец павінен быў дасканала авалодаць антычнымі мовамі (перш за ўсё лацінскай), добра ведаць творы рымскіх аўтараў, умець пісаць вершы і складаць прамовы. Праграмы навучання ў розных калегіях былі аднолькавымі, а кола вывучаемых прадметаў залежала толькі ад статуса самой калегіі: ніжэйшай (з курсамі інфімы, граматыкі і сінтаксы), сярэдняй (з курсамі паэтыкі і рыторыкі) або вышэйшай (з курсамі логікі і тэалогіі). Першым пры Аршанскай калегіі быў адкрыты клас граматыкі ў 1618 г., праз 2 гады пасля яе адкрыцця, у 1623 г. — клас паэтыкі. З 1634 г. тут выкладалася рыторыка, з 1696 г. логіка, з 1724 г. філасофія.

Да нашага часу захаваўся рэдкі дакумент, у якім прыведзены пералік навук, што выкладаліся ў школе Аршанскай калегіі напачатку 19 ст. Ён быў адціснуты ў друкарні акадэміі езуітаў у Полацку. У 1—3 класах школы вы-

кладаліся хрысціянская навука, гісторыя, геаграфія, арыфметыка, толькі лацінская з моў. У 4—5 класах акрамя лацінскай вывучалі яшчэ рускую, нямецкую і французскую мовы, грэчаскую гісторыю, старажытную і сучасную геаграфію, алгебру, практычную геаметрыю, вучыліся маляваць. Цікава, што ў адным класе маглі апынуцца вучні рознага ўзросту — ад 8 да 32 гадоў. Такія выпадкі былі зафіксаваны ў актах візітацыі калегіі і, трэба адзначыць, не надта здзіўлялі сучаснікаў.

Выкладанне ў школе вялося бясплатна. Аршанскія езуіты прымалі да сябе на вучобу дзяцей гарадской і павятовай шляхты, простых мяшчан. Траплялі сюды хлопчыкі і з заможных сем'яў, і з сем'яў беднякоў-гаротнікаў. Амаль палавіна вучняў і жыла пры калегіі. Гэта былі т.зв. канвіктары і бурсакі. Бацькі канвіктараў уносілі езуітам пэўную плату за стол, ацяпленне і пансіён сваіх дзяцей. Жылі гэтыя хлопчыкі побач з манахамі ў будынку калегіума ва ўтульных пакоях з распісанымі скляпеннямі. Бурсакі — дзеці зусім збяднелай шляхты і гараджан — поўнасцю ўтрымліваліся за кошт езуітаў. Яны жылі ў трох вялікіх пакоях, што размяшчаліся ў адным будынку са школай. Дадаткова іх навучалі спевам і ігры на музычных інструментах — бурсакі абавязаны былі бясплатна граць у «музыцы касцёльнай», спяваць у хоры, а таксама абслугоўваць розныя мерапрыемствы ордэна (удзельнічаць у працэсіях, тэатральных спектаклях).

Схільнасць да наладжвання адметных відовішчаў увогуле была характэрнай прыкметай дзейнасці манахаў-езуітаў на Беларусі. Ян Баршчэўскі ў сваім «Шляхціцу Завальні» пакінуў красамоўны аповяд пра Драўлянага Дзядка, што некалі месціўся ў мурах полацкіх езуітаў і, «высунуўшыся з-за сцяны праз вузкае вакенца, даваў парады і перасцярогі». Не менш каларытныя ўспаміны пра «публічныя эксперыменте» віцебскіх айцоў-езуітаў пакінуў мемуарыст 19 ст. М.Маркс. У прыватнасці, ён пісаў, што ў прызначаныя перадсвяточныя дні са званіцы езуіцкага касцёла «то ўзлятаў паветраны шар з лялькамі, якія сядзелі ў лодцы, то бясшкодна спускаўся на плошчу прывязаны да парашута казёл. А ў залах вучылішча, у адной — цёмнай — чароўны ліхтар паказваў цуды святых Лаёлы, Ганзага, Косткі, Баболі і іншых членаў таварыства Ісуса; у другой жа — светлай — грымучы газ з выбухам згараў у лятаючых мыльных бурбалках або канічныя люстэркі збіралі пачварныя разводы ў вытанчаныя малюнкі».

На жаль, такіх сведчанняў сярод аршанскіх мемуарыстаў мы не маем, хоць занатоўваць сучаснікам, думаецца, таксама было што. З канца 17 да сярэдзіны 18 ст. пры Аршанскай калегіі дзейнічаў школьны тэатр. Вучэбныя пастаноўкі адбываліся ў спецыяльна прыстасаванай рэкрэацыйнай зале калегіума або проста на вуліцах горада, дзе наладжваліся паказы міракляў («дыялогаў») і містэрый. Пэўнае ўяўленне аб рэпертуары тэатра дае «Аршанскі кодэкс» — рукапісны зборнік барочных драм канца 17 ст., які быў створаны ў самой калегіі. Змешчаныя ў ім польскамоўныя драмы з беларускімі інтэрмедыямі ставіліся ў школьных тэатрах Оршы, Полацка, Навагрудка, Віцебска.

Пры ўсіх хібах, якія ўвогуле мела адукацыя, атрыманая ў езуітаў (абскурантысцкія адносіны да ідэй вальнадумства, падаўленне асобы вучня жорсткай дысцыплінай, адсутнасць у структуры класічнай школы нацыянальнага элемента і г.д.), можна сцвярджаць, што аршанская езуіцкая школа была для свайго часу моцным асяродкам адукацыі на ўсёй Аршаншчыне. На працягу трох першых чвэрцей 18 ст. ў ёй працавалі 4—5 прафесараў, людзей адметнай адукацыі і ведаў. Статыстычныя даныя аб колькасці вучняў захаваліся толькі на пачатак 19 ст, ў розныя гады ў школе навучаліся ад 36 да 90 чалавек. Асаблівую цікавасць выклікаюць славутыя выхаванцы аршанскіх езуітаў. Пасля заканчэння школы некаторыя з вучняў прынялі духоўны сан і здолелі зрабіць сабе добрую кар'еру на новай ніве. Сярод іх варта адзначыць Яна Красоўскага, які стаў уніяцкім біскупам; Станіслава Шадурскага (1726—66), прафесара філасофіі, выкладчыка тэалогіі і царкоўнага права; Францішка Кару (1731—1802), прафесара архітэктуры, рэктара Полацкага і Аршанскага калегіумаў, генеральнага вікарыя езуітаў на Беларусі. З тых вучняў аршанскіх езуітаў, што засталіся «ў свеце», асабліва вылучаецца Пётр Завадоўскі (1739—1812), знакаміты расійскі дзяржаўны дзеяч, міністр народнай асветы ва ўрадзе Аляксандра I. Натуральна, што пра гэты факт біяграфіі славутага сенатара не вельмі любіла згадваць дарэвалюцыйная дваранская гісторыяграфія.

Аршанская езуіцкая калегія перапыніла сваю дзейнасць у 1820-я гады, калі па загадзе Аляксандра I на тэрыторыі Расійскай імперыі ордэн быў скасаваны. Зачыняліся ўсе калегіі, маёмасць іх падлягала канфіскацыі, манахі-езуіты павінны былі пакінуць межы дзяржавы. Езуітаў Віцебскай і Магілёўскай губерняў меркавалася выслаць за мяжу «прежде прочих». Справа адукацыі моладзі перадавалася ў рукі манахаў іншых ордэнаў.

У былых езуіцкіх мурах у Оршы была адчынена 4-класная дамініканская школа. «Кляштар, што застаўся пасля езуітаў, вельмі зручны для размяшчэння настаўнікаў і канвіктараў», — адзначалася ў акце візітацыі новай школы. Аднак і новыя ўладары знаходзіліся тут нядоўга: у 1829 г. ўсе дамініканскія школы ў Оршы былі зачынены. З гэтага часу практычна і пачалося разбурэнне комплексу пабудоў былой езуіцкай калегіі.

Наступнае дзесяцігоддзе будынкі стаялі безгаспадарчымі, пакуль не былі перададзены ў вайсковае ведамства. Меркавалася размясціць у іх палкавы штаб, аднак праект гэты застаўся толькі на паперы. Аднойчы веснавой ноччу 1842 г. абрынулася каля 20 м мураванай сцяны, якой была абнесена тэрыторыя калегіі. Гэта акалічнасць прыспешыла ўлады зрабіць выснову аб неабходнасці эксплуатацыі будынкаў, таму што яны, застаўшыся і надалей без нагляду, маглі «придти в совершенное расстройство». Было вырашана зрабіць тут новы гарадскі астрог, у які першыя арыштанты былі пераведзены ўжо ў жніўні 1842 г. У будынках былой калегіі, прыстасаваных для навучання, пачаліся паўсюдныя пераробкі, якія вымагала іх новае функцыянальнае прызначэнне. У 1848 г. спецыяльным загадам імператара тут былі дадаткова размешчаны лазарэт для арыштантаў астрога і памяшканні для ніжніх чыноў мясцовай інваліднай каманды.

Больш за ўсё не пашчасціла былому езуіцкаму касцёлу імя архангела Міхаіла. Першапачаткова яго хацелі перадаць праваслаўным, кансісторыя ўжо нават склала каштарыс на перабудову. Аднак пазней улады прынялі рашэнне прадаць храм на знос. З яго вынеслі начынне і абразы, знялі званы, пачалі разбіраць дах і сцены. Да сярэдзіны 19 ст. хрысціянскі храм рукамі хрысціян быў знішчаны поўнасцю.

Затое турэмны замак у будынках былой калегіі ўладкаваўся трывала, на цэлыя 150 гадоў. У 1863 г. ў Аршанскім астрозе ўтрымліваліся «палітычныя злачынцы», якіх адтуль накіроўвалі ў Сібір. Пазней тут знаходзіліся ўдзельнікі хваляванняў 1905 г., пакутавалі ахвяры сталінскага і гітлераўскага генацыду.

Сёння гісторыя Аршанскай калегіі мусіць атрымаць свой працяг. Будынкі былой турмы перададзены аддзелу культуры Аршанскага гарвыканкома, зроблены праект рэстаўрацыі помніка. Магчыма, праз колькі гадоў калегіі зноў будзе вернуты яе колішні шляхетны выгляд і сэнс установы, якая дбае перш за ўсё пра душу і розум чалавека.

Л.П. Хмяльніцкая.

Кальвінізм у Оршы

Рэфарматарскія ўплывы ішлі на Беларусь і з захаду (у 1525 г. становіцца лютэранскай Прусія, следам за ёй — Лівонскі ордэн), і з усходу (у 1552 г. з Расіі ў Віцебск прыехалі тры манахі-ерэтыкі, сярод іх — вядомы вальнадумец Феадосій Касы). У 1563 г. аднаго з іх злавіў Іван IV у захопленым Полацку і асобна загадаў вывесці яго на Дзвіну і ўтапіць у палонцы.

Спачатку ў Вялікім княстве Літоўскім з пратэстанцтвам змагаліся, у 1538 г. прыхільнікам пратэстанцтва пачынае пагражаць выгнанне і канфіскацыя маёмасці, у 1542 г. — страта шляхецтва. Было забаронена нават запрашаць немцаў у настаўнікі і ездзіць вучыцца за мяжу. Нарэшце, у 1544 г. вялікім князем становіцца Жыгімонт Аўгуст, які быў католікам, але пры якім у княстве ўстанаўліваецца надзвычайная па тых часах канфесійная талерантнасць (прыкладна ў тую ж самую эпоху ў Парыжы адбылася Варфаламееўская ноч).

Пашырэнне пратэстанцтва ў Вялікім княстве Літоўскім звязваецца з дзейнасцю братоў Мікалая Радзівіла Чорнага і Мікалая Радзівіла Рудога, чый уплыў асабліва ўзмацніўся

пасля шлюбу Жыгімонта Аўгуста з сястрой Радзівілаў Барбарай.

Пра тое, што завезеныя Радзівіламі, былымі студэнтамі заходнееўрапейскіх універсітэтаў, і купцамі зернейкі новага светапогляду трапілі ў падрыхтаваную глебу, сведчыць тая імклівасць, з якой кальвінізм заваёўваў сабе пазіцыі на беларускай зямлі. Следам за Радзівіламі ў кальвінізм пераходзяць самыя магутныя магнацкія роды: Сапегі, Хадкевічы, Вішнявецкія, Пацы, Войны, Кішкі, Валовічы, Глябовічы, князі Пронскія, Пузыні, Грушэўскія, Горскія і іншыя, а за імі падалася ў новую веру і шляхта. У 1576 г. ў Вялікім княстве Літоўскім католікі складалі ўсяго каля тысячнай часткі насельніцтва (да Рэфармацыі — 700 парафіяў), а ў Навагрудскім ваяводстве было зачынена 650 праваслаўных храмаў.

Амаль у кожным больш-менш буйным горадзе будаваўся кальвінскі збор, усяго ў Вялікім княстве Літоўскім (улічваючы, што пратэстантызм мала закранаў Украіну) розныя даследчыкі налічваюць ад 163 да 320 кальвінскіх збораў. Быў такі збор і ў Оршы. Польскі навуковец Л.Лукашэвіч пісаў: «Итальянский реформатор Павел Вергериус, путешествовавший в том же году (1555) по этой провинции, нашел в ней великое множество костелов Гельветического исповедования. Первые из них, по основанию, были в Вильне, Клецке, Несвиже, Девельтове, Орше...»

З вышэйпрыведзенай цытаты можна зразумець, што ў 1555 г. ў Оршы ўжо быў кальвінскі збор. Адам Кіркор у кнізе «Жывапісная Расія» называе заснавальнікам збору Мікалая Радзівіла Чорнага. Вядома таксама, што пры зборы дзейнічала школа. Мяркуецца, што выбар для Вялікага княства Літоўскага менавіта кальвінскай плыні пратэстанцтва быў не выпадковым, а з'яўляўся часткай планаў Мікалая Радзівіла Чорнага, які імкнуўся да незалежнасці Вялікага княства і разлічваў на тое, што кальвінізм пазбавіць Вялікае княства Літоўскае ад уплыву не толькі з боку Масквы, але і з боку Польшчы, дзе панавала каталіцтва, а пратэстантызм пашыраўся пераважна ў форме лютэранства.

В.М. Сцяпанаў.

ІХ ІМЁНЫ ЗАСТАЛІСЯ Ў ГІСТОРЫІ

Труцэвіч Іаіль

Да ліку славутых людзей 17 ст. — прадаўжальнікаў вялікай справы Францыска Скарыны — належыць друкар, пісьменнік, грамадскі і культурны дзеяч, заснавальнік Куцеінскага манастыра Іаіль Труцэвіч. Дзейнасць яго прыпадае на першую палавіну стагоддзя.

Біяграфічных звестак пра І.Труцэвіча, на жаль, амаль няма. Невядомы нават час нараджэння. Некаторыя даследчыкі лічаць, што нарадзіўся ён на Магілёўшчыне, магчыма, у самім Магілёве. Тут прайшлі яго дзяцінства і юнацтва. У 2-й чвэрці стагоддзя ён стаў членам Магілёўскага богаяўленскага брацтва. Актыўна займаючыся не толькі рэлігійнай, але і асветніцкай дзейнасцю, звярнуў на сябе ўвагу вышэйшага праваслаўнага духавенства. Верагодна, што Труцэвіч быў сведкам паўстання магілёўскіх праваслаўных гараджан супраць уніяцкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча ў снежні 1618 г. і падзея гэта зрабіла глыбокі ўплыў на яго далейшы жыццёвы лёс. Справу аб паўстанні разглядаў варшаўскі суд. Згодна з яго рашэннем праваслаўныя цэрквы і манастыры перадалі католікам і уніятам. Спроба братчыкаў заснаваць у Магілёве новы манастыр аказалася няўдалай.

У гэтых умовах у Труцэвіча нарадзілася думка аб заснаванні цэнтра сваёй дзейнасці побач з Оршай, у маёнтку буйнога беларускага праваслаўнага феадала Багдана Статкевіча. Грамата на гэта ад Іерусалімскага патрыярха Феафана была атрымана ў 1620 г.

Работы пачаліся. У 1626 г. было завершана ўзвядзенне Святадухаўскай царквы і іншых манастырскіх пабудоў. Будаўніцтвам увесь час кіраваў сам Труцэвіч, што дазволіла

яму набыць вялікі практычны вопыт, які вельмі спатрэбіўся ў далейшым. У час сустрэч з буйнымі праваслаўнымі феадаламі ён змог пераканаць іх у неабходнасці стварэння цэлай серыі манастыроў як апорных пунктаў праваслаўя. Апрача Куцеінскага Богаяўленскага манастыра намаганнямі Труцэвіча ў 1630-х — пачатку 40-х гг. былі пабудаваны Куцеінскі Успенскі, Буйніцкі, Святадухаўскі, Тупічэўскі Святадухаўскі, Баркалабаўскі манастыры.

Шмат увагі надаваў Труцэвіч арганізацыі жыцця і дзейнасці створаных культавых устаноў. Як ігумн галоўнага, Куцеінскага манастыра, ён адначасова з'яўляўся кіраўніком усіх манастыроў. Пасада ігумена выбарная. У выбарах бралі ўдзел усе манахі. Згодна з рэгламентам, які распрацаваў Іаіль, выбары лічыліся сапраўднымі тады, калі ігумен выбіраўся аднагалосна. Кандыдат павінен быў адпавядаць шматлікім патрабаванням, у тым ліку і такому, як адукаванасць. Вялікі клопат першы ігумен праяўляў аб умацаванні сувязей з мясцовымі праваслаўнымі арганізацыямі, а таксама «обителями повету Оршанского, людей народу нашего русского». Іх прадстаўнікі склалі Аршанскае, Магілёўскае і іншыя праваслаўныя брацтвы, якія актыўна падтрымлівалі пачынанні Труцэвіча. Усе манастыры хутка ўмацоўваліся і набывалі папулярнасць. Што датычыць Куцеінскага, дык яго, як месца найбольш паважанае і багатае, усё часцей называлі Беларускай лаўрай. Ігумен не абмяжоўваўся толькі рэлігійнай дзейнасцю. Ён разам са сваімі аднадумцамі шмат зрабіў для пашырэння асветы. Вядома, што пры актыўным яго ўдзеле былі створаны брацкія школы ў галоўным Куцеінскім, а таксама ў Тупічэўскім манастырах. Куцеінскія манахі дапамагалі школе пры манастыры Раства Багародзіцы. Стварэнне такіх школ было справай небяспечнай і цяжкай з прычыны забароны іх уладамі.

Вялікая бяда была ў тым, што пры навучанні не хапала самага галоўнага — кніг. Тыя адзінкавыя экзэмпляры, што меліся ў манастырскай бібліятэцы, не маглі мець істотнага значэння. Патрэбна была свая друкарня. У неабходнасці мець яе Труцэвіч змог пераканаць Статкевіча, іншых вядомых у той час праваслаўных феадалаў і нават Кіеўскага мітрапаліта Пятра Магілу. Для адкрыцця друкарні ў Куцейне меліся адносна добрыя ўмовы. Знаходзілася яна ў 3 вярстах ад горада, праз які пралягалі важныя водныя і сухапутныя шляхі. Меліся тут і пісьменныя манахі. Друкаром з Кіева запрасілі Спірыдона Собаля, які ўжо меў вопыт выдавецкай дзейнасці. Але ігумен, зрабіўшы стаўку на С. Собаля, ведаў не толькі аб яго прафесіяналізме. Разумеў: каб друкаваць кнігі, патрэбна яшчэ мужнасць, а, магчыма, і самаахвярнасць. Аб'ектыўна С.Собаль адпавядаў і гэтым патрабаванням, бо з'яўляўся сведкам пакарання магіляўчан, якія выступілі супраць Кунцэвіча, і сярод якіх быў яго бацька.

Собаль аказаўся таленавітым, працавітым друкаром. Арганізацыйнымі пытаннямі займаўся непасрэдна ігумен. Менавіта ён падбіраў для друку кнігі. Кожная ўтрымлівала прадмову, аўтарам большасці іх быў Іаіль. Ён добра валодаў беларускай мовай і настойваў, каб кнігі выдаваліся на ёй.

Напалеон загадаў знішчыць пантонныя паркі, 600 нязмораных коней, што вызваліліся у выніку гэтага, перадаць артылерыі. Боепрыпасы былі папоўнены са складаў, што знаходзіліся ў горадзе. У Оршы спальваліся лішнія абозы, у тым ліку з награбленым у Расіі дабром. Напалеон аддаў загад утапіць у Дняпры трафеі (сярод іх аказалася знойдзенае пасля вайны вялікае сярэбранае панікадзіла, вывезенае французамі з Успенскага сабора Маскоўскага Крамля). Больш таго, сам імператар каля гадзіны пры ўездзе на мост адбіраў з абозу карэты і павозкі, якія падлягалі знішчэнню. У пакаранне тым, хто турбаваўся толькі аб асабістым інтарэсе, было загадана падпаліць карэту маёра Леруа, не дазволіўшы нічога адтуль забраць.

Паводле распараджэння статс-сакратара графа П.Дару быў спалены архіў «Вялікай арміі» (нават сакрэтныя, у адным асобніку, паперы). Салдатам дазвалялася мець пры сабе, акрамя зброі, хлеб, бялізну і абутак.

Вестка аб авалоданні рускімі Мінска прымусіла Напалеона паклапаціцца пра далейшы маршрут. З Оршы можна было адыходзіць у 3 напрамках: 1-ы — злучыўшыся з карпусамі Віктора і Сен-Сіра, абысці верхняе цячэнне Бярэзіны і крочыць на Вільню, 2-гі — рухацца на поўдзень, у абход Барысава, на злучэнне з карпусамі Шварцэнберга і Ранье. І, нарэшце, 3-ці, найкарацейшы шлях — праз Барысаў. Яго і выбраў Напалеон.

Каб было менш страт пры адступленні, начальнік разведкі напалеонаўскай арміі генерал М.Сакальніцкі разаслаў фальшывыя загады за подпісам імператара. Потым выявілася, што яны адыгралі пэўную ролю — рускае камандаванне паверыла ў існаванне знішчаных французскіх часцей і злучэнняў.

Знаходзячыся ў Оршы, Напалеон не пераставаў думаць пра маршала М.Нея, што ішоў у ар'ергардзе арміі. Згубіўшы ўсялякую надзею на тое, што «найхрабрэйшы з храбрых» (так справядліва называлі Нея ў арміі) вырвецца з кальца рускіх войскаў, Напалеон выступіў 8(20) лістапада з Оршы і к вечару прыбыў у маёнтак Барань. Сюды праз некаторы час прыскакаў афіцэр з данясеннем, што Ней ідзе да Оршы. Імператар, які лічыў маршала загінуўшым, шчыра ўзрадаваўся. Нездарма ён казаў: «Я аддаў бы 300 мільёнаў золата, якое захоўваецца ў мяне ў падвалах Цюільры, каб выратаваць яго».

Пакінуўшы Смаленск апошнім, «князь Маскоўскі» Ней з 8 тыс. воінаў здолеў вырвацца з акружэння і, праявіўшы выдатную асабістую мужнасць, перайшоў па тонкім, ломкім лёдзе Дняпро, згубіўшы з 3 тыс. салдат і афіцэраў 2200 чалавек. З астатнімі ён увайшоў у Оршу. «Ні адна выйграная бітва не рабіла такой сенсацыі, — успамінаў Каленкур. — Радасць была ўсеагульнай, усе былі быццам у ап'яненні, усе мітусіліся і бегалі, паведамляючы адзін аднаму аб вяртанні Нея... Афіцэрам і салдатам — усім здавалася, што нам не страшны цяпер лёс і стыхіі, што французы непераможныя!»

Але напарадзе была р. Бярэзіна...

Следам за адыходзячай напалеонаўскай арміяй ішлі авангардныя часці расійскага войска: казакі атамана М.Платава, атрады генерала М.Міларадавіча, партызанскія злучэнні Дз.Давыдава і А.Сяславіна.

8(20) лістапада атрад генерала М.М.Барадзіна (у яго складзе служыў аршанец граф Леў Салагуб) заняў Дуброўна і рушыў на Оршу. Разам з ім дзейнічалі партызаны Сяславіна. У ноч на 7(19) лістапада ён даносіў камандаванню: «Напаў я з казакамі на в. Крапіўна, што на вялікай дарозе, і непрыяцель, які быў устрывожаны, запаліў паселішча і паспешна адступіў да Оршы... Пры гэтым выпадку паколата (непрыяцеля. — В.Л.) немалая колькасць...»

Часці Даву і Нея, якія адыходзілі з Оршы апошнімі, знішчылі пераправу і падпалілі горад. Як сведчылі самі французы, дым пажарышча быў бачны на адлегласці 15 вёрст.

Першымі ў горад уварваліся казакі палка Паісія Сяргеевіча Кайсарава. Яны адразу ж кінуліся тушыць агонь. Аршанцы былі ўдзячны і дажджу, які пачаўся 8 лістапада і працягваўся з невялікімі перапынкамі некалькі сутак.

Актыўны ўдзел у вызваленні Аршаншчыны прымала партызанскае злучэнне славутага Дзяніса Васілевіча Давыдава. У сваім «Дзённіку ваенных дзеянняў 1812 года» ён запісаў: «У ноч на 8-е засада, якая была пастаўлена мной на дарозе з Оршы на Горкі ляжачай, перахапіла спачатку кур'ера, а праз дзве гадзіны жыда, пасланых ад маршала Берцье да Бланкара з загадам ісці найхутчэй за Дняпро». Маёр Бланкар узначальваў кавалерый-

скае дэпо ў Горках. 6(18) лістапада ён дакладваў камандаванню ў Оршу, што гарнізон цалкам разладжаны. Дэпо Бланкара, падпарадкаваўшыся загаду, пайшло да Копысі. Даведаўшыся пра гэта ад мясцовых жыхароў, Давыдаў накіраваўся туды праз Гараны, Бабінічы. Далей Давыдаў паведамляў: «На падходзе даведаўся я, што дэпо прыбыло ў Копысь і заняло яго, з усёй воінскай засцярогай, палавіннай колькасцю пешых кавалерыстаў, каб назаўтра прыкрыць імі пераправу цяжкасцей; абараняемую другой палавінай гэтай свалаты. Гэтыя абставіны вымушалі мяне прыпыніцца скрытна ў шасці вярстах ад Копысі, пры сяле Смётана, з намерам не раней распачаць напад, які на пераправе паловы дэпо празу раку, і тады разбіць паасобку: адну частку на гэтым, а другую — на тым баку Дняпра. Рака не была яшчэ пакрыта льдом, толькі краі былі лёгка замерзлыя.

Дзевятага, раніцой, мы паімчаліся да Копысі. Амаль палова дэпо была ўжо на супрацьлеглым беразе; другая палова, што засталася на гэтым баку, мела намер спачатку абараняцца супраць гусараў маіх і Данскога палка Папова-13-га, што займалі галоўную вуліцу; але калі хутка Чачэнскі з Бугскім сваім палком прабраўся ўздоўж берага і з'явіўся ў тыле яе, сярод горада, ля пераправы, — тады ўсе сталі кідаць зброю, адразаць ворчыкі ў перавозачных коней і перапраўляцца дзе папала ўплаў на супрацьлеглы бераг. Імгненна рака пакрылася людзьмі і коньмі, якія плылі і тапіліся. Берагі яе і сама яна былі завалены фурамі, карэтамі і брычкамі. Па вуліцах пачалася пагоня і разня бязлітасная, а з супрацьлеглага берага пачаўся па нас моцны ружэйны агонь... Хутка коннікі мае ачысцілі ад непрыяцеля вуліцы. Я сабраў палкі і, нягледзячы на пальбу, якая вялася з супрацьлеглага берага, пусціўся двума натоўпамі ўплаў цераз Дняпро, абплываючы, так сказаць, справа і злева лінію стралкоў, якія абаранялі пераправу. Яшчэ мы не дакрануліся да берага, як большая частка гэтых стралкоў прыйшла ў замяшанне, пачала кідаць зброю і крычаць, што яны здаюцца. Мы пераправіліся. Я скіраваў сотню казакаў для ўзяцця тых, хто здаўся ў палон, тых, хто схаваўся ў Александрыі (вёска непадалёку ад Копысі. — В.Л.), і бягучых у разбродзе па Беларускім гасцінцы. Уся партыя кінулася за рэшткамі дэпо, напрамак якога паказвалі кінутыя фуры, павозкі і пехацінцы, адстаўшыя ад галоўнай масы, якая ўжо складалася не больш чым з 250 радавых і афіцэраў, бо ўсе паразыходзіліся па лясах, загінулі ў рацэ, паколаты казакамі і захоплены імі ў палон. Гэтых апошніх было шэсцьсот радавых і, памятаецца, каля дзесяці афіцэраў».

Па-рознаму сустракалі вызваліцеляў ад напалеонаўскай навалы жыхары Копысі і навакольных вёсак. Той жа Давыдаў 9(21) лістапада дакладваў начальніку штаба арміі генералу П.П.Канаўніцыну: «Цяпер мы ў непрыяцельскай зямлі, дзе ўсе супраць нас... Тутэйшыя жыхары вельмі варожа да нас ставяцца. Я некаторых аддаў цялеснай кары...» Напэўна, гэта былі ці польскія шляхціцы, ці сяляне, якія, абабраныя французскімі акупантамі, вымушаны былі даваць пракармленне і расіянам.

13—14 (25—26) лістапада ў Копысі знаходзіўся галоўнакамандуючы рускай арміі М.І.Кутузаў. Адсюль ён накіраваў ліст адміралу П.В.Чычагову, у якім прапанаваў свой план разгрому Напалеона на Бярэзіне. 14(26) лістапада фельдмаршал у лісце да жонкі адзначыў: «Непрыяцель усё бяжыць, згубіў з галоўнай сваёй арміі ўсю артылерыю, яму ісці лёгка». На думку некаторых гісторыкаў, зацягнуты «адпачынак» Кутузава ў Копысі адмоўна адбіўся на завяршэнні аперацыі па знішчэнні французскай арміі.

У сувязі з уступленнем асноўных сіл расійскай арміі на тэрыторыю Беларусі М.І.Кутузаў звярнуўся да воінаў: «Я находжу... найстражайша забараніць усялякі дух помсты і нават нараканні ў чым-небудзь жыхарам беларускім больш прычыненні ім крыўд і ўціску, а, наадварот, хай сустрэнуць яны ў нас, як родзічы нашы братоў, абаронцаў ад агульнага ворага і суцяшальнікаў ва ўсім тым, што яны пацярпелі ў кароткачасовую бытнасць пад ярмом чужой і гвалтоўнай улады, прышэсцем нашым хай адрадзіцца між імі цішыня і спакой».

Трэба адзначыць, што большасць мясцовага насельніцтва з натхненнем сустракала вызваліцеляў ад іншаземнага нашэсця. «Пры ўступленні нашым усеагульная радасць, непрыяцель пакінуў паўсюдна нянавісць», — пісаў з-пад Оршы генерал А.П.Ярмолаў. Знаходзячыся ў Дуброўна, 9(21) лістапада ён даносіў Кутузаву: «Нам немагчыма абысці гэтага горада, дзе ў манастырах ёсць зручнасць

размясціць шпіталі і розныя дэпо... Таму няма стану, у якім бы не было прыкметна радасці аб вяртанні нашым, і праклёны пасылаюцца ўслед за непрыяцелем».

Паводле загада М.Платава камендантам Оршы быў прызначаны палкоўнік Майсей Іванавіч Карпенка (Карпенкаў). Даручыўшы яму 1-ы егерскі полк і сотню казакаў, атаман накіраваўся на Талачын. Шмат намаганняў прыклаў Карпенка для аднаўлення ў горадзе нармальнага жыцця. Ён заснаваў новае гарадское кіраванне, склаў вопіс адбітай у французаў ваеннай і іншай маёмасці, накіраваў ва ўнутраныя губерні больш за 5 тысяч палонных. У Оршы дзейнічаў шпіталь для хворых і параненых французаў, кінутых Напалеонам пры адступленні з Расіі.

Востра паўстала пытанне пра ачыстку горада ад трупаў людзей і коней, што засталіся на вуліцах, плошчах і дварах. Каб пазбавіцца ад іх, Карпенка загадаў раскласці на левым беразе Дняпра кастры і спаліць трупы.

16(22) лістапада 1-ы егерскі полк пакінуў Оршу і рушыў праз Копысь на Шклоў. У лістападзе—снежні ў Оршы і яе наваколлі размяшчаліся 8-ы пяхотны полк Маскоўскага апалчэння, 1-ы, 3-і, 5-ы, 9-ы казацкія палкі Палтаўскага і 4-ы полк Чарнігаўскага апалчэння.

Оршу, нарэшце, мінула ваеннае ліхалецце.

Вайна 1812 года нанесла крывавыя, доўга незагойныя раны нашай зямлі і яе народу. Жудасная карціна паўстала перад поглядам тагачасніка. «Праедзеш Оршу, Дуброўну, Барысаў, Мінск і нічога не заўважыш, акрамя беднасці ў народзе і паўсюднага разбурэння — немінучага выніку вайны, — пісаў Фёдар Глінка. — Руіны дамоў і разораныя французамі вёскі — вось што паўстае вачам нашым! Шмат патрэбна часу, каб згладзіць сляды вайны!»

У 1814—17 гг. праводзілася 7-я рэвізія (перапіс сельскага і гарадскога насельніцтва для вызначэння падаткаў). Па Магілёўскай губерні колькасць гарадскога насельніцтва за ваенны і пасляваенны перыяд (1813—15) скарацілася на 32%. На жаль, па Оршы няма канкрэтных даных за гэтыя гады. Вядома толькі, што ў 1825 г. ў горадзе пражывала 2158 чалавек, што на 204 больш, чым у перадваенным 1811 г. У Копысі напярэдадні нашэсця жылі 1874 чалавекі, у 1815 г. — 1502 чалавекі. Паводле ўжо вядомай нам «Ведамасці...» смаленскага губернскага пракурора, з 326 душ, што налічвалася ў Смалянах паводле даваеннай рэвізіі, «памерла і разышлося невядома куды 157».

У канцы 18 ст. ў Оршы было 397, у 1825 г. — 227. У Копысі колькасць жылых пабудоў перавысіла даваенны ўзровень толькі ў 1860-х гадах.

Напалавіну скараціласа пагалоўе жывёлы. Так, у Магілёўскай губерні наступаючыя расійскія войскі ўзялі «в разный ізвоз» больш за 3 тыс. коней. Практычна знішчаны быў багаты ўраджай 1812 г. Пасяўныя плошчы беларускіх губерняў склалі 50% даваенных. Прыкладна столькі ж, відаць, было па Аршанскім і Копыскім паветах. Сялянства, даведзенае нашэсцем да галечы, гаравала і галадала. «Ад Копысі... жыхароў нідзе не знаходзіш, — пісаў адзін з рускіх афіцэраў, — сяленні былі пустыя, як гаворыцца, ні кошкі, ні сабакі. У свірнах і пунях усё было чыста: ні зерня, ні круп, ні шматка сена».

Цалкам або часткова былі разбураны масты і пераправы, дарогі былі завалены розным хламам. Тысячы трупаў людзей і жывёл, што ляжалі непахаванымі на трактах і прасёлках, берагах рэк, напаўнялі паветра невыносным смуродам. У рапарце міністра паліцыі А.Балашова «Аб пахаванні паўшых» паведамлялася пра закапванне 430 707 чалавечых трупаў на ваеннай дарозе ад Масквы да Вільні. Немалая доля іх прыпадала на Беларусь, якая стала, паводле слоў У.І.Ігнатоўскага, «нейкай сусветнай трупярняй.». У Копыскім павеце спалілі і закапалі каля 13 тыс. «сабраных непрыяцельскіх чалавечых целаў, загінуўшых пры праследаванні расійскімі войскамі».

Велізарныя страты нанесла нашэсце навакольным лясам. Позняй восенню і зімой, каб хоць трохі абагрэцца, французы падпальвалі лес. Такія лясы-«галавешкі» цягнуліся ўздоўж дарогі ад Смаленска да Мінска і далей на Вільню. Англічанін Р.Джонстан, які ехаў з Оршы ў Барысаў, запісаў у сваім «Падарожжы»: «Нішто не можа выглядаць так гаротна, як сумныя і заблытаныя сляды адступлення французскай арміі. Шэрагі бяроз, высаджаныя ўздоўж дарогі, былі цалкам спалены; кожнае дрэва не толькі ля дарогі, але і ў самай глыбіні лесу было падпалена. Здавалася, што французы раскладвалі вогнішча ля

падножжа кожнага дрэва, бо кожнае дрэва было напалову спалена або з глыбокімі ранамі».

Падлічаныя пасля вайны страты (сюды ўваходзілі кошт спаленай і разрабаванай маёмасці жыхароў, страты ад падзяжу жывёлы, знішчэння хлеба на палях, кошт розных паставак для напалеонаўскай арміі і інш.) склалі па Магілёўскай губерні 39 497 764 руб. Вялікія страты панеслі Аршанскі (3 млн. руб.) і Копыскі паветы.

Такімі былі вынікі напалеонаўскага нашэсця. Нездарма ў народнай памяці 1812 год надоўга заставаўся пад найменнем «разоранага года».

В.П.Лютынскі.

Падзеі паўстання 1863 года на Аршаншчыне

Пачатак 1863 г. азнаменаваўся новым пад'ёмам сялянскага руху ў Беларусі, які быў выкліканы надзеяй былых памешчыцкіх сялян атрымаць «настоящую волю» ў сувязі з пераводам іх у становішча часоваабавязаных. Гэта супала па часе з нацыянальна-вызваленчым паўстаннем, якое ў 1863 г. ахапіла ўсю Польшчу.

Асаблівае значэнне надавалася паўстанню ў Магілёўскай губерні. Меркавалася, што тут разгорнуцца падзеі, ад якіх будзе залежаць поспех агульнарасійскай рэвалюцыі, на якую мелі вялікую надзею рэвалюцыйныя дэмакраты. У пачатку 1863 г. сюды быў накіраваны Людвік Звяждоўскі, якому было даручана кіраўніцтва ўсімі дзеяннямі паўстанцаў на ўсходзе Беларусі. Да гэтага ў губерню прыбылі з Масквы і Пецярбурга афіцэры І.Будзіловіч, К.Жаброўскі, А.Алендскі, Я.Жукоўскі, якія пачалі фарміраваць паўстанцкія атрады ў Аршанскім, Сенненскім і Чэрыкаўскім паветах.

У в. Зарубы Аршанскага павета Л.Звяждоўскі стварыў атрад. З дапамогай студэнтаў Горы-Горацкага земляробчага інстытута яму ў ноч з 23 на 24 красавіка 1863 г. ўдалося захапіць Горкі. Атрад захапіў зброю, грошы і днём 24 красавіка пакінуў горад.

Аднак паўстанне на Аршаншчыне адбывалася ў неспрыяльных умовах. Большасць сялян павета ставілася да яго варожа. Атрад Звяждоўскага неўзабаве быў разбіты. Прасякнутыя царысцкімі ілюзіямі, падманутыя дэмагагічнай агітацыяй улад, яны дапамагалі ўладам лавіць паўстанцаў. Злоўленыя ў Аршанскім і суседніх паветах паўстанцы накіроўваліся ў Оршу. Так, адзін з кіраўнікоў паўстанцкага атрада ў Аршанскім павеце Ігнат Будзіловіч, які дзейнічаў пад псеўданімам Каткоў і Ян Ніховіч, у час бою пад Пагосцішчамі быў схоплены і паводле прыгавору ваеннага суда расстраляны ў Оршы.

Дакументы сведчаць

АПОШНЯЕ ЖАДАННЕ

В один из ненастных осенних дней 1863 г. г. Орша имел необыкновенный вид. Несмотря на холод и дождь, несмотря на раннее утро, почти все жители были на главной улице, о чем-то оживленно разговаривали, устремляя взоры и показывая руками в одну сторону, чего-то, видимо, ожидая. Наконец в толпе послышались голоса: «ведут, ведут» и все бросились в конец улицы к тому месту, где кого-то вели. Скоро все увидели то, чего ждали: в город входили окруженные казаками, солдатами и вооруженными жителями 400 польских повстанцев. В предыдущую ночь в окрестностях Орши были разбиты три банды, почти целиком взяты в плен и теперь приведены в город. Впереди повстанцев со связанными руками шли, видимо, их главные предводители: два молодых офицера русской артиллерийской бригады, которая квартировала в Орше. Это были братья К., бежавшие к повстанцам несколько дней назад. Старший из них статный красивый блондин лет 23-х шел твердой, уверенной походкай, спокойно рассматривая толпу жителей. Младший — лет 18-ти, худенький, маленький, с едва пробивающимися усиками был, видимо, сильно взволнован, шел мелким, быстрым шагом,

потупив голову вниз. Третий из повстанцев громадного роста, худощавый старик лет 60-ти, с длинными седыми усами, с давно небритой бородой, одетый в национальный польский костюм, шел гордо, спокойно; лицо его некогда красивое, выражало полное равнодушие, а голубые глаза смотрели даже приветливо. Остальные повстанцы представляли собою обыкновенную серую толпу мужиков, забитых, жалких, угнетенных.

При вступлении в город конвойные казаки энергично принялись разгонять толпу жителей, которая скоро разбежалась по разным улицам и переулкам, а пленные повстанцы медленно продолжали движение к месту своего заключения. На основании приказа графа М.И.Муравьева суд над повстанцами должен был состояться как можно скорее и приговор должен быть произнесен по возможности не позже как в 24 часа, а если кто-либо подлежит смертной казни, то она должна быть произведена немедленно после объявления приговора. Суд (по законам военного времени) составляли тут же на месте из числа наличных воинских чинов под председательством старшего. В Орше тогда стояла резервная артиллерийская бригада, командир которой и являлся председателем. Еще ночью дали ему знать, как начальнику гарнизона, о поимке банд, о том, что захвачены с оружием в руках братья К., офицеры бригады, и что утром все повстанцы будут приведены в город.

Таким образом суд мог состояться немедленно. В тот же день около 8-ми утра в помещении канцелярии бригады все судьи были в сборе. Конечно, гвоздь события составляли братья К. Раньше за ними ничего подозрительного не замечалось; это были скромные работящие офицеры, довольно общительные и веселые. Жили они вместе с матерью старухой, все в городе их знали, и никому в голову не приходило, чтобы эти два юноши могли уйти «до лесу». Они исчезли из Орши всего несколько дней тому назад, но никто об этом не беспокоился, так как три батареи бригады стояли в окрестностях города, и офицеры часто ездили к своим товарищам, не докладывая о том начальству. Не беспокоились еще и потому, что их мать оставалась спокойною и никому не говорила об исчезновении сыновей. Таким образом поимка их, да еще с оружием в руках во главе банд, как громом поразила всех, особенно сослуживцев.

Около 8-30 часов утра началось судебное разбирательство.

Свидетели, военные начальники, разбиравшие банды, единогласно показали, что все трое обвиняемых были взяты в бою, с оружием в руках, во главе банд, что все трое отчайно сопротивлялись, но скоро были обезоружены и связаны.

На вопрос председателя, имеют ли что-либо обвиняемые возразить на показания свидетелей, все трое отвечали, что не имеют. Затем было преступлено к допросу рядовых повстанцев. Их показания почти все были одинаковы Никто не признавал себя виновным в вооруженном восстании. Одни говорили, что их заставила идти «до лесу» мать, грозя проклятиями, других гнали в лес ксендзы, обещая вечные муки и на том свете и отлучение от церкви, третьи, что их обманули, говоря, что они идут драться не против русского правительства, а за него. Вообще ни один не признал себя виновным, сваливая свое участие в восстании на внешние причины, которым нельзя было противостоять. О братьях К. показали, что они давно уже разъезжали по окрестностям Орши, уговаривая жителей через ксендзов и женщин идти в банды, то обещая за это громадные земельные наделы, деньги и т.п., то пуская в ход разные угрозы.

О третьем предводителе — старике показали то же самое, причем обвиняли его в жестоком обращении с подчиненными, в том, что он подорвал все их силы быстрыми передвижениями и т.п.

Несмотря на сравнительно короткий допрос каждого обвиняемого, судебное разбирательство очень затянулось; к 3 часам ночи успели допросить около 200 человек. Так как в течение суток приговор не мог быть постановлен, то председатель объявил перерыв до 8 ч. утра.

Граф Муравьев, интересуясь Оршанским делом, тотчас же после получения телеграммы о поимке банды командировал в Оршу состоящего при нем для поручений генерала Костанду (впоследствии командующий войсками Московского военного округа) с приказанием не затягивать суда и чтобы приговоры были постановлены со всей строгостью законов.

Можно даже предположить, что генерал Костанда получил полномочия именем графа конфирмовать приговор, так как в делах нам не удалось найти подлинной резолюции или телеграммы Муравьева, тем более как увидим ниже приговор был приведен тотчас же в исполнение после окончания суда.

Генерал Костанда прибыл в Оршу уже после перерыва судебного заседания и во исполнение указания графа приказал председателю продолжать суд, вследствие чего заседание было открыто в 6 часов утра.

Дальнейший допрос повстанцев был значительно сокращен, как ввиду однородности показаний их, так и вследствие того, что показания первой половины допрошенных давали достаточный материал для дела.

После 10-минутного перерыва, в 3 часа дня заседание продолжалось. Председатель, обращаясь к подсудимым начальникам банд сказал:

— Господа! Вы слышали здесь все показания. Вы обвиняетесь в вооруженном восстании против русского правительства, а вы братья К., кроме того, в измене присяге, в измене долгу службы. Вы не потрудились даже снять с себя мундиров той части, в которой служили. Признаете ли вы себя виновными?

Младший брат робко, вопросительно посмотрел на старшего, который спокойным голосом сказал:

— Господин полковник! Мы с братом признаем себя виновными в измене присяге, долгу службы и в вооруженном восстании против русского правительства. Больше мы ничего сказать не можем.

— А вы, П...ий? — обратился председатель к старику, — признаете ли вы себя виновным в вооруженном восстании против русского правительства?

— Господа судьи! — громко и твердо произнес П-й, — я действительно схвачен с оружием в руках, да! Я боролся против русского правительства, боролся за свободу своей родины... (выступление долгое, в котором он показал, что смысл всей его жизни — свобода Родины. Все члены его банды только добровольцы и пришли бороться только по убеждению. — Е.И.). Свою речь он закончил словами: «Я свое сделал, а теперь нужно, необходимо умереть. Но господа судьи, я имею к вам громадную просьбу. Я знаю, что меня должны повесить... умоляю вас не вешайте меня, а расстреляйте... я солдат. Будьте милостивы, вы сами военные и поймете мои чувства... прошу вас расстреляйте меня».

Одушевленные, искренние слова старика произвели на всех сильное впечатление.

Председатель посоветовавшись с генералом Костанда и членами суда сказал.

— Ввиду полного сознания всех трех подсудимых, ввиду того, что за их преступление положено только одно наказание — смертная казнь, суд не удаляясь на совещание постановил: братьев К. лишить воинского звания и всех прав состояния и предать смертной казни через повешение; дворянина П...ского по лишении всех прав состояния предать смертной казни через расстреляние.

Братья К. стояли бледные, неподвижные. Старик П. перекрестился и, низко кланяясь судьям, произнес:

— Да благословит вас Господь... благодарю вас, очень благодарю.

— Господа! — обратился председатель к обвиняемым, — приговор будет приведен в исполнение через 2 часа. Может быть вы желаете передать вашу последнюю волю, ваше последнее желание, я обязан все сделать для вас. Может вы желаете повидаться с родственниками. К вам, братья К., пришла мать. Не желаете ли ее видеть? Старший из братьев встрепенулся и громким голосом произнес:

— Нет, мы видеть ее не желаем, передайте ей.

— Брат Стась! Что ты говоришь? — испуганным голосом произнес младший. — Как не желаем? Ведь мы скоро умрем.

— Нет! — закричал старший. — Янек, ты не увидишь матери.

— Не имеете ли вы какого-либо желания или просьбы? — обратился председатель к П-скому.

— Нет, — ответил тот вздохнув, — впрочем я имею одну просьбу, но боюсь, что она покажется вам странной. Я последнее время скитался по лесам и болотам, продрог, прозяб, мало ел, а теперь мне очень хотелось бы выпить горячего чаю... больше я ничего не желаю.

— Но ведь вы слышали, что через 2 часа будет приведен над вами в исполнение приговор. Может быть, вы хотите в чай тайком положить яд и умереть раньше приведения приговора в исполнение.

— Даю вам слово порядочного поляка, — сурово сказал старик, — что ничего подобного я не сделаю... просто я желаю чаю, будьте добры, — мягко сказал он, — дайте мне чая, я еще успею его выпить.

Суд постановил разрешить обвиняемому дать чая, и тот за 2 часа до смерти выпил 4 стакана чая, со сливками, с булками, поблагодарил за угощение и весело и бодро пошел на казнь.

Евгений Князев.

(Описанный здесь случай изложен по архивным данным со слов очевидца, отставного поручика артиллерии Мельницкого, ныне помещика Витебской губернии).

Исторический вестник. 1904. Т. 98, декабрь.

РАПАРТ ЖАНДАРСКАГА ПАЛКОЎНІКА САКАЛОВА ШЭФУ ЖАНДАРАЎ КНЯЗЮ ДАЛГАРУКАВУ ПРА БАІ З ПАЎСТАНЦАМІ

30 красавіка 1863 г.

Оршанский исправник подполковник Савицкий с 50-ю нижними чинами и несколькими крестьянами 26 числа Оршанского у. в с. Погостище к границе Витебской губ., уничтожил шайку мятежников, состоявшую, по словам пленных, из 30 хорошо вооруженных, 21 взято в плен, убито 6, спаслось вплавь через реку до 10, остальные утонули, желая спастись вплавь, с нашей стороны убито двое крестьян, ранено 3 рядовых; в числе пленных несколько помещиков Оршанского уезда.

Полковник Соколов.

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. 2, Мн., 1940.

ДАНЯСЕННЕ ПАЛКОЎНІКА САКАЛОВА ШЭФУ ЖАНДАРАЎ КНЯЗЮ ДАЛГАРУКАВУ ПРА СУД НАД І.БУДЗІЛОВІЧАМ

1 верасня 1863 г.

Поручик лейб-гренадерского Екатеринославского е. вел. полка Будзилович, по приговору военного суда, утвержденному Витебским военным губернатором генерал-майором Веревкиным, за сформирование в Оршанском у. Могилевской губ. мятежнической шайки и начальствование над одною, расстрелян в г. Орше 28 числа истекшего августа месяца.

Полковник Соколов.

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. 2, Мн., 1940

Прамысловыя прадпрыемствы Аршаншчыны 2-й палавіны 19 — пачатку 20 ст.

Аршанскае дэпо. Дзейнічае з 1872 г. на чыгуначнай станцыі Орша Маскоўска-Брэсцкай чыгункі. Абслугоўвала і рамантавала паравозы і вагоны. У 1872 г. працавалі 32 чал., у т.л. 9 машыністаў і іх памочнікаў, 3 качагары, 2 змазчыкі; у 1878 — 14 чал., у т.л. 3 качагары і 3 змазчыкі; у 1906 — 199 чал.

Аршанская пенькатрапальная мануфактура. Дзейнічала ў 1880—81 гг. у Оршы. Уладальнік — купец Фаін. У 1881 г. працавала 75 чал., апрацавана 15 тыс. пудоў пянькі на 16,5 тыс. руб.

Аршанская пенькатрапальная мануфактура. Дзейнічала ў 1881 г. ў Оршы. Уладальнік — купец Этынгоф. Працавала 75 чал., апрацавана 15 тыс. пудоў пянькі на 16,5 тыс. рублёў.

Аршанскія чыгуначныя майстэрні. Дзейнічалі з 1872 г. пры Аршанскім дэпо станцыі Орша Маскоўска-Брэсцкай чыгункі. Рамантавалі паравозы і вагоны. У 1895—1903 гг. быў паравы рухавік (25 к.с.), у 1905—13 — паравы рухавік (40 к.с.). У 1900 г. працавала 139 рабочых, ім выплачана 34,2 тыс. руб. заработнай платы. У кастрычніку і снежні 1905 г. адбыліся забастоўкі рабочых пад кіраўніцтвам мясцовай арганізацыі РСДРП.

Баранскі драцяна-цвікавы завод. Дзейнічаў з 1873 г. ў маёнтку каля мяст. Барань (цяпер у межах г. Барань, падпарадкаванага Аршанскаму гарсавету). Вырабляў дрот, кастылі, цвікі драцяныя, падкоўныя і шавецкія, мэблевыя спружыны, шыпы, шайбы, вінты. Абсталяванне для завода было набыта ў Вестфаліі (Германія); 23 драцяныя і 6 паліровачных барабанаў, 19 цвіковых машын, 2 такарныя станкі (для дрэва і металу), стругальная і свідравальная машыны, паравы кацёл. Працавала ад 14 (1876) да 350 (1913) чал. У 1908 г. завод згарэў. У 1909—10 гг. пабудаваны цагляныя карпусы, устаноўлена замежнае абсталяванне, завод пачаў выпускаць абівачныя цвікі, ручны тэкс і іншыя вырабы для абутковай прамысловасці. У 1910 г. выпушчана прадукцыі на 287,6 тыс. руб. У 1913 г. дзейнічалі 3 вадзяныя і 3 газагенератарныя рухавікі. У гады 1-й сусветнай вайны завод вырабляў для арміі калючы дрот, спецпакеты драцяных загародаў, цвікі, падковы, шыпы, скобы. Рабочы дзень у 1885 г. доўжыўся 13,5 гадз. Работа аплачвалася здзельна, месячны заробак складаў: у цвікоўшчыка і драцяншчыка 15—30 руб., слесара 20—25 руб., квасільшчыка 15—21, каваля 40 руб., паліроўшчыка 22—28 руб.

Цесляры, малатабойцы, насільшчыкі, конюхі, вартаўнікі, атрымлівалі па 4—10 руб. у месяц і харчы, якія выдаваліся натурай. Майстры атрымлівалі да 900 руб. у год. У 1879 г. арганізавана харчовая арцель рабочых. У 1885 г. было 20 кватэр для сямейных рабочых, плата складала 3 руб. за месяц. У 1904—07 гг. дзейнічала група РСДРП. 11 ліпеня 1905 г. Аршанская арганізацыя РСДРП арганізавала забастоўку 200 рабочых завода, 13 лістапада 1905 г. рабочыя завода далучыліся да ўсеагульнай забастоўкі. З 1921 г. завод называўся «Чырвоны Кастрычнік», за гады Савецкай улады рэканструяваны і расшыраны. У 1941 г. абсталяванне завода было эвакуіравана ў Башкірскую АССР.

Берасценеўскі завод сухой перагонкі драўніны. Дзейнічаў у 1900—14 гг. у маёнтку Берасценева Аршанскага павета (цяпер вёска ў Аршанскім раёне). Вырабляў воцатны парашок, драўняны і метылавы спірт, фармалін, воцатную кіслату, воцатна-кіслы натрый, драўняны вугаль, смалу, драўняны воцат, ацэтон. У 1900 г. працавала 160 рабочых, у 1902 — 82 рабочыя, у 1905—1908 гг. — 90 рабочых; выраблялася прадукцыі на 150—300 тыс. руб. у год. У 1910 г. працавала 100 рабочых, выраблена прадукцыі на 200 тыс. руб.

Берасценеўскі косцеабпальны і клеяварны завод. Дзейнічаў у 1865—1914 гг. у маёнтку Берасценева Аршанскага павета (цяпер вёска ў Аршанскім раёне). Вырабляў касцяную муку на ўгнаенне і на корм жывёле, штучныя угнаенні, сталярны клей, касцяны вугаль, касцявое сала, сернакіслы аміяк, мыла, гліцэрын. У 1890—98 гг. дзейнічалі 2 паравыя машыны (12—28 к.с.) і 2 паравыя катлы, у 1908 г. паравыя рухавікі (60 к.с.). У 1895 г. працавалі 24 рабочыя, выраблена прадукцыі на 28,5 тыс. руб. У 1905 г. працавала 50 чал., на паліва затрачана 2700 руб. На выстаўцы ў Магілёве (1896) прадукцыя завода ўдастоена Вялікага сярэбранага медаля.

Выдрыцкі завод сухой перагонкі драўніны. Дзейнічаў у 1900—16 гг. ва ўрочышчы Выдрыца Аршанскага павета. Належаў акцыянернаму таварыству «Шэрынг» і быў адным з буйных хімічных прадпрыемстваў Расійскай імперыі. Выпускаў драўняны і метылавы спірт, воцат, фармалін, воцатную кіслату, воцатна-кіслы натрый, драўняны вугаль, смалу, ацэтон і інш. У 1908 г. выраблена воцатнага парашку на 196 тыс. руб. У 1910 г. працавала 150 рабочых. У 1913 г. дзейнічала 9 паравых рухавікоў (100 к.с.), працавала 150 рабочых і 300 часовых рабочых, выраблена прадукцыі на 500 тыс. руб. Асноўны капітал завода ў 1913 г. склаў 600 тыс. руб. У студзені—кастрычніку 1916 г. завод паставіў ваеннаму ведамству 9379 пудоў рознай прадукцыі на 1031 тыс. руб. і заключыў кантракт на пастаўку 11 тыс. пудоў прадукцыі.

Высокаўская папяровая фабрыка. Дзейнічала ў 1828—85 гг. у в. Высокае Аршанскага павета (цяпер вёска ў Аршанскім раёне), у 1828—78 гг. працавалі вадзяныя рухавікі, было 5 чанаў, у 1879 г. — паравая машына (30 к.с.), 2 паравыя катлы (90 к.с.), вадзяныя рухавікі і 12 ролаў, у 1885 г. — 2 паравыя машыны (48 к.с.), вадзяное кола (10 к.с.), папераробная машына, 7 ролаў. У 1869—70 гг. фабрыка выпускала штогод да 15 тыс. пудоў пісчай і абгортачнай паперы, у 1870 г. — 10 тыс. пудоў пісчай і 8 пудоў абгортачнай паперы. У 1847 г. працавала 270 рабочых, у т.л. майстар і 4 наёмныя рабочыя, астатнія (145 мужчын і 120 жанчын) — прыгонныя. Рабочы дзень складаў 12 гадзін, заработная плата мужчыны — 40—50 кап., жанчыны — 20—25 кап. у дзень. У 1850 г. працавала 265 рабочых, у т.л. 5 вольнанаёмных майстроў. Да 1882 г. сярод рабочых пераважалі прыгонныя. Абаротны капітал складаў 40—50 тыс. руб. Сыравіну: рыззё, марганец, клей, купарвасны алей, галын — атрымлівалі з Масквы, Калугі, Віцебска, Магілёва. У 1850 г. расход на сыравіну склаў каля 13,6 тыс. руб. Прадукцыю рэалізавалі ў Магілёўскай губерні, Дзвінску, Смаленску, Мінску, Рызе.

Копыская кафляна-ганчарная мануфактура. Дзейнічала ў 1880—1913 гг. у г. Копысь Горацкага павета (цяпер гарадскі пасёлак у Аршанскім раёне). Уладальнік — купец Альпяровіч. Выпускаў кафлю, тэракотавыя і ганчарныя паліваныя вырабы. У 1908 г. працавала 34 чал., выпушчана прадукцыі на 25 тыс. руб.; у 1898 г. працавала 50 чалавек.

Копыская кафляна-ганчарная мануфактура. Дзейнічала ў 1897—1913 гг. у г. Копысь Горацкага павета (цяпер гарадскі пасёлак у Аршанскім раёне). Уладальнік — купец Шалыта. Выпускала кафлю, тэракоты, пазалочанае аздабленне для печаў, паліву для кафляных і ганчарных заводаў. У 1898—1905 гг. на прадпрыемстве працавала па 50 рабочых, у 1913—45 гг. выраблена прадукцыі на 20 тыс. руб.

Копыская кафляна-ганчарная фабрыка. Дзейнічала у 1889—1913 гг. у г. Копысь Горацкага павета (цяпер гарадскі пасёлак у Аршанскім раёне). Уладальнікі — купцы Альпяровіч і Шапіра. У 1895 г. ўстаноўлены 2 конныя рухавікі, у 1913 г. — 2 нафтавыя рухавікі (40 к.с.). У 1890 г. працавала 86 чал., выпушчана маёлікавых вырабаў на 1,2 тыс. руб., тэракотавых на 15 тыс. руб., кафлі на 41 тыс. руб., палівы на 10 тыс. руб.; усяго на 76,2 тыс. руб. У 1895 г. фабрыка працавала 290

дзён, затраты на паліва склалі 2,8 тыс. руб. У 1913 г. на вытворчыя мэты скарыстана 1,8 тыс. пудоў нафты. У 1896 г. на выстаўцы ў Магілёве фабрыка дэманстравала печы з матавай гладкай кафлі з размалёўкай і металічнымі ўстаўкамі, вазоны для кветак з рэльефным аздабленнем, сподкі з малюнкамі. Экспанаты адзначаны малым сярэбраным медалём міністэрства фінансаў.

Копыская кафляная мануфактура. Дзейнічала ў 1889—1914 гг. у г. Копысь Горацкага павета (цяпер гарадскі пасёлак у Аршанскім раёне). Вырабляла паліваную і тэракотавую кафлю. У 1900 г. працавала 25 чал., выпушчана 15 тыс. штук кафлі на 12 тыс. руб.; 600 пудоў тэракотавых вырабаў на 300 руб. У 1913 г. працавала 60 чал., выпушчана прадукцыі на 40 тыс. руб. У 1900 г. на вытворчасць затрачана 24 тыс. пудоў гліны, 1 тыс. пудоў глазуры, 1,6 пудоў мергелю.

Копыская кафляная мануфактура. Дзейнічала з 1898 г. ў г. Копысь Горацкага павета (цяпер гарадскі пасёлак у Аршанскім раёне). Уладальнікі — купцы Касой, Кроль, Эскін. На прадпрыемстве працавала 90 чал.

Копыскі кафляна-глазурны завод. Адзін са старэйшых і найбуйнейшых заводаў Беларусі таго часу. Дзейнічаў з 1860 г. ў г. Копысь Горацкага павета (цяпер гарадскі пасёлак у Аршанскім раёне). Уладальнік — купец Песяльнік. Выпускаў пячную паліваную, ганчарную і тэракотавую кафлю, якая прадавалася ад 5 руб. (1900) да 1 руб. 45 кап. (1910) за пуд. На заводзе ў розныя гады працавала ад 9 да 131 чал. У 1896 г. на выстаўцы ў Магілёве адзначаны бронзавым медалём за высокую якасць прадукцыі.

Копыскі кафляны завод. Дзейнічаў з 1874 г. ў г. Копысь Горацкага павета (цяпер гарадскі пасёлак у Аршанскім раёне). Уладальнік — купец Гурэвіч. Выпускаў кафлю і тэракотавыя вырабы. У 1895 г. ўстаноўлены конны рухавік, у 1913 г. — газавы рухавік (10 к.с.). Працавала ад 6 да 120 чал. У 1913 г. завод — адзін з буйнейшых у Расіі, меў склады прадукцыі ў Кіеве, Адэсе, Рызе. У якасці сыравіны выкарыстоўваліся рачны пясок, соль, гліна, мергель, волава, фарфоравы і шкляны бой.

Ляснічаўская фабрыка запалкавай саломкі «Мінерва». Дзейнічала ў 1904—1914 гг. у маёнтку Ляснічыя Аршанскага павета (цяпер вёска ў Аршанскім раёне). Вырабляла запалкавую саломку. У 1908—13 гг. мела паравую машыну (30 к.с.). У 1908 г. працавала 65, у 1913 — 60 рабочых, выраблена прадукцыі на 45 тыс. руб.

Смалянская спіртаачышчальная фабрыка. Дзейнічала ў 1895—1914 гг. у мястэчку Смаляны Аршанскага павета (цяпер пасёлак у Аршанскім раёне). У 1895 г. мела паравую машыну (20 к.с.), 1 паравы кацёл, у 1908—1913 гг. — паравую машыну (25 к.с.). У 1895 г. на паліва затрачана 1,5 тыс. руб., зрасходавана 31 тыс. пудоў жыта, 46 тыс. пудоў ячменю, 11 293 тыс. пудоў бульбы. У 1913 г. было 55 рабочых.

Смалянская цагельная мануфактура. Дзейнічала ў 1876—96 гг. у фальварку Смаляны Аршанскага павета (цяпер пасёлак у Аршанскім раёне). У 1881 г. выраблена 180 тыс. штук цэглы на 1260 руб.; працавала 12, 1896 — 50 рабочых. На выстаўцы ў Магілёве (1896) прадукцыя адзначана сярэбраным медалём.

Смалянская электрастанцыя. Дзейнічала ў 1905 г. ў мястэчку Смаляны Аршанскага павета (цяпер пасёлак у Аршанскім раёне).

Смётанская кафляная мануфактура. Дзейнічала ў 1864—1914 гг. у в. Смётанка Горацкага павета (цяпер вёска ў Аршанскім раёне). У 1879—90 гг. выпускала кафлю, у 1908—13 — паліваную кафлю, ганчарныя і тэракотавыя вырабы, паліву. У 1900 г. працавала 49, у 1910 — 72, у 1913 — 50 рабочых; выраблена прадукцыі адпаведна на 23 тыс. руб., 20,5 тыс. руб. і 25 тыс. руб.

Якаўлевіцкая суконная фабрыка. Дзейнічала ў 1914—15 гг. у вёсцы Якаўлевічы Горацкага павета (цяпер пасёлак у Аршанскім раёне). Вырабляла армейскае сукно і шарсцяныя коўдры. У сувязі з 1-й сусветнай вайной у 1915 г. заказы выраслі на 25—40% у параўнанні з 1914 г. Працавала да 50 рабочых. Фабрыка дзейнічала і ў 1925—28 гг.

Друкуецца па кн.: Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Беларусі / Аўт.-склад. М.Ф.Балбас. Мн., 1988.

Як «завязвалі» аршанскі вузел

Калі б у летапіс гэтага старажытнага горада ўвесці спецыяльны раздзел «Орша чыгуначная», то ў самым яго пачатку давялося б прывесці прозвішчы трох інжынераў шляхоў зносін: двух падпалкоўнікаў — Марчанкі і Шпілёва і генерал-маёра Ліпіна.

Звесткі пра дарэвалюцыйныя цэнзавыя прадпрыемствы Оршы, на якіх працавала менш за 50 рабочых

Назва прадпрыемства, яго месцазнаходжанне	Гады дзейнасці	Наяўнасць рухавіка			Вытворчая дзейнасць			
		тып	магутнасць (конскіх сіл)	год	колькасць рабочых	рэалізацыя прадукцыі		
						колькасць	сума, тыс. руб.	год
АРШАНСКАЕ ВАПНАВАЕ, г. Орша	1800—1802	—	—	—	30	7 тыс. пудоў	—	1802
АРШАНСКАЕ ВАПНАВАЕ, г. Орша. Уладальнік — патомны ганаровы грамадзянін Пузрын	1881	—	—	—	30	270 тыс. пудоў	5	1881
АРШАНСКАЕ МЕХАНІЧНАЕ, г. Орша (цяпер станкабудаўнічы завод)	1898—1998	паравы	12	1900	24	—	15	1913
АРШАНСКАЕ МУКАМОЛЬНАЕ, г. Орша	1900—1913	вадзяны	5	—	—	—	—	—
АРШАНСКАЕ ПІВАВАРНАЕ, г. Орша	1882—1913	газавы	9	1908	12	79 тыс. вёдраў	—	1910
АРШАНСКАЕ СПІРТАВОЕ, г. Орша	1897—1908	газавы	7	1908	—	114 тыс. вёдраў	—	1905
АРШАНСКАЕ ТЫТУНЁВАЕ, г. Орша	1882—1885	—	—	—	80	5,6 тыс. пудоў	10	1884
АРШАНСКАЕ ЦАГЕЛЬНАЕ, г. Орша. Уладальнік — Зархі	1899—1913	паравы	16	1908	35	—	12	1913
АРШАНСКАЯ ДРУКАРНЯ, г. Орша. Уладальнік — Падземскі	1898—1913	—	—	—	—	—	—	—
АРШАНСКАЯ ДРУКАРНЯ, г. Орша. Уладальнік — Іёсялевіч	1898—1913	2	—	—	11	—	6	1913

Марчанка ўжо ў 1856 г., усяго праз 5 гадоў пасля заканчэння будаўніцтва 1-й у Расіі чыгуначнай магістралі Пецярбург—Масква, прапанаваў у ліку першапачатковых чыгунак правесці лінію Дынабург—Курская губерня праз Лепель, Оршу, Клімавічы. Але праз 10 гадоў «хлебавозная» дарога прайшла праз Полацк, Віцебск, Смаленск на Арол, не завітаўшы ў Оршу.

Шпілёў у 1868 г., нягледзячы на сур'ёзныя перашкоды (жорсткае абмежаванне ў сродках, націск высокапастаўленых чыноўнікаў), давёў уладам неабходнасць змены напрамку лініі Смаленск—Брэст з тым, каб весці яе не праз Магілёў, Бялынічы, Ігумен, Мінск, а праз Оршу, Барысаў, Мінск.

Дырэктар Дэпартамента чыгунак Расійскай імперыі Ліпін падтрымаў Шпілёва — напрамак лініі быў зменены, а на падставе шпілёўскіх вышуканняў былі распрацаваны тэхнічныя ўмовы і канцэсія на Смаленска-Брэсцкую чыгунку пад непасрэдным кіраўніцтвам самога Ліпіна.

Праектам чыгункі прадугледжвалася пабудова станцыі 2-га класа з асноўным дэпо на 12 паравозаў (такога ж класа станцыя будавалася ў губернскім Мінску). Пляцоўка для размяшчэння станцыённай гаспадаркі была выбрана на адлегласці 3 вёрст ад Оршы, а для злучэння станцыі з горадам прадугледжвалася пабудова шашы. Аднак, па просьбе гарадскога галавы, спраўніка і некаторых знатных жыхароў горада замест пракладкі шашы будаўнікі забрукавалі некалькі вуліц, на якіх жыла аршанская «эліта». Але камісія Міністэрства шляхоў зносін пад старшын-

ствам стацкага саветніка Фадзеева ў складзе інжынераў — калежскіх асэсараў Межанінава і Зіміна 25—30 кастрычніка 1871 г. вырашыла: «...устройство мостовой в Орше не может заменить требуемое Министерством шоссе, полагает обязать строителей выполнить требование Министерства в возможно короткий срок и для устройства шоссе удержать с них 6 тысяч рублей» (па тым часе вялікія грошы).

Указаны камісіяй Фадзеева недахоп быў не адзіным. Праз некаторы час урадавы інспектар на Маскоўска-Брэсцкай чыгунцы, сапраўдны стацкі саветнік Кіпрыянаў адзначаў, што ўвесь баластны слой складаецца пераважна з дробнага пяску, укладзеныя шпалы — большай часткай яловыя, а рэйкі — нізкай якасці, значная колькасць станцый (у тым ліку і Орша) размешчана няўдала. Водазабеспячэнне зроблена вельмі няякасна, зімой амаль заўсёды няма вады і тэндары запраўляюцца снегам. «Подобная система эксплуатации дороги ставит Правительство в необходимость истрачивать излишние и в общей сложности очень значительные суммы на доплату гарантии и субсидии, в то же время систематически истощает средства дороги и приводит в будущем к необходимости слишком несоответственных затрат на её восстановление, как одной из главнейших стратегических железных дорог в России». Урадавы інспектар даволі ясна паказаў механізм нажывы чыгуначных таварыстваў: будаваць, ужываючы нізкаякасныя матэрыялы, а па справаздачы паказваць іх больш якаснымі. Імкнуцца як мага хутчэй адкрыць рух цягнікоў, каб потым ліквідаваць недаробкі пад выглядам эксплуатацыйных выдаткаў і на гэтай падставе атрымліваць ад урада даплату да прадугледжанай дагаворам канцэсіі гарантыі, тым больш, што ўрад зацікаўлены падтрымліваць стратэгічную чыгунку ў добрым стане.

Нягледзячы на махлярства і пралікі будаўнікоў, рэйкі даволі хутка клаліся на палатно новай чыгункі. І вось 16 (28) лістапада 1871 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё лініі Смаленск—Брэст; адначасова пачаўся 1-ы перыяд існавання станцыі 2-га класа Орша. На яе пляцоўцы было ўложана, акрамя галоўнага (перагоннага) пуці, яшчэ з дзесятак пуцей (у тым ліку і дэпоўскіх, гэтак званых «тракцыйных»). Яны злучаліся паміж сабой 19 стрэлкамі і 2 паваротнымі кругамі. Бліжэйшай станцыяй у бок Смаленска была Асінаўка, а ў бок Барысава — Коханава. Такіх вядомых сёння станцый, як Хлусава, Хлюсціна, Бобр, Навасады, у той час яшчэ не было. Адзіным сродкам сувязі з'яўляўся электрамагнітны чорнапішучы тэлеграф, прычым Орша была злучана ім не толькі са станцыямі прылягаючых участкаў, але спецыяльным адгалінаваннем і з гарадской паштова-тэлеграфнай канторай.

У першы ж тыдзень пасля адкрыцця руху зімовая стыхія прынесла новай чыгунцы многа непрыемнасцей. Моцныя завеі занеслі снегам пуці і цягнікі, амаль на 5 сутак спыніўшы рух. Шмат намаганняў прыклалі чыгуначнікі, каб коньмі вывезці людзей з занесеных цягнікоў у бліжэйшыя населеныя пункты, а пошту — на адпаведныя паштамты.

У 1876 г. было вырашана дзеля забеспячэння хуткага падвозу войскаў да заходняй мяжы зрабіць лінію Смаленск—Брэст двухпутнай. На наступны год пачалася ўкладка другога пуці, чаму вельмі спрыялі прадбачлівыя патрабаванні «ліпінскіх» тэхнічных умоў, згодна з якімі масты і трубы ўзводзіліся з улікам пабудовы другога пуці. 1 лютага 1876 г. рух па другім пуці быў адкрыты паміж Смаленскам і Оршай, а таксама Славянамі (цяпер Слаўнае) і Мінскам. Восенню таго ж года закончыліся работы на ўчастку Славяны—Орша. Такім чынам, уся лінія ад Оршы да Брэста стала двухпутнай. Адначасова з будаўніцтвам другога пуці стараліся ліквідаваць другія недахопы чыгуначнай гаспадаркі. Напрыклад, станцыя Орша забяспечвалася вадой для правозаў з бліжэйшага балота, адкуль яе пампавалі па трубе даўжынёй 1042 сажні; у 1879 г. пабудавалі новую сістэму водазабеспячэння з ракі Адроўкі, праклаўшы водаправод даўжынёй амаль 1800 сажняў.

Трэба заўважыць, што паляпшэнне тэхнічнага абсталявання на Маскоўска-Брэсцкай чыгунцы праводзілася галоўным чынам не па прычыне рэзкага павелічэння аб'ёму перавозак, а па патрабаванні ваеннага ведамства. Напрыклад, каб выканаць яго дырэктыву аб павелічэнні прапускной здольнасці лініі Драгабуж—Орша—Мінск да 42 пар цягнікоў у суткі, у 1892 г. лінія была абсталявана двухачковай аднаправоднай блакіроўкай сістэмы Сіменса.

У 1900 г. пачалося будаўніцтва лініі Віцебск—Жлобін — важнага звяна магістралі

Пецярбург—Адэса. «Рэйкавая» Орша ўваходзіла ў 2-гі перыяд свайго існавання — яна станавілася важным чыгуначным вузлом. На мяжы 1902—03 гг. новая лінія была прынята ў эксплуатацыю і ўключана ў склад Рыга-Арлоўскай чыгункі.

У 1908 г. пачалося будаўніцтва лініі Орша—Унеча—Варажба, падчас якога ўзвялі мост цераз Дняпро.

У 1912 г., у сувязі са 100-годдзем вайны з Напалеонам, Маскоўска-Брэсцкую чыгунку перайменавалі ў Аляксандраўскую.

Падчас 1-й сусветнай вайны, у пачатку 1915 г. Вярхоўная Стаўка рускай арміі пераехала з Баранавіч у Магілёў, што значна павялічыла нагрузку на Аршанскі вузел. Тэрмінова былі пабудаваны дадатковыя пуці. Каля іх выраслі баракі для бежанцаў і палонных. Недалёк ад злучэння «царскай» веткі з пуцямі Аляксандраўскай чыгункі быў пабудаваны раз'езд «Мяшок» для адстою саставаў і абслугоўвання часовых воінскіх складаў. Быў пракладзены другі пуць на лініі Віцебск—Орша—Жлобін.

У чэрвені 1916 г. ў Оршы некалькі дзён працавала камісія Міністэрства шляхоў зносін пад старшынствам начальніка ўпраўлення Г.О.Паукера. У сувязі з пабудовай лініі Орша—Варажба Маскоўска-Кіеўска-Варонежскай чыгункі яна прызнала неабходным пасажырскую станцыю і вакзал зрабіць агульнымі для ўсіх трох дарог, а таварныя станцыі — для кожнай асобную.

Шмат падзей адбывалася і каля аршанскіх рэек: карнілаўшчына, віхурныя дні Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый, новае нямецкае наступленне ў лютым 1918 г., падрыў дняпроўскага маста. Захопнікі занялі Оршу-Таварную і спыніліся. Невялікія атрады савецкіх войск утрымлівалі Оршу-Пасажырскую, на якую прыходзілі цягнікі са Смаленска. Немцы наладзілі чыгуначны рух ад Оршы-Таварнай да Мінска. Толькі позняй восенню пачаўся адыход акупантаў.

А летам наступнага года — зноў бяда: польскія войскі занялі Мінск і Барысаў; Орша стала прыфрантавым вузлом. Адсюль ішлі бронецягнікі для артналётаў на польскія пазіцыі.

У 1919 г. быў зняты другі пуць на лініі Віцебск—Жлобін, рэйкі якога выкарысталі для адбудовы чыгунак Расіі, разбураных грамадзянскай вайной. І толькі пасля заключэння Рыжскага дагавора ў 1921 г. стварыліся ўмовы для адбудовы чыгуначнай гаспадаркі. У 1922 г. адбыліся і важныя адміністрацыйныя змены: Аляксандраўская і Маскоўска-Балтыйская чыгункі былі аб'яднаны ў адну — Маскоўска-Беларуска-Балтыйскую (МББ чыгунка). У 1929 г. ў яе склад увайшлі і Арлоўска-Віцебская чыгунка.

У 1923 г. быў здадзены ў эксплуатацыю апошні ўчастак лініі Унеча—Орша—Камунары. Гэта падзея стала пачаткам трэцяга перыяду гісторыі чыгуначнай Оршы.

Значнай падзеяй гэтага перыяду з'явілася будаўніцтва 132-кіламетровай чыгункі Орша—Лепель. 1 кастрычніка 1924 г. зводны чыгуначны полк пачаў падрыхтоўчыя работы: пабудову лініі сувязі, нарыхтоўку шпал, брусоў, паляў (свай) і вываз іх зімнікам у патрэбнае месца. Вясной на трасу прыбылі яшчэ 6 чыгуначных палкоў. Іх аб'ядналі ў корпус шляхоў зносін, які быў умацаваны сапёрнымі і аўтатранспартнымі часцямі. Асноўныя работы пачаліся ў маі 1925 г. Камандаванне дабівалася павышэння тэмпаў працы: хутка яны павялічыліся з 0,7 да 4,3 км у суткі. 1 кастрычніка 1925 г. на трасе пачаўся рух рабочых цягнікоў, а 7 лістапада ў Лепелі адбыўся шматлюдны мітынг, на які першым цягніком прыбыў камандуючы войскамі Заходняй ваеннай акругі Міхаіл Тухачэўскі. Пропуск першага цягніка галоўным чынам меў дэманстрацыйны характар, асабліва для замежжа: маўляў, глядзіце, як мы можам хутка будаваць! І толькі 10 сакавіка 1926 г. пачалася часовая эксплуатацыя лініі, а 15 кастрычніка — пастаянная.

Такім чынам, толькі праз 70 гадоў часткова ажыццявілася ідэя інжынера Марчанкі (бо Дынабург быў аддзелены ад Лепеля 2 межамі — беларуска-польскай і польска-латвійскай). Орша стала першым у Беларусі вузлом з 6 напрамкамі руху цягнікоў.

Сігізмунд Эрдман, Ірына Саўчук, Уладзімір Шоба.

Беларуская мінуўшчына. 1997. № 2.

Іх памятаюць...

Мелісіна Аляксей Пятровіч

Аляксей Пятровіч Мелісіна нарадзіўся ў 1759 г. ў сям'і артылерыйскага генерала. Ведаў некалькі замежных моў. Падпалкоўнік А.П.Мелісіна вызначыўся ў 1790 г. пры штурме Ізмаіла. У 1807 г. прымаў удзел у фарміраванні Лубенскага гусарскага палка, у складзе якога змагаўся з французамі. У Айчынную вайну 1812 г. камандаваў кавалерыйскай брыгадай у арміі А.П.Тармасава, удзельнічаў у вызваленчым паходзе ў Еўропу. У 1813 г. ў Лейпцыгскай бітве пад Дрэздэнам здзейсніў сапраўдны подзвіг самаахвяравання: кінуў шаблю ў ножны і, разабраўшы павады па-манежнаму, г.зн. у дзве рукі, узняў каня на дыбкі, і ў скачцы накіраваў яго прама на варожыя штыкі. У карэ непрыяцеля ўтварылася «прабоіна», у якую рушылі кавалерысты. А.П.Мелісіна атрымаў тры кулі ў грудзі і быў увесь сколаты штыкамі. Загінуў 15 жніўня 1813 г. Узнагароджаны ордэнам Св. Георгія 4-й ступені. Пахаваны ў брацкай магіле ў г. Дрэздэн.

Удава генерала, Аляксандра Міхайлаўна, з дапамогай расійскага дзяржаўнага і ваеннага дзеяча А.А.Аракчэева наведала месца пахавання мужа. Перавезці астанкі мужа было немагчыма. Знойдзены толькі асабістыя рэчы А.П.Мелісіна, у тым ліку крывёю заліты мундзір. У Магілёўскай губерні сям'і Мелісіна належала сяло Пугляі з наваколлем (у той час яно ўваходзіла ў склад Горацкага павета). Сюды і прывезла Аляксандра Міхайлаўна асабістыя рэчы мужа. Усё было складзена ў драўляную скрынку і пахавана ў Пугляеўскай царкве. Над месцам пахавання ўзведзены помнік, абнесены спецыяльна зробленай, з мастацкім густам, металічнай рашоткай. На сцяне храма ўмацавана апраўленая ў пазалочаную раму мармуровая дошка з памятным надпісам. Па жаданні Аляксандры Міхайлаўны была зроблена дзіўнай прыгажосці даразахавальніца з чырвонага дрэва, якая ўяўляла сабой купалападобную кампазіцыю па ўзору алтара Іосіфаўскага сабора ў Магілёве. Падтрымлівалася шасцю калонамі, умацаванымі ў п'едэстал, які складаўся з трох ступеняў. Уверсе, паміж калонамі, 12 абразкоў у залатой і сярэбранай аправе, георгіеўскі крыж, ордэнская зорка, 2 заручальныя пярсцёнкі і залаты нацельны крыж. У дах даразахавальніцы ўмацаваны 6 абразкоў, уверсе сярэбраны шар з выявай георгіеўскага крыжа. На п'едэстале паміж калонамі ў сярэбраных ячэйках 2 заручальныя свечкі. Купалападобная сень і асобныя дэталі помніка былі як бы паўтарэннем асобных элементаў старажытнагрэчаскай архітэктуры. Гэта не выпадкова, бо з таго часу, як загінуў Аляксей Пятровіч, скончыўся род Мелісінаў, які паходзіў ад грэчаскага імператара Канстанціна V. Патомкі імператара перасяліліся ў Расію пры Пятры I. Вядома, што дзед героя Айчыннай вайны 1812 г. Іван Афанасьевіч быў медыкам Пятра I, потым узначальваў камер-калегію. У пачатку 20 ст. драўляная царква ў в. Пугляі была разбурана. *В.П.Лютынскі.*

Арля-Ашмянец Фердынанд Францавіч

Педагог, пісьменнік. Нарадзіўся ў 1775 г. ў Беларусі. Пасля сканчэння Галоўнай Полацкай школы быў настаўнікам у Дынабургскім, потым у Віцебскім і Аршанскім павятовых вучылішчах. У 1800—08 гг. настаўнічаў у Полацкім,Рагачоўскім і Камянецкім вучылішчах. У 1808 г. пераехаў у Курскую гімназію, потым у г. Арол, дзе выкладаў статыстыку, гісторыю, геаграфію, старажытнасці, міфалогію і лацінскую мову. Там ён распачаў два перыядычныя выданні: «Друг россиян и их единомышленников...» (выйшла ў канцы 1816 г.) і «Отечественный памятник, посвящённый дружелюбному соединению российских и польских народов» (кн. 1—3, 1817—18), якія друкаваліся ў Маскве. Абодва выданні мелі на мэце «замацаваць у вечным саюзе непарушнай дружнасці розумы і сэрцы славяна-расійскіх і польскіх народаў праз асвету і дабрачыннасць». З Арла пісьменнік пераехаў у Магілёў, дзе пэўны час быў выкладчыкам гімназіі, а ў 1818 г. пераведзены ў Маладзечанскае вучылішча настаўнікам гісторыі права і лацінскай мовы.

Мусніцкі Нікодым

Паэт, драматург, гісторык, педагог. Нарадзіўся 16 лютага 1765 г. ў Літве, жыў у Беларусі. Вучыўся ў Полацку і Оршы. Выкладаў рыторыку, французскую мову і філасофію ў Мсціславе і Віцебску. З 1800 г. выкладчык

тэалогіі ў Полацкай езуіцкай калегіі. Для полацкага школьнага тэатра пісаў камедыі («Дзівак», 1800; «Падазронасць», 1802) і трагедыі («Смерць Цыцэрона», «Флавій» і інш.). У Полацку выйшлі яго зборнікі «Тэатральныя забаўкі» (т. 1—2, 1803) і «Драбнейшыя паэтычныя забаўкі» (1804), у якіх выразна выявіліся стылявыя рысы класіцызму. Аўтар гісторыі езуітаў у Беларусі (рукапіс), падручнікаў. Эпічная паэма Мусніцкага «Палтава» (Полацк, 1803), у якой праслаўляецца перамога рускіх войск над шведамі, выклікала ў 1817—18 гг. вострую ідэйную палеміку паміж прыхільнікамі асветніцтва і езуітамі. Выступаў за пашырэнне асветы, збліжэнне Беларусі з Расіяй.

Памёр 16 лютага 1805 г. *А.В.Мальдзіс.*

Падалінскі Міхаіл

Гравёр, педагог. Нарадзіўся ў 1783 г. на Аршаншчыне. Творчасць звязана з мастацкім жыццём Беларусі і Літвы. Скончыў Віленскі універсітэт. З 1822 г. выкладаў малюнак у гімназіі, потым у Віленскім універсітэце, з пачатку 1880 г. ў Мінскай гімназіі. Захаваліся афорты, партрэты прафесараў Віленскага універсітэта В.Герберскага, І.Франка, В.Пелікана, канцлера Вялікага княства Літоўскага Л.Сапегі (паводле жывапіснага арыгінала 17 ст.).

Трухачоў Міхаіл Мітрафанавіч

Міхаіл Мітрафанавіч Трухачоў нарадзіўся ў 1784 г. ў Кіеўскай губерні. З дваран. Ва ўзросце 5 гадоў залічаны падпрапаршчыкам у Кіеўскі батальён. У 15-гадовым узросце прымаў удзел у швейцарскім паходзе Суворава 1799 г. Удзельнічаў у руска-пруска-французскай вайне 1806—07 гг., руска-турэцкай вайне 1806—12 гг., Айчыннай вайне 1812 г., замежных паходах 1813—14 гг. У 1814 г. М.М.Трухачоў — маёр Уладзіміраўскага уланскага палка, у 1826 г. — палкоўнік. Служыў у 1-м Марскім палку. Прымаў удзел у падаўленні паўстання 1830—31 гг. У 1833 г. ваенна-павятовы начальнік 3-й акругі Магілёўскай губерні. Апошнія гады жыцця правёў на Аршаншчыне, дзе набыў сабе маёнтак. М.М.Трухачоў — кавалер расійскіх ордэнаў Св. Ганны 2-й ступені, Св. Уладзіміра 4-й ступені, Св. Велікамучаніка і Пераможцы Георгія 4-й ступені з бантам. Памёр 18 кастрычніка 1850 г. Пахаваны на могілках каля в. Стахоўка. У пачатку 1990-х гадоў магіла рускага генерала адноўлена і ўзята пад ахову дзяржавы як помнік гісторыі.

В.П.Лютынскі.

Насовіч Іван Іванавіч

Мовазнавец-лексікограф, фальклярыст, этнограф. Нарадзіўся 26 верасня 1788 г. ў в. Гразівец Быхаўскага павета Магілёўскай губерні (цяпер Чавускі раён) у сям'і псаломшчыка. Адукацыю атрымаў у Магілёўскай гімназіі, потым у Магілёўскай духоўнай семінарыі. Там ён грунтоўна авалодаў старажытнаславянскай, лацінскай, грэчаскай і французскай мовамі, вывучаў польскую і старажытнаяўрэйскую мовы, што пры дасканалым веданні беларускай і рускай моў адкрыла яму шырокія перспектывы ў галіне даследавання мовазнаўства. З 1812 г. Насовіч працаваў выкладчыкам рускай мовы і славеснасці вышэйшага аддзялення Аршанскага духоўнага вучылішча, выкладчыкам, рэктарам Мсціслаўскага духоўнага вучылішча (1813—22), загадчыкам, наглядчыкам, выкладчыкам Дынабургскай гімназіі, Маладзечанскага, Свянцянскага дваранскіх вучылішчаў (1822—43). Пераезды па службе, а таксама падарожжа па Магілёўскай, Мінскай і Гродзенскай губерням далі яму магчымасць глыбока пазнаёміцца з народнай творчасцю, сабраць багаты лексічны, фразеалагічны і фальклорны матэрыял з розных рэгіёнаў Беларусі. У 1843 г. ён выйшаў у адстаўку, пераехаў у Мсціслаў і заняўся навуковай працай. У выніку цеснага супрацоўніцтва з Археаграфічнай камісіяй, Аддзяленнем этнаграфіі Рускага геаграфічнага таварыства, Аддзяленнем рускай мовы і славеснасці Пецярбургскай Акадэміі навук Насовіч распачаў падрыхтоўку першага гістарычнага слоўніка беларускай мовы пад назвай «Алфавітны паказальнік старажытных беларускіх слоў, выбраных з «Актаў, што адносяцца да гісторыі Заходняй Расіі», выдадзеных у 1853», які быў удастоены Ураваўскай прэміі (1865). У ім ён даў тлумачэнне і лексікаграфічную інтэрпрэтацыю 13 тысячам слоў (рукапіс зберагаецца ў бібліятэцы Расійскай АН у Санкт-Пецярбургу).

Значнае месца ў яго творчай спадчыне займаюць фальклорна-этнаграфічныя працы, у якіх аналізуецца і асэнсоўваецца жыццё і побыт народа, яго духоўны свет і мараль, звычаі і павер'і, практычная мудрасць і вусная паэтычная творчасць. Здабыткам беларускай

фальклярыстыкі сталі яго зборнікі «Беларускія прыказкі і прымаўкі» (1852), «Зборнік беларускіх прыказак» (1867, прысуджаны залаты медаль Рускага геаграфічнага таварыства, Насовіч абраны членам гэтага таварыства па аддзяленні этнаграфіі), «Беларускія прыказкі і загадкі» (1868), зборнік «Беларускія песні» (1873, больш за 350 тэкстаў песень, а таксама шэраг артыкулаў, прысвечаных песеннай культуры беларусаў). У свой час падрыхтаваў зборнік, у якім былі сабраны беларускія вусна-паэтычныя творы (байкі, легенды, павер'і, быліны, анекдоты і інш.), аднак рукапіс згубіўся і не быў выдадзены, і сёння лёс яго невядомы. Да гэтых зборнікаў ён пісаў прадмовы, дзе выказваў свае погляды на беларускую народную вусна-паэтычную творчасць народа, рабіў фанетыка-граматычныя і лексічныя каментарыі, даваў тлумачэнне паасобных выразаў і слоў.

Значную ўвагу надаваў Насовіч пытанням гісторыі, асабліва старажытнай гісторыі Беларусі. У гісторыка-лінгвістычным даследаванні «Аб плямёнах да часоў Рурыка, што засялялі беларускую тэрыторыю» ён даводзіў, што назвы плямён «дрыгавічы», «радзімічы» і «крывічы» паходзяць ад беларускіх слоў. Пераклаў таксама з лацінскай мовы 3-томную працу А.Тэйнера «Старажытныя помнікі, што асвятляюць гісторыю Польшчы і Літвы», у якой адлюстраваны ўзаемадачыненні Польшчы і Вялікага княства Літоўскага і праліта святло на гісторыю беларускіх зямель у перыяд з 1217 г. па 1696 г. Насовіч — аўтар грунтоўнай (каля 1000 старонак) гісторыка-мемуарнай працы «Успаміны з майго жыцця», дзе дадзена шырокая панарама тагачаснага грамадства, раскрыты духоўныя інтарэсы і маральнае аблічча беларускай інтэлігенцыі канца 18 — сярэдзіны 19 ст. Значнае месца ў гэтым творы адведзена педагагічным ідэям самога Насовіча, які больш як 30 гадоў працаваў на ніве асветы.

Асноўнае месца ў навуковай спадчыне Насовіча займае тлумачальна-перакладны «Слоўнік беларускай мовы», над якім ён самааддана працаваў 16 гадоў (скончыў у 1863 г., выдадзены ў 1870, факс. выд. 1983). Гэта навукова-лінгвістычны летапіс народа і часу, самы поўны на той час збор лексікі і фразеалогіі жывой беларускай мовы, які ахоплівае больш за 30 тысяч слоў. У гэтым арыгінальным і непаўторным творы засведчаны стан і ўзровень развіцця беларускай мовы сярэдзіны 19 ст., данесены нашчадкам лексічныя скарбы і фразеалагічнае багацце нацыянальнай мовы. Матэрыялы для слоўніка Насовіч чэрпаў з гаворак Магілёўшчыны, Міншчыны, Віцебшчыны, Гродзеншчыны, некаторых паветаў Прывіленскага краю — усяго моўнага ландшафту тагачаснай Беларусі. Аўтар свядома не ўключаў у рэестр словы, агульныя для беларускай і рускай моў. Для пацвярджэння ўжывальнасці слоў і дакладнасці тлумачэння іх семантыкі выкарыстоўваў самы аўтарытэтны ілюстрацыйны матэрыял — народныя песні, прыказкі, выслоўі, фразеалагізмы. Многія словы ўзяты са старабеларускіх пісьмовых помнікаў. У 1881 г. быў выдадзены «Дадатак да беларускага слоўніка І.І.Насовіча» (каля 1 тыс. новых слоў).

Вялікую каштоўнасць мае эпісталярная спадчына Насовіча — дзесяткі лістоў у Пецярбург вядомым рускім вучоным, акадэмікам І.Сразнеўскаму і А.Быкаву.

Памёр Насовіч 25 ліпеня 1877 г.

І.П.Хаўратовіч.

Дзеружынскі Францішак

У 1773 г. папа рымскі спыніў існаванне ордэна езуітаў. Таварыства Ісуса засталося толькі на тэрыторыі Расійскай імперыі ў Беларусі і ў Амерыцы. Амерыканскія езуіты адміністрацыйна далучыліся да беларускіх, абышоўшы папскую забарону, а іхняя юрысдыкцыя ў Злучаных Штатах стала вядомая як Беларуская правінцыя. Гэтак было да 1814 г., да адмены папскай забароны на дзейнасць ордэна.

У дзейнасці рымска-каталіцкай царквы ў Амерыцы пачэснае месца займае езуіт з Беларусі святар Францішак Дзеружынскі. Нарадзіўся ён у Оршы 3 студзеня 1779 г. Тут вучыўся ў езуіцкім калегіуме, у 1794 г. ўступіў у Таварыства Ісуса. Ф.Дзеружынскі быў высвячаны ў 1808/1809 акадэмічным годзе і прызначаны выкладчыкам тэалогіі ў Полацкай акадэміі. Выкладаў ён і ў некалькіх іншых школах на Беларусі.

Ёсць падставы меркаваць, што айцец Францішак не падпаў пад польскі культурны ўплыў, а заставаўся патрыётам Беларусі. У адрозненне ад большасці польскай інтэлігенцыі і рымска-каталіцкага духавенства, якое чакала прыходу Напалеона, каб адрадзіць колішнюю Рэч Паспалітую, ён здабывае коней і падводы ды ўцякае на поўнач, у Вялікія Лу-

кі. Вяртаецца ж толькі пасля адыходу напалеонаўскага войска.

На карысць «мясцовага патрыятызму» сведчыць і той факт, што сястра Дзеружынскага выйшла замуж за праваслаўнага. Змяшаныя шлюбы не ўспрымаліся як выключэнне ў беларускім асяроддзі (чаго не можна сказаць пра тагачасных палякаў).

Але не прыняў А.Францішак і расійскай улады. Таму і эміграваў у Паўночную Амерыку. 7 лістапада 1821 г. святар прыбыў у Філадэльфію. Да самай смерці аддаваў ён свой талент і вялікі інтэлект новай краіне. Яму давялося займаць шэраг царкоўна-адміністрацыйных пасад, у тым ліку ўзначальваць Амерыканскую езуіцкую супольнасць.

Але найбольшы клопат Ф.Дзеружынскі праяўляў у арганізацыі і развіцці рымска-каталіцкай адукацыі, школьнай сістэмы ў ЗША. Літаратура на гэту тэму складае не адзін том.

Памёр Францішак Дзеружынскі 22 верасня 1850 г. ў Мэрылендзе.

Гэтыя звесткі, а таксама інфармацыю пра беларускую дыяспару ў Амерыцы можна знайсці ў манаграфіі Вітаўта Кіпеля «Беларусы ў ЗША», якая выйшла ў выдавецтве «Беларусь» у 1993 г. *Дз.В.Дзядзенка.*

Шумахер Пётр Васілевіч

Сярод славутых пісьменнікаў і паэтаў, якія нарадзіліся на зямлі Прыдняпроўя, ёсць імя паэта Пятра Васілевіча Шумахера. Нарадзіўся ён 23 ліпеня 1817 г. ў Оршы.

Продкі Пятра Васілевіча па бацькоўскай лініі паходзілі з Германіі. Дакладна невядома, калі яны перасяліліся ў Расію, але дакументы сведчаць, што прадзед П.Шумахера меў пры цары Аляксеі Міхайлавічу ў Маскве аптэку. Бацька будучага паэта быў ад'ютантам у вядомага дзяржаўнага дзеяча графа Я.Ф.Канкрына ў час яго паходу з рускай арміяй у Парыж. На зваротным шляху малады афіцэр пазнаёміўся і ўзяў шлюб з Т.Хлабысовіч. Доўгі час маладая пара жыла ў Оршы.

Вучыцца хлопчык паступіў у аршанскі езуіцкі канвікт, які ў той час даваў грунтоўныя веды, аб чым пазней з задавальненнем успамінаў Шумахер. За 6 гадоў вучобы ён атрымаў трывалыя веды па матэматыцы, фізіцы, хіміі, гісторыі, геаграфіі, старажытных мовах, свабодна валодаў англійскай і нямецкай мовамі, потым вывучыў французскую і італьянскую. У такіх навучальных установах за розныя парушэнні дазваляліся цялесныя пакаранні. Ужо на схіле гадоў паэт, калі ўспамінаў гады вучобы ў аршанскім езуіцкім канвікце, пісаў:

Унылой старости морозы
Бездушным холодом мертвят
О юных днях живые грёзы,
И знойной молодости розы
С годами тратят аромат.
В сугробах снега мёрзнет сад,
И только голые берёзы
Напоминают мне те лозы,
Что вызывали вопль и слёзы
Лет шестьдесят тому назад.

Гады жыцця юнака ў Оршы — гэта час, калі малады і дапытлівы розум увабраў у сябе шматлікія малюнкі цяжкага, непрагляднага жыцця простага народа. Пазней гэта было выкарыстана ў яго шматлікіх вершах, накіраваных супраць існуючых парадкаў. Свежае паветра аршанскіх лясоў, сістэматычныя купанні ў Дняпры (ад вызвалення яго з-пад ільду і да восеньскіх халадоў) настолькі ўмацавалі здароўе Шумахера, што ў сталым узросце ён не адзін раз выходзіў пераможцам у крытычных для жыцця сітуацыях.

Неабходнасць працягу адукацыі Пятра і яго братоў прымусіла бацькоў пераехаць з Оршы ў Пецярбург. Пасля сканчэння камерцыйнага вучылішча Шумахер працаваў у ваенным міністэрстве, а потым у міністэрстве фінансаў пад пільным вокам свайго хроснага бацькі графа Канкрына. У гэты час у яго ўзнікла павышаная цікавасць да літаратуры. Першы яго верш быў надрукаваны ў 1842 г.

Імкненне з большай карысцю для Радзімы выкарыстаць свае веды і здольнасці не спалучалася з руцінай канторскай работай. З дапамогай Канкрына Шумахер атрымаў пасаду кіраўніка капальнямі золата ў Сібіры. У час пераездаў ад капальні да капальні адбыліся яго шматлікія сустрэчы з дзекабрыстамі. Некалькі разоў ён наўмысна прыязджаў у г. Ялутараўск, каб сустрэцца з І.І.Пушчыным, лепшым сябрам А.Пушкіна, а таксама з С.Балконскім і І.Д.Якушкіным — мужнымі змагарамі з царызмам.

У пачатку 1850-х гадоў ён вярнуўся ў Пецярбург. Акрамя літаратурных заняткаў прыйшло захапленне тэатрам. Пётр Васілевіч

прыняў самы актыўны ўдзел у жыцці і дзейнасці пецярбургскага артыстычнага таварыства і адначасова з вялікім поспехам выступіў на тэатральнай сцэне. Дзякуючы літаратурнаму і артыстычнаму таленту ён стаў вядомы ў асяроддзі творчай інтэлігенцыі паўночнай сталіцы.

У сярэдзіне 1850-х гадоў Шумахер наведаў Германію, Францыю, Італію і іншыя еўрапейскія краіны. Пасля вяртання з-за мяжы нядоўгі час жыў у доме сваёй жонкі ў Ніжнім Ноўгарадзе. Там у лютым 1858 г. адбылася яго сустрэча з прызнаным усёй літаратурнай грамадскасцю Расіі Т.Шаўчэнкам. У час сустрэчы Шумахер пазнаёміў вялікага кабзара з першымі чатырма нумарамі герцанаўскага «Колокола».

Тры абставіны: няўдалы шлюб, адсутнасць сродкаў існавання, цяга да вандраванняў — зноў прывялі Шумахера ў Сібір. Ён стаў паручэнцам генерал-губернатара М.Мураўёва-Амурскага і таму шмат ездзіў па Сібіры, цікавіўся гісторыяй краю і шматлікіх народаў, якія жылі ў тых мясцінах. Вынікам вандровак сталі глыбокія навуковыя даследаванні па гісторыі краю. Яны былі надрукаваны ў «Русском архиве».

Калі паэт вярнуўся з Сібіры, яго вершы набылі востра-крытычны характар. Шмат паэтычных радкоў было надрукавана ў часопісах Пецярбурга і Масквы, яшчэ больш забароненых да друку цэнзурай хадзіла ў рукапісах. Літаратурная творчасць Шумахера знаходзілася пад пільнай увагай не толькі вядомых пісьменнікаў і паэтаў — І.Тургенева, А.Майкова, Я.Палонскага, А.Фета, але і трэцяга аддзялення. У 1871 г. Шумахер паспрабаваў выдаць першую кнігу «Для всякого употребления», аднак яна была адразу арыштавана ў друкарні і паводле пастановы суда спалена як небяспечная для існуючага рэжыму.

На дапамогу паэту-патрыёту прыйшоў І.Тургенеў. На свае ўласныя грошы ў 1873 г. ён выдаў у Берліне першы зборнік вершаў Шумахера «Маім землякам», а ў 1880 г. там жа — другую кнігу вершаў паэта. Яшчэ годам раней у Расіі ўбачыла свет кніга выбраных твораў вядомага сатырыка «Шутки последних лет», творы для якой адбіраў не паэт, а цэнзура. Уладам была падстава палохацца. Шмат твораў літаратара — гэта суровы прыгавор расійскай тагачаснай рэчаіснасці. У вершы «Сям'я» ёсць, напрыклад, такія радкі:

В понятьях нравственных я вижу нищету,
Я вижу в обществе зачатки разложенья.
Все ищут грубого плотского наслажденья
И на духовную нет спроса красоту.
Порок, насилие, разврат в виду властей,
Кругом — мошенники, злодеи, паразиты,
И женщин ум, душа и сердце в прах разбиты,
И скоро перейдёт зараза на детей.

Паэт марыў аб іншым жыцці народа:

Когда казна в видах дохода,
Не станет спаивать народ,
И, отравляя жизнь народа,
Плодить и нищих и сирот.
Когда не станут патриотов
Гнать вон из службы помелом,
А высочайших идиотов
Дарить фельдмаршалским жезлом.
Когда мы все от сна воспрянем,
Любовью к Родине горя.

Літаратурная праца не прыносіла сродкаў для дастойнага існавання, нейкім чынам выратоўвала артыстычная дзейнасць. Шумахер быў выдатным чытальнікам, нядрэнным выканаўцам уласных рамансаў. Разам з іншымі літаратурнымі, артыстычнымі славутасцямі ён наладжваў папулярныя ў артыстычных колах Пецярбурга літаратурна-музычныя вечары.

Але жыццё ў шумнай сталіцы патрабавала вялікіх сродкаў і было цяжкім. У 1878 г. Шумахер перасяліўся ў больш спакойную Маскву. Дзякуючы дапамозе сяброў па літаратурнай справе і прыхільнікаў творчасці, сярод якіх былі губернатар Масквы В.Пярфільеў і асабліва граф С.Шарамецеў, дзесяць апошніх гадоў паэта прайшлі адносна бестурботна. Пётр Васілевіч шмат чытаў, вёў вялікую перапіску з мастацкімі дзеячамі Расіі. Не абыходзіла яго і паэтычная муза. З-пад пяра паэта выходзілі шматлікія вершы і эпіграмы, якія ахвотна друкавалі шматлікія літаратурныя часопісы.

Памёр Шумахер 11 мая 1891 г. Яго пахавалі ў адным з найпрыгажэйшых куткоў Кускоўскага парку загараднага дома графа Шарамецева. Літаратурныя і артыстычныя часопісы Расіі адгукнуліся на смерць паэта падрабязнымі некралогамі. Да дзесяцігоддзя

з дня смерці Шумахера граф Шарамецеў выдаў пасмяротны зборнік яго вершаў, але і на гэты раз цэнзура выкінула шмат твораў, якія, на яе погляд, маглі аказаць дрэнны ўплыў на грамадства, асабліва на студэнцкую моладзь.

Найбольш поўнае выданне твораў П.Шумахера ўбачыла свет ў 1937 г. пад назвай «Стихотворения и сатира». Акрамя 176 надрукаваных у кніжцы твораў даецца поўны пералік тых з іх, якія не ўвайшлі ў зборнік. Такую спадчыну пакінуў наш зямляк.

У 1990 г. ў серыі «Класікі і сучаснасць» маскоўскае выдавецтва «Савецкі пісьменнік» выдала кнігу «Руская эпіграма», дзе сярод твораў іншых паэтаў надрукаваны 6 вершаў-эпіграм П.Шумахера. *І.А.Яршоў.*

Хлудзінская-Баржэнцкая Цэліна

Нарадзілася 26 кастрычніка 1833 г. ў в. Антавіль Аршанскага павета. Адна з заснавальніц ордэна Сясцёр Уваскрашэння Хрыста. З дзяцінства імкнулася да служэння людзям і Богу, у дваццацігадовым узросце вырашыла стаць манашкай, але бацькі і спавядальнік указалі ёй на замужжа як волю Божую.

У 1874 г. пасля смерці мужа Цэліна здзейсніла намер сваёй маладосці і пайшла ў манастыр.

6 студзеня ў Рыме на свяце Трох Каралёў памочнік кардынала Ліцыда Марыо Парочы прыняў зарок заснавальніцы ордэна Сясцёр Уваскрашэння Хрыста.

Цэліна прадбачыла і ўгадала праблемы і напрамкі развіцця ордэна: устанавіла ў аб'яднанні адну катэгорыю сясцёр, адзін хор. Сёстры адпаведна сваім здольнасцям і захапленням выконвалі адпаведную працу і абавязкі незалежна ад паходжання.

10 мая 1905 г. дзейнасць ордэна Сясцёр Уваскрашэння Хрыста была ўслаўлена дэкрэтам з Рыма. Лозунгам ордэна Цэліна выбрала выслоўе: «Праз крыж і смерць да ўваскрашэння і славы».

Малітоўныя дамы былі створаны ў Польшчы, Італіі, ЗША, Канадзе, Вялікабрытаніі, Аўстраліі, Аргенціне і Бразіліі.

Памерла Хлудзінская-Баржэнцкая 26 кастрычніка 1913 г. ў г. Кракаў (Польшча).

В.Л.Стукалава.

Рэвалюцыйны рух на Аршаншчыне ў 1900—1917 гг.

У канцы 1898 г. ў Оршы ўзнік сацыял-дэмакратычны гурток рабочых рамесніцкіх майстэрняў. Ён меў бібліятэку з 80 кніг і брашур. Нелегальная літаратура прывозілася з Мінска і Гомеля.

Газета «Іскра» ў № 1 за 11 снежня 1900 г. паведамляла, што ў Оршы распаўсюджвалася пракламацыя «Да ўсіх рабочых і работніц Расіі», якая заклікала да пратэсту супраць ваенных судоў над рабочымі Варшавы. У сувязі з гэтым у Оршы было праведзена 20 вобыскаў і 14 арыштаў, а ноччу 6 верасня 1900 г. паліцыя арыштавала кіраўнікоў сацыял-дэмакратычнага гуртка, да следства было прыцягнута 22 чалавекі.

Актыўна ўдзельнічалі ў рэвалюцыйным руху рабочыя Копысі. У 1901 г. тут узнікла рабочая група, у якую ўваходзілі рабочыя кафельных заводаў Гарлачоў, Чарвякоў, Багданаў і інш. 200 рабочых Копысі і кафельнага завода ў в. Смётанка ў ліпені 1901 г. арганізавалі стачку. Яны былі незадаволены зніжэннем платы за прадукцыю. У 1903 г. копыскія сацыял-дэмакраты пісалі ў «Іскру» (№ 50) пра гэту стачку: «Гады тры назад на мясцовых кафельных заводах, круглы год займаючых каля 1200 рабочых, узнікла ўсеагульная забастоўка, якая мела зусім стыхійны характар. Некаторыя патрабаванні рабочых былі задаволены. З той пары з мястэчкам завязаліся адносіны, туды стала пранікаць літаратура, лісткі, а праз два гады, як першы вынік палітычнай прапаганды, у красавіку адбыліся дэманстрацыі».

Пад уплывам сацыял-дэмакратычнай прапаганды ў жніўні 1903 г. рабочыя Копысі правялі палітычную забастоўку пад заклікам «Далоў царскае самадзяржаўе! Далоў царскія суды!». 16, 23 і 31 жніўня 1903 г. рабочыя Копысі арганізавалі сходкі з удзелам сялян. Гэта прымусіла ўлады выклікаць сотню казакоў з Вільні. Яна прыбыла 13 верасня і была размеркавана ў Шклове, Копысі і Смётанцы. У ноч з 14 на 15 верасня ў Копысі, Алексан-

дрыі і Смётанцы было праведзена 15 вобыскаў.

Ідэі рэвалюцыйнай барацьбы сацыял-дэмакраты прапагандавалі сярод сялянства. Магілёўскі губернатар даносіў у дэпартамент паліцыі, што сялянскае насельніцтва вакол Копысі і Шклова — вёсак Зубава, Ляўкі, Нікіцічы, Ржаўцы і іншых — стала збірацца на сходкі ў лясах і абмяркоўваць сваё становішча, якое трэба палепшыць за кошт памешчыкаў. У жніўні 1903 г. па ініцыятыве сацыял-дэмакратаў адбыўся нелегальны сход рабочых і сялян — жыхароў вёсак Бабінічы, Антонаўка, Смётанка і Панізоўе, на якім прысутнічалі 300 рабочых і сялян. Прамоўцы заклікалі іх да сумеснай барацьбы супраць царскага рэжыму. Удзельнікі сходу атрымалі сацыял-дэмакратычную літаратуру, у якой расказвалася аб хваляваннях сялян у Харкаўскай і Палтаўскай губерніях у 1902 г.

У 1904 г. былі афармлены Аршанская і Копыская групы РСДРП, якія ўвайшлі ў склад Палескага камітэта РСДРП. Групы вялі рэвалюцыйную работу сярод рабочых і сялян Аршанскага павета. Гэта работа садзейнічала актыўнаму ўдзелу рабочых і сялян Аршаншчыны ў рэвалюцыі 1905—1907 гг.

У 1905—1907 гг. у Оршы і павеце існавалі таксама Аршанская арганізацыя эсэраў і аршанскі сацыял-дэмакратычны камітэт Бунда, якія праводзілі сваю дзейнасць у асноўным разам з арг-цыямі РСДРП.

Падзеі 9 студзеня 1905 г. ў Пецярбургу ўскалыхнулі ўсю Расію. З самага пачатку ў рэвалюцыйны рух уключыліся рабочыя і сяляне Аршаншчыны. Газета «Іскра» (№ 96) паведамляла, што ў лютым 1905 г. ў Копысі забаставалі рабочыя кафельных заводаў, да іх далучыліся рабочыя млыноў і канторскія служачыя. Гэта стачка адбылася 20 лютага, у ёй удзельнічала звыш 250 чалавек.

Пад кіраўніцтвам Копыскай групы РСДРП у красавіку 1905 г. забаставалі рабочыя ўсіх кафельных заводаў. Яны выставілі патрабаванні: 8-гадзінны рабочы дзень, павелічэнне заробку. 14 красавіка 1905 г. за горадам адбылася масоўка, у якой удзельнічала 400 рабочых.

18 красавіка 1905 г. сацыял-дэмакраты Оршы арганізавалі забастоўку. Паліцыя чакала дэманстрацыі, у горад былі ўведзены салдаты. На дэманстрацыю выйшлі ад 300 да 400 рабочых. Спяваючы рэвалюцыйныя песні, яны некалькі разоў прайшлі па вуліцах горада. Паліцыя арыштавала 20 чалавек, 10 з якіх яна вымушана была выпусціць з турмы 27 красавіка. У гэты дзень у Оршы зноў адбылася дэманстрацыя.

Летам 1905 г. рэвалюцыйны рух нарастае. Рабочыя Копысі 11 чэрвеня правялі масоўку з удзелам 600 чалавек. Паліцыя сутыкнулася з узброеным супраціўленнем. У ліпені 1905 г. рэзка ўзрастае колькасць выступленняў рабочых Оршы. 1 ліпеня адбылася дэманстрацыя моладзі горада (каля 100 чалавек) у гарадскім садзе. Паліцыя арыштавала двух яе ўдзельнікаў. 5 ліпеня прайшла аднадзённая палітычная забастоўка і мітынг. Аршанскія рабочыя ў гэтым жа месяцы правялі забастоўку ў знак памяці аб забітых таварышах у час паўстання ў Лодзі. Баставалі рабочыя млына Макржыцкага і дабіліся павелічэння заробку.

Газета «Пролетарий» 23 жніўня паведаміла: «На кафельных заводах Копысі каля 800 рабочых. За апошніх 6 тыдняў (другая палавіна чэрвеня і ліпеня) было каля 5 масовак, на кожнай — ад 500 да 800 рабочых».

11 ліпеня па закліку копыскай групы сацыял-дэмакратаў з 8 гадзін рабочыя Копысі выйшлі на вуліцы, каб ушанаваць памяць ахвяр 9 студзеня 1905 г. Яны прымусілі гандляроў закрыць лаўкі, спынілі паромны рух цераз Днепр і правялі некалькі гадзін на беразе ракі. Рабочыя спявалі рэвалюцыйныя песні, выкрыквалі «Далоў самадзяржаўе». Да рабочых далучыліся сяляне навакольных вёсак. У дэманстрацыі прынялі ўдзел да 1599 чалавек.

Улады Копысі выклікалі падмогу: 12 ліпеня ў Копысь прыбылі 2 роты салдат, жандарскі палкоўнік, магілёўскі паліцмэйсцер, віцэ-губернатар, якія пачалі дазнанне. Былі арыштаваны 12 найбольш актыўных рабочых, а рота салдат засталася ў Копысі.

На актыўны ўдзел копыскіх рабочых у рэвалюцыйных выступленнях уплывала дзейнасць мясцовай групы РСДРП, якая налічвала 120 членаў. За два тыдні ў ліпені 1905 г. група распаўсюдзіла пракламацыі «Цар і ліберальныя дэпутаты», «Да ўсіх рабочых гор. Мінска», брашуры «Павукі і мухі», «Сяляне, да вас наша слова».

У рэвалюцыйным руху прымалі таксама ўдзел рабочыя прадпрыемстваў, размешчаных у сельскай мясцовасці. У ліпені 1905 г.

забаставалі 200 рабочых Серкавіцкага завода Мерліса. Яны выставілі эканамічныя патрабаванні. 11 ліпеня забаставалі рабочыя цвікавага завода ў Барані — за павышэнне заробку і паляпшэнне быту. Перад гэтым у Барані з'явілася пракламацыя «Да ўсіх рабочых Аршанскага цвікавага завода» са штэмпелем «Аршанская арганізацыя Палескага камітэта РСДРП». У пракламацыі з 19 пунктаў былі сфармуляваны патрабаванні рабочых. У выніку стачкі адміністрацыя цвікавага завода пайшла на ўступкі рабочым.

У ліпені таго ж года пачалася забастоўка 200 рабочых ільнопрадзільнай фабрыкі Этрыха ў в. Высачаны. Эканамічныя іх патрабаванні адміністрацыя адхіліла, фабрыку закрылі. І толькі 19 жніўня яна была зноў адкрыта, калі Этрых прыбавіў на 10 працэнтаў заробак рабочым і скараціў рабочы дзень з 11 да 10 гадзін. Да восені 1905 г. рабочы рух дасягнуў апагею. На пасяджэнні Аршанскага камітэта РСДРП 10 кастрычніка была выбрана камісія, якой даручылі спыніць рух на чыгуначным вузле і напісаць зварот да рабочых. На другі дзень, 11 кастрычніка, пачалася стачка чыгуначнікаў. У 10 гадзін яны спынілі работу, адчапілі паравозы ад вагонаў двух паяздоў. Затым пачаўся мітынг, на якім выступіла агітатар А.Сычова («Таня»). Жандары арыштавалі яе і адправілі ў гарадскую турму. Але вакол турмы збіралася моладзь і вітала А.Сычову.

На новым мітынгу ў 7 гадзін вечара чыгуначнікі вырашылі не выходзіць на работу, пакуль будуць баставаць рабочыя Масквы і пакуль улады не выканаюць іх патрабаванні. Улады выклікалі на станцыю 4 роты Кадніка ўскага палка з Магілёва, прыбыў таксама магілёўскі віцэ-губернатар Лыдыжанскі.

12 кастрычніка ў знак салідарнасці з чыгуначнікамі забаставалі 200 рабочых Баранскага драцяна-цвікавага завода. 13 кастрычніка палітычная забастоўка стала ў Оршы ўсеагульнай. Бастуючыя спынілі дзейнасць паштовай канторы, былі закрыты навучальныя ўстановы. Абстаноўку ў Оршы ў гэтыя кастрычніцкія дні інспектар народных вучылішчаў ахарактарызаваў наступным чынам: «...вялізны натоўп дэманстрантаў з чырвонымі і чорнымі рамкамі і сцягамі, з рэвалюцыйнымі надпісамі на іх пад гукі «Марсельезы» і амаль бесперапынныя крыкі «Ура!» прайшоў па галоўнай вуліцы. Настрой ў горадзе вельмі трывожны. Магазіны закрыты. У двары казначэйства і большасці іншых месцаў — узброеныя войскі. Зараз зноў пачалася дэманстрацыя: чутны шум і крык, раздаюцца выстралы».

Пасля выхаду царскага маніфесту 17 кастрычніка ў Оршы адбылася палітычная дэманстрацыя. Дэманстранты прайшлі па вуліцах з рэвалюцыйнымі песнямі, заклікамі «Далоў самадзяржаўе! Далоў цара!». Рабочыя дабіліся вызвалення палітычных вязняў.

Ранкам 20 кастрычніка ў Оршу прыбылі з чырвонымі сцягамі рабочыя Баранскага цвікавага завода і ўключыліся ў агульную дэманстрацыю. Арганізавалі забастоўку і рабочыя Копысі. Пасля таго, як улады дапусцілі ў Оршы пагромы, рабочыя правялі 21 лістапада аднадзённую палітычную забастоўку. Копыская арганізацыя сацыял-дэмакратаў 27 лістапада склікала мітынг рабочых за горадам, у якім удзельнічала 1000 чалавек. Паліцэйскіх яны вымусілі схавацца.

У снежні пачалася ўсеагульная стачка ў Маскве, яе адразу падтрымалі чыгуначнікі Оршы. У сваёй тэлеграме рабочым і служачым дэпо Мінска і ўсіх службаў Маскоўска-Брэсцкай чыгункі яны заклікалі далучыцца да забастоўкі: «Таварышы! Просім салідарнасці. Масква, Вязьма і мы, Орша, бастуем па прапанове Маскоўскага вузла. Забастоўка выклікана невыкананнем маніфеста 17 кастрычніка».

8 снежня ў Оршы пачалася стачка рабочых, прыпыніўся рух цягнікоў, не працавалі прадпрыемствы. Кожны дзень адбываліся мітынгі, дзе гучалі заклікі рабочых да ўзброенага паўстання. З ліку баставаўшых служачых на станцыі Орша быў выбраны камітэт, які распараджаўся затрымкай цягнікоў. Улады былі вымушаны прасіць аб прысылцы войска. Пачаліся вобыскі і арышты. 22 снежня арыштавалі 13 чыгуначнікаў.

У Копысі ў снежні адбыўся рэвалюцыйны мітынг, на якім прысутнічала да 500 чалавек.

У 1906 г. пачаўся спад рэвалюцыйнага руху на Аршаншчыне. За ўдзел у ім рабочыя падвяргаліся рэпрэсіям. Былі арыштаваны дзесяткі найбольш актыўных удзельнікаў рабочага руху, членаў сацыял-дэмакратычных арганізацый, баявых груп. Толькі 12 ліпеня 1906 г. этапным парадкам у Архангельскую і

Валагодскую губерні былі адпраўлены 14 палітычных вязняў з Оршы. У Аршанскай і Копыскай арганізацыях РСДРП назіраліся рознагалоссі паміж бальшавікамі і меншавікамі, што адбівалася на арганізаванасці рэвалюцыйных выступленняў.

Але стачкі і мітынгі працягваліся і ў 1906—1907 гг. У 1906 г. рабочыя Оршы адзначылі гадавіну «крывавай нядзелі» — 9 студзеня. У горадзе прайшла аднадзённая палітычная стачка. У кастрычніку 1906 г. адбылася стачка рабочых шчацінных прадпрыемстваў Оршы, якія выставілі эканамічныя і палітычныя патрабаванні. Барацьба рабочых уплывала на моладзь: 13 сакавіка 1906 г. вучаніцы жаночай гімназіі адмовіліся ад заняткаў у знак пратэсту супраць смяротнага пакарання П.П.Шміта.

1 мая 1907 г. рабочыя Оршы правялі дэманстрацыю.

Састаўной часткай рэвалюцыйнага руху на Аршаншчыне была барацьба сялянства. Агітацыйную работу ў яго асяроддзі праводзілі сацыял-дэмакраты, якія мелі шырокія сувязі з сялянамі Горацкага, Аршанскага і Магілёўскага паветаў, праводзілі сходы сялян і запрашалі іх на рабочыя сходкі.

У красавіку 1905 г. рабочыя Копысі ўзначалілі выступленне сельскіх рабочых у маёнтках Смётанка, Ляўкі і дапамаглі выпрацаваць патрабаванні да памешчыкаў. Галоўнымі кіраўнікамі сялян і батракоў былі старшы рабочы маёнтка Смётанка В.Новікаў, рабочы кафельных заводаў Н.Пятрушын, селянін в. Ляўкі Е.Самойленка. Сяляне з ахвотай слухалі агітатараў, хавалі іх ад паліцыі. Сялянскі рух і забастоўкі сельскіх рабочых вакол Копысі летам 1905 г. мелі такі ўпарты характар, што ўлады тройчы прысылалі сюды войскі.

У перыяд вясенне-палявых работ у маёнтках Ляўкі, Смётанка, Бабінічы, Вусце Аршанскага павета пачаліся забастоўкі сельскагаспадарчых рабочых. Яны патрабавалі 10-гадзіннага рабочага дня, павелічэння заробку падзёншчыкам і пастаянным рабочым. У той жа час сяляне вёсак Ляўкі, Смётанка, Заполле, Аляксандрава пачалі пасвіць жывёлу на памешчыцкіх землях.

Летам 1905 г. сяляне перайшлі да больш актыўных дзеянняў — захоплівалі сенажаці, кідалі работу ў памешчыкаў. Баставалі сельскагаспадарчыя рабочыя. У асноўным яны выстаўлялі эканамічныя патрабаванні. Буйныя забастоўкі прайшлі ў маёнтках Вусце, Забалацце, Скрыншчына. Выступленнямі сельскіх рабочых часта кіравалі заводскія рабочыя. Напрыклад, у маёнтку Забалацце паліцыя затрымала двух агітатараў — рабочых з Оршы і Копысі.

Арганізавана правялі забастоўку 22 ліпеня 1905 г. батракі ў маёнтку Скрыншчына, які арандаваў кулак Казьмяк. Яны дабіліся павелічэння заробку. Часта сяляне здымалі з работы падзёншчыкаў у памешчыцкіх маёнтках, каб прымусіць памешчыкаў выканаць свае патрабаванні ці выжыць іх з вёскі. Так, сяляне трох вёсак — Тумінічы, Мезенава, Барайшава знялі ў маёнтку Мацнева батракоў, падзёншчыкаў, служачых, прыслугу і выставілі памешчыку Ганеўскаму патрабаванні: выплаціць запазычанасць за работу ў маёнтку, даць вёскам пашу, павялічыць заробак падзёншчыкам і рабочым. Памешчык вымушаны быў уступіць. Такое ж па характару выступленне адбылося ў в. Новае Сяло Машкоўскай воласці.

У Аршанскім павеце шырока распаўсюдзіліся захопы пашы і сенажацяў сялянамі. Сяляне в. Вязьмічы Аляхновіцкай воласці захапілі ў маёнтку Смаляны (памешчык Цітоў) участак, які быў засаджаны лесам, і аб'явілі яго сваёй пашай. Сяляне в. Зароўцы Старасельскай воласці адабралі пашу ў памешчыка, а ў в. Падкняжа той жа воласці адмовіліся ад адпрацоўкі за выпас жывёлы і карысталіся бясплатна пашай у маёнтку Багушэўка князя Любамірскага.

Па звестках дэпартамента паліцыі, у Аршанскім павеце ў 1905 г. ў раёне Копысь—Горкі—Орша за 8 месяцаў адбыліся 44 выступленні сялян, што склала 32 працэнты ад агульнай колькасці сялянскіх выступленняў у губерні. Прапагандысцкую работу сярод сялян вялі сацыял-дэмакраты.

Антыўрадавыя мітынгі, сходы, дэманстрацыі сялян адбыліся ў кастрычніку-лістападзе 1905 г. ў мястэчках Ляды, Рудня, Копысь, Любовічы.

У 1906 г. сялянскі рух пайшоў на спад. Тым не менш, пад кіраўніцтвам рабочых Баранскага цвікавага завода прайшлі забастоўкі падзёншчыкаў і батракоў у маёнтках Вусце,

Забалацце, Бабінічы, Чурылава. Бастуючыя дабіліся выканання сваіх патрабаванняў.

Зноў актывізаваўся рабочы і сялянскі рух у Оршы і Аршанскім павеце перад першай сусветнай вайною, а найбольш яскрава праявіў сябе ў час Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый. *Л.В.Яршова.*

Дакументы сведчаць

З ДАНЯСЕННЯ МАПЛЁЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ ПРА ЗАБАСТОЎКУ РАБОЧЫХ КАФЛЯНЫХ ЗАВОДАЎ г. КОПЫСЬ

10 августа 1901 г.

Горецкий уездный исправник рапортом, полученным мной 29 июня, донес, что на 9 изразцовых заводах заштатного гор. Копыси, на таком же заводе при дер. Сметанке, формовщики, изготовляющие изразцы с платой от сотни, устроили разновременно, начиная с 23 того же июля, стачку, заключающуюся в том, что все они поголовно отказались выносить из заводов в амбары выделанные изразцы, несмотря на то, что это составляет их обязанность по договорам, что собранными полицией на месте сведениями, между прочим, установлено, что стачкам этим предшествовали три сходки рабочих, которые они делали 17, 19 и 22 июля, что сходки эти устраивались ими за городом в оврагах тайно по ночам с большими предосторожностями; так, рабочие отправлялись на сходки и возвращались с них небольшими группами по разным улицам, чтобы не навлечь на себя подозрений, что кроме стачки рабочие никаких насилий и своеволий по отношению к заводчикам и их служащим пока не дозволяли и попрежнему продолжают заниматься работами на всех заводах и что по вызову местной полиции туда прибыл старший фабричный инспектор Могилевской губ. для выяснения причин, послуживших к стачке рабочих. В полученном мною 1 сего августа (сообщении), тот же исправник донес, что в стачке на Копыских изразцовых заводах участвует до 200 чел. рабочих, большинство коих местные жители гор. Копыси и окрестных селений, что с начала стачки (рабочие) отказались от выноски из заводов в амбары готовых изделий, а затем на некоторых заводах рабочие стали предъявлять требования о подноске им глины, которую они раньше сами подносили, а также о принятии от них изготовляемых изразцов без браковки и что поводом, послужившим к стачке рабочих, по словам последних, были следующие причины:

а) что в последние два года заводчики значительно сбавили плату за изделия, б) что цены они меняют часто, преимущественно перед зимой, когда рабочему трудно найти заработок в другом месте, в) что на некоторых заводах дают плохую глину, так что формировщики, прежде чем приступить к работе, вынуждены сами ее обрабатывать, г) что за выноску из заводов в амбары готовых изделий прежде им платили, а в последнее время требуют выноски бесплатно, д) что приготовляемые изделия вовремя от рабочих не принимаются, или принимаются, но не все, как бы следовало, а только часть, а остальные валяются на фабрике, портятся, и рабочий не получает за них деньги, е) что приемщики изделий сильно их бракуют, ж) что администрация заводов произвольно их штрафует, з) что если рабочий позволит себе протестовать против распоряжения заводчика, или на него жаловаться, то такого рабочего рассчитывают и на других заводах его не принимают, что по правилам внутреннего распорядка, утвержденным старшим фабричным инспектором на заводах Посельника, Гинзбурга и Гуревича, выноска готовых изделий из заводов в амбары не поставлена в обязанность формовщикам, а между тем от них требовалась. Насколько справедливо такое заявление рабочих — он, исправник, удостоверить не может, так как, в силу ст. 2 наказа чинам фабричной инспекции, заявления эти проверяются старшим фабричным инспектором. Кроме того, по слухам, циркулирующим среди заводчиков и рабочих, оказывается, что незадолго до сходок рабочих на одном из заводов будто находился некоторое время в качестве простого подёнщика какой-то студент и что на сходки приезжал кто-то, но насколько справедливы эти слухи, при всем старании проверить пока не удалось...

Об изложеннном мною имею честь довести до сведения Департамента, присовокупляя при этом, что о дальнейшем ходе настоящего дела мной будет сообщено дополнительно.

И. д. губернатора вице-губернатор (подпись).

Правитель канцелярии (подпись).

З ДАНЯСЕННЯ НАЧАЛЬНІКА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРСКАГА ПРАЎЛЕННЯ Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ ПРА РАБОЧЫ І СЯЛЯНСКІ РУХ У г. КОПЫСЬ І ЯГО НАВАКОЛЛІ

16 сентября 1903 г.

Секретно.

Вследствие предложения Департамента полиции от 9 сентября с. г. за № 8271 имею честь уведомить, что по наблюдениям последнего времени с половины июля с. г. стало заметным распространение вредных идей социал-демократического характера, коими заражены почти все рабочие, как евреи, так и русские на фабриках, заводах и мастерских заштатного гор. Копыси, с. Сметанки и мест. Шклова, (а также) крестьянское население прилегающих к означенным пунктам деревень, по преимуществу Любинической вобл., Горецкого у., а именно: Зуево, Левково, Никитичи, Ржавцы и др., где крестьяне стали, подобно рабочим на фабриках Копыских, Сметанской и Шкловской собираться в свободное время на сходки в лесах и обсуждать интересующие их вопросы об улучшении своего быта за счет соседних землевладельцев, будучи убеждены, что земля не должна принадлежать помещику, который ее лично сам не обрабатывает, а должна быть поделена между крестьянами, которые возделывают ее своим собственным трудом. Кроме того, на тех же сходках говорилось избранными лицами — грамотеями, что начальства никакого не нужно, крестьяне должны управлять сами собой и т.п.

По заявлению местных землевладельцев, как, напр., гг. Чачкова, Курча, генерала Рейна и др. такая перемена в настроении крестьянских умов особенно сказалась в конце истекшего лета и выразилась более рельефно в убийстве полицейского урядника Якушевича в ночь с 8 на 9 сентября с. г. в с. Сметанке через окно из ружья. В таковом преступлении подозреваются и, кажется, достаточно уличены двое крестьян-рабочих того же селения: Иван Сергеев, Шершнев и Самуил Семенов-Саловский с завода Песельника.

Одновременно с упомянутым убийством было покушение на жизнь сидевшего с покойным Якушевым за одним столом управляющего крахмальным заводом г-на Чачкова — Николая Калиновского, но последний, несмотря на выстрел, направленный в него через другое окно того же помещения, по счастливой случайности остался невредим.

Ввиду вышеупомянутого убийства, а равно и выдающихся сходок рабочих, совершившихся в гор. Копыси и его окрестности 16, 23 и 31 августа с.г. с участием крестьян, г-н губернатор решил перейти к более внушительным мерам, способным показать фактически населению местечек и более или менее отдалённых деревень Любинической вол., (и) других, что правительство, когда нужно, всегда располагает надлежащими средствами воздействия для восстановления и поддержания порядка. А потому г-н губернатор вызвал по телеграфу из гор. Вильно сотню казаков, которая и прибыла по железной дороге 13 сего сентября через гор. Оршу и была распределена на полусотне в мест. Шклове и заштатном гор. Копыси со Сметанкой.

Такая неожиданная мера, видимо, произвела на население, как еврейское, так и русское довольно сильное впечатление, усугубленное еще тем, что по распоряжению г-на губернатора 15 сего сентября в с. Сметанке, отстоящей в 8 в. от Копыси, были подвергнуты, при большом стечении крестьян из разных селений и евреев, телесному наказанию розгами лица, особо обратившие на себя внимание своей тайно-преступной деятельностью среди рабочих и крестьян. В ночь с 14 на 15 сего сентября были произведены 15 обысков в гор. Копыси и селениях — Александрии и Сметанке у еврейских и русских рабочих кафельных фабрик, причем у рабочего Ефима Петрашина были обнаружены нелегальные песни...

Полковник Поляков.

З АГЛЯДУ КІЕЎСКАГА АКРУГОВАГА ФАБРЫЧНАГА ІНСПЕКТАРА РАБОЧЫ РУХ У СТУДЗЕНІ—САКАВІКУ 1905 г. Ў МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ

март 1905 г.

В Могилевской губ. в первой забастовке, происшедшей 12 января, приняли участие ремесленники «из сочувствия к Петербургским рабочим». Затем забастовало цепное отделение гвоздильного завода в Орше, отличающегося особенно плохими условиями для рабочих. Забастовка продолжалась две недели и окончилась на почве взаимных уступок. Там же, в Орше, состоялась непродолжительная забастовка 350 чел. на ткацкой фабрике, также из сочувствия к Петербургу без достаточных местных оснований и прошла очень тихо и скоро. Затем 23—28 февраля забастовали 12 изразцовых заводов в Копыси с числом рабочих до 1200 чел. Забастовка вызвана особо тяжелыми местными условиями и низкой заработной платой, при

отсутствии каких-либо политических требований. Забастовка длилась месяц и закончилась 25 марта на почве взаимных уступок.

З ДАНЯСЕННЯ МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА МІНІСТРУ УНУТРАНЫХ СПРАЎ ПРА ВЫСТУПЛЕННІ СЯЛЯН Ў АРШАНСКІМ ПАВЕЦЕ

16 июня 1905 г.

...О новых, полученных мною сообщениях о самоуправных действиях крестьян докладываю следующее:

По заявлению владельца им. Татарск Оршанского у. дворянина Намрат-Курека, местные крестьяне в ночь с 13 на 14-е июня всей деревней пасли лошадей на его поле, прогоняют рабочих и требуют окончательного ухода их от него. Для выяснения дела мною потребованы от исправника обстоятельные сведения.

И. д. губернатора вице-губернатор (подпись).

Правитель канцелярии (подпись).

ДАНЯСЕННЕ ПАМОЧНІКА НАЧАЛЬНІКА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРСКАГА ПРАЎЛЕННЯ Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ ПРА ЗАБАСТОЎКУ РАБОЧЫХ У МАЁНТКУ БАБІНІЧЫ І ЗАБАСТОЎКУ РАБОЧЫХ У ОРШЫ

20 июня 1905 г.

Секретно.

16 сего июня в им. Бабиничах Пугляевской вол. Горецкого у. отставного генерал-майора Рейна забастовала большая часть рабочих, преимущественно молодых, требуя увеличения заработной платы; небольшая же часть рабочих хотя с утра и продолжала работать, но около полудня в им. Бабиничи явились фабричные рабочие из кафельного завода Сметанки в числе около 75 чел. и уговорили остальных рабочих имения забастовать, если не будет повышена плата. Означенные выше фабричные рабочие никакого насилия и беспорядка не производили; по уходе за имением пели песни, причем произвели около 10 выстрелов из револьвера в воздух. Требования рабочих об увеличении платы удовлетворены, причем цены назначены поденным рабочим:

мужчине 75 коп., а женщине 45 коп. в день.

Кто именно был из фабричных рабочих с. Сметанки, установить не представляется возможным, так как рабочие им. Бабиничи их скрывают.

Об изложенном имею честь донести Департаменту полиции.

Ротмистр (подпись).

5 июля 1905 г.

Секретно.

Сего числа рабочие гор. Орши устроили забастовку в память убитых товарищей в гор. Лодзи и Одессе. Все магазины и лавки в городе были с утра закрыты, и, несмотря на требования полиции открыть, таковые не открывались весь день. Ввиду возможности демонстрации полуэскадрон драгун задержан в городе на сие число. До вечера демонстрация не происходила.

Ротмистр (подпись).

З ДАНЯСЕННЯ МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА МІНІСТРУ УНУТРАНЫХ СПРАЎ ПРА РЭВАЛЮЦЫЙНЫ РУХ У ОРШЫ

6 июля 1905 г.

1-го и 5-го июля в гор. Орше произошло следующее: 1 июля в 8 час. вечера в городском саду собралась толпа демонстрирующей молодежи до 100 чел., причем в этой толпе было произведено несколько выстрелов.

Затем 5-го июля я получил от исправника телеграмму, что в этот день в гор. Орше забастовали рабочие всех категорий, все лавки закрыты и что к устранению ожидаемой демонстрации приняты меры.

И. д. губернатора вице-губернатор (подпись).

Правитель канцелярии (подпись).

З ДАНЯСЕННЯ НАЧАЛЬНІКА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ ПРА ПАЛІТЫЧНУЮ ДЭМАНСТРАЦЫЮ РАБОЧЫХ г. КОПЫСЬ

13 июля 1905 г.

11 июля (в гор. Копыси) в 4 часа утра были замечены и подобраны разбросанные ночью гектографированные прокламации от Копысской группы Полесского комитета Российской социал-демократической рабочей партии.

Содержанием таковых был призыв почтить прекращением работ на этот день память убитых товарищей во время беспорядков в Петербурге, Москве, Лодзи и других городах, а также к кровавому отомщению за них.

В 8 час. утра, в тот же день, на улицы стали выходить рабочие в праздничных одеждах и на торговой площади соединились в две группы по 300—400 человек каждая.

Воспрепятствовать этому со стороны полиции было невозможно. Вслед за этим, одна из упомянутых групп направилась к заводу Песельника на берег Днепра, и за нею вскоре последовала и вторая, выделив из своего состава человек 10—20, для прекращения движения парома на Днепре. В то же время другие рабочие ходили по городу и заставляли торговцев закрыть свои помещения. Затем рабочие, соединившись вместе на берегу Днепра, провели там несколько часов, причем произносились речи, пелись революционные песни, и стреляли из револьверов. Издали можно было разобрать крики «Ура!» и «Долой самодержавие!»

Около часу дня с берега Днепра рабочие двинулись в город и пошли по главной улице.

Вся эта масса с пением революционных песен дошла до торговой площади, откуда стала разбегаться. Оставшаяся группа в человек 200—300 прошла по той же улице далее до Пятницкой церкви и там разошлась по домам. Местная полиция не могла по своей малочисленности воспрепятствовать демонстрации и ограничилась наблюдательной деятельностью.

Управляющим губернией оставлена одна рота 314 пехотного полка в гор. Копыси, в предупреждение там демонстрации.

Полковник Поляков.

З ДАНЯСЕННЯ ПАМОЧНІКА НАЧАЛЬНІКА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРСКАГА УПРАЎЛЕННЯ Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ ПРА ЗАБАСТОЎКУ РАБОЧЫХ НА БАРАНСКІМ ЦВІКАВЫМ ЗАВОДЗЕ

5 июля 1905 г.

11 сего июля с 12 час. дня рабочие гвоздильного завода в им. Барань Оршанского у., прекратив работы, устроили общую забастовку, требуя от администрации завода улучшения их рабочего быта и надбавки заработной платы, причем накануне забастовки были разбросаны гектографированные прокламации под заглавием «Ко всем рабочим Оршанского гвоздильного завода», со штемпелем «Оршанская организация Полесского комитета РСДРП», с изложением в них разных требований рабочих, состоящих из 18 пунктов.

12 июля в присутствии пристава 1 стана Оршанского у. Модзолевского могилевский фабричный инспектор предложил директору завода требования рабочих по возможности удовлетворить, на что директор завода согласился... 13 июля работы на заводе возобновились.

Ротмистр (подпись).

ДЗЕЙНАСЦЬ КОПЫСКАЙ ГРУПЫ РСДРП

1 сентября 1905 г.

Копысь. Группа получила извещение об утверждении 8 июля. За две недели были распространены прокламации: «Царь и либеральные депутаты», «Ко всем рабочим гор. Минска»; брошюры: «Пауки и мухи», «Стачка лжи», «Крестьяне, к вам наше слово!» Было три собрания: одно общее христиан и евреев и два еврейских. На первом говорилось о необходимости объединения в одну партию, на втором — о вооружении, на третьем — о национальном вопросе. 1-го должна была состояться продажа за недоимки имущества местных крестьян; было организовано сопротивление; продажа состоялась. Престиж группы поднялся.

Копыская группа.

ПРАВЯДЗЕННЕ КОПЫСКАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ РСДРП УСЕАГУЛЬНАЙ ЗАБАСТОЎКІ І ДЭМАНСТРАЦЫІ РАБОЧЫХ У г. КОПЫСЬ

5 сентября 1905 г.

На кафельных заводах Копыси около 800 рабочих (2/3 из них христиане, остальные — евреи). За последние шесть недель (вторая половина июня и июль) было около 5 массовок; на каждой — от 500 до 800 рабочих. Темы: о небходимости бороться, о политической борьбе; о задачах пролетариата, о современных событиях и т.п. (ораторы присылались Полесским комитетом). В начале июля было общее собрание (около 600 чел.) рабочих всех кафельных заводов для обсуждения и решения вопроса «о резке кафеля». Рабочие получают за свою работу 90 проц. авансом. Они за него отвечают круговой порукой. Несмотря на круговую поруку, хозяева за резку кафеля выдавали аванса на 20 проц. менее. Рабочие на собрании решили, что ввиду круговой поруки следует настоять на том, чтобы и за резку выдавалось полностью 90 проц. аванса. На собрание явилась вся полиция (10—12 чел.), с приставом во главе. Рабочие вооружились чем попало (кольями) и стали обороняться. Так как полиция не уходила, то рабочие, взявшись за руки, сплоченной массой с песнями двинулись в город. Около часу продолжалось шествие. Разошлись на Базарной площади.

Через день собрались вновь (на лужке, как и в прошлый раз) для решения того же дела. Мы воспользовались состоявшимся собранием для произнесения политической речи. Собрание и речь очень понравились. Не успел оратор кончить, как вновь явилась полиция. Боевой отряд организации выступил вперед. Полиция удалилась. Но вследствие замешательства в толпе кончить речь не удалось. Опять вся масса, с боевым отрядом впереди, двинулась в город. Здесь ждала полиция с целью отметить по возможности бывших в толпе. Решено было заставить полицию удалиться. При общем напоре на полицию произошло небольшое столкновение (обменялись приблизительно 8-ю выстрелами). Были легко раненые с обеих сторон, между прочим, пристав. Требование рабочих об увеличении авансов за резку до 90 проц. удовлетворено.

В понедельник после 9-го июля отметили полугодовщину петербургских январских событий. Листки Копыской организации, распространенные накануне, звали к всеобщей забастовке. Забастовка удалась вполне. Закрылась даже казёнка. Жнецы в окрестности не вышли на работу. Утром было собрание (около 40 чел.), на котором были и крестьяне с ближних деревень. Произнесена была речь о значении январских дней, о необходимости открытых массовых выступлений. В час дня пошли в город со знаменем, песнями, салютами. Народу на демонстрации было до 1500 чел. Вечером было большое гуляние, зажигали огни (магний) и т.п.

Дня через два из Могилева явились 2 роты солдат, жандармский полковник, могилевский полицмейстер, вице-губернатор. Стали производить розыски, дознание. Начались аресты, обыски, которые продолжаются и до сих пор (конец июля). Рабочие держат себя хорошо. Солдаты же, присланные в Копысь, сами стали предъявлять начальству требования: напр., они требуют вместо сараев, в которых их поместили, квартиры. Когда одну роту отправляли в Горки, она не захотела идти пешком, требуя подвод. К солдатам Копысской организации выпущены листки (один местный, остальные — перепечатки) о волнениях во флоте и в армии. Несмотря на солдат, на обыски и аресты, в конце июля опять была массовка.

Сообщено рабочими из организации.

З ДАНЯСЕННЯ ПАМОЧНІКА НАЧАЛЬНІКА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРСКАГА УПРАЎЛЕННЯ Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ ПРА ЗАБАСТОЎКУ СЯЛЯН в. НОВАЕ СЯЛО АРШАНСКАГА ПАВЕТА

5 августа 1905 г.

Секретно.

1 сего августа в 10 час. утра крестьяне дер. Новое Село Мошковской вол. Оршанского у., собравшись толпой до 50 чел., с палками в руках пришли в им. Межево гр. Анны Константиновой Лубенской и с бранью и насилием прогнали с работ всех рабочих, годовых до 30 чел. и поденных обоего пола до 200 чел., требуя от владелицы имения заработной платы. Столкновения крестьян с чинами полиции не было, так как прибывший на место в этот же день пристав 1-го стана Оршанского у. крестьян в имении не застал.

Беспорядки продолжаются. Для прекращения означенных беспорядков войска вызваны не были. Зачинщиков к означенным беспорядкам выяснено 11 чел. и принимавших в них участие 40 чел. На увещевания станового пристава и предупреждения об ответственности 2 августа собранные крестьяне вели себя по отношению к нему дерзко и заявили, что они край-

не стеснены экономиею им. Межево: их сильно преследуют и за потравы, пасьбу скота, не принимают на работы, а если кого и принимают, то платят мужчине в день не более 30 коп., на его харчах, а женщине не более 25 коп. в день, осенью же и зимой поденным платят по 20 коп. в день. Кроме того, крестьяне заявили, что Межевская экономия пользуется их землей, ныне находящейся под лесом, и они требуют возврата этой земли и что если все изложенные претензии не будут удовлетворены, то они никому не позволят работать в им. Межеве, а участком земли воспользуются сами, не желая вести судебных процессов.

Виновные привлечены к ответственности.

Об изложенном имею честь донести Департаменту.

Ротмистр (подпись).

З ДАНЯСЕННЯ ПАМОЧНІКА НАЧАЛЬНІКА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРСКАГА ПРАЎЛЕННЯ Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ ПРА ЗАБАСТОЎКІ РАБОЧЫХ У ОРШЫ І БАРАНІ

13 октября 1905 г.

...Имею честь донести Департаменту, что забастовка рабочих стн. Орша Московско-Брестской ж.д. находится в прежнем положении, и несмотря на увещевания могилевского вице-губернатора, рабочие не пожелали пустить поезд до получения уведомления из Москвы об окончании их забастовки.

Станция и пути охраняются войсками. В первый день забастовки на путях Риго-Орловской ж.д. были забиты костылями две стрелки неизвестно кем, но во-время костыли были вынуты. Пассажирам с остановленных поездов выдаются деньги: по 1 руб. 50 коп. пассажирам 1 класса, 1 руб. — 2 класса и 50 коп. — 3 класса.

По делу задержанной агитаторши дознанием вполне установлено, что она произносила публично противоправительственные речи, кричала «Долой самодержавие!», причем на допросе эта женщина категорически отказалась назвать себя и сообщить о себе какие-либо сведения. Виновной она себя не признала, но заявила, что она действительно говорила противоправительственную речь к рабочим и кричала «Долой самодержавие!» и что, когда ее выпустят из тюрьмы, то ее первый возглас будет «Долой самодержавие!», но что она в этом не видит преступления.

Помощник начальника Могилевского губернского жандармского управления в Оршанском, Горецком и Сенненском уездах ротмистр (подпись).

14 октября 1905 г.

12 сего октября на Баранском Оршанского у. проволочно-гвоздильном заводе все рабочие, в числе до 200 чел., забастовали, прекратив работы; забастовка продолжается и в настоящее время, и по словам директора завода продолжится до 17 октября. Причина забастовки администрацией завода точно не установлена. Некоторые рабочие, по слухам, устроили забастовку на экономических началах, а некоторые из-за поддержания и солидарности с железнодорожными рабочими. Сего числа многие из рабочих желали идти на работы, но директор завода Гайдович в наказание им отказал в этом до 17 октября. Насилий и политических агитаций не замечалось в среде забастовавших рабочих, хотя последнее время наблюдается их подозрительно возбужденное состояние.

Об изложенном имею честь донести Департаменту.

Ротмистр (подпись).

З ДАНЯСЕННЯ НАЧАЛЬНІКА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРСКАГА ПРАЎЛЕННЯ КАМАНДЗІРУ АСОБАГА КОРПУСА ЖАНДАРАЎ ПРА МІТЫНГ НА СТАНЦЫІ І Ў г. ОРША

15 октября 1905 г.

Секретно.

11-го сего октября в 10 час. утра на стн. Орша был подан кем-то свисток, на который собрались все рабочие станционного депо, прекратив работу. Войдя в здание вокзала, рабочие согнали с работы других рабочих и телеграфистов и по приходе почтовых поездов за №№ 3 и 4, отцепили паровозы и выпустили пары, после чего продолжали гулять большими группами по вокзалу.

Около 4-х час. дня на платформе Московско-Брестской ж.д. появилась неизвестная молодая женщина и, обратясь к рабочим, бывшим на вокзале, и публике, сказала: «Подойдите

ко мне поближе, мне надо вам кое-что сказать». Сейчас же около этой молодой женщины образовалась сплоченная толпа, человек до 300, причем упомянутая женщина стала им читать какую-то прокламацию, разъясняя ее содержание, и в заключение воскликнула: «Долой самодержавие!» Этот крик был единодушно поддержан присутствовавшей толпой.

Тогда жандармские железнодорожные унтер-офицеры Панков, Белоусов и Бирюков и унтер-офицер дополнительного штата вверенного мне управления Игнатьев при помощи находившихся на вокзале пяти нижних чинов с ружьями врезались в толпу, желая задержать ораторшу. Жандарму Белоусову удалось ее схватить, но толпа первоначально отбила задержанную, причем последняя бросилась бежать через вокзал на платформу Риго-Орловской ж. д., сопровождаемая толпою. Жандарм Белоусов догнал ее на упомянутой платформе, схватил и удержал, отбиваясь от толпы, до тех пор, пока не подоспели отставшие несколько человек солдат-пассажиров, прибывших с поездом 4, которые обнажив оружие, отделили задержанную вместе с унтер-офицером Белоусовым от толпы и доставили ее в город в тюрьму. Толпа сопровождала их, крича: «Долой самодержавие!», но после предупреждения Белоусова, что он будет стрелять при первой попытке толпы отбить силой арестованную, сопровождающая ее толпа рассеялась. Несколько человек из толпы поехали на извозчике в город, где успели собрать большую толпу... Эта последняя толпа встретила арестованную на Базарной площади крича: «Долой самодержавие! Давайте бомбы, ружья!». В это время подоспела конвойная команда, при помощи коей арестованная и была доставлена в тюрьму, причем арестованная кричала, обращаясь к толпе: «Прощайте, братцы!»

Толпа от тюрьмы направилась на Петербургскую улицу, разбивая по дороге стёкла в окнах присутственных мест. При сем были разбиты стекла в полицейском управлении, в уездном съезде, в казначействе и почтово-телеграфной конторе. Задержанная отказалась себя назвать; она белоруска... лет около 25...

Около 7 час. вечера того же числа, на той же станции в пожарном собралась сходка рабочих в присутствии начальника участка инженера Гемельфарба и оршанского уездного исправника. Рабочие постановили на этой сходке не производить никаких беспорядков и стать на работу при условии выполнения их требований, предъявленных в марте сего года, и когда кончится забастовка вообще на Московско-Брестской ж. д.

В 2 часа ночи на стн. Орша прибыли 2 роты солдат Кадниковского полка из гор. Могилева, а 12 числа, в 12 час. дня, еще 2 роты того же полка с командиром батальона; с тем же поездом прибыл в Оршу и могилевский вице-губернатор Ладыженский... О преступных деяниях задержанной агитаторши производится помощником моим в Оршанском, Горецком и Сенненском уездах дознание в порядке 1035 ст. Устава уголовного судопроизводства.

Полковник Поляков.

З ДАНЯСЕННЯ ІНСПЕКТАРА АРШАНСКАГА ГАРАДСКОГА ВУЧЫЛІШЧА ДЫРЭКТАРУ НАРОДНЫХ ВУЧЫЛІШЧАЎ МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ ПРА ЗАБАСТОЎКУ НАВУЧЭНЦАЎ ГІМНАЗІІ

15 октября 1905 г.

Волнение последнего времени среди рабочих гор. Орши и ее окрестностей и беспорядки в Орше 11 сего октября, сопровождавшиеся битьем стекол в правительственных учреждениях и стрельбою, неблагоприятно отразились на учащихся, произведя между последними заметное движение. После же прекращения 13 числа занятий в местной женской гимназии волнения учащихся вверенного мне училища еще более усилились, так что на следующий день, 14 октября, ученики явились в училище явно возбужденными, и преподавателям училища стоило немалых трудов поддерживать порядок до окончания уроков. С самого утра во время уроков какие-то темные личности бродили около училища, и два из них пытались ворваться в классы во время уроков, но их удалось не допустить. После уроков старшие ученики заявили мне в самой приличной форме, что они желают побеседовать с учениками младших классов с целью успокоения их возбужденного состояния, и вслед затем толпой собрались в училищный сад, откуда возвратились через некоторое время и объявили, что они, находя невозможным отставать якобы от общей забастовки учебных заведений округа и в видах поддержания движения рабочих, решили большинством забастовать на один день, не заявляя при этом никаких требований...

Учитель-инспектор (подпись).

З ДАНЯСЕННЯ ПАМОЧНІКА НАЧАЛЬНІКА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРСКАГА ПРАЎЛЕННЯ Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ ПРА ЗАБАСТОЎКУ І ЎЗБРОЕНУЮ ДЭМАНСТРАЦЫЮ Ў ОРШЫ

19 октября 1905 г.

Секретно.

В дополнение к телеграмме от сего числа доношу, что вчера, 18 сего октября, с утра в гор. Орше стали циркулировать слухи, что будто бы объявлен манифест о даровании конституции. Вечером того же дня, около 8 час., толпа с пением революционных песен, с криками «Долой самодержавие!» и другими ходила по городу до 12 часов ночи и затем разошлась.

Полицией были приняты следующие меры: около полицейского управления стоял взвод солдат и несколько человек солдат стояло около почты (в городе всего одна рота солдат). К разогнанию толпы мер не принималось. Сего числа с утра городской голова Стратанович в разных местах города читал высочайший манифест, отпечатанный в «Могилевских Ведомостях», причем объявил, что в час дня будет на площади всенародное молебствие о даровании конституции. К 10 час. утра на Петербургской ул. собралась толпа и все время кричала: «Ура! Долой самодержавие! Долой царя!».

Пели революционные песни, много ораторов говорили речи. Около 12 час. дня в толпе появилось несколько красных флагов с преступными подписями. В это время толпа стала требовать освобождения политических заключенных, их было всего трое в тюрьме и семь человек содержались в полиции по постановлению могилевского губернатора.

В начале первого часа дня толпа двинулась к тюрьме, где ворвалась на тюремный двор, причем освободила бывшего в то время на прогулке арестованного и стала требовать освобождения третьего арестанта, на что начальник тюрьмы не соглашался, несмотря на угрозы толпы разгромить тюрьму. После этого к товарищу прокурора Гусаревичу явилась депутация от толпы, которая требовала освободить арестованных, хотя бы временно, обещая по первому требованию доставить их в тюрьму. Тогда товарищ прокурора отправился в тюрьму в сопровождении меня, где я распорядился освободить их.

Перед освобождением из тюрьмы помощником исправника Гацкевичем (исправник находится в отлучке), уступая силе толпы, были освобождены семь арестованных при полиции. Со станции толпа вернулась в город около 7 час. вечера и около полицейского управления разошлась по предложению неизвестных ораторов до завтра, 20 октября, 10 час. утра. Насилий толпа не проявила, но тем не менее арестованных полиция принуждена была освободить во избежание кровопролития, так как толпа вся была вооружена (количество вооруженных демонстрантов достигало 3000 чел.) и в возбужденном состоянии.

Ротмистр (подпись).

ПАЛІТЫЧНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ Ў ОРШЫ

З ДАНЯСЕННЯ ІНСПЕКТАРА НАРОДНЫХ ВУЧЫЛІШЧ 3—га ЎЧАСТКА ДЫРЭКТАРУ НАРОДНЫХ ВУЧЫЛІШЧ МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ ПРА РЭВАЛЮЦЫЙНЫ РУХ

20 октября 1905 г.

Считаю должным сообщить в.п., что нормальное течение занятий в учебных заведениях гор. Орши нарушается сильными волнениями политического характера, возникшими в этом городе с прошлой недели и продолжающимися по настоящее время…

…Около одного часа дня громадная толпа демонстрантов с красными флагами и революционными надписями на них, под звуки «Марсельезы» и почти непрерывные крики «ура» прошла по главной улице.

Настроение в городе весьма тревожное. Магазины закрыты. Во дворе казначейства и большинстве других мест вооруженные войска. Сейчас (8 час. вечера) снова началась демонстрация: слышны шум и крики, раздаются выстрелы.

Инспектор (подпись).

З ПРАКЛАМАЦЫІ АРШАНСКАЙ ГРУПЫ РСДРП ДА НАСЕЛЬНІЦТВА ОРШЫ

октябрь 1905 г.

...Русское самодержавие, которое десятки лет давит и угнетает все честное и мыслящее в России, которое в железных кандалах заковало все население, не давало им свободно жить, дышать и вести свою борьбу. Их по тюрьмам сажали, и в участках избивали, на каторгу ссылали. Но бодро и смело шли они в первых рядах, и когда после 17 октября организовало самодержавие всероссийский погром, чтобы потоками крови потушить революцию, они, эти смелые борцы за свободу, эти храбрые воины пролетарской армии, самоотверженно бросились в борьбу и сложили свои буйные головы.

Товарищи! Тридцать дней прошло с того ужасного дня, когда на нашем оршанском кладбище были похоронены 22 жертвы...

Помянем же мы в этот день наших славных павших товарищей. Покажем же и мы, что смерть нас не страшит, что лучше умереть в борьбе, чем изнывать в темноте.

Вперед же, товарищи, в бой! Сбросим иго самодержавного правительства и воздвигнем свободную демократическую республику. Уничтожим капитализм! Да здравствует социализм!

Оршанская организация Российской социал-демократической рабочей партии.

ДАНЯСЕННЕ ПАМОЧНІКА НАЧАЛЬНІКА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРСКАГА ПРАЎЛЕННЯ Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ ПРА АГІТАЦЫЮ РАБОЧЫХ СЯРОД СЯЛЯН БАРАНІ І НАВАКОЛЬНЫХ ВЁСАК

11 ноября 1905 г.

Секретно.

По полученным мною сведениям, рабочие гвоздильного завода в с. Барань Оршанского у., преимущественно католики — уроженцы Привисленского края, агитируют среди крестьян окрестных деревень, подговаривая их на борьбу с чинами полиции и войсками на случай, если последние будут командированы для подавления беспорядков, причем рабочие названного завода будут сами вооружены холодным оружием и револьверами, вооружают таковым же оружием крестьян и подстрекают их принять участие с рабочими в избиении чинов полиции, каковое избиение они намерены произвести в ближайшем будущем. Кроме сего, мною получены также сведения, что рабочие того же завода устраивают в с. Барань и ближайших деревнях демонстрации с красными флагами, о чем мною, вместе с сим, сообщено оршанскому уездному исправнику.

Об изложенном имею честь донести Департаменту.

Ротмистр (подпись).

ТЭЛЕГРАМА БАСТУЮЧЫХ РАБОЧЫХ ДЭПО ОРША РАБОЧЫМ І СЛУЖАЧЫМ ДЭПО МІНСК

9 декабря 1905 г.

Минск. Мастерские депо и всем службам Московско-Брестской ж. д.

Товарищи. Просим солидарности. Москва, Вязьма и мы, Орша, бастуем по предложению Московского узла.

Подлинную подписали товарищи депо Орша.

С подлинным верно: помощник начальника Могилевского губернского жандармского управления в Оршанском, Горецком и Сенненском уу. ротмистр (подпись).

ЗАБАСТОЎКА САЛІДАРНАСЦІ Ў ОРШЫ

ДАНЯСЕННІ ПАМОЧНІКА НАЧАЛЬНІКА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРСКАГА ПРАЎЛЕННЯ Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ ПРА РЭВАЛЮЦЫЙНЫ РУХ У КОПЫСІ І ОРШЫ

13 декабря 1905 г.

Секретно.

В гор. Копыси Горецкого у. в 7 час. вечера состоялся митинг (присутствовало) до 500 чел., преимущественно рабочих копысских фабрик, причем неизвестный приезжий оратор го-

ворил речь, призывая к восстанию. По сведениям, оратор приезжал из Орши. Митинг продолжался до 10 час. вечера, после чего все разошлись с пением «Марсельезы».

Об изложенном имею честь донести Департаменту.

Ротмистр (подпись).

13 декабря 1905 г.

Под влиянием агитации мастеровые рабочие прекратили работы и остановили движение поездов. С 8 же декабря начались митинги ежедневно... причем на этих митингах призывались к вооруженному восстанию и к забастовке.

Из забастовавших служащих был выбран комитет, который, находясь постоянно на станции, распоряжается задержанием поездов и пропуском воинских поездов.

Но забастовщики, имея в виду аресты, производимые в Минске и Смоленске, по-видимому ожидали таковых и высказали явное намерение оказать сопротивление аресту агитаторов и заявили, что не допустят арестовать... Когда я с исправником явились на вокзал, то там уже собрались толпой забастовщики, почему привести аресты в исполнение мы не могли, а толпа проводила меня свистками. Ввиду того что в гор. Орше не имеется никакой воинской силы, а чинов полиции слишком мало, то пришлось отказаться от ареста агитаторов до прибытия войск, причем на завтра, 14 декабря, ожидается прибытие в Оршу эскадрона драгун.

Об изложенном имею честь донести Департаменту.

Ротмистр (подпись).

22 октября 1909 г.

Секретно.

Владелец щетинной фабрики в гор. Орше Кох увеличил рабочий день до 10 час. в сутки. Рабочие-щетинщики предложения фабриканта не приняли и с 13 сего октября не пошли на работу. Настроение рабочих, по внешности, мирное. Ведется наблюдение, так как щетинщики традиционно ненадежный в политическом отношении элемент.

Полковник (подпись).

ДАНЯСЕННЕ НАЧАЛЬНІКА АРШАНСКАЙ ЖАНОЧАЙ ГІМНАЗІІ ЎПРАЎЛЯЮЧАМУ ВІЛЕНСКАЙ НАВУЧАЛЬНАЙ АКРУГАЙ ПРА ЗАБАСТОЎКУ Ў АРШАНСКАЙ ЖАНОЧАЙ ГІМНАЗІІ

13 марта 1906 г.

Сегодня в начале второго урока, ученицы V и VI классов заявили представительницам, пришедшим на уроки, что сегодня они заниматься не могут, и затем начали уходить из класса одна за другой. Заметив их выход, я пытался возвратить их в класс, предполагая, что они волнуются от плача в коридоре трех учениц III класса, получивших двойки. Оказалось же, что ученицы VI класса пришли в IV класс, где учитель спокойно продолжал начатый урок, и вызвали из класса и учениц IV класса. Все толпою, без большого шума, разговаривая, остановились в зале. Войдя в их среду, я просил их успокоиться и сказать, в чем дело. Помолчав немного, они заявили, что сегодня заниматься не могут. «Почему?» — «По случаю казни Шмидта мы не можем сегодня заниматься». Попытки уговорить их успокоиться были безуспешными. Они отошли к стене, к окнам, ставши в длинную линию, запели какую-то песню. Слов разобрать не мог. Пропели один куплет и спокойно вышли из зала и разошлись из гимназии по домам.

Никаких резких выходок не было. В трех младших классах уроки идут.

Об этом имею честь донести в. п.

Начальник гимназии Икумов.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ДЫРЭКТАРА ДЭПАРТАМЕНТА ПАЛІЦЫІ НАЧАЛЬНІКУ ВІЛЕНСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ ПРА ПЕРАСЫЛКУ «РАБОЧЕЙ ГАЗЕТЫ» З-ЗА МЯЖЫ Ў РАСІЮ ПРАЗ ОРШУ

16 февраля 1911 г.

Секретно.

Доношу в. п., что адрес: «Гор. Орша Могилевской губ. Ольге Борисовне Лепешинской», по которому из-за границы был послан задержанный номер «Рабочей Газеты» издания Российской социал-демократической рабочей партии, относится к Ольге Борисовне Лепешинской, жене бывшего преподавателя Оршанского частного реального училища Пантелеймона

Николаевича Лепешинского, убежденного социал-демократа, привлекавшегося к дознаниям в 1895 и 1902 гг. при С.-Петербургском губернском жандармском управлении. В 1908 г. Лепешинский привлекался при Могилевском губернском жандармском управлении в качестве обвиняемого по 1 части 129 и п. 2, 132 ст. уголовного уложения. Дознание закончилось для него без всяких последствий.

До июля 1910 г. Ольга Лепешинская состояла преподавательницей в Оршанской еврейской женской прогимназии Фабриканта, а затем выехала в Московскую губ., где ее муж поступил преподавателем в одно из коммерческих училищ, находящееся в 20-ти верстах от Москвы.

Ольга Лепешинская по делам политического характера при Могилевском губернском жандармском управлении не привлекалась, но является личностью сомнительной политической благонадежности, так как находилась все время под влиянием своего мужа.

Задержанный номер издающейся за границей «Рабочей Газеты», адресованный на имя Лепешинской, несомненно, предназначался не лично ей, а ее мужу.

Генерал-майор (подпись).

З ДАНЯСЕННЯ МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ ПРА ЗАБАСТОЎКІ РАБОЧЫХ КАФЛЯНЫХ ЗАВОДАЎ У КОПЫСІ І ЛЁНАПРАДЗІЛЬНАЙ ФАБРЫКІ Ў в. ВЫСАЧАНЫ АРШАНСКАГА ПАВЕТА

27 июня 1911 г.

Секретно.

Уведомляю Департамент, что в гор. Копыси Горецкого у. на 13 кафельных заводах, по донесению исправника, стала подготовляться забастовка около 200 рабочих-формировщиков, требовавших от заводовладельцев уравнения платы с рабочими-терракотчиками. По имеющимся у меня от выезжавшего в г. Копысь старшего фабричного инспектора сведениям, забастовка протекает спокойно.

Более подробные сведения будут мною сообщены дополнительно.

Губернатор (подпись).

И. д. правителя канцелярии Н.Бестужев-Рюмин.

4 июля 1914 г.

По телеграфным сведениям, полученным мною от старшего фабричного инспектора Могилевской губ. и оршанского уездного исправника, 1 сего июля в с. Высочаны Оршанского у. на льнопрядильной фабрике Этриха забастовали рабочие, в числе 503 чел., предъявившие требование об увеличении им заработной платы. Забастовка протекает спокойно.

Об изложенном уведомляю Департамент полиции.

И. д. губернатора вице-губернатор в звании камер-юнкера высочайшего двора (подпись).

Правитель канцелярии (подпись).

ПАВЕДАМЛЕННЕ ПРА АРГАНІЗАЦЫЮ АРШАНСКАГА САВЕТА РАБОЧЫХ ДЭПУТАТАЎ

8 марта 1917 г.

8-го марта в помещении городской думы состоялось собрание рабочих и служащих гор. Орши. Присутствовали рабочие гаража ВЗС, рабочие по постройке мостов, рабочие по постройке новой линии и другие. Постановлено приступить к организации местного Совета рабочих и солдатских депутатов гор. Орши, для чего избраны во временно организованный комитет 4 представителя от рабочих и служащих гор. Орши. Принята следующая схема организации Совета рабочих депутатов: по отношению к городским рабочим — городские рабочие организуются по цехам. Каждый цех или предприятие, объединяющие от 25 до 100 чел., выбирают одного представителя, имеющие больше 100 — выбирают двух и т.д.

З АДОЗВЫ САВЕТА РАБОЧЫХ ДЭПУТАТАЎ АРШАНСКАГА ДРАЦЯНА-ЦВІКАВАГА ЗАВОДА ПРА НЕАБХОДНАСЦЬ АРГАНІЗАЦЫІ САВЕТА РАБОЧЫХ У ДЭПО ОРША

19 марта 1917 г.

Товарищи рабочие депо Орша Александровской ж. д.! Обращаемся к вам с просьбой организоваться; не забывайте, что «в единении сила». Немедленно организуйте у себя местный

Совет рабочих и из своего Совета делегируйте двух товарищей в Совет рабочих и солдатских депутатов гор. Орши и окрестностей ее. На нашем заводе с 8-го марта начал функционировать Совет рабочих и в настоящее время он вполне сорганизовался. Для ознакомления с организацией Совета рабочих нашего завода посланы инструкции в депо.

Совет рабочих Оршанского проволоко-гвоздильного завода.

Документы и материалы по истории Белоруссии. Мн., 1953. Т. 3.

Дакументы падрыхтавала да друку Л.В.Яршова.

Незабыўнае

БАРЫСАВА Раіса Барысаўна — удзельніца рэвалюцыйнага руху 1905 г. Неаднаразова арыштоўвалася царскімі ўладамі. З 1915 г. па ліпень 1917 г. вяла падпольную партыйную работу ў Данбасе. У 1918—20 гг. — старшыня павятовага камітэта партыі ў г. Пугачоў Саратаўскай вобласці. Была дэлегатам VIII з'езда РКП(б). Некалькі гадоў працавала ў сістэме народнай асветы, потым зноў на партыйнай рабоце. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны.

Матэрыял, які друкуецца, адносіцца да рэвалюцыйных падзей на Аршаншчыне 1907 г.

Прайшло больш паўстагоддзя, як у выніку праследаванняў царскіх улад я апынулася ў Оршы — тады павятовым горадзе Магілёўскай губерні. Гэта быў пачатак 1907 г., і было мне ўсяго 17 гадоў.

Пачаліся пошукі работы ў незнаёмым месцы. Выпадкова ўладкавалася на фабрычку па апрацоўцы лёну і шчаціны, што знаходзілася на ўзбярэжжы Дняпра і належала аднаму з купцоў. Рабочых на ёй было чалавек 30. Знешне фабрычка нагадвала звычайны жылы дом, а ўнутры гэта было цеснае і бруднае памяшканне без вентыляцыі. У паветры хмары пылу ад апрацоўваемага лёну і смурод ад шчаціны. У дадатак да ўсяго зусім нязначны заробак, аблічванне рабочых.

Неўзабаве пазнаёмілася з маладымі рабочымі Марынай і яе братам Каролем, якія таксама хаваліся ад праследаванняў жандараў. Праз іх далучылася да ўдзелу ў рэвалюцыйным падполлі Оршы.

Пасля расстрэлу піцерскіх рабочых 9 студзеня 1905 г. пралетарыі Оршы, наперадзе якіх ішлі чыгуначнікі, выказалі свой гнеўны пратэст у 3-дзённай стачцы і вулічных дэманстрацыях. Рэвалюцыйныя падзеі на працягу ўсяго 1905 г. нарасталі з кожным месяцам.

У кастрычніцкія дні 1905 г. аршанцы аднымі з першых далучыліся спачатку да чыгуначнай стачкі, а затым — да ўсеагульнай стачкі супраць царызму. Мітынгі і дэманстрацыі адбываліся штодзённа, нягледзячы на жорсткія праследаванні паліцыі, арышты і страляніну ў дэманстрантаў. У дні маскоўскага ўзброенага паўстання аршанскія чыгуначнікі затрымлівалі цягнікі з войскамі, якія ішлі на ўціхамірванне масквічоў.

У 1907 г., як і ва ўсёй краіне, на Аршаншчыне адчуваўся спад рэвалюцыйнай хвалі. Тым не менш эканамічныя стачкі адбываліся адна за другой.

Дзве стачкі ў тым годзе ў Оршы былі вельмі ўпартымі. Адна з іх — стачка краўцоў, якая працягвалася каля 3 тыдняў. Ёй кіравала група РСДРП. У гэтай стачцы праявіўся накоплены вопыт і воля рабочых да барацьбы. Гаспадары супраціўляліся: яны адмаўляліся пакінуць у сіле існаваўшы 11-гадзінны рабочы дзень і некалькі павялічаны заробак. Але ж асобныя гаспадары не вытрымалі і пачалі ісці на ўступкі. Такім чынам рабочым удалося адстаяць большую частку сваіх заваёў.

Помніцца мне і стачка рабочых на ўсіх лясных распрацоўках у павеце. Яна праходзіла таксама пад кіраўніцтвам бальшавікоў з мясцовай групы РСДРП. Да рабочых-лесарубаў далучыліся сплаўшчыкі лесу. Усяго баставала каля 200 чалавек. Калі пачалася стачка, гаспадары ўказалі на перадавых рабочых, і 15 з ліку іх тут жа былі арыштаваны. Аднак стачка не спынілася, а арышт таварышаў толькі ўзмацніў волю рабочых да адстойвання сваіх інтарэсаў. Жандармерыя перапалохалася, было зроблена яшчэ некалькі арыштаў. Тым часам лесапрамыслоўцы абвясцілі лакаут. Для зрыву лакауту стачачнікам аказвала дапамогу ўсё рабочае насельніцтва горада. Сродкі збіраліся не толькі ў Оршы, але паступалі і з іншых гарадоў. Так працягвала-

ся 3 месяцы. Незвычайная стойкасць рабочых, нягледзячы на нястачу і праследаванні з боку паліцыі, сарвала рэакцыйныя замахі гаспадароў. У жніўні стачка спынілася, хаця і не ўсе патрабаванні рабочых былі задаволены. Але ўстаноўлены ў 1905 г. заробак лесарубам і сплаўшчыкам удалося адстаяць.

На працягу лета 1907 г. ў Оршы амаль штодзённа ўспыхвалі пажары ў розных частках горада. Чарнасоценцы падпальвалі кварталы яўрэйскай беднаты. Перадавыя рабочыя прыкладалі нямала сіл і намаганняў, каб выратаваць насельніцтва ад бедства. Па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам групы РСДРП узніклі рабочыя атрады па барацьбе з пажарамі, яны патрулявалі па вуліцах. Але паліцыя пачала праследаваць гэтыя атрады.

У памяці насельніцтва горада яшчэ былі свежыя жахі нядаўняга жудаснага пагрому. У канцы 1905 г. царскі ўрад вырашыў разлічыцца з працоўнымі Оршы за іх баявыя рэвалюцыйныя выступленні. Калі пачаўся пагром, на дапамогу аршанцам паспяшаліся дубровенскія ткачы і сялянскія паўстанцы з прылягаючых да горада валасцей.

5 дзён на вуліцах Оршы працягваўся бой рабочай дружыны з чарнасоценцамі і паліцыяй. У выніку тысячы гараджан былі выратаваны ад непазбежнай гібелі і разгрому маёмасці. Але пагромшчыкі нарабілі нямала бяды: яны спустошылі цэлыя кварталы беднаты. Былі дзесяткі забітых і каля 300 раненых, больш 200 удзельнікаў баявых атрадаў арыштаваны.

Аршанскі пагром выклікаў абурэнне сярод прагрэсіўнай грамадскасці Расіі і за мяжой. Царскі ўрад быў вымушаны інсцэніраваць судовую камедыю над ярымі пагромшчыкамі. Але забойцы-грамілы абышліся 2—3 месяцамі турмы. У той жа час для кіраўнікоў і актывістаў баявых атрадаў рабочых, якія трапілі ў рукі жандармерыі, рыхтавалася пакаранне смерцю. Сярод рабочых Оршы панавала занепакоенасць за лёс сваіх таварышаў. Яны патрабавалі любымі сродкамі выратаваць асуджаных.

На нелегальным сходзе нашай групы Кароль інфармаваў, што па прапанове бальшавікоў створана баявая дружына, у якую ўвойдуць прадстаўнікі застаўшыхся на свабодзе партыйных груп і якая ажыццявіць распрацаваны план выратавання вязняў аршанскай турмы.

Неўзабаве гэты план стаў ператварацца ў жыццё. Пачаўся падкоп пад аршанскую турму. У склад групы трапіла і я. З гэтай мэтай я пасялілася ў доме па Турэмным завулку пад выглядам догляду пражываўшых тут двух старых, якія страцілі зрок. З вокнаў майго пакойчыка была бачна турэмная сцяна, па якой туды і назад крочыў вартавы.

У групе было 25 чалавек. Ніхто з нас не думаў аб асабістай небяспецы, усе жылі думкай аб выратаванні таварышаў.

Цэлы месяц вялі падкоп з доміка вартаўніка ляснога склада, які ўшчыльную прылягаў да турэмнай сцяны. Усё ішло паспяхова. Работа вялася ноччу, а днём, разам з палівам, вывозілася выкінутая з тунэля зямля. Але ж здарылася няшчасце: аднойчы згарэлі лясны склад, жылы дом, памяшканне вартаўніка, і нашы задумы сарваліся.

Пытанне прыйшлося вырашаць па-іншаму. Ад бальшавікоў было вылучана 15 адважных, ведаючых вайсковую справу таварышаў. Яны атрымалі зброю, што захавалася ў баевікоўчыгуначнікаў. Па пятах этапу, які ў канцы жніўня 1907 г. вывозіў зняволеных на суд у Магілёў, рушылі адважныя юнакі.

Нападна 10 казакоў з канвою, якія былі ўзброены да зубоў, уяўляўся вельмі складаным. Але ўсе былі ўпэўнены ў поўным поспеху, і ён ажыццявіўся. У далейшым ад Кароля я даведалася, як былі вызвалены зняволеныя. Аб гэтым вельмі цікава расказаць.

Аблегчыў усё праліўны дождж. Па дарозе наскрозь вымакшы патруль са зняволенымі спыніўся ў адной з хат. У гэты час таварышы з баявой групы схаваліся ў бліжэйшым лясочку. Асцярожна, адзін за другім, яны прабраліся да хаты. Карканнем вароны быў дадзены знак, што двое з вязняў павінны папрасіцца «на двор». Казак, які суправаджаў іх, выйшаў нават без зброі. А ў двары, як толькі зняволеныя адышлі ўбок, на яго накінуліся нашы таварышы. Трапным ударам яны збілі казака з ног, звязалі, заткнулі рот.

Тым часам двое вызваленых разам з адным з вызваліцеляў паспелі схавацца ў лесе. Услед за гэтым у дзверы хаты пастукаўся апрануты ў лахманы, барадаты і кульгавы чалавек. Ён папрасіў паноў-казакоў дазволу крыху абагрэцца.

Усеўшыся ў куце, прахожы пачаў развязваць свой кошык, у якім, дарэчы, аказалася гарэлка, і падрыхтаваўся яе выпіць. Дзевяць казакоў прыраслі вачыма да бутэлькі. Начальнік этапу крыкнуў:

— Гэй, ты, пачастуй і нас гарэлкай! Прамерзлі да касцей...

Стары, кланяючыся ў пояс, адказаў казакам, што яго паслалі купіць гарэлку ў суседнім мястэчку рубшчыкі лесу. Але калі панам трэба, то ён згодзен аддаць ім гарэлку, а як сціхне дождж, вернецца ў мястэчка назад, каб пакрыць нястачу.

Да кошыка кульгавага кінуліся ўсе. На стале паявіліся 5 бутэлек з гарэлкай. Тут жа разлілі гаручае па кубках і выпілі.

Пакуль ішла выпіўка, ніхто не заўважыў, што са двара не вярнуліся двое зняволеных з праважатым. А праз некалькі мінут усе казакі ляжалі ў непрабудным сне. Снатворнае падзейнічала занадта хутка. 14 нашых таварышаў разам з юнаком, які выдаваў сябе за кульгавага старога, зрабіліся паўнаўладнымі гаспадарамі ў хаце. Яны бесперашкодна забралі ўсю зброю і боепрыпасы казакоў, захапілі паштовыя сумкі, якія тыя таксама везлі ў Магілёў, і зніклі разам з вызваленымі. 5 вызваленых былі ў г. Коўна, адкуль пры дапамозе мясцовых падпольшчыкаў нелегальна перайшлі граніцу. У час пераправы адзін з іх загінуў ад кулі пагранічніка-жандара.

Пасля ўдалай аперацыі баевікі прывезлі да мяне на кватэру для захоўвання багатыя трафеі: 10 казацкіх стрэльбаў, 3 сотні патронаў да іх і 4000 рублёў грошай, што былі забраны ў час нападу на этап. Я працягвала паранейшаму жыць у доміку сляпых, якіх даглядала, і ніхто нават не здагадваўся шукаць зброю пад бокам у паліцыі.

У снежні 1907 г. я была вымушана пераехаць у г. Дзвінск. Тут мне была забяспечана надзейная яўка да таварышаў са складу мясцовай партыйнай групы.

З аршанскімі таварышамі я трымала сувязь яшчэ доўгія гады. *Р.Барысава.*

Ленінскі прызыў, 1958. 9 ліпеня.

Орша ў гады першай сусветнай вайны

1-я сусветная вайна пачалася 19 ліпеня (1 жніўня) 1914 г. ў выніку абвастрэння супярэчнасцей паміж ваенна-палітычнымі блокамі капіталістычных дзяржаў — Траістага саюза (Германія, Аўстра-Венгрыя, Італія) і Антанты (Англія, Францыя і Расія) за калоніі і сферы ўплыву, рынкі збыту і крыніцы сыравіны. У яе былі ўцягнуты 33 краіны з насельніцтвам 1,5 млрд. чалавек.

Заходнія губерні Расійскай імперыі (Орша ўваходзіла ў склад Магілёўскай губерні) 18 ліпеня былі пераведзены на ваеннае становішча. У сувязі з гэтым ваенныя ўлады і губернатары атрымалі неабмежаваныя правы. Былі забаронены сходы, забастоўкі (асабліва на чыгунцы), усё, што пагражала «грамадскаму спакою і дзяржаўнаму парадку». Уводзіўся жорсткі ваенна-паліцэйскі рэжым.

Пачалася мабілізацыя запасных у дзеючую армію. Яна суправаджалася шалёнай шавіністычнай «патрыятычнай» кампаніяй, ахапіла значную частку насельніцтва.

1-я сусветная вайна падарвала і без таго слаба развітую гаспадарку. З-за адсутнасці сыравіны, паліва, кваліфікаваных рабочых многія прадпрыемствы Оршы скарацілі ці зусім спынілі вытворчасць. Так, ужо ў 1914 г. ў Оршы і наваколлі зачыніліся 3 лесапільныя і 6 цагляных заводаў, некалькі млыноў і іншых прадпрыемстваў, усяго 17. У канцы 1914 г. ў сувязі з увядзеннем у краіне «сухога закону» былі зачынены практычна ўсе вінакурні. На пачатак 1917 г. аб'ём прамысловай прадукцыі для цывільнага насельніцтва склаў 15—16% даваеннага ўзроўню. Затое значна павялічыўся выпуск прадукцыі прадпрыемстваў, якія выконвалі ваенныя заказы. Узніклі такія прадпрыемствы і ў Оршы. На вытворчасць боепрыпасаў, транспартных сродкаў і іншага вайсковага рыштунку пераключыліся прадпрыемствы металаапрацоўчай прамысловасці. Гранаты і бомбы стаў вырабляць Аршанскі (у Барані) драцяна-цвікавы завод. У Оршы была заснавана майстэрня па вырабе і рамонту зброі і транспартных сродкаў. Амаль усе рабочыя, што працавалі на прадпрыемствах, якія выпускалі прадукцыю для арміі, былі пастаўлены пад кантроль ва-

еннага ведамства. Работа на гэтых прадпрыемствах вызначалася адпаведнымі правіламі, як «спецыфічны від вайсковай службы, неабходнай дзяржаве на час вайны».

Становішча рабочых было вельмі цяжкім: рабочы дзень не рэгламентаваўся, на прадпрыемствах панавалі жудасныя ўмовы працы. Нізкая заработная плата даводзіла рабочых да галечы.

У 1915—16 гг., калі фронт прыблізіўся да Оршы, насельніцтва прыфрантавой паласы выконвала цяжкія ваенныя павіннасці: рамонт дарог, пабудову мастоў, ахову чыгунак і інш. Маштабы абарончых работ былі такімі вялікімі, што ваенныя ўлады вырашылі мабілізаваць на Заходні фронт 100 тыс. чалавек з некаторых раёнаў краіны. Так, з Сібіры ў жніўні 1916 г. ў Оршу прыбыла першая партыя кітайцаў. У 1917 г. некалькі соцень кітайскіх рабочых працавалі на будаўніцтве станцыі Замасточча. Жыццё іх тут было не надта салодкім. Так, 21 ліпеня 1917 г. каля 180 кітайцаў былі зверскі забіты на рыначнай плошчы салдатамі.

Беларусь стала арэнай бітваў мільённых армій. Як вынік пачаліся масавыя ўцёкі. Сотні тысяч чалавек рушылі на ўсход. Праз Магілёўскую губерню прайшло каля 1 млн. бежанцаў. Жудасныя ўмовы (голад, холад, антысанітарыя, недахоп харчавання) выклікалі масавыя захворванні. З'явіўся так званы беларускі тыф, іншыя інфекцыйныя захворванні. Шырока распаўсюдзіліся венерычныя хваробы. Трэба зазначыць, што з хваробамі актыўна змагаліся. У Оршы, напрыклад, дзейнічала таварыства Чырвонага Крыжа (утрымлівала некалькі лазарэтаў), дзейнічалі бежанскія камітэты, Польскае таварыства дапамогі ахвярам вайны. (Тут хочацца заўважыць, што сярод бежанцаў быў тады і хлопчык, а потым вядомы польскі паэт, нобелеўскі лаўрэат Чэслаў Мілаш, якому належыць верш «Орша — станцыя злая. Можа ў Оршы эшалон прастаяць і суткі...») У 1918 г. была знята дакументальная стужка «Бежанцы ў Оршы».

Цяжкае становішча ў час вайны склалася з забеспячэннем насельніцтва харчаваннем, прадметамі паўсядзённага ўжытку. Як вынік — росквіт спекуляцыі, дарагавізна, картачкі на хлеб, цукар, мануфактуру. Расквітнела, не гледзячы на строгі ваенны час, і злачыннасць, асабліва ў 1917—18 гг.

Да 1917 г. Орша з'яўлялася важным ваенна-стратэгічным транспартным вузлом, застаючыся тылавым горадам. У горадзе меўся значны ваенны гарнізон, у наваколлі размясцілася казачая дывізія, у межах горада — каманда самакатчыкаў, этапная, ахоўная, інвалідная каманды, буйныя артылерыйскія, інжынерныя і вінныя склады і г.д.

Няўдачы на фронце, цяжкае матэрыяльнае становішча ваеннаслужачых вялі да ўсё большага разлажэння арміі. Так, 25 верасня 1915 г. кіраўнік міністэрства ўнутраных спраў князь Шчарбатаў пісаў у Стаўку Вярхоўнага галоўнакамандуючага: «У Оршы асабіста назіраў карціну неймавернай распушчанасці двух з паловай тысяч выздаравеўшых ніжніх чыноў... Звесткі аб узрастаючай распушчанасці войск робяць прыгнятальнае ўражанне ўнутры імперыі». У некаторых нумарах газеты «Оршанский вестник» змяшчаўся спіс забітых, параненых і без весткі прапаўшых ніжніх чыноў Аршанскага, Сенненскага і Горацкага паветаў.

Увядзенне смяротнай кары дэзерцірам (пра іх затрыманне часта пісаў «Оршанский вестник»), калечнікаў, якія знарок ранілі сябе ў пальцы, лупцоўка розгамі за іншыя парушэнні дысцыпліны вынікаў не давалі.

Ваенныя дзеянні на Аршаншчыне разгарнуліся ў лютым 1918 г., калі нямецкія войскі, парушыўшы перамір'е, падышлі да Оршы. За кароткі тэрмін было эвакуіравана на ўсход каля 6 тысяч вагонаў з абсталяваннем, боепрыпасамі. Што не ўдавалася вывезці — знішчалася. Так быў узарваны артылерыйскі склад на станцыі Орша-Заходняя, на станцыі Орша-Таварная, у Пажэньках у выніку ўзрыву артылерыйскіх складаў згарэла 5 дамоў, меліся ахвяры сярод мясцовага насельніцтва і аўстрыйскіх ваеннапалонных.

21 лютага горад аб'яўлены на ваенным, 12(25) лютага — на асадным становішчы. На наступны дзень у 2 гадзіны дня над Оршай упершыню з'явіўся нямецкі аэраплан.

18 лютага (3 сакавіка) з Оршы эвакуіруюцца камандаванне гарнізона, іншыя ўстановы.

5 сакавіка (далей усе даты даюцца па новым стылі) у горадзе 2 разы з'явіліся немцы з белым сцягам.

3 сакавіка Савецкім урадам быў заключаны з Германіяй Брэсцкі мір. Згодна з ім пад германскай акупацыяй апынулася большая частка тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і частка Аршанскага павета. Орша была падзелена дэмаркацыйнай лініяй. 6 сакавіка немцы занялі станцыю Орша-Таварная Рыга-Арлоўскай чыгункі і заходнюю частку горада. Орша-Цэнтральная засталася за Чырвонай Арміяй. З вясны да восені 1918 г. Орша была пагранічным горадам. Гэты перыяд найменш даследаваны. У яго ўмясціліся і нямецкая акупацыя, і барацьба з ёй, і леваэсэраўскі жнівеньскі мяцеж, і выступленні супраць Савецкай улады, і дзейнасць беларускіх нацыянальных арганізацый, і дзейнасць мытні, і г.д.

12 верасня 1918 г. ў Оршы дасягнута пагадненне аб перамяшчэнні савецка-германскай дэмаркацыйнай лініі да ранейшай паўночнай граніцы павета.

У выніку перамогшай у Германіі буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі Савецкі ўрад 13 лістапада анулюваў Брэсцкі мір. 16 лістапада пачалася эвакуацыя нямецкіх войскаў з-пад Оршы.

В.П.Лютынскі.

1917

1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўстанаўленне ўлады Саветаў

У развіцці палітычных падзей у 1917 г. значную ролю адыграла барацьба рэвалюцыйных сіл супраць карнілаўскай контррэвалюцыйнай змовы. Аршанскія рабочыя і салдаты прынялі ў ёй актыўны ўдзел. Пры Аршанскім Савеце было створана спецыяльнае бюро з 10 чалавек для кіраўніцтва дзеяннямі супраць мяцежнікаў. 29 жніўня Савет надрукаваў зварот да ўсіх працоўных горада і салдат гарнізона з патрабаваннем рашуча выступіць супраць контррэвалюцыі. Апорай Савета былі рэвалюцыйна настроеныя салдаты гарнізона і рабочыя чыгуначнага вузла. Яны ўстанавілі кантроль над поштай, тэлеграфам, тэлефонам, і Карнілаў не змог падтрымліваць сувязь з Масквой праз Оршу.

Сход вайсковых камітэтаў часцей гарнізона выбраў камісію па фарміраванні рэвалюцыйнага атрада для барацьбы з мяцежнікамі. Гаворка ішла пра стварэнне буйной баявой групы, здольнай пры неабходнасці процістаяць воінскім часцям, якія Карнілаў пасылаў на Петраград. Гэты атрад быў створаны і налічваў 1000 чалавек пяхоты, 700 кавалерыстаў, 12 кулямётаў, 3 артылерыйскія батарэі і каманду матацыклістаў. На дапамогу аршанцам Віцебскі Савет выдзеліў каля 400 салдат вучэбнай каманды артылерыйскага запаснога дывізіёна, 1000 пехацінцаў з 2 ротамі кулямётчыкаў, якія на чале з членамі Смаленскага камітэта РСДРП(б) 31 жніўня прыбылі ў Оршу са Смаленска. Зводны аршанскі атрад на 1 верасня 1917 г. налічваў звыш 3100 дысцыплінаваных, адданых рэвалюцыі байцоў. Абапіраючыся на гэтыя сілы, Аршанскі Савет устанавіў кантроль за рухам паяздоў на станцыях Шклоў і Літва, затрымліваў эшалоны, якія накіроўвалі мяцежнікі.

У выніку агітацыі аршанскіх бальшавікоў паміж Магілёвам і Оршай быў выгружаны з эшалонаў 22-і армейскі корпус, і мяцежнікі не змаглі яго выкарыстаць. Удзельнікі аршанскага рэвалюцыйнага атрада з 28 жніўня ахоўвалі Оршу заставамі. Матацыклісты вялі разведку на дарогах. Фактычна кантраляваўся рух усіх відаў транспарту ад Магілёва, дзе знаходзілася стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага, да Оршы. Матацыклісты аказвалі дапамогу ў кантролі за шасэйнымі дарогамі.

На аршанскім чыгуначным вузле з дапамогай рэвалюцыйных салдат быў раззброены эшалон цэкінцаў — «дзікая дывізія», якая накіроўвалася на Петраград.

У ходзе барацьбы з карнілаўскім мяцяжом у настроі салдат і працоўных горада адбыўся зрух «улева». 3 верасня на пасяджэнні Аршанскага Савета было выстаўлена патрабаванне суда над Карнілавым і ўдзельнікамі мяцяжу, вызвалення ўсіх зняволеных па справе 3 — 4 ліпеня 1917 г., выказаны пратэст супраць закрыцця бальшавіцкай газеты «Рабо-

чий». Усё часцей беспартыйныя рабочыя падтрымлівалі прапановы бальшавікоў у Савеце. На агульным сходзе Аршанскага Савета 25 верасня 1917 г. па пытанні «Аб палітычным моманце» за рэзалюцыю бальшавікоў было пададзена 24 галасы.

У пач. верасня 1917 г. бальшавіцкая арганізацыя Оршы налічвала 20 членаў. Яна падтрымлівала сувязь з ЦК РСДРП(б) у Петраградзе, атрымлівала з ЦК рэвалюцыйную літаратуру. Рабочыя пад уплывам рэвалюцыйнай прапаганды ўсё часцей выказвалі незадаволенасць палітыкай Часовага ўрада. У верасні аршанскія рабочыя прынялі ўдзел у стачках пратэсту супраць палітыкі Часовага ўрада. Баставалі рабочыя кравецкіх майстэрняў, якія патрабавалі павышэння зарплаты. У канцы верасня колькасць членаў бальшавіцкай арганізацыі ўзрасла да 40 чалавек. У Аршанскім Савеце яна мела 4 дэпутатаў. Напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі большасць рабочых і салдат падтрымлівала патрабаванні бальшавікоў. За два дні да Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Оршы адбыўся мітынг, у якім удзельнічалі 1500 чалавек. На мітынгу выступіў П.М. Лепяшынскі і заклікаў рабочых і салдат да барацьбы за ўладу.

25 кастрычніка 1917 г. тэлеграф прынёс вестку аб звяржэнні Часовага ўрада ў Петраградзе і пераходу ўлады да Саветаў. Увечары 26 кастрычніка ў самым вялікім памяшканні чыгуначнага вузла — эвакапункце — быў скліканы экстранны мітынг рабочых і служачых, на які запрасілі прадстаўнікоў салдат і аховы этапнага каменданта. Прысутнічала звыш 1500 чалавек. Выступілі бальшавікі Лепяшынскі, Дзмітрыеў, Дамарацкі, Волкаў і Самайлюк. Большасцю галасоў пастанавілі: далучыцца да паўстаўшага Петраграда і не прапусціць ні на Петраград, ні на Маскву ні аднаго эшалона контррэвалюцыйных войскаў. Вырашылі тэлеграфаваць аб гэтым рашэнні ў Петраград, Віцебск, Смаленск, Мінск і Магілёў. На мітынгу выбралі камісараў і палітычных кантралёраў па службах: Юркоў — па службе пуці, Самайлюк — па службе руху, Сядых — камісар дэпо, Мельнікаў — камісар станцыі Орша-Таварная, Шыцік — камісар аховы, Сасноўскі — камендант і камісар вузла, Буры — камісар матэрыяльнай службы, Яглейка — камісар тэлеграфа. 30 чалавек выдзелілі ў народную міліцыю па ахове вакзала, будынкаў і тэхнічнай маёмасці, а камісарам народнай міліцыі выбралі Осіпава.

Становішча ў горадзе ў гэты час кантралявалі меншавікі, эсэры, бундаўцы. Камендант горада Шабалін пагражаў рэвалюцыйным элементам арыштамі і ваенна-палявым судом. Са стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілёве генерал казацкай дывізіі Мікалаеў атрымаў загад заняць Аршанскі чыгуначны вузел і навесці там парадак.

26 кастрычніка Аршанскі Савет правёў надзвычайнае пасяджэнне. Бальшавікі пад кіраўніцтвам Дзмітрыева выступілі ў падтрымку рэвалюцыі, а меншавікі і эсэры — супраць. Камендант палкоўнік Шабалін аб'явіў, што паўстанне ў Петраградзе будзе задушана, і пагражаў расправай удзельнікам рэвалюцыйных выступленняў у Оршы. З пагрозамі ў адрас бальшавікоў выступіў і начальнік міліцыі Івенін.

Большасць Аршанскага Савета прыняла 26 кастрычніка рэзалюцыю аб стварэнні контррэвалюцыйнага камітэта выратавання. 27 кастрычніка было склікана экстраннае пасяджэнне гарадской думы з удзелам прадстаўнікоў камандавання казацкай дывізіі і камендатуры горада. Большасцю галасоў гарадская дума прыняла рашэнне заснаваць «Аршанскі камітэт выратавання радзімы і рэвалюцыі» ў складзе прадстаўнікоў камандавання казацкай дывізіі, меншавікоў, эсэраў і бундаўцаў. У выніку П.М. Лепяшынскі заявіў аб зняцці з сябе паўнамоцтваў гарадскога галавы. Па ініцыятыве бальшавікоў 27 — 28 кастрычніка былі праведзены перавыбары Аршанскага Савета. Рабочыя выбіралі ў Аршанскі Савет бальшавікоў і іх прыхільнікаў. 28 кастрычніка адбылося першае пасяджэнне новага Савета. На ім дэпутаты прынялі рашэнне паслаць прывітанне II Усерасійскаму з'езду Саветаў і запэўненне Петраградскаму Савету ў тым, што Аршанскі Савет гатовы са зброяй у руках падтрымаць яго барацьбу і не прапусціць на Петраград і Маскву ні аднаго контррэвалюцыйнага штыка з фронта.

Новы Аршанскі Савет прыняў рашэнне аб роспуску старога выканкома Савета і стварэнні ваенна-рэвалюцыйнага камітэта. Старшынёй ВРК быў выбраны Дзмітрыеў, членамі — Крывашэеў, Гарбачоў, Казійчук, Зюлько, Самайлюк, Яглейка і інш. ВРК скасаваў камітэт выратавання рэвалюцыі, замяніў свайміі каравуламі ахову горада, узяў пад кан-

троль усе важнейшыя ўстановы і аб'екты, выдаў загад, згодна якому ўсе ваенныя і грамадзянскія кіраўнікі павінны былі падпарадкавацца ВРК або здаць свае абавязкі асобам, прызначаным ВРК. Гэты ж загад прадпісваў, што распараджэнні камандавання аб перакідцы войск могуць быць выкананы толькі з дазволу і адабрэння ВРК.

Важным накірункам дзейнасці ВРК быў нагляд за ўсімі прыбываўшымі ў Оршу эшалонамі. Камітэт устанавіў сувязь з усімі часцямі гарнізона і прызначыў у іх сваіх камісараў. 1 лістапада бальшавікі поўнасцю кантралявалі становішча ў горадзе і на чыгуначным вузле. ВРК падтрымалі 623-і пяхотны і Украінскі палкі, частка казакоў Кубанскай дывізіі. Быў сфарміраваны чырвонагвардзейскі атрад з 60 чалавек, які ўзначаліў Дзмітрыеў.

На чыгуначным вузле 26 кастрычніка было створана выканаўчае бюро. Яно кантралявала рух паяздоў, сачыла за тым, каб на Петраград і Маскву не прайшлі эшалоны з контррэвалюцыйнымі войскамі. Кантроль быў устаноўлены і над праходжаннем тэлеграфнай карэспандэнцыі. Пазней рашэннем Аршанскага ВРК выканаўчае бюро на чыгуначным вузле было пераўтворана ў ваенны пункт, быў прызначаны камендант чыгуначнага вузла. У выніку кантролю эшалонаў былі затрыманы часці, якія Стаўка накіравала для падаўлення рэвалюцыі. За некалькі дзён было раззброена звыш 10 ваенных эшалонаў. Дапамогу ў гэтым 300 салдатам этапнага каменданта аказвалі 800 салдат з эшалона ўдарніка Макарэвіча, якія перайшлі на бок ВРК. Рэвалюцыйныя салдаты пад кіраўніцтвам членаў ВРК сустракалі прыбываючыя эшалоны, праводзілі мітынгі, гутаркі с салдатамі. Некаторыя контррэвалюцыйна настроеныя часці вярталі на тупіковыя станцыі, на Мінск, астатніх раззбройвалі.

Прыбыўшы ў Оршу, 623-і пяхотны полк падтрымаў уладу Саветаў і дапамагаў ВРК у ахове горада, што дазволіла паралізаваць дзеянні штаба Кубанскай казацкай дывізіі. Многія радавыя казакі перайшлі на бок ВРК. Палкоўнік Шабалін тэлеграфаваў у Стаўку: «Становішча ў Оршы крытычнае. Ранкам і станцыя Вузлавая, і горад будуць ва ўладзе бальшавікоў. Усім уладам прад'яўлены ультыматумы. Драгуны не прыбылі, процідзейнічаць няма чым. Цэлы пяхотны полк стаіць эшалонам на станцыі, з іх рота ўвечары пайшла ў горад. Каб выратаваць становішча, вышліце да васьмі гадзін 4 браневікі і батарэю». Але бальшавікі ўжо авалодалі становішчам у горадзе.

Рознымі метадамі контррэвалюцыянеры імкнуліся падарваць дысцыпліну і парадак у горадзе: накіроўвалі пад відам гаручага ці фуражу цыстэрны са спіртам, распаўсюджвалі плёткі аб няўстойлівасці Савецкай улады. Таму ВРК устанавіў строгі кантроль за грузамі. Старшыня ВРК Дзмітрыеў успамінаў, што ў сярэдзіне лістапада ў Оршы быў затрыманы транспарт віна з 17 вагонаў са Смаленска, а праз некалькі дзён прыбыў транспарт віна з 22 вагонаў, замаскіраваны пад «сена, селядзец, дровы». Такія саставы адпраўлялі назад, частку грузаў знішчалі.

Калі галоўнакамандуючы генерал Духонін выслаў у Оршу войскі па шасэйных дарогах, група бальшавікоў сустрэла іх і распрапагандавала салдат. З заклікам «Няхай жыве ўлада Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў!» яны прыйшлі ў Оршу.

Аршанскі ВРК прыняў меры па ўстанаўленні ўлады Саветаў ва ўсім павеце і яго населеных пунктах. Ва ўсе 16 валасцей былі пасланы прадстаўнікі ВРК. У сваіх выступленнях на шматлюдных сходах і мітынгах сялян яны растлумачылі значэнне перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі і дэкрэтаў II з'езда Саветаў аб міры і зямлі, заклікалі да іх ажыццяўлення. У адной з адозваў да сялян Аршанскага павета ВРК абяцаў сялянам раздачу памешчыцкіх зямель, а загадам па валасцях забараніў плату за арэнду памешчыцкай зямлі, лугоў.

Па ініцыятыве бальшавікоў 12 лістапада ў Оршы быў скліканы надзвычайны павятовы сялянскі з'езд. На ім прысутнічалі 72 дэлегаты ад 16 валасцей і мястэчак. Большасць з іх былі бальшавікі і левыя эсэры. З'езд прыняў рашэнне прызнаць і падтрымаць новы рабоча-сялянскі ўрад, прызнаць і правесці ў жыццё Дэкрэт аб зямлі. З'езд выбраў часовае бюро па сялянскіх справах Аршанскага ВРК з 9 чалавек, якое працавала пры ВРК на правах аддзела. Старшынёй яго быў выбраны бальшавік Арэшка, сакратаром — бальшавік Шыліханаў. У выніку дзейнасці часовага бюро па сялянскіх справах сяляне Аршанскага павета адышлі ад правых эсэраў і падтрымалі бальшавікоў. 23 снежня 1917 г. з'езд батракоў Аршанскага павета заявіў аб падтрымцы ўлады

Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў і Саўнаркома.

1 студзеня 1918 г. адбыўся павятовы сялянскі з'езд, большасць дэлегатаў якога падтрымала бальшавікоў. З'езд вырашыў арганізаваць баявыя сялянскія дружыны для падтрымкі ўлады Саветаў у валасцях. Былі праведзены перавыбары павятовага выканкома Савета сялянскіх дэпутатаў: з'езд пастанавіў перадаць яго правы часоваму бюро пры ВРК. Неўзабаве эсэраўскі выканком спыніў сваю дзейнасць. Затым быў створаны аб'яднаны павятовы Савет рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў. Такім чынам, на Аршаншчыне была створана адзіная сістэма органаў Савецкай улады з адзіным кіруючым цэнтрам — павятовым Саветам рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. *Л.В. Яршова.*

Аршаншчына ў 1918 — 1920 гг.

Галоўная роля ў арганізацыі Савецкай улады на Аршаншчыне належыць Ваенна-рэвалюцыйнаму камітэту і перавыбранаму пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Аршанскаму Савету рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Прыхільна аднеслася да Савецкай улады і большасць сялянства.

Першым суровым выпрабаваннем для новай улады стаў мяцеж польскага корпуса пад камандаваннем генерал-лейтэнанта Ю.Р. Доўбар-Мусніцкага. Сфарміраваны яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі корпус размяшчаўся ў раёне Віцебска — Мінска — Жлобіна. Першапачаткова Доўбар-Мусніцкі заявіў аб сваім нейтралітэце да Савецкай улады. Аднак у лістападзе-снежні польскія легіянеры неаднаразова праводзілі акцыі, скіраваныя супраць мясцовых органаў Савецкай улады, рабавалі і збівалі сялян, учынялі яўрэйскія пагромы. 12 студзеня 1918 г. Доўбар-Мусніцкі афіцыйна аб'явіў вайну Савецкай Расіі, разлічваючы ў выніку перамогі ліквідаваць Савецкую ўладу на Беларусі і далучыць Мінскую і Магілёўскую губерні да Польшчы.

Контррэвалюцыйны мяцеж польскага корпуса выклікаў усеагульнае абурэнне працоўных Беларусі. Актыўнае супраціўленне мяцежнікам аказалі жыхары Аршаншчыны. У тэлеграме, накіраванай Магілёўскім губрэўкомам, адзначалася: «З боку Віцебска рухаюцца на Оршу і Смаленск паўстаўшыя супраць рэвалюцыі польскія легіянеры Доўбар-Мусніцкага. Прапануецца арганізаваць узброеную сілу, рухацца насустрач легіянерам, разграміць іх, перашкодзіць рух у глыб краіны». Чацвёрты Магілёўскі губернскі з'езд саветаў прыняў рашэнне аб неадкладным узбраенні сялян для абароны Савецкай улады. Аднымі з першых на барацьбу з польскімі легіянерамі падняліся працоўныя Оршы і сяляне навакольных вёсак. За кароткі тэрмін з рабочых горада і сялян вёсак Кудаева, Міцькаўшчына, Салаўёва, Якубава і інш. у в. Берасценава былі сфарміраваны першыя чырвонагвардзейскія атрады — пяхотны колькасцю каля 700 чалавек і конны, які налічваў 400 вершнікаў. Для ўзбраення атрадаў, якія надалей будуць названы Другім Аршанскім атрадам Чырвонай гвардыі, былі атрыманы вінтоўкі і кулямёты з ваенных складаў, размешчаных у Оршы. На чале атрада стаяў старшыня Берасценаўскага Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў бальшавік Б.М. Зысман.

Атрад пачаў рух у бок завода Выдрыца і вёскі Арахі. У выніку рашучых дзеянняў чырвонагвардзейцаў асноўныя сілы палякаў, размешчаныя ў мястэчках Бабінавічы і Дабрамысль, былі разбіты, у палон трапілі сотні салдат і афіцэраў, было захоплена шмат амуніцыі і зброі. Контррэвалюцыйнае выступленне польскага корпуса на Аршаншчыне было ліквідавана.

У канцы 1917 — пачатку 1918 г. працягваўся працэс станаўлення органаў Савецкай улады, ажыццяўленне сацыяльна-эканамічных і культурных пераўтварэнняў. У снежні 1917 г. ў горадзе адбылася рабочая канферэнцыя, на якой абмяркоўвалася пытанне аб увядзенні кантролю над прамысловасцю і аб узбраенні рабочых. На ёй прысутнічала 50 прадстаўнікоў ад 14 прадпрыемстваў. У вёсках пачалося ажыццяўленне Дэкрэта аб зямлі. У студзені 1918 г. ў Оршы былі праведзены сялянскі і батрацкі павятовыя з'езды. На сялянскім з'ездзе было вырашана арганізаваць пры валасцях чырвоныя дружыны. Бат-

рацкі з'езд вырашаў пытанні арганізацыі батракоў.

30 снежня 1917 г. ў Оршы быў праведзены 1-ы павятовы з'езд Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Пры Аршанскім Савеце ў той час меліся дзесяць аддзелаў: ваенны, фінансаў, харчавання, кватэрны, народнай адукацыі, аховы, культурна-асветніцкі, рабочая секцыя, сялянскае бюро і камісія па нацыяналізацыі банкаў. Павятовая земская ўправа і валасныя земскія ўправы былі распушчаны. Прадуктовая ўправа была падпарадкавана Савету. Працягвала сваё самастойнае існаванне гарадская дума, але было вырашана перавыбраць яе на прынцыпах падпарадкавання Савету. Літаральна праз месяц яна была распушчана.

Новая пагроза навісла над Савецкай Расіяй у лютым 1918 г. 18 лютага аднавіла ваенныя дзеянні кайзераўская Германія. Яна мела намер не толькі ліквідаваць Савецкую ўладу, але і далучыць да Германіі тэрыторыі Украіны, Беларусі і Прыбалтыкі. Для барацьбы з агрэсарам пачалося стварэнне Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Паспяхова праходзіў запіс добраахвотнікаў у Оршы. Была сфарміравана першая рота Чырвонай Арміі Оршы. За кароткі тэрмін на Усход было эвакуіравана каля 6 тыс. вагонаў з абсталяваннем, боепрыпасамі і харчаваннем.

Да пачатку сакавіка 1918 г. савецкія войскі спынілі наступленне германскай арміі на лініі Орша — Магілёў — Гомель. 3 сакавіка Савецкі ўрад быў вымушаны пайсці на падпісанне з Германіяй ганебнага Брэсцкага міру. Згодна з ім пад нямецкай акупацыяй апынулася большая частка тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і заходняя частка Аршанскага павета. 6 сакавіка немцы занялі станцыю Орша-Таварная Рыга-Арлоўскай чыгункі. Орша-Цэнтральная засталася за Чырвонай Арміяй. Горад быў падзелены дэмаркацыйнай лініяй на 2 часткі. Для аховы заходніх граніц і спынення спроб далейшага наступлення Вышэйшы ваенны савет рэспублікі 29 сакавіка ўтварыў Заходні ўчастак атраду заслоны, у склад якога ўваходзіў і Аршанскі атрад.

З вясны па восень 1918 г. Орша была пагранічным горадам. Нягледзячы на складаную палітычную абстаноўку ў краіне, ваеннае супрацьстаянне Германіі, на Аршаншчыне працягваліся мерапрыемствы па ўмацаванні Савецкай улады. Галоўную ролю ў гэтым адыгрывалі бальшавікі. Іх партячэйкі ўзнікалі не толькі ў горадзе, на прамысловых прадпрыемствах, але і ў вёсках Аршаншчыны. Да канца сакавіка ў павеце налічвалася 125 членаў бальшавіцкай партыі.

З устанаўленнем нямецкай акупацыі ў частцы Аршанскага павета камітэт РКП(б) арганізаваў нелегальную рэвалюцыйную работу сярод насельніцтва акупіраванай тэрыторыі, выдаваў лістоўкі і іншую літаратуру. Бальшавікі праводзілі растлумачальную работу і сярод нямецкіх войск.

Пасля заключэння Брэсцкага мірнага дагавору на радзіму вярталіся тысячы рускіх ваеннапалонных. Сярод іх было шмат хворых, пакалечаных. У ліпені дзякуючы камісару станцыі Орша Д.Е. Івашчанку праз горад быў прапушчаны эшалон з 36 вагонамі хлеба, накіраваны Савецкім урадам рускім ваеннапалонным у Германію. 4 ліпеня Івашчанка атрымаў падзячную тэлеграму ад кіраўніка Савецкага ўрада У.І. Леніна.

На акупіраванай тэрыторыі Аршаншчыны былі адменены дэкрэты Савецкай улады, аднаўлялася памешчыцкая ўласнасць на зямлю. Германскія акупанты бессаромна рабавалі мясцовае насельніцтва, вывозілі хлеб, жывёлу, абсталяванне прамысловых прадпрыемстваў і сыравіну. Пры малейшым супраціўленні нямецкім уладам сялян збівалі. Акупанты спалілі в. Навасёлкі Аршанскага павета, а многіх яе жыхароў расстралялі.

На неакупіраванай тэрыторыі пачаўся працэс аднаўлення разбуранай гаспадаркі. Наладжваўся гандаль. У маі 1918 г. ў Оршы быў створаны цэнтральны рабочы кааператы.

Значныя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні адбываліся на вёсцы. Вясной 1918 г. ў неакупіраванай частцы Аршанскага павета ажывілася выкананне Дэкрэта аб зямлі. Галоўную ролю ў гэтым адыгрывалі створаныя па дэкрэту ВЦВК і СНК РСФСР камітэты вясковай беднаты (камбеды). Аб'яднаўшы бяднейшае сялянства, якое складала большую частку вясковага насельніцтва, яны выконвалі размеркавальныя функцыі, займаліся зборам харчавання для Чырвонай Арміі, барацьбой са спекуляцыяй і г.д. Па ўсім павеце да лістапада было арганізавана больш за 600 камбедаў.

Напачатку 1919 г. камбеды, выканаўшы ў асноўным пастаўленыя перад імі палітычныя і сацыяльна-эканамічныя задачы, зліліся з

валаснымі і пасялковымі Саветамі, якія да гэтага часу ў выніку перавыбараў сталі бальшавіцкімі.

Вострая палітычная барацьба ўспыхнула ў Оршы ў пачатку жніўня 1918 г. Выканком Аршанскага Савета, большасць у якім складалі левыя эсэры, не асудзіў леваэсэраўскі мяцеж у Маскве, скіраваны супраць Брэсцкага міру, стварэння камбедаў і харчразвёрсткі. Выключаныя са складу выканкома Савета левыя эсэры на чале са сваім лідэрам І.І. Буевічам падрыхтавалі выступленне супраць бальшавіцкай улады. Асноўную яго сілу складалі вайсковыя часці Аршанскага гарнізона. 6 жніўня быў створаны апазіцыйны Савецкай уладзе часовы ваенна-рэвалюцыйны камітэт, якому належала ўся паўната ўлады «да ўсталявання фармальнага правапарадку і дэмакратычнага ўраду». У яго склад увайшлі І.І. Буевіч (старшыня), І. Петражыцкі, Беленькі і інш. Гарнізонны сход даручыў рэўкому арганізаваць абарону Оршы ад бальшавікоў. Але сілы былі няроўнымі. Для падаўлення аршанскага мяцяжу былі тэрмінова накіраваны часці Чырвонай Арміі з Віцебска і Смаленска. Мяцежнікі амаль не аказалі супраціўлення. 10 жніўня газета «Звязда» ў артыкуле «Оршанская глупость» заклікала: «А чтобы другим больше не повадно было, всех зачинщиков и участников оршанских сценок следует покарать по строгости военного суда. Никакой пощады и никаких отговорок! Пусть каждый знает, что поднявший против Советов меч — от меча же погибнет сам». Цікава, што ў жніўні 1919 г. кіраўнік мяцяжу І.І. Буевіч будзе судом апраўданы, а потым зойме адказныя пасады на савецкай і гаспадарчай рабоце.

12 верасня 1918 г. ў Оршы было дасягнута пагадненне паміж Савецкай Расіяй і Германіяй аб перамяшчэнні дэмаркацыйнай лініі да ранейшай паўночнай граніцы павета. А ў выніку прайшоўшай у Германіі буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі Савецкі ўрад 13 лістапада анулюваў Брэсцкі дагавор. Пачалася эвакуацыя нямецкіх войск з заходняй часткі Оршы і з тэрыторыі павета. У хуткім часе Савецкая ўлада была адноўлена. У справаздачы Аршанскага павятовага выканкома (снежань 1918 г.) зазначалася: «Самай важнай з'явай за справаздачны перыяд у Аршанскім павеце было аднаўленне Савецкай улады у 5 валасцях (Баранскай, Коханаўскай, Старасельскай, Смалянскай і Стара-Талачынскай), якія былі пад акупацыяй Германіі. Гэтыя воласці былі пакінуты германцамі... Паўсюль былі арганізаваны Ваенна-рэвалюцыйныя камітэты, якія бліскуча выканалі свае задачы. Арганізацыя гэтых валасцей прайшла вельмі хутка, бо настрой у іх быў суцэльна на карысць Савецкай улады».

Актыўнымі правадзнікамі мерапрыемстваў новай улады былі партыйныя арганізацыі бальшавікоў. Па рашэнні партыйнай канферэнцыі Заходняй вобласці ў кастрычніку 1918 г. быў створаны Аршанскі раённы камітэт РКП(б). Аршанская гарадская партыйная арганізацыя аб'ядноўвала 160 членаў партыі і 60 спачуваючых. Пад уплывам Аршанскага камітэта РКП(б) быў зменены склад праўленняў большасці прафесійных саюзаў. Актыўны ўдзел прымалі бальшавікі і ў дзейнасці рабочага кантролю. Значную ўвагу яны ўдзялялі агітацыйнай і прапагандысцкай рабоце сярод насельніцтва Аршаншчыны. Правадніком ідэй Савецкай улады і бальшавіцкай партыі была газета «Набат». Такую назву атрымала мясцовая газета «Известия Совета рабочих, крестьянских, батрацких и красноармейских депутатов Оршанского уезда», якая выдавалася з сакавіка 1918 г. Рэдактарам газеты «Набат» стаў ураджэнец Аршанскага павета бальшавік І.А. Казлоўскі, больш вядомы потым як паэт-байкапісец Іван Батрак.

17 студзеня 1919 г. ў Оршы адбылася 1-я павятовая канферэнцыя РКП(б), на якой прысутнічалі 26 дэлегатаў ад 3 арганізацый і 17 ячэек, якія аб'ядноўвалі 595 членаў партыі і спачуваючых. Па рашэнні канферэнцыі быў створаны Аршанскі павятовы камітэт РКП(б), старшынёй якога быў абраны І.А. Казлоўскі. У сакавіку 1919 г. павятовая партыйная арганізацыя складалася з 775 чалавек. У выніку прайшоўшага ў канцы кастрычніка — пачатку лістапада партыйнага тыдня ў партыю ўступілі 361 чалавек. Колькасны рост партыйных радоў у цяжкія гады грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі сведчыў пра вялікі аўтарытэт Камуністычнай партыі сярод працоўных Аршаншчыны, пра цесныя сувязі мясцовых партарганізацый з насельніцтвам.

Сярод іншых палітычных партый, якія працягвалі існаванне ў першыя гады Савецкай улады, трэба назваць Аршанскі сацыял-дэмакратычны камітэт Бунда, большасць чле-

наў якога ў далейшым уступіла ў РКП(б), і Аршанскі саюз эсэраў-максімалістаў, які ўзнік восенню 1918 г. пасля ліквідацыі Аршанскага леваэсэраўскага мяцяжу. Выражаўшыя ў асноўным інтарэсы сельскага насельніцтва, эсэры-максімалісты крытыкавалі палітыку бальшавікоў адносна сялянства.

6 красавіка 1919 г. пад уплывам павятовага камітэта РКП(б) прайшлі выбары дэлегатаў на павятовы з'езд Саветаў. Большасць дэлегатаў з'езда складалі камуністы, якія сфарміравалі новы склад выканкома.

У 1918 — 1920 гг. неаднаразова мянялася адміністрацыйна-тэрытарыяльная прыналежнасць Аршанскага павета. 7 лістапада 1917 г. Орша і павет, знаходзячыся ў складзе Магілёўскай губерні, уваходзяць у Заходнюю вобласць. З 13 верасня 1918 г. яна была перайменавана ў Заходнюю камуну. З 1 студзеня па 2 лютага 1919 г. Аршаншчына ў складзе Магілёўскай губерні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. У сувязі са стварэннем Літоўска-Беларускай ССР Магілёўская губерня адыходзіць да РСФСР. 26 красавіка 1919 г. Магілёўская губерня была ліквідавана. Аршанскі павет уваходзіць у Гомельскую губерню РСФСР, а з 18 лістапада 1920 г. пераводзіцца ў склад Віцебскай губерні РСФСР.

Барацьба з унутранай і знешняй контррэвалюцыяй патрабавала напружання ўсіх сіл Савецкай краіны. З пачатку верасня 1918 г. рэспубліка была абвешчана ваенным лагерам. У 1918 — 1919 гг. праводзіліся надзвычайныя палітычныя і сацыяльна-эканамічныя мерапрыемствы, атрымаўшыя назву палітыкі «ваеннага камунізму». На Аршаншчыне праводзілася нацыяналізацыя буйной і сярэдняй прамысловасці. Так, напрыклад, у кастрычніку 1918 г. быў абвешчаны ўласнасцю дзяржавы Баранскі драцяна-цвікавы завод. У лютым—кастрычніку 1919 г. ў Оршы былі нацыяналізаваны піваварны завод, друкарня і іншыя прыватныя прадпрыемствы.

Да канца 1918 г. на поўную магутнасць запрацавала чыгуначная станцыя. Для забеспячэння чыгуначнікаў харчовымі таварамі ў дэпо была створана спажывецкая кааперацыя транспартнікаў. Яна займалася пытаннямі падсобнай гаспадаркі, што з'явілася ў чыгуначнікаў. Для ліквідацыі цяжкасцей з хлебам у дэпо быў пабудаваны свой млын. Ні на адзін дзень не спыняўся бесперабойны рух грузаў па аршанскай чыгунцы.

Надзвычай цяжкім заставалася матэрыяльнае становішча працоўных. Не хапала прадметаў першай неабходнасці: солі, газы, мануфактуры. Эканамічныя цяжкасці, палітычная нестабільнасць спрыялі развіццю спекуляцыі, росту злачыннасці, бандытызму. Для барацьбы з імі ў Оршы былі створаны часці асобага прызначэння (ЧОН). Уся гарадская партыйная арганізацыя бальшавікоў у 1918 г. была ваенізавана і ўяўляла сабой, па ўспамінах сучаснікаў, узброены атрад ЧОН.

Першыя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні адбываліся ў надзвычай складаны час. Савецкая краіна знаходзілася ў акружэнні варожых дзяржаў. Палыхала грамадзянская вайна. Орша, з'яўляючыся буйным чыгуначным вузлом, мела значнае стратэгічнае становішча. Гэта добра разумелі і кіраўнікі Савецкай Расіі. Так, у чэрвені 1919 г. Оршу наведаў старшыня ВЦВК М. І. Калінін. Ён выступіў перад працоўнымі горада, ахарактарызаваў унутранае і знешняе становішча краіны, растлумачыў палітыку Камуністычнай партыі. Выступіў Калінін і на сялянскім сходзе ў в. Машкова. Пад адкрытым небам сабралася больш за 300 чалавек. Сяляне, прыйшоўшыя з навакольных вёсак на сустрэчу з «усерасійскім старастам», скардзіліся на недахоп сельскагаспадарчага інвентару, насення, цяжкасці харчразвёрсткі. Калінін рэкамендаваў сялянам аб'ядноўвацца ў сельскагаспадарчыя арцелі, рашуча змагацца з кулацтвам.

Сотні аршанцаў абаранялі заваёвы Кастрычніка на франтах грамадзянскай вайны. Так, 20 красавіка 1919 г. Аршанскі камітэт РКП(б) пастанавіў мабілізаваць на Усходні фронт 10 працэнтаў камуністаў, а 25 красавіка было мабілізавана яшчэ 50 працэнтаў камуністаў. Сваіх членаў накіроўвала на фронт і створаная ў кастрычніку 1918 г. гарадская камсамольская арганізацыя. Змагаліся з ворагамі Савецкай улады і прадстаўнікі іншых левых партый Аршаншчыны. У красавіку 1919 г. правялі мабілізацыю ў Чырвоную Армію бундаўцы Оршы. У лістападзе на франты грамадзянскай вайны былі мабілізаваны амаль усе члены Аршанскага саюза эсэраў-максімалістаў.

У верасні 1919 г. ў Оршы было ўведзена ваеннае становішча, былі створаны надзвы-

Мітынг рабочых і чырвонаармейцаў на ст. Орша ў час адпраўкі на Заходні фронт. 1919 г.

чайныя органы ўлады — павятовы і чыгуначныя рэўкомы. Усё жыццё горада было перабудавана на ваенны лад. Працоўныя Аршаншчыны дапамагалі фронту харчаваннем, адзеннем. З вялікім патрыятычным уздымам праходзілі «тыдзень дапамогі фронту», «тыдзень чырвонага падарунка». «тыдзень дапамогі хвораму і параненаму чырвонаармейцу».

Важнае значэнне набылі ў той час камуністычныя суботнікі. Першы ў Оршы суботнік, у якім прынялі ўдзел 80 чалавек, адбыўся на чыгуначным вузле 27 верасня 1919 г. Газета «Набат» з гэтай нагоды пісала: «Праца прайшла вельмі ажыўлена. Першы суботнік быў святам камуністычнай працы, і ўсе даныя гавораць аб тым, што гэты пачын заваюе сабе будучыню» (1 кастрычніка 1919 г.). Так, ужо ў другім камуністычным суботніку, які адбыўся 6 снежня, бралі ўдзел 96 чалавек, большасць з якіх былі беспартыйнымі. Масавыя суботнікі, на якіх працавалі тысячы рабочых і служачых, праходзілі ў Оршы ў 1920 г.

Нягледзячы на складанае становішча ў першыя паслярэвалюцыйныя гады, на Аршаншчыне вялося культурнае будаўніцтва: адкрываліся школы, хаты-чытальні, клубы. 10 лютага 1919 г. ў Оршы быў адкрыты Пралетарскі універсітэт — папярэднік Аршанскага рабфака. Недахоп настаўніцкіх кадраў прымусіў адкрыць у Оршы 10-месячныя педагагічныя курсы.

У былых памешчыцкіх сядзібах адкрываліся бібліятэкі, дзіцячыя дамы. Так, напрыклад, у в. Гарадня, у былым памешчыцкім доме спачатку была адкрыта школа, куды аршанскія чыгуначнікі прывозілі дзяцей з горада на асобным цягніку. Пазней тут пачаў працаваць дзіцячы дом, дзе знайшлі сабе прытулак сотні дзяцей, згубіўшых бацькоў у гады грамадзянскай вайны.

Рэвалюцыя, грамадзянская вайна і ваенная інтэрвенцыя нанеслі вялікія матэрыяльныя і маральныя страты грамадству. Але нарэшце наступіў доўгачаканы мірны час, які даў магчымасць узяцца за будаўніцтва новага жыцця.

В.П. Лютынскі.

Аршанскі павятовы рэвалюцыйны камітэт

Часовы рэвалюцыйны орган па ўстанаўленню Савецкай улады і барацьбе з контррэвалюцыяй на тэрыторыі Аршанскага павета ў 1919 – 20 гг. Дзейнічаў з 26.10.1919 г. да лета 1920 г. Створаны паводле пастановы Аршанскага павятовага выканкома Савета ў складзе Жалезнякова (старшыня), Масюты (сакратар), М.С.Ігнацева, Шыліханава. Павятовы выканком часова быў распушчаны, уся грамадзянская і ваенная ўлада перайшла да рэўкома. На тэрыторыі павета было абвешчана ваеннае становішча. Ваколіцы Оршы ў радыусе 25 вёрст аб'яўляліся ў стане аблогі. Грамадзянскія і ваенныя ўстановы павінны былі выконваць усе загады і распараджэнні рэўкома. У адрозненне ад многіх іншых гарадоў у Оршы працягваў дзейнічаць гарадскі Савет, праходзілі павятовыя з'езды Саветаў.

М.С.Ігнацеў.

Пры неабходнасці рэўком умешваўся ў дзейнасць дзяржаўных, ваенных і гаспадарчых органаў, грамадскіх арганізацый, распускаў сходы апазіцыйнага характару. Разам з надзвычайнай камісіяй арыштоўваў прадстаўнікоў апазіцыйных сіл, правёў рэгістрацыю асоб польскай нацыянальнасці і г.д.

Дакументы сведчаць

СПРАВАЗДАЧА КАНФЕРЭНЦЫІ РАБОЧЫХ АРШАНСКАГА ПАВЕТА

6 снежня 1917 г.

Конференция состоялась 6 декабря в ВРК, было 50 представителей от 14 предприятий, насчитывающих около 2500 рабочих.

Порядок дня: 1. Выбор постоянной рабочей комиссии. 2. Рабочий контроль. 3. О вооружении рабочих. 4. Текущие дела.

По первому вопросу докладывал Хургин, который говорил, что постоянная рабочая комиссия должна решать все дела и защищать интересы рабочих, а также о необходимости рабочего контроля. Конференция приняла резолюцию о рабочем контроле. Органами его являлись фабрично-заводские комитеты или выборные контрольные комиссии. Они производят учет всех материалов, сырья, топлива, полуфабрикатов, всего инвентаря, свободных сумм, основного и оборотного капиталов, валовой и чистой прибыли и т.д., регулируют производство, прием и увольнение рабочих.

По третьему вопросу конференция высказалась за организацию рабочих дружин на фабриках и заводах под руководством фабзавкомов. Была выбрана постоянная рабочая комиссия из 6 человек: Буевич, Гребеж, Бушинский, Курик, Чурилло и один от текстильной мануфактуры.

Оршанский вестник. 1917. 9 декабря.

ПРАТАКОЛ ПАСЯДЖЭННЯ СЯЛЯНСКАГА З'ЕЗДУ АРШАНСКАГА ПАВЕТА МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ

1 студзеня 1918 года

Парадак дня:
1. Арганізацыя па валасцях валасных сялянскіх Саветаў і баявых сялянскіх дружын.
2. Выбары 1 члена ў бюро па сялянскіх справах.
3. Перавыбары Савета сялянскіх дэпутатаў.
4. Адносіны да Беларускай рады.

Пастанавілі:

Па 1-му пытанню. Для абароны інтарэсаў працоўнага народа, а таксама спынення грабяжоў і самавольных дзеянняў з боку цёмных асоб арганізаваць па валасцях валасныя сялянскія Саветы, якія і будуць ведаць справамі сялян. Так як заваёвы працоўнага народа павінны быць непахіснымі — арганізаваць пры валасных Саветах баявыя сялянскія дружыны для падтрымання народнай улады — Саветаў. Саветы валасныя выконваюць распараджэнні толькі павятовага бюро па сялянскіх справах, якое і прызнаецца сялянскім павятовым Саветам. Валасныя баявыя дружыны будуць абараняць заваёвы народа супраць усіх контррэвалюцыйных выступленняў, ад каго б такія ні зыходзілі. У баявую сялянскую дружыну ўваходзяць толькі тыя асобы, за якіх ручаецца сялянскі Савет, якому і падпарадкавана арганізацыя.

... Па 3-му пытанню. Ранейшы Савет сялянскіх дэпутатаў, як нявыканаўшы волю сялянства, прызнаны (аднагалосна) з'ездам неправамоцным у поўным саставе. Узамен ранейшага Савета сялянскіх дэпутатаў прымаецца бюро па сялянскіх справах пры Аршанскім Ваенна-рэвалюцыйным камітэце ў саставе старшыні тав. Арэшкава, сакратара Шыліханава, членаў:...

Па 4-му пытанню:

1) Прымаючы пад увагу, што сепаратысцкі рух, узняты беларускай буржуазіяй, накіраваны да таго, каб раздрабніць рэвалюцыйныя сілы пралетарыяту і бяднейшага сялянства Расіі і такім чынам нанесці ўдар рэвалюцыі;

2) прымаючы пад увагу, што ў выпадку аддзялення Беларусі ад астатняй Расіі дэкрэты аб бясплатным пераходзе памешчыцкай зямлі ў рукі сялян, аб кантролі над вытворчасцю і да т. п., выдадзеныя цэнтральным Саветам Народных Камісараў, акажуцца для Беларусі несапраўднымі;

3) прымаючы пад увагу выцякаючыя адсюль вынікі, якія пагражаюць кабалой беларускаму пралетарыяту і бяднейшаму сялянству, на плечы якіх ляжа ўвесь цяжар барацьбы з беларускай буржуазіяй, сялянскі з'езд Аршанскага павета пастанаўляе:

усякія спробы аб аддзяленні Беларусі ад астатняй Расіі ў момант сацыяльнай рэвалюцыі лічыць контррэвалюцыйнымі і абвясціць самую рашучую, самую бязлітасную барацьбу беларускай буржуазіі і яе радзе, прызнаць і падтрымаць усімі мерамі на месцах і ў цэнтры толькі ўладу Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, як адзіных выразнікаў волі большасці насельніцтва.

Старшыня Арэшкаў.

Сакратар Шыліханаў.

Оршанский вестник. 1918. 1 июля.

ПІСЬМО СТАРШЫНІ СЯЛЯНСКАГА БЮРО ПРЫ КАМІТЭЦЕ РСДРП(Б) г. ОРШЫ Ў ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ ПАРТЫІ АБ МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПА ЎМАЦАВАННІ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ

Партыйная работа ідзе ў нас у апошні час некалькі слабей, таму што амаль усе члены партыі аддалі сябе рабоце ў Ваенна-рэвалюцыйным камітэце.

Работы многа, а людзей параўнаўча мала. Ваенна-рэвалюцыйны камітэт на месцы арганізуе новую ўладу, паступова выціскаючы ўсе старыя ўстановы. Пры ім арганізавана бюро па сялянскіх справах, выбранае надзвычайным сялянскім з'ездам. Гэта апошняе карыстаецца сярод сялян і батракоў вялікім даверам: без яго дазволу ні адзін пуд збожжа не вывозіцца з вёскі, па ўсіх справах сяляне звяртаюцца да яго; усе маёнткі бяруцца на ўлік і іх вопісы дастаўляюцца яму. Гэта бюро звяло амаль зусім на шчэнт выканаўчы камітэт сялянскіх дэпутатаў, у якім гаспадараць «чарноўцы». Днямі склікаецца II сялянскі з'езд з той мэтай, каб узяць харчовую справу ў свае рукі.

Уся ваенная справа перайшла ў рукі ваеннага аддзела, выбранага гарнізонным сходам.

Каб правесці дэкрэт аб кантролі, а таксама і ўзбраенне рабочых, была склікана рабочая канферэнцыя з прадстаўнікоў фабрык і заводаў усяго Аршанскага раёна. На канферэнцыі прысутнічала 50 прадстаўнікоў ад 14 прадпрыемстваў з 2500 чал.; былі вынесены рэзалюцыі і выбрана рабочая камісія.

З мэтай арганізацыі батракоў на 19-е склікаецца батрацкі з'езд.

Астатнія аддзелы не ўпаўне яшчэ арганізаваны, але ў нас ужо намячаецца вылучэнне рэвалюцыйнага трыбунала са следчай камісіяй, таксама з фінансава-гаспадарчым аддзелам.

Масы на месцах прыступаюць да творчай работы. Аграрны рух пачынае прымаць арганізаваныя формы. У вёсках арганізуюцца сельскія рэвалюцыйныя камітэты, а таксама шырока і самастойна разрастаюцца партыйныя ячэйкі. Рабочыя дзе-небудзь не зусім умела, а дзе-небудзь больш умела прыступаюць да кантролю і месцамі нават да сацыялізацыі.

У нас яшчэ прадстаіць значная работа да ўладжвання адносін паміж сялянамі і батракамі, так як часам паміж імі адчуваецца некаторае разыходжанне. Тут-та на практыцы адчуваецца, што эсэраўская «сацыялізацыя» непрыгодна і абгрунтоўваецца на дарэвалюцыйных забабонах.

Каласальную работу давялося выконваць Ваенна-рэвалюцыйнаму камітэту ў барацьбе з ваеннымі эксцэсамі. На мясцовым вінным складзе пачаўся, пад уплывам цёмных сіл, разгром салдатамі і сялянамі. З найвялікшай цяжкасцю пры яўна варожым настроі з боку граміл удалося ўвесь спірт (8000 вёдзер) выпусціць у раку. Якаясьці цёмная рука са Смаленска з 401 вярсты на Аляксандраўскай чыгунцы накіроўвала на Мінск і на Гомель вагоны з віном. Днямі мы знішчылі 16 вагонаў. У павеце прыходзіцца весці ўпартую барацьбу з марадзёрнічаючымі бандытамі з салдат Самакатнага батальёна і польскіх легіёнаў. Учора была захоплена банда з 50 самакатчыкаў з кулямётамі, прычым 1 забіты і 2 ранена.

Стыхія, бурлівая хваля, вялізная, часта праз галаву перавальвае: здаецца вось-вось утопішся, але мы плывем, хваля ўсё вышэй узнімаецца, гарызонт у нас абшырны, работы многа цікавай, творчай. Толькі б утрымаць яе.

Старшыня бюро пры камітэце РСДРП (бальшавікоў) у гор. Оршы Л. Хургін.

Правда. 1918. 3 января.

АБ'ЯВА ВЫКАНКОМА АРШАНСКАГА САВЕТА АБ АРГАНІЗАЦЫІ АТРАДА ЧЫРВОНАЙ ГВАРДЫІ Ў ОРШЫ

Пры камісару ўнутраных спраў Аршанскага выканаўчага камітэта Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў арганізуецца атрад Чырвонай гвардыі, мэтай якога з'яўляецца барацьба з контррэвалюцыяй, пагромамі, хуліганствам і грабяжамі.

Членамі ў атрад могуць быць прыняты асобы, якія маюць рэкамендацыі ад сацыялістычных партый левага цячэння, рабочых прафесіянальных саюзаў і асобных членаў партый.

Запіс членаў адкрываецца з 8 гэтага студзеня ў памяшканні выканаўчага камітэта (памяшканне былога клуба) з 10 да 12 гадзін дня.

Камісар унутраных спраў Індулен.

Кіраўнік спраў Казійчук.

Оршанский вестник. 1918. 9 января.

РЭЗАЛЮЦЫЯ АГУЛЬНАГА СХОДУ ХІМСКАГА СЕЛЬСКАГА ТАВАРЫСТВА АРШАНСКАГА ПАВЕТА МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ АБ АДАБРЭННІ РОСПУСКУ УСТАНОЎЧАГА СХОДУ І АБАРОНЕ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ

11 студзеня 1918 г.

1) Устаноўчы сход, як не прызнаўшы Дэкларацыі правоў працоўных мас і Савецкай улады, як адзінага выразніка волі большасці працоўных, лічым такі Устаноўчы сход (большасць яго) чыста буржуазным, якому дазваляем збірацца толькі ў Петрапаўлаўскай крэпасці.

2) Уся ўлада павінна належаць толькі Саветам салдацкіх, рабочых і сялянскіх дэпутатаў у асобе народных камісараў. І толькі такую ўладу лічым сапраўднай уладай сялян і рабочых, якую і будзем падтрымліваць.

3) Патрабуем усеагульнага ўзбраення сялян і рабочых і поўнага раззбраення буржуазіі.

4) Патрабуем бязлітаснай барацьбы з усякім непрызнаннем Савецкай улады аж да ўжыцця сілы зброі.

5) Усякае непрызнанне Савецкай улады будзе разглядацца як контррэвалюцыя. І літасці ім быць не можа.

Далоў гвалтаўнікоў, далоў буржуазны Устаноўчы сход, далоў буржуазію, капіталістаў і сабатажнікаў!

Няхай жыве Савецкая ўлада сялян і рабочых!

Няхай жыве Савет Народных Камісараў!

Няхай жыве дэмакратычны народны мір!
Старшыня сходу Е. Кажашэчка.
Сакратар С. Захарэнка.
Члены: Е. Ганчароў, Н. Хнякоў, П. Нікаеў, Н. Ганчароў, П. Хачкоў.

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі, ф. 393, воп. 3, спр. 212, стар. 204.

Рэзалюцыя сходу Аршанскага павятовага зямельнага камітэта Магілёўскай губерні аб адабрэнні роспуску Устаноўчага сходу, правядзення ў жыццё дэкрэтаў Савецкай улады і барацьбе з контррэвалюцыяй

12 студзеня 1918 г.

Заслухаўшы даклад прадстаўніка Усерасійскага Выканаўчага Камітэта Савета сялянскіх дэпутатаў тав. Маісеева, сход адзінагалосна пастанавіў:

1. Дзеянне Савецкай улады аб роспуску Устаноўчага сходу лічыць правільным, і ўсякі замах на Савецкую ўладу і на распараджэнні народных камісараў будзе разглядацца як контррэвалюцыя, і літасці ім быць не можа.

2. Патрабуем бязлітаснай барацьбы аж да ўжывання сілы зброі з усякім непрызнаннем Савецкай улады, якая з'яўляецца ў гэты час адзіным выразнікам волі рабочых і сялянскай беднаты.

3. Патрабуем усеагульнага ўзбраення народнай арміі з сялян і рабочых і пагалоўнага разбраення буржуазіі.

4. Уся паўната ўлады як на месцах, так і ў цэнтры павінна належыць выключна працоўнаму народу, яго Саветам сялянскіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў і народным камісарам — і толькі такую ўладу мы будзем падтрымліваць: усякі ж замах на Савецкую ўладу сустрэне магутны дружны адпор салдат, рабочых і сялян.

5. Патрабуем безадкладнага правядзення ў жыццё ўсіх дэкрэтаў, выдадзеных народнымі камісарамі, і асабліва Дэкрэта аб зямлі.

Далоў буржуазны Устаноўчы сход, далоў капіталістаў, памешчыкаў і іх прыхвасняў!
Няхай жыве ўлада Саветаў!
Няхай жыве сацыяльная рэвалюцыя!
Няхай жыве ўсеагульны народны дэмакратычны мір!

Оршанский вестник. 1918. 15 января.

АБ АРГАНІЗАЦЫІ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ Ў АРШАНСКІМ ПАВЕЦЕ

(з «Інфармацыйнага лістка» аддзела мясцовага ўпраўлення НКУС)

27 студзеня 1918 г.

Раённы аб'яднаны Савет рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў распаўсюджвае сваю ўладу на павет. Паўсюль у банках савецкія камісары. Харчовая ўправа падпарадкавана Савету, гарадская дума працуе самастойна; намечана яе пераабраць на прынцыпе падпарадкавання Савету. Павятовая земская ўправа і валасныя земскія ўправы распускаюцца. На сялянскім павятовым з'ездзе вырашана арганізаваць чырвоныя дружыны пры валасцях. Батрацкі з'езд рашаў пытанне аб арганізацыі батракоў.

Пры Савеце ёсць аддзелы: народнай асветы, фінансавы, ваенны, кватэрны, харчавання, сялянскае бюро, культурна-асветны, аддзел аховы, рабочая секцыя, камісія па нацыяналізацыі банкаў.

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі, ф. 393, воп. 4, спр. 69, л.17.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАЗЕТЫ «ПРАВДА» АБ РАЗЗБРАЕННІ ПОЛЬСКІХ ЛЕГІЯНЕРАЎ У РАЁНЕ ОРШЫ

Сёння каля раз'езда НР 3 Рыга-Арлоўскай чыгункі, у вёсцы Садобрына, атрадам чырвонагвардзейцаў з гор. Віцебска пасля перастрэлкі быў раззброены атрад польскіх легіянераў у колькасці 200 чалавек, частка легіянераў уцякла. Уцёкшыя легіянеры захопліваюцца нашымі раз'ездамі. Пуць Віцебск — Орша свабодны для паяздоў. Страты чырвонагвардзейцаў: 1 паранены. У легіянераў страты: некалькі забіта і многа параненых. Бой працягваўся з 8 гадзін да 10 гадзін, усё закончана было да 12 гадзін дня.

Правда. 1918. 30 января.

З РЭЗАЛЮЦЫІ МАШКОЎСКАГА ВАЛАСНОГА САВЕТА АРШАНСКАГА ПАВЕТА ПРА АБАРОНУ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ

23 чэрвеня 1918 г.

«Российская Социалистическая Федеративная Советская Республика переживает небывалые испытания. Необходимо всем сплотиться вокруг Советов, охранять и оберегать их от всяких покушений, чтобы победить контрреволюции и предотвратить голод в стране...

Все уличенные в призыве к выступлению против Советов и в агитации против лиц, поставленных у власти, должны быть выселяемы в 3-дневный срок за пределы волости».

З РЭЗАЛЮЦЫІ СХОДА БЕДНАТЫ ПУГЛЯЕЎСКАЙ ВОЛАСЦІ АРШАНСКАГА ПАВЕТА ПРА ЎМАЦАВАННЕ САЮЗА РАБОЧЫХ І СЯЛЯН І ЎХВАЛЕННІ РАШЭННЯЎ V УСЕРАСІЙСКАГА З'ЕЗДА САВЕТАЎ

28 ліпеня 1918 г.

Мы, граждане Пугляевской вол., заявляем, что мы всеми силами поддерживаем политику Совета Народных Комиссаров, активно поддерживаем постановления V Всероссийского съезда; мы стоим за продовольственную диктатуру, за создание комитетов деревенской бедноты и за взятие на учёт урожая 1918 г.

Мы считаем, что выступления в Москве во время V Всероссийского съезда Советов левых эсеров — преступление против Советской власти, это выступление могло погубить рабоче-крестьянское правительство... а посему мы, крестьяне Пугляевской вол., заявляем, что воевать в данный момент ни в коем случае невозможно и мы поддерживаем постановления V Всероссийского съезда и считаем левых эсеров изменниками русской революции и Советской власти...

З АДОЗВЫ ЧАСОВАГА РЭВАЛЮЦЫЙНАГА ШТАБА АРШАНСКАГА ПАВЕТА ДА НАСЕЛЬНІЦТВА Ў СУВЯЗІ З ВЫХАДАМ ЛЕВЫХ ЭСЭРАЎ З ПАВЯТОВАГА САВЕТА

ліпень 1918 г.

... Левые эсеры дезертировали из Оршанского исполкома. В тяжелую для революции минуту они предали рабочих и крестьян.

Мы, коммунисты-большевики, взваливаем на себя всю тяжесть революционной власти. Когда мы, коммунисты-большевики, предложили левым эсерам исключить тех, кто поддерживает подлый контрреволюционный мятеж в Москве, левые эсеры отказались это сделать.

Левые эсеры изменили революции, уйдя из Совета.

Ввиду этого исполкомом образован Временный революционный штаб, которому принадлежит вся полнота власти в уезде и городе.

Состав Временного революционного штаба следующий: председатель Рошаль, товарищ председателя — Горбачев, секретарь — Зысман, член штаба — Жук...

... Временный революционный штаб призывает население сохранять полное спокойствие, а трудовые массы оказать ему поддержку. Всякие выступления против революции революционным штабом будут беспощадно подавляться...

ЗВАРОТ КАМУНІСТАЎ АРШАНСКАГА ЧЫГУНАЧНАГА ВУЗЛА ДА РАБОЧЫХ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ АБ АКТЫЎНЫМ УДЗЕЛЕ Ў БАРАЦЬБЕ З КОНТРРЭВАЛЮЦЫЯЙ

15 верасня 1918 г.

У гэты грозны для рэвалюцыі час, калі звонку і ўнутры банды контррэвалюцыянераў усімі гнюснымі і несумленнымі спосабамі імкнуцца задушыць рэвалюцыю, мы, камуністы Аршанскага чыгуначнага вузла, на сходзе 15 верасня стварыўшы камуністычную ячэйку, заклікаем усіх рабочых з'яднацца і бязлітасна знішчаць усіх ворагаў рэвалюцыі, у чым адзінае выратаванне рабоча-сялянскай Савецкай улады. Усіх рабочых, адурманеных прапагандай контррэвалюцыянераў аб якойсьці ўчрадзілцы, прывіўшы такім чынам варожыя думкі ў адносінах да Савецкай улады, просім прыходзіць да нас, і мы заўсёды прыйдзем да вас на да-

памогу і растлумачым, у чым заключаецца хітрасць гэтых контррэвалюцыянераў у адносінах да ўлады рабочых і сялян.

Усім контррэвалюцыянерам абвяшчаем чырвоны масавы тэрор, калі хоць адзін волас упадзе з галавы нашага рабочага ў барацьбе з ворагамі рэвалюцыі.

Няхай жыве правадыр сусветнага пралетарыяту Ленін!

Няхай жыве ўлада рабочых і сялян!

Няхай жыве чырвоны тэрор за справядлівую справу!

Накіравана 13 кастрычніка 1918 г. ў Савет Народных Камісараў У.І. Леніну. ЦК РКП(б), усім ваенрэўкомам, народнаму камісару шляхоў зносін, усерасійскаму выканаўчаму камітэту чыгуначнікаў, Аршанскаму гаркому РКП(б), Аршанскаму Савету і інш.

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф. 107, воп. 1, спр. 7, арк. 41 — 43.

СА СПРАВАЗДАЧЫ ГОМЕЛЬСКАГА ГУБЕРНСКАГА КАМІТЭТА РКП(б)

20 мая 1919 г.

Оршанский у.

К концу апреля сего года всех членов партии насчитывалось 183, сочувствующих и кандидатов — 414. Число организаций и ячеек 36. Из них мобилизовано 86 человек, главным образом из городской организации, ибо по уезду многие ячейки вследствие своей малочисленности не в состоянии были произвести мобилизацию. Городская организация разбита на секции: рабочую, крестьянскую и красноармейскую.

Резюмируя работу Оршанского у., приходится констатировать, что она за истекшие два месяца понизилась известным процентом главным образом потому, что оттуда были взяты лучшие работники.

Борьба за Советскую власть в Белоруссии, 1918 — 1920 гг.: Сборник документов и материалов. Мн., 1971. Т. 2. С. 109.

СПРАВАЗДАЧА АРШАНСКАГА ПАВЯТОВАГА КАМІТЭТА РКП(б) АБ ПРАВЯДЗЕННІ «ПАРТЫЙНАГА ТЫДНЯ»

Не раней 22 кастрычніка 1919 г.

«Согласно постановлению Оршанского комитета РКП(большевиков) «Партийная неделя» назначена на дни от 14 до 21 октября сего года. Для ее проведения комитетом партии было мобилизовано 50 членов Оршанской организации. Заранее были заготовлены воззвания, листовки, также была проведена газетная кампания, в которой рядом статей освещалась программа и тактика Коммунистической партии, а также общая политика Советской власти. За время «Партийной недели» в городе было проведено 15 митингов, на некоторых из них было свыше 1 тыс. человек, в общем среднем на каждом митинге было 300-400 человек. Митинги внесли громадное оживление в массы. Массы принимали в них живое участие и явно высказали громадный интерес и сочувствие Коммунистической партии. В железнодорожном районе на стн. Орша и др. близлежащих станциях — 12 митингов, на которых замечалось тоже явное сочувствие Советской власти.

Агитаторы, которые были посланы в деревни, посетили в дни «Партийной недели» 165 деревень и имений. При обходах они собирали митинги, на которых разъясняли гражданам сущность и значение политики Советской власти и программу Коммунистической партии, отвечали на все вопросы граждан, принимали жалобы. В крестьянстве заметен явный поворот к Советской власти. Крестьяне недовольны только действиями некоторых представителей Советской власти.

Всего за «Партийную неделю» было подано заявлений о желании вступить в партию: по городу — от 166 человек, по уезду — 95 чел., по железнодорожному району — 100 человек, всего — от 361 человека. Из них попало красноармейцев — 67, служащих и милиционеров — 62 чел., рабочих — 45 человек, крестьян — 40 чел., коммунаров и батраков — 42 чел., железнодорожников — 100 чел.

За это время основано новых ячеек деревенских и волостных — 6, по железнодорожному району — 3 ячейки...»

Секретарь Оршанской организации РКП(б) Л. Хургин.

Борьба за Советскую власть в Белоруссии, 1918 — 1920 гг.: Сборник документов и материалов. Мн., 1971. Т. 2. С. 223.

З ДАКЛАДА КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ «ТЫДНЯ ФРОНТА І ТРАНСПАРТА» Ў АРШАНСКІМ ПАВЕЦЕ

10 студзеня 1920 г.

Проведение «Недели» организовала специальная комиссия из представителей ревкома, компартии, Коммунистического Союза Молодежи, ж/д организаций РКП и др., она в свою очередь разбилась на комиссии: хозяйственную, политическую, по проведению «Недели» в госпиталях, военно-дезертирную.

Политическая комиссия стала вести газетную кампанию, подготовлять беспартийные волостные конференции, которые обсуждали вопросы: текущий момент и международное положение Республики, продовольственный вопрос, земельный вопрос, отделение церкви от государства, социальное обеспечение и охрана труда и др. Конференции были проведены во всех волостях Оршанского уезда. Кроме этого была проведена беспартийная конференция красноармейская Оршанского гарнизона с той же повесткой.

Хозяйственная комиссия стала вести подготовительные работы по наиболее лучшей реализации всех пожертвований, которые будут поступать в течение всей недели, начали заготавливаться квитанции для сбора подарков, подписные листы и т. д. Было произведено строгое распределение труда. Назначены были сборщики. Кружечный сбор был поручен Коммунистическому Союзу Молодежи. Театрально-художественная работа была поручена отнаробразу, готовившему спектакли и концерты-митинги.

1 февраля началась «Неделя фронта и транспорта» в Орше. «В городе почувствовалось некоторое оживление. В субботу был первый субботник рабочих г. Орши. В субботнике приняло участие около 400 человек. Часть рабочих была отправлена на ближайшие станции по разгрузке дров, часть приняла участие в очистке пути от снежных заносов. 1 февраля был второй массовый субботник рабочих в количестве 600 человек и учащихся около 300 человек. Последний был организован по инициативе Коммунистического Союза Молодежи. Отрадно было видеть стройные ряды рабочих и учащихся, бодро и с революционными песнями направляющихся на станцию. По данным ж/д комиссии, субботник 1 февраля был высокопроизводителен и сыграл большое моральное значение в жизни пролетариата».

Оживленно проходил сбор пожертвований, в первый день собрали 60 тыс. руб.

1 — 7 февраля проходили спектакли, концерты-митинги.

«2 февраля был второй субботник учащихся 2-й и 3-й советских школ второй ступени, на котором присутствовали 200 человек. 6 и 7 февраля были заключительные субботники рабочих г. Орши...»

По решению пленума упрофбюро все рабочие и служащие отчислили дневной заработок в пользу «Недели фронта», партийные организации дневной заработок своих членов. Кроме того отчисления поступали от рабочих всех фабрик Оршанского у. К 12 февраля фонд «Недели фронта» уже дошел до 315 тыс. руб. ... В городе было собрано много одежды, продуктов первой необходимости. Продукты направлялись в госпитали, одежда и продукты на фронт. Много было сделано для улучшения состояния лазаретов. Силами рабочих профсоюзов был проведен ремонт их, уборка, починка белья и обуви, изготовлена мебель и кухонные принадлежности, проведены концерты и митинги.

Друкуецца па кн.: Борьба за Советскую власть в Белоруссии, 1918 — 1920 гг.: Сборник документов и материалов. Мн., 1971. Т. 2. С. 245 — 250.

Разгром «дзікай» дывізіі

У жніўні 1917 г. ў час станаўлення Савецкай улады С.М. Будзённы прыбыў у Оршу. Пад яго камандаваннем 1-я кавалерыйская брыгада Каўказскай дывізіі разам з рэўкомам аршанскіх чыгуначнікаў удзельнічала ў затрыманні і паступовым разбраенні 5 эшалонаў карнілаўскай «дзікай» дывізіі, якія праз Оршу перакідваліся ў Маскву. Была вызвалена таксама група бальшавікоў, якіх арыштава-

лі контррэвалюцыянеры і ў двух таварных вагонах накіроўвалі ў Магілёў.

З успамінаў С.М.Будзённага

«Перад адыходам эшалонаў брыгады з Гомеля да мяне прыбыў таварыш ад М.В. Фрунзе і паведаміў, што бальшавіцкая арганізацыя Заходняга фронту атрымала звесткі пра тое, што на Оршу па чыгунцы рухаецца «дзікая» дывізія, якую генерал Карнілаў у ліку іншых войскаў імкнуўся выкарыстаць для ліквідацыі Саветаў у Петраградзе і ўстанаўлення ў краіне ваеннай дыктатуры. Гэту дывізію, якая рухалася на Петраград, рэвалюцыйныя рабочыя і салдаты затрымалі на станцыі Дно і павярнулі назад. Цяпер карнілаўцы вырашылі накіраваць дывізію праз Оршу ў Маскву.

Таварыш, які прыбыў ад Фрунзе, сказаў, што бальшавіцкая арганізацыя Заходняга фронту палічыла неабходным затрымаць і раззброіць «дзікую» дывізію і што гэта задача ўскладаецца на дывізіённы камітэт Каўказскай кавалерыйскай дывізіі, у тым ліку на мяне. Я тут жа паведаміў пра гэта палкавым камітэтам і заручыўся іх поўнай падтрымкай.

Калі брыгада прыбыла ў Магілёў, да мяне ў вагон увайшоў сам Фрунзе. Ён паўтарыў тое, што было ўжо сказана мне яго пасланцом, і папярэдзіў, што трэба прыняць усе магчымыя меры для таго, каб перагарадзіць шлях «дзікай» дывізіі на Маскву, а калі будзе неабходна, не спыняцца і перад прымяненнем зброі, але перш за ўсё растлумачыць салдатам, чым выклікана раззбраенне гэтай дывізіі. Фрунзе сказаў, што па прыбыцці ў Оршу я павінен неадкладна звязацца з мясцовым рэвалюцыйным камітэтам чыгуначнікаў і дзейнічаць сумесна з імі. Аршанскім таварышам ужо паведамлена пра тое, якая задача пастаўлена перад намі, і трэба толькі інфармаваць іх аб гатоўнасці брыгады яе выканаць.

— Усё зразумела, — адказаў я Фрунзе. — Але вось у чым справа... Няцяжка падрыхтаваць салдат брыгады да раззбраення «дзікай» дывізіі, але як аднясецца да гэтага камандаванне брыгады? Яно, безумоўна, будзе супраць раззбраення горскай дывізіі: па-першае, таму, што не мае на гэта ніякіх установак вышэйшага камандавання, і, па-другое, з-за асцярогі, што раззбраенне можа прывесці да кровапраліцця.

Фрунзе рэкамендаваў мне заняць цвёрдую пазіцыю ў адносінах да камандавання брыгады і што б там ні было дабіцца на падставе рашэнняў салдацкіх камітэтаў дывізіі і фронту частковай або поўнай выгрузкі брыгады ў Оршы. Правёўшы з дапамогай палкавых камітэтаў адпаведную падрыхтоўку салдат да пастаўленай задачы, я з першым эшалонам Ніжагародскага палка прыбыў у Оршу, дзе і пачалася выгрузка. Камандзір брыгады генерал Копачаў запратэставаў і заявіў, што ў яго няма ўказанняў аб выгрузцы і брыгада павінна следаваць у Мінск.

Я адказаў генералу, што мы атрымалі ўказанні з фронту і не можам не выканаць іх; напэўна, і ён атрымае такія ж указанні, а адказнасць за вынікі бяруць на сябе дывізіёны і палкавыя камітэты. Салдаты аднадушна падтрымліваюць свае камітэты і маюць цвёрды намер затрымаць «дзікую» дывізію...

Нарэшце, генерал Копачаў, камандзіры палкоў і ўвесь афіцэрскі састаў брыгады адступілі і заявілі, што яны здымаюць з сябе адказнасць за дзеянні салдацкіх камітэтаў і больш не ўмешваюцца ў справы, якія звязаны з раззбраеннем дывізіі горцаў...

«Дзікая» дывізія набліжалася да Оршы. Рэвалюцыйны камітэт чыгуначнікаў уважліва сачыў за праходжаннем кожнага эшалона. Мы дамовіліся прымаць эшалоны ў Оршы праз вызначаны час, з тым, каб мець магчымасць раззбройваць горцаў паэшалонна.

Горцы супраціўлення не аказалі. Мабыць, яны прынялі патрабаванне аб раззбраенні як загад зверху, а можа, кулямёты і гарматы, якія былі прыведзены ў баявое становішча, аказалі сваё пераканаўчае ўздзеянне.

Салдаты першых двух эшалонаў «дзікай» дывізіі пасля таго, як яны здалі ўсю агнястрэльную зброю, былі выгружаны з вагонаў і накіраваны ў горад Быхаў пешшу...

Выканаўшы ў Оршы загад Фрунзе, наша брыгада пагрузілася ў вагоны і адбыла ў Мінск. Начальнік дывізіі генерал Карніцкі, калі даведаўся пра падзеі ў Оршы, быў страшэнна абураны, ён патрабаваў аддаць мяне пад ваенна-палявы суд. Аднак гэта патрабаванне наткнулася на рашучае салдацкае «не», і пытанне пра аддачу мяне пад суд адпала».

Друкуецца па кн.: Буденный С.М. Пройденный путь. Кн. 1—3. М., 1959—73.

Падрыхтаваў да друку Б.Ф. Шалуха.

Нараджэнне Чырвонай гвардыі

У канцы 1917 г. паміж Лёзна і Бабінавічамі знаходзілася больш за 3 тыс. польскіх легіянераў Доўбар-Мусніцкага. Яны наступалі ў двух стратэгічна важных напрамках — на Смаленск і Оршу, а пазней планавалі пайсці на Арахі і Выдрыцу, каб звергнуць там уладу Саветаў і аднавіць манархічны рэжым.

Важную ролю ў барацьбе з імі адыграла Чырвоная гвардыя, якая была створана на Аршаншчыне. Пад кіраўніцтвам партыйнага і ваенна-рэвалюцыйнага камітэтаў Оршы яе атрады арганізоўваліся з ліку рабочых і сялянскай беднаты ў былым маёнтку Берасценава. Іх арганізатарам стаў выхадзец з мяшчан, ураджэнец горада Дуброўна Барыс Максімавіч Зысман. Ён жа быў аднадушна выбраны камандзірам аднаго з атрадаў. За кароткі час колькасць чырвонагвардзейцаў дасягнула больш за тысячу чалавек. Потым у вёскі для далейшага запісу ў атрад і збору харчавання былі накіраваны члены Савета, былыя франтавікі 1-й сусветнай вайны.

Да таго часу, як паступіла тэрміновае данясенне з Магілёўскага губернскага рэвалюцыйнага камітэта пра тое, што з боку Віцебска праз Лёзна на Оршу і Смаленск ідуць палякі, чырвонагвардзейскі атрад ужо сфарміраваўся. На яго ўзбраенні былі кулямёты «Максім» і вінтоўкі. З вопытных байцоў і ўдзельнікаў імперыялістычнай вайны была падрыхтавана і разведка. Пад выглядам лесарубаў яны на конях накіраваліся ў бок легіянераў, каб разведаць іх сілы і размяшчэнне. На хутарах, дзе знаходзіліся легіянеры, былі ўзяты ў палон польскія салдаты і афіцэры.

Хутка чырвонагвардзейцы выступілі ў напрамку буйных населеных пунктаў Бабінавічы і Дабрамыслі. Прымяніўшы флангавы ўдар справа і злева, яны спачатку атакавалі і без страт у жывой сіле захапілі мястэчка Бабінавічы, а праз нейкі час Дабрамыслі.

Так паступова нараджалася Чырвоная гвардыя, якая складалася з рабочых, сялян і рэвалюцыйных салдат. Яна ламала супраціўленне буржуазіі, забяспечвала перамогу Савецкай уладзе.

У далейшым зводны атрад быў перайменаваны ў 2-і Аршанскі атрад Чырвонай гвардыі, а ў грамадзянскую вайну — у Аршанскі полк, які прымаў удзел у барацьбе з войскамі адмірала Калчака ў Сібіры. Б.М. Зысман пасля камандаваў дывізіяй.

Б.Ф. Шалуха.

Гэтых дзён не змоўкне слава

ПАНАСЮК Пётр Аляксеевіч, былы камандзір аднаго з партызанскіх атрадаў на Аршаншчыне, якія выступілі супраць германскіх імперыялістаў у гады грамадзянскай вайны. Жыў у калгасе імя Заслонава.

Вестку аб рэвалюцыі я сустрэў на Заходнім фронце. А потым Дэкрэты аб міры, аб зямлі... Першыя дакументы Савецкай улады адразу выклікалі сімпатыю да яе. Тым больш, што галоўная маса салдат была з сялян. Ім даўно абрыдлі акопы, і ўвесь час яны марылі аб сустрэчы з сем'ямі, аб кавалку зямлі.

Вярнуўшыся дамоў, упершыню атрымаў зямельны надзел. Радасць была вялікай: мой бацька ўсё жыццё батрачыў у памешчыка. Такі ж лёс рыхтаваў стары рэжым і яго сынам, якіх было шасцёра. З дзяцінства мы гнулі спіну на багацеяў. Але ўсё змяніў Кастрычнік.

Пасяліўся ў вёсцы Васькаўшчына, ажаніўся з дзяўчынай-сіратой. Завялі невялікую гаспадарку.

Чорным груганом наляцела вестка аб тым, што набліжаюцца нямецкія захопнікі. Амаль усе мужчыны сабраліся да мяне, калі кайзераўцы былі ўжо на подступах да вёскі. Набраўся атрад чалавек у дваццаць пяць. У кожнага быў конь, такая-сякая зброя, знайшлі нават кулямёт.

Першае баявое хрышчэнне атрад атрымаў недалёка ад Казечак. Вёску вызвалілі ад захопнікаў, многія з германцаў загінулі, частка разбеглася. З нашых толькі дваіх лёгка пара-

ніла. Гэта быў першы поспех, які акрыліў атрад. У якасці трафеяў нам дасталася палявая гармата, якая ў далейшым дазваляла рабіць даволі сур'ёзныя аперацыі. У атрад пачалі ўступаць сяляне з навакольных вёсак, нашы сілы ўмацоўваліся. Мы прыносілі ворагу значны ўрон.

Пазней большасць байцоў атрада ўлілася ў 1-ы Аршанскі рэвалюцыйны полк, камандзірам якога быў А. Пазняк, а камісарам — Зысман. Я стаў камандзірам кулямётнага ўзвода.

Шмат слаўных баявых спраў было на рахунку нашых аднапалчан. Мы ўдзельнічалі ў разгроме леваэсэраўскіх элементаў, якія пачалі верхаводзіць у 2-м Аршанскім палку, што знаходзіўся ў Задняпроўі. Быў падаўлены контррэвалюцыйны мяцеж у Магілёве, дзе мужна змагаліся і аршанцы, разбіта банда, што разбойнічала ў Пугляйскім лесе. Пазней удзельнічалі ў ліквідацыі кулацкага бунту ў Лёзненскай воласці і на тэрыторыі Духаўшчынскага павета Смаленскай губерні.

У барацьбе загінула нямала баявых сяброў. Але як радасна сёння бачыць, што іх справа жыве, яна стала сцягам для мільёнаў.

П. Панасюк.

Ленінскі прызыў. 1963. 7 лістапада.

Камандзір Першага Аршанскага

Антон Нічыпаравіч Пазняк нарадзіўся ў 1893 г. ў в. Солаўе на Аршаншчыне ў сям'і чыгуначніка-рамонтніка. Бацька яго ў 1905 г. быў удзельнікам рабочай дружыны, за што яго звольнілі з работы.

З таго часу працоўнае жыццё пачалося і для маленькага Антона. З-за поглядаў бацькі яго выключылі з чыгуначнага вучылішча, і ў свае 14 гадоў Антон у пошуках заробкаў пакінуў родны дом. Ён працаваў грузчыкам на чыгунцы, слесарам, сталяром.

Калі пачалася імперыялістычная вайна, Пазняка прызвалі ў царскую армію. Былы батрак, а потым рабочы, ён убачыў усю непатрэбнасць кровапралітнай вайны, у якой гінуў працоўны народ, усім сэрцам быў супраць парадкаў у арміі, муштры і здзекаў афіцэраў над салдатамі.

Аднойчы на вачах радавога Пазняка фельдфебель, нехта Васкрасенскі, здзекваўся над салдатам. Антон Нічыпаравіч заступіўся за таварыша, і яго тут жа прыгаварылі да трох гадоў пакарання ў арыштанцкіх ротах. Праўда, прыгавор замянілі адпраўкай на перадавую лінію фронту, але там яго хутка застала Лютаўская рэвалюцыя 1917 г.

Як актыўнага і дзейнага чалавека таварышы вылучылі Пазняка ў палкавы камітэт. Там ён уступіў у РСДРП.

У ліпені 1917 г. Антон Нічыпаравіч быў накіраваны ў адну з часцей Заходняга фронту. Партыйная арганізацыя даручыла яму адказную справу — распаўсюджванне рэвалюцыйнай літаратуры, знаёмства салдацкіх мас з праграмай бальшавіцкай партыі, звесткамі пра жыццё і дзейнасць Леніна, падрыхтоўку сацыялістычнай рэвалюцыі. На адным з мітынгаў агенты Часовага ўрада арыштавалі Пазняка. Яму пагражаў расстрэл, але салдаты вызвалілі яго.

Антон Нічыпаравіч вярнуўся ў родную Оршу, і зноў працягвалася яго кіпучая рэвалюцыйная дзейнасць, барацьба за ўстанаўленне Савецкай улады ў горадзе і на сяле.

У сваіх успамінах А.Н. Пазняк пісаў:

«... Прыбыў у родны горад, з'явіўся ў павятовы камітэт, дзе старшынёй РКП(б) быў Хургін. У гарадской думе было засілле меншавікоў і эсэраў. Адзін толькі бальшавік П.М. Лепяшынскі быў па-сапраўднаму актыўным рэвалюцыйным байцом. Група бальшавікоў паспяхова працавала ў былым маёнтку Берасценава, дзе быў ужо арганізаваны Берасценаўскі раённы Савет, які аб'ядноўваў 6 валасцей.

З салдат, якія прыйшлі з фронту, фарміравалі атрады Чырвонай гвардыі.

У пачатку 1918 г. сілы контррэвалюцыі зрабілі спробу звергнуць Савецкую ўладу пры дапамозе корпуса Доўбар-Мусніцкага. На чырвонагвардзейцаў была ўскладзена задача абяззброіць гэтыя часці. Нашы чырвонагвардзейскія атрады разагналі меншавіцка-эсэраўскую думу ў Оршы і накіраваліся насустрач белапалякам. Нас было звыш тысячы чалавек. Мы абяззброілі некалькі эшалонаў польскіх легіянераў, якія накіроўваліся са Смаленска на Оршу, і эшалоны паміж Віцеб-

скам і Лёзна, а таксама атрады, што рухаліся пешшу. У Оршы чырвонагвардзейцы абязброілі таксама 3 тыс. белапалякаў.

У лютым 1918 г. зноў узяліся за зброю. Мірныя перагаворы ў Брэсце былі сарваны, немцы пайшлі ў наступленне. Атрады Чырвонай гвардыі сустрэлі нямецкіх захопнікаў на станцыі Слаўнае, дзе быў дадзены першы бой. Другі бой быў дадзены ля Талачына. Наша задача зводзілася да таго, каб затрымаць рух ворага і даць магчымасць працоўным Оршы эвакуіраваць з горада ваенную маёмасць. У глыб краіны было адпраўлена 6 тыс. вагонаў рознай маёмасці, а тое, што не ўдалося вывезці, было знішчана. На станцыі Орша-Таварная ўзарвалі склад артылерыйскіх снарадаў.

З сакавіка 1918 г. быў заключаны мірны дагавор з Германіяй. Але Орша, дзе праходзіла дэмаркацыйная лінія, стала пагранічным горадам. Барацьба за ўмацаванне Савецкай улады яшчэ больш ускладнілася. Леваэсэраўскія элементы, дробная буржуазія, спекулянты дэзарганізавалі работу Савета, падпольную работу даводзілася весці сярод працоўных акупіраванай немцамі тэрыторыі. Пасля дэкрэта Савецкай улады аб стварэнні рэвалюцыйнай Чырвонай Арміі ў Оршы быў створаны першы полк, кіраваць ім даручалася мне, камісарам прызначаўся Барыс Максімавіч Зысман. 5 красавіка 1918 г. на з'ездзе Саветаў Аршанскага павета палку прысвоена назва «Першы рэвалюцыйны полк Аршанскага Савета».

Асабовы састаў палка фарміраваўся з камуністаў, членаў прафсаюзаў і салдат старой царскай арміі, якія ўцякалі з-за кардону ад немцаў.

6 жніўня эсэры пры падтрымцы контррэвалюцыйных элементаў паднялі мяцеж у 2-м палку Магілёўскай дывізіі. Я знаходзіўся ў гэты час на лячэнні ў шпіталі, быў арыштаваны, збіты да паўсмерці і кінуты ў гарадскую турму. Дзякуючы таму, што ў гарнізонным нарадзе знаходзілася 6-я рота першага палка, а эсэры не ўлічылі, што камандзір роты т. Астроўскі быў камуністам, мне ўдалося ўцячы. Астроўскі затрымаў начальніка турмы і ўсю ахову, устанавіў свае пасты. Нам удалося наладзіць сувязь з батальёнамі і ротамі першага палка. Урач аказаў мне неабходную медыцынскую дапамогу. І пакуль эсэры засядалі, выносілі рашэнні, полк змяніў варту, абязброіў батарэю і заняў тэлеграф, банк, тэлефонную станцыю, чыгуначную станцыю, друкарню.

Усе эсэраўскія рашэнні трапілі да нас у рукі, у тым ліку і вынесены мне смяротны прыгавор.

Прыбыўшыя да нас на дапамогу для ліквідацыі эсэраўскага легіёна воінскія часці з Віцебска і Смаленска ўвайшлі ў горад без адзінага выстралу.

Краіна ў агні. Аршанскі рэвалюцыйны полк уліваецца ў праслаўленую 27-ю дывізію, змагаецца супраць Калчака на Усходнім фронце, супраць белапалякаў на Заходнім фронце, а таксама ўдзельнічае ў падаўленні Кранштацкага мяцяжу...»

Антон Нічыпаравіч Пазняк пражыў 74 гады, з іх 50 ён аддаў служэнню народу.

В.Х. Гурэвіч.

Разгром акупантаў

З успамінаў Б.М. Зысмана

ЗЫСМАН Барыс Максімавіч — былы старшыня Берасценаўскага Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Аршанскага павета. Прымаў актыўны ўдзел у барацьбе з польскімі акупантамі. У 1918 г. камандаваў 2-м Аршанскім конным атрадам Чырвонай гвардыі, потым дывізіяй.

У штаб увялі двух чалавек у салдацкіх шынялях, якія патрабавалі прадставіць іх начальніку. Яны назваліся жыхарамі вёскі, якая была размешчана ў лесе паміж Бабінавічамі і Дабрамыслямі, і паведамілі, што ў маёнтку каля іх вёскі знаходзяцца палякі, а іх штаб у панскім доме. Усяго палякаў каля 3000 чалавек. У правільнасці іх паведамлення не было сумнення, і мы вырашылі неадкладна выступіць у паход, каб захапіць праціўніка знянацку. Пяхота была разбіта на 2 падраздзяленні. Іх камандзірам было загадана да 6 гадзін раніцы выйсці ў размяшчэнне праціўніка з 2 бакоў, акружыць яго і чакаць

сігналу наступлення. Сам я на чале коннага атрада рушыў па дарозе да маёнтка.

Жаданне разбіць польскіх легіянераў было вельмі вялікае. Напярэдадні сяляне, якія даведаліся пра наш атрад, прыслалі на падмогу сваіх сыноў і падводы з рознымі прадуктамі. Асабліва шмат чырвонагвардзейцаў вылучылі вёскі Кудаева, Міцькаўшчына, Салаўёва і Якубава. Актыўны ўдзел у фарміраванні атрадаў прыняў франтавік з в. Кудаева Ілья Селязнёў. З маёнткаў прыбывалі батракі на конях са зброяй у руках. Памятаю, з вёскі Сляпцы Дубровенскага раёна прыбыў батрак Варанкоў з 17-гадовым сынам, прынёс зброю і прыпасы прадуктаў.

Каля 6 гадзін раніцы мы падышлі да маёнтка, дзе пад бярозай у вялікім кажуху спаў вартавы. Калі ён прачнуўся, то вельмі здзівіўся нашаму паяўленню. Яму не заставалася нічога рабіць, як узняць рукі і здацца. Мы ўварваліся ў маёнтак. З памяшканняў у паніцы беглі афіцэры і салдаты: хто страляў, хто выходзіў з паднятымі ўгару рукамі. Большасць палякаў кінулася без аглядкі ў лес, але там іх сустракалі залпавым агнём з кулямётаў і вінтовак нашы пехацінцы. Праз гадзіну бой закончыўся. Мы ўзялі ў палон сотні варожых салдат і афіцэраў, шмат інжынернай вайсковай маёмасці, зброі і абмундзіравання. Палонныя былі адразу адпраўлены ў бок Оршы, а наш атрад накіраваўся ў мяст. Дабрамыслі.

Там мы даведаліся, што ў валасным упраўленні пад вартай знаходзіцца шмат палонных легіянераў, якіх захапілі сяляне. У 12 гадзін дня я атрымаў з Оршы тэлефанаграму, у якой паведамлялася, што палякі, калі даведаліся пра разгром іх сіл, павярнулі ў бок Віцебска і здаліся ў палон Крылову, старшыні Віцебскага губваенкома. Мне прапаноўвалася далейшы рух спыніць, і мы павярнулі на Оршу. У горадзе нас радасна сустрэлі працоўныя. Услед за намі крочылі палонныя.

Так польскія легіянеры атрымалі першы суровы ўрок за спробу ўзняць меч супраць маладой Савецкай рэспублікі.

Падрыхтаваў да друку Б.Ф. Шалуха.

Эшалон з хлебам

На будынку Аршанскага чыгуначнага вакзала ў 1978 г. ўстаноўлена мемарыяльная дошка з надпісам: «У ліпені 1918 года камісар станцыі Орша Д.Е. Івашчанка паспяхова выканаў адказнае заданне Савецкага ўрада, за што атрымаў асабістую падзяку У.І. Леніна».

Пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі бальшавікі павялі рашучую барацьбу за спыненне імперыялістычнай вайны і заключэнне справядлівага дэмакратычнага міру. У снежні 1917 г. ў г. Брэст-Літоўск было падпісана пагадненне аб перамір'і з германскім блокам дзяржаў.

Аднак 18 лютага 1918 г. Германія парушыла ўмовы перамір'я і пачала наступленне па ўсім Заходнім фронце. У бой было кінута больш за 50 нямецкіх дывізій. Немцы рваліся да Петраграда — калыскі сацыялістычнай рэвалюцыі. Над Савецкай краінай навісла смяротная небяспека.

...Германскае камандаванне пагадзілася на падпісанне мірнага дагавору 3 сакавіка. Умовы міру былі вельмі цяжкія і грабежніцкія, але краіна Саветаў захавала сваю незалежнасць.

Пасля заключэння міру лінія фронту стала дэмаркацыйнай. Орша з'яўлялася пагранічным горадам, які быў падзелены на 2 часткі.

Па ініцыятыве У.І. Леніна савецкі ўрад выдзеліў з фонду Чырвонага Крыжа 36 вагонаў збожжа для галадаючых рускіх ваеннапалонных. Камісару чыгуначнай станцыі Орша-Цэнтральная (заходняя частка была акупіравана немцамі) Данілу Епіфанавічу Івашчанку было даручана дамовіцца з нямецкім ваенным камандаваннем аб пропуску гэтага грузу ў лагер для рускіх ваеннапалонных у Германіі.

Нягледзячы на правакацыі з боку нямецкага камандавання і рускіх эсэраў, якія спрабавалі сарваць адпраўку эшалонаў з хлебам, вагоны былі дастаўлены па прызначэнні. Чыгуначнікі разам з камісарам Івашчанкам вымушаны былі ўзяцца за зброю, каб выканаць вельмі адказнае даручэнне У.І. Леніна.

Камісар Івашчанка па прамым провадзе паведаміў пра гэта Леніну. У адказ тэлеграф перадаў: «Орша. Камісару Івашчанку. Дзя-

кую за пропуск 36 вагонаў у Германію. Гэта для нашых ваеннапалонных, якія трапілі ў бядотнае становішча. Прашу абвяргаць гнусны паклёп і памятаць, што мы павінны дапамагаць нашым ваеннапалонным з усіх сіл.

4 ліпеня 1918 года. Старшыня Саўнаркома Ленін».

Івашчанка Даніла Еліфанавіч нарадзіўся 24.8.1892 г. ў в. Андрыянава Дубровенскага раёна. Пасля грамадзянскай вайны служыў у органах ВЧК. З 1932 г. ў Сярэдняй Азіі і Малдавіі на кіруючых пасадах у сістэме Міністэрства ўнутраных спраў. Памёр 23.7.1947 г. Пахаваны ў г. Кішынёў. Яго вобраз адлюстраваны ў мастацкім фільме «Хлеб пахне порахам», створаным на кінастудыі «Беларусьфільм» па аповесці Івана Шамякіна «Эшалон прайшоў».

Б.Ф. Шалуха.

Паведамленне пра разгром мяцяжу левых эсэраў у г. Орша

Яшчэ некалькі слоў аб мяцяжы ў г. Орша.

Левыя эсэры з выхадам з Аршанскага выканкома не задумаліся, беручы прыклад са сваіх сатаварышаў, наладзіць подлую авантуру ў г. Орша, дзеля чаго не спыніліся нават перад нізасцю агітацыі сярод мас як у г. Орша, так і яго ваколіцах, наладжваючы лятучыя мітынгі, хоць такія і, наогул, усякія сходы ў той момант, у сувязі з увядзеннем у горадзе ваеннага становішча, былі зусім забаронены. Апрача таго, антысавецкая агітацыя была перанесена ў свой час і ў часці Аршанскага гарнізона, дзе мела некаторае ўздзеянне, і знайшліся маладушныя, якія аднесліся да яе з давер'ем, прымкнулі да сацыял-здраднікаў. Трэба заўважыць, што гэта агітацыя вялася самымі рознымі спосабамі, і «працаўнікі» не спыняліся ні перад чым, у выніку чаго цёмныя масы пачалі заклікаць да ўчынення пагрому, у прыватнасці, да пагрому над яўрэямі. Самымі важкімі матывамі ў агітацыі выстаўлялася раздзімаемая імі цяжкасць Брэсцкага дагавору, на зрыў якога і напіралі агітатары, гаворачы, што да гэтага, маўляў, давялі бальшавікі і г.д.

Часці гарнізона, прызначаныя да адпраўкі на чэхаславацкі фронт і якія мелі ў сваім саставе, як трэба меркаваць, многа маладушных баязліўцаў, паверылі той авантуры і пачалі бясчынстваваць у горадзе пад непасрэдным кіраўніцтвам левых эсэраў. У адзін час бясчынствы прынялі такія памеры, што здавалася, быццам Савецкая ўлада звергнута, і ў горадзе, апрача мас, якія дэбашыраць, і левых эсэраў, іншай улады не існуе.

Доўга цягнуцца такое становішча не магло, і левым эсэрам «паўладарыць» не ўдалося, бо высланымі са Смаленска вернымі Савецкай уладзе і рэвалюцыі войскамі па дарозе нават былі раззброены дзве аршанскія батарэі і адзін полк. З прыбыццём жа ў Оршу віцебскага атрада смаленцы сумесна прыняліся за ліквідацыю авантуры. Амаль пры нязначнай затраце энергіі мяцеж-авантуру ўдалося падавіць. У цяжкую для левых эсэраў мінуту завадатары разбегліся, а частка была затрымана і аддадзена правасуддзю рэвалюцыі.

Такім чынам, амаль за некалькі гадзін уся гэтая авантура была зусім ліквідавана, і ўлада Саветаў адноўлена, горад зноў быў ахаваны ад бясчынстваў і насілля. Былі наладжаны належныя мітынгі, дзе як мага шырэй насельніцтва было азнаёмлена з тым, што адбылося. Апрача таго, па растлумачэнні падзей прадстаўнікамі Савецкай улады са Смаленска і Масквы безадкладна быў скліканы з'езд для перавыбараў выканкома, у які ўвайшлі, між іншым, 4 левыя эсэры.

Незалішне адзначыць той факт, што войскі, якія прызначаліся да адпраўкі на чэхаславацкі фронт у час ліквідацыі ўсёй гэтай авантуры, абразуміліся і, прыняўшы ўзорны парадак і падтрымліваючы самі рэвалюцыйную дысцыпліну, пад урачыстае спяванне і музыку былі адпраўлены ў саставе аднаго эскадрона кавалерыі, двух пяхотных палкоў на фронт з клятвай памерці або перамагчы. Адна батарэя паклялася быць абаронцай Савецкай улады, атрымала назад гарматы і была пакінута ў Оршы. Насельніцтва з энтузіазмам вітала гэтыя войскі, ускладала на іх надзею, як на аплот рэвалюцыі, вітала таксама часцей Смаленскага і Віцебскага гарнізонаў, якія гераічна падавілі мяцеж. Незалішне таксама ўказаць і на тое, што многія з левых эсэраў у далейшым усвядомілі гнуснасць і шкоду сваіх учынкаў і віталі часці, якія адпраўляліся на фронт, і,

наогул, Чырвоную Армію на чале з Савецкай уладай. На чале часцей на фронт пайшлі камуністы, прысланыя з Масквы, якімі маса, г.зн. чырвонаармейскія часці, засталіся вельмі задаволены. У сучасны момант у Оршы ўзорны парадак.

Звезда. 1918. 31 августа.

Настаўнік

Маё дзяцінства і юнацтва, што прайшлі ў Оршы, пераплятаюцца з успамінамі пра сям'ю Лепяшынскіх. У 1907 — 10 гг. сям'я Лепяшынскіх — Панцеляймон Мікалаевіч, вядомы дзеяч бальшавіцкай партыі, яго жонка Вольга Барысаўна і дачка Вольга, мая равесніца і сяброўка па дзіцячых гульнях, — жыла ў Оршы.

П.М. Лепяшынскаму дазволілі выкладаць у рэальным вучылішчы, а Вользе Барысаўне — у прыватнай гімназіі. У 1909 г. Вольга Барысаўна дапамагала мне паступіць у жаночую гімназію. З яе дачкой Вольгай нас пасадзілі за адну парту як навічкоў. Я часта бывала ў іх дома. Панцеляймон Мікалаевіч маляваў нам розныя карцінкі-загадкі.

Ішлі гады. У 1915 г. я скончыла гімназію з залатым медалём, але ажыццявіць сваю мару — стаць урачом — не змагла, бо не было сродкаў на вучобу, і да таго ж існавала так званая «працэнтная норма». З дазволу начальніка Віленскай вучэбнай акругі я стала настаўніцай у прыватнай пачатковай жаночай школе. У 1917 г. паступіла ў 8-ы клас гімназіі, каб атрымаць атэстат сталасці. І тут зноў сустрэлася з сям'ёй Лепяшынскіх. Панцеляймон Мікалаевіч у той час быў старшынёй гарадской Думы, куды яго абралі пры садзеянні бальшавікоў. Меншавікі і эсэры былі вельмі незадаволены гэтым і ўсяляк спрабавалі пазбавіцца ад бальшавіцкага дэпутата.

Таленавіты педагог П.М. Лепяшынскі адначасова працаваў у 8-м класе выкладчыкам матэматыкі. Ён быў патрабавальным да навучэнцаў, але моладзь вельмі любіла яго. Крыніцай гэтай любві і павагі з'яўляліся шчырыя і задушэўныя гутаркі Панцеляймона Мікалаевіча са сваімі выхаванцамі.

Незадоўга да Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Аршанскім гарадскім кінатэатры была наладжана публічная лекцыя аднаго з меншавікоў. Пасля яе адбылася дыскусія, у час якой з вострай прамовай выступіў П.М. Лепяшынскі. Ён бліскуча даказаў непазбежнасць пераростання буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў рэвалюцыю сацыялістычную.

У 1917 г. Панцеляймон Мікалаевіч па заданні партыі на некаторы час выязджаў з Оршы. Адміністрацыя школы выкарыстала гэтую акалічнасць для таго, каб пазбавіцца ад яго і вызваліць ад работы. Даведаўшыся пра гэта, большая частка вучняў абвясціла забастоўку і адмовілася пайсці на заняткі да новага настаўніка. Аб падзеях, якія адбыліся ў той час у школе, я напісала Лепяшынскаму і атрымала ад яго адказ. Ён пісаў, што вельмі ўзрушаны сардэчнымі адносінамі да яго з боку моладзі, але не вернецца больш у Оршу, бо атрымаў іншае заданне партыі. Ён раіў нам настойліва вучыцца, каб потым перадаць атрыманыя веды свайму народу.

Першым старшынёй Аршанскага павятовага камітэта партыі быў Іван Андрэевіч Казлоўскі. Член партыі з 1915 г., ураджэнец Коханаўскай воласці. У час Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. ён быў вызвалены з Шлісельбургскай крэпасці. Гэта быў камуніст крыштальнай чысціні, паэт-самародак. Працаваў ён у Оршы рэдактарам газеты «Набат».

У канцы 1918 г. мне было даручана разам з іншымі камуністкамі напісаць адозву да работніц і сялянак Аршаншчыны. У ёй гаварылася аб горкай жаночай долі да рэвалюцыі, змяшчаўся заклік згуртавацца вакол партыі бальшавікоў.

Застаўся ў памяці 1-ы з'езд работніц і сялянак Аршанскага павета, які праходзіў у лютым 1919 г. ў клубе па Ленінскай вуліцы. Тут я зрабіла даклад «Жанчына і сацыялізм», а некаторыя дэлегаткі-сялянкі крычалі з месца: «Ты малюеш будучы рай, а ў нас няма солі і газы». Дэлегатак з сяла мы тады размясцілі па кватэрах работніц. Яны ўпэўніліся, што работніцы, занятыя на вытворчасці, атрымлівалі па чвэрці фунта хлеба, і толькі дзецям і старым прыходзілася па фунту. Развіталіся мы, як шчырыя сябры, і потым дапа-

магалі ў стварэнні дэлегацкіх сходаў сялянак на месцах.

Незабыўным стаў кастрычнік 1919 г., калі ў якасці дэлегаткі ад Віцебскай губерні я паехала на 1-ы Усерасійскі з'езд жаночых аддзелаў. Тут я сустрэлася з Н.К. Крупскай, В. Голубевай і другімі віднымі дзяячкамі рэвалюцыйнага жаночага руху. Успамінаецца, як напярэдадні Першага мая 1920 г. моладзь Оршы на чале з камсамольцамі выходзіла на азеляненне горада і пасадзіла многа дрэў на беразе Дняпра. Пазней тут вырас цудоўны парк, які быў знішчаны ў час нямецка-фашысцкага нашэсця.

У 1921 г. Віцебскі губком партыі выдзеліў мне пуцёўку на вучобу ў Маскоўскі універсітэт на медыцынскі факультэт. І вось я стала ўрачом. Пасля Вялікай Айчыннай вайны наведала Оршу, з болем і сумам убачыла сляды яе разбурэння. Вялікая радасць і гордасць ахапілі мяне, калі я даведалася з карэспандэнцыі, якая была апублікавана ў газеце «Медицинский работник», што мой родны горад зараз непазнавальна змяніўся, стаў яшчэ больш прыгожым і з кожным днём усё больш добраўпарадкоўваецца.

А. Вальфсон, г. Волагда

Сустрэчы жыхароў Аршаншчыны з М.І. Калініным

У грамадзянскую вайну па ініцыятыве У.І. Леніна былі арганізаваны спецыяльна абсталяваныя паязды, якія выкарыстоўваліся як перасоўныя агітпункты. Адзін з іх — «Кастрычніцкая рэвалюцыя» — у красавіку 1919 г. ўзначаліў старшыня Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Міхаіл Іванавіч Калінін. Разам з ім у паездцы ўдзельнічаў паліткамісар, намеснік народнага камісара ўнутраных спраў Міхаіл Фёдаравіч Уладзіміраўскі.

У чэрвені 1919 г. агітпоезд прыбыў у Оршу. Пасля кароткай гутаркі з прадстаўнікамі павятовай улады Калінін накіраваўся ў цэнтр воласці — в. Машкова. Суправаджаў яго старшыня Аршанскага павятовага Савета рабочых, чырвонаармейскіх і сялянскіх дэпутатаў Мікалай Сямёнавіч Ігнацьеў. Чаму было выбрана менавіта гэта месца? Справа ў тым, што да жніўня 1918 г. тут дзейнічалі леваэсэраўскія арганізацыі. Тутэйшыя рабочыя і сяляне яшчэ знаходзіліся пад уплывам левых эсэраў.

У в. Машкова Калініна чакалі. На мітынг, які адбыўся пад адкрытым небам, прыйшлі таксама сяляне з навакольных вёсак — Асінаўкі, Немерава, Багрынава, Папоўкі, Корава, Слабады. Прамову Калініна слухалі больш як 300 чалавек. Сяляне скардзіліся на недахоп соі, сельскагаспадарчага інвентару, прыгнёт кулакоў. Адчувалася, што Міхаіл Іванавіч добра ведаў патрэбы людзей, раіў ім, як правільна будаваць жыццё па-новаму, рэкамендаваў сялянам аб'яднацца ў сельскагаспадарчыя арцелі для супольнай апрацоўкі зямлі.

Не абышлося без выступленняў супраць харчразвёрсткі. Міхаіл Іванавіч даў рашучы адпор кулацтву, якое актыўна выступала супраць улады Саветаў. Ён расказаў пра становішча на фронце, прасіў аказваць Чырвонай Арміі ўсямерную дапамогу хлебам і іншымі прадуктамі, казаў, што дзеля гэтага патрэбна своечасова ўбраць ураджай і як мага хутчэй здаць лішкі збожжа дзяржаве. Амаль усе сяляне падтрымалі Міхаіла Іванавіча, абяцалі дапамагчы.

Пасля паездкі ў в. Машкова Калінін выступіў на мітынгу ў Оршы, дзе сабраліся рабочыя, сяляне з навакольных вёсак і чырвонаармейцы. Ён ахарактарызаваў прычыны цяжкага эканамічнага становішча ў краіне, адзначыў, што патрабуецца вялікае напружанне сіл у барацьбе з ворагамі Савецкай дзяржавы, дапамога фронту. Неабходна, гаварыў ён, умацоўваць рэвалюцыйны парадак у тылах, выбіраючы ў мясцовыя органы Савецкай улады лепшых людзей з асяроддзя рабочых і бядняцка-серадняцкіх слаёў сялянства.

На ўспамін пра гэту сустрэчу быў зроблены фотаздымак, на якім Калінін сфатаграфаваны разам з вялікай групай жыхароў горада на пероне чыгуначнага вакзала.

У азнаменаванне наведвання Оршы і яе наваколля М.І. Калініным на фасадзе будынка вакзала з заходняга боку ўстаноўлена дошка.

Б.Ф. Шалуха.

З успамінаў А. Камінскай, былой рабочай саўгаса «Межава»

Было гэта ў 1919 г., месяца дакладна не памятаю. Жыла я тады ў в. Ліпкі непадалёку ад Оршы. Тут было размешчана павятовае ўпраўленне па сельскай гаспадарцы. Муж мой даглядаў коней, што былі ў вёсцы і якія былі перададзены з памешчыцкіх маёнткаў. Я была кухаркай у невялічкай сталовай для служачых.

Год той быў вельмі галодны: хлеб цанілі на вагу золата, да вясны захавалася толькі крыху бульбы ды сачавіцы. Не вельмі густа!

Аднойчы раніцай, як толькі развіднела, у канцылярыю зайшоў незнаёмы чалавек. Ён быў апрануты ў звычайнае паліто, на нагах — боты, у акулярах, барада клінком. Зусім не багатае было на ім адзенне. Ён пачакаў, пакуль збяруцца служачыя, а калі тыя прыйшлі, пачаў гутарыць з імі. Цікавіўся, як ідуць сельскагаспадарчыя справы на вёсцы. Многае я тады не разумела. Спытала ў кагосьці, хто гэта такі. Мне адказалі, што да нас завітаў сам Міхаіл Іванавіч Калінін з цэнтра.

Мне загадалі рыхтаваць снеданне (набліжалася ўжо 10 гадзін). А гэта было вельмі цяжка: адварыла бульбу, асобна — вяленую воблу, знайшоўся і хлеб. Чаю не рыхтавала, бо цукру ў той час не было. Прынесла і падала на стол нашаму дарагому госцю. Ён еў і пахвальваў. Потым запытаўся ў мяне, дзе я працавала раней. Я расказала, што яшчэ з маленства пачала батрачыць у паноў, дзевяць гадоў запар мыла іх бялізну, і вось толькі зараз пачалі адыходзіць мае стомленыя рукі.

Міхаіл Іванавіч распытваў падрабязна, як жылося пры памешчыках, а потым так ветліва і далікатна сказаў:

— Можа я вас затрымліваю, дык выбачайце!..

Хутка падалі шарабан, і М.І. Калініна адвезлі ў горад.

З таго часу адбылося шмат падзей, але кароткая сустрэча з відным дзеячам партыі і дзяржавы назаўсёды пакінула ў мяне незабыўнае ўражанне.

З Леніным у сэрцы

З успамінаў С.Я. Сянчылы

СЯНЧЫЛА Сяргей Якаўлевіч нарадзіўся ў 1904 г. на Аршаншчыне. Скончыў у Оршы адзіную працоўную школу другой ступені. Удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У 1920-х гадах служыў на Заходнім фронце. Пазней быў курсантам аб'яднанай ваеннай школы імя Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта. Генерал-маёр у адстаўцы. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 3 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Суворава 2-й ступені, 9 ордэнамі Кутузава 2-й ступені, медалямі.

У 1920-х гадах я вучыўся ў школе імя ВЦВК у Крамлі, ахоўваў савецкі ўрад і правадыра савецкага народа У.І. Леніна.

Ініцыятарам арганізацыі гэтай школы, на той час першых Маскоўскіх кулямётных курсаў, быў Ленін. Па яго патрабаванні курсы былі адкрыты 21 снежня 1917 г., за некалькі месяцаў да стварэння Чырвонай Арміі, у Круціцкіх казармах Масквы. Потым іх перавялі ў Крэмль, а курсантам даручылі яго ахову.

Нягледзячы на занятасць, Уладзімір Ільіч удзяляў вялікую ўвагу крамлёўскім курсантам: цікавіўся вучэбнымі праграмамі, гутарыў з камандзірамі, выкладчыкамі, курсантамі, выступаў на сходах асабістага саставу, прымаў парады выпускнікоў, дапамагаў у наладжванні быту курсантаў, разам з імі працаваў у час суботнікаў.

Ленін часта бываў у нас у казармах і заўсёды праяўляў вялікі клопат пра кожнага з нас. Аднойчы ноччу Уладзімір Ільіч зайшоў да нас у казарму. Дзяжурны па роце курсант залішне гучна далажыў таварышу Леніну, але той у сваю чаргу ледзь чутна сказаў: «Ціш-шэй». Ленін ціха абыходзіў памяшканне, спыняўся каля ложкаў, цікавіўся чысцінёй бялізны, памяшкання, яго афармленнем і г. д. Каля аднаго з ложкаў заўважыў спушчаную коўдру, паправіў яе і клапатліва накрыў курсанта.

Ленін любіў дысцыпліну і сам ніколі не дапускаў ніякіх парушэнняў. Аднойчы ў час кангрэса Камінтэрна ён з'явіўся ў школе з

групай замежных дэлегатаў. Адзін з дэлегатаў Венгрыі спыніўся каля паста, спытаў паруску: «Гэта салдат рэвалюцыі?» «Так, — адказаў Уладзімір Ільіч, — гэта воін Чырвонай Арміі, курсант». Дэлегат падышоў бліжэй да вартавога, хацеў абняць яго. Уладзімір Ільіч з усмешкай, але строга прамовіў:

«Вартавы — асоба недатыкальная. Яму неабходна прад'явіць мандат», — і сам першы яго паказаў, а за ім і таварыш з Венгрыі.

Вартавыя каля варот Крамля добра ведалі Уладзіміра Ільіча ў твар, і ён звычайна ўваходзіў ці ўязджаў у Крэмль без прад'яўлення пропуска. Неяк ён выехаў з Крамля, а за гэты час варта змянілася. На пост каля Спаскіх варот заступіў вартавы, які не ведаў Леніна ў твар і затрымаў яго. Уладзімір Ільіч папрасіў вартавога выклікаць начальніка каравула. Той загадаў прапусціць Леніна, а сам далажыў каменданту Крамля П.Д.Малькову. Крыху пазней каменданту пазваніў Ленін: «Таварыш Малькоў, прашу адзначыць вартавога, які зараз стаіць на пасту каля Спаскіх варот. Добры таварыш. Ведае свае абавязкі і выдатна нясе службу».

Паводле традыцыі, якая складалася ў Крамлі, выпускі курсантаў праводзілі Ленін ці Калінін. На адзін з выпускаў прыйшоў Уладзімір Ільіч і выступіў з палымянай прамовай. Ён расказаў пра становішча Савецкай Расіі, наступленні панскай Польшчы і белагвардзейскіх банд Урангеля, выказаў ўпэўненасць, што ўсе напады Антанты будуць адбіты, бо нельга перамагчы народ, які абараняе сваю родную ўладу.

У гутарцы з Леніным курсанты-выпускнікі выказвалі жаданне хутчэй трапіць на фронт, казалі, што яны гатовы памерці за ўладу Саветаў. На гэта Уладзімір Ільіч заўважыў, што ісці ў бой трэба не за смерцю, а за перамогай, пасля якой жыццё павінна стаць цудоўным.

У гады грамадзянскай вайны і барацьбы за станаўленне савецкай дзяржавы крамлёўскія курсанты часта выязджалі на франты і змагаліся з белагвардзейскімі войскамі, і амаль кожны раз іх праводзіў Ленін. Пра гераізм курсантаў-крамлёўцаў гаварылі самі белагвардзейцы.

У 1920 г. ў памяць крамлёўскіх курсантаў, якія загінулі ў грамадзянскую вайну, пастаўлены помнік, а каля яго насыпана зямля з мясцін гераічных баёў.

Крамлёўскія курсанты бачылі гіганцкую работу, якую праводзіў Ленін па стварэнні і ўмацаванні Савецкай улады, таму імкнуліся ўспрымаць яго высакародныя рысы характару, любоў да Радзімы і свайго народа. У 1922 г. за вялікі клопат і бацькоўскія адносіны Леніна да іх курсанты выбралі яго ганаровым курсантам, а ў 1923 г. — ганаровым камандзірам школы імя ВЦВК і выдалі адпаведныя граматы, якія Ленін з удзячнасцю прыняў.

У студзені 1924 г. мне давялося быць у ганаровай варце на Краснай плошчы і праводзіць Леніна ў яго апошні шлях. Я быў адным з першых вартавых ганаровага каравула каля Маўзалея Леніна.

Яны змагаліся за ўладу Саветаў на Аршаншчыне

Спіс складзены на падставе Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 28 кастрычніка 1967 г. і 21 чэрвеня 1968 г. аб узнагароджанні ордэнамі і медалямі СССР актыўных удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, якія вызначыліся ў барацьбе за ўстанаўленне Савецай улады ў 1917 — 1922 гг.

Абухоўскі Сямён Васілевіч, Акімаў Андрэй Фёдаравіч, Аляксеенка Уладзімір Андрэевіч, Арлоў Карп Рыгоравіч, Асіноўскі Залман-Нісон Гіршавіч, Ашуркаў Ігнацій Фёдаравіч, Балотнікаў Міхаіл Макаравіч, Банадысеў Павел Мікітавіч, Барэйша Андрэй Карнілавіч, Батурэвіч Фёдар Васілевіч, Бахматаў Іван Купрыянавіч, Бераза Пётр Яўстаф'евіч, Берасцюк Міхаіл Акімавіч, Блізняцоў Дзмітрый Макаравіч, Бляхер Хоня Самуілавіч, Бондараў Пётр Аляксандравіч, Бохан Мікалай Цімафеевіч, Вазміцель Андрэй Давыдавіч, Вакар Сафон Паўлавіч, Валакіцін Аляксандр Яфімавіч, Валакіцін Емяльян Іванавіч, Васілеўскі Фёдар Ціханавіч, Васілеўскі Піліп Рыгоравіч, Васільеў Аляксандр Аляксандравіч, Ветраў Мікалай Іванавіч, Галаганаў Іван Сямёнавіч, Гарохаў Андрэй Сцяпанавіч, Гаўрыненка Мікалай Гаўрылавіч, Гняцко Міхаіл Іосіфавіч, Госцеў Міхаіл

Захаравіч, Гратвол Якаў Мацвеевіч, Грусман Абрам Гамшэевіч, Грыгар'еўскі Капітон Максімавіч, Жарскі Станіслаў Вікенцьевіч, Жолудзеў Іосіф Захаравіч, Жолудзеў Патап Ціханавіч, Жукаў Лявон Епіфанавіч, Жукоўскі Макарый Ільіч, Жылінскі Уладзімір Мікалаевіч, Забалоцкі Рыгор Іванавіч, Зеленаў Фёдар Міхайлавіч, Капашылаў Радзівон Барысавіч, Карабіцкі Георгій Іванавіч, Каралёў Ягор Ільіч, Качанаў Трафім Якаўлевіч, Качук Аляксандр Мацвеевіч, Кеўдаў Пракофій Іванавіч, Кісліца Іван Іванавіч, Комлеў Леанід Рыгоравіч, Крылоў Міхаіл Аляксандравіч, Кутневіч Антон Сысоевіч, Кучко Кузьма Аляксандравіч, Лагуцін Аляксандр Іванавіч, Лаўрыновіч Іван Аляксандравіч, Лісіца Кандрат Максімавіч, Лучыноўскі Станіслаў Васілевіч, Лявоненка Ісаак Яўсеевіч, Лясун Міхаіл Яфімавіч, Магер Іван Аляксандравіч, Марковіч Гдалій Мендзялеевіч, Мартусевіч Васіль Андрэевіч, Марціновіч Іван Астапавіч, Мацулеў Георгій Сямёнавіч, Міласердны Кірыл Карпавіч, Міхалёў Ігнацій Пахомавіч, Мухамедзян Горай Мухарлянавіч, Навумовіч Сямён Сямёнавіч, Ніжнікаў Ніканор Іванавіч, Новікаў Данііл Цімафеевіч, Падбярозскі Аляксандр Станіслававіч, Паўлоўскі Міхаіл Іванавіч, Платонаў Сямён Іванавіч, Пракаповіч Гаўрыіл Сцяпанавіч, Пракудзін Георгій Карпавіч, Пяроў Пётр Васілевіч, Пятун Андрэй Аляксеевіч, Радзівонава Пелагея Сяргееўна, Родкін Фёдар Аксёнавіч, Рыжанскі Іосіф Нічыпаравіч, Сакалоў Аляксандр Васілевіч, Сакомскі Сямён Рыгоравіч, Салдаценка Міхаіл Пятровіч, Салтановіч Іван Захаравіч, Самацыстаў Парфен Фаміч, Сафрановіч Міхаіл Мікалаевіч, Сачкоў Севасцьян Акімавіч, Свярчкоў Аляксандр Іларыёнавіч, Сіўцоў Іван Яфімавіч, Сіянін Міхаіл Данілавіч, Стаховіч Пётр Міхайлавіч, Сядзінкіна Людвіга Адольфаўна, Сямёнаў Аляксандр Мінавіч, Тарасаў Епіфан Макеевіч, Тарасевіч Іван Лукіч, Трыгубенка Трафім Рыгоравіч, Тузлукаў Міхаіл Мікалаевіч, Туровіч Адам Іосіфавіч, Уродаў Капітон Макаравіч, Фейгін Самуіл Аронавіч, Фралкоў Мікалай Уладзіміравіч, Халаба Савелій Іванавіч, Харэвіч Іван Савельевіч, Ходасаў Сяргей Іванавіч, Хутарэцкі Ісаак Барысавіч, Цеплякоў Аўрам Яўменавіч, Цімошын Мікалай Аляксандравіч, Ціханаў Васіль Васілевіч, Чукасаў Васіль Аляксандравіч, Шабека Георгій Іванавіч, Шандалесаў Мікіта Іосіфавіч, Шастакоў Фёдар Іванавіч, Шатраўка Васіль Васілевіч, Шаўкун Сямён Пракопавіч, Шурмін Васіль Піліпавіч, Шчарбінскі Георгій Цярэнцьевіч, Шышкоў Цімафей Давыдавіч, Юркевіч Ілья Іванавіч, Яўроў Мітрафан Іосіфавіч.

Філіял Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці ў г. Орша, ф. 27, воп. 4. спр. 172, л. 52 — 53, спр. 129, л. 51 — 63.

На мірных рэйках

Перамога над унутранымі і знешнімі ворагамі дала магчымасць маладой Савецкай краіне перайсці да мірнага гаспадарчага будаўніцтва. Цэнтр цяжару ўсёй работы перамясціўся на ліквідацыю вынікаў чатырохгадовай імперыялістычнай і трохгадовай грамадзянскай войнаў.

Эканамічнае становішча Оршы ў той час было вельмі цяжкім. У горадзе не працавалі многія прамысловыя прадпрыемствы, іншыя з-за недахопу сыравіны, паліва і зношанасці абсталявання вымушаны былі часта прастойваць, што непазбежна прыводзіла да скарачэння аб'ёмаў вытворчасці. У запушчаным стане знаходзілася чыгунка і яе службы. Паравозы і вагоны патрабавалі доўгачасовага рамонту або поўнай замены. Не хапала рэек і шпал для неадкладнага абнаўлення пуцей.

Перад мясцовымі дзяржаўнымі і партыйнымі органамі паўстала задача выключнай важнасці — у кароткі тэрмін аднавіць народную гаспадарку, стварыць перадумовы для перабудовы эканомікі. Нездарма гэта актуальнае пытанне было ў цэнтры ўвагі дэлегатаў павятовай канферэнцыі РКП(б) і павятовага з'езду Саветаў, якія адбыліся ў сакавіку 1920 г.

У працоўных калектывах узмацнялася выхаваўчая і арганізатарская работа, праводзіліся суботнікі і нядзельнікі, накіраваныя на ліквідацыю разрухі, наладжванне работы прамысловасці і транспарту. З вялікім энтузіязмам працавалі жыхары горада 1 мая 1920 г.

Аршанскія павятовыя выканком, камітэт РКП(б) і прэзідыум партбюро. 1921 г.

на Усерасійскім суботніку. Звыш 10 тысяч чалавек адпрацавалі ўвогуле 52 164 гадзіны. Яны бясплатна выпускалі гатовую прадукцыю, рамантавалі абсталяванне, прыбіралі і азелянялі родны горад. Вызначыліся на суботніку чыгуначнікі. Работнікі паравознага дэпо адрамантавалі ў той дзень некалькі лакаматываў і вагонаў паставілі на рэйкі 50 і загрузілі дровамі 32 вагоны. Усе будні чыгуначнікаў у тыя гады былі напоўнены ўдарнай стваральнай працай. У спякоту і сцюжу выходзілі яны на перагоны, каб нарыхтаваць і вывезці паліва, без якога не мог працаваць транспарт.

У сакавіку 1921 г. X з'езд РКП(б) аб'явіў аб пачатку пераходу ад ваеннага камунізму да новай эканамічнай палітыкі. Гэту вестку пралетарская Орша сустрэла з разуменнем. Працоўныя горада былі ўпэўнены ў тым, што НЭП дасць магчымасць ажывіць вытворчасць і гандаль, паскорыць аднаўленне народнай гаспадаркі, назапасіць сродкі для стварэння цяжкай індустрыі.

Пераход да НЭПа станоўча адбіўся на гаспадарчым становішчы горада. Ужо ў 1921 г. былі адноўлены скураны і мылаварны заводы, адкрыты шавецкая і шорная майстэрні, кузня для рамонту сельскагаспадарчага інвентару. Палепшылася забеспячэнне прадпрыемстваў сыравінай і палівам. Рабочыя пачалі своечасова атрымліваць заработную плату, прычым частка яе выдавалася натурай: хлебам, бульбай, фуражом, мануфактурай. Сярэдні заробак наблізіўся да пражытачнага мінімуму. Намеціліся таксама зрухі да лепшага ў працаўладкаванні, у павелічэнні занятасці гарадскога насельніцтва.

Паступова нармалізавалася жыццё чыгуначнага вузла, аднаўляліся і пашыраліся вагоннае і паравознае дэпо. У 1922 г. завяршылася будаўніцтва чыгункі Орша — Унеча, а ў 1926 г. — Орша — Лепель. Станцыя Орша ператварылася ў буйны чыгуначны вузел.

У аднаўленчы перыяд шмат увагі надавалася падрыхтоўцы кадраў для народнай гаспадаркі. З гэтай задачай паспяхова спраўляўся Аршанскі рабфак. Першы яго выпуск адбыўся ў 1922 г. Усе 12 выпускнікоў — дзяцей рабочых і сялян — атрымалі накіраванні ў вышэйшыя навучальныя ўстановы: адны — на медыцынскі факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, другія — у інстытут інжынераў шляхоў зносін у Петраградзе. Усяго за першыя пяць выпускаў рабочы факультэт

Дэлегаты 1-й Аршанскай канферэнцыі «Саюза металістаў». 1924 г.

закончыў 401 чалавек. У большасці сваёй яны ўліліся ў рады студэнцтва і сталі затым высокакваліфікаванымі спецыялістамі рознага профілю, дзеячамі навукі і культуры. У час знаходжання ў Оршы ў маі 1926 г. старшыня ЦВК БССР А. Чарвякоў наведаў рабфак і звярнуўся да яго выпускнікоў з наступнымі словамі: «Аршанскі рабочы факультэт выпускае новую дружыну адукаваных рабочых і сялян. Гэтым самым выконвае сваю задачу падрыхтоўкі да працы, да кіраўніцтва дзяржавай працоўных ад станка і сахі».

Асаблівая ўвага ў аднаўленчы перыяд надавалася буйным прадпрыемствам, якія мелі найбольш важнае народнагаспадарчае значэнне. У 1924 і 1925 гг. узніклі новыя дзяржаўныя і кааператыўныя прадпрыемствы. Сярод іх найбольшай колькасцю працуючых вызначаліся дзяржаўная швейная майстэрня і кааператыўная арцель рамізнікаў, якая спецыялізавалася на перавозцы грузаў. Тады ж піваварны завод перайшоў у падпарадкаванне Савета Народнай гаспадаркі БССР і стаў прадпрыемствам рэспубліканскага значэння.

З мэтай паказу першых поспехаў у адбудове народнай гаспадаркі і распаўсюджвання лепшага вопыту ў кастрычніку 1924 г. была праведзена Аршанская акруговая выстаўка. На ёй былі прадстаўлены вырабы прамысловых прадпрыемстваў, саматужных промыслаў, дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю, прадукцыя сельскай гаспадаркі.

У той час у буйной прамысловасці пераважала грамадская ўласнасць, існавала дзяржаўная манаполія ў знешнім гандлі. Але немалаважнае значэнне для паляпшэння жыцця насельніцтва мелі таксама дробныя прыватныя прадпрыемствы. У 1926 г. ў горадзе налічвалася 271 прадпрыемства саматужнай прамысловасці. На іх было занята крыху больш за 440 рабочых-краўцоў, шаўцоў, бондараў, пекараў і г. д. Вышукваючы грашовыя сродкі і сыравіну, павялічваючы вытворчасць, яны садзейнічалі насычэнню ўнутранага рынку таварамі першай неабходнасці і прадуктамі харчавання.

Ажыўленне вытворчасці прыводзіла да пашырэння гандлю. У горадзе дзейнічала каля 200 прыватных гандлёвых кропак. Але дзяржаўныя і кааператыўныя ўстановы, якіх было напалавіну менш, пераўзыходзілі іх па агульным гандлёвым абароце.



Рабочыя механічнага завода Славінскага. 1928 г.

Да 1925/26 гаспадарчага года працоўныя Оршы дабіліся далейшых значных поспехаў у аднаўленні прамысловасці. Былі пушчаны два цагельныя заводы, металічная майстэрня з ліцейным аддзяленнем, лесапільны завод, арганізаваны новыя прамысловыя арцелі «Чырвоны Кастрычнік», «Камунар», «Хімтэкстыль». Агульная сума сродкаў, якія былі затрачаны на аднаўленне прамысловасці, дасягнула 117 тыс. рублёў, з іх 100 тыс. — са сродкаў прыбытку.

Да 10-й гадавіны Кастрычніка дала ток гарадская электрастанцыя магутнасцю 160,4 кілавата. А незадоўга да гэтага, у ліпені 1927 г., адбылася закладка буйнейшай па тым часе электрастанцыі на Асінаўскіх балотах — будучай Беларускай ДРЭС.

У маі 1929 г. IX Усебеларускі з'езд Саветаў зацвердзіў 1-ы пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі Беларусі. Прадугледжвалася ажыццявіць шырокую праграму стварэння ў рэспубліцы буйной індустрыі. Для гэтага неабходна было рэканструяваць наяўныя і пабудаваць новыя вытворчыя магутнасці. У Оршы пачалося будаўніцтва буйнейшых у рэспубліцы мясакамбіната, ільнокамбіната, сілікатнага завода і іншых прадпрыемстваў. Для ажыццяўлення індустрыялізацыі працоўныя горада рабілі свой уклад у накапленне грашовых сродкаў, аддавалі частку заробкаў у пазыкі «Пяцігодку — за чатыры гады!», «Трэці — рашаючы год пяцігодкі», «Чацвёрты — завяршальны год пяцігодкі». Значныя сумы для фінансавання буйных аб'ектаў у Оршы паступалі і з агульнасаюзнага бюджэту.

Як і па ўсёй краіне, у Оршы разгарнуліся сацыялістычнае спаборніцтва і рух ударнікаў, барацьба за ажыццяўленне лозунга «Пяцігодку — за чатыры гады!». Так, рабочыя льнокамбіната пастанавілі не пакідаць вытворчасць да канца пяцігодкі і датэрмінова выканаць яе, а 52 найбольш актыўныя працаўнікі аб'явілі сябе ўдарнікамі і стварылі брыгады імя 518 прадпрыемстваў СССР, якія ўступалі ў строй у трэцім, рашаючым годзе пяцігодкі.

У 1931 г. з 1700 рабочых Аршанскага аддзялення цягі 1197 чалавек былі ахоплены спаборніцтвам. Наогул чыгуначнікі заўсёды востра адчувалі пульс жыцця, задавалі тон у рабоце. У перыяд першых пяцігодак яны

Пасёлак Выдрыца. 1930-я гады.

выступалі ініцыятарамі многіх карысных спраў. Дзякуючы ўмелай арганізацыі працы паравознікі змаглі паставіць усесаюзны рэкорд па скарачэнні прастою лакаматываў у пад'ёмным рамонце, павысіць вагавыя нормы паяздоў, якія яны вадзілі па ўчастках Орша — Смаленск і Орша — Барысаў, на 500 тон, а тэхнічную скорасць — на 12 — 15 км у гадзіну. Слава аб аршанскіх працаўніках сталёвых магістраляў разносілася па ўсім Савецкім Саюзе. У 1934 г. аршанскія паравознікі занялі 1-е месца ва Усесаюзным спаборніцтве, якое арганізавалі Народны камісарыят шляхоў зносін, палітупраўленне НКШЗ, ЦК чыгуначнікаў разам з рэдакцыямі газет «Правда» і «Труд».

Мабілізацыя ўнутраных рэзерваў, дапамога брацкіх саюзных рэспублік і, галоўнае, самаадданая праца саміх рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў дазволілі аршанцам паспяхова справіцца з выкананнем грандыёзных задач індустрыялізацыі. За гады першай пяцігодкі ў горадзе ўступілі ў строй новыя прадпрыемствы: у 1929 г. — вапняковы і лесапільны заводы, механічная хлебапякарня, у 1930 г. — першая чарга льнокамбіната — ільночосальная фабрыка, мясакамбінат, элеватар, у 1931 г. — электрападстанцыя, у 1932 г. — машынна-трактарныя майстэрні. У механічны і чыгуналіцейны завод «Чырвоны барацьбіт» былі пераўтвораны слясарна-механічныя майстэрні.

Падзеяй выключнай важнасці стаў пуск 8 лістапада 1930 г. першынца энергетыкі нашай рэспублікі — Беларускай ДРЭС, пабудаванай па плану ГОЭЛРО. Гэта станцыя садзейнічала больш інтэнсіўнаму развіццю не толькі Оршы, але і іншых прамысловых цэнтраў Беларусі: Віцебска, Магілёва, Шклова, зрабіла адчувальны ўплыў на выкананне заданняў першых пяцігодак, на сацыяльна-культурнае развіццё нашага краю.

Ужо з самага пачатку вытворчай дзейнасці новых прадпрыемстваў стабілізаваліся і колькасна раслі іх працоўныя калектывы. Так, на льночасальнай фабрыцы льнокамбіната ў 1930 г. было занята 250 чалавек, на мясакамбінаце — 110, на лесапільным заводзе — 109. Усяго на канец першай пяцігодкі ў горадзе працавалі 22 прамысловыя прадпрыемствы і 11 арцелей прамысловай кааперацыі з агульнай колькасцю рабочых 2288 чалавек. У 1928 — 1932 гг. узніклі арцелі «Днепр» (канатна-вяровачная), «Чырвоны металіст», «Працоўны харчавік», «Чырвоны утыльшчык» і інш. Дзякуючы ім былі створаны сотні новых рабочых месц.

З развіццём прамысловасці расло і насельніцтва Оршы. Без уліку жыхароў чыгуначнага пасёлка, які ў той час не ўваходзіў у склад горада, колькасць гараджан з 22 579 у 1927 г. павялічылася да 32 153 чалавек у 1932 г. Амаль 10 тыс. чалавек за 5 гадоў! Такога шпаркага прыросту не назіралася ў гісторыі Оршы на працягу многіх стагоддзяў.

У гады 1-й пяцігодкі, якая адначасова была аб'яўлена пяцігодкай калектывізацыі сельскай гаспадаркі, працоўныя калектывы індустрыяльнай Оршы пачалі аказваць значную практычную дапамогу працаўнікам вёскі. Наладжвалася масава-культурная работа сярод сялян, у час сяўбы і жніва праходзілі сумесныя суботнікі, агульнымі намаганнямі ствараліся новыя калгасы. Многія заводы і арцелі горада выпускалі для калектыўных і індывідуальных гаспадарак рабочы інвентар. У прыватнасці, запасныя часткі да сельскагаспадарчых машын пачаў вырабляць пасля рэканструкцыі завод «Чырвоны барацьбіт».

У студзені 1934 г. XV з'езд КП(б) Беларусі адобрыў асноўныя паказчыкі і напрамкі 2-га пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі. Ім прадугледжвалася завяршэнне будаўніцтва буйных прамысловых прадпрыемстваў у Оршы: льнокамбіната, сілікатнага завода і інш. Ставілася задача па расшырэнні вытворчасці на дзеючых заводах і фабрыках, значным павышэнні прадукцыйнасці працы. На прадпрыемствах Оршы разгарнуўся масавы рух рабочых за лепшае выкарыстанне тэхнікі і высокую арганізацыю

працы. Прыкладам у гэтым плане мог служыць завод «Чырвоны барацьбіт», які пераўтварыўся ў дзяржаўнае прадпрыемства, аснашчанае машынамі і абсталяваннем і ўкамплектаванае кадрамі інжынерна-тэхнічнага персаналу. У 1933 г. план па выпуску валавай прадукцыі быў выкананы на 100,3 працэнта, а па прадукцыйнасці працы — на 115,2 працэнта.

У горадзе рэгулярна праводзіліся «дні ўдарнікаў», «стаханаўскія суткі», «стаханаўскія пяцідзённікі». У «дзень ударніка» на заводзе «Чырвоны Кастрычнік» вытворчая праграма была выканана на 148,5 працэнта. Асобныя працаўнікі дабіліся яшчэ больш высокіх паказчыкаў. Настройшчык цэха машыннага тэкса камсамолец Гарбачоў выканаў вытворчае заданне на 413 працэнтаў, а работніца Нікіціна — на 331. Надзвычай высокай выпрацоўкі дасягнуў у «стаханаўскі дзень», які прайшоў 4 студзеня на будаўніцтве льнокамбіната, муляр Верхавінін. Разам з памочнікам ён за змену ўклаў 9250 цаглін і тым самым у 13 разоў перакрыў устаноўленую норму.

Ільнокамбінат будаваўся і адначасова выдаваў гатовую прадукцыю. У гады 2-й пяцігодкі там разгарнуўся масавы рух шматстаночніц. Сярод лепшых былі Марыя Глушанкова, Кацярына Мядзведзева, Галіна Максімава і іншыя, якія працавалі на васьмі станках. У ткацкім цэху была арганізавана стаханаўская школа, у якой маладыя работніцы вучыліся ў больш вопытных прафесійнаму майстэрству. Неўзабаве на пашыраную зону абслугоўвання (чатыры станкі замест двух) перайшлі 24 маладыя ткачыхі. У першы дзень «стаханаўскай дэкады», якая пачалася 21 верасня 1936 г., калектыў сілікатнага завода даў краіне 67 500 штук цэглы пры плане 42 тысячы. Змена майстра Капусціна выпрацавала 35 тысяч цаглін.

У кастрычніку 1935 г. адбыўся першы раённы злёт стаханаўцаў аршанскай прамысловасці. У рабоце яго ўдзельнічала 280 перадавікоў вытворчасці льнокамбіната, мясакамбіната, завода «Чырвоны барацьбіт» і іншых прадпрыемстваў горада і раёна.

На пачатак 1936 г. агульная колькасць стаханаўцаў у Оршы, без уліку чыгуначнікаў, дасягнула 800 чалавек. Сумленнымі адносінамі да працы вызначаліся многія рабочыя і служачыя лакаматыўнага дэпо, іншых вытворчых падраздзяленняў чыгуначнага вузла. У 1936 г. ЦВК СССР адзначыў высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі групу стаханаўцаў-чыгуначнікаў. Ордэн Леніна быў уручаны былому начальніку палітаддзела Аршанскага аддзялення службы эксплуатацыі В. Кірылаву, ордэн «Знак пашаны» — начальніку Аршанскай дыстанцыі сувязі, члену савета пры Наркамаце шляхоў зносін І. Манькоўскаму.

Кожны год 2-ой пяцігодкі быў адзначаны пускам новых прадпрыемстваў і цэхаў. У 1933 г. пачаў работу масласырзавод, у наступным узнікла панчошная арцель. У 1935 г. на мясакамбінаце ўступілі ў строй кансервавы цэх і халадзільнік. Да 1937 г. было поўнасцю завершана будаўніцтва асноўных вытворчасцей ільнокамбіната — прадзільнага, ткацкага і аддзелачнага, здадзены ў эксплуатацыю дапаможныя службы.

ЯБЛОНСКІ Іван Віктаравіч, н. ў 1899, в. Алянец Ашмянскага р-на, рабочы завода «Спартак», пражываў у Оршы. Асуджаны 22.9.1938. Расстраляны 29.11.1938. Рэабілітаваны 1.10.1959.

ЯЗВІНСКІ Антон Мікалаевіч, н. ў 1910, в. Камароўшчына Езярышчанскага р-на, электраманцёр Аршанскага льнокамбіната, пражываў у Оршы. Асуджаны 25.5.1938. Расстраляны 10.12.1938. Рэабілітаваны 9.10.1989.

ЯКАЙЦІС Аляксандр Іванавіч, н. ў 1882, г. Вільнюс, вагаўшчык станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 28.10.1927 да ссылкі ў Валагодскую вобл. тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 20.9.1991.

ЯКІМОВІЧ Пётр Дзмітрыевіч, н. ў 1909, г. Орша, рабочы станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 28.9.1938. Рэабілітаваны 28.11.1959.

ЯКУБЛЕВІЧ Канстанцін Аляксандравіч, н. ў 1876, г. Раслаўль Смаленскай вобл., тэхнік станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 7.12.1937. Расстраляны 19.1.1938. Рэабілітаваны 28.10.1989.

ЯКУБОВІЧ Зальман Вольфавіч, н. ў 1916, Лодзінскае ваяводства, ваеннаслужачы, да арміі пражываў у Оршы. Асуджаны 30.10.1943 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 6.9.1979.

ЯКУБОВІЧ Іван Іванавіч, н. ў 1897, Мінск, дыспетчар аддзялення руху станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 8.6.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 7.5.1955.

ЯКУШЫК Мартын Сільвестравіч, н. ў 1888, м. Картуз-Бяроза, машыніст дэпо станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 2.10.1931 да ссылкі на Поўнач на 3 гады. Рэабілітаваны 2.10.1989.

ЯЛЕЦКІ Канстанцін Сцяпанавіч, н. ў 1892, в. Карчава (Карчова) Навагрудскага пав., пенсіянер, пражываў у Оршы. Асуджаны 20.5.1938. Рэабілітаваны 20.10.1958.

ЯЛОЗА Вікенцій Вікенцьевіч, н. ў 1914, в. Машкова Аршанскага р-на, качагар дэпо станцыі Орша-Цэнтральная, пражываў у Оршы. Асуджаны 28.9.1938 на 8 гадоў. Рэабілітаваны 7.9.1960.

ЯНКОЎСКІ Мікалай Мікалаевіч, н. ў 1890, г. Орша, бухгалтар аўтагаза. Асуджаны 28.9.1937. Расстраляны 12.10.1937. Рэабілітаваны 28.7.1956.

ЯНКОЎСКІ Мікалай Станіслававіч, н. ў 1915, г. Асіповічы, машыніст паравознага дэпо станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 16.4.1938. Расстраляны. Рэабілітаваны 14.4.1958.

ЯНУМ Эдуард Рыгоравіч, н. ў 1903, г. Рыга, бухгалтар вагонарамонтнай майстэрні станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 15.8.1938. Расстраляны 14.11.1938. Рэабілітаваны 18.8.1958.

ЯНУШАЎ Піліп Рыгоравіч, н. ў 1897, г. Вільна, фармоўшчык Аршанскага цагельнага завода, пражываў у Оршы. Асуджаны 2.10.1931 на 3 гады пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах. Рэабілітаваны 16.10.1989.

ЯНУШАЎ Сямён Рыгоравіч, н. ў 1906, г. Вільна, грузчык станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 2.10.1931 на 3 гады пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах. Рэабілітаваны 16.10.1989.

ЯНУШКЕВІЧ Селівестр Вікенцьевіч, н. ў 1889, в. Прэданнікі Івянецкай воласці, рэвізор руху пры станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 7.12.1937. Расстраляны 19.1.1938. Рэабілітаваны 14.5.1957.

ЯНУШКЕВІЧ Вікенцій Міхайлавіч, н. ў 1895, в. Жывіца Дзяржынскага р-на, дзесятнік каменедрабільнага завода, пражываў у Оршы. Асуджаны 1.4.1938. Расстраляны 16.4.1938. Рэабілітаваны 16.10.1989.

ЯНУШКО Аляксей Фролавіч, н. ў 1895, г. Варшава, камандзір дывізіёна НКУС станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 20.5.1938. Расстраляны 29.7.1938. Рэабілітаваны 1.10.1957.

ЯНЧЭЎСКІ Іван Захаравіч, н. ў 1888, в. Засценак Курань Магілёўскай губ., майстар станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 23.5.1930 на 3 гады. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ЯРАШЭВІЧ Станіслаў Феліксавіч, н. ў 1910, в. Чарапоўшчына Плешчаніцкага р-на, рабочы на будаўніцтве Аршанскага льнокамбіната, пражываў у Оршы. Асуджаны 28.10.1937. Расстраляны 11.10.1937. Рэабілітаваны 29.9.1989.

ЯСІНСКІ Іван Сільвестравіч, н. ў 1912, г. Гродна, машыніст паравоза станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 23.2.1938. Расстраляны 26.3.1938. Рэабілітаваны 5.10.1957.

ЯСІНСКІ Сільвестр Максімавіч, н. ў 1881, в. Блудзень Гродзенскай губ., качагар пральні станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 28.12.1937. Расстраляны 27.1.1938. Рэабілітаваны 28.2.1961.

ЯСКЕВІЧ Аксен Іванавіч, н. ў 1891, в. Гразіна Аршанскага р-на, рабочы, пражываў у Оршы. Асуджаны 4.5.1933 да ссылкі ў Казахстан на 3 гады. Рэабілітаваны 22.11.1989.

ЯСКОВІЧ Аляксандр Георгіевіч, н. ў 1896, с. Хмара Смаленскай вобл., урач станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 10.2.1934 на 3 гады. Рэабілітаваны 20.4.1989.

ЯЎСІКЕВІЧ Канстанцін Ісакавіч, н. ў 1903, г. Орша, загадчык склада райбазы Белкаапсаюза. Асуджаны 25.9.1938. Рэабілітаваны 13.8.1957.

ЯЎХУЦІЧ Соф'я Львоўна, н. ў 1885, г. Варшава, тэлефаністка станцыі Орша, пражывала ў Оршы. Асуджана 2.10.1932 да пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах тэрмінам на 3 гады. Рэабілітавана 30.11.1989.

ЯЦКЕВІЧ Васіль Вікенцьевіч, н. ў 1903, в. Восава (Осава) Смалявіцкага р-на, староста станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 13.4.1932 да ссылкі на Поўнач на 3 гады. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ЯЦЫК Эдуард Пятровіч, н. ў 1914, Масква, намеснік начальніка станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 7.12.1937. Расстраляны 19.1.1938. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ЯЦЫНА Іосіф Ігнацьевіч, н. ў 1898, в. Усвейка Талачынскага р-на, загадчык магазіна райтрансгандальхарчу станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 15.5.1938. Расстраляны 29.7.1938. Рэабілітаваны 28.1.1958.

ЯЧНЫ Іосіф Антонавіч, н. ў 1895, хут. Крывая Дзяржынскага р-на, брыгадзір на будаўніцтве хлебагарадка, пражываў у Оршы. Асуджаны 27.12.1936 на 5 гадоў з паражэннем у правах на 2 гады. Рэабілітаваны 13.7.1960.

АРШАНСКІ РАЁН.

АБЛАВАЦКІ Аляксей Лаўрэнцьевіч, н. ў 1887, в. Владыкі Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Владыкі. Асуджаны 11.5.1932 да ссылкі ў Заходнюю Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны 27.11.1989.

АБРАШКЕВІЧ Мікалай Фёдаравіч, н. ў 1906, в. Копысь Аршанскага р-на, настаўнік Конюскай сямігодкі, пражываў у в. Копысь. Асуджаны 28.11.1937 на 3 гады. Рэабілітаваны 16.4.1992.

АЗАРОНАК Дзмітрый Піменавіч, н. ў 1913, в. Чарное Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Свядомасць», пражываў у в. Чарное. Асуджаны 10.11.1932 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 14.8.1959.

АКСАМІТ Аляксандр Міхайлавіч, н. ў 1899, в. Пілікі Мінскага р-на, аўтамеханік Аршанскага цагельнага завода, пражываў у в. Свісцёлкі Аршанскага р-на. Асуджаны 10.1.1938. Расстраляны 28.1.1938. Рэабілітаваны 31.10.1989.

АЛАНЦЬЕЎ Аляксандр Якаўлевіч, н. ў 1904, в. Малыя Салавы Аршанскага р-на, малатабоец кар'ера 533-га км Заходняй чыгункі, пражываў у в. Анібалева Аршанскага р-на. Асуджаны 14.8.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 28.10.1960.

АЛЕНСКІ (АЛІНСКІ) Пётр Фларыянавіч, н. ў 1891, в. Глінішча Уздзенскага р-на, рабочы Асінторфа, пражываў у пас. Асінторф Аршанскага р-на. Асуджаны 3.11.1938 на 10 гадоў. Памёр у заключэнні ў 1939. Рэабілітаваны 28.11.1966.

АЛЕСЕНКА Акім Паўлавіч, н.ў 1864, в. Бабінічы Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Бабінічы. Асуджаны 16.2.1938. Расстраляны 14.3.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 18.10.1989.

АЛЕХНА Фама Антонавіч, н. ў 1893, в. Рэмдзюны Вілейскай губ., электраманцёр БелДРЭС, пражываў у пас. Арэхі Аршанскага р-на. Асуджаны 21.9.1938. Расстраляны 1.10.1938. Рэабілітаваны 6.10.1958.

АЛЬТШУЛЕР Янкель Хаймавіч, н. ў 1892, г. Магілёў, цырульнік цырульні пас. БелДРЭС, пражываў у пас. Арэхі Аршанскага р-на. Асуджаны 1.11.1937. Расстраляны 11.11.1937. Рэабілітаваны 29.10.1957.

АЛЬХІМЕНКА Пётр Андрэевіч, н. ў 1886, в. Пузырова Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у

в. Пузырова. Асуджаны 22.9.1935 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 10.12.1958.

АМАНЕНКАВА Малання Мартынаўна, н. ў 1877, в. Стражава Аршанскага р-на, сялянка-аднаасобніца, пражывала ў в. Стражава. Асуджана 10.4.1930 на 3 месяцы. Рэабілітавана 11.8.1989.

АМАНЕНКАВА Малання Міронаўна, н. ў 1878, в. Судзілавічы Аршанскага р-на, сялянка-аднаасобніца, пражывала ў в. Судзілавічы. Асуджана 10.4.1930 на 2 месяцы. Рэабілітавана 11.8.1989.

АНАНЕНКА Фёдар Лук'янавіч, н. ў 1910, в. Судзілавічы Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Судзілавічы. Асуджаны 10.4.1930 на 3 месяцы. Другі раз асуджаны 30.12.1937. Расстраляны 27.1.1938. Рэабілітаваны 24.9.1960 і 11.8.1989.

АНДРЭЕВА Кацярына Іванаўна, н. ў 1901, хут. Адамава Аршанскага р-на, сялянка-аднаасобніца, пражывала на хут. Адамава. Асуджана 19.6.1929 да ссылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана 1.6.1992.

АНДРЭЕЎ Мікалай Сцяпанавіч, н. ў 1881, г. Барысаў, рахункавод-інспектар 4-га аддзялення Вязьмлага, пражываў у в. Юрцава Аршанскага р-на. Асуджаны 20.9.1938. Расстраляны 1.10.1938. Рэабілітаваны 25.9.1989.

АНДРЭЙКАЎ Фядот Юр'евіч, н. ў 1884, в. Нікіцінічы Шклоўскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Светачаўка Аршанскага р-на. Асуджаны 3.6.1935 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 14.6.1958.

АНІКЕЕЎ Аляксандр Аляксеевіч, н. ў 1908, в. Лісуны Аршанскага р-на, брыгадзір калгаса в. Лісуны, пражываў у в. Лісуны. Асуджаны 2.12.1932 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 14.8.1992.

АНІКЕЕЎ Сцяпан Іванавіч, н. ў 1882, в. Лісуны Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Лісуны. Асуджаны 2.7.1936 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 15.11.1991.

АНІНКЕВІЧ Пётр Аўгуставіч, н. ў 1896, в. Доўнары Дубровенскага р-на, лясны вартаўнік калгаса «2-я Пяцігодка», пражываў на хут. Шабаны Аршанскага р-на. Асуджаны 2.11.1938. Расстраляны 18.11.1938. Рэабілітаваны 18.9.1989.

АНКІНОВІЧ Мікалай Герасімавіч, н. ў 1898, хут. Халхоўшчына Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў на хут. Халхоўшчына. Асуджаны 26.2.1931 да ссылкі ва Усходнюю Сібір. Рэабілітаваны 29.4.1958.

АНКІНОВІЧ Яфім Пятровіч, н. ў 1893, в. Кашына Аршанскага р-на, слесар паравознага дэпо станцыі Орша, пражываў у в. Гразіна Аршанскага р-на. Асуджаны 20.5.1938. Расстраляны 29.7.1938. Рэабілітаваны 10.8.1960.

АНТАНОВІЧ Браніслава Іосіфаўна, н. ў 1903, в. Новае Сяло Аршанскага р-на, пражывала ў Оршы. Асуджана 24.2.1934 на 3 гады. Рэабілітавана 9.8.1958.

АНТОНАЎ Іван Рыгоравіч, н. ў 1864, в. Гліні Магілёўскай губ., селянін-аднаасобнік, пражываў на хут. Одвічы-Няронкі Коханаўскага р-на. Асуджаны 5.4.1929 да пазбаўлення права пражывання ў 6 населеных пунктах тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 4.6.1992.

АНТОНАЎ Кузьма Дзянісавіч, н. ў 1898, в. Якаўлевічы Аршанскага р-на, цясляр Якаўлевіцкай суконнай фабрыкі, пражываў у в. Якаўлевічы. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 9.6.1961.

АНТОНАЎ Логвін (Логін) Сідаравіч, н. ў 1901, в. Казловічы Аршанскага р-на, ветфельчар, пражываў у в. Казловічы Аршанскага р-на. Асуджаны 2.11.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 28.9.1989.

АНТРАПОВІЧ Рыгор Дзянісавіч, н. ў 1870, в. Дзяцел Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Дзяцел. Асуджаны 12.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 20.11.1989.

АРЛІКОЎСКІ Васіль Уладзіміравіч, н. ў 1896, в. Вялікае Сяло Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Вялікае Сяло. Асуджаны 12.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 22.6.1989.

АРЛОЎ Савелій Нікіфаравіч, н. ў 1891, в. Альхоўка Аршанскай акругі, хлебароб, пражываў у в. Альхоўка. Асуджаны 12.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 22.6.1989.

АРЦІШЭЎСКІ Віктар Гіляравіч, н. ў 1880, мяст. Бобр Магілёўскай губ., селянін-аднаасобнік, пражываў на хут. Прыхабы Коханаўскага р-на. Асуджаны 18.6.1929 да ссылкі ў Сібір на 3 гады. Другі раз асуджаны 1.11.1932 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 18.7.1959 і 10.4.1992.

АРЦЮШКЕВІЧ Іван Андрэевіч, н. ў 1899, в. Галашэёўка Аршанскага р-на, грузчык кар'ера 533-га км, пражываў у в. Галашэёўка. Асуджаны 24.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 6.5.1989.

АРЦЮШКЕВІЧ Канстанцін Лявонавіч, н. ў 1889, в. Галашэёўка Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Галашэёўка. Асуджаны 2.12.1932 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 10.10.1989.

АРЦЮШЭЎСКІ Сцяпан Антонавіч, н. ў 1895, в. Петкавічы Дзяржынскага р-на, ляснічы Копыскага лясніцтва, пражываў у маёнтку Ляўкі Аршанскага р-на. Асуджаны 15.10.1938. Расстраляны 14.11.1938. Рэабілітаваны 18.8.1958.

АСІПОВІЧ Максім Сямёнавіч, н. ў 1902, в. Лучыншчына Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Ленінскі шлях», пражываў у в. Лучыншчына. Асуджаны 15.9.1937. Расстраляны 30.9.1937. Рэабілітаваны 22.4.1989.

АСІПОВІЧ Мацвей Сямёнавіч, н. ў 1904, в. Лучыншчына Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Лучыншчына. Асуджаны 30.4.1933 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 17.1.1959.

АСТАПАЎ Іван Баніфацьевіч, н. ў 1876, в. Цярэні Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Цярэні. Асуджаны 3.1.1930 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 9.8.1989.

АСТАПАЎ Ігнацій Іванавіч, н. ў 1888, в. Цярэні Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Цярэні. Асуджаны 3.1.1930 на 3 гады. Рэабілітаваны 9.8.1989.

АСТАПАЎ Сямён Аўрамавіч, н. ў 1888, в. Залессе Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Залессе. Асуджаны 3.1.1930 на 3 гады. Рэабілітаваны 19.4.1989.

АСТАПАЎ Цярэнцій Іванавіч, н. ў 1904, в. Цярэні Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Цярэні. Асуджаны 3.1.1930 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 9.8.1989.

АСТАПЕНКА Іван Гаўрылавіч, н. ў 1870, в. Ком (Кош) Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Ком. Асуджаны 3.1.1930 на 1 год. Рэабілітаваны 9.8.1989.

АСТАШКЕВІЧ Канстанцін Лявонавіч, н. ў 1882, в. Хімінічы Аршанскага р-на, настаўнік Хімініцкай школы, пражываў у в. Хімінічы. Асуджаны 4.5.1933 да ссылкі на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер з заменай высылкай за межы БССР на той жа тэрмін. Другі раз асуджаны 24.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 23.11.1989.

АСТРОЎСКАЯ Антаніна Іпалітаўна, н. ў 1904, г. Уфа, сялянка-аднаасобніца, пражывала на хут. Залессе Коханаўскага р-на. Асуджана 19.6.1929 да ссылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана 29.5.1992.

АЎГУСТОЎСКІ Вячаслаў Станіслававіч, н. ў 1916, г. Орша, ваеннаслужачы. Асуджаны 12.1.1944 на 3 гады. Рэабілітаваны 15.2.1993.

АЎТУХОЎ Іван Фёдаравіч, н. ў 1885, в. Смаляны Аршанскага р-на, калгаснік калгаса імя Сталіна, пражываў у в. Смаляны. Асуджаны 24.9.1937 на 10 гадоў. Памёр у заключэнні 12.9.1943. Рэабілітаваны 30.10.1989.

АЎЧЫНКА Ігнацій Цімафеевіч, н. ў 1875, в. Жвікава Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Жвікава. Асуджаны 24.9.1937. Расстраляны 12.10.1937. Рэабілітаваны 13.6.1959.

АФАНАСЬЕЎ Сцяпан Аўгенавіч (Капырын Пётр Фролавіч), н. ў 1894, в. Кашчына Барысаўскага р-на, міліцыянер Дзяржынскага райаддзела міліцыі, пражываў у в. Аляксандрава Аршанскага р-на. Асуджаны 16.6.1930 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 31.10.1989.

АХРЫМЕНАК Рыгор Фаміч, н. ў 1899, в. Лукомль Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Лукомль. Асуджаны 12.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 22.6.1989.

БАБАШЫНСКІ Аляксандр Аляксандравіч, н. ў 1888, в. Красыні Лёзненскага р-на, дырэктар саўгаса «Бабінічы», пражываў у саўгасе Бабінічы Аршанскага р-на. Асуджаны 13.11.1938. Расстраляны 28.11.1938. Рэабілітаваны 28.11.1957.

БАБРОВА Мітрадора Кузьмінічна, н. ў 1900, в. Татарск Аршанскага р-на, хатняя гаспадыня, пражывала ў в. Татарск. Асуджана 3.3.1930 на 3 гады. Рэабілітавана 20.11.1989.

БАБРОЎ Фама Фёдаравіч, н. ў 1886, в. Вусце Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Зара свабоды», пражываў у в. Вусце. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 8.12.1989.

БАГАМОЛАЎ Леў Васілевіч, н. ў 1902, в. Андрэеўкі Смаленскай вобл., токар БелДРЭС, пражываў у пас. Арэхі Аршанскага р-на. Асуджаны 22.10.1937. Расстраляны 27.1.1938. Рэабілітаваны 17.10.1989.

БАГДАНОВІЧ Карл Францавіч, н. ў 1887, в. Старая Рудзіца Мінскага р-на, рабочы саўгаса «Забалоцце» Аршанскага р-на, пражываў у саўгасе. Асуджаны 21.1.1938. Расстраляны 20.2.1938. Рэабілітаваны 18.9.1989.

БАГІНСКАЯ Ядзвіга Паўлаўна, н. ў 1902, в. Чэрань Мінскай губ., правадніца вагонаў станцыі Орша, пражывала ў в. Забалоцце Аршанскага р-на. Асуджана 14.5.1938. Расстраляна 15.6.1938. Рэабілітавана 16.10.1989.

БАДЗЯКОЎ Андрэй Ільіч, н. ў 1904, в. Славені Шклоўскага р-на, старшыня Будаўскага сельсавета Аршанскага р-на, пражываў у калгасе «Чырвонае сяло» Аршанскага р-на. Асуджаны 12.2.1933 да вышэйшай меры пакарання з высылкай сям'і на 3 гады за межы БССР. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 15.9.1962.

БАЗЫЛЕНКА Мітрафан Іванавіч, н. ў 1886, пас. Арэхі Аршанскага р-на, рабочы на будаўніцтве БелДРЭС, пражываў у пас. Выдрыца Аршанскага р-на. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 21.6.1958.

БАЗЫЛЕНКА Трафім Іванавіч, н. ў 1876, пас. Арэхі Аршанскага р-на, пражываў у пас. Арэхі. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Памёр у заключэнні 9.4.1940. Рэабілітаваны 21.6.1958.

БАКУНОВА Еўдакія Хрысанаўна, н. ў 1907, в. Валкулакава Дубровенскага р-на, рабочая саўгаса «Бабінічы», пражывала ў в. Бабінічы. Асуджана 22.1.1935 на 5 гадоў. Рэабілітавана 4.4.1990.

БАЛБАСАЎ Фёдар Герасімавіч, н. ў 1899, в. Якаўлевічы Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Якаўлевічы. Асуджаны 12.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 5.7.1989.

БАЛБАСАЎ Ціт Герасімавіч, н. ў 1890, в. Раманаўка Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Раманаўка. Асуджаны 12.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 14.6.1989.

БАЛТУНОЎ Парфен Аляксеевіч, н. ў 1905, в. Балтуны Лёзненскага р-на, кранаўшчык торфазавода «Асінторф», пражываў на торфазаводзе. Асуджаны 16.10.1938. Расстраляны 6.11.1938. Рэабілітаваны 22.8.1989.

БАНДЭР Эдуард Іванавіч, н. ў 1906, в. Шыркі Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Шыркі. Асуджаны 27.8.1931 на 1 год. Рэабілітаваны 31.7.1989.

БАНЬКОЎ Якаў Сідаравіч, н. ў 1896, в. Зубры Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Зубры. Асуджаны 4.5.1933 да ссылкі ў Казахстан на 3 гады. Рэабілітаваны 30.11.1989.

БАРАВІК Кірыл Трафімавіч, н. ў 1869, в. Вечнасць Круглянскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Антонава Аршанскага р-на. Асуджаны 12.3.1930 да ссылкі на Поўнач на 3 гады. Рэабілітаваны 12.12.1989.

БАРАВІК Лука Міхайлавіч, н. ў 1889, в. Засценак-Вяземскі Аршанскага р-на, каваль Юрцаўскай сельскагаспадарчай калоніі Аршанскага р-на, пражываў у в. Юрцава. Асуджаны 10.2.1934 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 4.3.1958.

БАРАВІК Мірон Кандрацьевіч, н. ў 1900, в. Дубровіцы Сенненскага р-на, пуцявы абходчык станцыі Орша, пражываў на хут. Хорабрава Аршанскага р-на. Асуджаны 22.5.1937 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 11.9.1989.

БАРАВІК Міхаіл Лявонавіч, н. ў 1873, в. Засценак Аршанскага р-на, чорнарабочы торфанарыхтовак, пражываў у в. Межава Аршанскага р-на. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 27.11.1989.

БАРАВІК Фядос Міхайлавіч, н. ў 1895, в. Камякі Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Ступавое Аршанскага р-на. Асуджаны 24.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 26.6.1989.

БАРАНОЎСКІ Дзмітрый Афанасьевіч, н. ў 1881, в. Застружжа Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Чырвоны прамень», пражываў у в. Застружжа. Асуджаны 28.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 30.11.1989.

БАРАНОЎСКІ Мікалай Афанасьевіч, н. ў 1877, в. Застружжа Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Прагрэс», пражываў у в. Застружжа. Асуджаны 28.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 30.11.1989.

БАРАНОЎСКІ Мікалай Мікалаевіч, н. ў 1920, в. Застружжа Аршанскага р-на, пражываў у мяст. Копысь Аршанскага р-на. Асуджаны 9.12.1957 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 9.4.1993.

БАРЗОЎ Міхаіл Пятровіч, н. ў 1878, в. Чарное Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Марозаўка Аршанскага р-на. Асуджаны 17.5.1931. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 27.11.1989.

БАРКОЎСКІ Мікіта Андрэевіч, н. ў 1901, в. Стайкі Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Шлях да сацыялізму», пражываў у в. Стайкі. Асуджаны 14.3.1938. Расстраляны 6.4.1938. Рэабілітаваны 21.8.1989.

БАРОЗНАЎ Антон Карпавіч, н. ў 1891, в. Ляўкі Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Ляўкі. Асуджаны 22.2.1933 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 17.9.1960.

БАРОЗНАЎ Ягор Карпавіч, н. ў 1898, в. Ляўкі Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Ляўкі. Асуджаны 22.2.1933. Расстраляны. Рэабілітаваны 17.9.1960.

БАРТАСЕВІЧ Якаў Дзям'янавіч, н. ў 1880, в. Белы Лясок Пружанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Ляўкі Аршанскага р-на. Асуджаны 22.2.1933. Расстраляны. Рэабілітаваны 17.9.1960.

БАРТАШОВА Марыя Рыгораўна, н. ў 1925, в. Гарбацэвічы Аршанскага р-на, вольнанаёмная 1-га авіятэхбата, пражывала ў в. Ліпкі Аршанскага р-на. Асуджана 24.10.1947 на 10 гадоў. Рэабілітавана 22.12.1955.

БАРТАШЭВІЧ Еўдакім Самуілавіч, н. ў 1883, в. Гарбацэвічы Аршанскага р-на, рабочы льнозавода, пражываў у мяст. Копысь Аршанскага р-на. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 12.12.1989.

БАРШЧЭЎСКІ Антон Лаўрэнцьевіч, н. ў 1914, в. Кабылякі Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Кабылякі. Асуджаны 18.5.1949 да ссылкі на пасяленне. Рэабілітаваны 1.11.1990.

БАРЫСЕВІЧ Мірон Васілевіч, н. ў 1863, в. Пугляі Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Авангард», пражываў у в. Пугляі. Асуджаны 30.12.1937. Расстраляны 27.1.1938. Рэабілітаваны 23.3.1990.

БАРЫСЕНКА Пётр Антонавіч, н. ў 1890, в. Брылі Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «VII з'езд Саветаў», пражываў у в. Брылі. Асуджаны 20.11.1935 на 3 гады. Рэабілітаваны 5.11.1991.

БАСАЎ Іван Сцяпанавіч, н. ў 1892, в. Парадзіна Мсціслаўскага р-на, пражываў у в. Шчацінкі Аршанскага р-на. Асуджаны 25.5.1937 на 8 гадоў. Рэабілітаваны 20.3.1990.

БАЦЮКОЎ Фёдар Цімафеевіч, н. ў 1873, в. Татарск Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Чырвоны сцяг», пражываў у в. Татарск. Асуджаны 9.5.1935 да высылкі ў Казахстан на 3 гады. Рэабілітаваны 22.11.1989.

БЕКАРЭВІЧ Канстанцін Пятровіч, н. ў 1889, в. Салаўі Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Езяноўшчына Аршанскага р-на. Асуджаны 10.2.1934 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 4.3.1958.

БЕЛАЗОРАЎ Мікіта Міхайлавіч, н. ў 1886, в. Марозава Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «1 Мая», пражываў у в. Марозава. Асуджаны 24.9.1937. Расстраляны 24.9.1937. Рэабілітаваны 27.12.1957.

БЕЛАРУСКІ Сяргей Іосіфавіч, н. ў 1914, в. Смётанка Аршанскага р-на, ваеннаслужачы, пражываў у в. Смётанка. Асуджаны 2.10.1944 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 18.2.1958.

БЕРАСНЁЎ Герман Арцем'евіч, н. ў 1892, в. Гразіна Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Гразіна. Асуджаны 23.5.1932 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 17.8.1989.

БЕРАСНЁЎ Платон Клімавіч, н. ў 1894, в. Лявонаўка Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Лявонаўка. Асуджаны 11.5.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 1.9.1962.

БЕХШТЭДЭР Отта Генрыхавіч, н. ў 1881, г. Лібава (Латвія), рабочы торфазавода «Асінторф», пражываў у пас. Асінторф Аршанскага р-на. Асу-

джаны 10.1.1938. Расстраляны 15.3.1938. Рэабілітаваны 6.10.1989.

БІКУС Сямён Сцяпанавіч, н. ў 1895, в. Яромкавічы Навагрудскага пав., рахункавод лесаўчастка, пражываў у в. Няводнікі Аршанскага р-на. Асуджаны 5.8.1939 на 3 гады. Рэабілітаваны 1.10.1993.

БІРКЕЛЬ Аляксандр Аляксандравіч, н. ў 1907, в. Капытава Маскоўскай вобл., тэхнік-будаўнік БелДРЭС, пражываў у пас. Арэхі Аршанскага р-на. Асуджаны 4.8.1932, у тэрмін пакарання залічаны тэрмін знаходжання пад следствам 17.4.1932. Рэабілітаваны 20.1.1956.

БЛАДЫКА Іосіф Цімафеевіч, н. ў 1905, в. Рамашова Аршанскага р-на, рабочы калгаса, пражываў у в. Шанькова Аршанскага р-на. Асуджаны 24.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 16.6.1989.

БЛАЖКОЎ Мікіта Лявонавіч, н. ў 1873, в. Еліна Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Пралетарый», пражываў у в. Еліна. Асуджаны 10.11.1932 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 31.10.1989.

БЛАХОЦІНА Антаніна Андрэеўна, н. ў 1922, в. Якаўлевічы Аршанскага р-на, рабочая суконнай фабрыкі, пражывала ў в. Якаўлевічы. Асуджана 12.4.1945 на 10 гадоў. Рэабілітавана 13.10.1964.

БЛІЗНЯЦОЎ Андрэй Кузьміч, н. ў 1878, в. Тарчылава Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Чырвоны Бераг Аршанскага р-на. Асуджаны 15.4.1932 да ссылкі ў Заходнюю Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны 31.10.1989.

БЛОХАВА Аляксандра Архіпаўна, н. ў 1903, в. Тумінічы Аршанскага р-на, хатняя гаспадыня, пражывала ў в. Лісуны Аршанскага р-на. Асуджана 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітавана 25.1.1939.

БОБРЫКАЎ Герасім Нікіфаравіч, н. ў 1908, в. Чырвоны Пасёлак Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Чырвоны Пасёлак. Асуджаны 3.1.1930 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 28.6.1958.

БОБРЫКАЎ Нікіфар Карпавіч, н. ў 1875, в. Кобызы (Кобзева) Дубровенскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у пас. Чырвоны Аршанскага р-на. Асуджаны 3.1.1930 на 3 гады. Другі раз асуджаны 25.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 28.6.1958 і 23.11.1989.

БОЛЦІКАЎ Андрэй Пятровіч, н. ў 1902, в. Малая Міцькаўшчына Аршанскага р-на, прыказчык кааператыўнай лаўкі, пражываў у в. Малая Міцькаўшчына. Асуджаны 12.3.1930 на 1 год (умоўна). Рэабілітаваны 29.9.1989.

БОНДАРАЎ Кузьма Ануфрыевіч, н. ў в. Чарное Аршанскага р-на, старшыня калгаса «Свядомасць», пражываў у в. Чарное. Асуджаны 30.4.1933 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер з заменай высылкай ў Казахстан на той жа тэрмін. Рэабілітаваны 12.12.1989.

БОНЧ-АСМАЛОЎСКІ Аляксандр Іванавіч, н. ў 1887, маёнтак Расточына Смаленскай губ., селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Казіно Аршанскай акругі. Асуджаны 3.1.1930 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 25.12.1989.

БОХАН Платон Якаўлевіч, н. ў 1899, в. Туравічы Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Туравічы. Асуджаны 14.5.1933 да ссылкі ў Казахстан на 3 гады. Рэабілітаваны 22.11.1989.

БОЯР Іван Пятровіч, н. ў 1879, Латвія, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Грузды Аршанскага р-на. Асуджаны 8.3.1938 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 31.10.1989.

БРЖЭЗІНСКІ Адам Карнеліевіч, н. ў 1900, в. Пупчына Аршанскага р-на, студэнт Ленінградскага політэхнічнага інстытута, пражываў у в. Пупчына. Асуджаны 12.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 9.8.1989.

БРУКШТАН Яфім Прохаравіч, н. ў 1883, в. Салаўі Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Салаўі. Асуджаны 3.9.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 23.11.1989.

БРЫЛЕЎ Рыгор Дзянісавіч, н. ў 1869, в. Навасёлкі Аршанскай акругі, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Казнікі Аршанскага р-на. Асуджаны 15.12.1929 на 3 гады. Рэабілітаваны 9.7.1992.

БРЭД Франц Ягоравіч, н. ў 1897, Курляндская губ., рабочы БелДРЭС, пражываў на хут. Ганусін Бор Аршанскага р-на. Асуджаны 16.10.1938 на 10 гадоў. Памёр у заключэнні 19.2.1942. Рэабілітаваны 4.11.1968.

БУГАЁЎ Ларыён Ніканоравіч, н. ў 1899, в. Кулакоўшчына Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Кулакоўшчына. Асуджаны 11.3.1931 на 3 гады. Рэабілітаваны 7.5.1992.

БУЕВІЧ Аляксандр Фартунатавіч, н. ў 1882, в. Дымава Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Дымава. Асуджаны 12.3.1930 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 9.8.1989.

БУЕВІЧ Браніслаў Фартунатавіч, н. ў 1895, в. Дымава Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Дымава. Асуджаны 12.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 9.8.1989.

БУЕВІЧ Іосіф Фартунатавіч, н. ў 1889, в. Пярэста Сенненскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Дымава Аршанскага р-на. Асуджаны 12.3.1930 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 9.8.1989.

БУЛАЎКІН Павел Спірыдонавіч, н. ў 1878, в. Хімы Аршанскага р-на, рабочы арцелі «1 Мая», пражываў у в. Хімы. Асуджаны 28.9.1937. Расстраляны 13.10.1937. Рэабілітаваны 30.10.1989.

БУРДАЎ Антон Дзмітрыевіч, н. ў 1869, в. Раманаўка Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Раманаўка. Асуджаны 12.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 14.6.1989.

БУРДАЎ Іван Антонавіч, н. ў 1904, в. Раманаўка Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Раманаўка. Асуджаны 12.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 14.6.1989.

БУРДАЎ Пётр Антонавіч, н. ў 1896, в. Раманаўка Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пра-

жываў у в. Раманаўка. Асуджаны 12.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 14.6.1989.

БУЦЯН Іван Сяргеевіч, н. ў 1867, в. Андрыянава Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Андрыянава. Асуджаны 10.4.1930 на 6 месяцаў. Рэабілітаваны 11.8.1989.

БУЯШОЎ Іван Парфенавіч, н. ў 1912, в. Крынічна Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Перамога», пражываў у в. Крынічна. Асуджаны 28.11.1937. Расстраляны 21.12.1937. Рэабілітаваны 3.8.1962.

БЯЗЗУБІК Ева Васілеўна, н. ў 1885, в. Янава Копыскага р-на, сялянка-аднаасобніца, пражывала ў в. Забродзе Копыскага раёна. Асуджана 17.5.1931 на 5 гадоў. Рэабілітавана 27.11.1989.

БЯЗЗУБІК Емяльян Антонавіч, н. ў 1886, в. Малыя Міхінічы Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Забродзе Копыскага р-на. Асуджаны 17.5.1931. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 27.11.1989.

БЯЗЛЮДАЎ Адольф Адамавіч, н. ў 1900, в. Пагост Аршанскага р-на. Асуджаны 24.2.1934 на 5 гадоў, адбываў тэрмін пакарання на Беламорска-Балтыйскай будоўлі. Рэабілітаваны 15.11.1938.

БЯЗЛЮДАЎ Іван Сямёнавіч, н. ў 1884, в. Зайцава Аршанскага р-на, сезонны рабочы, пражываў у в. Зайцава. Асуджаны 24.9.1937. Расстраляны 12.10.1937. Рэабілітаваны 16.6.1989.

БЯЗЛЮДАЎ Іосіф Іванавіч, н. ў 1910, г. Орша, радыётэхнік Смаленскага акруговага ваеннага шпіталю, пражываў у г. Смаленск. Арыштаваны 31.3.1941. Звестак аб асуджэнні няма. Памёр у лагеры 21.1.1943. Рэабілітаваны 6.1.1993.

БЯЗЛЮДАЎ Іосіф Францавіч, н. ў 1889, в. Пагост Аршанскага р-на, слесар Аршанскага паравознага дэпо, пражываў у в. Пагост. Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 9.12.1937. Рэабілітаваны 23.9.1960.

БЯЗЛЮДАЎ Фларыян Адамавіч, н. ў 1903, в. Зайцава Аршанскага р-на, студэнт Ленінградскага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту, пражываў у Аршанскім р-не. Асуджаны 28.9.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 14.9.1959.

БЯЛЯЕЎ Фёдар Яўменавіч, н. ў 1908, в. Валоўцы Аршанскага р-на, рабочы-стрэлачнік станцыі Зубры, пражываў у в. Зубры Аршанскага р-на. Асуджаны 15.4.1933 да вышэйшай меры пакарання з высылкай сям'і на 3 гады на Поўнач. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 23.10.1959.

БЯЛЯЎСКІ Іван Андрэевіч, н. ў 1896, в. Крапіўна Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Прамень сацыялізму», пражываў у в. Крапіўна. Асуджаны 24.4.1945 на 15 гадоў. Рэабілітаваны 13.11.1954.

БЯРГОВІН (БЕРАГОВІН) Стафан (Сцяпан) Аляксандравіч, н. ў 1884, в. Раска Сенненскага р-на, працаваў мойшчыкам на заводзе «Пралетарый», пражываў у мяст. Копысь Аршанскага р-на. Асуджаны 21.10.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 26.9.1990.

БЯРОЗКІН Васіль Аўрамавіч, н. ў 1878, в. Лешча Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Лешча. Асуджаны 11.3.1931 да ссылкі ў Сібір. Памёр у ссылцы ў 1932 г. Рэабілітаваны 3.2.1962.

БЯРОЗКІН Герасім Аўрамавіч, н. ў 1882, в. Лешча Аршанскага р-на, калгаснік калгаса імя Молатава, пражываў у в. Лешча. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 14.7.1992.

БЯРОЗКІН Раман Аўрамавіч, н. ў 1908, в. Лешча Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Свядомасць», пражываў у в. Светачаўка Аршанскага р-на. Асуджаны 21.10.1932 на 5 гадоў. Другі раз асуджаны 25.9.1937 на 10 гадоў. Памёр у заключэнні 27.4.1944. Рэабілітаваны 28.11.1958 і 16.8.1974.

ВАЗМІЦЕЛЕЎ Васіль Піліпавіч, н. ў 1905, в. Ласыршчыкі Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Ласыршчыкі. Асуджаны 28.2.1933 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 2.11.1959.

ВАЙНІКОВІЧ Мікалай Адамавіч, н. ў 1897, хут. Роскі Сялец Аршанскага р-на, механік Юрцаўскай сельскагаспадарчай калоніі, пражываў у в. Юрцава Аршанскага р-на. Асуджаны 10.2.1934 на 8 гадоў. Рэабілітаваны 4.3.1958.

ВАЙНІЛОВІЧ Іван Васілевіч, н. ў 1890, в. Клюшнікава Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Клюшнікава. Асуджаны 11.5.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 12.7.1989.

ВАЙЦАХОВІЧ Кліменцій Паўлавіч, н. ў 1900, г. Вілейка, машыніст паравоза БелДРЭС, пражываў у пас. БелДРЭС Аршанскага р-на. Асуджаны 9.11.1937. Расстраляны 26.11.1937. Рэабілітаваны 12.10.1989.

ВАЙЦЯНКОЎ Кузьма Ерамеевіч, н. ў 1898, в. Зубава Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Зубава. Асуджаны 4.10.1937. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 2.2.1959.

ВАЛАДЗЬКО Каліграт Яфрэмавіч, н. ў 1881, в. Юроўшчына Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Новыя Стайкі Копыскага р-на. Асуджаны 17.5.1931 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ВАЛАДЗЬКО Ягор Фёдаравіч, н. ў 1895, в. Харэўшчына Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Харэўшчына. Асуджаны 1.11.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 18.7.1959.

ВАЛАДКОВІЧ Сідар Максімавіч, н. ў 1890, в. Клюшнікава Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Клюшнікава. Асуджаны 11.5.1932 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 12.7.1989.

ВАЛАТКЕВІЧ Уладзімір Іосіфавіч, н. ў 1899, в. Леснікі Плешчаніцкага р-на, тынкоўшчык на будаўніцтве мясакамбіната, пражываў у в. Пелянцеева Аршанскага р-на. Асуджаны 23.12.1936 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 16.3.1959.

ВАЛЕЙСКІ Іван Васілевіч, н. ў 1868, г. Магілёў, святар Смалянскай царквы, пражываў у в.

Смаляны Аршанскага р-на. Асуджаны 15.9.1937. Расстраляны 29.9.1937. Рэабілітаваны 4.11.1957.

ВАЛОДЧАНКА Афанасій Андрэевіч, н. ў 1903, в. Чарное Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Чарное. Асуджаны 10.11.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 14.8.1959.

ВАЛОДЧАНКА Іван Антонавіч, н. ў 1883, в. Чарное Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Свядомасць», пражываў у в. Чарное. Асуджаны 17.5.1931 да ссылкі за межы БССР. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ВАЛОДЧАНКА Ілья Паўлавіч, н. ў 1893, в. Чарное Аршанскага р-на, сялянін-аднаасобнік, пражываў у в. Чарное. Асуджаны 10.11.1932 да ссылкі ў Казахстан на 3 гады. Рэабілітаваны 14.8.1959.

ВАЛОДЧАНКА Купрыян Антонавіч, н. ў 1889, в. Чарное Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Чарное. Асуджаны 17.5.1931 да ссылкі за межы БССР. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ВАЛОДЧАНКА Майсей Андрэевіч, н. ў 1900, в. Чарное Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Чарное. Асуджаны 10.11.1932 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 14.8.1959.

ВАЛОДЧАНКА Пётр Сямёнавіч, н. ў 1887, в. Чарное Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Чарное. Асуджаны 10.11.1932 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 14.8.1959.

ВАЛОДЧАНКА Платон Якаўлевіч, н. ў 1882, в. Земнік Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Земнік. Асуджаны 12.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 5.7.1989.

ВАЛОДЧАНКА Сямён Паўлавіч, н. ў 1898, в. Чарное Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Чарное. Асуджаны 17.5.1931. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ВАЛУЕЎ Авяр'ян Анціпавіч, н. ў 1877, в. Баева Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Баева. Асуджаны 9.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 25.9.1989.

ВАЛУЙ Васіль Лявонцьевіч, н. ў 1875, в. Глінкі Плешчаніцкага р-на, цясляр на будаўніцтве льнокамбіната, пражываў у в. Быстынка Аршанскага р-на. Асуджаны 23.12.1936 на 5 гадоў. Памёр у заключэнні 18.1.1942. Рэабілітаваны 16.3.1959.

ВАЛЧКОЎ Уладзімір Мікалаевіч, н. ў 1909, в. Межава Талачынскага р-на, настаўнік школы ў пас. БелДРЭС, пражываў у в. Выдрыца Аршанскага р-на. Асуджаны 10.4.1936 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 4.4.1990.

ВАЛЫНСКІ Станіслаў Іванавіч, н. ў 1898, г. Тукум Курляндскай губ., машыніст паравоза Белэнергакамбіната, пражываў у пас. Арэхі Аршанскага р-на. Асуджаны 16.10.1938 на 8 гадоў. Рэабілітаваны 7.9.1959.

ВАЛЬСДОРФ Емяльян Рыгоравіч, н. ў 1885, г. Орша, слесар завода «Чырвоны Кастрычнік», пражываў у пас. Барань Аршанскага р-на. Арыштаваны 23.6.1941. Асуджаны 25.4.1942 на 8 гадоў. Памёр у заключэнні ў Сталінградзе 19.12.1941. Рэабілітаваны 22.1.1960.

ВАРАБЕЙ Іосіф Сцяпанавіч, н. ў 1899, в. Баравыя Аршанскага р-на, вартаўнік пажарнай аховы цагельнага завода, пражываў у в. Баравыя. Асуджаны 16.10.1938. Расстраляны 6.11.1938. Рэабілітаваны 22.8.1989.

ВАРАПАЕЎ Ігнат Парфёнавіч, н. ў 1892, в. Старкі Магілёўскай губ., селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Тудараўка Копыскага р-на. Асуджаны 29.5.1931 да ссылкі з сям'ёй на Урал. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ВАРЛАМАЎ Пётр Ільіч, н. ў 1904, в. Непражына Чэлябінскай вобл., брыгадзір чыгуначнай станцыі Лемніца Заходняй чыгункі, пражываў на станцыі Смаляны Заходняй чыгункі. Асуджаны 14.5.1938. Расстраляны. Рэабілітаваны 17.9.1957.

ВАСІЛЕНКА Афанасій Лук'янавіч, н. ў 1885, в. Галаўское Сенненскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Новыя Стайкі Копыскага р-на. Асуджаны 17.5.1931 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ВАСІЛЁНАК Еўдакім Пракопавіч, н. ў 1893, в. Цюлькін Аршанскага р-на, муляр Смалянскага сельгастэхнікума, пражываў у саўгасе Смаляны Аршанскага р-на. Асуджаны 22.9.1938. Расстраляны 3.10.1938. Рэабілітаваны 30.8.1989.

ВАСОРАЎ (ВОСАРАЎ) Якаў Трафімавіч, н. ў 1894, в. Казлы Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Казлы. Асуджаны 3.3.1930 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 28.8.1989.

ВАШЧЫЛІН Пётр Ісакавіч, н. ў 1879, в. Ком (Кош) Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Ком. Асуджаны 3.1.1930 на 3 гады. Рэабілітаваны 9.8.1989.

ВЕРАСАЎ Палікарп Якаўлевіч, н. ў 1872, в. Дубраўка Аршанскага р-на, калгаснік калгаса імя Сталіна, пражываў у в. Дубраўка. Асуджаны 3.9.1932 да пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 10.4.1992.

ВЕРХАЛАЗАЎ Фадзей Клімавіч, н. ў 1863, в. Камсенічы Магілёўскай губ., селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Тудараўка Копыскага р-на. Асуджаны 29.5.1931 на 1 год. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ВІЖЫНІС Іосіф Казіміравіч, н. ў 1897, в. Малькоўка Аршанскай акругі, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Малькоўка. Асуджаны 3.1.1929 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 19.4.1989.

ВІЖЫНІС Міхаіл Іванавіч, н. ў 1901, в. Малькоўка Аршанскай акругі, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Малькоўка. Асуджаны 3.1.1930 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 19.4.1989.

ВІЛЬЧЫНСКІ Франц Антонавіч, н. ў 1888, маёнтак Мелехава Магілёўскай губ., возчык райтрансгандальхарчу, пражываў на хут. Залеглава Аршанскага р-на. Асуджаны 28.9.1938 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 26.3.1959.

ВІТКОЎСКІ Антон Пятровіч, н. ў 1891, в. Чарніцы Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Шчацінка Аршанскага р-на. Асуджаны 4.5.1933 да пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ВІТКОЎСКІ Іосіф Адамавіч, н. ў 1889, в. Калатоўка Аршанскага р-на, пуцявы абходчык 6-й дыстанцыі пуці Заходняй чыгункі, пражываў у в. Янаўка Аршанскага р-на. Асуджаны 16.10.1938. Расстраляны 31.10.1938. Рэабілітаваны 4.5.1959.

ВІШНЯКОВА Мелання Рыгораўна, н. ў 1877, в. Вежкі Дубровенскага р-на, манашка, пражывала ў в. Вежкі. Асуджана 9.8.1932 да ссылкі на 3 гады. Рэабілітавана 9.2.1959.

ВОЛКАЎ Андрэй Пятровіч, н. ў 1891, в. Калінаўка Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Калінаўка. Асуджаны 25.11.1930 на 3 гады. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ВОЛКАЎ Мірон Цімафеевіч, н. ў 1884, в. Маркавічы Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Маркавічы. Асуджаны 11.5.1932 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 10.7.1989.

ВОЛКАЎ Раман Андрэевіч, н. ў 1877, в. Калінаўка Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Калінаўка. Асуджаны 25.11.1930 на 3 гады. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ВОЛЧАНКА Аляксей Яфімавіч, н. ў 1886, в. Езяноўшчына Аршанскага р-на, дзесятнік ваенведа СКО БВА, пражываў у в. Гразеўка Аршанскага р-на. Асуджаны 28.9.1937. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 24.9.1960.

ВУЕЎСКІ Канстанцін Іванавіч, н. ў 1900, в. Заполле Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Заполле. Асуджаны 27.8.1931 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ВЯРБІЦКІ Васіль Цімафеевіч, н. ў 1884, в. Пячонкі Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Заполле Аршанскага р-на. Асуджаны 3.1.1930 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 25.12.1989.

ВЯРБІЦКІ Мартын Цімафеевіч, н. ў 1876, в. Пячонкі Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Пячонкі. Асуджаны 3.1.1930 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 25.12.1989.

ГАБРЫНЕЦ Максім Яўсеевіч, н. ў 1884, в. Стайкі Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «1 Мая», пражываў у в. Стайкі. Асуджаны 14.2.1933 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 20.10.1993.

ГАЕЎСКІ Пётр Аляксандравіч, н. ў 1880, в. Вязьмічы Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Вязьмічы. Асуджаны 16.2.1933. Расстраляны. Рэабілітаваны 26.4.1989.

ГАЕЎСКІ Сцяпан Аляксандравіч, н. ў 1890, в. Вязьмічы Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Вязьмічы. Асуджаны 16.2.1933. Расстраляны. Рэабілітаваны 26.4.1989.

ГАЙДЫШАЎ Марцін Іванавіч, н. ў 1900, в. Валаўцы Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Валаўцы. Асуджаны 22.1.1935 на 3 гады. Рэабілітаваны 24.9.1991.

ГАЛАВАЧ Якаў Іванавіч, н. ў 1890, в. Азярок Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Азярок. Асуджаны 28.9.1938 на 8 гадоў. Рэабілітаваны 24.11.1989.

ГАЛАВАЧ Яфім Яфімавіч, н. ў 1897, в. Азярок Аршанскага р-на, служачы 37-га акалотка 4-га аддзялення пуці станцыі Смаляны, пражываў у в. Азярок. Асуджаны 28.6.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 10.4.1990.

ГАЛАЎКО Афанасій Фёдаравіч, н. ў 1892, в. Грыцковічы, Украіна, ключнік саўгаса «Забалоцце», пражываў у в. Забалоцце Аршанскага р-на. Асуджаны 2.12.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 18.10.1989.

ГАЛКОЎСКІ Мацвей Антонавіч, н. ў 1870, в. Варгуцьева Талачынскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у маёнтку Корава Аршанскага р-на. Асуджаны 11.3.1931 да ссылкі разам з сям'ёй у Заходнюю Сібір. Рэабілітаваны 7.5.1992.

ГАЛУБОВІЧ Аляксандр Данілавіч, н. ў 1902, в. Малыя Марвіны Навагрудскага ваяв., без пэўных заняткаў, пражываў у Оршы. Асуджаны 13.2.1936 на 3 гады. Рэабілітаваны 15.5.1992.

ГАЛУБОВІЧ Пётр Антонавіч, н. ў 1902, в. Ламачына Аршанскага р-на, нарадчык кандуктарскага рэзерву станцыі Орша, пражываў у Аршанскім р-не. Асуджаны 28.9.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 14.9.1959.

ГАЛЫНЕЦ Станіслаў Іванавіч, н. ў 1888, в. Грыцава Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Грыцава. Асуджаны 3.6.1932 на 3 гады. Другі раз асуджаны 24.11.1945 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 27.11.1965 і 24.11.1989.

ГАЛЬМАКОЎ Міхаіл Тарасавіч, н. ў 1900, в. Буда Аршанскага р-на, матарыст торфазавода Асінторф, пражываў у пас. Асінторф. Асуджаны 15.10.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 20.10.1989.

ГАЛЯШОЎ Хрысан Цімафеевіч, н. ў 1887, в. Прыгузкі Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Прыгузкі. Асуджаны 29.8.1937. Расстраляны 23.9.1937. Рэабілітаваны 1.11.1958.

ГАМБАЛЕЎСКІ Аўтух Пятровіч, н. ў 1882, в. Вязьмічы Аршанскага р-на. Працаваў кавалём у калгасе, пражываў у в. Вязьмічы. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ГАМБАЛЕЎСКІ Васіль Мацвеевіч, н. ў 1875, мяст. Смаляны Аршанскага р-на, рабочы вучгаса Смаляны, пражываў у мяст. Смаляны. Асуджаны 10.3.1938. Расстраляны 26.3.1938. Рэабілітаваны 18.12.1959.

ГАМБАЛЕЎСКІ Іван Фёдаравіч, н. ў 1873, в. Гальцава Аршанскага р-на, калгаснік калгаса імя Сталіна, пражываў у в. Гальцава (Гольцава). Асуджаны 21.10.1937 на 8 гадоў. Справа спынена 8.7.1939.

ГАМБАЛЕЎСКІ Макар Мацвеевіч, н. ў 1896, в. Дар'іна Слабада Аршанскага р-на, конюх калгаса «6 умоў Сталіна», пражываў у в. Дар'іна Слабада. Асуджаны 10.3.1938. Расстраляны 26.3.1938. Рэабілітаваны 18.12.1959.

ГАНЕБНІК Карней Іванавіч, н. ў 1864, в. Багрынава Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Багрынава. Асуджаны 11.5.1932 на 3 гады (умоўна). Рэабілітаваны 10.7.1989.

ГАНЧАРОЎ Кузьма Іванавіч, н. ў 1900, в. Антонаўка Аршанскага р-на, пажарнік Якаўлевіцкай фабрыкі, пражываў у в. Светачаўка Аршанскага р-на. Асуджаны 12.11.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 2.10.1956.

ГАНЧАРОЎ Свірыд Мікалаевіч, н. ў 1882, в. Антонавічы Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Чырвоная ніва», пражываў у в. Антонавічы. Асуджаны 24.9.1937. Расстраляны 11.10.1937. Рэабілітаваны 3.4.1962.

ГАПАНЕНКА (ГАПОНЕНКА) Анікей Максімавіч, н. ў 1874, в. Аланцьева Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Пралетарый», пражываў у в. Аланцьева. Асуджаны 24.9.1937. Расстраляны 11.10.1937. Рэабілітаваны 28.4.1989.

ГАРАВАЦКІ Іван Станіслававіч, н. ў 1886, в. Якаўлевічы Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Пузырова Аршанскага р-на. Асуджаны 3.2.1933 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 14.3.1964.

ГАРАВЕЦ Браніслаў Феліксавіч, н. ў 1891, в. Рэпухава Аршанскага р-на, ветфельчар Межаўскага ветучастка, пражываў у в. Межава Аршанскага р-на. Асуджаны 23.12.1947 на 8 гадоў. Рэабілітаваны 24.10.1956.

ГАРАВЕЦ Міхаіл Фёдаравіч, н. ў 1892, в. Вялікае Бабіна Арэхаўскага р-на, рабочы ДЭУ—797 Ушасдор МУС БССР, пражываў у в. Вялікае Бабіна. Асуджаны 29.11.1949 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 19.7.1955.

ГАРАВОЙ Анісім Гаўрылавіч, н. ў 1905, в. Гараны Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Гараны. Асуджаны 26.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 30.9.1989.

ГАРБАЦКІ Іван Еліфанавіч, н. ў 1903, в. Крапіўна Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Крапіўна. Асуджаны 26.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 21.8.1989.

ГАРБАЦКІ Мікалай Кузьміч, н. ў 1907, в. Крапіўна Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Крапіўна. Асуджаны 11.5.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ГАРБАЧЭЎСКІ Аляксей Іосіфавіч, н. ў 1881, в. Савішчана Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Барацьбіт», пражываў у в. Савішчана. Асуджаны 25.9.1937. Расстраляны 13.10.1937. Рэабілітаваны 18.4.1989.

ГАРБАЧЭЎСКІ Іван Аляксеевіч, н. ў 1918, в. Савішчана Аршанскага р-на, ваеннаслужачы. Асуджаны 22.6.1945 да вышэйшай меры пакарання. Мера пакарання заменена на 20 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 6.12.1995.

ГАРБАЧЭЎСКІ Нікандр Емяльянавіч, н. ў 1900, в. Савішчана Аршанскага р-на, агент Аршанскага камітэта па нарыхтоўках, працаваў у в. Савішчана. Асуджаны 29.1.1945 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 8.6.1948.

ГАРНАСТАЕЎ Восіп Восіпавіч, н. ў 1871, в. Дубраўка Аршанскага р-на, калгаснік калгаса імя Сталіна, пражываў у в. Дуброўка. Асуджаны 3.9.1932 да пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах тэрмінам на 3 гады. Другі раз асуджаны 29.8.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 14.3.1958 і 10.4.1992.

ГАРНАСТАЕЎ Якаў Іосіфавіч, н. ў 1878, в. Дубраўка Аршанскага р-на, калгаснік калгаса імя Сталіна, пражываў у в. Дубраўка. Асуджаны 3.9.1932 на 3 гады. Другі раз асуджаны 29.8.1937. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 22.7.1957 і 10.4.1992.

ГАРЦУЕЎ Аляксей Дзмітрыевіч, н. ў 1893, в. Ком Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Ком. Асуджаны 3.1.1930 на 3 гады. Рэабілітаваны 9.8.1989.

ГАТАЛЬСКАЯ Таццяна Іванаўна, н. ў 1921, в. Лясная Прапойскага р-на, без пэўных заняткаў, пражывала ў в. Ступіні Аршанскага р-на. Асуджана 21.3.1946 на 10 гадоў. Рэабілітавана 30.12.1993.

ГАЎРУШАНКА Арцём Васілевіч, н. ў 1879, в. Руміна Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Вольная праца», пражываў у в. Руміна. Асуджаны 30.4.1933 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 18.7.1959.

ГЕЛАХАЎ Нікіфар Рыгоравіч, н. ў 1878, в. Чэрвіна Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Чэрвіна. Асуджаны 12.10.1937. Расстраляны 12.10.1937. Рэабілітаваны 20.3.1958.

ГЕРБІТОЎСКІ Іосіф Казіміравіч, н. ў 1883, г. Вільна, тынкоўшчык БелДРЭС, пражываў у пас. БелДРЭС Аршанскага р-на. Асуджаны 14.12.1937. Расстраляны 17.1.1938. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ГІНТОЎТ Канстанцін Іосіфавіч, н. ў в. Каменка Шклоўскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Светачаўка Аршанскага р-на. Асуджаны 3.6.1935 на 5 гадоў ссылкі ў Краснаярскі край. Рэабілітаваны 14.6.1958.

ГІНТОЎТ Нікіфар Іосіфавіч, н. ў 1877, в. Каменка Шклоўскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Светачаўка Аршанскага р-на. Асуджаны 3.6.1935 на 5 гадоў ссылкі ў Краснаярскі край. Рэабілітаваны 14.6.1958.

ГЛІНСКІ Аляксандр Піліпавіч, н. ў 1875, в. Машкова Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Машкова. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Памёр у заключэнні 1.5.1942. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ГОЛЕР (ГОЛУБЕВА) Ганна Германаўна, н. ў 1927, пражывала ў в. Ламачына Аршанскага р-на. Асуджана 15.11.1947 на 5 гадоў ссылкі ў Краснаярскі край. Рэабілітавана 20.10.1993.

ГОЛЕР (ГОЛУБЕВА) Ганна Сігізмундаўна, н. ў 1888, в. Зайцава Аршанскага р-на, хатняя гаспадыня, пражывала ў в. Ламачына Аршанскага р-на. Асуджана 15.11.1947 на 5 гадоў ссылкі ў Краснаярскі край. Рэабілітавана 20.10.1993.

ГОЛЕР (ГОЛУБЕВА) Раіса Германаўна, н. ў 1924, пражывала ў в. Ламачына Аршанскага р-на. Асуджана 15.11.1947 на 5 гадоў ссылкі ў Краснаярскі край. Рэабілітавана 20.10.1993.

ГОЛЕР (ГОЛУБЕВА) Яўгенія Германаўна, н. ў 1919, пражывала ў в. Ламачына Аршанскага р-на. Асуджана 15.11.1947 на 5 гадоў ссылкі ў Краснаярскі край. Рэабілітавана 20.10.1993.

ГОЛУБЕЎ Емяльян Рыгоравіч, н. ў 1904, в. Раманаўка Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Раманаўка. Асуджаны 12.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 14.6.1989.

ГОЛУБЕЎ Рыгор Авяр'янавіч, н. ў 1875, в. Раманаўка Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Раманаўка. Асуджаны 12.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 14.6.1989.

ГОЛУБЕЎ Ціхан Міхайлавіч, н. ў 1894, в. Раманаўка Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Раманаўка. Асуджаны 12.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 14.6.1989.

ГОМАНАЎ Ксенафонт Сямёнавіч, н. ў 1884, в. Гараны-Мужычча Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Гараны. Асуджаны 15.9.1937. Расстраляны 30.9.1937. Рэабілітаваны 12.7.1958.

ГОРБАЧ Андрэй Сцяпанавіч, н. ў 1893, мяст. Лежына (Ляжына) Слуцкага р-на, бухгалтар Асінторфа, пражываў у пас. Асінторф Аршанскага р-на. Асуджаны 4.10.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 6.9.1957.

ГРАВІТ Роберт Марцінавіч, н. ў 1893, Латвія, цясляр аддзела капітальнага будаўніцтва Бел-ДРЭС, пражываў у Рыбацкім пасёлку Аршанскага р-на. Асуджаны 16.10.1938 на 10 гадоў. Памёр у заключэнні 21.4.1939. Рэабілітаваны 20.6.1960.

ГРАГУЕНКА Іван Ягоравіч, н. ў 1885, в. Ком Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Ком. Асуджаны 3.1.1930 на 3 гады. Рэабілітаваны 9.8.1989.

ГРАЧЫХА Цімафей Парфенавіч, н. ў 1877, в. Арэхі Аршанскага р-на, рыбак арцелі рыбакоў, пражываў у в. Арэхі. Асуджаны 30.12.1937. Расстраляны 27.1.1938. Рэабілітаваны 12.12.1959.

ГРОСКРЭЙЦ Георгій Германавіч, н. ў 1899, в. Выдрыца Аршанскага р-на, бухгалтар саўгаса «Высокае», пражываў у в. Высокае Аршанскага р-на. Асуджаны 10.4.1938 да высылкі за межы СССР. Рэабілітаваны 29.9.1989.

ГРУДЗІНСКІ Вітольд Антонавіч, н. ў 1888, в. Лешава Коханаўскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Лешава. Асуджаны 19.6.1929 да ссылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны 10.4.1992.

ГРУДЗІНСКІ Леанід Уладзіміравіч, н. ў 1905, г. Магілёў, пражываў у в. Балбасава Аршанскага р-на. Асуджаны 26.12.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 14.1.1993.

ГРУНТАЎ Яфім Рыгоравіч, н. ў 1893, в. Ходцы Сенненскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Канавалава Аршанскага р-на. Асуджаны 9.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 11.8.1989.

ГРЫШЧАНКА Емяльян Несцеравіч, н. ў 1897, в. Ірвяніца Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Ірвяніца. Асуджаны 9.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 25.9.1989.

ГУЗАВА Феадосія Лявонцьеўна, н. ў 1906, в. Хімінічы Аршанскага р-на, калгасніца калгаса «Парыжская камуна», пражывала ў в. Хімінічы. Асуджана 22.4.1935 на 5 гадоў. Рэабілітавана 30.7.1990.

ГУЛЬЦОЎ Васіль (Епіфан) Антонавіч, н. ў 1902, в. Бабінічы Аршанскага р-на, старшыня калгаса «Зара свабоды», пражываў у в. Вусце Аршанскага р-на. Асуджаны 28.11.1937. Расстраляны 21.12.1937. Рэабілітаваны 2.9.1961.

ГУМІНСКІ Павел Давыдавіч, н. ў 1870, в. Хорабрава Аршанскага р-на, возчык дравянога склада станцыі Орша, пражываў у в. Хорабрава. Асуджаны 21.9.1938 на 10 гадоў. Памёр у заключэнні 31.5.1939. Рэабілітаваны 16.10.1989.

ГУРШНІС Адольф Антонавіч, н. ў 1881, в. Акменічкі Віленскай губ., вартаўнік калгаса, пражываў на хут. Бор Аршанскага р-на. Асуджаны 16.10.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 23.10.1989.

ГУРЫН Аляксей Арцёмавіч, н. ў 1875, в. Карпаўшчына Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Барацьбіт» пражываў у в. Карпаўшчына. Асуджаны 15.9.1937. Расстраляны 29.9.1937. Рэабілітаваны 4.11.1957.

ГУРЫН Анісім Сямёнавіч, н. ў 1870, в. Падбалоцце Сенненскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Новыя Стайкі Аршанскага р-на. Асуджаны 17.5.1931 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ГУРЫН Стафан Арцёмавіч, н. ў 1867, в. Карпаўшчына Аршанскага р-на, не працаваў, пражываў у в. Карпаўшчына. Асуджаны 15.9.1937. Расстраляны 29.9.1937. Рэабілітаваны 4.11.1957.

ГУСЯНЦОЎ Пётр Яфімавіч, н. ў 1894, в. Анібалева Аршанскага р-на, цясляр будаўнічай брыгады, пражываў у в. Анібалева. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ГУТ Сцяпан Ісакавіч, н. ў 1872, в. Лянковічы Аршанскага р-на, вартаўнік Аршанскай цагельнай арцелі «Працаўнік», пражываў у Оршы. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Памёр у заключэнні 25.9.1939. Рэабілітаваны 10.4.1992.

ДАБРАГОДЗІН Архіп Панцеляймонавіч, н. ў 1895, г. Звянігарад Кіеўскай вобл., памочнік бухгалтара саўгаса «Кастрычнік», пражываў у мяст. Копысь Аршанскага р-на. Асуджаны 3.9.1937 на 10

гадоў. Памёр у заключэнні 16.9.1944. Рэабілітаваны 10.6.1965.

ДАВЫДЗЕНКА Мацвей Сямёнавіч, н. ў 1880, в. Востраў Аршанскага пав., пячнік Асінторфа, пражываў у пас. Асінторф. Асуджаны 15.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 24.12.1960.

ДАКУТОВІЧ Максім Сцяпанавіч, н. ў 1874, в. Барадзіно Аршанскага р-на, вартаўнік бальніцы, пражываў у в. Барадзіно. Асуджаны 28.9.1937. Расстраляны 13.10.197. Рэабілітаваны 30.10.1989.

ДАЛГАЛОВІЧ Аляксандр Канстанцінавіч, н. ў 1896, г. Рыга, начальнік пагрузачных работ торфапрадпрыемства «Асінторф», пражываў у пас. Асінторф Аршанскага р-на. Асуджаны 11.10.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 2.7.1959.

ДАЛІДОВІЧ Аляксей Васілевіч, н. ў 1905, в. Кушаўка Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Авангард», пражываў у в. Кушаўка. Асуджаны 24.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 16.5.1959.

ДАЛІДОВІЧ Іван Сямёнавіч, н. ў 1870, в. Кушаўка Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Кушаўка. Асуджаны 4.5.1933 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 8.7.1961.

ДАЛІДОВІЧ Іосіф Мікалаевіч, н. ў 1872, в. Кушаўка Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Кушаўка. Асуджаны 17.3.1933 на 3 гады ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 31.10.1969.

ДАЛІДОВІЧ Рыгор Васілевіч, н. ў 1874, в. Кушаўка Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Кушаўка. Асуджаны 17.3.1933 на 5 гадоў ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 31.10.1969.

ДАЛІДОВІЧ Сямён Іванавіч, н. ў 1897, в. Кушаўка Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Кушаўка. Асуджаны 4.5.1933 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер з заменай высылкай ў Казахстан на той жа тэрмін. Рэабілітаваны 8.7.1961.

ДАЛІДОВІЧ Ціт Іванавіч, н. ў 1891, в. Кушаўка Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Кушаўка. Асуджаны 4.5.1933 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 8.7.1961.

ДАЛІДОВІЧ Якаў Данілавіч, н. ў 1889, в. Кушаўка Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Кушаўка. Асуджаны 4.5.1933 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 8.7.1961.

ДАМАЕНТАЎ Мікалай Трафімавіч, н. ў 1893, в. Зубровічы Копыскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Зубровічы. Асуджаны 12.3.1930 на 1 год. Рэабілітаваны 28.11.1989.

ДАМАРАЦКІ Карл Іванавіч, н. ў 1905, пас. Барань Аршанскага р-на, слесар завода «Чырвоны Кастрычнік», пражываў у пас. Барань. Асуджаны 22.7.1936 на 3 гады. Рэабілітаваны 6.4.1989.

ДАМБРОЎСКІ Іосіф Віктаравіч, н. ў 1902, в. Новае Хорабрава Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Чырвоны чыгуначнік» Аршанскага р-на, пражываў у калгасе. Асуджаны 12.10.1931 на 3 гады ссылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны 24.11.1989.

ДАНІЛЕНКА Пётр Нікіфаравіч, н. ў 1909, в. Люціна Аршанскага р-на, калгаснік калгаса імя Куйбышава, пражываў у в. Люціна. Асуджаны 4.7.1936 на 3 гады. Рэабілітаваны 13.7.1960.

ДАНІЛЬЧУК Яўстафій Сцяпанавіч, н. ў 1893, в. Шканы Сядлецкай губ., Польшча, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Ганусін Бор Аршанскага р-на. Асуджаны 3.3.1933 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 28.11.1959.

ДАРОНІН Нікан Рыгоравіч, н. ў 1892, в. Абухава Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Абухава. Асуджаны 10.2.1934 на 3 гады. Рэабілітаваны 4.3.1958.

ДАРОНІН Радзівон Карнеевіч, н. ў 1897, в. Юрцава Аршанскага р-на, дзесятнік, пражываў у в. Юрцава. Асуджаны 4.10.1937. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 21.4.1958.

ДАШКЕВІЧ Іван Цімафеевіч, н. ў 1892, в. Гразіўка Аршанскага р-на, рабочы цагельнага завода, пражываў на цагельным заводзе Крапівінскага сельсавета. Асуджаны 16.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 16.4.1992.

ДАШКЕВІЧ Лаўрэнцій Цімафеевіч, н. ў 1900, в. Гразівец Аршанскага р-на, калгаснік калгаса імя Кірава, пражываў у в. Гразівец. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 25.4.1964.

ДЗЕМІДОВІЧ Вікенцій Адамавіч, н. ў 1875, в. Галаўня Уздзенскага р-на, вартаўнік Тарчылаўскай торфаарцелі, пражываў у в. Гарбацэвічы Аршанскага р-на. Асуджаны 24.9.1937 на 10 гадоў. Памёр у заключэнні 9.1.1939. Рэабілітаваны 29.4.1961.

ДЗЕМЯШКЕВІЧ Агаф'я Міхайлаўна, н. ў 1900, в. Замошша Шклоўскага р-на, сялянка-аднаасобніца, пражывала ў в. Зямцы Аршанскага р-на. 7.6.1931 як член сям'і кулака выслана на Урал. Рэабілітавана 3.3.1992.

ДЗЕМЯШКЕВІЧ Валянціна Фёдараўна, н. ў 1925, в. Зямцы Аршанскага р-на, пражывала ў в. Зямцы. 7.6.1931 як член сям'і кулака выслана на Урал. Рэабілітавана 3.3.1992.

ДЗЕМЯШКЕВІЧ Фёдар Міхайлавіч, н. ў 1893, в. Зямцы Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Зямцы. 7.6.1931 высланы з сям'ёй на Урал. Памёр у заключэнні ў 1934 г. Рэабілітаваны 3.3.1992.

ДЗЕМЯШКЕВІЧ Яўген Фёдаравіч, н. ў 1924, в. Зямцы Аршанскага р-на, знаходзіўся на ўтрыманні бацькоў, пражываў у в. Зямцы. 7.6.1931 як член сям'і кулака высланы на Урал. Рэабілітаваны 3.3.1992.

ДЗЕХЦЯРОЎ Аляксандр Васілевіч, н. ў 1908, мяст. Копысь Аршанскага р-на, інжынер матарызаванага батальёна аўтаматчыкаў, пражываў у мяст. Копысь. Асуджаны 4.1.1945 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер з паражэннем у правах на 5 гадоў. Рэабілітаваны 19.4.1991.

ДЗЯШКЕВІЧ Рыгор Іванавіч, н. ў 1891, в. Хадулы Аршанскага р-на, рабочы па найме, пражываў у в. Хадулы. Асуджаны 29.8.1937 на 10 гадоў. Па-

мёр у заключэнні 16.6.1942. Рэабілітаваны 29.2.1960.

ДЛУЖНЕЎСКІ Піус Фабіянавіч, н. ў 1912, в. Дубоўка Бягомльскага р-на, рабочы каменедрабільнага завода, пражываў у в. Ерашэвічы Аршанскага р-на. Асуджаны 28.3.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ДРАГУН Канстанцін Рыгоравіч, н. ў 1901, в. Скарды Плешчаніцкага р-на, рабочы саўгаса «Кастрычнік», пражываў у мяст. Копысь Аршанскага р-на. Асуджаны 3.1.1938. Расстраляны 9.1.1938. Рэабілітаваны 15.6.1959.

ДРАГУН Рыгор Рыгоравіч, н. ў 1885, в. Скарды Плешчаніцкага р-на, рабочы саўгаса «Кастрычнік», пражываў у мяст. Копысь Аршанскага р-на. Асуджаны 3.1.1938. Расстраляны 9.1.1938. Рэабілітаваны 17.5.1961.

ДРАГУН Фама Рыгоравіч, н. ў 1890, в. Скароды (Скарды) Плешчаніцкага р-на, рабочы саўгаса «Кастрычнік» Аршанскага р-на, пражываў у саўгасе. Асуджаны 17.11.1937. Расстраляны 17.12.1937. Рэабілітаваны 23.5.1962.

ДРАЗДОВІЧ Іосіф Францавіч, н. ў 1902, мяст. Мяшкова Талачынскага р-на, пуцявы рабочы 7-й дыстанцыі пуці станцыі Орша, пражываў на 577-ым км Заходняй чыгункі (Аршанскі р-н). Асуджаны 8.6.1938 на 8 гадоў. Рэабілітаваны 23.3.1957.

ДРАЗДОВІЧ Дамінік Феліксавіч, н. ў 1905, в. Стайчаўка Лепельскага р-на, грузчык каменедрабільнага завода ў Оршы, пражываў у в. Гразілаўка Аршанскага р-на. Асуджаны 20.4.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 4.9.1989.

ДРАЗДОЎ Сяргей Рыгоравіч, н. ў 1889, мяст. Копысь Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у мяст. Копысь. Асуджаны 15.12.1929 на 3 гады. Рэабілітаваны 16.4.1992.

ДРОЗД Данііл Фёдаравіч, н. ў 1893, в. Пушча Плешчаніцкага р-на, цясляр саўгаса «Вусце», пражываў у саўгасе «Вусце» Аршанскага р-на. Асуджаны 23.5.1936 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 18.1.1961.

ДРУГАЧЭНКА Пётр Сцяпанавіч, н. ў 1904, в. Турснова Расненскага р-на, рабочы Аршанскага зямельнага аддзела, пражываў у Оршы. Асуджаны 12.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 10.8.1989.

ДУБКЕВІЧ Іосіф Віктаравіч, н. ў 1876, в. Хадулы Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Хадулы. Асуджаны 22.3.1935 на 3 гады. Рэабілітаваны 25.4.1963.

ДУБОЎСКІ Аляксандр Еўдакімавіч, н. ў 1893, в. Свісцёлкі Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Свісцёлкі. Асуджаны 9.8.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 9.2.1959.

ЖАЛНЯРОЎСКІ Антон Міхайлавіч, н. ў 1885, в. Аляксандрава Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Аляксандрава. Асуджаны 16.6.1930 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ЖАЛНЯРОЎСКІ Вікенцій Канстанцінавіч, н. ў 1873, в. Круч Лёзненскага р-на, вартаўнік торфапрадпрыемства «Асінторф», пражываў у пас. Асінторф Аршанскага р-на. Асуджаны 2.11.1938. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 9.6.1960.

ЖАРНАСЕК Раман Ягоравіч, н. ў 1898, в. Высокае Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Высокае. Асуджаны 4.7.1931 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 18.7.1989.

ЖДАНОВІЧ Сцяпан Міхайлавіч, н. ў 1887, в. Гараны Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Гараны. Асуджаны 11.5.1932 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 15.6.1989.

ЖУКАЎ Аляксандр Сафронавіч, н. ў 1909, в. Сяглава Аршанскага р-на, рабочы Аршанскага мехзавода, пражываў у в. Ліпкі Аршанскага р-на. Асуджаны 15.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 10.2.1960.

ЖУКАЎ Аляксей Лявонавіч, н. ў 1885, в. Сяглава Аршанскага р-на, земляроб, пражываў у в. Сяглава. Асуджаны 15.4.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 5.4.1989.

ЖУКАЎ Герасім Ігнацьевіч, н. ў 1882, в. Брылі Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Брылі. Асуджаны 24.9.1937. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 11.4.1989.

ЖУКАЎ Кузьма Міхайлавіч, н. ў 1901, в. Якаўлевічы Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Якаўлевічы. Асуджаны 21.10.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ЖУКАЎ Ніл Лявонцьевіч, н. ў 1870, в. Сяглава Аршанскага р-на, калгаснік калгаса імя Блюхера, пражываў у в. Шугалава Аршанскага р-на. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ЖУКАЎ Сафрон Лявонавіч, н. ў 1880, в. Сяглава Аршанскага р-на, земляроб, пражываў у в. Сяглава. Асуджаны 15.4.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 5.4.1989.

ЖУКОЎСКІ Аляксей Клімавіч, н. ў 1888, в. Пішчалава Аршанскага р-на, ляснік Аршанскага лясніцтва, пражываў у в. Пішчалава. Асуджаны 23.10.1948. Па суду апраўданы.

ЖУКОЎСКІ Васіль Якаўлевіч, н. ў 1888, в. Слабада Аршанскага р-на, абходчык 6-й дыстанцыі пуці, пражываў у в. Слабада. Асуджаны 22.3.1941 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ЖУКОЎСКІ Канстанцін Ігнацьевіч, н. ў 1885, в. Люціна Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Люціна. Асуджаны 4.7.1936 на 7 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер з паражэннем у правах на 3 гады. Рэабілітаваны 13.7.1960.

ЖУКОЎСКІ Канстанцін Іосіфавіч, н. ў 1911, в. Нямірава Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Перамога», пражываў у в. Нямірава. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 3.8.1962.

ЖУРАЎКОЎ Ігнат Фёдаравіч, н. ў 1873, в. Чэрткі (Чарткі) Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Чэрткі. Асуджаны

12.2.1933. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 15.9.1962.

ЖУРАЎЛЁЎ Іван Максімавіч, н. ў 1882, в. Тумінічы Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у пас. Бялеўшчына Аршанскага р-на. Асуджаны 22.3.1935 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 25.4.1963.

ЖУРАЎЛЁЎ Леанід Максімавіч, н. ў 1889, в. Тумінічы Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 22.3.1935 на 5 гадоў. Другі раз асуджаны 17.3.1938. Расстраляны 20.5.1938. Рэабілітаваны 25.4.1963.

ЖУРАЎЛЁЎ Харытон Максімавіч, н. ў 1886, в. Тумінічы Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у пас. Бялеўшчына Аршанскага р-на. Асуджаны 22.3.1935 на 3 гады. Рэабілітаваны 25.4.1963.

ЖЫГАЛАВА Пелагея Рыгораўна, н. ў 1898, в. Навасёлкі Сенненскага раёна, калгасніца, пражывала ў в. Канавалава Аршанскага р-на. Асуджана 30.7.1932 на 3 гады. Рэабілітавана 27.11.1989.

ЖЫГАЛАЎ Герасім Сяргеевіч, н. ў 1897, в. Шэметаўка Сенненскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Канавалава Аршанскага р-на. Асуджаны 9.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 11.8.1989.

ЖЫГУНОЎ Аляксей Ільіч, н. ў 1870, в. Шэра-Селішча Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Шэра-Селішча. Асуджаны 12.2.1933 да вышэйшай меры пакарання з высылкай сям'і за межы БССР на 3 гады. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 15.9.1962.

ЖЫГУНОЎ Андрэй Захаравіч, н. ў 1904, в. Шэра-Селішча Аршанскага р-на, дзесятнік торфапрадпрыемства Асінторф, пражываў у пас. Асінторф Аршанскага р-на. Асуджаны 28.2.1933 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 2.11.1959.

ЖЫДКО Ягор Купрыянавіч, н. ў 1899, в. Ясевічы Глыбоцкага р-на, старшы конюх калгаса «Спартак», пражываў у в. Гразіна Аршанскага р-на. Асуджаны 2.11.1938. Расстраляны 18.11.1938. Рэабілітаваны 4.9.1989.

ЖЫЛІНСКАЯ Валянціна Іванаўна, н. ў 1919, мяст. Смаляны Аршанскага р-на, калгасніца саўгаса «Смаляны», пражывала ў мяст. Смаляны. Асуджана 13.2.1945 на 10 гадоў. Рэабілітавана 31.10.1964.

ЖЫЛІНСКІ Павел Данілавіч, н. ў 1897, в. Дар'іна Слабада Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «6 умоў Сталіна», пражываў у мяст. Смаляны Аршанскага р-на. Асуджаны 14.8.1937. Расстраляны 21.8.1937. Рэабілітаваны 31.10.1960.

ЗАБЕЛА Іван Ларыёнавіч, н. ў 1905, в. Няміра Аршанскага р-на, трактарыст Смалянскай МТС, пражываў у в. Няміра. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 3.8.1962.

ЗАБЕЛА Мікалай Барысавіч, н. ў 1906, в. Асіпоўка (Осіпаўка) Аршанскага р-на, дзесятнік чыгуначнай станцыі Орша, пражываў у в. Асіпоўка. Асуджаны 18.8.1931 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 19.11.1960.

ЗАБЕЛА Пракоп Цімафеевіч, н. ў 1908, в. Няміра Аршанскага р-на, парторг Машкоўскага сельсавета, пражываў у в. Няміра. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 3.8.1962.

ЗАБЛОЦКІ Іван Іосіфавіч, н. ў 1909, в. Верасняны Кіеўскай акругі, грабар на будаўніцтве Асінбуда, пражываў у пас. Асінторф Аршанскага р-на. Асуджаны 11.3.1931 на 3 гады. Рэабілітаваны 28.3.1989.

ЗАВАДСКІ Емяльян Макаравіч, н. ў 1884, в. Няронкі Аршанскага р-на, сезонны рабочы, пражываў у ваенна-будаўнічым гарадку Аршанскага р-на. Асуджаны 24.9.1937. Расстраляны 12.10.1937. Рэабілітаваны 16.6.1989.

ЗАГАРЖЭЛЬСКІ Браніслаў Мікалаевіч, н. ў 1890, в. Пупчына Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Пупчына. Асуджаны 12.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 9.8.1989.

ЗАГАРЖЭЛЬСКІ Віцеольд Мікалаевіч, н. ў 1875, в. Пупчына Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Пупчына. Асуджаны 12.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 9.8.1989.

ЗАГОРСКІ Яфім Іванавіч, н. ў 1879, в. Баркі Аршанскага р-на, загадчык гаспадаркі Аршанскага аэрапорта, пражываў у в. Баркі. Асуджаны 9.5.1933 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 11.6.1990.

ЗАЙЦАВА Лукер'я Адамаўна, н. ў 1911, в. Новае Сяло Аршанскага р-на, земляроб, пражывала ў в. Новае Сяло. Асуджана 10.11.1932 на 3 гады высылкі ў Казахстан. Рэабілітавана 17.8.1957.

ЗАЙЦАЎ Афанасій Рыгоравіч, н. ў 1898, в. Новае Сяло Аршанскага р-на, земляроб, пражываў у в. Новае Сяло. Асуджаны 10.11.1932 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 17.8.1957.

ЗАЙЦАЎ Лукаш Тарасавіч, н. ў 1887, в. Дзяругі Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Дзяругі. Асуджаны 23.9.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 24.11.1989.

ЗАЙЦАЎ Рыгор Якімавіч, н. ў 1868, в. Новае Сяло Аршанскага р-на, цясляр на будаўніцтве Асінторфа, пражываў у в. Ласыршчына Аршанскага р-на. Асуджаны 28.2.1933 да ссылкі на Поўнач на 3 гады. Рэабілітаваны 2.11.1959.

ЗАЙЦАЎ Якаў Якімавіч, н. ў 1869, в. Новае Сяло Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Заволны Аршанскага р-на. Асуджаны 12.2.1933 да вышэйшай меры пакарання з высылкай сям'і за межы БССР тэрмінам на 3 гады. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 15.9.1962.

ЗАЙЦАЎ Яфім Якімавіч, н. ў 1877, в. Новае Сяло Аршанскага р-на, земляроб, пражываў у в. Новае Сяло. Асуджаны 10.11.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 17.8.1957.

ЗАКІС Крыштан Індрыкавіч, н. ў 1895, Латвія, рабочы механічнай майстэрні торфазавода, пражываў у пас. Выдрыца Аршанскага р-на. Асуджаны

16.10.1938. Расстраляны 6.12.1938. Рэабілітаваны 1.9.1989.

ЗАЛЕСКІ Прохар Васілевіч, н. ў 1902, в. Новае Сяло Багушэўскага р-на, калгаснік калгаса «6 умоў Сталіна», пражываў у в. Смаляны Аршанскага р-на. Асуджаны 29.6.1941 да вышэйшай меры пакарання (не расстраляны). Рэабілітаваны 16.8.1941.

ЗАПОЛЬСКАЯ Ганна Іосіфаўна, н. ў.1909, в. Віскліна Аршанскай акругі, сялянка-аднаасобніца, пражывала ў в. Віскліна. Асуджана 12.7.1929 да ссылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана 15.6.1992.

ЗАПОЛЬСКАЯ Ксенія Мацвееўна, н. ў 1874, в. Бабенкі Аршанскай акругі, сялянка-аднаасобніца, пражывала ў в. Віскліна Аршанскай акругі. Асуджана 12.7.1929 да ссылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана 15.6.1992.

ЗАПОЛЬСКІ Валянцін Ігнацьевіч, н. ў 1902, в. Мыркі Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Мыркі. Асуджаны 12.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ЗАПОЛЬСКІ Ігнацій Дзям'янавіч, н. ў 1860, в. Мыркі Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Мыркі. Асуджаны 12.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ЗАПОЛЬСКІ Іосіф Дзям'янавіч, н. ў 1854, в. Мыркі Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Віскліна Аршанскай акругі. Асуджаны 12.7.1929 да ссылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны 15.6.1992.

ЗАПОЛЬСКІ Фёдар Ульянавіч, н. ў 1864, в. Мыркі Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Мыркі. Асуджаны 3.1.1930 на 3 гады. Рэабілітаваны 25.12.1989.

ЗАРЭМБА Мікалай Дамінікавіч, н. ў 1877, в. Сутокі Барысаўскага пав., рабочы арцелі «11 ліпеня», пражываў у мяст. Копысь Аршанскага р-на. Асуджаны 24.9.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.6.1989.

ЗАСЦЕНСКІ Іосіф Сямёнавіч, н. ў 1884, в. Крапіўна Аршанскага р-на, калгаснік калгаса імя Блюхера, пражываў у в. Шугайлава Аршанскага р-на. Асуджаны 25.9.1937. Расстраляны 13.10.1937. Рэабілітаваны 29.2.1964.

ЗАСЦЕНСКІ Іосіф Сямёнавіч, н. ў 1885, в. Шугайлава Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Шугайлава. Асуджаны 15.4.1932 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 21.12.1963.

ЗАХАРАЎ Архіп Парфенавіч, н. ў 1894, в. Якаўлевічы Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Якаўлевічы. Асуджаны 21.10.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 28.11.1989.

ЗБУРЖЫНСКІ Антон Карлавіч, н. ў 1888, ст. Слаўнае Магілёўскай губ., брыгадзір пуці станцыі Орша, пражываў на перагоне станцыі Пагост-Коханава. Асуджаны 20.1.1934 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 19.5.1960.

ЗЕМІТ Андрэй Якаўлевіч, н. ў 1895, в. Пуцілава Віцебскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Ганусін Бор Аршанскага р-на. Асуджаны 28.9.1931, у тэрмін пакарання ўключаны тэрмін знаходжання пад следствам з 4.7.1931. Другі раз асуджаны 16.10.1938. Расстраляны 6.11.1938. Рэабілітаваны 31.1.1969.

ЗЕМІТ Іван Якаўлевіч, н. ў 1888, в. Крапіўна Аршанскага р-на, калгаснік калгаса імя Блюхера, пражываў у в. Шугайлава Аршанскага р-на. Асуджаны 28.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 24.11.1989.

ЗІБЕРТ Васіль Давыдавіч, н. ў 1894, г. Віндава Курляндскай губ., начальнік пажарнай аховы завода «Чырвоны Кастрычнік», пражываў у пас. Барань Аршанскага р-на. Асуджаны 24.1.1942 на 5 гадоў ссылкі ў Башкірскую АССР. Памёр у ссылцы 16.10.1942. Рэабілітаваны 6.8.1960.

ЗІНЬКОВІЧ Дзмітрый Мартынавіч, н. ў 1887, г. Орша, кладаўшчык калгаса імя Блюхера, пражываў у в. Гуры Аршанскага р-на. Асуджаны 29.8.1937. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 22.7.1957.

ЗУЕЎ Якаў Аляксандравіч, н. ў 1884, в. Чаронкі Віленскай губ., рабочы саўгаса «Бабінічы», пражываў у в. Бабінічы Аршанскага р-на. Асуджаны 3.1.1938. Расстраляны 19.1.1938. Рэабілітаваны 14.4.1990.

ЗЯЛЮТКІН Георгій Васілевіч, н. ў 1909, г. Шклоў Магілёўскай губ., загадчык кааператыва «Чырвоны пахар», пражываў у в. Вялікія Салаўі Аршанскага р-на. Асуджаны 12.3.1930 на 1 год (умоўна). Рэабілітаваны 29.9.1989.

ЗЯНЬКЕВІЧ Пётр Усцінавіч, н. ў 1904, в. Лісава Барысаўскага р-на, настаўнік школы пас. Бел-ДРЭС, пражываў у в. Выдрыца Аршанскага р-на. Асуджаны 10.4.1936 на 3 гады. Рэабілітаваны 4.4.1990.

ЗЯНЬКО Уладзімір Вікенцьевіч, н. ў 1894, в. Боркі Дрысенскага пав., рабочы саўгаса «Высокае», пражываў у саўгасе «Высокае» Аршанскага р-на. Асуджаны 26.10.1937. Расстраляны 10.11.1937. Рэабілітаваны 11.3.1958.

ІВАНОЎСКІ Франц Антонавіч, н. ў 1905, в. Ахімкавічы Круглянскага р-на, аглядчык вагоннага ўчастка станцыі Орша, пражываў у калгасе «Чырвоны чыгуначнік» Аршанскага р-на. Асуджаны 28.9.1938 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 1.11.1958.

ІВАШКЕВІЧ Дзмітрый Андрэевіч, н. ў 1893, в. Чурылава Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Чурылава. Асуджаны 26.8.1930 на 3 гады. Рэабілітаваны 9.7.1992.

ІВАШКЕВІЧ Кузьма Андрэевіч, н. ў 1885, в. Чурылава Аршанскага р-на, калгаснік калгаса імя Блюхера, пражываў у в. Шугайлава Аршанскага р-на. Асуджаны 28.9.1937. Расстраляны 13.10.1937. Рэабілітаваны 10.10.1989.

ІНАШЭЎСКІ Арцём Карнеевіч, н. ў 1891, в. Еліна Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Еліна. Асуджаны 9.3.1930 на 1 год. Другі раз асуджаны 28.9.1937. Расстраляны 12.10.1937. Рэабілітаваны 25.4.1964.

ІНАШЭЎСКІ Васіль Карнеевіч, н. ў 1881, в. Еліна Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Еліна. Асуджаны 9.3.1930 на 1 год. Другі раз асуджаны 10.11.1932 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 25.4.1964 і 31.10.1989.

ІНАШЭЎСКІ Ціхан Іванавіч, н. ў 1918, в. Еліна Аршанскага р-на, бухгалтар калгаса «Чырвоны бераг», пражываў у в. Крашэвічы Аршанскага р-на. Асуджаны 4.10.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 5.7.1957.

ІСАЧАНКА Андрэй Міхайлавіч (ІСАЧАНКА Агей Малафеевіч), н. ў 1903, г. Дзвінск (Латвія), рабочы БелДРЭС, пражываў у в. Брухава Аршанскага р-на. Асуджаны 11.3.1938. Расстраляны 31.3.1938. Рэабілітаваны 25.8.1989.

ІСАЧАНКА Дзмітрый Іванавіч, н. ў 1872, в. Гарбацэвічы Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Ленінскія ўсходы», пражываў у в. Ленькавічы (Ляньковічы) Аршанскага р-на. Асуджаны 15.10.1932 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 31.10.1989.

КАВАЛЕНКА Давід Іванавіч, н. ў 1886, в. Ляўкі Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Ляўкі. Асуджаны 22.2.1933. Расстраляны. Рэабілітаваны 17.9.1960.

КАВАЛЕЎСКІ Аляксандр Іванавіч, н. ў 1912, в. Дземкіна Дубровенскага р-на, без пэўных заняткаў, пражываў у в. Ларынаўка Аршанскага р-на. Асуджаны 26.8.1930 на 3 гады. Рэабілітаваны 9.7.1992.

КАГАН Сямён Шлёмавіч, н. ў 1905, мяст. Гальваны (Латвія), выкладчык Гразінаўскай школы, пражываў у в. Гразіна Аршанскага р-на. Асуджаны 12.11.1938. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 19.2.1959.

КАЖАМЯКА Фядот Кліменцьевіч, н. ў 1883, в. Падбярэззе Коханаўскага р-на, старшыня калгаса, пражываў у в. Падбярэззе. Асуджаны 8.10.1932 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 26.10.1989.

КАЖАРСКІ Рыгор Ільіч, н. ў 1909, в. Жэрына Чашніцкага р-на, настаўнік Пугляеўскай школы, пражываў у в. Пугляі Аршанскага р-на. Асуджаны 4.5.1933 да пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 26.10.1989.

КАЗАКЕВІЧ Браніслаў Францавіч, н. ў 1913, в. Стайчуўка Лепельскага р-на, рабочы каменедрабільнага завода, пражываў у Оршы. Асуджаны 23.2.1938. Расстраляны 26.3.1938. Рэабілітаваны 16.11.1992.

КАЗАКОЎ Павел Ігнацьевіч, н. ў 1887, в. Ляньковічы Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Ленінскія ўсходы», пражываў у в. Ляньковічы. Асуджаны 15.10.1932 на 5 гадоў. Другі раз асуджаны 24.9.1937. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 12.4.1989.

КАЗАЧЭНКА Васіль Савельевіч, н. ў 1890, в. Чырвоная Слабада Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «1 Мая», пражываў у в. Стайкі Аршанскага р-на. Асуджаны 14.2.1933 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 20.10.1993.

КАЗАЧЭНКА Гаўрыіл Ягоравіч, н. ў 1889, в. Чырвоная Слабада Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «1 Мая», пражываў у в. Стайкі Аршанскага р-на. Асуджаны 14.2.1933 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 20.10.1933.

КАЗЛОЎ Афанасій Ігнацьевіч, н. ў 1904, в. Шаркі Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Шаркі. Асуджаны 27.8.1931 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 31.7.1989.

КАЗЛОЎ Павел Цімафеевіч, н. ў 1891, в. Вялікія Салаўі Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Вялікія Салаўі. Асуджаны 12.3.1930 на 1 год (умоўна). Рэабілітаваны 29.9.1989.

КАЗЛОЎ Фёдар Піліпавіч, н. ў 1907, в. Сліверні Копыскага р-на, калгаснік калгаса імя Дзяржынскага, пражываў у в. Сасноўка Копыскага р-на. Асуджаны 17.5.1931 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 27.11.1989.

КАЗЛОЎСКІ Герасім Іосіфавіч, н. ў 1890, в. Кувечына Аршанскага р-на, кладаўшчык Аршанскага аэрапорта, пражываў у в. Яркі Аршанскага р-на. Асуджаны 9.5.1933 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер з заменай высылкай на пасяленне. Рэабілітаваны 11.6.1990.

КАЗЛОЎСКІ Ігнат Лаўрэнцьевіч, н. ў 1903, в. Лісуны Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Ударнік», пражываў у в. Лісуны. Асуджаны 14.4.1935 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 17.4.1963.

КАЗЛОЎСКІ Міхаіл Кузьміч, н. ў 1892, в. Жур'ева Аршанскага р-на, брыгадзір службы пуці чыгункі, пражываў у в. Гразіна Аршанскага р-на. Асуджаны 16.10.1938. Расстраляны 31.10.1938. Рэабілітаваны 13.7.1960.

КАЗЛОЎСКІ Сцяпан Васілевіч, н. ў 1881, в. Гур'ева Аршанскага р-на, цясляр на станцыі Смаляны Заходняй чыгункі, пражываў у в. Гур'ева. Асуджаны 14.2.1938. Расстраляны 14.3.1938. Рэабілітаваны 27.10.1956.

КАЗУНКО Пётр Раманавіч, н. ў 1873, в. Гора (Гара) Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Гора. Асуджаны 7.3.1930 да ссылкі разам з сям'ёй за межы БССР. Рэабілітаваны 20.11.1989.

КАЛАСОЎСКІ Васіль Афанасьевіч, н. ў 1886, в. Дзятлава Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Чырвоны меліяратар», пражываў у в. Дзятлава. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 30.11.1989.

КАЛЯВОДА Іван Васілевіч, н. ў 1896, г. Хлюмец, Чэхаславакія, млынар саўгаса «Забалацце», пражываў у в. Забалацце Аршанскага р-на. Асуджаны 2.12.1932 на 3 гады. Другі раз асуджаны 26.3.1934 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 15.9.1989 і 18.10.1989.

КАМЛЁНАК Васіль Карпавіч, н. ў 1868, в. Вязьмічы Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Вязьмічы. Асуджаны 16.2.1933 на 5 гадоў зняво-

лення ў папраўча-працоўны лагер з заменай высылкай на Поўнач на той жа тэрмін. Рэабілітаваны 26.4.1989.

КАМЛЁНАК Васіль Сямёнавіч, н. ў 1892, в. Цюльпіна Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Цюльпіна. Асуджаны 9.1.1938. Расстраляны 8.2.1938. Рэабілітаваны 18.9.1989.

КАМЛЁНАК Еўдакім Сямёнавіч, н. ў 1879, в. Цюльпіна Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Цюльпіна. 4.3.1932 зняволены на 5 гадоў. Рэабілітаваны 27.11.1989.

КАМЛЁНАК Максім Канстанцінавіч, н. ў 1871, в. Вязьмічы Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Вязьмічы. Асуджаны 16.2.1933. Расстраляны. Рэабілітаваны 26.4.1989.

КАМЛЁНАК Парфірый Арцем'евіч, н. ў 1897, в. Вязьмічы Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Чырвоная перамога», пражываў у в. Вязьмічы. Асуджаны 21.10.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 4.7.1959.

КАНАБЕЕЎ Сцяпан Сяргеевіч, н. ў 1880, в. Дзмітрыеўка Тамбоўскай вобл., загадчык Крапіўненскага медпункта, пражываў у в. Крапіўна Аршанскага р-на. Асуджаны 30.7.1945 на 10 гадоў. 13.4.1948 справа спынена.

КАНДРАТУК Канстанцін Фёдаравіч, н. ў 1894, Скідзельская воласць, інжынер Аршанскага льнокамбіната. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937. Рэабілітаваны 4.12.1957.

КАНОПЧАНКА Ігнат Андрэевіч, н. ў 1872, в. Гараны Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Гараны. Асуджаны 24.9.1937. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 7.10.1957.

КАНОПЧАНКА Марк Аляксеевіч, н. ў 1889, в. Гараны Аршанскага р-на, сезонны рабочы, пражываў у в. Гараны. Асуджаны 24.9.1937. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 7.10.1957.

КАНТОРАЎ (КАНТАРАЎ) Васіль Нікіціч, н. ў 1878, в. Гарбацэвічы Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Гарбацэвічы. Асуджаны 15.4.1932 на 5 гадоў. Другі раз асуджаны 24.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 31.10.1989 і 23.11.1989.

КАНЦАВЕНКА Андрэй Яфімавіч, н. ў 1892, в. Зубры Аршанскага р-на, стрэлачнік станцыі Зубры, пражываў у в. Зубры. Асуджаны 15.4.1933 да вышэйшай меры пакарання з высылкай сям'і на Поўнач на 3 гады. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 23.10.1959.

КАПАШЫЛАЎ Навум Васілевіч, н. ў 1877, в. Лявонаўка Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Лявонаўка. Асуджаны 11.5.1932 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 1.9.1962.

КАПЕЛЬКА Міхаіл Гаўрылавіч, н. ў 1898, в. Пугляі Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Пугляі. Асуджаны 28.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 4.10.1989.

КАПЛУН Емяльян Афанасьевіч, н. ў 1873, в. Салаўі Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Салаўі. Асуджаны 3.9.1932 да ссылкі на Поўнач на 3 гады. Рэабілітаваны 23.11.1989.

КАПЛУН Іван Васілевіч, н. ў 1909, в. Малыя Каплуны Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Малыя Каплуны. Асуджаны 12.3.1930 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 29.9.1989.

КАПУСЦІН Ціхан Нікіціч, н. ў 1894, в. Шатукі Смаленскай вобл., кладаўшчык завода «Асінторф», пражываў у пас. Асінторф Аршанскага р-на. Асуджаны 29.4.1942 на 3 гады. Рэабілітаваны 23.12.1960.

КАРА Уладзімір Іванавіч, н. ў 1903, в. Горбава Лёзненскага р-на, рабочы чыгуначнай станцыі Асінторф, пражываў у пас. Асінторф Аршанскага р-на. Асуджаны 12.11.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 20.10.1989.

КАРАБАН Васіль Іванавіч, н. ў 1875, в. Селішча Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Селішча. Асуджаны 26.12.1932 да ссылкі ў Казахстан на 3 гады. Рэабілітаваны 22.6.1989.

КАРАБІЦКІ Прохар Іванавіч, н. ў 1880, в. Туравічы Аршанскага р-на, калгаснік калгаса імя XVI Партз'езда, пражываў у в. Туравічы. Асуджаны 14.5.1933 да ссылкі ў Казахстан на 3 гады. Другі раз асуджаны 4.10.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 5.5.1959 і 22.11.1989.

КАРАВЕЦ Васіль Андрэевіч, н. ў 1896, в. Гопкі Люблінскага пав., рамонтны рабочы службы руху станцыі Орша, пражываў у в. Люсееўка Аршанскага р-на. Асуджаны 23.9.1937. Расстраляны 27.9.1937. Рэабілітаваны 30.11.1989.

КАРАВЕЦ (КУРАВЕЦ) Марыя Ісакаўна, н. ў 1888, в. Майсееўка Аршанскага р-на, калгасніца калгаса «XIII Кастрычнік», пражывала ў в. Майсееўка. Асуджана 25.9.1938. Расстраляна 5.10.1938. Рэабілітавана 2.10.1989.

КАРАНЕЎСКІ Іосіф Антонавіч, н. ў 1895, в. Казадай Сенненскага р-на, пастух саўгаса «Высокае» Аршанскага р-на, пражываў у саўгасе. Асуджаны 9.12.1937. Расстраляны 19.1.1938. Рэабілітаваны 20.10.1989.

КАРАНЬКОЎ Васіль Афанасьевіч, н. ў 1871, в. Высокае Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Высокае. Асуджаны 28.8.1921 на 1 год. Рэабілітаваны 29.5.1992.

КАРАНЬКОЎ Нікіта Нікітавіч, н. ў 1880, в. Крушановічы Коханаўскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Гразіна Аршанскага р-на. Асуджаны 23.5.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 17.8.1989.

КАРЖЫЦКІ Васіль Мікалаевіч, н. ў 1888, в. Лісічына Аршанскага р-на, манцёр дэпо станцыі Орша, пражываў у в. Лісічына. Асуджаны 26.2.1931 на 1 год (умоўна). Рэабілітаваны 29.4.1958.

КАРМАНАЎ Аляксандр Пракопавіч, н. ў 1862, в. Лучыншчына Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Лучыншчына. Асуджаны 30.4.1933. Расстраляны. Рэабілітаваны 17.1.1959.

КАРМАНАЎ Іван Аляксандравіч, н. ў 1913, в. Лучыншчына Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Лучыншчына. Асуджаны 30.4.1933 на 5 гадоў. Другі раз асуджаны 15.9.1937. Расстраляны 30.9.1937. Рэабілітаваны 17.1.1959 і 15.5.1989.

КАРМАНАЎ Мікалай Аляксандравіч, н. ў 1910, в. Лучыншчына Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Лучыншчына. Асуджаны 30.4.1933 на 5 гадоў. Другі раз асуджаны 15.9.1937. Расстраляны 30.9.1937. Рэабілітаваны 17.1.1959 і 15.5.1989.

КАРМАНАЎ Пётр Трафімавіч, н. ў 1910, в. Макараўка Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Макараўка. Асуджаны 11.5.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 26.5.1962.

КАРМАНАЎ Сысой Дзям'янавіч, н. ў 1890, в. Лучыншчына Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Лучыншчына. Асуджаны 30.4.1933 на 3 гады. Рэабілітаваны 17.1.1959.

КАРМАНАЎ Філімон Самсонавіч, н. ў 1905, в. Макараўка Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Макараўка. Асуджаны 11.5.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 26.5.1962.

КАРМАНАЎ Ціхан Федасеевіч, н. ў 1893, в. Макараўка Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Макараўка. Асуджаны 23.5.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 26.5.1962.

КАРМАНАЎ Якаў Цімафеевіч, н. ў 1900, в. Макараўка Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Макараўка. Асуджаны 17.3.1933 на 3 гады. Рэабілітаваны 31.10.1969.

КАРОТКІН Максім Міхеевіч, н. ў 1906, в. Чаркасоны Аршанскага р-на, брыгадзір 15-й дыстанцыі службы руху, пражываў у в. Зарэчча Аршанскага р-на. Асуджаны 30.6.1947 на 15 гадоў. Рэабілітаваны 22.5.1956.

КАРПЕКА Фядот Якаўлевіч, н. ў 1869, в. Будзішча Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Чырвоная зорка», пражываў у в. Будзішча. Асуджаны 11.5.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 20.11.1989.

КАРПОВІЧ Максім Ягоравіч, н. ў 1886, в. Камякі Аршанскага р-на, рабочы станцыі Лямніцы, пражываў у в. Камякі. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 30.11.1989.

КАРЦАЎ Іван Фёдаравіч, н. ў 1898, в. Вяркова Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Краснае Аршанскага р-на. Асуджаны 12.3.1930 да ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 5.7.1989.

КАСАБУКА Аляксандр Іванавіч, н. ў 1893, г. Рэчыца Гомельскай вобл., святар, пражываў у мяст. Копысь Аршанскага р-на. Асуджаны 17.5.1931. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 27.11.1989.

КАСТКО Барыс Філімонавіч, н. ў 1902, в. Капланаўка Кіраўскага р-на, загадчык няпоўнай сярэдняй школы, пражываў у в. Зубрэвічы Аршанскага р-на. Асуджаны 9.11.1937. Расстраляны 17.1.1938. Рэабілітаваны 17.5.1961.

КАСТЫЛЁЎ Сысой Рыгоравіч, н. ў 1904, в. Шапкі Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Шапкі. Асуджаны 24.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 16.5.1989.

КАСЦЮКОВІЧ Арцём Анікеевіч, н. ў 1896, в. Дубраўкі Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Дубраўкі. Асуджаны 11.5.1932 да ссылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны 31.10.1989.

КАСЦЮКОЎ Архіп Афанасьевіч, н. ў 1898, в. Марозава Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «1 Мая», пражываў у в. Марозава. Асуджаны 28.9.1937. Расстраляны 12.10.1937. Рэабілітаваны 10.10.1989.

КАТКОЎСКІ Дзяніс Ананьевіч, н. ў 1896, в. Заложжа Аршанскага р-на, трактарыст калгаса «Прамень сацыялізму» Аршанскага р-на, пражываў у калгасе. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 22.5.1992.

КАТУЛЬСКІ Васіль Вікенцьевіч, н. ў 1898, г. Адэса, загадчык аддзела БелДРЭС, пражываў у пас. Арэхі Аршанскага р-на. Асуджаны 4.8.1932 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 20.1.1956.

КВАСАЎ Іван Конанавіч, н. ў 1887, в. Быстрая Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Быстрая. Асуджаны 29.5.1931 да высылкі разам з сям'ёй на Урал. Рэабілітаваны 24.7.1989.

КВАСАЎ Міхаіл Конанавіч, н. ў 1901, в. Быстрая Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Быстрая. Асуджаны 29.5.1931 да высылкі разам з сям'ёй на Урал. Рэабілітаваны 24.7.1989.

КВАСАЎ Пётр Савельевіч, н. ў 1892, в. Быстрая Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Быстрая. Асуджаны 29.5.1931 да высылкі разам з сям'ёй на Урал. Рэабілітаваны 24.7.1989.

КІВЕРЫК Іван Іаганавіч, н. ў 1888, в. Забежыца Аршанскага р-на, рабочы Асінторфа, пражываў у в. Шабаны Аршанскага р-на. Асуджаны 31.10.1938 на 8 гадоў. Рэабілітаваны 16.10.1989.

КІПЕ Ян Хрыстафоравіч, н. ў 1885, Курляндская губ., старшыня калгаса імя Кірава, пражываў у в. Пустынкі Аршанскага р-на. Асуджаны 16.10.1938. Расстраляны 16.11.1938. Рэабілітаваны 29.11.1968.

КІРЫК Ермалай Нікітавіч, н. ў 1897, в. Грэчыкі Аршанскага р-на, калгаснік калгаса імя Праўды, пражываў у в. Балакі Аршанскага р-на. Асуджаны 29.8.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 12.1.1959.

КІСЯЛЁЎ Іван Іванавіч, н. ў 1890, в. Пагост Аршанскага р-на, грузчык райтрансгандальхарчу станцыі Орша, пражываў у в. Пагост. Асуджаны 26.2.1934 на 3 гады. Другі раз асуджаны 19.3.1938. Расстраляны 20.4.1938. Рэабілітаваны 20.7.1959.

КІСЯЛЁЎ Франц Сцяпанавіч, н. ў 1890, в. Пагост Аршанскага р-на, грузчык райтрансгандальхарчу станцыі Орша, пражываў у в. Жалязнякі Аршанскага р-на. Асуджаны 28.9.1938 на 8 гадоў. Рэабілітаваны 31.10.1989.

КІУЗАЛІС Вольга Іванаўна, н. ў 1870, в. Беразно Аршанскага р-на, сялянка-аднаасобніца, пражывала ў в. Беразно. Асуджана 10.4.1930 да ссылкі на 3 гады за межы БССР. Рэабілітавана 11.8.1989.

КЛІМАН Павел Эрнеставіч, н. ў 1897, в. Шабаны Аршанскага р-на, вартаўнік базы Аршанскага мясакамбіната, пражываў у в. Шабаны. Асуджаны 31.10.1938. Расстраляны 19.11.1938. Рэабілітаваны ў 1989 г.

КЛІМОВІЧ Васіль Іванавіч, н. ў 1865, хут. Беларужжа Аршанскага р-на, рабочы па найме, пражываў у мяст. Копысь Аршанскага р-на. Асуджаны 15.9.1937. Расстраляны 30.9.1937. Рэабілітаваны 15.5.1989.

КЛІМЯНКОЎ Нікіфар Ігнацьевіч, н. ў 1889, в. Холбні Дубровенскага р-на, бухгалтар Юрцаўскай сельскагаспадарчай калоніі, пражываў у в. Юрцава. Асуджаны 10.2.1934 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 4.3.1958.

КЛІНДУХОЎ Леанід Васілевіч, н. ў 1891, в. Свяцілавічы Гомельскай вобл., святар царквы ў в. Расіна, пражываў у в. Расіна Аршанскага р-на. Асуджаны 12.3.1930 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 22.6.1989.

КЛЯПІЦКІ Парфірый Паўлавіч, н. ў 1880, в. Заложжа Аршанскага р-на, рабочы цагельнага завода, пражываў у в. Заложжа. Асуджаны 28.9.1937. Расстраляны 13.10.1937. Рэабілітаваны 10.10.1989.

КЛЯПІЦКІ Пётр Прохаравіч, н. ў 1898, в. Горная Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Горная. Асуджаны 11.5.1932 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 20.11.1989.

КЛЯПІЦКІ Пётр Прохаравіч, н. ў 1898, в. Крапіўна Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Крапіўна. Асуджаны 20.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 22.12.1989.

КЛЯПІЦКІ Прохар Паўлавіч, н. ў 1867, в. Крапіўна Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Крапіўна. Асуджаны 11.5.1932 да ссылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны 20.11.1989.

КЛЯПІЦКІ Сідар Прохаравіч, н. ў 1901, в. Горная Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Горная. Асуджаны 11.5.1932 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 20.11.1989.

КЛЯЎЗО (КЛЯВЗО) Іван Феліксавіч, н. ў 1909, в. Ламачына Аршанскага р-на, рабочы 6-й дыстанцыі пуці станцыі Орша, пражываў у в. Ламачына. Асуджаны 20.5.1938. Расстраляны 29.7.1938. Рэабілітаваны 17.11.1989.

КЛЯЎЗО (КЛЯВЗО) Лявон Феліксавіч, н. ў 1910, в. Татарск Аршанскага р-на, пуцявы рабочы Заходняй чыгункі, пражываў у Аршанскім р-не. Асуджаны 28.9.1938 на 8 гадоў. Рэабілітаваны 14.9.1959.

КЛЯЦКОЎ Іван Афанасьевіч, н. ў 1875, в. Свіракі Дубровенскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Горная Крапіўка Аршанскага р-на. Асуджаны 28.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 30.11.1989.

КЛЯШКОЎ Ларыён Уласавіч, н. ў 1884, в. Дубніцы Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Дубніцы. Асуджаны 14.2.1933 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 20.10.1993.

КНЯЗЕЎ Міхаіл Міронавіч, н. ў 1901, в. Слабада-Кузьмінічы Цярэзаўскага р-на, выкладчык Смалянскага сельгастэхнікума, пражываў у мяст. Смаляны Аршанскага р-на. Асуджаны 3.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 4.5.1957.

КОЖАР Фёдар Ціханавіч, н. ў 1887, в. Малая Гальцава Аршанскага р-на, рабочы Асінторфа, пражываў у в. Малая Гальцава. Асуджаны 24.9.1937. Расстраляны 12.10.1937. Рэабілітаваны 13.6.1989.

КОПЦІК Фядос Якаўлевіч, н. ў 1894, в. Селішча Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Селішча. Асуджаны 26.12.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 22.6.1989.

КОПЧЫК Сцяпан Якаўлевіч, н. ў 1872, в. Селішча Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Селішча. Асуджаны 26.12.1932 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер з заменай высылкай разам з сям'ёй на Поўнач на той жа тэрмін. Рэабілітаваны 22.6.1989.

КОТАЎ Іван Фокавіч, н. ў 1899, в. Іскозы Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Іскозы. Асуджаны 9.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 25.9.1989.

КОТАЎ Майсей Мінавіч, н. ў 1894, в. Рагазіна Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Рагазіна. Асуджаны 11.3.1931 да ссылкі ў Сібір. Рэабілітаваны 12.7.1989.

КОТАЎ Павел Фёдаравіч, н. ў 1897, в. Рагазіна Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Ленінскі заклік», пражываў у в. Ганусін Бор Аршанскага р-на. Асуджаны 3.3.1933 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 28.11.1959.

КОТАЎ Пётр Фёдаравіч, н. ў 1894, в. Рагазіна Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Рагазіна. Асуджаны 17.5.1931 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 12.7.1989.

КОТАЎ Рыгор Яфімавіч, н. ў 1876, в. Харкаўка Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Лемна Аршанскага р-на. Асуджаны 26.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 30.11.1989.

КОТАЎ Фёдар Міхайлавіч, н. ў 1869, в. Лемна Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Лемна. Асуджаны 11.3.1931 да ссылкі ў Сібір. Рэабілітаваны 3.2.1962.

КОТАЎ Яфім Фёдаравіч, н. ў 1907, в. Лемна Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Запаветы Ільіча», пражываў у в. Лемна. Асуджаны 29.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 10.10.1989.

КРАКАЎСКІ (КРАКОЎСКІ) Аляксандр Аляксеевіч, н. ў 1903, в. Красналукі Халопеніцкага р-на, брыгадзір кар'ера 533-і км, пражываў у в. Андрэеўшчына Аршанскага р-на. Асуджаны

16.4.1938. Расстраляны 15.5.1938. Рэабілітаваны 9.10.1989.

КРАСОЎСКІ Сазон Цімафеевіч, н. ў 1881, в. Лучыншчына Аршанскага р-на, калгаснік калгаса імя Варашылава, пражываў у в. Лучыншчына. Асуджаны 25.12.1931 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 27.11.1989.

КРАУЗЕ Лаўр Васілевіч, н. ў 1891, мяст. Краснаполле Магілёўскага р-на, дырэктар Баранскай сярэдняй школы, пражываў у пас. Барань Аршанскага р-на. Асуджаны 29.10.1937. Расстраляны 11.11.1937. Рэабілітаваны 14.7.1958.

КРУКОЎСКІ Міхаіл Сцяпанавіч, н. ў 1878, в. Даўжаніцы Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Даўжаніцы. Асуджаны 11.5.1932 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 15.6.1989.

КРУПЕНЯ Назар Фёдаравіч, н. ў 1879, в. Шэра-Селішча Аршанскага р-на, конюх торфапрадпрыемства «Асінторф», пражываў у пас. Асінторф Аршанскага р-на. Асуджаны 28.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 13.7.1959.

КРУПІН Афанасій Ананьевіч, н. ў 1892, в. Рэчкі Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «2-я Пяцігодка», пражываў у в. Рэчкі. Асуджаны 15.5.1935 на 3 гады. Рэабілітаваны 22.11.1989.

КРУШЫНСКІ Сцяпан Іванавіч, н. ў 1880, в. Папоўшчына Аршанскага р-на, калгаснік калгаса ў в. Папоўшчына, пражываў у в. Папоўшчына Аршанскага р-на. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 24.11.1989.

КРЫСАНТОВІЧ Адам Міхайлавіч, н. ў 1890, в. Пагост Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Пагост. Асуджаны 24.2.1934 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 9.8.1958.

КУЗНЯЦОВА Караліна Карлаўна, н. ў 1885, в. Пагосцін Аршанскага р-на, калгасніца калгаса «Парыжская камуна», пражывала ў в. Пагосцін. Асуджана 25.4.1942 на 5 гадоў. Рэабілітавана 19.12.1989.

КУЗНЯЦОЎ Іван Іосіфавіч, н. ў 1876, в. Ламачына Аршанскага р-на, кустар, пражываў у в. Ламачына. Асуджаны 24.2.1934 на 3 гады. Рэабілітаваны 9.8.1958.

КУЗНЯЦОЎ Пётр Дзмітрыевіч, н. ў 1879, в. Кабылякі Аршанскага р-на, рабочы вапнавага завода, пражываў у в. Кабылякі. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 13.12.1989.

КУЗНЯЦОЎ Франц Станіслававіч, н. ў 1893, в. Ламачына Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Парыжская камуна», пражываў у в. Ламачына. Асуджаны 9.11.1937. Расстраляны 26.11.1937. Рэабілітаваны 13.11.1971.

КУЗЬМІНСКАЯ Караліна Карлаўна, н. ў 1874, сялянка-аднаасобніца, пражывала на хут. Курчыкава Аршанскага р-на. Асуджана 12.7.1929 да ссылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана 15.6.1992.

КУЗЬМІНСКАЯ Ксенія Сяргееўна, н. ў 1908, сялянка-аднаасобніца, пражывала на хут. Курчыкава Аршанскага р-на. Асуджана 12.7.1929 да ссылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана 15.6.1992.

КУЗЬМІНСКІ Вікенцій Ігнацьевіч, н. ў 1911, селянін-аднаасобнік, пражываў на хут. Курчыкава Аршанскага р-на. Асуджаны 12.7.1929 да ссылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны 15.6.1992.

КУЗЬМІНСКІ Ігнацій Аляксандравіч, н. ў 1879, в. Курчынава Аршанскага р-на, селянін, пражываў у в. Курчынава. Асуджаны 19.6.1929 да ссылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны 1.6.1992.

КУЗЬМІНСКІ Мікалай Ігнацьевіч, н. ў 1908, селянін-аднаасобнік, пражываў на хут. Курчыкава Аршанскага р-на. Асуджаны 12.7.1929 да ссылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны 15.6.1992.

КУКІШАЎ Пётр Свірыдавіч, н. ў 1900, в. Лявонаўка Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Лявонаўка. Асуджаны 11.5.1932 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 1.9.1962.

КУКСЁНАК Яфімія Ермалаеўна, н. ў 1907, в. Стражава Аршанскага р-на, сялянка-аднаасобніца, пражывала ў в. Стражава. Асуджана 10.4.1930 на 3 месяцы. Рэабілітавана 11.8.1989.

КУКСО Пётр Еўдакімавіч, н. ў 1901, в. Ферма-Гразіна Аршанскага р-на, рахункавод вугальнага склада станцыі Орша, пражываў у в. Васькаўшчына Аршанскага р-на. Асуджаны 4.2.1939 на 7 гадоў. Рэабілітаваны 15.4.1959.

КУЛІК Васіль Карпавіч, н. ў 1875, в. Гаравыя Поршні Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Гаравыя Поршні. Асуджаны 29.8.1937. Расстраляны 23.9.1937. Рэабілітаваны 10.10.1989.

КУЛІК Іосіф Якаўлевіч, н. ў 1898, мяст. Заслаўль, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Новае Сяло Аршанскага р-на. Асуджаны 12.2.1933. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 15.9.1962.

КУЛІКОЎСКАЯ Антаніна Яфімаўна, н. ў 1928, в. Роскі Сялец Аршанскага р-на, знаходзілася на ўтрыманні маці, пражывала ў в. Роскі Сялец. Асуджана 1.4.1946 да ссылкі ў Краснаярскі край на 5 гадоў. Рэабілітавана 1.10.1993.

КУЛІКОЎСКАЯ Валянціна Яфімаўна, н. ў 1925, в. Роскі Сялец Аршанскага р-на, настаўніца пачатковай школы ў в. Пашына, пражывала ў в. Пашына. Асуджана 1.4.1946 да ссылкі ў Краснаярскі край на 5 гадоў. Рэабілітавана 1.10.1993.

КУЛІКОЎСКАЯ Фядосся Прохараўна, н. ў 1900, в. Роскі Сялец Аршанскага р-на, калгасніца калгаса «Перамога», пражывала ў в. Роскі Сялец. Асуджана 1.4.1946 да ссылкі ў Краснаярскі край на 5 гадоў. Рэабілітавана 1.10.1993.

КУЛІКОЎСКІ Леанід Яфімавіч, н. ў 1931, в. Роскі Сялец Аршанскага р-на, знаходзіўся на ўтрыманні маці, пражываў у в. Роскі Сялец. Асуджаны 1.4.1946 да ссылкі ў Краснаярскі край на 5 гадоў. Рэабілітаваны 1.10.1993.

КУЛЬБЕЙ Сямён Мікалаевіч, н. ў 1879, в. Азеры Навагрудскага пав., цясляр калгаса «Вусце», пражываў у в. Іванаўка Аршанскага р-на. Асу-

джаны 23.5.1936 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 18.1.1961.

КУПАВА Архіп Маркавіч, н. ў 1879, в. Селішча Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Прамень», пражываў у Кудаеўскім сельсавеце Аршанскага р-на. Асуджаны 28.9.1937. Расстраляны 13.10.1937. Рэабілітаваны 18.10.1989.

КУПАВА Васіль Пятровіч, н. ў 1907, в. Селішча Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Селішча. Асуджаны 26.12.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 22.6.1989.

КУПАВА Васіль Фёдаравіч, н. ў 1881, в. Селішча Аршанскага р-на, калгаснік, пражываў у в. Селішча. Асуджаны 26.12.1932 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 22.6.1989.

КУПАВА Захар Ермалаевіч, н. ў 1886, в. Селішча Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Селішча. Асуджаны 26.12.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 22.6.1989.

КУПАВА Кузьма Навумавіч, н. ў 1872, в. Селішча Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Селішча. Асуджаны 26.12.1932 на 3 гады ссылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 22.6.1989.

КУПАВА Міхаіл Канстанцінавіч, н. ў 1883, в. Селішча Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Селішча. Асуджаны 26.12.1932 на 3 гады ссылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны 22.6.1989.

КУПАВА Нікіфар Фёдаравіч, н. ў 1901, в. Селішча Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Маяк камунізму», пражываў у в. Селішча. Асуджаны 4.8.1935 на 3 гады. Рэабілітаваны 20.4.1990.

КУПАВА Яфім Фёдаравіч, н. ў 1878, в. Селішча Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Селішча. Асуджаны 26.12.1932 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 22.6.1989.

КУПЧЫК Іосіф Адамавіч, н. ў 1878, в. Косава Слонімскага пав., селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Ладынка Коханаўскага р-на. Асуджаны 19.6.1929 на 3 гады. Рэабілітаваны 30.8.1993.

КУРАЛЕНКА Софія Фамінічна, н. ў 1920, в. Міцькаўшчына Аршанскага р-на, вагаўшчыца на БелДРЭС, пражывала ў пас. Арэхаўск Аршанскага р-на. Асуджана 22.11.1948 на 25 гадоў з паражэннем у правах на 5 гадоў. Рэабілітавана 13.3.1956.

КУРТАСАЎ Каліна Якаўлевіч, н. ў 1882, в. Новае Тарчылава Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Новае Тарчылава. Асуджаны 15.4.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 31.10.1989.

КУХАРСКІ Рыгор Васілевіч, н. ў 1897, в. Забруддзе Жытомірскай вобл., рабочы Асінбуда, пражываў у пас. Асінторф Аршанскага р-на. Асуджаны 11.3.1931 на 3 гады. Рэабілітаваны 28.3.1989.

КУХАРЭНКА Ягор Васілевіч, н. ў 1878, в. Новае Сяло Аршанскага р-на, вартаўнік калгаса, пражываў у в. Новае Сяло. Асуджаны 28.2.1933 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 2.11.1959.

КУЧКОЎСКІ Ерафей Сяргеевіч, н. ў 1892, в. Панізоўе Аршанскага р-на, пажарнік, пражываў у в. Панізоўе. Асуджаны 28.11.1937. Расстраляны 21.12.1937. Рэабілітаваны 7.8.1965.

КУЧЫНСКІ Захар Патапавіч, н. ў 1886, в. Панізоўе Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Вольная праца», пражываў у в. Панізоўе. Асуджаны 24.9.1937. Расстраляны 12.10.1937. Рэабілітаваны 10.2.1958.

КУЧЫНСКІ Іосіф Сцяпанавіч, н. ў 1878, в. Пагосцік Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Пагосцік. Асуджаны 11.5.1932 на 5 гадоў. Другі раз асуджаны 24.9.1937. Расстраляны 12.10.1937. Рэабілітаваны 16.6.1989 і 28.11.1989.

КУШАЛЕЎСКІ Станіслаў Іосіфавіч, н. ў 1906, в. Урэчча Слуцкага р-на, настаўнік Пугляеўскай школы, пражываў у в. Пуглякі Аршанскага р-на. Асуджаны 4.5.1933 да пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 26.10.1989.

ЛАБАЦЭВІЧ Марк Міхайлавіч, н. ў 1878, в. Згарда Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Згарда. Асуджаны 28.9.1937. Расстраляны 13.10.1937. Рэабілітаваны 10.10.1989.

ЛАВІЦКАЯ Таццяна Купрэеўна, н. ў 1875, в. Казадоі Аршанскага р-на, калгасніца калгаса «Брыгадзір», пражывала ў в. Васнева Аршанскага р-на. Асуджана 9.1.1938 на 10 гадоў. Рэабілітавана 28.11.1989.

ЛАРКОЎ Максім Сямёнавіч, н. ў 1906, в. Капысіца Аршанскай акругі, навучэнец Аршанскага педтэхнікума, пражываў у в. Капысіца. Асуджаны 18.9.1930 на 3 гады. Рэабілітаваны 9.7.1992.

ЛАРЫЁНАЎ Канстанцін Фёдаравіч, н. ў 1895, г. Гомель, старшы бухгалтар БелДРЭС, пражываў у в. Арэхі Аршанскага р-на. Асуджаны 4.8.1932 на 3 гады. Рэабілітаваны 20.1.1956.

ЛАТЫШАЎ Кліменцій Цімафеевіч, н. ў 1880, в. Сліжы Аршанскага р-на, цясляр калгаса «Чырвоны бераг» Аршанскага р-на, пражываў у калгасе. Асуджаны 14.3.1938. Расстраляны 7.4.1938. Рэабілітаваны 11.8.1989.

ЛАЎРУШКІН Ермалай Гаўрылавіч, н. ў 1870, в. Казловічы Аршанскага р-на, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Казловічы. Асуджаны 11.5.1932 на 3 гады ссылкі ў Заходнюю Сібір. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ЯРКОВІЧ Мікалай Ерафеевіч, н. ў 1911, ст. Бухэду Кітайска-Усходняй чыгункі, дзяжурны па станцыі Орша, пражываў у в. Хорабрава Аршанскага р-на. Асуджаны 16.10.1938 на 8 гадоў. Рэабілітаваны 16.10.1989.

ЯРОМЕНКА Ігнат Антонавіч, н. ў 1904, в. Сядлініна Аршанскага р-на, цясляр БелДРЭС, пражываў у Рыбацкім пасёлку. Арыштаваны 24.12.1944. Справа спынена 12.11.1946.

ЯРОМЕНКА Ігнацій Емяльянавіч, н. ў 1895, в. Брылі Горацкага пав., прыватны прадпрымальнік, пражываў на хут. Жураўка Аршанскага р-на. Асуджаны 14.6.1941 на 5 гадоў. Рэабілітаваны 9.9.1993.

ЯСЕЛЬСКАЯ Ніна Іванаўна, н. ў 1900, в. Пячковічы Аршанскага р-на, сялянка-аднаасобніца, пражывала ў в. Пячковічы (Печкавічы). Асуджана 12.7.1929 на 2 гады ссылкі ў Сібір. Рэабілітавана 15.6.1992.

ЯСКЕВІЧ Антон Арцёмавіч, н. ў 1888, в. Засекі Аршанскага р-на, старшыня калгаса «Будаўнік», пражываў у в. Ізмайлава Аршанскага р-на. Асуджаны 15.4.1932 на 3 гады. Другі раз асуджаны 29.8.1937. Расстраляны 22.9.1937. Рэабілітаваны 15.9.1962.

ЯСКЕВІЧ Іван Карпавіч, н. ў 1891, в. Ферма Гразіна Аршанскага р-на, цясляр станцыі Орша, пражываў на хут. Зады Аршанскага р-на. Асуджаны 14.11.1933 на 3 гады. Рэабілітаваны 11.5.1990.

ЯЎСЕЕНКА Андрэй Антонавіч, н. ў 1897, в. Свіракі Дубровенскага р-на, кладаўшчык спіртзавода, пражываў у в. Высокае Аршанскага р-на. Асуджаны 25.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 4.7.1959.

ЯФІМАЎ Іван Рыгоравіч, н. ў 1896, в. Лісуны Аршанскага р-на, калгаснік калгаса «Ударнік», пражываў у в. Лісуны. Арыштаваны 29.7.1938. Справа спынена 3.3.1939.

Спіс жыхароў Аршанскага раёна, выселеных у адміністрацыйным парадку (паводле звестак Аршанскага райвыканкома)

БЕЛАРУСКІ Сяргей Іосіфавіч, н. ў 1914, пражываў у в. Смётанка.

БРАЗОЎСКАЯ Марфа Сямёнаўна, н. ў 1900, пражывала ў в. Бабінічы.

ВАСІЛЁНАК Андрэй Васілевіч, н. ў 1915, пражываў у в. Цюльпін.

ГАНАК Ніна Фёдараўна, н. ў 1928, пражывала ў в. Юрцава.

ДАШКЕВІЧ Лаўрэн Цімафеевіч, н. ў 1901, пражываў у в. Гразіўка.

ІЛЬЧУК Антаніна Кандрацьеўна, н. ў 1935, пражывала ў в. Магераўка.

ІЛЬЧУК Мікалай Яфімавіч, н. ў 1920, пражываў у в. Магераўка.

ІЛЬЯНКОВА Ганна Дзмітрыеўна, н. ў 1919, пражывала ў в. Балбасава.

КАВАЛЕЎСКІ Мікалай Іванавіч, н. ў 1929, пражываў у в. Прыдняпроўе.

КАЛІНОЎСКАЯ Лідзія Фёдараўна, н. ў 1924, пражывала ў в. Новае Хорабрава.

КАСЦЮКОВІЧ Барыс Аляксеевіч, н. ў 1917, пражываў у в. Хімы.

ЛАШЧЫНОЎСКАЯ Зінаіда Андрэеўна, н. ў 1924, пражывала ў в. Зубава.

ЛЕГАНЬКОЎ Пётр Якаўлевіч, н. ў 1919, пражываў у в. Копысь.

ЛІХАЧОВА Таццяна Марцінаўна, н. ў 1925, пражывала ў в. Прыгузкі.

МАГЕР Настасся Марцінаўна, н. ў 1919, пражывала ў в. Прыгузкі.

МУЛІНА Яўгенія Пятроўна, н. ў 1942, пражывала ў в. Бабінічы.

ПАКРОЎСКАЯ Аляксандра Мінаўна, н. ў 1930, пражывала ў в. Бабінічы.

РЖЭНДЗІНСКАЯ Вікторыя Станіславаўна, н. ў 1906, пражывала ў в. Арэхаўск.

РЫБАКОВА Агаф'я Паўлаўна, н. ў 1912, пражывала ў в. Высокае.

ЦІМАШЧАНКА Вера Георгіеўна, н. ў 1920, пражывала на станцыі Казарма 537-ы км.

ШАСТАКОВА Юлія Дзмітрыеўна, н. ў 1920, пражывала ў в. Есіпава.

ШПАКОЎСКАЯ Фрыда Піліпаўна, н. ў 1937, пражывала ў в. Андрэеўшчына.

1941

1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

У гады выпрабаванняў

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны Орша апынулася ў зоне ваенных дзеянняў. Пачынаючы з 23 чэрвеня 1941 г. нямецка-фашысцкая авіяцыя рабіла рэгулярныя налёты на горад. Аршанскі чыгуначны вузел, які меў важнае стратэгічнае значэнне, фашысты бамбілі па некалькі разоў на дзень.

У першы тыдзень вайны мала хто з аршанцаў верыў у непазбежнасць акупацыі горада ворагам. Становішча было невядомае нават гарадскім уладам. Выхаваныя на сталінскім лозунгу «Ваяваць на чужой тэрыторыі малой крывёю!», людзі спадзяваліся, што Чырвоная Армія спыніць ворага.

Імклівае наступленне ворага, бамбёжкі, разбурэнні, гібель родных і знаёмых, памножаныя на заклікі Камуністычнай партыі да абароны сацыялістычнай Айчыны, абуджалі ў большасці насельніцтва імкненне зрабіць свой уклад у барацьбу з захопнікамі. Гарадскі камітэт КП(б)Б, гарвыканком, ваенны камісарыят, установы, прадпрыемствы перайшлі на рэжым кругласутачнай працы. Каля дзвярэй ваеннага камісарыята выстройваліся доўгія чэргі: не толькі мабілізаваныя, але і многія добраахвотнікі імкнуліся на фронт. У гэтыя дні тысячы аршанцаў і жыхароў раёна пайшлі змагацца з ворагам. Ухадзілі нават цэлыя калектывы на чале з кіраўнікамі. З аршанскіх сувязістаў было сфарміравана падраздзяленне сувязі, якое было накіравана на Заходні фронт. Камандзірам яго стаў намеснік начальніка гарадской канторы сувязі Мікалай Васілевіч Манькоўскі.

У трывожныя дні і ночы першых тыдняў вайны пачалі выяўляцца высокія якасці духу, маральная сіла савецкіх людзей, якія ў канчатковым выніку забяспечылі перамогу Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне.

Патрыятызм, мужнасць, гераізм, гатоўнасць да самаахвяравання ў імя доўгу, высокая свядомасць, інтэрнацыяналізм, дружба і таварыскасць, дысцыплінаванасць і арганізаванасць знаходзілі сваё выяўленне ў паўсядзённай дзейнасці людзей.

З першых дзён вайны аршанскія чыгуначнікі перайшлі на казарменнае становішча. Каб забяспечыць перавозкі, яны працавалі без адпачынку па 2 — 3 сутак. Рамонт паравозаў рабіўся нават у час бамбёжак. Кругласутачна працавалі скразныя франтавыя брыгады, якія рамантавалі пашкоджаныя авіяцыяй праціўніка вагоны, станцыйныя пуці і чыгуначныя лініі, абсталяванне і сувязь.

«...Сто трыццаць гадзін нязменна знаходзіліся на паравозе машыніст Андрэеў, памочнікі машыніста Верхаводзька і Гускін. На адной са станцый гэтыя героі пад артылерыйскім абстрэлам ворага дапамаглі аднавіць пуць і вывезці засеўшыя там цягнікі. Пад

моцным кулямётным дажджом, пад разрывамі бомбаў Андрэеў выратаваў браняпоезд і каштоўны рыштунак» (газета «Ленінскі прызыў» 1956 г. 16 чэрвеня).

У канцы чэрвеня 1941 г. адзін з наліўных саставаў вёў да фронту С.Піваваравў. У шляху яго нагнаў фашысцкі сцярвятнік. Ад выбуху бомбы загарэлася адна з цыстэрнаў у сярэдзіне саставу. Машыніст змог адчапіць ад палаючай цыстэрны ўсе астатнія і, не зважаючы на апёкі, даставіць груз па назначэнні.

Малады машыніст Васіль Радзюк вёў састаў з баявой тэхнікай і асабовым складам да фронту. Каля ст. Слаўнае яго атакаваў фашысцкі самалёт. Паравоз атрымаў пашкоджанні, сам Васіль быў паранены. Але машыніст не пакінуў свайго паста. Ён давёў састаў да месца назначэння і толькі тады дазволіў санітарам адвезці сябе ў шпіталь. Падобных прыкладаў мноства.

У канцы чэрвеня ў горад пачалі паступаць параненыя, а таксама жыхары, што эвакуіраваліся з прыгранічных абласцей рэспублікі. Дзякуючы энергічным дзеянням гарадскіх улад пытанні шпіталізацыі параненых і размяшчэння бежанцаў вырашаліся хутка і без затрымак.

У той жа час гарадскі камітэт КПБ(б), гарваенкамат, гарком і райком камсамола пачалі фарміраванне знішчальных атрадаў і груп для барацьбы з дыверсантамі, правакатарамі, сігнальшчыкамі ў горадзе і раёне. Атрады камплектаваліся з юнакоў і дзяўчат, якіх накіроўвалі камсамольскія арганізацыі. На чале кожнай такой групы станавіўся камуніст. У начны час члены гэтых груп патрулявалі на вуліцах, ахоўвалі склады і іншыя важныя аб'екты. Адной з такіх груп была сарвана буйная дыверсія на важнейшым аб'екце горада — базе дзяржаўных рэзерваў. Двое невядомых, што былі затрыманы групай знішчальнікаў, аказаліся агентамі ворага. У ходзе следства яны выдалі сваіх саўдзельнікаў і далі іншую каштоўную інфармацыю.

За некалькі дзён да акупацыі ў Оршы пачалася арганізацыя падполля. Абласныя, гарадскія і раённыя партыйныя органы падабралі і зацвердзілі кандыдатуры падпольшчыкаў. Гарком партыі вызначыў канспіратыўныя кватэры і распрацаваў памятку «Аб асаблівасцях работы ў падполлі». У Оршы на льнокамбінаце і хлебазаводзе, у лясах у раёне БелДРЭСа, непадалёку ад пасёлкаў Асінторф і Руміна пачалі стварацца базы з запасамі зброі, узрыўчаткі і харчавання.

У спісы падпольшчыкаў былі ўнесены: член райкома партыі, дырэктар Смалянскай МТС Л.Н.Анкіновіч, работнікі льнокамбіната памочнік майстра А.І.Бяляўскі, ткачыха М.Я.Глушанкова, электратэхнік І.К.Петрачэнка, брыгадзір цэха хлебакамбіната Н.І.Давыдзенка, інструктар гаркома партыі А.Т.Карабкіна, старшая тэлеграфістка ст. Орша Л.І.Мурамцава, студэнткі мясцовага тэхнікума сувязі М.М.Насовіч і Л.І.Рамаева, сакратар партарганізацыі Высокскага спіртзавода А.Г.Шкабарын, былы інструктар Аршанскага РК КП(б)Б А.Т.Скаварада і некаторыя іншыя.

У першыя дні ліпеня 1941 г. пачалася эвакуацыя прамысловага абсталявання аршанскіх прадпрыемстваў. На працягу тыдня былі дэманціраваны, пагружаны на платформы і адпраўлены ў тыл станкі і абсталяванне заводаў «Чырвоны барацьбіт», «Чырвоны Кастрычнік», ільнокамбіната і БелДРЭСа, а пазней абсталяванне чыгуначных прадпрыемстваў. Выканаць велізарны аб'ём работы ў такія сціслыя тэрміны рабочым і служачым названых прадпрыемстваў дапамаглі атрады народнага апалчэння. Людзі забываліся на ежу і сон. Працавалі ўдзень і ўначы, часам пад бамбёжкамі.

Становішча на Заходнім фронце між тым рэзка пагаршалася. Танкавыя злучэнні нямецка-фашысцкіх войск імкліва прасоўваліся наперад, амаль не сустракаючы супраціўлення. Да пачатку ліпеня савецкае Галоўнакамандаванне прыняло рашэнне аб разгортванні на межах сярэдняга цячэння Заходняй Дзвіны і Дняпра ад Краславы да Лоева войск другога стратэгічнага эшалона. Асаблівая роля адводзілася цэнтральнаму — аршанска-смаленскаму напрамку як найбольш кароткаму шляху да сталіцы дзяржавы — Масквы. Гэты напрамак прыкрывалі войскі 20-й і 19-й армій. Для стварэння абароннага рубяжа савецкае Галоўнакамандаванне загадала прыцягнуць грамадзянскае насельніцтва. Жыхары Оршы былі мабілізаваны на ўзвядзенне абарончых збудаванняў. 1200 байцоў добраахвотных фарміраванняў і 20 тыс. гараджан за некалькі сутак выкапалі па левым беразе Дняпра супрацьтанкавы роў даўжынёй 12 км.

М.М.Дзмітрыеў.

Ён пачынаўся ад чыгуначнага моста цераз Днепр і цягнуўся да в. Пашына. У раёне ўпадзення р. Адроўка ў Днепр была пабудавана плаціна. Узровень вады ў Адроўцы падняўся на 3 м. У ходзе баёў за Оршу гэтыя збудаванні адыгралі важную ролю: прарвацца праз гэтыя рубяжы танкі праціўніка так і не змаглі.

У басейнах рэк Бярэзіна і Днепр у тыя дні не было больш-менш значных сіл Чырвонай Арміі, якія былі б здольныя затрымаць прасоўванне фашысцкіх полчышчаў на аршанска-смаленскім напрамку. Выключэннем была 1-я Маскоўская пралетарская мотастралковая дывізія (камандзір палкоўнік Я.Р.Крэйзер). Яна была перакінута пад Оршу на шосты дзень вайны і з 28 чэрвеня пачала рыхтаваць абарончыя рубяжы на захад ад горада.

Вечарам 29 чэрвеня, у крытычны для Заходняга фронту дзень, калі фашысцкія войскі завяршылі акружэнне савецкіх армій, што абараняліся ў прыгранічных абласцях Беларусі, і захапілі Мінск, камандуючы фронтам генерал арміі Д.Р.Паўлаў паставіў мотастралкам новую задачу. Дывізіі было загадана тэрмінова высунуцца ў раён Барысава, заняць абарону на ўсходнім беразе Бярэзіны і не дапусціць прарыву танкавых і механізаваных войск праціўніка цераз раку. Асабліва ўпарта дывізія павінна была абараняць Зэмбінскую, Барысаўскую і Чарняўскую пераправы. Так на шляху фашыстаў да Оршы паўсталі мотастралковыя, артылерыйскія і танкавыя часці 1-й Маскоўскай пралетарскай дывізіі палкоўніка Крэйзера. Дывізія лічылася лепшай у Чырвонай Арміі. Укамплектаваная па штатах ваеннага часу, добра аснашчаная і абучаная (у склад дывізіі ўваходзілі 6-ы і 175-ы мотастралковыя, 13-ы артылерыйскі палкі, 300-ы зенітны і 123-і процітанкавы артылерыйскія дывізіёны, 93-і разведвальны батальён, батальён сувязі, інжынерны батальён і іншыя спецпадраздзяленні), яна ўяўляла сабой грозную сілу. У дывізіі налічвалася 12 тыс. салдат і афіцэраў, 220 танкаў, у тым ліку 40 Т-34 і КВ.

На працягу трох сутак дывізія вяла бязлітасныя баі на гэтым рубяжы, стрымліваючы націск 18-й танкавай дывізіі праціўніка. Стойкай абаронай, умелым манеўрам і смелымі контратакамі часці маскоўскай дывізіі нанеслі праціўніку значны ўрон. За тры дні баёў фашысцкая дывізія згубіла да 70 танкаў і 1,5 тыс. салдат і афіцэраў. Аднак к зыходу ліпеня праціўнік захапіў плацдарм на ўсходнім беразе Бярэзіны і ўклініўся ў абарону дывізіі на глыбіню 15 — 20 км.

У ноч на 4 ліпеня часці Маскоўскай мотастралковай дывізіі пакінулі пазіцыі на Бярэзіне і адышлі за р. Нача. Дывізія перайшла да рухомай абароны. Камандзір дывізіі ўлічваў слабыя бакі ў тактыцы праціўніка, які наступаў уздоўж дарогі і пазбягаў начных дзеянняў. Ён разгарнуў дывізію на 20-кіламетровым фронце, заняў выгадныя рубяжы, асядлаў дарогі. На падыходзіўшыя калоны праціўніка абрушвалі магутны агонь і прымушалі яго разгортвацца і старанна арганізоўваць бой.

Удзень 10 ліпеня часці дывізіі займалі абарону па ўсходнім беразе р. Адроў, прыкрываючы подступ да Оршы з захаду. Арганізаваныя гітлераўцамі танкавыя атакі ўздоўж аўтастрады Мінск — Масква былі адбіты. У ноч на 11 ліпеня дывізія была выведзена ў рэзерв і засяроджана ў лесе на поўнач ад Оршы. Камандуючы 20-й арміяй генерал-лейтэнант І.І.Масленікаў вырашыў выкарыстаць гэтую баяздольную дывізію для адбіцця магчымага ўдару з боку Віцебска. Змагаліся бязлітасна і мужна. Гэта ўсебакова выявілася ў адным з баявых эпізодаў, аб якім гаворыцца ў кнізе гісторыка і пісьменніка П.Г.Кузняцова «Пралетарская Маскоўска-Мінская»: «Адным з першых у бой з танкамі ўступіла супрацьтанкавая гармата, дзе наводчыкам быў сяржант Мікалай Дзмітрыеў. Бой гэтай гарматы ўвайшоў у гісторыю дывізіі як узор найвялікшага гераізму, самаадданасці. За перыяд дзесяцідзённай барацьбы ад Барысава да

Брацкая магіла савецкіх грамадзян і воінаў, якія загінулі на чыгуначным вузле Орша ў час бамбавага ўдару фашысцкай авіяцыі. Чэрвень 1941 г.

Оршы гарматны разлік абнавіўся двойчы. Нязменным заставаўся толькі наводчык. На рахунку ў гарматы лічылася ўжо 5 падбітых нямецкіх танкаў і звыш 10 кулямётаў. І ў гэты дзень, не паспеў змоўкнуць папераджальны крык назіральніка «Танкі!», адразу прагучала каманда сяржанта: «Да бою! Агонь!». Цяжка паранены, сыходзячы крывёй, губляючы апошнія сілы, Дзмітрыеў біў і біў па ворагу, нават калі выбухам варожага снарада ўвесь гарматны разлік быў выведзены са строю.

Тры фашысцкія танкі і некалькі бронетранспарцёраў з пяхотай знішчыў у гэтым баі адважны наводчык. Сямнаццаць кавалкаў варожай сталі даталі потым ўрачы з цела воіна-масквіча, ён застаўся жывы. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР радавому Мікалаю Міхайлавічу Дзмітрыеву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза». (Больш падрабязна пра баі 1-й Маскоўскай пралетарскай дывізіі гл. ў кн. П.Г.Кузняцова «Пралетарская Маскоўска-Мінская». М., 1975.)

Бязлітасныя баі на подступах да Оршы ішлі не толькі на зямлі, але і ў паветры. З ліпеня пад Оршу былі перакінуты 213-ы і 214-ы бамбардзіровачныя палкі. Яны базіраваліся каля в. Зубава. Эскадрыллі гэтых палкоў удзельнічалі ў баях у небе над Талачыном. Іх дзеянні прыкрываў 401-ы знішчальны авіяполк пад камандаваннем Героя Савецкага Саюза С. П. Супруна. Полк меў на ўзбраенні найноўшыя знішчальнікі ЛАГ-3 і МІГ-3. Не адзін фашысцкі ас знайшоў сабе магілу ў міжрэччы Бярэзіны і Дняпра. Аднак больш чым трохразовая перавага праціўніка ў колькасці самалётаў забяспечыла яму панаванне ў паветры. Забяспечыць надзейнае прыкрыццё баявых дзеянняў сваіх сухапутных войск савецкія лётчыкі ў той час не маглі.

У гэты цяжкі для абараняўшых Оршу савецкіх войск дзень адбылася падзея, якая ўвайшла ў гісторыю 2-й сусветнай вайны. Тут, пад Оршай, была ўпершыню выпрабавана ў баявой абстаноўцы новая савецкая зброя — установка для стральбы рэактыўны-



Орша. Адкрыццё мемарыяльнага комплексу «Кацюша». 1966 г.

мі снарадамі, якая пазней атрымала назву «кацюша». Першая батарэя рэактыўнай артылерыі была сфарміравана ў Маскве ў апошнія дні чэрвеня 1941 г. Камандзірам батарэі быў прызначаны слухач артылерыйскай акадэміі імя Дзяржынскага Іван Андрэевіч Флёраў. Батарэя, якая ў ноч на 2 ліпеня выступіла з Масквы на Заходні фронт, 14 ліпеня была ў раёне Оршы. Са Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання ў штаб Заходняга фронту была адпраўлена тэлефонаграма: «Прапануецца шырока прымяніць супраць фашыстаў «эрэсы» і ў сувязі з гэтым выкарыстоўваць іх у баі. Вам выдзяляецца адна батарэя БМ-13. Выпрабуйце яе і далажыце сваё заключэнне».

Батарэя заняла агнявыя пазіцыі на ўзлеску за 3 км на поўнач ад ст. Орша. Па загадзе начальніка артылерыі Заходняга фронту генерала Г.С.Карыяфілі 14 ліпеня 1941 г. ў 15 гадзін 15 хвілін батарэя зрабіла першы залп з усіх сямі ўстановак па вялікай колькасці жывой сілы і баявой тэхнікі праціўніка.

У той жа дзень па заяўцы камандзіра 413-га стралковага палка 73-й стралковай дывізіі батарэя зрабіла другі залп па нямецкай пераправе цераз Аршыцу. Усе гітлераўцы, якія ўцалелі на ўсходнім беразе пасля таго, як пераправа была знішчана, трапілі ў палон. У той жа дзень у нямецкі генеральны штаб паступіла данясенне: «Рускія прымянілі батарэю з небывалай колькасцю гармат. Снарады фугасна-запальныя, але незвычайнага дзеяння. Войскі, абстраляныя рускімі, сведчаць: агнявы налёт падобны ўрагану. Снарады разрываюцца адначасова. Страты ў людзях значныя».

Аднак адна батарэя, зразумела, не магла вырашыць лёсу баёў на Заходнім фронце і на Смаленскім напрамку, дзе становішча прымала для савецкіх войск, што абаранялі Оршу, усё больш пагражальны характар.

Контратакі 1-й Маскоўскай дывізіі, што былі нанесены ў фланг 18-й танкавай дывізіі праціўніка, прывялі да поўнага разгрому тылоў гэтай дывізіі, аднак змяніць становішча яны ўжо не маглі. На працягу наступных двух дзён Маскоўская дывізія стрымлівала праціўніка на подступах да Оршы з поўдня і паўднёвага ўсходу. Дывізія білася ў поўным акружэнні, пастаянна манеўравала і контратакавала. 16 ліпеня, знішчыўшы аўтатранспарт і баявую тэхніку, якія засталіся без гаручага, часці дывізіі сталі прарывацца на Горкі і Магілёў.

У той жа дзень пакінулі Оршу і часці 73-й і 18-й дывізій. Праціўнік ужо знаходзіўся за 100 км на усход ад Оршы. 16 ліпеня 29-я матарызаваная дывізія з танкавай групы Гударыяна ўварвалася ў Смаленск і авалодала паўднёвай часткай горада.

Баявыя дзеянні Чырвонай Арміі на аршанскім напрамку і гераічная абарона Оршы ў 1-й палавіне ліпеня 1941 г. адыгралі важную ро-

Памятны знак каля в. Пішчалава, дзе быў зроблены першы залп «Кацюш» у 1941 г.

лю ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У баях паміж Беразіной і Дняпром быў пакладзены пачатак краху гітлераўскага плана маланкавай вайны супраць СССР, канчаткова пахаванага пад Масквой.

Стойкай і актыўнай абаронай пад Оршай дывізіі 20-й арміі нанеслі значныя страты праціўніку ў жывой сіле і баявой тэхніцы. Некаторыя дывізіі Гударыяна і 8-га армейскага корпуса, якія наступалі на аршанска-смаленскім напрамку, страцілі да палавіны свайго баявога саставу.

Важнае значэнне адыграла абарона Дняпроўскага рубяжа для народнай гаспадаркі. За тыя некалькі дзён, на працягу якіх савецкія войскі стрымлівалі праціўніка, ва ўсходнія раёны краіны былі эвакуіраваны прамысловыя прадпрыемствы Оршы, Смаленска, Вязьмы, Раслаўля і іншых гарадоў. У глыбокі тыл былі адпраўлены дзесяткі тысяч савецкіх людзей, у тым ліку дзяцей, якія былі выратаваны такім чынам ад фашысцкага рабства. Многія эвакуіраваныя папоўнілі рады арміі, працавалі на абарончых прадпрыемствах, уносілі свой уклад у разгром фашысцкай Германіі.

З успамінаў удзельніка Вялікай Айчыннай вайны Л. Мураўёва

У адпаведнасці з дырэктывай ЦК КП(б)Б ад 23.6.1941 г. і пастановай СНК СССР ад 24.6.1941 г. аб арганізацыі барацьбы з варожымі дыверсантамі і парашутыстамі ў прыфрантавой паласе, а таксама аб ахове прадпрыемстваў і ўстаноў у Оршы з добраахвотнікаў быў сфарміраваны знішчальны батальён у колькасці 1200 чалавек на чале з М. М. Дзягілевым, а ў населеных пунктах Пішчалава, Смаляны, Межава, Забалацце і іншых — знішчальныя групы.

У маёй вёсцы Гразіна Межаўскага сельсавета такая група налічвала 12 чалавек. Узначальваў яе сакратар камсамольскай арганізацыі У. Стаброўскі. Група займалася аховай дарог, праверкай дакументаў, аказвала вялікую дапамогу ў пошуку і абясшкоджванні шпіёнаў і дыверсантаў. Яна была ўзброена дробнакалібернымі вінтоўкамі, паляўнічымі ружжамі і нажамі.

І.А.Флёраў.

Прыгадваю, як 8 ліпеня 1941 г. патруль знішчальнай групы выявіў фашысцкага агента з рацыяй у групе параненых, якіх мы прывезлі на вазах у гарадскую бальніцу. Ён спрабаваў уцячы, адстрэльваўся, але хутка быў абяззброены і арыштаваны.

Пасля вайны мне давялося сустракацца з некаторымі байцамі аршанскага знішчальнага батальёна: І. Волкавым, які да вайны працаваў выкладчыкам Панізоўскай школы, Я. Фарберам, былым майстрам Аршанскага льнокамбіната, В. Сікоцкім, начальнікам цэха завода «Чырвоны барацьбіт».

Яны ўспаміналі, што акрамя барацьбы з варожымі агентамі і дыверсантамі ўдзельнічалі ў эвакуацыі прадпрыемстваў, будаўніцтве абарончых збудаванняў, ахове чыгуначнага моста цераз Дняпро, абаранялі падыходы да горада з поўдня.

Дакументы сведчаць

Дырэктыва Саўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) партыйным і савецкім арганізацыям прыфрантавых абласцей пра мабілізацыю ўсіх сіл і сродкаў на разгром фашысцкіх захопнікаў

29 чэрвеня 1941 г.

Партыйным і савецкім арганізацыям прыфрантавых абласцей

Вероломное нападение фашистской Германии на Советский Союз продолжается. Целью этого нападения является уничтожение советского строя, захват советских земель, порабощение народов Советского Союза, ограбление нашей страны, захват нашего хлеба, нефти, восстановление власти помещиков и капиталистов. Враг уже вторгся на советскую землю, захватил большую часть Литвы с городами Каунас и Вильнюс, захватил часть Латвии, Брестскую, Белостокскую, Вилейскую области Советской Белоруссии и несколько районов Западной Украины. Опасность нависла над некоторыми другими областями. Германская авиация расширяет территорию бомбежки, подвергая бомбардировкам города — Ригу, Минск, Оршу, Могилев, Смоленск, Киев, Одессу, Севастополь, Мурманск.

В силу навязанной нам войны наша страна вступила в смертельную схватку со своим опасным и коварным врагом — немецким фашизмом. Наши войска героически сражаются с врагом, вооруженным до зубов танками, авиацией. Красная Армия, преодолевая многочисленные трудности, самоотверженно бьется за каждую пядь советской земли.

Несмотря на создавшуюся серьезную угрозу для нашей страны, некоторые партийные, советские, профсоюзные и комсомольские организации и их руководители все еще не понимают смысла этой угрозы, еще не осознали значений этой угрозы, живут благодушно мирными настроениями и не понимают, что война резко изменила положение, что наша Родина оказалась в величайшей опасности и что мы должны быстро и решительно перестроить всю свою работу на военный лад.

Совнарком СССР и ЦК ВКП(б) обязывают все партийные, советские, профсоюзные и комсомольские организации покончить с благодушием и беспечностью и мобилизовать все наши организации и все силы народа для разгрома врага, для беспощадной расправы с ордами напавшего германского фашизма.

Совнарком Союза ССР и ЦК ВКП(б) требуют от вас:

1. В беспощадной борьбе с врагом отстаивать каждую пядь советской земли, драться до последней капли крови за наши города и села, проявлять смелость, инициативу и сметку, свойственные нашему народу.

2. Организовать всестороннюю помощь действующей Армии, обеспечить организованное проведение мобилизации запасных, обеспечить снабжение Армии всем необходимым, быстрое продвижение транспортов с войсками и военными грузами, широкую помощь раненым, предоставление под госпитали больниц, школ, клубов, учреждений.

3. Укрепить тыл Красной Армии, подчинив интересам фронта всю свою деятельность, обеспечить усиленную работу всех предприятий, разъяснить трудящимся их обязанности и создавшееся положение, организовать охрану заводов, электростанций, мостов, телефонной и телеграфной связи, организовать беспощадную борьбу со всеми дезорганизаторами тыла, дезертирами, паникерами, распространителями слухов, уничтожить шпионов, диверсантов, вражеских парашютистов, оказывая во всем этом быстрое содействие истребительным батальонам. Все коммунисты должны знать, что враг коварен, хитер, опытен в обмане и распространении ложных слухов, учитывать все это в своей работе и не поддаваться на провокации.

4. При вынужденном отходе частей Красной Армии угонять подвижной железнодорожный состав, не оставлять врагу ни одного паровоза, ни одного вагона, не оставлять противнику ни килограмма хлеба, ни литра горючего. Колхозники должны угонять скот, хлеб сдавать под сохранность государственным органам для вывозки его в тыловые районы. Все ценное имущество, в том числе цветные металлы, хлеб и горючее, которое не может быть вывезено, должно безусловно уничтожаться.

5. В занятых районах создавать партизанские отряды и диверсионные группы для борьбы с частями вражеской армии, для разжигания партизанской войны всюду и везде, для взрыва мостов, дорог, порчи телефонной и телеграфной связи, поджога складов и т. д. В захваченных районах создавать невыносимые условия для врага и всех его пособников, преследовать и уничтожать их на каждом шагу, срывать все их мероприятия.

6. Немедленно предавать суду военного трибунала всех тех, кто своим паникерством и трусостью мешает делу обороны, не взирая на лица.

* * *

Совнарком СССР и ЦК ВКП(б) заявляют, что в навязанной нам войне с фашистской Германией решается вопрос о жизни и смерти Советского государства, о том — быть народам Советского Союза свободными или впасть в порабощение.

Теперь все зависит от нашего умения быстро организоваться и действовать, не теряя ни минуты времени, не упуская ни одной возможности в борьбе с врагом.

Задача большевиков — сплотить весь народ вокруг Коммунистической партии, вокруг Советского правительства для самоотверженной поддержки Красной Армии, для победы.

Друкуецца па кн.: КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. Т. 6. 1941–1954. М., 1971.

Акупацыйны рэжым

Пасля захопу Оршы гітлераўцы ўстанавілі ў горадзе жорсткі акупацыйны рэжым. Усе меры, што яны праводзілі ў час акупацыі, былі скіраваны на ажыццяўленне злачынных планаў германскага фашызму. Галоўнай мэтай акупантаў было знішчэнне савецкага дзяржаўнага ладу, разрабаванне нацыянальнага багацця, знішчэнне народаў, якія жылі на захопленых тэрыторыях. Захопнікі ўвялі сваё адміністрацыйнае дзяленне. Віцебская вобласць, у тым ліку і Орша, былі аднесены да так званай «вобласці армейскага тылу» групы армій «Цэнтр». Усе дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі былі ліквідаваны, грамадскія пабудовы і вялікія дамы заняты акупантамі. Свабоднае перамяшчэнне было забаронена, уведзена каменданцкая гадзіна. На дарогах, што вялі да горада, устанаўліваліся шлагбаумы. Вуліцы патрулявaліся нарадамі армейскіх і паліцэйскіх падраздзяленняў. У горадзе і раёне шнарылі агенты паліцыі бяспекі ў пошуках людзей, якія былі унесены ў «Асобую вышуковую кнігу СССР». Іх расстрэльвалі без суда і следства. Такая ж доля чакала тых, хто ўдзельнічаў у сходах, абмяркоўваў загады акупацыйных улад, выказваў незадаволенасць «новым парадкам» або слухаў маскоўскае радыё.

У горадзе і раёне, акрамя армейскіх тылавых частак, акупанты размясцілі сетку карных і разведвальных органаў: штаб 286-й ахоўнай дывізіі, палявую камендатуру, палявую жандармерыю, чыгуначную камендатуру, паліцыю, гестапа, групы тайнай палявой паліцыі ГФП-723, ваеннай разведкі — абвер-310, паліцыі бяспекі і СД, дапаможную паліцыю, мясцовую камендатуру — 842 і г. д. У Межаве знаходзіўся батальён 286-й ахоўнай дывізіі, у в. Наздроўшчына — група паліцыі бяспекі і СД. Армейскія і паліцэйскія гарнізоны пастаянна знаходзіліся ў Балбасава, Юрцава, Забалацці і іншых населеных пунктах раёна.

Сваю брудную крывавую справу карныя органы захопнікаў пачалі з першых дзён акупацыі Оршы. У горадзе і раёне на працягу некалькіх дзён была праведзена рэгістрацыя насельніцтва, што засталося. Гітлераўцаў цікавілі жыхары толькі з пункта гледжання іх расавай тэорыі і выкарыстання для работы. Пры рэгістрацыі ставіліся тры пытанні: год нараджэння, нацыянальнасць і прафесія. Ужо ў ходзе рэгістрацыі яўрэйскае насельніцтва аддзялялася ад астатніх грамадзян. Пасля агульнай рэгістрацыі было арганізавана рабочае бюро, дзе насельніцтва праходзіла другую рэгістрацыю — па спецыяльнасці і працаздольнасці. Неўзабаве насельніцтва ў прымусовым парадку пачалі прыцягваць да працы. У асноўным пасылалі на дарожныя работы і ўзвядзенне абарончых збудаванняў. На найбольш цяжкіх аб'ектах — расчыстцы завалаў, земляных — выкарыстоўваліся яўрэі.

У раёне льнокамбіната быў выбраны будынак для турмы, абсталяваны камеры і следчыя кабінеты з прыстасаваннямі для катаванняў. З асяроддзя крымінальнікаў і здраднікаў фашысты вербавалі агентуру, з дапамогай якой выяўлялі партыйных, камсамольскіх і савецкіх работнікаў, патрыятычна настроеных грамадзян. Усіх гэтых людзей чакала жорсткая расправа.

Першымі ахвярамі фашызму ў Оршы сталі патрыёты Н.М.Кавалёў, Н.П.Камінскі, П.Г.Кунцэвіч, П.Т.Казлоў, Ф.А.Аўдзееў, М.І.Шумілаў, У.М.Аўтухоў, С.Я.Казлоўскі, Г.Я.Аляксандраў, Е.С.Гарбылёў, Д.П.Важні-

каў, В.Н.Галавач, І.К.Гарбацэвіч, А.З.Атрашкевіч, І.Т.Кляўзо. А.В.Пятрова, П.Р.Грыўніна і многія іншыя — камуністы, камсамольцы, беспартыйныя.

Ужо ў жніўні 1941 г. ў справаздачы ГФП № 723 начальнік групы дакладваў у Берлін: «У выніку масавых арыштаў намі расстраляна 178 чалавек» (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4855, воп. 1, спр. 9, л. 32 — 43). Усяго за год гаспадарання ў Оршы адной толькі гэтай групай ГФП (не лічачы ахвяр паліцэйскіх і армейскіх карных органаў) было павешана і расстраляна каля 2 тыс. савецкіх патрыётаў.

Загадам мясцовай камендатуры ў верасні 1941 г. ў Оршы было арганізавана гета. Яно размяшчалася на вуліцы Энгельса, дзе засталося не больш як 25 дамоў. Сюды было сагнана каля 2 тыс. чалавек яўрэйскай нацыянальнасці, у ліку якіх было шмат дзяцей і старых. Тэрыторыю гета фашысты абнеслі калючым дротам і ўстанавілі ахову. Выхад з гета быў забаронены.

На яўрэйскую абшчыну камендатурай горада была накладзена кантрыбуцыя ў памеры 150 тыс. рублёў. З-за адсутнасці грошай палавіна гэтай сумы была аплачана каштоўнасцямі — золатам, серабром, дарагімі рэчамі. Сабранае золата і серабро было адпраўлена ў Берлін. Аднак гэтым паборы не абмяжоўваліся. Відавочца тых падзей І.С.Гладкоў, у той час электратэхнік, на судовым працэсе па справе аб злачынствах, здзейсненых нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Беларускай ССР, сведчыў: «Мае знаёмыя суседзі па кватэры, дзе мы жылі раней, Блюма Пеўзнер і яе сям'я распавядалі мне, што ноччу да іх часта ўрываліся нямецкія салдаты, забіралі лепшыя рэчы, і былі выпадкі згвалтаванняў» (Судовы працэс па справе аб злачынствах, учыненых нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Беларускай ССР. Мн., 1947).

Для адводу вачэй нямецкае камандаванне ўстанавіла норму выдачы прадуктаў: 10 — 15 г мукі і некалькі бульбін на аднаго чалавека на дзень. Аднак і гэта выдавалася нерэгулярна.

Скучанасць, голад і антысанітарыя выклікалі сярод вязняў гета эпідэмію тыфу. У медыцынскай дапамозе хворым было адмоўлена. У такіх умовах людзі знаходзіліся каля трох месяцаў. Многія з вязняў памерлі, не вытрымаўшы пакут. 20 лістапада 1941 г. на досвітку, тых, хто застаўся жывы, групамі па 150 — 200 чалавек у суправаджэнні ўзмоцненага канвою пачалі адводзіць на яўрэйскія могілкі. Там былі падрыхтаваны ямы-траншэі. Па загадзе канваіраў дарослыя і дзеці распраналіся, складвалі адзенне і рэчы ў штабелі, а самі кідаліся ў яму. Іх расстрэльвалі з аўтаматаў фашысты, якія стаялі на краі траншэй. Пад канец дня былі расстраляны 1873 чалавекі...

Злавеснай прыкметай «новага парадку» ў Оршы сталі лагеры савецкіх ваеннапалонных. Найбольш буйны лагер на ўсходняй ускраіне горада за Дняпром з'явіўся ўжо ў першы месяц акупацыі горада і праіснаваў амаль да вызвалення. Вязнямі яго былі ад 10 да 15 тыс. савецкіх салдат і афіцэраў. Іх трымалі пад адкрытым небам, у антысанітарных умовах, на галодным пайку, катавалі, бязлітасна збівалі.

У лагеры лютавалі эпідэмічныя хваробы, людзі даходзілі да апошняй ступені змардавання, што прыводзіла да масавай смяротнасці. Штодзень ад змардавання, хвароб і пабояў гінула да 100 — 150 чалавек. Сярод абслугоўваючага персаналу лагера былі жыхары горада. Ад іх насельніцтва даведвалася аб становішчы ваеннапалонных. Аднак дапамагчы ўсім гэтым няшчасным яны не маглі. Усе спробы перадаць палонным што-небудзь з прадуктаў ахова лагера неадкладна спыняла.

У.С.Багамазаў.

Генацыд беларускага насельніцтва

Рэха вайны і цяпер гучыць у сэрцах людзей, якія перажылі яе. Памяць надоўга захавала злачынствы фашысцкіх захопнікаў, якія ўстанавілі на часова акупіраванай беларускай зямлі свой «новы парадак» — рэжым тэрору, разбою і грабяжу. Сістэма акупацыйнай улады рыхтавалася загадзя. 16 студзеня 1941 г. Гітлер выдаў спецыяльны ўказ аб стварэнні корпуса кіраўнікоў упраўленняў у будучых акупіраваных усходніх абласцях, а ў сакавіку 1941 г. штабам вярхоўнага галоўнакамандавання германскай арміі была распрацавана

Інструкцыя аб асобых абласцях да дырэктывы № 21 (план «Барбароса»), якая прадугледжвала расчляненне захопленай тэрыторыі СССР на так званыя «рэйхскамісарыяты». Камандуючыя фашысцкімі войскамі надзяляліся на акупіраванай тэрыторыі неабмежаванымі правамі па правядзенні ў жыццё мерапрыемстваў, неабходных «для выканання задач і для забеспячэння бяспекі арміі», г.зн. маглі ўчыняць любыя зверствы ў адносінах да мясцовага насельніцтва.

Вышэйшым органам грамадзянскіх акупацыйных улад з'яўляўся генеральны камісарыят «Беларусія», на чале якога быў адзін з прыбліжаных Гітлера і Гімлера Вільгельм Кубе, былы обер-прэзідэнт у Берліне і Познані. У гарадах ствараліся гарадскія ўправы, якія служылі дапаможнымі органамі гарадскім камісарыятам.

Фашысты не скрывалі свайго намеру ператварыць Беларусь у калонію, у крыніцу сыравіны і таннай рабочай сілы для прамысловасці Германіі. Акупанты грабілі і знішчалі не толькі дзяржаўную, калгасна-кааператыўную маёмасць, але і асабісты набытак мірнага насельніцтва. Грабяжы праводзіліся ў рознай форме: ад абкладання насельніцтва шматлікімі непамернымі падаткамі і паборамі да прымусовага канфіскоўвання маёмасці. Усё награбленае вывозілася ў Германію або ішло на забеспячэнне фашысцкай арміі. Акупацыйныя ўлады абапіраліся пры гэтым на ўзброеныя сілы вермахта і фашысцкія карныя атрады.

Кроў лілася ракой і ў Оршы, якая таксама была акупіравана нямецкімі захопнікамі з 14 ліпеня 1941 г. па 26 чэрвеня 1944 г. За гэты перыяд фашысты прынеслі нямала гора і няшчасцяў. Квітнеючы, прамыслова развіты горад быў ператвораны ў турму і сістэматычна разбураўся.

З акта аб зверствах, грабяжах і разбурэннях, якія ўчынілі нямецка-фашысцкія захопнікі ў г. Орша Віцебскай вобласці

30 чэрвеня 1944 г.

«Все жилые здания, расположенные по центральной Ленинской улице, взорвали и разобрали на укрепления. Разрушили БелГРЭС, снабжавшую электротоком крупные промышленные центры. Сожгли пединститут, разрушили и разобрали народный театр вместимостью до 2000 человек, спилили и сожгли все сады и городские парки, построив на их месте траншеи, сожгли аэроклуб, механический завод, уничтожили элеватор».

Гітлераўцы сталі на шлях масавага грабяжу прамысловых прадпрыемстваў (мясакамбіната, льнокамбіната і інш.), а таксама грамадскіх і культурных устаноў г. Орша і раёна. У праграму іх дзеянняў уваходзіў і маёмасны грабёж безабароннага насельніцтва.

З акта аб зверствах, грабяжах і разбурэннях, якія ўчынілі нямецка-фашысцкія захопнікі ў г. Орша Віцебскай вобласці

30 чэрвеня 1944 г.

«Немецко-фашистские захватчики проводили ограбление советских граждан систематически и различными способами... Согласно указания германского земельного управления Оршанского района от 28.3.1944 г. и от 6.4.1944 г. каждое хозяйство должно было сдавать 150 кг только овощей, не считая картофеля. С апреля по сентябрь месяц каждое хозяйство должно было сдать 100 шт. яиц. Уничтожая преступно домашних животных и домашних птиц, немецкие грабители за неподчинение подвергали советских граждан такому обложению налогами, которые совершенно разоряли людей, а подчас прибегали к изъятию всего имущества».

Беларускі народ быў падвергнуты самай бесчалавечнай эксплуатацыі, небывалым у гісторыі здзекам і пакутам. Акупанты з дапамогай зброі прымушалі людзей працаваць па 10 — 12, а то і больш гадзін на прадпрыемствах, якія падпарадкоўваліся нямецкім фірмам. Катаржная праца не аплачвалася, рабочыя і іх сем'і жылі ў страшэннай галечы і голадзе. Рабочых за невыхад на працу знявольвалі ў спецыяльныя лагеры з жорсткім рэжымам, а тых, хто падазраваўся ў сабатажы, расстрэльвалі.

З акта аб зверствах, грабяжах і разбурэннях, якія ўчынілі нямецка-фашысцкія захопнікі ў г. Орша Віцебскай вобласці

30 чэрвеня 1944 г.

«Показаниями советских граждан установлено, что немецко-фашистские оккупанты устраивали в гор. Орша и в районах режим каторжного принудительного труда.

Население гор. Орша, от малолетних детей до стариков, привлекалось к тяжёлым физическим работам. Основные работы производились по устройству оборонительных и

всякого рода военных сооружений. За малейшие подозрения в саботаже применялись телесные наказания, как то: избиения резиновыми палками, шомполами и пр. Удары прикладом и рукоприкладство являлись системой. Никаких разграничений больных от здоровых, стариков от молодых, женщин от мужчин не существовало, все работали от зари до зари за полмарки».

З паказанняў А. С. Скакуна на судовым працэсе над фашысцкімі злачынцамі ў 1946 г.:

«Айк, як гаспадар горада, сістэматычна, пры садзейнічанні паліцыі і жандармерыі, праводзіў масавыя аблавы на насельніцтва, і ўсе, каго вылоўлівалі, у тым ліку і маці, якія мелі немаўлят, пасылаліся на франтавую паласу для капання акопаў, будаўніцтва ўмацаванняў або як жывыя заслоны супраць наступаючай Чырвонай Арміі».

Жудасным кашмарам стаў для гараджан вываз у Германію. Добраахвотнікі на паездку ў «Фатэрланд» не знаходзіліся, і каты прымусова зганялі ўсіх, хто падыходзіў па ўзросце, пачынаючы з 10 гадоў, у лагер для адпраўкі.

З акта аб зверствах, грабяжах і разбурэннях, якія ўчынілі нямецка-фашысцкія захопнікі ў г. Орша Віцебскай вобласці

30 чэрвеня 1944 г.

«На восточной окраине гор. Орша, за рекой Днепр, находился концлагерь, куда немцы сгоняли мирных советских граждан для отправки в Германию. В лагере их содержали в антисанитарных условиях, на голодном пайке, подвергали истязаниям и избиениям. В лагере свирепствовали эпидемические болезни, люди доходили до крайней степени истощения, что приводило к массовой смертности, к тому же больных от здоровых не изолировали. Ежедневная смертность в лагере была от 30 до 40 человек. По существу лагерь являлся не местом сбора для отправки в Германию, а истребительной машиной, уничтожавшей советских граждан.

На улице Новый Быт около вокзала, окружённый проволочным заграждением, находился барак № 8, куда немцы сгоняли людей для отправки в Германию. Барак являлся ужасом для каждого, т.к. попавшему в него возврата не было. Люди пропадали, погибали от истощения или от угона в Германию. По городу часто проводились облавы на жителей. Немцами оцеплялись кварталы, и всех попавших отправляли в барак № 8. Слово Германия для каждого было ужасом!».

Гітлераўцам, відаць, здавалася, што той «новы парадак», які яны ўстанавілі, задавальняе мірнае насельніцтва і яго трэба ўзмацніць. Канвеер смерці, як бачна, ужо працаваў і набіраў абароты.

У адпаведнасці з дырэктывай ад 13 мая 1941 г. за подпісам фельдмаршала Кейцеля «Аб ваеннай падсуднасці ў раёне «Барбароса» і аб асобых паўнамоцтвах войск» афіцэрам вермахта дазвалялася расстрэльваць без суда і следства ўсіх «падазроных асоб». Гітлераўскія палачы паслядоўна і сістэматычна праводзілі масавае знішчэнне мірнага насельніцтва, расстрэльвалі, вешалі, палілі жывымі бязвінных людзей.

З паказанняў А. С. Скакуна на судовым працэсе над фашысцкімі злачынцамі ў 1946 г.:

«Афіцэр Айк аказаўся самым жорсткім з камендантаў у Оршы. Ён адначасова з'яўляўся начальнікам турмы, якая па сутнасці была месцам збору для знішчэння ўсяго беларускага насельніцтва горада. Штодзень па два разы зранку вывозілі людзей на машынах «чорны воран» да месца расстрэлу. Савецкія грамадзяне ведалі свой лёс, і ў перадсмяротнай агоніі дзеці, жанчыны крычалі і праклінялі немцаў. Такім чынам, турма з'яўлялася для нашага мірнага насельніцтва нібыта перасыльным пунктам ад жыцця на той свет. У турме быў жорсткі рэжым: збіванне гумавымі і драўлянымі палкамі, мардабой, а калі каму якім-небудзь чынам удавалася выбрацца з турмы, то ён станавіўся распаўсюджвальнікам тыфу ў горадзе».

З матэрыялаў судовага працэсу, які адбыўся ў Мінску ў студзені 1946 года:

«Председатель суда: Скажите, какая смертность была в Оршанской тюрьме?

Зам. коменданта Орши капитан Айк: Мне неизвестно ни одного смертного случая.

Председатель: А вы в своих показаниях говорили, что в день было до 27 смертных случаев.

Айк: Этого я не мог сказать.

Председатель: А вы сказали, и это записали».

Кашчунствы гітлераўцаў насілі масавы характар. Пакуты беларускага народа не паддаюцца лагічнаму асэнсаванню. На якія толькі

зверствы не ішлі нелюдзі ў чалавечым абліччы!

З акта аб зверствах, грабяжах і разбурэннях, якія ўчынілі нямецка-фашысцкія захопнікі ў г. Орша Віцебскай вобласці

30 чэрвеня 1944 г.

«2 мая 1942 года по подозрению в связи с партизанами около льнокомбината и ж. д. моста в ямах было расстреляно 67 человек, среди них известные городские жители: Мурашко Мария Дмитриевна, Глушкова, Чеботарёв Владимир Романович. В конце сентября 1943 года под предлогом эвакуации было посажено в ж. д. вагоны 3000 с лишним жителей гор. Орша и района. Несколько эшелонов с советскими гражданами были загнаны в тупик Западной ж. д. ст. Орша-Западная. В течение 3-х суток людям не давали пищи, на 4-е сутки голодным была выдана отравленная пища, что привело к повальной смертности.

Трупы умерщвлённых таким образом советских граждан были свезены и свалены в силосные ямы колхоза «Красный берег», расположенные на юго-восточной окраине гор. Орша, недалеко от тупика ж. д.

Чтобы скрыть следы своего преступления, немцы, облив трупы горючей смесью, в течение двух дней жгли их, после чего силосные ямы были засыпаны землёй».

З акта Аршанскай гарадской камісіі аб знішчэнні мірных грамадзян гор. Орша нямецка-фашысцкімі захопнікамі

20 верасня 1944 г.

«На территории льнокомбината обнаружено 12 ям-могил 9 м длиной и 4 м шириной. 1 яма около полотна железной дороги размером 8 на 4 м и 11 ям за городом на опушке кустарника в 1 км от мясокомбината размером 3 на 2,5 м.

Весной 1944 г., чтобы скрыть следы преступления, немецко-фашистские варвары трупы расстрелянных опускали в прорубь под лёд р. Днепр. По показаниям свидетелей на территории льнокомбината расстреляно мирных граждан около 10 тыс. человек, кроме того, около 4 тыс. человек военнопленных умерло от голода.

В урочище Грязивица в 3 км от гор. Орша обнаружено 8 ям-могил длиной 8 м, шириной 4 м, глубиной 3 м. При вскрытии 1-й ямы-могилы на глубине 3 м найдены почти совсем сгнившие трупы, количество которых установить не удалось. По показаниям свидетелей в ямах похоронено около 4 тысяч человек».

Смерць і разбурэнні, якія прынесла вайна ў Оршу, надоўга застануцца ў людской памяці як факты недапушчальнай і невытлумачальнай жорсткасці. Генацыд — гэта шлях у нікуды, які прыдумаў звер пад назвай фашызм, што прагнуў чалавечай крыві і цешыўся ёю. Магчыма, не поўнасцю, а толькі часткова гэты матэрыял асвятляе падзеі мінуўшчыны. Аднак нават і ён дазваляе зразумець глыбіню гора, страшэннай бяды, якая адбылася ў Вялікую Айчынную вайну.

Г.Р.Вінніца.

Падпольны і партызанскі рух

Аднак жорсткі фашысцкі тэрор не зламаў волю беларускага народа да барацьбы з акупантамі. Шырокі фронт гэтай барацьбы пачаў складвацца з першага дня акупацыі.

Пры кожным зручным выпадку ворагу наносілі шкоду. Устройвалі засады, нападалі на фашысцкія абозы і аўтакалоны, узбройваліся трафейнай зброяй, мініравалі шашэйныя і грунтавыя дарогі, падрывалі масты і лініі сувязі. Так, на працягу некалькіх месяцаў пасля захопу немцамі Оршы ў раёне працягвалася ўзброеная барацьба з акупантамі ваеннаслужачых з частак і злучэнняў савецкіх армій, якія былі разбіты і адступалі пад націскам ворага.

Кіраўніцтва гэтай барацьбой узялі на сябе камуністы. І хоць на той момант кіруючыя партыйныя работнікі адсутнічалі, многія камуністы 16 ліпеня 1941 г., у дзень, калі была захоплена Орша, у лесе непадалёк ад пас. Асінторф сабраліся на партыйны сход. На гэтым сходзе быў створаны Аршанскі падпольны партыйны цэнтр, у задачы якога ўваходзіла арганізацыя і кіраўніцтва партыйным і камсамольскім падполлем. Кіраўніком цэнтра

Мемарыяльная дошка ў гонар падпольшчыкаў.

быў абраны Л.Н.Анкіновіч, а яго намеснікамі — А.Т.Скаварада і А.Г.Шкабарын.

На тым жа сходзе было вырашана, што А.Т.Скаварада і А.Г.Шкабарын прабяруцца ў Оршу і там арганізуюць барацьбу патрыётаў, а Л.Н.Анкіновіч стане выконваць тую ж задачу ў сельскай мясцовасці. Сувязь паміж імі будзе падтрымліваца праз праверaных людзей. Падпольныя групы было вырашана арганізоўваць па тэрытарыяльным прынцыпе. Для гэтага горад і раён ўмоўна падзялілі на зоны. За кожнай замацоўваліся партарганізатары. Яны павінны былі асабіста падбіраць людзей і арганізоўваць падпольныя групы, устанаўліваць сувязь і паролі. Партарганізатарам баранскай зоны стаў Г.А.Яўменаў, задняпроўскай — Н.С.Сіланцьева, зоны льнокамбіната — І.К.Петрачэнка, С.С.Благачыны, станцыі Орша-Заходняя — Е.В.Грачыха, вуліцы Пралетарскай і іншых усходняга напрамку — А.Т.Карабкіна, чыгуначнага вузла і пасёлка — В.І.Еўсюкевіч. Асаблівая важнасць надавалася чыгуначнаму вузлу, і таму для работы там былі вызначаны і камсамольскія арганізатары. Імі сталі М.Аскерка, М.Насовіч, Л.Рамаева, С.Гарбукова, П.Кунцэвіч і некаторыя іншыя.

У в. Якаўлевічы арганізоўваць і ўзначальваць падпольную барацьбу было даручана Н.І.Давыдзенку, І.Г.Яцко, у Руткаўшчыне — Н.М.Кавалёву, у Лісунах — А.В.Ціванскаму, у Новай Тухіні — Ф.Н.Шабураву, В.Р.Свайняк, у Пірагах — А.І.Палітаву, у Рубашыне — Ф.Н.Сплашнову, Гразіне — В.Д.Шыбеку, Кашыне — А.З.Атрашкевічу, Г.А.Кукса, Балбасаве — К.Е.Гурыну, Смалянах — Л.І.Красноўскаму, Копысі — Т.Г.Марозаву.

Было вырашана асноўную базу, што знаходзілася ў лесе непадалёк ад пас. Асінторф, перанесці ў в. Кашына. Крыху пазней для сувязі паміж базай, гарадскімі і сельскімі падпольнымі групамі былі падабраны сувязныя. Гэту цяжкую і небяспечную работу бездакорна выконвалі машыніст дэпо В.І.Сухачэўскі, работніца чыгуначнай станцыі Н.С.Сянчыла, рахункавод ільнокамбіната А.В.Пятрова, медсястра М.Я.Грышанава, камсамолка М.І.Аскерка, вайсковец Е.Берташ, хатнія гаспадыні А.Ф.Анкіновіч, П.Р.Грыўніна, рахункавод калгаса «Зарэчча» В.М.Салтановіч, загадчык кінатэатра А.П.Стаховіч, навучэнцы Г.І.Аскерка і В.І.Кавалёў.

У жніўні 1941 г. ва ўмовах строгай канспірацыі аршанскія патрыёты правялі некалькі нарад па пытаннях пашырэння падпольнай барацьбы ў горадзе і раёне. На адной з іх камуністы выбралі сакратаром партыйнай арганізацыі ў горадзе А.Т.Скавараду, а яго намеснікам — А.Г.Шкабарына. Была створана сетка канспіратыўных кватэр. Вось іх адрасы: вул. Беларуская, 17 (дом Я.М.Канцавога), вул. Рэспубліканская, 19 (дом А.Т.Бяляўскай), вул. Горацкая, 42 (дом А.І.Пяткевіча), вул. Чырвонаармейская, 49 (дом Е.К.Сухадольскай). Канспіратыўнымі кватэрамі сталі таксама дамы Е.І.Шыбекі ў в. Малотынь, М.А.Дамарацкага ў в. Вялікае Сяло, А.М.Аўдзеева на станцыі Бурбін і інш. Адным з галоўных месцаў сустрэч падпольшчыкаў стала закусачная ля вакзала чыгуначнай станцыі Орша. Утрымліваў яе В.М.Бахматаў, кіраўнік падпольнай групы, расстраляны фашыстамі ў жніўні 1942 г.

Так ужо з першых дзён і месяцаў акупацыі ў Оршы і Аршанскім раёне пачало складвацца падполле, якое ўступіла ў барацьбу з фашысцкімі карнымі органамі.

Пра актыўнасць аршанскіх камуністаў у арганізацыі падпольнай барацьбы сведчаць данясенні праціўніка — нямецкай палітычнай службы бяспекі. У верасні 1941 г. група ГФП-723 дакладвала ў Берлін: «...у цяперашні час упарта ствараюцца партызанскія групы. Дадзеныя вагаюцца ад 100 да 1000 чалавек, але ўсе яны разбітыя на дробныя групы па 20 — 30 чалавек. Спрабуюць аб'яднацца ў вялікія атрады. Узначальваюць іх пакінутыя камуністы. Пакінутыя на месцах камуністы спрабуюць стварыць партызанскія

групы і падполле, таму нельга недаацэньваць тую небяспеку, што могуць прынесці гэтыя фарміраванні. Узначальвае ўсе гэтыя групы нейкі палітычны камісар Анкіновіч і два капітаны. Такія справы ва ўсім раёне. Асабліва небяспечны Асінторф. Да вайны тут працавала 1500 чалавек. Знаходзіліся арганізатары, палітычныя камісары, якія ў час вайны засталіся на месцы і пайшлі ў лясы. Сумесна з салдатамі, якія трапілі ў акружэнне, ствараюцца партызанскія падпольныя групы, яны забілі нашага прадстаўніка у Асінторфе, яго сакратара, другога цяжка паранілі...» (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4855, воп. 1, спр. 9, л. 32 – 43).

Важную ролю ў пачатковы перыяд станаўлення падпольнай і партызанскай барацьбы ў Аршанскім раёне адыгралі вайскоўцы Савецкай Арміі. Многія з тых, хто трапіў у акружэнне пад Мінскам, Барысавам і Оршай, спрабавалі прабіцца да сваіх. Лясамі, абмінаючы бальшакі, ішлі з баямі на ўсход па тылах праціўніка асобныя групы з некалькіх чалавек, падраздзяленні, часці і нават злучэнні з баявой тэхнікай. У цяжкіх умовах акружэння, без харчавання, амаль без боепрыпасаў, вымушаныя несці на сабе параненых, салдаты і афіцэры працягвалі выконваць свой воінскі абавязак перад Айчынай.

У тыя цяжкія для краіны першыя месяцы вайны савецкае камандаванне не мела магчымасці аказаць дапамогу войскам, што апынуліся ў акружэнні. Але пра іх не забыліся. У ліпені – жніўні 1941 г., у разгар баёў за Смаленск, Ваенны Савет Заходняга фронту падрыхтаваў мноства лістовак з вытрымкамі з прамовы І. В. Сталіна ад 3 ліпеня 1941 г. Лістоўкі заклікалі чырвонаармейцаў, камандзіраў і палітработнікаў, якія апынуліся на часова акупіраванай тэрыторыі, ствараць партызанскія атрады, знішчальныя групы і біць ворага яго ж зброяй. Лістоўкі раскідваліся з самалётаў.

Многія з акружэнцаў, асабліва параненыя, заставаліся ў вёсках, дзе яшчэ не было нямецкіх гарнізонаў, і ў лясах. Там, пасля лячэння і азнаямлення з абстаноўкай, яны ўстанаўлівалі сувязі з мясцовымі патрыётамі, арганізоўвалі партызанскія групы, здабывалі зброю і ўзрыўчатку і пачыналі партызанскую барацьбу. Пазней многія з гэтых акружэнцаў сталі камандзірамі, начальнікамі штабоў і камісарамі партызанскіх груп, атрадаў і брыгад.

Характэрны ў гэтых адносінах лёс ураджэнца в. Рагозіна Малатнянскага сельсавета Мікалая Міхайлавіча Курлыпы. Кадравы вайсковец, на пасадзе начальніка харчзабеспячэння 4-га палка 17-й стралковай дывізіі ён удзельнічаў у баях за Барысаў. Там полк трапіў у акружэнне і стаў прабівацца на ўсход. Кожны пункт рэйду адзначаны баямі – пад Крупкамі, Круглым, Коханавам, у наваколлях Оршы і Копысі. Пад Смаленскам полк трапіў у засаду. Выйсці з цяжкага крывавага бою ўдалося нямногім. Цяжка кантужанага М.М.Курлыпу выратавала поле густога жыта. Праз двое сутак, крыху апамятаўшыся, ляснымі сцяжынкамі акружэнцы зноў рушылі на ўсход. Але куды б ні павярнулі – усюды натыкаліся на немцаў. У адным месцы ў кустах знайшлі лістоўку Ваенсавета Заходняга фронту. Параіліся і вырашылі вярнуцца пад Оршу, каб арганізаваць партызанскі атрад і весці барацьбу на чыгуначных камунікацыях ворага. Вярталіся тым жа маршрутам. Быў канец жніўня 1941 г. У в. Вялікія Астрагі сустрэліся з групай вайскоўцаў пад камандаваннем старшага палітрука Я.С.Галаванава. Група налічвала 15 чалавек, таксама акружэнцаў, і ўжо распачала партызанскую і падпольную барацьбу. Спадарожнікі Курлыпы засталіся з імі. Мікалай Міхайлавіч пашоў далей адзін. У родную вёску Рагозіна дабраўся ў канцы лістапада 1943 г. Там устанавіў сувязь з падпольшчыкамі, якімі кіраваў Л.Н.Анкіновіч. Збіралі зброю і боепрыпасы, выраблялі і распаўсюджвалі лістоўкі. У сакавіку 1942 г. М.М.Курлыпа становіцца начальнікам штаба партызанскага атрада лейтэнанта Ф.Собалева. Пасля некалькіх самастойных аперацый атрад злучыўся з атрадам К.С.Заслонава.

У жніўні 1941 г. вярнуўся ў родную вёску Рубашына Ф.П.Сплашноў. Кадравы вайсковец, ён быў камандзірам роты 23-й танкавай дывізіі, удзельнічаў у баях з першых дзён вайны. У Калінінскай вобласці часць, у якой ён ваяваў, трапіла ў акружэнне. Фёдар Пятровіч быў цяжка паранены і кантужаны. Падлячыўся у мясцовых жыхароў і вырашыў вярнуцца ў родныя мясціны. Тут ён арганізаваў буйную падпольную групу, наладзіў сувязь з Л.Н.Анкіновічам, а потым і з падпольшчыкамі бліжэйшых вёсак. Збіралі зброю,

назапашвалі харчаванне, а ў сакавіку 1942 г. арганізавалі атрад імя Варашылава і перайшлі да ўзброенай барацьбы ў тыле ворага. Атрад паспяхова дзейнічаў на працягу ўсяго перыяду часовай акупацыі Аршаншчыны.

Пры розных абставінах лёсы многіх акружэнцаў былі, аднак, падобныя ў адным: сапраўдныя патрыёты шукалі і знаходзілі шляхі барацьбы з акупантамі. Падпольшчыкамі на Аршаншчыне станавіліся многія камандзіры і палітработнікі Чырвонай Арміі, што апынуліся ў тыле ворага. Вялікі ўклад у арганізацыю падпольнай і партызанскай барацьбы ўнеслі В.П.Комлеў, Н.В.Смірноў, П.П.Лімаеў, В.Н.Александроўскі, Б.М.Апсатараў, А.Н.Агееў і многія іншыя.

Лёс, аднак, не заўсёды быў прыхільны да акружэнцаў. Некаторыя з іх з-за здраднікаў ужо ў самым пачатку сваёй дзейнасці трапілі ў лапы фашыстаў. Аб гэтым сведчаць данясенні ГФП-723: «... 11 жніўня 1941 г. была арыштавана група рускіх, якая знаходзілася ў цесным кантакце з камісарам Кавалёвым. Яны займаліся вярбоўкай маладых людзей для ўступлення ў партызаны. 20 жніўня быў арыштаваны Кавалёў, 1898 г. нараджэння. Пасля допыту расстраляны...» (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4855, воп. 1, спр. 9, л. 32 — 43).

«20 жніўня 1941 г. былі расстраляны рускія: Асятроў Уладзімір, 1920 г.н., Гарбулёў Аляксей, 1906 г.н., трэці, Волкаў, схаваўся. Асятроў і Волкаў, будучы салдатамі Чырвонай Арміі, набылі адзенне, зброю ў баявой гатоўнасці схавалі ў в. Каробішча ў пустым хляве. Абодва дасталі сабе дакументы як адпушчаныя з палону. Гарбулёў, як мясцовы жыхар, дапамагаў Волкаву ўцячы з лагера і разам з ім спрабаваў стварыць атрад партызан...»

«У лютым 1942 г. па паведамленні нашага агента ў Расне быў арыштаваны Мікалай Клімянкоў. Як устаноўлена, Клімянкоў яшчэ ў верасні 1941 г. стварыў партызанскі атрад, займаўся дыверсіямі і налётамі на нямецкія ўстановы. З наступленнем зімы атрад распусціў па вёсках, каб вясной пачаць новую барацьбу. Клімянкоў у арміі быў палітруком. У яго групу ўваходзілі мясцовыя жыхары з бліжэйшых ад Расны і Сатаны вёсак. Пры арышце адабраны 2 пісталеты. Расстраляны» (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4855, воп. 1, спр. 9, л. 32 — 43).

Часам у справаздачах гэтага рэпрэсіўнага фашысцкага органа паказваліся не прозвішчы, а лічбы расстраляных патрыётаў. Дзесяткі і сотні людзей безыменна гінулі ў фашысцкіх засценках.

Аднак працэс арганізацыі патрыятычных сіл няўхільна нарастаў. Павялічвалася колькасць падпольных груп, расла колькасць падпольшчыкаў. Пад канец 1941 г. ў Оршы ўжо дзейнічала больш за 20 падпольных груп, у тым ліку 7 на чыгуначным вузле. Актыўную барацьбу вялі падпольныя групы пад кіраўніцтвам Е.В.Грачыхі, В.М.Бахматава, Г.І.Шчэрбы, Н.П.Кузьміна, Е.А.Наталевіча, А.Г.Карабкінай, В.І.Еўсюкевіч. У друкарні дзейнічала група А.П.Мікалаева, на льнокамбінаце — Ш.К.Петрачэнкі, у шпіталі ваенна-палонных — В.А.Марчанка. Падпольшчыкі збіралі зброю і боепрыпасы, медыкаменты і прадукты харчавання, арганізоўвалі акты сабатажу, рабілі дыверсіі на чыгуначным транспарце, нападалі на варожыя калоны. Цяжкім шляхам ішло станаўленне падпольных груп, няпроста наладжваліся ўзаемадзеянне і сувязь паміж імі. За кожную памылку ў падборы людзей даводзілася расплачвацца самай дарагой цаной, як і за кожны неасцярожны крок.

З самых першых дзён барацьба аршанскага падполля мела актыўны баявы характар. 12 ліпеня 1941 г., як толькі немцы захапілі Юрцава, А.Г.Шкабарын з некалькімі пакінутымі для арганізацыі падполля таварышамі ўзарвалі Высокскі спіртзавод. Згарэлі будынкі, абсталяванне, склады сыравіны і гатовай прадукцыі. 27 чэрвеня 1941 г. кіраўнік аршанскага падпольнага цэнтра Л.Н.Анкіновіч з групай камуністаў арганізаваў напад на калону фашыстаў, што накіроўвалася на фронт. Знішчыўшы да паўсотні салдат і афіцэраў, падпольшчыкі захапілі трафеі і схаваліся ў лесе. На Аршанскім чыгуначным вузле яны псавалі стрэлачную гаспадарку, семафоры, тэлеграфную сувязь, падсыпалі ў буксы паравозаў, вагонаў і цыстэрнаў пясок, падпальвалі бутэлькамі з гаручай сумессю вагоны і цыстэрны з гаручым, склады са зброяй, боепрыпасамі і харчаваннем.

Адной з важнейшых задач падпольшчыкаў у дні акупацыі з'яўлялася палітычная прапаганда сярод насельніцтва. Гэтага патрабавалі самі абставіны. З захопам горада і раёна на людзей абрынуўся паток ілжывай гебельсаў-

скай прапаганды, мэтай якой было вытруціць са свядомасці сацыялістычныя ідэалы, распаліць уласніцкія інстынкты, зацвердзіць міф аб «непераможнасці вермахта» і непарушнасці «новага парадку». Як у горадзе, так і ў раёне распаўсюджваліся шматлікія выданні акупацыйных улад і іх прыспешнікаў. З устаноўленых на вуліцах гучнагаварыцеляў ледзь не круглыя суткі лілася хлусня пра разгром Чырвонай Арміі, пра падзенне Масквы і Ленінграда.

Каламутнаму патоку ілжы трэба было супрацьпаставіць праўдзівую інфармацыю аб справах на фронце і зверствах фашыстаў на часова акупіраванай тэрыторыі. Падпольным партыйным цэнтрам былі створаны прапагандысцкія групы. На чыгуначным вузле іх узначаліла В.І.Еўсюкевіч, у Задняпроўі — Н.С.Сіланцьева, у цэнтральнай частцы горада — А.Т.Карабкіна, у пасёлках і вёсках — А.З.Атрашкевіч, А.П.Стаховіч, І.Г.Яцко, В.Т.Шыбека, Л.Г.Кунцэвіч.

Сярод падпольшчыкаў знаходзіліся такія, хто быў знаёмы з радыётэхнікай. Да вайны ў радыётэхнічным гуртку пры Аршанскім аэраклубе займаліся Яўген Берташ і Віктар Кавалёў. Ім даручылі забяспечыць падпольныя групы радыёпрыёмнікамі. З дапамогай іншых падпольшчыкаў Я. Берташ і В. Кавалёў выкралі некалькі прыёмнікаў з памяшкання, дзе фашысты захоўвалі адабраную ў насельніцтва апаратуру, аднавілі іх. Акрамя таго, яны збіралі і рамантавалі старую апаратуру. Па некаторых крыніцах, пад канец жніўня 1941 г. ў горадзе і раёне ў падпольшчыкаў дзейнічала больш за паўсотні нелегальных радыёпрыёмных пунктаў [Я. Н. Крашаніннікаў. «У дні выпрабаванняў» (не апублікавана), фонд музея К. С. Заслонава]. Падпольшчыкі слухалі паведамленні маскоўскага радыё, пісалі і размнажвалі лістоўкі, расклейвалі іх у людных месцах. У лістоўках паведамлялася аб сапраўдным стане спраў на фронце, зверствах захопнікаў, яны заклікалі да барацьбы з акупантамі, умацоўвалі веру ў перамогу.

Так, у лістоўцы «Кроў за кроў, смерць за смерць» аршанскія падпольшчыкі пісалі: «...Масавым тэрорам, зверствамі і забойствамі мірнага насельніцтва гітлераўцы хацелі напалохаць наш савецкі народ, паставіць яго на калені, зламаць яго волю да барацьбы... Яны паляць вёскі і гарады, расстрэльваюць, вешаюць, топяць у рэках, калодзежах, закопваюць жывымі ў ямы... Партызанскі рух — справа ўсіх і кожнага» (экспазіцыя музея К.С. Заслонава).

Праўдзівыя словы лістовак надавалі людзям надзею, уздымалі народ на барацьбу. Значна пашырыўся размах гэтай работы ў жніўні—верасні 1941 г., пасля таго, як падпольшчыцы М. Насовіч і Л. Рамаева, якія ўладкаваліся на работу ў кантору паравознага дэпо, выкралі адтуль пішучую машынку, а падпольная група А. Мікалаева, што дзейнічала ў друкарні, пачала забяспечваць партыйны цэнтр друкарскім шрыфтам, фарбай, паперай і рознымі прыстасаваннямі для друкавання лістовак. Іх выпуск быў наладжаны на гарышчах дамоў А. Мікалаева, Е. Ісачанкі, І. Дразда і ў некаторых іншых месцах.

За час акупацыі падпольшчыкамі была напісана, размножана і распаўсюджана велізарная колькасць лістовак, зваротаў і заклікаў. Захавалася толькі некалькі асобных экзэмпляраў. Але яны пераканаўча сведчаць аб вялікай сіле духу патрыётаў, якіх не зламалі фашысцкія рэпрэсіі.

Лістоўка, датаваная снежнем 1942 г., пачынаецца заклікам: «Смерць нямецкім акупантам!». Далей ідзе тэкст: «Таварышы! Грамадзяне Савецкага Саюза! Надышоў час, калі пад магутнымі ўдарамі Чырвонай Арміі полчышчы германскіх фашыстаў адкідваюцца на Захад, нясуць на шляху свайго адступлення велізарныя страты людзьмі і тэхнікай. Немцы, як звычайна, утойваюць свае паражэнні на франтах і перабольшваюць страты Чырвонай Арміі. Акрамя таго, фашысты вядуць узмоцненую прапаганду пра тое, што быццам бы ў занятых Чырвонай Арміяй раёнах ідзе жорсткая расправа над насельніцтвам, якое знаходзілася ў нямецкай акупацыі, і гэтак далей. ...Хлусня, падман і абдурванне. Не верце ні адзінаму фашысцкаму слову! Фашызм — гэта смерць і голад... За подлы напад на нашу Радзіму, за ўсё... за смерць нашых бацькоў, мацярок, дзяцей, сясцёр, братоў мы павінны адпомсціць у тысячу разоў ворагу! Таварышы! Мы не павінны поўзаць перад немцамі. Лепш смерць, чым рабства..., ідзіце ў лес, змагайцеся... Толькі барацьбой можна паскорыць канчатковую перамогу. Няхай жыве Чырвоная Армія! Няхай жыве наша Радзіма!.. Слава Леніну!» На лістоўках стаіць пя-

чатка з зоркай і словы «Патрыёты горада Оршы» (экспазіцыя музея К. С. Заслонава).

Побач з падпольным партыйным цэнтрам, арганізаванымі групамі ў горадзе і раёне ўзнікалі і самастойныя баявыя групы.

У Аршанскім паравозным дэпо працаваў да вайны памочнікам машыніста Дзяніс Яфімавіч Касачоў. Эвакуіравацца ён не паспеў. З першых дзён акупацыі ён аб'яднаў вакол сябе невялікую групу маладых людзей. Назапасілі зброі, боепрыпасаў, пачалі выходзіць на дыверсіі. У жніўні група Дз. Касачова абстралявала з засады наліўны састаў з бензінам, які рухаўся з Оршы да Смаленска, дзе ў той час ішлі бязлітасныя баі. Да станцыі Краснае састаў прыйшоў з пустымі цыстэрнамі. Пазней Дз. Касачоў і яго група ўвайшлі ў склад падполля, а потым ён стаў камандзірам партызанскага атрада.

У жніўні 1941 г. ў Оршу вярнуліся многія сем'і чыгуначнікаў, якія спрабавалі эвакуіравацца ў тыл. Пад Смаленскам нямецкі дэсант перарэзаў цягнікам шлях на ўсход. Вярталіся назад пешшу. Сярод тых, хто вярнуўся, былі сем'і Кардоўскіх, Тамашэвічаў, Дакутовічаў, Аскеркаў. Добра ведалі адзін аднаго дзеці гэтых сем'яў. А.Кардоўская, В.Тамашэвіч, Я.Каржэнь, М.Аскерка, С.Гарбукова часта збіраліся, вырашалі, што рабіць далей. Ніхто з іх працаваць на немцаў не жадаў. Сталі пісаць і па начах расклейваць лістоўкі, а ў кастрычніку падпалілі пажарны гараж, дзе стаялі нямецкія бензавозы. 8 бензавозаў узарваліся і згарэлі, загінулі 6 немцаў.

Нямала такіх падпольных груп узнікла ў той час і ў раёне. На жаль, большасць членаў гэтых груп не валодала вопытам падпольнай работы, не была абучана метадам барацьбы, не мела падрыўных сродкаў. Даверлівыя адносіны да тых, хто яшчэ ўчора, здавалася, быў сваім, вельмі хутка прыводзілі да правалаў. Справаздачы ГФП-723 за першыя месяцы акупацыі стракацяць паведамленнямі аб знішчэнні падпольных груп. Вось прозвішчы толькі некаторых падпольшчыкаў, што ўказаны ў справаздачах ГФП-723: Раман Сімакоў, Васіль Іваноў, Дзмітрый Беланосаў, Сяргей Сігаеў, Аляксандр Гапёнак, Пётр Улін, Аляксей Голубеў, Сямён Палаткін, Мікалай Бярэзін, Якаў Кананоўіч, Аляксандр Расінскі, Іосіф Кляўзо, Сяргей Сцелімашанка, Сяргей Котаў, Мікалай Краўчанка.

Ні велізарныя ахвяры, ні фашысцкі тэрор не зламалі мужнасці беларускага народа. Падпольная барацьба нарастала. Падпольшчыкі набывалі вопыт. Пашыраліся і ўдасканальваліся формы і метады барацьбы.

Вялікую ролю ў арганізацыйным і тактычным удасканальванні Аршанскага падполля адыгралі прафесійныя разведчыкі. Іх засылалі ў Оршу, у раён як органы НКУС, так і армейскія і франтавыя разведорганы. Аршанскі чыгуначны вузел меў важнае стратэгічнае значэнне. Праз яго ішлі асноўныя патокі войскаў, матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння групы армій «Цэнтр», ад чаго, у сваю чаргу, залежала становішча на фронце. Савецкае камандаванне надавала важнае значэнне Аршанскаму транспартнаму вузлу. Сюды было накіравана і закінута больш за 30 разведвальных і спецыяльных груп. Амаль усе яны паспяхова дзейнічалі. Разведчыкі і дыверсанты наладжвалі сувязь з падпольшчыкамі і атрымлівалі ад іх неацэнную дапамогу. Многія падпольныя групы пачалі працаваць па заданнях разведчыкаў. Спецгрупе капітана Міхаіла Лушчына, закінутай у ліпені 1942 г., дапамагалі больш за 30 падпольшчыкаў. Найбольш актыўнымі сярод іх былі Марыя і Рыгор Аскеркі, Графутка, Сяргей Лушчын, Вера Дамарацкая, Сяргей Котаў, Мікалай Краўчанка. На групу лейтэнанта Васіля Каваленкі працавала больш за 15 удзельнікаў падполля на чале з Л. Н. Анкіновічам. Актыўную дапамогу разведчыкам аказвалі Надзея Мікалаева, Аркадзь Стаховіч, Кацярына і Ніна Мураўёвы, Алімпіяда Картавенка, Людміла Шыбека, дзесяткі, сотні іншых падпольшчыкаў і патрыётаў. Удзельнікі Аршанскага падполля здабывалі каштоўныя разведвальныя дадзеныя, выконвалі спецыяльныя заданні разведгруп «Няўлоўныя», «Дзяржынец», «Марскі», «Грозны» і інш. Вынікаў дзеянняў усіх антыфашысцкіх сіл у Оршы і ў раёне ніхто з падпольшчыкаў не падводзіў. Затое пра дзейнасць удараў патрыётаў па ворагу ў тыя дні можна меркаваць па справаздачах групы ГФП. У сваім данясенні за кастрычнік 1941 г. фашысты дакладвалі: «Толькі за гэты месяц мы мелі 15 дыверсій і 85 нападаў» (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4855, воп. 2, спр. 1, л. 14).

Надзвычай важнае значэнне для нямецка-фашысцкага камандавання набываў Аршанскі вузел падчас бітвы за Маскву. Праз Оршу

штодзённа ішлі на Маскву эшалоны з жывой сілай, тэхнікай, боепрыпасамі, зброяй, гаручым, запчасткамі і харчаваннем. Перашкаджаць ім і зрываць гэтыя пастаўкі было ў той час галоўнай задачай Аршанскага падполля. У выкананні гэтай задачы вядучую ролю адыграў Канстанцін Сяргеевіч Заслонаў і створаныя ім падпольныя групы.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, К. С. Заслонаў быў начальнікам паравознага дэпо ст. Орша. Пад яго кіраўніцтвам у самых складаных умовах паравознікі выканалі свае задачы. Дэпо працавала дакладна і зладжана. Усе саставы былі адпраўлены ў тыл. Сам Заслонаў пакінуў Оршу з апошнім саставам 13 ліпеня 1941 г., калі на станцыю ўжо прарваліся фашысцкія танкі.

На ўчастку Смаленск — Ярцава немцы выкінулі дэсант. Апошнім саставам быў перакрыты шлях да Масквы. З групай чыгуначнікаў Заслонаў абышоў раён, захоплены фашысцкімі дэсантнікамі, і дабраўся да Масквы. У канцы ліпеня — пачатку жніўня 1941 г. групы аршанскіх чыгуначнікаў былі накіраваны ў дэпо імя Ільіча ст. Масква-Беларуская і ўключыліся ў работу па перавозцы войск да фронта. Заслонава прызначылі інспектарам па прыёмцы паравозаў. Але працаваць у спакойных абставінах ён не мог. Пераіўшыся з блізкімі людзьмі з аршанскіх чыгуначнікаў, якіх добра ведаў, ён вырашыў арганізаваць дыверсійны атрад. Ужо ў ходзе папярэдняга абмеркавання гэтай ідэі Заслонава чалавек 30 аршанскіх чыгуначнікаў згадзіліся стаць партызанамі. Аднак цяжкасць у ажыццяўленні ідэі заключалася ў тым, што ўсе гэтыя людзі былі спецыялістамі — машыністамі і памочнікамі машыністаў. Такіх нават у армію не бралі. Яны былі патрэбны на сваіх месцах: транспарт працаваў на фронт. К. С. Заслонаў звярнуўся з пісьмом да наркома шляхоў зносін. «Наша краіна ў агні. Жыццё патрабуе, — пісаў ён, — каб кожны грамадзянін, у кім б'ецца сэрца патрыёта, хто дыхае і хоча дыхаць здаровым савецкім паветрам, стаў на абарону нашай Радзімы. Прашу Вашага дазволу арганізаваць партызанскі атрад і дзейнічаць у раёне ад Ярцава да Баранавічаў у паласе чыгуначных ліній, станцый і збудаванняў...»

Дазвол быў атрыманы хутка. Праз адзінаццаць дні Заслонава выклікалі ў Наркамат шляхоў зносін, а потым у ЦК КП(б)Б, дзе ён атрымаў інструктаж аб арганізацыі атрада. У верасні атрад быў сфарміраваны, яго камандзірам быў прызначаны К. С. Заслонаў, камісарам — Ф.Н.Якушаў, начальнікам штаба — Б.У.Станулiс, начальнікам разведкі — Д.М.Латко, намеснікам камісара і намеснікам начальніка разведкі — А.Е.Андрэеў. Пасля кароткага абучэння і прыняцця прысягі атрад быў узброены, забяспечаны падрыўнымі сродкамі і перакінуты да лініі фронту ў в. Закеева Калінінскай вобласці. Фронт на ўчастку пераходу праходзіў у той час па невялікай рэчцы Межа. 1 кастрычніка, пераправіўшыся цераз раку, заслонаўцы апынуліся на тэрыторыі, захопленай праціўнікам.

Трохсоткіламетровы пераход у тыле ворага аказаўся неймаверна цяжкім і складаным. Сур'ёзна ўскладнялі пераход і замаразкі, якія пачаліся рана. Пераадолець цяжар пераходу здолелі нямногія. Некалькі чалавек загінула, многія абмарозіліся і захварэлі. У канцы кастрычніка правялі сход. Вырашылі вярнуць у савецкі тыл усіх, хто страціў здольнасць да актыўных баявых дзеянняў. Заслонаў жа і яшчэ 7 чалавек, найбольш стойкіх і ўпартых, рушылі далей, да Оршы, для выканання задання. Маршрут праходзіў па лясах і балотах. Вёскі былі заняты ворагам. У адной з іх пры перастрэлцы з немцамі загінулі начальнік разведкі Д. Латко і А. Баркоўскі. 12 лістапада 1941 г. дабраліся да в. Заполле, што ў 30 км ад Оршы. Разам з камандзірам іх было ўсяго шасцёра. Там ад знаёмых даведаліся, што ўсіх чыгуначнікаў акупацыйныя ўлады прымушаюць вяртацца на ранейшую работу. Адмова кваліфікавалася як сабатаж загадаў ваеннага камандавання і пагражала расстрэлам. Многія аршанцы, якія вярнуліся з захопленай немцамі Вязьмы, ужо працавалі ў дэпо. Акупантам патрэбны былі спецыялісты-паравознікі. Сваіх паравозных і рамонтных брыгад ім не хапала. Заслонаўцы вырашылі выкарыстаць гэта. Зброю і ўзрыўчатку пакінулі ў Заполлі ў сваякоў машыніста Д. Я. Радчанкі, а самі папарна накіраваліся ў горад, «наймацца на работу».

Так, 14 лістапада ў Оршы з'явіўся былы начальнік паравознага дэпо К. С. Заслонаў, машыністы А. Е. Андрэеў, С. І. Чэбрыкаў, водаправодчык П. В. Шурмін.

Іх задума заключалася ў тым, каб, уладкаваўшыся працаваць у дэпо, у шырокім маштабе арганізаваць на чыгуначным вузле падпольную і дыверсійную дзейнасць. Дарэчы, становішча на вузле спрыяла выкананню гэтай задумкі. Пасля акупацыі Оршы паравозкі забяспечвалі чыгуначныя войскі фашыстаў.

У лістападзе ж, калі фронт адсунуўся да Масквы, на Аршанскім вузле з'явіліся нямецкія чыгуначнікі, якія насілі доўгія чорныя шынялі і фуражкі з высокім верхам. Яны былі на пасадах майстроў, дзяжурных па дэпо, часткова — машыністаў. Аднак людзей ім не хапала. Гэта і скарысталі заслонаўцы. У нямецкай управе яны атрымалі дакументы, а сярод насельніцтва распаўсюдзілі чутку, што Заслонаў вярнуўся з занятай фашыстамі Вязьмы. Праз некалькі дзён Заслонаў і яго паплечнікі ўладкаваліся на работу. Канстанціна Сяргеевіча немцы прызначылі начальнікам рускіх паравозных брыгад. Прыбыўшыя з ім камуністы А.Е.Андрэеў і С.І.Чэбрыкаў сталі паравознымі машыністамі, а Пётр Васілевіч Шурмін — майстрам водазабеспячэння.

З першых дзён яны разгарнулі актыўную падпольную дзейнасць. Немцы дазволілі Заслонаву самому прымаць людзей на работу. Канстанцін Сяргеевіч добра ведаў людзей. Найбольш праверaных і сумленных патрыётаў з ліку прымаемых у дэпо паравознікаў ён прыцягваў да дыверсійнай дзейнасці. У ліку першых у арганізацыю ўвайшлі В.І.Аскальдовіч, П.К.Белавусаў, В.М.Грамакоў, Т.А.Дакутовіч, браты Л.А. і А.А. Калдушкі, браты А.П. і Н.П. Дамарацкія, В.Ф.Лазорскі, С.Т.Прыгода, Ф.І.Епішаў, Д.Я.Радчанка, М.І.Шумілаў, П.У.Шурмін, К.Д.Захарэвіч, Б.В.Канунаў і некаторыя іншыя. Праводзілася работа і сярод моладзі. І неўзабаве Т.А.Дакутовіч узначаліў невялікую маладзёжную групу, у якую ўвайшлі Яўген Бялянка, Яўген Каржэнь, Яўген Бокуц, Уладзімір Хмылоў, Васіль Рыбакоў і іншыя патрыятычна настроеныя маладыя людзі. Так на Аршанскім чыгуначным вузле была створана падпольная арганізацыя пад кіраўніцтвам К.С.Заслонава. Прынцыпова новым у дзейнасці гэтай арганізацыі было тое, што яна займалася не асобнымі актамі дыверсій і сабатажу, а прафесійнай работай па дэзарганізацыі дзейнасці ўсяго чыгуначнага вузла. Прычым асноўны ўпор рабіўся на вывад са строю паравозаў. Добрыя спецыялісты-паравознікі рабілі гэта прафесійна.

Ужо ў снежні 1941 г. на вузле пачаліся смелыя дыверсіі, акты сабатажу. У той час стаялі траскучыя маразы, і падпольшчыкі, скарыстоўваючы гэтыя абставіны, замарожвалі і выводзілі са строю паравозныя і вадзяныя помпы, паветраразмеркавальнікі і паветраправоды, водапрыёмныя трубы, прэс-маслёнкі і рухомыя дэталі паравозаў. Пад'язныя пуці і стрэлкі залівалі вадой з вестaвых труб, інжэктараў і вадзяных помпаў. Станцыйныя пуці і дэпоўскія стрэлкі пакрываліся тоўстым слоем лёду, паравозы і вагоны сыходзілі з рэек. Нямецкія паравозы мелі шэраг агрэгатаў і прыбораў, якія канструкцыйна не былі прыстасаваны да эксплуатацыі ў моцныя маразы. Гэта, а таксама адсутнасць у немцаў вопыту работы ў суровых зімовых умовах заслонаўцы таксама ўмела выкарыстоўвалі. Дэпо было літаральна забіта паравозамі, якія патрабавалі неадкладнага рамонту. Воінскія эшалоны суткамі прастойвалі ў чаканні адпраўкі, салдаты мерзлі ў вагонах. Часта паравозы выходзілі са строю на перагонах, не даходзячы да станцый, і паязныя брыгады вымушаны былі кідаць саставы. Рамонтнікі, сярод якіх былі людзі Заслонава, усяляк зацягвалі аднаўленне паравозаў, рамонт рабілі няякасна, спасылаючыся пры гэтым на адсутнасць абсталявання і запасных частак.

Пазней для правядзення дыверсій заслонаўцы пачалі выкарыстоўваць вугальныя міны. П.У.Шурмін і Д.Я.Радчанка даставілі ў Оршу ў мяхах з бульбай з в. Заполле прыхаваную там узрыўчатку і капсулі. Міны выраблялі ў доме Паўла Шурміна. Да нескладанага працэсу іх вырабу Заслонаў прыцягнуў моладзь — Ціму Дакутовіча, Віцю Тамашэвіча, Жэню Каржэня і іншых. Звонку такая міна нічым не адрознівалася ад кавалка вугалю. Маладыя падпольшчыкі прыносілі міны на станцыю і хавалі ў топцы разбітага паравоза. Машыністы і іх памочнікі з заслонаўскай арганізацыі завозілі міны на іншыя станцыі і там падкладвалі ў тэндары лакаматываў. У топках паравозаў, а здаралася гэта як правіла ў дарозе, міны ўзрываліся, лакаматывы выходзілі са строю. Тут ужо патрабаваўся капітальны рамонт, і пашкоджаныя паравозы адпраўляліся ў Германію. Міны ў тэндары паравозаў, якія ужо стаялі пад парай, падкідваліся і ў самой Оршы. Да таго ж, машыністы і іх памочнікі, якія ўваходзілі ў заслонаўскую арганізацыю, вадзілі паязды з Оршы па ўсіх напрамках, што дазваляла значна пашыраць размах дыверсійнай дзейнасці. Выводзіліся са строю паравозы, прыпісаныя да дэпо станцый Орша, Віцебск, Мінск, Жлобін, Унеча, Магілёў, Смаленск, Барысаў і інш. Паколькі ад Смаленска ў бок фронту цягнікі вадзілі нямецкія паравозныя брыгады, міны часцей за ўсё падкладваліся менавіта ў гэтыя лакаматывы.

Аднак узрыўчаткі, якая была прынесена з-за лініі фронту, хапіла ненадоўга. Выйсце было знойдзена хоць і рызыкоўнае, але надзейнае. Тол пачалі выплаўляць са снарадаў, якія засталіся на месцах баёў. Гэтым занялася маладзёжная група Цімафея Дакутовіча. Маладыя падпольшчыкі паспяхова спраўляліся з задачай.

Дыверсійная дзейнасць заслонаўскай арганізацыі з кожным днём набывала ўсё больш шырокія маштабы, мяняўся, станавіўся больш рознабаковым яе характар, расла колькасць падпольных груп, сетка іх усё больш і больш разгалінoўвалася. Праз сваіх памочнікаў Заслонаў стварае падпольныя групы на станцыях Орша-Заходняя, Орша-Усходняя, наладжвае сувязь з паравознікамі, якія працавалі на іншых станцыях. Ад пакінутай для падпольнай работы Ф.А.Цынгалёвай, якая да вайны працавала інструктарам райкома партыі, К.С.Заслонаў даведваецца аб існаванні падпольнага партыйнага цэнтра і асабіста звязваецца з адным з яго кіраўнікоў Л.Н.Анкіновічам.

Наладзіўшы сувязь з партыйным цэнтрам, Заслонаў стаў атрымліваць ад партыйнага падполля поўную інфармацыю аб становішчы ў вёсках, у горадзе, сам інфармаваў аб выніках праведзеных дыверсій.

Зіма ў той першы ваенны год была суровай. Мароз мацнеў з кожным днём. Неяк вечарам Заслонаў зазірнуў да Пятра Васілевіча Шурміна. Коратка пагаварылі пра справы, а потым Заслонаў аддаў распараджэнне перакрыць калодзежы водазабеспячэння вузла.

На наступны дзень вузел застаўся без вады. Усе краны быццам павысыхалі. Паравозы сноўдалі ад адной калонкі да другой — вады нідзе не было. Заслонаўцы размарожвалі трубы разводзячай сеткі. Нямецкія ўлады прынялі ўсе магчымыя меры, але зрабіць што-небудзь не маглі. Знайсці сярод трохсот калодзежаў, што ляжалі пад снегам, пашкоджаныя, было проста немагчыма. Заставалася адно — чакаць вясны, адлігі. Рэгулярны рух цягнікоў застопарыўся. Паравозы былі вымушаны хадзіць на запраўку на іншыя станцыі за 50 — 70 км. Усе пуці былі забіты саставамі. Прапускная здольнасць Аршанскага чыгуначнага вузла рэзка знізілася.

Жаданне помсціць ворагам, гарачае пачуццё патрыятызму кіравала падпольшчыкамі, якія імкнуліся выкарыстаць кожную магчымасць для нанясення ўдараў па ворагу. Небяспека мала палохала заслонаўцаў. Машыніст Леанід Калдушка на станцыі Орша разагнаў свой паравоз і ўрэзаўся ў нямецкі воінскі эшалон. У выніку былі разбіты паравоз і адзін з вагонаў. Немцы, што павыскоквалі з вагонаў, паднялі трывогу. А Леанід знік у цемры. А вось яшчэ прыклад. На станцыі Орша-Усходняя саставіцелем паяздоў працаваў камуніст Бераснеў. Паводле задання Заслонава яму трэба было арганізаваць крушэнне воінскіх эшалонаў. Скарыстаўшы адзін з момантаў, ён перавёў стрэлкі так, што сустрэчныя цягнікі апынуліся на адным пуці. Сутыкненне на поўным хаду прывяло да крушэння абодвух эшалонаў. Пад абломкамі вагонаў знайшлі сваю смерць сотні фашысцкіх салдат і афіцэраў.

Сам жа К.С.Заслонаў не толькі ажыццяўляў кіраўніцтва дзеяннямі падпольшчыкаў, але і прымаў непасрэдны ўдзел у правядзенні буйных аперацый.

У студзені 1942 г. ў выніку контрнаступлення савецкіх войск пад Масквой аказалася перарэзанай чыгуначная лінія Ржэў — Вялікія Лукі. І таму рэзка ўзрасло значэнне чыгуначнай лініі Орша — Смаленск, на якую цяпер стала прыпадаць асноўная нагрузка па забеспячэнні групы армій «Цэнтр». Праз Аршанскі чыгуначны вузел пайшоў асноўны паток ваенных грузаў. Каб павялічыць яго прапускную здольнасць, акупацыйныя ўлады пачалі скарыстоўваць абводныя пуці, пускаць цягнікі ў абход асноўнай магістралі праз Оршу-Заходнюю і Оршу-Усходнюю. Орша-Усходняя злучаецца з асноўнай магістраллю чыгуначнай веткай. Вывесці яе са строю — азначала аказаць значную дапамогу Чырвонай Арміі.

Марозным студзеньскім вечарам Заслонаў і Шурмін рознымі шляхамі накіраваліся да веткі, прыхапіўшы з сабой міны, узрыўчатку, лапаты. Сустрэліся ля палатна ў дамоўленым месцы. Канстанцін Сяргеевіч падкапаў пад шпалай мёрзлую зямлю, устанавіў міну, зарад узмацніў толам. Другую міну ўстанавіў Шурмін. Абодвум хацелася ўбачыць вынікі дыверсіі, але ж заставацца было небяспечна. Калі прагрымелі выбухі, яны ўжо былі далёка ад таго месца... На чарговай міне, устаноўленай Заслонавым, падарваўся воінскі эшалон і зляцеў пад адхон. Немцы прывезлі з



Будынак у Оршы, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны праходзілі нелегальныя камсамольскія сходы пад кіраўніцтвам К.С.Заслонава.

веткі некалькі вагонаў сваіх забітых салдат і афіцэраў.

У студзені — лютым 1942 г. ўзмацніліся ўдары савецкай авіяцыі па Аршанскім чыгуначным вузле. Падпольшчыкі ў час налётаў з дапамогай электрычных ліхтароў падавалі сігналы савецкім лётчыкам. У адзін з такіх налётаў Ціма Дакутовіч прывёў у рух паравоз, што стаяў каля дэпо, і накіраваў у паваротны круг. Круг і паравоз былі выведзены са строю.

Напярэдадні 24-й гадавіны Чырвонай Арміі самалёты скінулі над Оршай лістоўкі, у якіх папярэджвалі насельніцтва пра тое, што горад будуць бамбіць, і заклікалі людзей быць на той час далей ад яго. Пасля нарады са сваімі бліжэйшымі паплечнікамі Заслонаў вырашыў на выпадак бамбёжкі, а гэта здаралася звычайна ўначы, даць заданне камсамольцам-падпольшчыкам з розных месцаў сігналамі ручных ліхтароў указваць савецкім пілотам месца знаходжання дэпо воінскіх эшалонаў. Праз Дакутовіча ён перадаў адважным патрыётам два сігнальныя пісталеты і патроны да іх.

Пачуўшы выццё сірэны — сігнал паветранай трывогі — маладыя заслонаўцы, карыстаючыся прыцемкамі, рушылі да станцыі. Калі раздаліся першыя выбухі авіябомбаў, немцаў у раёне станцыі не было. Усе яны разбегліся. Амаль адкрыта падпольшчыкі пачалі сігналіць савецкім лётчыкам кішэннымі ліхтарамі. Каржэнь і Дамарацкі пускалі ракеты на будынак дэпо. А ў дымаходнай трубе дэпоўскай кацельні юныя мсціўцы ўсталявалі карбідную лямпу. Яркі яе агонь быў добра бачны зверху. Арыентуючыся на светлавыя сігналы і ракеты, савецкія лётчыкі скідвалі бомбы на станцыю, дэпо, эшалоны, што скапіліся на чыгуначных пуцях. Гулкія выбухі калацілі зямлю.

Аднак, займаючыся дыверсіямі, Заслонаў добра разумеў, што надыдзе час, калі ім усё ж прыйдзецца пакінуць Оршу. Нягледзячы на ўсе меры перасцярогі, магчымасць правалу не выключалася. І таму яшчэ ў студзені 1942 г. было вырашана рыхтавацца да адыходу ў лес. Падрыхтоўка базы была даручана Анатолю Андрэеву. Месца для базы выбралі ў 20 км ад Оршы ў вёсках Грабянёва і Гразіна. У Грабянёве жыў былы машыніст аднаўленчага поезда А.Шыбека. Ён дапамог заслонаўцам звязацца з А. Сарнычовым, П.Лямаевым і іншымі савецкімі вайскоўцамі-акружэнцамі, якія знайшлі ў гэтых вёсках часовае сховішча.

Для падрыхтоўкі базы Заслонаў дазваляў Андрэеву двух-трохдзённыя водпускі. Паездкі гэтыя не выклікалі падазрэнняў, таму што ў той час большасць гарадскіх жыхароў хадзілі ў вёскі, каб абмяняць там на харчы сахарын, рэчы і інш. А тым часам Андрэеў разам з сябрамі раздабылі некалькі кулямётаў, вінтовак, скрынь з патронамі, схавалі ўсё гэта ў надзейным месцы.

23 лютага, на наступны пасля масіраванага налёту савецкай авіяцыі дзень, К. С. Заслонаў быў арыштаваны агентамі службы палітычнай бяспекі групы ГФП-723. Яго завезлі ў турму на льнокамбінат. Заслонава абвінавачвалі ў дыверсійнай дзейнасці і падачы сігналаў лётчыкам. Каб дабіцца паказанняў, фашысты білі і катавалі яго. Але начальнік паравозных брыгад трымаўся мужна. Дабіцца ад яго следчыя так нічога і не змаглі. Яўных доказаў немцы не мелі. Былі зняты і абвінавачванні ў падачы светлавых сігналаў у час налёту авіяцыі. Алібі было надзейным, бо ў момант налёту на вузел рускі інжынер гуляў у шахматы са сваім суседам па доме, нямецкім фельдфебелем. Апошні пацвердзіў гэта. Раніцай 24 лютага Канстанціна Сяргеевіча вызвалілі. З турмы ён паехаў у дэпо. Хоць за ім пільна сачылі, тым не менш Заслонаў праз Андрэева змог папярэдзіць сваіх паплечнікаў пра пагрозу правалу і загадаў перабірацца на лясную базу. Сам ён з наступленнем цемры,

Мемарыяльная дошка ў гонар падпольшчыкаў.

не заходзячы на кватэру, пайшоў на хутар Хорабрава.

Вынікі падпольнай дыверсійнай дзейнасці К.С.Заслонава на Аршанскім чыгуначным вузле былі значныя. Актыўны ўдзельнік заслонаўскага падполля А.Е.Андрэеў пісаў: «...Менш чым за тры месяцы — са снежня 1941 па люты 1942 г. — заслонаўцы вывелі са строю больш за 170 паравозаў, пусцілі пад адхон 6 эшалонаў з жывой сілай і баявой тэхнікай ворага, падарвалі некалькі нямецкіх складоў з боепрыпасамі і рыштункам, нанеслі велізарныя страты чыгуначнай гаспадарцы, знішчылі нямала гітлераўскіх салдат і афіцэраў» (Л.І.Сяліцкі, А.Е.Андрэеў. Выстаяць і перамагчы! Партыйнае падполле ў Беларусі, 1941 — 1944: Віцебская, Магілёўская, Гомельская, Палеская вобл. Мн., 1985. С. 127).

На Аршанскім чыгуначным вузле Заслонаў пакінуў частку сваіх людзей, каб тыя працягвалі дыверсійную дзейнасць. Кіраўніцтва падпольшчыкамі ён даручыў Сяргею Чэбрыкаву, Пятру Белавусаву і Пятру Шурміну. Пазней з імі была наладжана пастаянная сувязь. Пакінутыя Заслонавым у Оршы падпольшчыкі праведзенымі імі дыверсіямі, сабатажам, шкодніцтвам нанеслі акупантам значныя страты.

Пры ацэнцы дыверсійнай дзейнасці К.С.Заслонава, а таксама падпольных груп на Аршанскім чыгуначным вузле, якія таксама знаходзіліся пад яго кіраўніцтвам, трэба ўлічваць, што яна ажыццяўлялася ў час бітвы за Маскву, дзе, як лічыла фашысцкае камандаванне, вырашаўся зыход вайны і лёс Савецкай дзяржавы. Зрываючы перавозкі нямецкіх войск, баявой тэхнікі, боепрыпасаў, падпольшчыкі аказалі значную дапамогу савецкім войскам у разгроме гітлераўцаў пад Масквой.

Побач з заслонаўскай арганізацыяй у Оршы паспяхова дзейнічалі і іншыя падпольныя групы, кіраўніцтва якімі ажыццяўляў падпольны партыйны цэнтр. На пачатку 1942 г. ў горадзе і раёне такіх груп налічвалася ўжо больш за 50. Кіраваў падполлем Лявон Нічыпаравіч Анкіновіч, які ў той час знаходзіўся ў в. Кашына. Важную ролю ў арганізацыі падполля і кіраўніцтве ім адыгрываў і былы начальнік Аршанскага гарадскога аддзела НКДБ Аляксей Пятровіч Максіменка, які таксама ўваходзіў у склад падпольнага партыйнага цэнтра. Непасрэднае кіраўніцтва падпольшчыкамі ў самой Оршы ажыццяўлялі А.Г.Шкабарын і А.Т.Скаварада. Дзякуючы іх намаганням падполле аформілася арганізацыйна, паміж асобнымі групамі была ўстаноўлена сувязь, іх дзейнасць набывала мэтанакіраваны характар.

Так, асенне-зімовым часам 1941 —1942 гг. актыўна дзейнічала падпольная група ў вагонным дэпо. Кіраваў ёй Анатоль Бяляўскі. Члены групы падсыпалі пясок у буксы вагонаў, рабілі насечкі на восях колавых пар, пасля чаго вагоны хутка выходзілі са строю, падпольшчыкі двойчы выводзілі са строю кампрэсарную станцыю.

Збіралі інфармацыю разведвальнага характару, вялі агітацыйную работу, рабілі дыверсіі, выкрадалі з вагонаў нямецкіх цягнікоў зброю і боепрыпасы падпольшчыкі даволі вялікай групы, якая з ліпеня 1941 г. пад кіраўніцтвам Кацярыны Уладзіміраўны Грачыхі дзейнічала на станцыі Орша-Заходняя.

Каштоўнай інфармацыяй аб перавозках нямецкіх войскаў і грузаў да фронта забяспечвала савецкае камандаванне група Ніны Бабуры, якая арганізавалася ў жніўні 1941 г. і дзейнічала на станцыях Орша-Усходняя і Орша-Заходняя. У студзені 1942 г. яна перайшла пад кіраўніцтва К.А.Дудчанкі, прафесійнага разведчыка, які быў закінуты з Масквы.

Члены Даўжаніцкай падпольнай камсамольскай арганізацыі на чале з Аляксандрам Крукоўскім сістэматычна высякалі кавалкі падземнага кабелю, што звязваў камандаванне групы армій «Цэнтр» з Берлінам, псавалі тэлефонна-тэлеграфную сувязь, нішчылі слупы.

А падпольшчыкі в. Рубашына пад кіраўніцтвам Ф.П.Сплашнова побач з правядзеннем дыверсій на шашы, зрывам гаспадарчай

Памятны знак ахвярам фашызму на месцы растрэлу ўдзельнікаў партыйна-камсамольскага падполля. Орша, раён мясакамбіната.

дзейнасці акупантаў вялі работу ў навакольных вёсках па стварэнні падпольных груп, рыхтавалі запасы зброі і харчавання для партызанскай барацьбы, рабілі налёты на дробныя гарнізоны ворага. У красавіку 1942 г. імі быў арганізаваны партызанскі атрад імя Варашылава. Значную работу праводзілі і многія іншыя падпольныя групы і арганізацыі горада і раёна.

Усё гэта не магло не насцярожыць акупацыйныя ўлады. Карныя органы фашыстаў актывізавалі сваю дзейнасць па выяўленні ўдзельнікаў падполля, узмацнілі тэрор супраць патрыётаў. Да цяжкіх страт падпольшчыкаў прыводзілі недастатковая канспірацыя, слабая абароненасць на выпадак правалаў, нямецкая агентура, што ўкаранялася ў іх рады, здрада асобных членаў арганізацый.

У выніку масавых арыштаў у катавальні палітычнай паліцыі ў красавіку 1942 г. трапілі кіраўнікі падпольнай партыйнай арганізацыі Оршы А.Т.Скаварада і А.Г.Шкабарын. Фашысты ведалі пра іх сувязь з Заслонавым. Абодва вытрымалі неймаверныя катаванні, не выдалі нікога з падпольшчыкаў і былі расстраляны.

Сур'ёзныя страты панеслі падпольшчыкі чыгуначнага вузла з-за здрады Васіля Ролева і Мікалая Алянковіча. Абодва ў свой час былі падпольшчыкамі, а потым і партызанамі заслонаўскага атрада. Яны выдалі ўсіх падпольшчыкаў, якіх ведалі, нічога не ўтаілі фашыстам і пра партызанскі атрад. У выніку падпольшчыкі не далічыліся каля 30 сваіх баявых сяброў, якія былі схоплены гітлераўцамі і пасля катаванняў расстраляны. Карныя органы акупантаў з дапамогай сваіх агентаў, што былі ўкаранёны ў шэраг падпольшчыкаў, выявілі некалькі явачных кватэр, арыштавалі многіх падпольшчыкаў і партызан, іх сувязных. Усе былі пакараны смерцю.

Паводле справаздачы групы ГФП-723, толькі ў верасні 1942 г. былі расстраляны 162 чалавекі. У справаздачы за кастрычнік 1942 г. група ГФП-723 паведамляла: «...За справаздачны перыяд нам удалося ўкараніць у штабы буйных партызанскіх атрадаў сваю надзейную агентуру, у выніку чаго стала магчымым дапытаць цэлы шэраг асоб г. Оршы. У асноўным гэта былі ўрачы, якія садзейнічалі партызанам. На допытах яны далі каштоўныя паказанні... Уся наша старая агентура добра замаскіравана, мае падробленыя дакументы. 5 жыхароў вёскі Таргоўцы паўночна-заходняй Оршы замаскіраваны пад партызанскі атрад, яны ўстанавілі сувязь з вядомымі ім партызанамі, па іх дадзеных былі злоўлены 4 партызаны, яны прызналіся, што з'яўляюцца сувязнымі. Расстраляны» (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4855, воп. 1, спр. 10, л. 21).

Аднак ні панесеныя страты, ні тэрор не зламалі волю патрыётаў. Як у горадзе, так і ў раёне ўзнікаюць новыя патрыятычныя арганізацыі, расце колькасць падпольшчыкаў. Пра некаторыя з груп стала вядома толькі пасля вайны з архіўных дакументаў праціўніка. Так, у справаздачы групы ГФП-723 за жнівень 1942 г. ўказваецца: «...Знойдзены кампраметуючы матэрыял на Эдуарда Галушкова... У час адсутнасці бацькоў у кватэры адбыўся сход па стварэнні партызанскай групы, на якім прысутнічаў і расказаў пра задачы групы член банды Заслонава, былы аграном Аляксандр Атрашкевіч з вёскі Кашына. Атрашкевіч з'яўляўся сувязным паміж ствараемай у Оршы падпольнай арганізацыяй і гэткай жа арганізацыяй у вёсцы Зарэчча... Кіраўнік арганізацыі — староста вёскі Зарэчча Масаловіч Андрэй і 4 іншыя члены былі арыштаваны... Арганізацыя выконвала заданні і падтрымлівала сувязь з бандай «Дзяніса» і Анкіновіча, а таксама мела сувязь з бандай Заслонава. Яна мела такое ж заданне, як і памянёная вышэй арганізацыя, і забяспечвала партызан зброяй, боепрыпасамі, гранатамі і мінамі. Масаловіч і 4 ягоныя памочнікі былі таксама расстраляны» (Нацыянальны архіў

Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і падпольшчыка Л.Н.Анкіновіча в. Забалацце.

Рэспублікі Беларусь, ф. 4855, воп. 1, спр. 10, л. 18). У другой справаздачы чытаем: «...5 лістапада 1942 г. ў Оршы арыштаваны былы дырэктар школы Кунцэвіч Павел... Кунцэвіч быў выкрыты ў тым, што сістэматычна займаўся вярбоўкай новых асоб для партызанскай банды, а таксама выконваў спецыяльныя заданні па Аршанскім раёне. Так, да прыкладу, 21 кастрычніка 1942 г. яму было даручана Заслонавым падрыхтаваць і ажыццявіць 7 лістапада выбухі на складах боепрыпасаў у Вусці, а таксама бензаскладзе ў Оршы. Кунцэвіч адмаўляў сваю віну, і ніякімі сродкамі яго нельга было прымусіць прызнацца. Ён быў расстраляны» (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4855, воп. 1, спр. 10, л. 19).

З другой палавіны лета 1942 г. кіраўніцтва падпольнымі групамі перамясцілася ў штабы партызанскіх злучэнняў, якія мелі, як правіла, сувязь з Цэнтральным штабам партызанскага руху. Гэта дазваляла больш мэтанакіравана ажыццяўляць кіраўніцтва дзейнасцю падпольшчыкаў, забяспечваць іх магнітнымі мінамі, лепш выкарыстоўваць разведвальную інфармацыю.

Паляпшэнню кіраўніцтва падполлем, пашырэнню размаху яго дзейнасці паспрыяла стварэнне ў чэрвені 1943 г. Аршанскіх партыйнага і камсамольскага падпольных райкомаў. Раённы камітэт партыі ўзначаліў камандзір 1-й партызанскай брыгады Л.І.Сяліцкі, сакратаром стаў Л.Н.Анкіновіч, членамі — Б.К.Іваноў і А.П.Максіменка. Райком камсамола ўзначалілі сакратары Б.І.Пятроў і Д.С.Падалінскі. У яго склад быў уключаны Н.Е.Багдановіч (упаўнаважаны ЦК ЛКСМБ па Оршы і раёне). Райкомы партыі і камсамола падтрымлівалі сувязь з падпольшчыкамі, ажыццяўлялі кіраўніцтва і накіроўвалі іх дзейнасць. У той час у Оршы і раёне дзейнічала каля 100 падпольных груп. Толькі райком камсамола меў на сувязі 83 баявыя камсамольска-маладзёжныя групы, якія налічвалі ў сваім складзе каля 700 камсамольцаў. Падпольна-патрыятычны рух няўхільна развіваўся насуперак усім мерам, што прымаліся следча-карнымі органамі акупантаў.

Актывізавалася агітацыйна-палітычная дзейнасць падпольшчыкаў. Падпольныя групы самастойна выпускалі лістоўкі, атрымлівалі ад райкома партыі і з партызанскіх злучэнняў газеты «Правда», «Звязда», лістоўкі, іншую літаратуру. Са жніўня 1943 г. па ліпень 1944 г. выдавалася падпольная газета «Ленінскі прызыў». За гэты час было выпушчана 35 нумароў тыражом 650 экзэмпляраў кожны. Рэдактарам газеты быў Б. К. Іваноў, сакратаром рэдакцыі — А.І.Стук. Шрыфт і фарбу здабывалі ў нямецкай друкарні падпольшчыкі, якія працавалі там. Кіраваў гэтай групай А.П.Мікалаеў. У склад групы «Патрыёты Радзімы» (так называлі сябе падпольшчыкі) уваходзіла 7 чалавек. Яны забяспечвалі шрыфтам і партызанскую брыгаду «Чэкіст», дзе пачала выпускацца газета «За Радзіму». Член гэтай падпольнай групы Вера Берасцюк друкавала бланкі на атрыманне прадуктаў з нямецкіх складоў. Па дакументах, што былі выраблены ёй, партызаны атрада «Знішчальнік» атрымалі з нямецкага склада дзве грузавыя машыны прадуктаў.

Распаўсюджванне газет, лістовак і іншых супрацьакупацыйных друкаваных матэрыялаў аказвала значны ўплыў на жыхароў, ва-

еннапалонных, падраздзяленні так званых «народнікаў». Так, у «Ленінскім прызыве» за 5 верасня 1943 г. быў змешчаны зварот беларусаў — салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі да партызан і партызанак. У ім гаварылася: «... кроў загінуўшых кліча нас да помсты, стогны зняволеных заклікаюць да жорсткай барацьбы, да суровай адплаты ворагу...» У гэтым жа нумары надрукаваны пісьмы савецкіх грамадзян, выгнаных у Германію, дзе апавядаецца пра іх пакуты ў няволі. Тут жа змешчаны справаздачы і пра дзейнасць партызан і падпольшчыкаў: «С. і К. вывелі са строю тры паравозы, падарвалі аўтамашыну. Забіты 2 фашысты, 4 — паранены, знішчаны 4 цыстэрны з гаручым. На станцыі Орша-Заходняя знішчана 50 тон гаручага...»

Вялікі размах набыла работа аршанскіх падпольшчыкаў у лагерах ваеннапалонных. Вызваленне з няволі вязняў, арганізацыя масавых уцёкаў каштавалі жыцця не аднаму дзесятку падпольшчыкаў. Затое тысячы выратаваных ад непазбежнай смерці палонных салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі актыўна ўключыліся ў барацьбу ў складзе партызанскіх атрадаў і злучэнняў.

Па некаторых дадзеных, да восені 1941 г. ў Оршы і яе наваколлі ў лагерах ваеннапалонных знаходзілася больш за 120 тыс. савецкіх салдат і афіцэраў. Рэжым утрымання асуджаў іх на немінучую гібель.

Вось што сведчыць у сваіх успамінах былы вязень аднаго з аршанскіх лагераў смерці А.Н.Саблін: «...Я знаходзіўся ў лагеры ваеннапалонных у г. Оршы. Тут людзі гінулі, як мухі. Хто губляў сілы, таго прыстрэльвалі, як непатрэбную жывёліну. Усе думы былі — уцячы. Дапамагла нам у гэтым камсамолка Вера Бугрова. Схавала на гарышчы дома Кацярыны Графутка і яе дачкі Ліды. Калі ўсё ўляглося, нас накіравалі ў партызаны...» (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4, воп. 33-а, спр. 174, л. 73 — 76).

Для вызвалення вязняў лагераў ваеннапалонных падпольшчыкі імкнуліся скарыстаць усе магчымасці. Калі ў канцы 1941 — пач. 1942 гг. немцы дазволілі сваякам забіраць з лагераў блізкіх, намаганнямі падпольшчыкаў многія жыхары горада і раёна па падробленых дакументах дапамаглі вырвацца на волю дзесяткам салдат і афіцэраў.

Трапіўшы ў палон, а потым у аршанскі лагер, Васіль Часаўскіх у сваіх успамінах пісаў: «...У канцы кастрычніка ці пачатку лістапада 1941 г. мяне ўзяла з гэтага пекла дзяўчына-камсамолка. Гэта было маім выратаваннем. Яна ў найцяжэйшых умовах выхадзіла мяне... Дзяўчына гэтая — Цыганкова Настасся Сямёнаўна — стала маёй баявой сяброўкай па барацьбе і ў жыцці» (Фонд музея К.С.Заслонава, т. 4, л. 21).

Доўгі час арганізацыяй уцёкаў займалася камсамольская падпольная арганізацыя, якой кіравала Надзея Сіланцьева. Член гэтай групы Марыя Мурашка была ўладкавана ў лагер ваеннапалонных тэхнічкай у кантору. І з яе дапамогай некалькі соцень вязняў сталі партызанамі. Многім ваеннапалонным дапамаглі ўцячы і стаць партызанамі члены падпольных камсамольскіх груп Эдуарда Галушкова, Мікалая Кузьміна, Людмілы Шыбека, Еўдакіі Шамшуровай. Начальнік штаба аднаго з партызанскіх атрадаў Смалоткін успамінаў: «Знаходзячыся ў лагеры ваеннапалонных у г. Оршы, наладзіў сувязь з аршанскімі падпольшчыкамі. Атрымаўшы ад іх рэжучы інструмент, у ноч з 8 на 9 верасня 1941 г., мы, 36 чалавек, уцяклі з лагера... У гэтым дапамаглі нам камсамольцы горада Оршы Марыя Аскерка, яе брат Рыгор і іх сябры» (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4855, воп. 1, спр. 5, с. 143 — 149).

А вось успаміны камандзіра і камісара яшчэ аднаго з партызанскіх атрадаў Васіля Шарава і Уладзіміра Бурлаева: «...Партызанскі рух у Горацкіх лясах сістэматычна папаўняўся за кошт ваеннапалонных, выведзеных з Аршанскіх лагераў... Нам было перададзена каля 2-х тысяч чалавек. Многія сталі камандзірамі, палітработнікамі атрадаў і брыгад».

Адной з самых буйных аперацый, праведзеных аршанскімі падпольшчыкамі, сталі масавыя ўцёкі ваеннапалонных у жніўні 1942 г. з лагера, усталяванага фашыстамі на ўскрайку Оршы ў кар'еры, адкуль акупанты вывозілі шчабёнку. Арганізавала яго партарганізатар аршанскага падпольнага партыйнага цэнтра Ганна Трафімаўна Карабкіна. У лагеры была арганізавана падпольная група, дастаўлена зброя. Аперацыю дэталёва спланавалі. На выпадак, калі не атрымаецца бяскшумна зняць ахову, падпольным групам Дзмітрыя Бохана і Мікалая Кузьміна было дадзена заданне не дапусціць падыходу падмацавання на дапамогу ахове. Члены груп былі ўзброены гранатамі. Аднак пусціць іх у

справу не давялося. Аперацыя прайшла паспяхова, сотні ваеннапалонных па загадзя распрацаваных маршрутах пайшлі ў лес да партызан.

Зразумела, цяжка дакладна падлічыць, колькі ваеннапалонных было выратавана аршанскімі падпольшчыкамі, аднак наяўныя дадзеныя сведчаць, што іх было больш за дзесяць тысяч чалавек.

Для аховы тылоў і камунікацый ад партызан і падпольшчыкаў, барацьбы з патрыётамі ўжо у 1941 г. гітлераўскае камандаванне і акупацыйныя ўлады пачалі фарміраваць з жыхароў акупіраваных раёнаў паліцэйскія падраздзяленні, карныя атрады, а некалькі пазней — так званую «народную армію». У складзе гэтых сіл былі здраднікі, крымінальнікі. Аднак даволі значны працэнт сярод іх складалі і ваеннапалонныя. Перакананых ворагаў савецкага ладу ў іх асяроддзі было не так ужо і шмат. Часцей за ўсё былыя салдаты і афіцэры Чырвонай Арміі ішлі ў паліцаі і «народнікі», каб вырвацца з лагера, пазбегнуць гібелі. Абалваненыя фашысцкай прапагандай, яны баяліся адплаты за сваю здраду і вымушаны былі служыць акупантам. Але ж нямала было і такіх, хто чакаў толькі зручнага моманту, каб перайсці да сваіх.

У Оршы, навакольных вёсках і населеных пунктах — Асінторфе, БелДРЭСе, Забалацці, Межаве, Балбасаве, Пагосце, Смалянах, Панізоўі і іншых — у 1942 — 1944 гг. знаходзіліся дастаткова буйныя фарміраванні паліцэйскіх і «народнікаў». Асабліва высокая шчыльнасць гэтых фарміраванняў назіралася ўздоўж шашэйных дарог і чыгункі. Разлажэнне гэтых дабравольніцкіх фарміраванняў таксама стала адной з важных задач падпольшчыкаў. Да рашэння яе была падключана значная іх колькасць. Якім жа чынам яны дзейнічалі? Уладкоўваліся на працу па абслугоўванні паліцэйскіх і «народных» фарміраванняў, падкідвалі лістоўкі, знаходзілі сярод сваіх «падапечных» тых, хто не прадаўся немцам, арганізоўвалі ініцыятыўныя і падпольныя групы, дапамагалі наладзіць сувязь з партызанамі. Нярэдкімі былі выпадкі, калі кіраўнікі падпольных груп засылалі ў паліцэйскія падраздзяленні сваіх агентаў.

Гэта была небяспечная работа. Здараліся правалы, былі ахвяры. Аднак падпольшчыкі дабіваліся поспехаў, і немалых, у многім дзякуючы ўмела пастаўленай агітацыі. У арсенале форм агітацыйнай работы галоўнае месца займалі лістоўкі. Вось што пісалася ў адной з іх: «...Справа немцаў прайграная... Мы гаворым вам прама і шчыра: знаходзячыся ў радах воінскіх часцей, якія служаць немцам, вы робіце вялікае злачынства перад Радзімай. Калі вы будзеце працягваць служыць немцам — вам не пазбегнуць суровага пакарання савецкага народа. Аднак вы можаце атрымаць ад Савецкай улады дараванне і аднавіць гонар патрыётаў Радзімы сабе і сваім сем'ям, калі неадкладна пойдзеце ад немцаў і будзеце сумленна служыць савецкаму народу. Якім чынам вы павінны паступаць? Шкодзіць усім, чым можаце. Разбурайце аб'екты, якія вам даручана ахоўваць, падрывайце чыгуначныя пуці і тэлефонна-тэлеграфную сувязь, знішчайце ваенную маёмасць, паліце склады... Адыходзьце па адным і групамі, захапіўшы з сабою зброю, да партызан або праз лінію фронту...» (У тыле ворага. М., 1962. С. 177).

Такая агітацыя прыносіла свой плён. У 1942 г. камандзір брыгады «Баця» В.У.Бойка дакладваў штабу партызанскага руху: «Нашымі людзьмі, разведчыкамі разложана 4 гарнізоны «народнікаў». У брыгаду перайшло каля 300 чалавек. Яны прынеслі 20 ручных кулямётаў, 4 мінамёты, 10 аўтаматаў, 150 вінтовак, 2 рацыі, вялікую колькасць гранат, патронаў, харчавання» (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 3500, воп. 4, спр. 35, л. 84 — 93).

Папярэджаныя сувязнымі партызаны чакалі ўжо іх на ўзлессі каля вёскі Дымава. Яны, падпусціўшы карнікаў на прыцэльны выстрал, адкрылі па іх такі агонь, што тыя, пакідаўшы на полі бою зброю і дзесяткі забітых і параненых, кінуліся хто куды.

Пра дымаўскі бой, пра перамогу партызан доўга гаварылі ў нашых аколіцах, у нашых вёсках.

Я ж помню гэты бой па-свойму: зубрэвіцкія паліцаі, чысценькія і дагледжаныя, строем, з песнямі ідуць у бок Вярхоўя, за якім — Рацаўскі лес. Ідуць на аблаву партызан, а потым спалоханыя, захаканыя, брудныя і расхрыстаныя, усё аглядаючыся, бягуць з той аблавы на злом галавы.

«Пасля гэтага бою, — успамінае начальнік штаба брыгады Іван Буланаў, — гітлераўцы да верасня 1942 года не паказваліся ў Рацаўскі лес, дзе базіравалася брыгада».

Партызаны пачалі адчуваць сябе гаспадарамі на сваёй роднай зямлі. У іх з'явіўся нават моцны конны разведатрад, які не баяўся паказвацца ў Зубрэвічах нават удзень — паліцаі тады сядзелі ціхенька ў сваім канцы вёскі, а ў наш баяліся нават носа сунуць.

Аднаго разу з гэтым атрадам зблізку пазнаёміліся і мы, дзеці.

Той дзень мы нарэзалі з кары яловага бярвення белых палос, панарабілі з іх сабе партупей і пад кіраўніцтвам старэйшых хлопцаў строем маршыравалі па вуліцы. Разведчыкі, мусіць, доўга назіралі за намі з засады і ніяк не маглі зразумець, што гэта за войска маршыруе па вуліцы. А потым, прыняўшы нас за партызанаў, нечакана наляцелі невядома адкуль. Убачыўшы, што гэта дзеці, яны разгубаліся — маглі б пастраляць падшыванцаў! У злосці разведчыкі ледзь не адсцябалі нас плёткамі.

Мясцовыя нямецкія ўлады баяліся партызан гэтак жа, як і паліцаі. Яны пачалі ваяваць з мірнымі людзьмі, бо зразумелі, што кожны тутэйшы чалавек — патэнцыяльны партызан: як толькі што, так ён і азіраецца на лес.

Немцы забралі цётку Насту. Некалькі месяцаў яна сядзела ў турме, здаецца, у Шклове, а потым нечакана з'явілася ў нашай хаце — яе выпусцілі! Знайшоўся нейкі добры паліцэйскі, які дапамог ёй вызваліцца. Ён прынёс якуюсьці мазь і прымусіў цётку Насту нацерціся ёю. Пасля гэтага ўсё яе цела — і твар, і рукі — пакрылася страшэннымі струпамі, якія я прыняў за вынікі гестапаўскіх катаванняў. Немцы ж падумалі, што гэта нейкая вельмі заразная хвароба і, спалохаўшыся, выгналі партызанскую маці з турмы.

Яна чамусьці не пайшла ў сваю хату на Зарэччы, а найперш зазірнула да нас. І засталася надоўга — жыла з намі і лячылася.

Цётка Наста прыйшла да нас цёмначы — каб ніхто не бачыў. Потым яна схадзіла, таксама ўначы, у Бярозаўку, дзе, ведала, стаіць даччын атрад. Але там нагаварылі ёй такога — маўляў, Марыя паляцела на самалёце ў Маскву, — што яна вярнулася зноў у Зубрэвічы. Хоць усе ведалі, што гэта вельмі небяспечна. Мама аднойчы чула, што мужчыны, якія ладзілі з немцамі, седзячы на бярвенні, абураліся: «Во да чаго мы апусціліся — у нашай вёсцы партызаны жывуць!». Мама тады расказала пра пачутае цётцы Насце і занепакоілася: «Сястрыца ты мая дарагая, трэба нам нешта рабіць... Забяруць цябе».

А тым часам немцы, убачыўшы, што з партызанамі так лёгка, як бы ім хацелася, не справіцца, пачалі распрацоўваць у штабе начальніка тылу групы нямецка-фашысцкіх армій «Цэнтр» план карнай аперацыі пад кодавай назваю «Сава».

«Сава» закрычала, завухкала, загухкала, па-сарочы застракатала аўтаматнымі чэргамі на самым пачатку верасня. І мэта ў яе была адна — акружыць і знішчыць партызанскую брыгаду «Чэкіст». Для гэтага тылавыя нямецкія войскі ўзмацнілі некалькімі палявымі часцямі, якія накіроўваліся на фронт, дадаўшы ім яшчэ і авіяцыю.

Артылерыя, танкі, самалёты... Рэгулярныя нямецкія часці... І ўсё гэта супраць партызан, на ўзбраенні якіх «23 ручныя і станковыя кулямёты, аўтаматаў ППД і вінтовак — каля 500, 2 мінамёты без мін»...

Партызаны зразумелі, што тут яны не перамогуць. Да вечара карнікі занялі амаль усе вёскі вакол Рацаўскага лесу. Пачаліся перастрэлкі. З'явіліся параненыя. Прынеслі першых забітых.

Усе без выключэння ведалі: заўтра раніцою вораг уварвецца ў партызанскі лес...

Герасім Кірпіч увечары збірае ў гэтым лесе нараду камсастава брыгады.

«Амаль паўгода, — кажа ён, — мы білі фашыстаў у гэтай зоне, цяпер яны сабраліся пабіць нас. Абстаноўка, як бачыце самі, цяжкая, складаная. Але панікі ў нашых шэрагах не павінна быць. Што будзем рабіць, таварышы?»

Усе маўчалі, а думка была адна: трэба ўходзіць, трэба зараз жа пакідаць Рацаўскі лес. Але куды ісці? На поўдні і на ўсходзе ў ворага сабраны вельмі вялікія сілы.

«Значыць, — прапанаваў камандзір атрада Барыс Клюшнікаў, — нам трэба ісці на поўнач ці на захад, лепей у бок Оршы. Я прапаноўваю за гэту ноч перабрацца ў Альхоўскі лес, дзе пачынаў свае дзеянні 10-ы атрад. Лес знаходзіцца блізка ад буйнога аэрадрома Балбасава, і вораг наўрад ці здагадаецца, што мы будзем знаходзіцца там».

Клюшнікаў клікаў усю брыгаду туды, дзе ён ствараў першы партызанскі атрад. Рызыка была вялікая: калі б немцы выявілі партызан у Альхоўскім лесе, авіяцыя змяшала б там усё з зямлёю — аэрадром жа побач, усяго за сем кіламетраў.

Аднак усе аднагалосна падтрымалі Клюшнікава, і брыгада тую ж ноч ціха, бясшумна, незаўважна, абыходзячы населеныя пункты, прыйшла ў Альхоўскі лес.

А раніцою немцы, уварваўшыся ў Рацаўскі лес, былі здзіўлены і расчараваны — нікога ў ім ужо не было. Толькі апусцелыя шалашы і зямлянкі сведчылі пра тое, што ў іх толькі што жылі людзі і што іх было вельмі многа. Узброеныя да зубоў карнікі, прагнучы сапраўднай барацьбы, кінуліся наўздагон за партызанамі на захад і паўднёвы захад, аднак нікога не дагналі — у вёсках і палях было ціха, спакойна і нішто не паказвала на тое, што тут прайшло вялікае партызанскае злучэнне: партызаны як растварыліся ў паветры ці правaліліся скрозь зямлю.

А мсціўцы ўвесь трывожны дзень 30 жніўня правялі ў Альхоўскім лесе — зусім пад бо-

кам у фашысцкага аэрадрома. А Зубрэвічы ж — паміж лесам і Балбасавым.

Мне здаецца, што я памятаю, якая напятая, трывожная цішыня стаяла той дзень у наваколлі. Можа, я і прыдумляю, можа, думаю заднім, сённяшнім розумам, але ж людзі ў нашых вёсках ведалі пра «Саву», чулі выбухі, чулі аўтаматныя чэргі, бачылі самалёты і таму вельмі трывожыліся.

І Альхоўскі лес быў перапоўнены трывогаю.

Над Зубрэвічамі, узняўшыся з аэрадрома, праляталі самалёты, яны кружыліся над Альхоўскім лесам, але нічога, на шчасце, так і не заўважылі: во як патаемна прыйшлі ў лес партызаны, во як замаскіраваліся ў ім, што нічым — столькі ж коней, фурманак, зброі, тысячы людзей! — не выдалі сябе.

Мікалай Кантроўскі, выйшаўшы з Рацаўскага лесу, прыйшоў са сваімі сябрамі да нас. Да світання яны спалі ў нашай хаце ўпокат на падлозе, а як толькі заднелася перабраліся на гарышча і там перабылі неспакойны дзень, слухаючы, як гудуць над галавою самалёты, як гергечуць на вуліцы немцы. Калі сцямнела, яны пайшлі ў Альхоўскі лес, каб разам з брыгадаю шукаць выйсця.

Там ужо выйсце было знойдзена. На другой нарадзе, якой зноў жа кіраваў Кірпіч, партызаны прынялі рашэнне як найхутчэй пакінуць гэты раён — пра адкрытую бітву з ворагам не магло быць і гаворкі: вельмі ж няроўныя сілы.

І прапанова была адна — ісці за чыгунку, за аўтамагістраль, ісці ў Лепельскія лясы. А каб лягчэй было ісці і манеўраваць, брыгаду падзялілі на дзве часткі. Андрэй Нікітчанка, які прапанаваў гэта, узначаліў другую групу, а з першаю пайшоў камбрыг Кірпіч.

Групе Кірпіча ўдалося перайсці і чыгунку, і аўтамагістраль Масква—Мінск без ахвяр — яна пераходзіла іх паміж станцыяй Талачын і паўстанкам Відзершчына. А групе Нікітчанкі, якая пераходзіла жалезку паміж станцыяй Коханава і паўстанкам Рудня, не пашанцавала: яе выявіла ахова чыгункі і абстраляла нават мінамётным агнём. Атрадам гэтай групы давялося зноў вяртацца ў Альхоўскі лес.

У групу Нікітчанкі ўваходзіў і атрад Клюшнікава.

Таму Коля Кантроўскі са сваімі сябрамі зноў апынуўся ў нас на гарышчы.

Памятаю жудасны выпадак з тых дзён.

Немцы збіралі тады па хатах сабе ежу: «матка, яйка, млека, шпэк». Яны прышлі да нас якраз у той дзень, калі Коля з сябрамі былі на гарышчы. Мы з цёткаю Аляксандрай Іванаўнай былі ў хаце і выбеглі толькі тады, калі пачулі, што ў сенцах нехта грукае. Немцы патрабавалі яек і ўжо прыстаўлялі, прысоўвалі да лаза на гарышчы лесвіцу — каб пашукаць там курыныя гнёзды. Цётка ледзь угаварыла іх не лезці нікуды, паказала, што яна зараз прынясе тое, чаго яны хочуць, і выбегла з сянец — сваіх яек у нас не было, і яна пабегла пазычаць іх у суседзяў.

Я ж застаўся з немцамі адзін. Усё хацеў выманіць іх з сянец — пан, куры не тут нясуцца, куры нясуцца ў хляве, хадзеце пакажу — але яны, смеючыся, што я дрыжу, не паслухаліся мяне і пайшлі з сянец толькі тады, калі пераклалі сабе ў кошык яйкі, што прынесла цётка.

Сіўчык расказваў пасля, што яны ўжо стаялі ля лаза напагатове. З вінтоўкамі ў руках, з узведзенымі куркамі...

Група Нікітчанкі, убачыўшы, што ў параўнаўча невялікім Альхоўскім лесе пачаць пановаму партызанскую барацьбу немагчыма, падалася ў большыя, Крупскія лясы.

З імі пайшлі таксама Марыя і Мікалай. Больш Сіўчыка я не бачыў. Марыя Антонаўна, якая нядаўна памерла, пры жыцці гаварыла, што быццам бы Коля вырашыў прабрацца за лінію фронта, але дайшоў толькі да Андрэеўшчыны, дзе да вайны яна вучыла дзяцей, — ён, каб агледзецца і адпачыць, зайшоў да настаўніцы, сястрыной сяброўкі, а тая выдала яго немцам...

Выгнаўшы з гэтых мясцін брыгаду «Чэкіст», фашысты пачалі наводзіць тут свой парадак.

За гэта ўзялася ГФП — тайная палявая паліцыя. Яна дзейнічала хітра, каварна, вылюдна. «Рускія паліцэйскія службы, перааранутыя пад бандытаў» (г. зн. партызан), прыходзілі ўночы да партызанскіх сувязных, усё распытвалі і пра партызан, і пра тых, хто ім спачуваў, дапамагаў — беларусы ж вельмі даверлівыя людзі і дзяліліся з мярзотнікамі ўсім, што ведалі, як з роднымі, сваімі, — а ўдзень начныя госці прыходзілі ўжо ў паліцэйскай, альбо нямецкай форме, забіралі іх у гестапа, дапытвалі там, білі, мардавалі і ўрэшце расстрэльвалі.

Зноў забралі цётку Насту — на гэты раз яна ўжо не вярнулася.

Ніхто з нашай радні не ведаў і не ведае, калі, дзе і як гэта адбылося, але ўсе ведаюць — яе расстралялі.

Тады стралялі шмат і з лёгкасцю.

«Падтрымліваў сувязь з партызанамі». Стралялі.

«Забяспечвала іх прадуктамі». Стралялі.

«Перадаваў ім звесткі». Стралялі.

«Выконваў ролю кур'ера». Стралялі.

«Пякла хлеб, давала малако». Стралялі.

Расстралялі ўсю сям'ю камандзіра атрада Барыса Ключнікава — бацька, праўда, памёр сам, а маці, брата, братаву жонку і іх малое дзіця расстралялі. Я памятаю, як везлі іх усіх на калёсах з Зарэчча ў гестапа. Нічыіх твараў не памятаю. Застаўся ў памяці толькі адзін — дзіцячы. Мусіць, таму, што дзяўчынка была добра прычасаная і чамусьці ўсмяхалася.

Расстралялі сям'ю камісара Масюрова — бацьку, маці, двух братоў. Старэйшая сястра, якая на той час ужо была замужам у Зубрэвічах, выпадкова на кані прыехала ў родную вёску. Ёй удалося выпрасіць у карнікаў толькі сваю самую малодшую сястрычку Таню. Я не бачыў, як іх забіралі з Вярхоўя, адно толькі чуў, што там дужа галасілі. І яшчэ ў памяці, як Масюрыха прывезла ў Зубрэвічы маленькую заплаканую дзяўчынку...

Не абмінула тайная палявая паліцыя і нашу хату.

Аднаго разу ўночы я прачнуўся ад нейкага прыглушанага шэпту. Невядомыя мужчыны шапталіся з маім бацькам. Я разбіраў толькі словы «Коля», «вінтоўка», «вярнуўся».

Было прадвесне 1943 года. Колі мы даўно не бачылі. І яго сяброў таксама. А тут прыйшлі вельмі шчырыя, сардэчныя людзі, яго новыя сябры, яны кажуць, што Коля паранены і просіць, каб бацька перадаў ім вінтоўку — тую, якая схавана ў таку. Яны ж нават ведаюць, дзе ляжыць вінтоўка!

Бачыце, Колі ўжо няма жывога, а вінтоўку для яго ўсё яшчэ просяць...

І мой бацька, шчырая і даверлівая душа, паверыў... Схадзіў у ток, дастаў са схованкі вінтоўку і аддаў яе незнаёмым людзям. Бельгійскую. Змазаную. З патронамі. Апошнюю. Якую бярог для сябе...

І толькі калі «партызаны», адно выйшаўшы з хаты на вуліцу, адразу ж, пад нашымі вокнамі стрэлілі з яе, маці затурбавалася:

— Даніла ты Даніла, што ж ты нарабіў... Не партызаны гэта.

Бацька пярэчыў ёй, але нясмела і няўпэўнена — ён зразумеў і сам: навошта гэта партызанам, атрымаўшы вінтоўку, так недарэчна выдаваць сябе?

А я і цяпер яшчэ чую, як гучна і трывожна хрупаціць лядок пад нагамі мярзотнікаў, якія прыкінуліся партызанамі, што весела і голасна — на ўсю вёску! — размаўляючы і смеючыся, з бацькавай вінтоўкаю ў руках здаляюцца ад нашае хаты.

Бацьку забралі неўзабаве пасля гэтага. Вясною. Перад вялікаднем. Відаць, доўга ў турме ён не сядзеў — доказы ж збіраць не трэба было, гестапаўцы ўжо трымалі іх у сваіх руках. Казалі, што білі бацьку моцна і жорстка. Здзекваліся: прыносілі ў камеру і кідалі перад ім ператворанага ўжо ў крывавы, але жывы кавалак мяса партызана. І патрабавалі прызнацца, што бацька таксама партызан...

Даніла ж Іванавіч у партызаны пайсці не мог — у яго былі хворыя ногі, з-за чаго бацьку не ўзялі і ў войска, не паслалі на фронт. Аднак чым мог, ён, канечне ж, дапамагаў партызанам.

Мама спачатку насіла перадачы бацьку. Бацькі не бачыла, а ўсё роўна насіла. Потым турэмны наглядчык пашкадаваў яе — улучыўшы момант, калі побач нікога не было, стараючыся гаварыць як найцішэй, сказаў:

— Не насі ты гэтыя перадачы, жанчына. Яны твайму мужу ўжо не трэба. Лепей сама ўцякай куды-небудзь з дому, хавайся.

А куды ўцячэш? Куды схаваешся? Дома ж трое дзяцей — Ніна, Паша і Ваня...

Тады мама зразумела, што бацькі ўжо няма сярод жывых.

Яна хадзіла ўчарнелая, маўклівая, уся ў сабе — не размаўляла нават з намі.

Памятаю, мама ляжыць на падлозе ў хаце, Паша лашчыцца да яе, цалуе, гладзіць маму, расчэсвае ёй валасы, а мама не звяртае на гэта аніякай увагі: ляжыць як нежывая. З адкрытымі вачыма.

А яна ж так любіла, калі дочкі расчэсвалі ёй валасы!

Мама ведала, што яе чакае, але ўсё ж хацела хутчэй засеяць нашу палоску. Для нас.

— Вось пасею я вам, дзеткі, а ўбіраць вы ўжо будзеце самі.

Яна навазіла на палоску гною, растрэсла яго, але пасеяць не паспела...

Яе забралі ў маі 1943 года.

Мама хацела ўзяць з сабою гестапа і нас з Пашаю — бачыце, маўляў, у мяне ж малыя дзеці, іх пашкадуйце. Думала, адпусцяць і нас, і яе. Але яшчэ ў Дубраўках яе ўгаварылі не браць нас з сабой паліцаі: «Ты думаеш, там будуць глядзець на тваіх дзяцей? Загубіш і сябе, і іх». І тады мама расцалавала нас на развітанне...

Яна сядзела ў вязніцы гестапа ў Оршы — там, дзе цяпер выбудаваўся лёнакамбінат. Адтуль Ульяна Пракопаўна так і не выйшла. Маму білі і ўсё дапытваліся: «Дзе Кантроўскі Мікалай?»

Я і цяпер не магу спакойна праходзіць каля даваеннага Дома піянераў, дзе ў вайну было гестапа — мне і сёння здаецца, што я чую прадсмяротныя крыкі закатаваных ахвяр, а на сценах баюся ўбачыць незажыўшыя плямы іхняй святой крыві.

Гадоў дзесяць таму назад, калі капалі катлаван пад трэцюю чаргу аршанскага лёнакамбіната, ля самага берага Дняпра экскаватаршчыкі наткнуліся на мноства чарапоў, касцей, рэштак адзення. Было зразумела, што тут знаходзіцца брацкая магіла партызан і тых, хто ім спачуваў, — непадалёку ж знаходзіцца зненавідны не аднаму мне Дом піянераў, у якім было гестапа.

Я пачуў пра гэта па радыё і, кінуўшы ўсё, паехаў у Оршу — зразумеў, што мае бацькі там, у гэтым катлаване.

З Пашаю мы сустрэліся на лёнакамбінаце.

Катлаван і праўда быў страшны, жудасны — столькі касцей, якія ў свой час былі жывымі людзьмі!

Мы кінуліся ўніз, на дно катлавана... Але што тут шукаць, дзе тут што наша, да чаго можна прыгарнуцца душою?

Паша падняла маленькі, дзіцячы чарапочак з валосікамі, якія былі акуратненька, ласкава прычасаны і з любоўю заплецены ў косачку, і загаласіла:

— А дзетачка ж ты маё, а сястрычачка ж ты мая родная, а ты ж, мусіць, ведаеш, дзе ляжыць мая мамачка. А цябе ж, відаць, так хорашанька прычасала наша мамачка, што твая косачка і ў магілачцы да гэтага часу не расплялася... А мая ж мамачка дужа любіла нас вось гэтак прычэсваць...

Вясною 1943 года, атрымаўшы радыёграму з Беларускага штаба партызанскага руху, вярнулася з Лепельшчыны ў свой Рацаўскі лес партызанская брыгада «Чэкіст».

Але падтрымліваць з ёю сувязь у нас ужо не было каму...

Загінуў, так і не дайшоўшы да лініі фронту, Мікалай Кантроўскі — Сіўчык, які стаў першым у нашым родзе партызанам.

Загінулі яго бацькі — цётка Наста і дзядзька Антон.

Загінулі мае бацькі — Ульяна Пракопаўна і Даніла Іванавіч.

Памёрлі ў вайну баба Васюта і дзед Пракоп.

Дзесьці ў Круглянскіх лясах партызаніла Марыя Антонаўна.

І дзядзьку Ціта, старэйшага бацькава брата, таксама забрала вайна. Толькі не гэтая, а ранейшая — першая імперыялістычная. Вось як пра гэта расказвала мне цётка Алеся:

«А наш Ціт таксама, дзетка, з вайны не прыйшоў. Потым, па вайне ўжо, хадзіў твой бацька аж у Галошава, гэта куды малоць усе ад нас ездзілі, бо там вадзяны млын быў, — яй жа богу, і ты, калі маленькі быў, туды з бацькам ездзіў. Мне ж здаецца, што ты расказваў пра каменную бабу, якой бог сказаў не азірацца, а яна азірнулася, ды так яшчэ і сёння ля Галошава стаіць. Дык вось туды і хадзіў Даніла, бо даведаўся, што ў гэтую вёску вярнуўся чалавек, які разам з Ціцам ваяваў. Той трохі і расказаў твайму бацьку. Кажа, іхняга камандзіра забіла, а тут германцы на нашы акопы наступаюць. А нашы сядзяць у акопах, і няма каму іх падняць. Тады, кажа, узнімаецца Ціт. «За цара, за ацечаства!» — крычыць. Выскоквае сам з акопа, а за ім і астатнія. У штыхавую, кажа, пайшлі. Кажа, што сам ён бачыў, як Ціта два германцы на штыхі паднялі...»

Выхоўвала, гадавала нас цётка Алеся — Аляксандра Іванаўна, бацькава сястра.

За выратаванне партызанскіх дзяцей Аляксандра Іванаўна Сіпакова ўзнагароджана салдацкім, вельмі шаноўным медалём «За баявыя заслугі».

Партызанская брыгада «Чэкіст», калі немцы падчас славутай аперацыі «Багратыён» адступалі на захад — па Зубрэвічах у тры рады два дні і дзве ночы ехалі машыны, ішла тэхніка — навязалі ім кароткачасовы бой каля Альхоўскага лесу. Калона спынілася, ус-

хваляваныя немцы доўга раіліся, але ўсё ж у партызанскі лес уваходзіць збаяліся — паехалі ў абход.

У майго дзеда Івана і бабкі Васюты было пяцёра дзяцей: трое сыноў — Ціт, Пятрок і Даніла, а таксама дзве дачкі — Наста і Аляксандра. Гэта па бацькавай лініі.

У майго дзеда Пракопа і бабкі Яўхім'і было тры дачкі — Ульяна, Куліна, Мальвіна. Гэта па матчынай лініі.

Засталася толькі цётка Мальвіна — самая малодшая маміна сястра. Ёй неўзабаве будзе восемдзесят гадоў. Яна партызаніла ў Лепельскіх лясах.

Янка Сіпакоў.
1999 г.

К.С.Заслонаў.

Партызанскія біяграфіі

ЗАСЛОНАЎ Канстанцін Сяргеевіч (партызанская мянушка Дзядзька Косц я). Герой Савецкага Саюза (7.3.1943). Нарадзіўся 7.1.1910 г. ў г. Асташкаў Цвярской губерні. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага падполля і партызанскага руху ў Віцебскай вобласці. У 1930 г. скончыў прафесійна-тэхнічную школу ў Вялікіх Луках. Працаваў у чыгуначным дэпо ст. Віцебск. У 1933—37 гг. машыніст на Далёкім Усходзе і ў Новасібірску, з 1937 г. начальнік дэпо ст. Рослаўль Смаленскай вобласці, з кастрычніка 1939 г. — ст. Орша. У верасні 1941 г. ў Маскве сфарміраваў з чыгуначнікаў партызанскі атрад. У кастрычніку таго ж года перайшоў з ім лінію фронту, уладкаваўся на працу ў Аршанскае дэпо, стварыў і ўзначаліў некалькі падпольных дыверсійных груп, якія разам з іншымі падпольнымі групамі Аршанскага патрыятычнага падполля паралізавалі работу чыгуначнага вузла. З лютага 1942 г. камандзір партызанскага атрада, з ліпеня 1942 г. — брыгады (гл. артыкул 1-я партызанская брыгада імя К.С.Заслонава). Загінуў у баі з нямецка-фашысцкімі акупантамі 14.11.1942 г. ў в. Купаваць Сенненскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну імем К.Заслонава называліся 2 партызанскія брыгады. У Оршы створаны музей К.Заслонава (гл. артыкул Аршанскі мемарыяльны музей Героя Савецкага Саюза К.С.Заслонава). Яго імем названы дэпо ст. Орша, школа ў Оршы, чыгуначная станцыя ў Лепельскім і вёска ў Сенненскім раёнах, калгасы, вуліцы ў многіх гарадах і вёсках, дзіцячая чыгунка ў Мінску. У Віцебску на доме, дзе жыў Заслонаў, і на будынку дэпо мемарыяльныя дошкі. У Оршы на магіле, у Сянно, на перакрыжаванні дарог Мінск—Масква і Орша—Віцебск пастаўлены помнікі, на месцы яго гібелі — стэла. К.Заслонаву прысвечаны мастацкі фільм, творы літаратуры, жывапісу, скульптуры, музыкі. Пра яго складзены народныя песні і легенды.

ІВАНОЎ Барыс Канстанцінавіч. Нарадзіўся 6.9.1905 г. ў в. Заклінне Лужскага р-на Ленінградскай вобласці. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. З 1928 г. на камсамольскай і педагагічнай рабоце ў Ленінградскай вобласці. У партызанах з 25.4.1942 г.: камандзір групы, камісар атрада, з чэрвеня 1943 г. камісар партызанскай брыгады 1-й імя К.С.Заслонава, у красавіку—чэрвені 1944 г. адначасова і камандзір брыгады. З 1944 г. на педагагічнай і савецкай рабоце. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, медалямі. Памёр 3.7.1979 г.

КОМЛЕЎ Васіль Паўлавіч. Нарадзіўся 31.12.1918 г. ў в. Верхатор Ішымбайскага р-на, Башкортастан. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. З 1939 г. ў Чырвонай арміі. З ліпеня 1941 г. на фронце, памочнік начальніка аператыўнага аддзела штаба арміі. У партызанах з 1941 г., з сакавіка 1942 г. камандзір атрада. З кастрычніка 1942 г. ў распараджэнні БШПР. З мая 1943 г. камандзір арганізацыйнай групы, атрада, у верасні 1943



Пісьмо К.С.Заслонава жонцы.

г. — чэрвені 1944 г. камандзір партызанскай брыгады 2-й імя К.С.Заслонава. Пасля вайны намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкома, на гаспадарчай рабоце ў Сенненскім р-не. У 1949 г. скончыў ВПШ пры ЦК ВКП(б)Б. Кандыдат эканамічных навук (1959). З 1960 г. старшы выкладчык, дацэнт, з 1967 г. прарэктар, з 1972 г. загадчык кафедры Беларускага інстытута народнай гаспадаркі імя Куйбышава. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 2 іншымі ордэнамі, медалямі.

МЕРКУЛЬ Васіль Цімафеевіч. Нарадзіўся ў 1897 г. ў в. Кураўшчына Аршанскага р-на. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. У 1932 г. скончыў Камуністычны універсітэт Беларусі імя Леніна. З 1919 г. ў Чырвонай Арміі. Удзельнік грамадзянскай вайны. З 1924 г. на гаспадарчай і савецкай рабоце. У партызанах з ліпеня 1941 г.: камандзір атрада, адначасова са жніўня 1941 г. член Старобінскай раённай партыйнай тройкі, з кастрычніка 1942 г. камісар партызанскага атрада «Камарова», у чэрвені 1943 г. — ліпені 1944 г. камісар партызанскай брыгады 101-й імя Аляксандра Неўскага, адначасова ў сакавіку 1943 г. — ліпені 1944 г. сакратар Старобінскага падпольнага РК КП(б)Б. З ліпеня 1944 г. намеснік старшыні Мінскага аблвыканкома. Узнагароджаны 3 ордэнамі, медалямі. Памёр 12.11.1944 г.

СЯЛІЦКІ Людвіг Іванавіч. Нарадзіўся 25.12.1903 г. ў в. Вялікі Трылесін Бялыніцкага р-на Магілёўскай вобласці. Адзін з кіраўнікоў партыйнага падполля і партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. У 1926—38 гг. у Чырвонай Арміі. З 1938 г. на гаспадарчай, савецкай і партыйнай рабоце ў Віцебскай, потым у Беластоцкай абласцях. З ліпеня 1941 г. ў варожым тыле, з лютага 1942 г. камандзір партызанскай групы, камісар атрада, у ліпені 1942 г. — красавіку 1943 г. камісар, у лістападзе 1942 г. — красавіку 1944 г. камандзір партызанскай брыгады 1-й імя К.С.Заслонава, адначасова ў чэрвені 1943 г. — маі 1944 г. 1-ы сакратар Аршанскага падпольнага РК КП(б)Б. З мая 1944 г. ў распараджэнні ЦК ВКП(б). У 1948—71 гг. райваенком ва Узбекістане, інжынер упраўлення аўтадарогі Масква—Брэст. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 4 іншымі ордэнамі, медалямі, ордэнамі ПНР, ЧССР, НРБ. Яго імем названа вуліца ў Оршы. Памёр 5.3.1977 г.

УЛАДЗІМІРАЎ Віталь Піліпавіч. Нарадзіўся ў 1911 г. ў Аршанскім раёне. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. З 1941 г. ў Чырвонай Арміі. Са снежня 1941 г. ўдзельнік Асвейскага камуністычнага падполля. У партызанах з мая 1942 г.: камандзір групы, палітрук, у ліпені 1942 г. — сакавіку 1943 г. камісар партызанскай брыгады Асвейскай імя М.В.Фрунзе, адначасова член Асвейскага падпольнага РК КП(б)Б. Загінуў у баі 9.3.1943 г.

Вызваленне Аршанскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

Настаў час вызвалення Беларусі. 23 чэрвеня 1944 г. фронт, які амаль год стаяў менш чым у 40 км на ўсход ад Оршы, прыйшоў у рух. Пачалася аперацыя па разгроме нямецка-фашысцкіх войск у Беларусі. Вызваленне Віцебска і Оршы з'яўлялася задачай першага этапу гэтай аперацыі, якая атрымала кодавую назву «Багратыён». План аперацыі прадугледжваў адначасова прарыў больш чым 1000-кіламетровага фронта праціўніка на 6 участках, расчляненне яго войскаў і разгром па частках. Знішчэнню моцнай флангавай групоўкі гітлераўцаў у раёне Віцебска і Оршы надавалася асаблівае значэнне. Для правядзення аперацыі «Багратыён» савецкае камандаванне ў паласе чатырох франтоў, што ўдзельнічалі

Вулічныя баі ў Оршы. 1944 г.

ў яе правядзенні (1-га Прыбалтыйскага, 1-, 2-, 3-га Беларускіх), засяродзіла буйную групоўку войск у складзе агульнавайсковых і 2 танкавых армій (усяго 166 дывізій, 12 танкавых і механізаваных карпусоў, 7 узмоцраёнаў і 21 брыгаду). Агульная колькасць асабовага складу ўсіх часцей і злучэнняў дасягала 2,4 млн. чалавек, у іх распараджэнні было больш за 36 тыс. гармат і мінамётаў, 5,2 тыс. танкаў і самаходных артылерыйскіх установак. Для падтрымкі з паветра дзеянняў сухапутных войск выдзялялася 5 паветраных флатоў, якія налічвалі ў сваім складзе 5,3 тыс. баявых самалётаў, прыцягвалася таксама авіяцыя далёкага дзеяння і авіяцыя супрацьпаветранай абароны.

Савецкім войскам на гэтым участку фронта процістаяла групоўка нямецка-фашысцкіх войск у складзе 63 дывізій і 3 брыгад, у якіх налічвалася 1,2 млн. чалавек, 9,5 тыс. гармат і мінамётаў, 900 танкаў і штурмавых гармат, 1350 самалётаў. За тры гады акупацыі Беларусі фашысты стварылі добра абсталяваную і глыбокаэшаланіраваную — 250—270 кіламетраў — абарону, якая абапіралася на развітую сетку палявых умацаванняў і натуральныя рубяжы. Абарончыя палосы праходзілі, як правіла, па заходніх берагах шматлікіх водных перашкод, якія мелі шырокія забалочаныя поймы. Развітая сетка чыгуначных і шашэйных дарог забяспечвала магчымасць шырокага манеўру сіламі і сродкамі нанясення контрудараў. Нямецка-фашысцкае камандаванне лічыла сваю абарону ў Беларусі непераадольнай.

На Аршанскім напрамку нямецка-фашысцкім камандаваннем быў створаны рубеж абароны глыбінёй да 45 км. Аматары розных кодавых найменняў, фашысты прысвоілі Віцебска-Аршанскаму раёну абароны ўмоўнае найменне «Пантэра». Абарону на Аршанскім напрамку займалі злучэнні 4-й палявой арміі групы армій «Цэнтр». Супраць іх савецкае камандаванне нацэліла 11-ю гвардзейскую і 31-ю арміі 3-га Беларускага фронта (камандуючы фронтам генерал-палкоўнік І.Д.Чарняхоўскі). Горад Орша знаходзіўся ў паласе наступлення 31-й арміі (камандуючы генерал-лейтэнант В.В.Глаголеў). У складзе 11-й гвардзейскай арміі (камандуючы генерал-лейтэнант К.М.Галіцкі), якая наступала на поўнач ад Оршы, знаходзілася 1-я Маскоўская пралетарская дывізія. Тры гады назад, у ліпені 1941-га г., часці гэтай дывізіі вялі цяжкія абарончыя баі на подступах да Оршы, стрымліваючы націск танкавых армад Гудэрыяна.

На досвітку 23 чэрвеня 1944 г. войскі 31-й і 11-й гвардзейскіх армій, нацэленых на Оршу, былі гатовыя да наступлення. Ва ўсіх падраздзяленнях зачытваліся звароты ваенных саветаў фронта і армій з заклікам бязлітасна знішчаць ворага. У 6 гадзін 40 хвілін пачалася артылерыйская падрыхтоўка. На працягу 2 гадзін 20 хвілін на пазіцыях нямецкай абароны бушаваў шквал агню. Шчыльнымі разрывамі снарадаў і мін была ахоплена ўся абарона ворага. Над нямецкімі акопамі на дзесяткі метраў стаяла непраглядная сцяна пылу і дыму. За 30 хвілін да канца артпадрыхтоўкі сотні самалётаў завіслі над варожай абаронай, скідваючы на галовы фашыстаў свой смертаносны груз. У 9 гадзін раніцы ўдарныя групоўкі 11-й гвардзейскай і 31-й арміі кінуліся на ворага. Па плану аперацыі яны павінны былі ў першы дзень прарваць тактычную зону абароны праціўніка на глыбіню 15—20 км і да зыходу дня авалодаць усходняй ускраінай г. Дуброўна. Аднак, нягледзячы на мужнасць салдат і афіцэраў, вырашыць гэту задачу войскі не змаглі. Праціўнік быў занадта моцны. Непасрэдна на Аршанскім напрамку 31-й арміі процістаялі часці 78-й і 260-й пяхотных, 25-й матарызаванай фашысцкіх дывізій. 78-я штурмавая дывізія лічылася ў нямецкай арміі адной з лепшых. Гітлер прысвоіў ёй найменне Бадэн-Вюртэмбергскай. Склад яе быў незвычайны: 16 тысяч чалавек, больш за 220 гармат, 154 мінамё-

Аршанцы сустракаюць вызваленцаў. 31-я армія. Чэрвень 1944 г.



Помнік на брацкай магіле савецкіх лётчыкаў у Оршы.

ты, 535 кулямётаў. У дывізію ўваходзіў таксама батальён цяжкіх мінамётаў, дывізіён штурмавых гармат і штурмавы батальён. Акрамя таго, да сярэдзіны чэрвеня 1944 г. яна атрымала на ўзмацненне 48-ы пяхотны полк з 260-й пяхотнай дывізіі, 164-ы мінамётны полк і 667-ю брыгаду штурмавых гармат. Камандаваў дывізіяй генерал-лейтэнант Траўт. Добра ўкамплектаваныя і ўзброеныя былі і іншыя фашысцкія дывізіі.

На працягу першага дня наступлення дывізій 31-й арміі, нягледзячы на высокі наступальны парыў салдат і афіцэраў, многія з якіх нават пасля ранення не пакідалі поля бою, наступаўшыя здолелі авалодаць толькі 1-й і 2-й пазіцыямі галоўнай паласы абароны немцаў, прасунуўшыся наперад на 3—3,5 км. Праціўнік няспынна контратакаваў. Да вечара войскі арміі адбілі дзесяць моцных контратак, у кожнай з якіх удзельнічала да палка пяхоты і да 45 танкаў і штурмавых гармат.

Тым не менш абарона ворага была ў значнай ступені дэзарганізавана. Каб пазбавіць фашысцкае камандаванне магчымасці прывесці свае войскі ў парадак, камандуючы 31-й арміі генерал Глаголеў загадаў працягваць бой ноччу.

На працягу другога і трэцяга дзён наступлення тактычная зона абароны праціўніка была прарвана. Войскі арміі ад зыхода 25 чэрвеня падышлі да Дуброўна і пачалі баі за яго вызваленне. 26 чэрвеня наступаючыя савецкія дывізіі прарвалі 2-ю паласу абароны праціўніка і, праследуючы адыходзячага ворага, няспынна рухаліся да Оршы. Горад быў ператвораны фашыстамі ў моцны вузел абароны. Па ўсходнім беразе Дняпра і вакол горада акупанты ўзвялі шматлікія інжынерныя збудаванні, якія ўключалі некалькі ліній траншэй, злучаных хадамі зносін, доты і дзоты, умацаваныя пазіцыі для артылерыі і танкаў, процітанкавыя рвы і мінныя палі, драцяныя загароды. У самім горадзе кожная вуліца, цагляныя будынкі, руіны прыстасоўваліся для абароны.

Орша, гэты важнейшы чыгуначны вузел Беларусі, быў жыццёва неабходны акупантам. Авалоданне ім адкрывала шлях на захад. Таму фашысты імкнуліся ўтрымаць Оршу любой цаной. Аднак наступленне савецкіх войск, якія дзейнічалі на поўначы ад армій, што былі нацэлены на Оршу, ставіла праціўніка ў выключна цяжкае становішча. 26 чэрвеня 1944 г. быў узяты Віцебск. Скарыстоўваючы брэш, што стварылася ў абароне фашыстаў, 5-я танкавая армія маршала бронетанкавых войск П.А.Ротмістрава імклівым кідком абышла Оршу, авалодала Талачыном, што ў 50 км на паўднёвы захад ад Оршы, і перарэзала аўтамагістраль і чыгунку Масква—Мінск. Усе шляхі да Оршы, акрамя паўднёвага напрамку, былі захоплены савецкімі войскамі. Да чыгуначных і шашэйных дарог, якія злучалі Оршу з Магілёвам, імкліва рухаліся дывізіі 36-га і 113-га стралковых карпусоў 31-й арміі, 192-я і 331-я стралковыя дывізіі 71-га стралковага корпуса і 220-я стралковая дывізія 36-га стралковага корпуса, праследуючы праціўніка.

Каб аблегчыць гэту задачу, патрэбны былі масты цераз Днепр і Аршыцу. У тыл да фашыстаў былі накіраваны невялікія групы савецкіх салдат. Раніцай 26 чэрвеня 1944 г. аддзяленні разведкі 222-га сапёрнага батальёна

Помнік на магіле 2 савецкіх лётчыкаў, прозвішчы якіх не ўстаноўлены. Вёска Рэпухава.

88-й стралковай дывізіі пад камандаваннем старшага сяржанта М.М.Лазькова захапіла мост цераз Аршыцу ў 3 км на паўночны ўсход ад Оршы. Каля поўдня групай салдат пад камандаваннем сяржанта Е.А.Макеева з 381-га сапёрнага батальёна 220-й стралковай дывізіі быў захоплены чыгуначны мост цераз Днепр, падрыхтаваны фашыстамі ад ўзрыву (у канструкцыі моста было закладзена 5300 кг толу). Адбіўшы ўсе спробы фашыстаў вярнуць масты, салдаты ўтрымлівалі іх да падыходу сваіх войск. За рашучасць і адвагу пры захопе і захаванні мастоў старшаму сяржанту М.М.Лазькову, сяржанту Е.А.Макееву і радавому А.С.Юрчанку былі прысвоены званні Герояў Савецкага Саюза.

Каля 20 гадзін вечара 26 чэрвеня 1944 г. стралкі 88-й і 192-й стралковых дывізій 71-га корпуса і танкісты 213-й танкавай брыгады, якія ўзаемадзейнічалі з імі, ушчыльную падышлі да горада з поўначы. Пачаўся штурм Оршы. Пераадолеўшы шалёны агонь і ўпартае супраціўленне ворага, першымі на ўскраіны горада ўварваліся батальёны 752-га стралковага палка палкоўніка Ф.А.Сцебянёва са 192-й дывізіі. Танкісты 213-й танкавай брыгады ўвайшлі ўслед за імі. Пачаліся бязлітасныя баі на гарадскіх вуліцах. На досвітку савецкія стралкі і танкісты захапілі чыгуначную станцыю. Рух вызваліцеляў быў настолькі імклівы, што ўзарваць замініраваны імі чыгуначны мост фашысты не паспелі. На станцыйных пуцях савецкія салдаты знайшлі 20 эшалонаў. Ваенная маёмасць, нарабаванае гітлераўцамі харчаванне, станкі і абсталяванне прадпрыемстваў і іншыя каштоўнасці прызначаліся да адпраўкі ў Германію. Імклівасць прасоўвання савецкіх войск, якія перарэзалі ўсе чыгуначныя пуці з Оршы, пазбавіла фашыстаў магчымасці адправіць цягнікі па прызначэнні. У адным з цягнікоў аказаліся людзі. Амаль 3 тыс. ваеннапалонных і мірных жыхароў, знясіленых голадам і пабоямі, былі выратаваны ад няволі і смерці.

Баі за Оршу працягваліся. Раніцай 27 чэрвеня з поўначы, усходу і паўднёвага ўсходу ў горад уварваліся часці 88-й і 331-й дывізій 71-га корпуса, 173-я і 220-я дывізіі 36-га корпуса. Ламаючы шалёнае супраціўленне фашыстаў, пехацінцы, танкісты і артылерысты расчышчалі ад ворага вуліцу за вуліцай, квартал за кварталам. Ва ўзаемадзеянні з часцямі 36-га гвардзейскага стралковага корпуса 11-й гвардзейскай арміі і 2-га гвардзейскага танкавага корпуса злучэнні 31-й арміі ачысцілі ад акупантаў увесь горад. У той жа дзень, 27 чэрвеня 1944 г., іншыя злучэнні 11-й гвардзейскай і 31-й арміі, працягваючы наступленне ў заходнім напрамку, вызвалілі больш за 200 населеных пунктаў. Аршанскі раён быў ачышчаны ад захопнікаў.

Сярод шматлікіх палонных, якія былі захоплены савецкімі войскамі ў Оршы, былі салдаты і афіцэры гітлераўскіх 14-й і 260-й пяхотных, 25-й матарызаванай і 286-й ахоўнай дывізій і шэрагу асобных часцей. Палонныя генералы і афіцэры на допытах прызнавалі знішчальную моц удараў савецкіх войск, а авалоданне імі Оршай расцэньвалі як рашаючы этап для паспяховага зыходу наступальнай аперацыі.

Вызваленне Оршы мела важнае значэнне для выгнання захопнікаў з усёй тэрыторыі Беларусі. Войскі наступаючых савецкіх армій

выйшлі на аператыўную прастору. Наступленне развівалася нябачнымі раней тэмпамі. 1 ліпеня быў вызвалены Барысаў, 3 ліпеня — сталіца Беларусі Мінск. На працягу 5—11 ліпеня было завершана знішчэнне буйной групоўкі акружаных нямецка-фашысцкіх войск на ўсход ад Мінска. Працягваючы наступленне на захад, савецкія войскі завяршылі вызваленне Беларусі і 20 ліпеня ўступілі на тэрыторыю Польшчы.

У выніку правядзення Беларускай наступальнай аперацыі савецкімі войскамі былі поўнасцю знішчаны 17 дывізій і 3 брыгады праціўніка, а 50 дывізій пазбавіліся больш за палавіну свайго складу. Фашысты страцілі больш за паўмільёна забітымі, параненымі і палоннымі.

За высокае баявое майстэрства, праяўленае ў баях за вызваленне Оршы, 41 воінскай часці і злучэнню было прысвоена ганаровае найменне «Аршанская».

Пры вызваленні горада і раёна савецкія салдаты і афіцэры здзейснілі нямала гераічных подзвігаў, адзначаных у іх ваенных біяграфіях ордэнамі і медалямі. За беззапаветную мужнасць і гераізм у баях на зямлі і ў небе Аршаншчыны 7 чалавек былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза: старшы сяржант М.М.Лазькоў, лейтэнант М.Лефеўр, сяржант Я.А.Макееў, гвардыі лейтэнант С.В.Міт, радавы Ю.В.Смірноў, палкоўнік Ф.А.Сцебянёў, радавы А.С.Юрчанка.

Але герояў было больш. Па-свойму кожны салдат, сяржант, афіцэр і генерал, якія прымалі ўдзел ў баях, быў героем. Наступальныя баі, якія не перапыняліся ні днём ні ноччу, патрабавалі велізарнага напружання ўсіх фізічных і духоўных сіл. Па некалькі сутак без сну, часта галодныя, салдаты ішлі ў агонь, сыходзіліся ў рукапашнай і, ламаючы шалёнае супраціўленне ворага, праяўлялі мужнасць, гераізм і нязломную волю да перамогі.

Аднак было б памылкова думаць, што сіла і мужнасць воінскага духу былі манаполіяй толькі савецкага салдата. І, хоць савецкая гісторыя не захавала прозвішчаў і фактаў пра мужнасць нямецкіх салдат, яны несумненныя. Стрымліваць неверагоднай сілы ўдар праціўніка, які пераўзыходзіў па колькасці асабовага складу ў 7 разоў, артылерыйскіх ствалоў — амаль у 4, мінамётаў — больш чым у 7, танкаў — у 4 разы, авіяцыі — у 5 разоў, маглі толькі салдаты незвычайнай стойкасці духу. Баі ў Оршы, дзе гітлераўцы змагаліся за кожную вуліцу, кожны дом, ужо ведаючы пра безвыходнасць свайго становішча, таксама сведчаць пра стойкасць нямецкага салдата. Падманныя ідэі расавай перавагі і права на панаванне толькі дэфармавалі, але не знішчылі яго гераізму. Замоўчваць пра гэта — значыць прымяншаць сілу яго пераможцы — савецкага салдата.

У.С.Багамазаў.

Дакументы сведчаць

Загад

Вярхоўнага Галоўнакамандуючага генералу арміі Чарняхоўскаму

Войска 3-го Белорусского фронта, развивая наступление, сегодня, 27 июня, в результате стремительного обходного маневра в соединении с фронтальной атакой овладели городом и оперативно важным железнодорожным узлом — Орша — могучим бастионом обороны немцев, прикрывающих Минское направление. В боях за овладение Оршей отличились войска генерал-лейтенанта Галицкого, генерал-лейтенанта Глаголева, генерал-майора Шафранова, генерал-майора Рыжикова, генерал-майора Петерс, генерал-лейтенанта Кошевого, генерал-майора Провалова, генерал-майора Олешева, полковника Колтунова, подполковника Ковалевского, полковника Климахина, генерал-майора Берестова, полковника Полевик, генерал-майора Стриженко, полковника Демина, генерал-майора Бородкина.

Артиллеристы генерал-лейтенанта артиллерии Семенова, генерал-майора артиллерии Попова, генерал-майора артиллерии Белякова, генерал-майора артиллерии Сазонова, полковника Полипенко, полковника Федотова, полковника Хасина, полковника Кий.

Танкисты генерал-майора танковых войск Бурдейного, генерал-майора танковых войск Нецветайло, полковника Бурлыго, полковника Букова, полковника Цынченко, полковника Лупшо, полковника Дагелиса.

Летчики генерал-лейтенанта авиации Белецкого, генерал-лейтенанта авиации Савицкого, генерал-лейтенанта Ушакова, генерал-лейтенанта Горлоченко, генерал-лейтенанта Благовещенского, генерал-майора Захарова, полковника Пруткова, полковника Зимина.

Саперы генерал-майора инженерных войск Зверева, полковника Захарова, подполковника Целишева, майора Кравченко, майора Семенова, полковника Проневича, майора Трояновa, майора Масензона и связисты генерал-майора войск связи Бурова, полковника Давиденко, полковника Болышева.

В ознаменование одержанной победы соединения и части, наиболее отличившиеся в боях за освобождение Орши, представить к присвоению наименования «Оршанских» и к награждению орденами.

Сегодня, 27 июня, в 22 часа, столица нашей Родины Москва от имени Родины салютует доблестным войскам 3-го Белорусского фронта, овладевшим городом Орша, двадцатью артиллерийскими залпами из двухсот двадцати четырех орудий.

За выдающиеся боевые действия объявляю благодарность руководимым Вами войскам, участвовавшим в боях за освобождение Орши.

Вечная слава героям, павшим в боях за свободу и независимость нашей Родины! Смерть немецким захватчикам!

Верховный Главнокомандующий
Маршал Советского Союза И.Сталин.
27 июня 1944 г.

Загад
Вярхоўнага Галоўнакамандуючага № 0182
6 ліпеня 1944 г. г. Масква.

Соединениям и частям III-го Белорусского фронта, отличившимся в боях за овладение городом и оперативно-важным железнодорожным узлом Орша, присвоить наименование «Оршанских» и впредь их именовать:

173 стрелковая Оршанская дивизия
192 стрелковая Оршанская дивизия
220 стрелковая Оршанская дивизия
352 стрелковая Оршанская дивизия
48 зенитная артиллерийская Оршанская дивизия РГК
20 артиллерийская Оршанская дивизия прорыва РГК
43 истребительно-противотанковая артиллерийская Оршанская бригада
14 гвардейская пушечная артиллерийская Оршанская бригада
83 гвардейский гаубичный артиллерийский Оршанский полк РГК
570 корпусной артиллерийский Оршанский полк
120 отдельная танковая Оршанская бригада
213 отдельная танковая Оршанская бригада
63 отдельный гвардейский танковый Оршанский полк прорыва
926 самоходный артиллерийский Оршанский полк
1435 самоходный артиллерийский Оршанский полк
1445 самоходный артиллерийский Оршанский полк
2 истребительный авиационный Оршанский корпус
4 гвардейская истребительная авиационная Оршанская дивизия
5 гвардейская бомбардировочная авиационная Оршанская дивизия
2 гвардейский истребительный авиационный Оршанский Краснознаменный полк
15 истребительный авиационный Оршанский полк
17 ночной бомбардировочный авиационный Оршанский полк
64 гвардейский истребительный авиационный Оршанский Краснознаменный полк
65 гвардейский истребительный авиационный Оршанский Краснознаменный полк
89 гвардейский истребительный авиационный Оршанский полк
115 гвардейский истребительный авиационный Оршанский полк
133 гвардейский истребительный авиационный Оршанский полк
154 гвардейский штурмовой авиационный Оршанский полк
621 штурмовой авиационный Оршанский полк
274 истребительный авиационный Оршанский полк
523 истребительный авиационный Оршанский полк
900 истребительный авиационный Оршанский полк
948 штурмовой авиационный Оршанский полк
952 штурмовой авиационный Оршанский полк
36 отдельный Оршанский Краснознаменный полк связи

1 отдельный гвардейский Оршанский полк связи
92 отдельный Оршанский полк связи
375 отдельный Оршанский радиодивизион
412 отдельный линейный Оршанский батальон связи
433 отдельный линейный Оршанский батальон связи
31 инженерно-саперная Оршанская бригада

Крылатыя дзяўчаты

14 кастрычніка 1943 года. Ужо некалькі дзён запар 125-ы жаночы авіяцыйны полк робіць налёты на абарончыя ўмацаванні праціўніка на ўсходняй ускраіне Оршы. Фашысты, кінуўшы ў бой новыя рэзервы, спрабавалі прыпыніць наша наступленне на Аршанска-Віцебскім напрамку. Зенітная артылерыя ворага вяла суцэльны загараджальны агонь, у небе баражыравалі некалькі груп нямецкіх знішчальнікаў.

Калона савецкіх бамбардзіроўшчыкаў усё ж дасягнула мэты. Але ў апошні момант самалёт камандзіра звяна гвардыі лейтэнанта Губінай быў падбіты: правы матор выйшаў са строю. Па-майстэрску пілатуючы на адным маторы, Любоў Губіна вывела самалёт на цэль і скінула ўвесь бомбавы груз. Але самалёт адстаў ад строю. Лётчыцы яе звяна Ірына Асадзе і Ганна Язоўская не кінулі свайго камандзіра ў бядзе і, прыкрываючы падбітую машыну, узялі курс да свайго аэрадрома.

Нашы бамбардзіроўшчыкі пайшлі на ўсход, прыкрываючы галаву калоны. І вось нямецкія сцярвятнікі кінуліся на адстаючае звяно. Бамбардзіроўшчыкі прынялі няроўны бой з ворагам. Штурманы і стралкі-радысты адкрылі моцны кулямётны агонь па «Фоке-Вульф-190». Але ў гэты момант прамым пападаннем былі забіты Ганна Язоўская і яе штурман Алена Панамарова. Самалёт Язоўскай загарэўся і рэзка пайшоў уніз. Стралок-радыст паспела выскачыць з ахопленага полымем самалёта і ўдала прызямлілася.

Тады немцы пачалі атакаваць самалёт Ірыны Асадзе. Яе штурман Валянціна Волкава, параненая, працягвала весці агонь з кулямёта. Толькі з другога заходу фашысты падпалілі гэты самалёт. Да апошняй мінуты Ірына Асадзе не пакідала свайго камандзіра, ідучы з ёю побач на палаючым самалёце. А калі ўспыхнула кабіна і агонь пачаў абпальваць твар і рукі, лётчыца загадала экіпажу пакінуць самалёт. Волкава, знясіленая ад страты крыві, не змагла адкрыць каўпак кабіны. Ірына Асадзе сарвала каўпак, выключыла маторы і, перавёўшы самалёт на пікіраванне, выштурхнула Валянціну Волкаву, а потым выскачыла з самалёта сама.

Любоў Губіна засталася адна. Немцы сталі ва ўпор расстрэльваць безабаронную машыну. Кабіну завалакло густым дымам. Губіна загадала экіпажу пакінуць самалёт. Стралок-радыстка Амельчанка ўдала скокнула. Штурман Братухіна лямкай парашута зачапілася за турэль кулямёта. Моцны паток паветра прыціснуў яе да кабіны. Калі да зямлі заставалася каля 500 метраў, Губіна ўбачыла за бортам сяброўку. Не думаючы пра сябе, Любоў Губіна рэзка нахіліла самалёт убок. Моцным патокам паветра штурмана адарвала ад кабіны, і на вышыні 150—200 м яна адкрыла парашут. Калі купал парашута напоўніўся паветрам, Братухіна з жалем на сэрцы ўбачыла, як самалёт камандзіра ўрэзаўся ў зямлю...

Высакародны ўчынак Любові Губінай скалыхнуў увесь авіяцыйны полк. Жыхары вёскі Іванёва Смаленскай вобл., якія бачылі бой бамбардзіроўшчыка Губінай з праціўнікам, выслухаўшы расказ Кацярыны Братухінай, вырашылі перайменаваць сваё сяло і назваць яго Губіна. Загадам па авіяцыйным корпусе адважныя лётчыцы Любоў Губіна, Ганна Язоўская, Алена Панамарова навечна занесены ў спісы 125-га жаночага палка.

Б.Ф.Шалуха.

Імёны савецкіх лётчыкаў сталі вядомы

У ноч з 24 на 25 чэрвеня 1943 г. не вярнуўся з баявога задання экіпаж 20-га гвардзейскага авіяцыйнага палка далёкага дзеяння. Фашысцкія зеніткі збілі савецкі бамбардзіроўшчык, і ён упаў на полі паблізу горада. Усе члены экіпажа загінулі. Іх прозвішчы ўстаноўлены ў пачатку 1990-х гадоў маладзёжна-пошукавым клубам «Русічы». Вось яны: камандзір гвардыі лейтэнант Аляксандр Абрамавіч Цаліб'еў, н. ў 1916 г., ураджэнец с. Канадзей Нікалаеўскага раёна Ульянаўскай вобласці; штурман — гвардыі мал. лейтэнант Міхаіл Піліпавіч Цэлік, н. ў 1920 г., ураджэнец с. Яўлена-Пакроўскае Паўлаградскага раёна Омскай вобласці; паветраны стралок-радыст — гвардыі ст. сяржант Васіль Андрэевіч Шаклін, н. ў 1919 г., ураджэнец в. Шухарды Кіраўскай вобласці. Дзякуючы пошукавай рабоце ў г. Сызрань Куйбышаўскай (цяпер Самарскай) вобласці была знойдзена жонка загінуўшага камандзіра Ніна Паўлаўна Цаліб'ева.

У 1995 г. на ўшанаванне памяці загінуўшых савецкіх лётчыкаў гарвыканком прыняў пастанову назваць адну з вуліц у Оршы паблізу метэастанцыі, побач з месцам гібелі экіпажа, імем А.Цаліб'ева, а дзве другія, што яе перасякаюць, — імёнамі членаў яго экіпажа.

В.П.Лютынскі.

Яны вызвалялі Аршаншчыну

ЗАХАРАЎ Георгій Няфёдавіч. Герой Савецкага Саюза (19.4.1945). Нарадзіўся 24.4.1908 г. ў с. Старое Сямёнкіна Кляўлінскага раёна Самарскай вобласці. Генерал-маёр авіяцыі (1940). У Чырвонай Арміі з 1930 г. У 1933 г. скончыў Сталінградскую ваенную школу лётчыкаў, у 1939 г. — курсы пры Ваеннай акадэміі Генштаба, у 1950 г. — акадэмію Генштаба. У 1936—37 гг. удзельнік нацыянальна-рэвалюцыйнай вайны ў Іспаніі, у 1937—38 гг. — нацыянальна-вызваленчай вайны ў Кітаі. З 1941 г. на Заходнім, 3-м Беларускім франтах. Камандзір знішчальнай авіядывізіі, у склад якой уваходзіў французскі полк «Нармандыя—Нёман». Захараў вызначыўся пры вызваленні Віцебска, Оршы, Мінска, Гродна. На працягу вайны зрабіў 153 баявыя вылеты, удзельнічаў у 48 паветраных баях, асабіста збіў 10 варожых самалётаў, з іх 2 над Мінскам. Да 1961 г. ў Савецкай Арміі. Віцэ-прэзідэнт таварыства «СССР—Францыя». Аўтар кніг «Аповесці аб знішчальніках» (1977), «Я — знішчальнік» (1985) і інш. Памёр 6.1.1996 г.

КАТЛЯР Феадосій Парфір'евіч. Герой Савецкага Саюза (1945). Нарадзіўся 27.8.1904 г. ў г. Вяземскі Хабараўскага краю. Генерал-лейтэнант авіяцыі (1958). У Чырвонай Арміі з 1926 г. Скончыў ваенныя акадэміі імя Фрунзе (1938), Генштаба (1950). Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г., савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. З чэрвеня 1941 г. на Паўднёвым, Паўднёва-Заходнім, Варонежскім, Данскім, Паўночна-Каўказскім, Заходнім, 3-м Беларускім, 1-м і 2-м Прыбалтыйскім франтах. Камандзір бамбардзіровачнай авіядывізіі генерал-маёр Катляр зрабіў 118 баявых вылетаў. Дывізія пад яго камандаваннем вызначылася ў баях пад Віцебскам, Оршай, Барысавам, Мінскам і на Вільнюскім напрамку. Да 1960 г. ў Савецкай Арміі. Памёр 15.9.1980 г.

КРЭЙЗЕР Якаў Рыгоравіч. Герой Савецкага Саюза (22.7.1941). Нарадзіўся 4.11.1905 г. ў г. Варонеж. Генерал арміі (1962). Да прызыву ў Чырвоную Армію працаваў на будаўніцтве дарог. У Чырвонай Арміі з 1921 г. Скончыў паскораны курс Ваеннай акадэміі Генштаба (1941). З чэрвеня 1941 г. на Заходнім, Бранскім, Сталінградскім, Паўднёвым, 4-м Украінскім, Ленінградскім, 1-м і 2-м Прыбалтыйскім франтах: камандзір дывізіі, намеснік камандуючага, камандуючы арміямі. Вызначыўся ў ліпені 1941 г. ў абарончых баях за Барысаў і Оршу. Пад яго камандаваннем 1-я Маскоўская мотастралковая дывізія на 2 сутак затрымала наступленне праціўніка на Бярэзіне, на некалькі сутак — у напрамку р. Дняпро. У ліпені 1944 г. войскі 51-й арміі пад яго камандаваннем удзельнічалі ў баях каля Полацка. Пасля вайны камандаваў войскамі ваенных акруг, быў начальні-

М.Лефеўр.

Я.А.Макееў.

кам курсаў «Выстрал». У 1962—66 гг. дэпутат ВС СССР. Памёр 29.11.1969 г.

ЛАЗЬКОЎ Мікалай Міхайлавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 19.2.1924 г. ў в. Бярозаўка Багародзіцкага раёна Тульскай вобласці. У Чырвонай Арміі і на фронце з 1942 г., камандзір аддзялення ўзвода інжынернай разведкі 222-га асобнага сапёрнага батальёна 88-й стралковай дывізіі 31-й арміі 3-га Беларускага фронту. Вызначыўся пры вызваленні Віцебскай вобласці. У час падрыхтоўкі Беларускай аперацыі са студзеня да 23.6.1944 г. з групай сапёраў удзельнічаў у 96 начных пошуках і зняў 586 мін. У баях пад Оршай арганізаваў абарону моста цераз р. Аршыца. Пасля вайны служыў у Савецкай Арміі, з 1973 г. палкоўнік у запасе.

ЛЕФЕЎР (Lefevre) Марсель. Герой Савецкага Саюза (4.6.1945). Нарадзіўся 17.3.1918 г. ў Нарманды, Францыя. Заслужаны лётчык Францыі. Скончыў лётную школу. З 1938 г. ў арміі. З 1941 г. ў радах «Змагарнай Францыі», удзельнічаў у баях супраць гітлераўцаў. З 28.11.1942 г. ў СССР у складзе авіяэскадрыллі «Нармандыя» (пазней авіяполк «Нармандыя—Нёман»). На фронце з сакавіка 1943 г.: лётчык-інструктар, камандзір эскадрыллі. Старшы лейтэнант Лефеўр удзельнік Віцебска-Аршанскай, Усходне-Прускай, Кёнігсбергскай аперацый. Зрабіў 105 баявых вылетаў, правёў 30 паветраных баёў, збіў 11 самалётаў праціўніка. У адным з баёў самалёт Лефеўра загарэўся, але лётчык давёў яго да свайго аэрадрома. Ад цяжкіх апёкаў памёр 5.6.1944 г. ў Маскве. Навечна залічаны ў спіс эскадрыллі знішчальнага авіяпалка. Яго імем названа вуліца ў г. Лез-Андэлі ў Нарманды.

МАКЕЕЎ Ягор Абрамавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 7.12.1922 г. ў в. Ліхачова Пачынкаўскага раёна Смаленскай вобласці. У Чырвонай Арміі і на фронце з 1941 г.: сяржант, камандзір аддзялення сапёрнага батальёна 220-й стралковай дывізіі 31-й арміі 3-га Беларускага фронту. Вызначыўся ў Беларускай аперацыі. 27.6.1944 г. ў складзе групы мінёраў падпоўз да чыгуначнага моста цераз р. Дняпро каля Оршы, знішчыў варожых салдат, якія яго мініравалі. Разам з радавым А.С.Юрчанкам абясшкодзіў выбуховы зарад і ўтрымліваў мост да прыходу савецкіх войск. На месцы подзвігу мінёраў пастаўлены памятны знак. З 1946 па 1949 г. Макееў працаваў старшынёй калгаса на радзіме, пасля горным майстрам у Данбасе. Памёр 11.6.1957 г. Яго імем названа Старынкаўская васьмігадовая школа ў Пачынкаўскім раёне.

МАЛЫШАЎ Пётр Фёдаравіч. Нарадзіўся 28.8.1898 г. ў в. Селязнёва Пераслаўскага р-на Яраслаўскай вобл. Генерал-лейтэнант (1943). Удзельнік грамадзянскай вайны. Скончыў курсы «Выстрал» (1923, 1930), Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1935). У Вялікую Айчынную вайну на Заходнім, Бранскім, Ленінградскім, 1-м і 2-м Прыбалтыйскім франтах: камандзір стралковай дывізіі, намеснік камандуючага, са снежня 1943 г. камандуючы 4-й ударнай арміяй. Удзельнічаў у Гарадоцкай, Віцебска-Аршанскай, Полацкай, Мінскай і іншых аперацыях. Войскі пад яго камандаваннем вызначыліся пры вызваленні Гарадка, Полацка і інш. Да 1959 г. на камандных пасадах у Савецкай Арміі. Памёр 10.12.1972 г.

МІТ Сяргей Міхайлавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 9.6.1909 г. ў в. Чарняцова Наўгародскай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з чэрвеня 1941 г.: лейтэнант, камандзір узвода 4-й гвардзейскай танкавай брыгады 2-га танкавага корпуса 31-й арміі 3-га Беларускага фронту. Вызначыўся ў баі за пераправу цераз р. Адроў у раёне в. Засеклі (Аршанскі раён). 26.6.1944 г. ўзвод пад яго камандаваннем прарваў абарону праціўніка, знішчыў 2 процітанкавыя гарматы, 5 самаходных штурмавых установак, 1 танк і некалькі дзесяткаў фашыстаў. Свой падбіты і ахоплены агнём танк накіраваў на варожую пераправу, прымусіў уцякаць праціўніка. Каб не перашкаджаць руху ўзвода, загадаў адвесці танк убок, дзе ён узарваўся. С.М.Міт згарэў у тан-

ку разам з экіпажам, але пасадзейнічаў паспяховаму наступленню савецкіх войск. Пахаваны ў в. Смаляны Аршанскага раёна.

ПЕТУШКОЎ Аляксей Свірыдавіч. Герой Савецкага Саюза. Нарадзіўся 18.10.1913 г. ў г. Лісічанск Варашылаўградскай вобласці. У 1930—33 гг. працаваў токарам на заводзе «Энергія» ў Мінску. У 1936 г. скончыў Сталінградскую ваенную школу лётчыкаў, у 1956 г. — Ваенную акадэмію Генштаба. На фронце з 1941 г.: падпалкоўнік, намеснік камандзіра авіяпалка далёкага дзеяння. З 1941 г. па красавік 1944 г. зрабіў 265 баявых вылетаў на варожыя аб'екты ў Варонежы, Курску, Арле, Харкаве, Кіеве, Мінску, Таліне, Нарве, Пскове, Оршы, Кёнігсбергу, Бухарэсце, Данцыгу, Будапешце, Берліне. Пасля вайны ў Савецкай Арміі. З 1959 г. палкоўнік у запасе. Да 1977 г. на адміністратыўнай рабоце.

ПЕТЭРС Георгій Барысавіч. Герой Савецкага Саюза (5.5.1945). Нарадзіўся 27.7.1897 г. ў Маскве. Генерал-маёр (1943). З сям'і служачых. У Чырвонай Арміі з 1918 г. Удзельнік грамадзянскай вайны. У 1924 г. скончыў Ваенна-інжынерную школу імя Камінтэрна, у 1929 г. — Ваенную акадэмію імя Фрунзе. На фронце з 1941 г.: камандзір стралковай дывізіі. Вызначыўся ў Беларускай аперацыі 1944 г. Дывізія пад яго камандаваннем прарвала абарону праціўніка на Аршанскім напрамку і 27.6.1944 г. першая ўвайшла ў Оршу; у ліпені 1944 г. фарсіравала Нёман, захапіла плацдарм, на якім адбіла 30 контратак пяхоты і танкаў праціўніка. Да 1959 г. ў Савецкай Арміі. Памёр 18.5.1978 г.

СМІРНОЎ Юрый Васілевіч. Герой Савецкага Саюза (6.10.1944). Нарадзіўся 2.9.1925 г. ў в. Дзешукова Макар'еўскага раёна Кастрамской вобласці. На фронце са студзеня 1943 г.: стралок 77-га гвардзейскага стралковага палка 26-й стралковай дывізіі 11-й гвардзейскай арміі 3-га Беларускага фронту. Удзельнік баёў на Беларусі. Вызначыўся пры прарыве варожай абароны на Пн ад Оршы. 24.6.1944 г. ў складзе танкавага дэсанта прарваўся ў тыл ворага каля в. Шалашына Аршанскага раёна. У начным баі быў цяжка паранены і захоплены ў палон. Нягледзячы на жорсткія катаванні, ён не выдаў ворагу ваенную тайны. 25.6.1944 г., нічога не дабіўшыся, фашысты распялі яго. Пахаваны ў г.п. Арэхаўск. Навечна залічаны ў спісы 1-й роты

С.М.Міт.

гвардзейскага стралковага палка. У в. Шалашына, на месцы расправы гітлераўцаў з патрыётам, а таксама ў г.п. Арэхаўск і цэнтры саўгаса імя Смірнова (в. Буда) Дубровенскага раёна пастаўлены помнікі. Яго імем названы вуліцы ў Мінску, Кастраме, Макар'еве Кастрамской вобласці.

СЦЕБЯНЕЎ Фёдар Аляксандравіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 3.10.1899 г. ў в. Падсосенне Верхаважскага раёна Валагодскай вобласці. У 1922 г. скончыў Сімферопальскія пяхотныя камандныя курсы. У Чырвонай Арміі з 1919 г. У грамадзянскую вайну на Заходнім, Паўднёвым франтах, пад Петраградам. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. на фронце:

Мемарыяльная дошка ў гонар вызваліцеляў на будынку школы ў в. Роскі-Сялец.

Піянеры каля магілы Ю.Смірнова. 1987 г.

палкоўнік, камандзір 753-га стралковага палка 192-й стралковай дывізіі 31-й арміі 3-га Беларускага фронту. Вызначыўся ў Беларускай аперацыі ў ноч на 27.6.1944 г. Полк пад яго камандаваннем у ліку першых уварваўся ў Оршу і захапіў чыгуначную станцыю Орша-Заходняя, нанёс праціўніку вялікія страты. 1—3.7.1944 г. ўдзельнічаў у вызваленні Барысава і Мінска, 14.7.1944 г. адзін з першых у дывізіі фарсіраваў Нёман на поўнач ад г. Гродна і захапіў плацдарм. Ф.А.Сцебянеў — удзельнік баёў ва Усходняй Прусіі, за Кёнігсберг, у Маньчжурыі. Пасля вайны старшыня і намеснік старшыні Маскоўскага камітэта ДТСААФ, інспектар ЦК ДТСААФ. Памёр 8.2.1971 г. Яго імем названа вуліца ў Мінску.

ФЕШЧАНКА Пётр Васілевіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 3.7.1922 г. ў с. Прышыб Крамянчугскага раёна Палтаўскай вобласці. Генерал-маёр (1965). У Чырвонай Арміі са жніўня 1940 г. У 1941 г. скончыў 2-е Саратаўскае танкавае вучылішча, у 1950 г. — Харкаўскі педагагічны інстытут. На фронце са жніўня 1941 г.: капітан, камандзір танкавага батальёна. Вызначыўся ў баях за вызваленне Віцебскай вобласці. 25—27.6.1944 г. танкавы батальён

пад яго камандаваннем адбіваў контратакі ворага каля в. Смаляны Аршанскага раёна і чыгуначнай ст. Талачын, перарэзаў гітлераўцам шлях да адступлення на шашы і чыгунцы Орша—Мінск, захапіў 7 эшалонаў з грузам, 15 самаходных гармат, 3 процітанкавыя батарэі, 40 бронетранспарцёраў, што садзейнічала поспеху ў наступленні танкавай брыгады. У 1947—61 гг. на партыйнай рабоце, з 1961 г. ў органах КДБ і МУС на Украіне.

З артыкула ў газеце

...На Аршаншчыне Пятра Фешчанку ведаюць як аднаго з гераічных удзельнікаў вызвалення вёскі Смаляны летам 1944 года.

Быў чэрвень. Баі грымелі па ўсёй лініі фронту. Танкавы батальён пад камандаваннем капітана Фешчанкі дзейнічаў у авангардзе брыгады. Танкісты паспяхова прасоўваліся наперад, а камандаванне ставіла ўсё новыя задачы. Батальёну было загадана прарвацца ў тыл ворага і захапіць вёску Смаляны. Гэтым адразаўся б праціўніку шлях да адыходу.

Але нечакана каля Смалян батальён наткнуўся на танкавую засаду праціўніка. Спыніцца і завязаць адкрыты бой? «Не, нельга, — вырашыў камандзір. — Гэта можа перашкодзіць выкананню задання». Ён пакідае адзін узвод, які завязаў бой з ворагам, а галоўнымі сіламі абышоў засаду. Потым батальён атакаваў варожую калону, расчляніў яе. Праціўнік у паніцы пачаў адступаць па аўтастрадзе. Танкі гвардыі капітана Фешчанкі пачалі праследаванне.

Батальён захапіў Смаляны і рушыў далей, каб перарэзаць дарогу і перакрыць ворагу шлях да адступлення. Танкісты ўтрымлівалі дарогу да падыходу асноўных сіл брыгады. У гэтым дзёрзкім рэйдзе было знішчана 15 самаходных гармат, 2 процітанкавыя батарэі, 40 бронетранспарцёраў. Больш за 2000 салдат і афіцэраў праціўніка здаліся ў палон.

Працягваючы вызваленне беларускай зямлі, камандзір танкавага батальёна Фешчанка вызначыўся ў баі за пасёлак Коханава, а ў складзе 19-й гвардзейскай танкавай брыгады — у баях за сталіцу Беларусі. Пётр Васілевіч Фешчанка за мужнасць і адвагу ў баях пад вёскай Смаляны атрымаў званне Героя Савецкага Саюза. Пасля перамогі яго мірная праца адзначана ордэнам Леніна.

Ленінскі прызыў. 1981. 28 лістапада.

ЮРЧАНКА Антон Сцяпанавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 17.1.1923 г. ў с. Чарныш Чарнігаўскай вобласці. З сялян. У Чырвонай Арміі з верасня 1943 г., на фронце з мая 1944 г.: мінёр 381-га асобнага сапёрнага батальёна 220-й стралковай дывізіі 31-й арміі 3-га Беларускага фронту. Вызначыўся ў Беларускай аперацыі. 27.6.1944 г. ў складзе групы мінёраў удзельнічаў у захопе чыгуначнага моста цераз р. Дняпро. У баях за авалоданне і ўтрыманне моста праявіў храбрасць, мужнасць і гераізм. Разам з сяржантам Я.А.Макеевым пад агнём праціўніка знішчыў ахову (10 гітлераўскіх салдат), прарваўся на мост і перарэзаў правады, якія злучалі толавы зарад з выбуховым устройствам. На месцы подзвігу мінёраў памятны знак. У 1946—52 гг. і з мая 1974 г. А.С.Юрчанка старшыня Чарнышэўскага сельсавета, у 1955—64 гг. галоўны аграном калгаса ў родным сяле.

ЯКУБОЎСКІ Іван Ігнатавіч. Двойчы Герой Савецкага Саюза (10.1.1944 і 29.3.1944). Нарадзіўся 7.1.1912 г. ў в. Зайцава Горацкага раёна Магілёўскай вобласці. Маршал Савецкага Саюза (1967), Герой ЧССР (1970). З сялян. У 1930—32 гг. вучыўся ў Аршанскім педагагічным вучылішчы, у 1934 г. скончыў Аб'яднаную Беларускую ваенную школу імя ЦВК БССР, у 1948 г. — Ваенную акадэмію Генштаба. У Чырвонай Арміі з 1932 г. Камандаваў узводам, танкавай ротай, быў начальнікам штаба асобнага танкавага батальёна, выкладчыкам у ваенным вучылішчы, камандзірам вучэбнага танкавага батальёна. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г., савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на Заходнім, паўднёвым, Паўднёва-Заходнім, Сталінградскім, Данскім, Бранскім, Цэнтральным, Варонежскім і 1-м Украінскім франтах: камандзір танкавага батальёна, палка, намеснік камандзіра і камандзір танкавай брыгады, намеснік камандзіра танкавага корпуса. Удзельнік абарончых баёў пад Мінскам, Магілёвам, Тулай, Харкавам, Варонежам, Сталінградскай і Курскай бітваў, вызвалення Украіны, Польшчы, Львоўска-Сандамірскай, Вісла-Одэрскай, Ніжне- і Верхнесілезскай, Берлінскай і Пражскай аперацый. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра і Віслы, вызваленні Кіева і г. Фастаў Кіеўскай вобласці, захопе Сандамірскага плацдарма.

А.С.Юрчанка.

М.І.Альхоўскі.

Пасля вайны на камандных пасадах у Савецкай Арміі. З ліпеня 1957 г. 1-ы намеснік Галоўнакамандуючага і Галоўнакамандуючы Групай савецкіх войск у Германіі. Са студзеня 1965 г. па красавік 1967 г. камандуючы войск Кіеўскай ваеннай акругі, з красавіка 1967 г. першы намеснік міністра абароны СССР, з ліпеня 1967 г. адначасова Галоўнакамандуючы Аб'яднанымі Узброенымі Сіламі краін Варшаўскага Дагавора. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР з 1962 г. Ганаровы грамадзянін гарадоў Жытомір, Калач, Аполе (ПНР). Памёр 30.11.1976 г. Бюст І.І.Якубоўскага ўстаноўлены ў г. Горкі Магілёўскай вобласці. На будынку Аршанскага педагагічнага вучылішча, дзе ён вучыўся, мемарыяльная дошка. Яго імем названы Кіеўскае вышэйшае танкавае інжынернае вучылішча, вуліцы ў Асіповічах, г.п. Бялынічы, у Магілёве, Мінску, Горках — вуліца, завулак, плошча і сквер.

Героі Савецкага Саюза — аршанцы

АЛЬХОЎСКІ Мікалай Іванавіч. Герой Савецкага Саюза (4.2.1944). Нарадзіўся 10.10.1939 г. ў в. Межава Аршанскага раёна. У 1936 г. скончыў Ваенна-паветраную акадэмію імя Жукоўскага. У Чырвонай Арміі з 1927 г. У Вялікую Айчынную вайну з лютага 1943 г. на Бранскім, Варонежскім, Сцяпным, 2-м Украінскім франтах. Удзельнік баёў на Курскай дузе, вызвалення Украіны, Малдавіі, Румыніі, Венгрыі, Чэхаславакіі. Камандзір эскадрыллі знішчальнікаў авіяпалка, маёр. Зрабіў 128 баявых вылетаў, удзельнічаў у 34 паветраных баях, знішчыў 19 самалётаў праціўніка. Да 1953 г. ў Савецкай Арміі, падпалкоўнік. Пазней жыў і працаваў у Маскве. Памёр 26.8.1978 г.

ДУДЧЫК Павел Андрэевіч. Герой Савецкага Саюза (29.6.1945). Нарадзіўся 12.7.1918 г. ў в. Казённыя Паршні Аршанскага раёна. У Чырвонай Арміі з 1938 г. У 1942 г. скончыў Бранскае ваенна-палітычнае вучылішча, у 1950 г. — Вышэйшую афіцэрскую артылерыйскую школу. У Вялікую Айчынную вайну з мая 1942 г. на Калінінскім, Паўночна-Заходнім, 2-м Прыбалтыйскім, 1-м і 4-м Украінскім франтах. Вызначыўся ў баях пад г. Ліепая і за в. Берзі (Добельскі раён, Латвія) у снежні 1944 г.: артылерыйская батарэя пад камандаваннем капітана Дудчыка за 6 гадзін адбіла 11 варожых контратак, знішчыла каля 200 гітлераўцаў, падбіла 8 танкаў і прымусіла ворага адступіць. Да 1959 г. ў Савецкай Арміі, палкоўнік. Працаваў на Мінскім аўтазаводзе. Памёр 17.4.1994 г.

ЗАВАДСКІ Уладзімір Георгіевіч. Герой Савецкага Саюза (26.10.1944). Нарадзіўся 13.1.1919 г. ў Оршы. У 1940 г. скончыў Энгельскае ваенна-авіяцыйнае вучылішча, у 1976 г. — Харкаўскі інжынерна-эканамічны інстытут. У Чырвонай Арміі з 1939 г. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. на Заходнім, Сцяпным, 2-м Украінскім франтах у бамбардзіровачнай і разведвальнай авіяцыі. Удзельнік Маскоўскай, Курскай бітваў, вызвалення Украіны, Румыніі, Венгрыі, Аўстрыі, Чэхаславакіі, зрабіў 152 баявыя вылеты, у тым ліку 115 на разведку войска і глыбокіх тылоў ворага. Да 1956 г. ў Савецкай Арміі, маёр, да 1985 г. працаваў на машынабудаўнічым заводзе. Памёр 20.6.1992 г.

З артыкула ў газеце

...Уладзімір Георгіевіч неаднаразова перасякаў лінію фронту і скідваў бомбы на фашысцкіх бандытаў. За абарону Масквы ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага сцяга і медалём «За адвагу».

Асабліва праявіў сябе У.Завадскі ў час фарсіравання нашымі войскамі Дняпра. Быў такі выпадак. Выканаўшы баявую задачу, пілот вяртаўся на свой аэрадром, але вымушаны быў уступіць у сутычку з дзевяццю самалётамі праціўніка. Завязаўся няроўны бой. Ворагу ўдалося падпаліць самалёт Завадскага. Аднак лётчык умела давёў падбітую машыну да размяшчэння нашых войск. Ён даў магчымасць экіпажу пакінуць палаючы самалёт і апошнім выскачыў сам.

А вось яшчэ выпадак, які характарызуе У.Завадскага як умелага і адважнага лётчыка. Было гэта 8 сакавіка 1944 года ў раёне Умані на Украіне. Камандаванне паставіла задачу тэрмінова разведаць размяшчэнне сіл праціўніка. Надвор'е было нялётнае: моцны вецер гнаў густыя снежныя хмары. Бачнасць дрэнная, у паветры ніводнага самалёта. Камандзір авіячасці даручыў выкананне задачы менавіта Завадскаму, хаця прасіліся многія іншыя лётчыкі. Не марудзячы ні мінуты, пілот узняўся з палявога аэрадрома. Вецер кідаў машыну з боку ў бок, але лётчык моцна трымаў штурвал у руках. Калі ён знізіўся да брыючага палёту, зрабіў разведку і аэрафотаздымку. Праціўнік адкрыў кулямётны і артылерыйскі абстрэл, аднак гэта не спалохала смельчака. На зваротным шляху У.Завадскі двойчы атакаваў калону фашыстаў. Каштоўныя звесткі, якія ён здабыў, дапамаглі камандаванню раскрыць задумы ворага. За праяўленую ў баях мужнасць на 2-м Украінскім фронце У.Г.Завадскі быў узнагароджаны яшчэ адным ордэнам Чырвонага Сцяга і ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

...Байцы і камандзіры часці, у якой служыў У.Г.Завадскі, у пісьме да бацькоў герояў — Георгія Фёдаравіча і Настассі Яўсееўны пісалі: «У асобе вашага сына мы маем не толькі выдатнага лётчыка, але і шчырага сябра і таварыша. Ён з'яўляецца ўсеагульным любімцам і заслужана карыстаецца нашай глыбокай павагай і любоўю. У ім мы бачым воіна-волата, які памнажае славу савецкага народа і яго Узброеных Сіл...»

Л.Чванаў.

Ленінскі прызыў. 1963. 7 лістапада.

КАНАВАЛЕНКА Уладзімір Ануфрыевіч. Герой Савецкага Саюза (16.10.1943). Нарадзіўся 22.4.1917 г. ў г. Санкт-Пецярбург. У 1933 г. скончыў Аршанскі чыгуначны тэхнікум, у 1941 г. — Сухумскае ваеннае пяхотнае вучылішча. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1942 г. Удзельнік Сталінградскай і Курскай бітваў. Вызначыўся ў 1943 г. пры вызваленні Чарнігаўшчыны і Палесся: стралковы полк пад яго камандаваннем пераадолеў мінныя палі і першы фарсіраваў р. Сейм, авалодаў чыгуначнай ст. Бахмач, фарсіраваў Дзясну, Дняпро, Прыпяць. 23 верасня 1943 г. полк адбіў 8 контратак, знішчыў шмат жывой сілы і тэхнікі праціўніка. Памёр ад ран у баі 22.3.1944 г. Пахаваны ў г. Жмерынка Вінніцкай вобласці. Яго імем названа сярэдняя школа ў в. Замасточча Віцебскага раёна, дзе ён вучыўся. На будынку школы ўстаноўлена мемарыяльная дошка.



У.Г.Завадскі.

КАРНАЧОНАК Мікалай Аляксандравіч. Герой Савецкага Саюза (23.11.1942). Нарадзіўся ў 1922 г. ў в. Баркі 1-я Шклоўскага р-на. Працаваў майстрам на Аршанскім мясакансервавым камбінаце. Скончыў аэраклуб у Оршы і Адэскае авіяцыйнае вучылішча. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на Паўднёва-Заходнім і Сталінградскім франтах, лейтэнант, камандзір звяна знішчальнага авіяпалка. Зрабіў 349 баявых вылетаў, збіў 10 варожых самалётаў. Загінуў у баі 22.9.1942 г. Яго імем названы вуліцы ў Оршы, Шклове, Аршанскі мясакансервавы камбінат, на тэрыторыі якога пастаўлены бюст героя.

Шлях героя

Гэта было ў даваенныя гады. На Аршанскі мясакансервавы камбінат прыйшоў працаваць вясковы хлопчык Коля Карначонак, які толькі што скончыў сямігадовую школу. Было яму ўсяго 14 гадоў. Колю прыцягваў горад

тым, што там быў аэраклуб, а ён з ранняга дзяцінства марыў стаць лётчыкам.

Прайшоў некаторы час, і юнак пачаў вучыцца лётнай справе. Праз некалькі гадоў камсамольская арганізацыя камбіната накіравала яго ў Адэскае авіяцыйнае вучылішча. У 1940 г. выпускніку вучылішча ваеннаму пілоту Мікалаю Аляксандравічу Карначонку было прысвоена званне малодшага лейтэнанта.

Пачалася Вялікая Айчынная вайна. У засценках гестапа за сувязь з партызанамі загінула маці Мікалая Ксенія Савельеўна.

Не ведаючы стомы, не шкадуючы сіл, Карначонак знішчаў фашысцкіх мярзотнікаў на зямлі і ў паветры. З ліпеня 1941 г. ён зрабіў 349 баявых вылетаў, збіў у паветраных баях 10 самалётаў праціўніка, у тым ліку 7 бамбардзіроўшчыкаў. У напружаныя дні бітваў на Паўднёва-Заходнім і Сталінградскім франтах адважны лётчык рабіў па 6—7 вылетаў, неаднаразова ўступаў у бой з перавышаючымі сіламі ворага. Як камандзір звяна ён асабістым прыкладам вучыў мужнасці і бясстрашнасці сваіх падначаленых.

Яшчэ ў першыя дні вайны за адвагу ў паветраных баях Карначонак быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, а 23 лістапада 1942 г. яму прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза.

В.Гурэвіч.

ПУСТЭЛЬНІКАЎ Сямён Сільвестравіч. Герой Савецкага Саюза (31.3.1945). Нарадзіўся 10.2.1921 г. ў в. Свісцёлкі Аршанскага раёна. Працаваў у Аршанскіх чыгуначных майстэрнях. У Чырвонай Арміі з 1940 г. На фронце з чэрвеня 1941 г. Удзельнік баёў пад Ленінградам. Пасля ранення з 1944 г. ў пагранвойсках. Затрымаў 20 варожых агентаў. 5 лютага 1945 г. перагарадзіў шлях 25 бандытам, якія хацелі перайсці граніцу, і адзін вёў з імі бой. Змагаўся да апошняга патрона. Падарваў гранатай сябе і ворагаў, якія яго акружылі. Імем С.С.Пустэльнікава названы пагранзастава на Украіне (ён навечна залічаны ў яе спісы), вуліца ў Львове, вуліца і школа ў Оршы.

З артыкула ў газеце

Падоўгу затрымліваюцца наведвальнікі музея пагранічных войск у Маскве каля стэнда з аўтаматам «ППШ № ГД-219». Гэта зброя належала яфрэйтару Сямёну Пустэльнікаву, які ахоўваў дзяржаўную граніцу Савецкага Саюза.

Нарадзіўся Сямён Пустэльнікаў у вёсцы Свісцёлкі паблізу Оршы. Яго бацька — Сільвестр Давыдавіч — быў бедняком. Сямёну рана давялося спытаць нялёгкую сялянскую працу.

...У 1940 годзе Сямёна Пустэльнікава прызвалі на службу ў пагранічныя войскі. Ён хутка прывык да новага жыцця і стаў выдатнікам баявой і палітычнай падрыхтоўкі.

Чэрвень 1941 года. Пагранічніку Пустэльнікаву ў першы ж дзень вайны давялося адбіваць атакі фашыстаў. На рахунку снайпера Пустэльнікава дзесяткі знішчаных гітлераўскіх захопнікаў.

У адным з баёў пад Ленінградам Сямён Пустэльнікаў быў цяжка паранены, і ўрачэбная камісія прызнала яго непрыгодным да ваеннай службы.

— Са зброяй у руках, у радах свайго баявога палка я павінен вярнуцца на граніцу, дзе пачыналася вайна, — упарта заявіў камуніст Пустэльнікаў.

З лета 1944 года ён зноў ахоўваў заходнія рубяжы Радзімы.

У той час на толькі што вызваленых граніцах ішла, няхай крыху іншая, але сапраўдная вайна, якая патрабавала ад пагранічнікаў вялікай адвагі. Вораг раз-пораз імкнуўся закінуць цераз граніцу сваіх лазутчыкаў, дыверсантаў.

...Лютаўскай раніцай 1945 года па баявой трывозе падняліся байцы пагранічнай заставы. Разведка паведаміла, што дзяржаўную граніцу перасекла група фашысцкіх дыверсантаў, узброеных аўтаматамі, гранатамі і ручнымі кулямётамі.

Дыверсанты імкнуліся дасягнуць ляснога масіву, што чарнеў на гарызонце, дзе яны маглі б схавацца. Адлегласць паміж пагранічнікамі і лазутчыкамі была вялікая, і здавалася, ужо нішто не можа перашкодзіць вылюдкам выратаваць сваю скуру. Раптам з-за ўзгорка выскачыў коннік без шапкі. Салдаты пазналі ў ім аднаго з жыхароў бліжэйшага сяла. Ён нечакана ўпаў побач з назіраўшым у бінокль лейтэнантам Казлянковым.

— Фашысцкія гады залеглі ў лагчыне, перапранаюцца, — з цяжкасцю выгаварыў селянін.

— Навошта ж на агонь лезеш, ідзі да заставы, — прагаварыў лейтэнант.

У гэты момант падбег пагранічнік Пустэльнікаў.

— Дазвольце затрымаць праціўніка! — звярнуўся ён да лейтэнанта. — На кані, у абыход. Залягу і там затрымаю.

— Няхай салдат бярэ каня. Калі б у мяне іх было і тры, я б іх аддаў, — усхвалявана гаварыў селянін.

— Добра. Бярыце з сабой два лішнія дыскі, гранаты і дзейнічайце, — сказаў лейтэнант.

Зборы імгненна былі закончаны. Лейтэнант моцна абняў Пустэльнікава, і той ужо на кані куляй паімчаўся да ўзлеску, каб затрымаць адступленне ворага.

Неўзабаве конь зваліўся. Фашысцкая куля трапіла яму ў галаву. Дыверсанты зразумелі, што ім пагражае небяспека, і пачалі напралом лезці наперад. Але іх сустракаў аўтаматны агонь. Фашысты вымушаны былі залегчы. Убачыўшы, што перад імі ўсяго адзін салдат, яны адкрылі шалёную стральбу і перабежкамі накіраваліся да Пустэльнікава. Схаваўшыся за трупам каня, пагранічнік вёў трапны агонь адзіночнымі выстраламі, а часам і чэргамі.

Пустэльнікаў не адразу адчуў, што паранены ў бядро. Штосьці цёплае і ліпкае пацякло ў бот. Адчуўшы калючы боль, Сямён разумеў, што яму яшчэ можна адпаўзці ў лес. Шукаць яго фашысты, безумоўна, не стануць, бо ім не да гэтага. Але тады лазутчыкі беспакарана могуць знікнуць, схавацца.

— Не! Любой цаной, але толькі не прапусціць ніводнага гада жывым, — вымавіў Пустэльнікаў.

Фашысты пачалі насядаць. Яны былі ўжо зусім блізка, амаль побач з савецкім пагранічнікам. Рыжы доўгі гітлеравец нават падняўся ва ўвесь рост і на ламанай рускай мове крыкнуў: «Рус, здавайся!». Пустэльнікаў разануў чаргой з аўтамата, і фашыст уткнуўся ў зямлю.

Некалькі разоў падымаліся ворагі. Мужны пагранічнік выразна бачыў іх азвярэлыя твары. І ў гэты час скрозь аўтаматную і кулямётную траскатню Пустэльнікаў ясна адрозніў зусім блізкія выстралы сваіх.

— Затрымаць бы гадаў яшчэ дзесяць— пятнаццаць мінут, — думаў адважны воін.

Раптам убачыў, як злева абышлі яго і падняліся пяць фашысцкіх галаварэзаў і бягуць прама на яго. А патроны скончыліся...

— Здавайся, — крыкнуў гітлеравец.

Перамагаючы боль, пагранічнік выскачыў з-за ўкрыцця і кінуўся ў самую гушчу ворага, прыціснуўшы да грудзей гранату.

— Пагранічнікі не здаюцца! — крыкнуў яфрэйтар Сямён Пустэльнікаў.

Гэтыя словы і аглушальны выбух пачулі лейтэнант і двое салдат-пагранічнікаў, якія праследавалі ворага.

...Скончыўся бой. На ўзлеску пагранічнікі знайшлі цела Сямёна Пустэльнікава, а крыху далей пяць распасцёртых варожых трупаў, знішчаных выбухам гранаты, і чатыры, забітыя трапнымі кулямі савецкага аўтаматчыка. Ні адзін фашысцкі гад не застаўся ў жывых ад куль пагранічнікаў... *Б.Валодзін.*

Віцебскі рабочы. 1966. 17 красавіка.

САЛЯНІКАЎ Анатоль Данілавіч. Герой Савецкага Саюза (19.8.1944). Нарадзіўся 19.7.1919 г. ў в. Чурылава Аршанскага раёна. У 1942 г. скончыў Энгельскую ваенна-авіяцыйную школу пілотаў. У Чырвонай Арміі з 1941 г. З 1942 г. на Бранскім, 2-м Прыбалтыйскім франтах: капітан, камандзір эскадрыллі штурмавікоў. Зрабіў 115 баявых вылетаў, знішчыў 10 танкаў, 2 бронемашыны, 120 аўтамашын, 18 гармат, 4 вагоны, склад, 6 мінамётаў, 44 павозкі з грузам, больш за 500 гітлераўцаў. Эскадрылля пад яго камандаваннем са студзеня па красавік 1944 г. зрабіла 123 баявыя вылеты. Да 1947 г. ў Савецкай Арміі, потым да 1981 г. на адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце.

СІЯНІН Міхаіл Данілавіч. Герой Савецкага Саюза (17.11.1943). Нарадзіўся 17.12.1901 г. ў в. Забалацце Аршанскага раёна. У Чырвонай Арміі з 1920 г. Удзельнік ліквідацыі кранштацкага мяцяжу, баёў з бандамі Антонава, басмачамі; узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга і імянной шашкай Рэўваенсавета СССР. У 1927 г. скончыў Вышэйшую кавалерыйскую школу, у 1941 г. — Ваенную акадэмію Генштаба. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з лістапада 1941 г.: палкоўнік, камандзір механізаванай брыгады. Удзельнічаў у бітве па Масквой. У верасні 1943 г. брыгада пад яго камандаваннем вызначылася ў бітве за Дняпро каля с. Вялікі Букрын, на ПдУ ад Кіева, 22.9.1943 г. фарсіравала раку і захапіла плацдарм. М.Д.Сіянін — удзельнік баёў на Дукельскім перава-

А.Д.Салянікаў.

М.Д.Сіянін.

ле ў Чэхаславакіі. Памёр 1.10.1973 г. Яго імем названа вуліца ў Оршы.

СЯРЖАНТАЎ Іван Якаўлевіч. Герой Савецкага Саюза (24.8.1943). Нарадзіўся 17.2.1919 г. ў в. Якаўлевічы Аршанскага раёна. У 1938 г. скончыў Аршанскі аэраклуб, у 1941 г. — Чугуеўскую школу ваенных лётчыкаў. У Чырвонай Арміі з 1938 г. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на Паўднёва-Заходнім фронце: лётчык-знішчальнік, лейтэнант. Зрабіў 258 баявых вылетаў, правёў 85 паветраных баёў, збіў асабіста 13 самалётаў праціўніка, 8 у групавых баях. Памёр ад ран 29.4.1943 г. ў г. Растоў-на-Доне. Яго імем названы вуліцы ў Оршы, Растове-на-Доне.

З артыкула ў газеце

...Яго вабіла неба. Ён з юнацкіх гадоў марыў стаць лётчыкам і заўсёды з хваляваннем сачыў за палётам сталёвых чырваназорных птушак. Гэта запаветная мара прывяла яго ў Аршанскі аэраклуб, які ён скончыў у 1938 годзе. Хутка пайшоў служыць у Чырвоную Армію.

Імкненне ўдасканальваць лётнае майстэрства не пакідала ні на мінуту і было галоўнай мэтай жыцця Івана Сяржантава. І ён свайго дасягнуў: паступіў на вучобу ў Чугуеўскую школу ваенных лётчыкаў.

«Дысцыпліна, страявая і тэарэтычная падрыхтоўка выдатныя. Матэрыяльную частку вывучыў добра і эксплуатуе яе граматна і ўмела» — з такой пуцёўкай пасля сканчэння ў 1941 годзе ваеннай авіяцыйнай школы пачаў баявы шлях лётчык-знішчальнік І.Я.Сяржантаў.

У жорсткіх паветраных сутычках з нямецка-фашысцкімі захопнікамі праявіліся адвага, майстэрства, мужнасць і воля да перамогі савецкага сокала. Толькі за першыя чатыры месяцы паветраных баёў на Паўднёва-Заходнім фронце адважны пілот знішчыў каля 400 гітлераўцаў і значную колькасць баявой тэхнікі ворага.

...Сярод тых, хто па-геройску абараняў подступы да Волгі і біў ворага ў сталінградскім небе, быў і наш зямляк лётчык-знішчальнік Іван Якаўлевіч Сяржантаў. 27 лютага 1942 года ў час баёў пад Растовам адважны сокал разам з баявымі сябрамі сустрэў у паветры 8 варожых «юнкерсаў», якія ішлі на бамбёжку пад прыкрыццем 7 знішчальнікаў. Савецкія лётчыкі, нягледзячы на колькасную перавагу ворага, смела кідаліся ў бой з фашысцкімі сцярвятнікамі. У гэтым няроўным паветраным паядынку І.Сяржантаў збіў «Ю-87» і ўступіў у бой з «месерамі». Тое ж зрабілі і яго баявыя сябры. Фашысцкая паветраная армада пад смелымі ўдарамі нашых знішчальнікаў была рассеяна і, не дасягнуўшы мэты, у беспарадку скінула бомбы і пачала ратавацца ўцёкамі. За гэты подзвіг Сяржантаву быў уручаны ордэн Чырвонай Зоркі.

У другім баі І.Сяржантаў смела ўступіў у няроўны паядынак з вялікай групай фашысцкіх бамбардзіроўшчыкаў. Адзін з іх ён знішчыў у паветры, а астатнія рассеяў.

Потым наш зямляк яшчэ шмат разоў сустракаўся з фашысцкімі сцярвятнікамі пры выкананні баявых заданняў. За мужнасць і адвагу, праяўлены гераізм пры абароне Радзімы Сяржантаў у 1943 годзе быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга з прысваеннем чарговага звання...

В.Румін.

Віцебскі рабочы. 1980. 4 лістапада.

ХІГРЫН Барыс Львовіч. Герой Савецкага Саюза (31.8.1941). Нарадзіўся 14.8.1909 г. ў Оршы. У Чырвонай Арміі з 1931 г. У 1933 г. скончыў Маскоўскае артылерыйскае вучылішча. На фронце з чэрвеня 1941 г.: капітан, камандзір артылерыйскага дывізіёна. Вызначыўся ў баях на шашы Бабруйск—Магілёў. 5 ліпеня 1941 г. дывізіён пад яго камандаваннем адбіў атакі і затрымаў наступленне ворага на ўсходнім беразе р. Друць. Б.Л.Хігрын замяніў параненага наводчыка і асабіста падбіў 4 танкі праціўніка. Загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў г.п. Бялынічы. Ён навечна залічаны ў спісы воінскай часці. Яго імем названы вуліцы ў Оршы, Бялынічах. На месцы, дзе ён загінуў, устаноўлена гармата з мемарыяльнай дошкай.

ЧАСНЫК Мікалай Лявонцьевіч. Герой Савецкага Саюза (22.8.1944). Нарадзіўся 26.10.1921 г. ў Оршы. У 1941 г. скончыў Барысаглебскую школу ваенных лётчыкаў, у 1952 г. — Ваенна-паветраную акадэмію. У Чырвонай Арміі з 1940 г. З 1941 г. на Паўночна-Заходнім фронце: лётчык-знішчальнік, камандзір звяна, авіяэскадрыллі знішчальнага палка асобнага прызначэння. Зрабіў 685 баявых вылетаў, удзельнічаў у 46 паветраных баях, збіў 27 варожых самалётаў. 7 ліпеня 1944 г. быў збіты і трапіў у палон. Удзельнік паўстання вязняў у канцлагеры Бухенвальд. Да 1958 г. служыў у ВПС СССР. З 1959 г. палкоўнік у запасе. Працаваў у Паўночна-Каўказскім упраўленні грамадзянскай авіяцыі.

Землякі на франтах Вялікай Айчыннай вайны

ДЗЕМЯШКЕВІЧ Адам Станіслававіч. Нарадзіўся 1.11.1902 г. ў Оршы, генерал-лейтэнант авіяцыі (1959). У Чырвонай Арміі з 1920 г. У 1934 г. скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на Заходнім, 1-м Беларускім франтах. Удзельнік абароны Масквы, Ленінграда, вызвалення Польшчы, баёў за Берлін. Пасля вайны на адказных пасадах у Савецкай Арміі, намеснік начальніка Ваенна-паветранай акадэміі. Памёр 12.9.1962 г.

КАСЦЮКОВІЧ Пётр Іванавіч. Нарадзіўся 16.8.1923 г. ў в. Казекі Аршанскага раёна. Поўны кавалер ордэна Славы. Да вайны працаваў у калгасе. У Вялікую Айчынную вайну з 1942 г. на Калінінскім, Бранскім, 1-м і 2-м Беларускім франтах: сяржант, камандзір мінамётнага разліку. Вызначыўся ў чэрвені 1944 г. пры вызваленні Магілёва, у жніўні 1944 г. пры авалоданні крэпасцю Асавец (Польшча), у сакавіку 1945 г. ў баях за Данцыг (Гданьск) і выхад да Балтыйскага мора. Пасля вайны жыў у Оршы, працаваў на льнокамбінаце. Памёр 11.2.1982 г.

Аршанцы — удзельнікі штурму Берліна

АКАЛОЎ Анатоль Ігнацьевіч, н. ў 1923, мал. сярж. 295-й сд.

АНІСІМАВА (БАБРОВА) Надзея Іванаўна, н. ў 1925, рад. 734-га зенап.

АНІХОЎСКАЯ Аляксандра Іванаўна, н. ў 1924, яфр. 1-й забр.

АСТРОЎСКАЯ Ульяна Лазараўна, н. ў 1925, рад. сп 88-й сд.

БАБАРЫКА Пётр Адамавіч, н. ў 1924, рад. 48-й мінбр.

БАРЫШАЎ Мікалай Іларыёнавіч, н. ў 1916, рад. 56-га гв. тб.

БЕЛАЗЁРЦАЎ Іларыён Філімонавіч, н. ў 1925, старш. 362-га бавп.

БЕЛЯКОВІЧ Браніслаў Ісаевіч, н. ў 1920, кап. 533-га зптап.

БЕНЗА Пётр Іванавіч, н. ў 1921, сярж. 2-га азэчп.

БУЛЫКІН Васіль Несцеравіч, н. ў 1913, мал. лейт. 480-га сп 152-й сд.

ВАСІЛЬЕЎ Міхаіл Анісімавіч, н. ў 1926, рад. 76-й гв. сд.

ВЕРХАВІНІН Фёдар Арцёмавіч, н. ў 1922, кап. 42-га бавпдд.

ВІНАРСКАЯ (КАЗЛОВА) Вера Сямёнаўна, н. ў 1924, рад. 734-га зенап.

ВІНЧАНКА Мікалай Якаўлевіч, н. ў 1921, ст. сярж. 411-га абс.

ГАРБАЦЭВІЧ Іван Антонавіч, н. ў 1903, рад. 1283-га гап.

ГАРНІЗА Барыс Іванавіч, н. ў 1918, старш. 215-га сп.

ГЛІНСКІ Анатоль Фёдаравіч, н. ў 1923, маёр 33-га гв. асапб зсп.

ГЛЯВІЦКІ Аляксандр Міхайлавіч, н. ў 1913, рад. 269-га сд.

ГОЛЕШАЎ Мікалай Несцеравіч, н. ў 1924, рад. 1394-га зенап.

ГОЛЫШАЎ Леанід Міхайлавіч, н. ў 1916, ст. сярж. 336-га сп 5-й сд 2-га БФ.

ГРАКАЎ Мікалай Васілевіч, н. ў 1920, сярж. 2-й арачс.

ГУЗАВА Ганна Тарасаўна, н. ў 1922, рад. 18-й аўт. дарогі.

ГУЗАЎ Аляксей Архіпавіч, н. ў 1923, мал. сярж. 93-га сп.

ГУПАКОЎ Яўген Ільіч, н. ў 1916, мал. сярж. 1298-га гап.

ГУРКОЎ Генадзь Сямёнавіч, н. ў 1925, мал. сярж. 70-й мбр.

ГУСАРАЎ Васіль Сцяпанавіч, н. ў 1926, кап. 48-й цмінбр.

ДАНІЛЬЧАНКА Павел Міхайлавіч, н. ў 1921, сярж. 1-й гв. тбр.

ДЗЕМЯШКЕВІЧ Адам Станіслававіч.

ДЗІМКОЎ Рыгор Максімавіч, н. ў 1923, ст. сярж. 169-га цгап.

ДОНАЎ Пётр Іванавіч, н. ў 1919, яфр. 76-га ааўтб.

ДУБОЎСКІ Віктар Аляксандравіч, н. ў 1918, рад. 22-й гв. сд.

ДУДАРАЎ Барыс Аляксеевіч, н. ў 1921, яфр. 120-га амб.

ДУЙНОЎ Сяргей Якаўлевіч, н. ў 1918, мал. сярж. 103-га гв. абс.

ЕРМАЛАЕЎ Васіль Платонавіч, н. ў 1926, маёр 1-га гв. завп 7-й завд.

ЖДАНАВА Клаўдзія Варфаламееўна, н. ў 1925, рад. 734-га зенап.

ЗАВАДСКІ Рыгор Максімавіч, н. ў 1918, старш. 1-га Кольскага завп.

ЗАВАЛІН Ілья Аляксеевіч, н. ў 1918, маёр 30-га гв. бавп.

ЗАМАСЦІНОВІЧ Пётр Ігнацьевіч, н. ў 1915, ст. сярж. Сталінградскага фронту.

ІВАНОЎ Емяльян Якаўлевіч, н. ў 1915, сярж. 232-га мінп.

ІВАШКЕВІЧ Міхаіл Васілевіч, н. ў 1925, сярж. 23-й гв. мсбр.

КАЗАКЕВІЧ Аляксандра Мікалаеўна, н. ў 1922, ст. сярж. 11-га пс 63-й А.

КАЗЛОЎСКІ Піліп Аляксеевіч, н. ў 1911, мал. сярж. 704-га абс.

КАМІНСКІ Уладзімір Францавіч, н. ў 1926, кап. 5-й брыгады 1-й Польскай арміі.

КАПЛАН Барыс Аронавіч, н. ў 1914, старш. 307-га зенап.

КАЧАЕЎ Эраст Зурабавіч, н. ў 1918, старш. 14-га цбавп.

КІРАЙЦАЎ Уладзімір Ніканоравіч, н. ў 1921, сярж. 1065-га зенап.

КЛЯПІЦКІ Пётр Адамавіч, н. ў 1922, мал. сярж. 419-га мінп.

КОГАН Давід Абрамавіч, н. ў 1920, ст. лейт. 101-га сп 4-й сд.

КОНТУР Віктар Парфенавіч, н. ў 1922, кап. 109-га бавп.

КРАСНОЎ Сяргей Іванавіч, н. ў 1922, кап. 20-й тбразенбат.

КУЗЬМІНЫХ Фёдар Кузьміч, н. ў 1925, ст. лейт. 121-га сапб.

КУРАНКОВА Кацярына Сямёнаўна, н. ў 1925, мал. лейт. 5372-га эвак. шпіталя.

КУР'ЯНАЎ Пётр Андрэевіч, н. ў 1924, рад. 415-га мінп 24-й мінбр.

КУЧАРЭНКА Цімафей Пятровіч, н. ў 1921, кап. 890-га Бранскага авпдд.

ЛАГУЦІН Міхаіл Аляксандравіч, н. ў 1923, маёр 104-га медсанб 175-й сд.

ЛАЎРОЎ Мікалай Міхайлавіч, н. ў 1925, сярж. 109-га асапб.

ЛЕЛІКАЎ Васіль Рыгоравіч, н. ў 1925, маёр 267-й арс 3-га бавп.

ЛЕРНАТОВІЧ Антон Уладзіміравіч, н. ў 1920, старш. 2930-га зенап.

ЛЁГКІ Міхаіл Ягоравіч, н. ў 1926, рад. 419-га мінп.

ЛЮБЕЗНЫ Іван Піліпавіч, н. ў 1924, рад. 440-га сп.

ЛЯВОНАВА Марыя Фролаўна, н. ў 1928, сярж. 17-га завп.

ЛЯДОЎСКІХ Мікалай Трафімавіч, н. ў 1925, маёр 26-га асобнага пражэкт. бат. 5-га корп. СПА.

МАГІЛЕНКА Мікалай Фаміч, н. ў 1913, сярж. 1210-га сп.

МАКАРАНКА Міхаіл Васілевіч, н. ў 1921, мал. сярж. 196-й сд.

МАХНАЧ Канстанцін Аляксандравіч, н. ў 1923, сярж. 16-й мінбр.

МЕЛЬНІКАВА Антаніна Іонаўна, н. ў 1915, рад. 64-й сд.

МЕРКУЛЬ Піліп Самойлавіч, н. ў 1923, падпалк. 32-га зенд.

МІЛЬЁННІКАВА Надзея Рыгораўна, н. ў 1925, рад. 734-га зап.

МІНІНА Наталля Іванаўна, н. ў 1923, старш. 31-й гв. арс.

МІЦКЕВІЧ Мікалай Захаравіч, н. ў 1923, рад. 116-га гап.

МУРАНКОЎ Міхаіл Ціханавіч, н. ў 1906, старш. 48-га мотапад'ёмнага атрада Дняпроўскай флатыліі.

МУХА Уладзімір Васілевіч, н. ў 1919, мал. лейт. 6-й гв. атбр.

МЯДЗВЕДЗЕЎ Кірыл Захаравіч, н. ў 1915, старш. 187-га гв. сп.

МЯДЗВЕДСКІ Аляксей Сцяпанавіч, н. ў 1919, рад. 171-га ап.

НЕВАДНІЧЫ Мікалай Аляксеевіч, н. ў 1921, мал. лейт. 246-га завп 1-й Брандэнбургскай знішч. дывізіі.

НІКУЛІН Серафім Андрэевіч, н. ў 1909, кап. 59-га сп.

НІЛАЎ Дзямід Аляксеевіч, н. ў 1910, рад. 1283-га гв. ап.

ОЗЕР Раман Мацвеевіч, н. ў 1911, ст. сярж. 426-й абр.

ПАЖАРЫЦКІ Аляксандр Платонавіч, н. ў 1917, сярж. 3-й гв. ад.

ПАНАМАРОВА Алена Міхайлаўна, н. ў 1923, мал. сярж. 17-й мібр.

ПАНАМАРОЎ Генадзь Міхайлавіч, н. ў 1915, падпалк. 363-га авпдд.

ПЕТРАКОЎ Павел Лук'янавіч, н. ў 1919, старш. 29-й гв. ачбр.

ПРАКАПЫШКА Васіль Міхайлавіч, н. ў 1926, старш. 433-га сп.

ПРЫМАКОЎ Пётр Сяргеевіч, н. ў 1922, мал. сярж. 172-га сп.

ПУЦІНЦАЎ Анатоль Уладзіміравіч, н. ў 1926, ст. сярж. 588-га ап.

РАБАЎ Васіль Рыгоравіч, н. ў 1918, лейт. 858-га сп 283-й сд.

РАБУШКА Ксенія Захараўна, н. ў 1921, рад. 734-га зенап.

РАБЫХ Іван Пятровіч, н. ў 1915, маёр 3-й гв. тбр.

РАДЗЕВІЧ Зінаіда Паўлаўна, н. ў 1921, рад. 734-га зенап.

РАДЗЬКОЎ Віталь Марцінавіч, н. ў 1925, яфр. 55-га ап 61-й сд.

РАМАНАЎ Канстанцін Сяргеевіч, н. ў 1918, ст. сярж. 5-й сд.

РАМАНОЎСКІ Віктар Піліпавіч, н. ў 1925, рад. рр.

РАМКОЎ Міхаіл Барысавіч, н. ў 1922, рад. 508-га сп.

РУБІН Валянцін Пятровіч, н. ў 1916, тэхнік-лейт. 123-га сп 395-й сд.

РУДАКОЎ Іван Якаўлевіч, н. ў 1914, рад. 29-й гв. мсбр.

РУДАКОЎ Уладзімір Міхайлавіч, н. ў 1926, рад. 29-й гв. мсбр.

РУМЯНЦАЎ Іван Лаўрэнцьевіч, н. ў 1921, яфр. 316-га азенап.

САВІН Іван Якаўлевіч, н. ў 1926, сярж. 153-га зенап.

САВІЦКІ Анатоль Паўлавіч, н. ў 1920, мал. лейт. 6-га асанавп.

САВОСЦІН Уладзімір Фёдаравіч, н. ў 1927, маёр 646-га сп 152-й сд.

САКОВІЧ Фёдар Паўлавіч, н. ў 1921, сярж. 4-га апс.

САЛМАНАЎ Георгій Венядзіктавіч, н. ў 1922, кап. 55-га гв. завп 1-й гв. завд.

СЕЛІНЕНКА Іван Антонавіч, н. ў 1918, ст. сярж. 336-га сп.

СЕРНІН Сяргей Нічыпаравіч, н. ў 1925, рад. 362-га бавп.

СІДАРОВІЧ Іван Іванавіч, н. ў 1911, рад. 256-га мінп.

СКОРКІН Іван Мікітавіч, н. ў 1922, кап. 6-га шавп.

СЛАБАЖАН Аляксандр Пракопавіч, н. ў 1921, кап. 712-га сп 132-й сд.

СОМІН Раман Майсеевіч, н. ў 1913, маёр 1-й гв. тбр.

СТАНКЕВІЧ Мікалай Пятровіч, н. ў 1921, ст. сярж. 104-га гв. зап.

СУВОРАЎ Мікалай Максімавіч, н. ў 1923, сярж. 362-га бавп.

СУВОРАЎ Яфрэм Цімафеевіч, н. ў 1917, рад. 357-га ап.

ТАМАШЭВІЧ Фелікс Іванавіч, н. ў 1925, ст. сярж.

ТАПАРОЎ Аляксандр Пятровіч, н. ў 1923, падпалк. 335-й ап 14-й ад.

ТРУСАЎ Кірыл Прохаравіч, н. ў 1924, яфр. 186-й габр.

ТУРАВЕЦ Іван Канстанцінавіч, н. ў 1920, рад. 10-й абр.

ФІЛІМОНАЎ Міхаіл Іванавіч, н. ў 1911, мал. сярж. 1052-га сп.

ФІЛІМОНЕНКА Дзмітрый Герасімавіч, н. ў 1920, ст. сярж. 232-га мінп.

ФІЛІПАЎ Уладзімір Іванавіч, н. ў 1924, мал. сярж. 18-га зсп 287-й сд.

ФІЛІПОВІЧ Анатоль Давыдавіч, н. ў 1921, рад. 47-га гв. сп.

ФІЛІПОВІЧ Рыгор Канстанцінавіч, н. ў 1913, рад. 503-га мінп.

ХАХЛОЎ Сяргей Ануфрыевіч, н. ў 1919, яфр. 800-га сп 49-й тбр.

ХВАШЧЫНСКІ Пётр Іларыёнавіч, н. ў 1921, яфр. 5-га абс.

ЦІТОЎ Канстанцін Маркавіч, н. ў 1925, сярж. 458-га асобнага бат. арт. забесп.

ЦІШКОЎ Міхаіл Якаўлевіч, н. ў 1918, кап. 231-га гв. сп 75-й гв. сд.

ЦЯЦЕНКАЎ Васіль Емяльянавіч, н. ў 1919, кап. 3-га апс.

ЧАРТОК Алетр Гамшэевіч, н. ў 1921, сярж. 22-й завд.

ЧАРТОЎСКІ Аляксандр Рыгоравіч, н. ў 1925, старш. 362-га цбавп.

ЧУГУНЕНКА Юльян Сяргеевіч, н. ў 1928, рад. 149-га арм. зсп.

ЧЭПІКАВА Наталля Міхайлаўна, н. ў 1922, рад. 475-га мінп.

ШАКУРА Пётр Барысавіч, н. ў 1913, рад. 674-га сп.

ШАМАВА Ефрасіння Панкрацьеўна, н. ў 1922, рад. 734-га зенап.

ШАМАЕЎ Пётр Васілевіч, н. ў 1920, кап. 890-га авп 45-й авд.

ШАРЫПА Афанасій Маркавіч, н. ў 1914, яфр. 266-га баа.

ШАШКОЎ Канстанцін Фёдаравіч, н. ў 1917, старш. 188-га сп 106-й сд.

ШТЭЙНГАРД Міхаіл Генухавіч, н. ў 1911, сярж. 331-га пагр. палка.

ШУФЕР Яфім Львовіч, н. ў 1925, рад.

ШЧАРБАКОЎ Платон Емяльянавіч, н. ў 1913, рад. 1069-га сп.

ШЫНКЕВІЧ Таццяна Аляксандраўна, н. ў 1925, рад. 734-га зенап.

ШЫНКЕВІЧ Яўген Савельевіч, н. ў 1925, рад. 339-га гв. сп.

ЯГОРАЎ Сцяпан Фёдаравіч, н. ў 1917, мал. лейт. 21-га завп.

ЯКІМОВІЧ Сцяпан Васілевіч, н. ў 1918, старш. 1955-га зптад.

ЯМЧУК Уладзімір Паўлавіч, н. ў 1923, мал. сярж. 25-га арт. дывізіёна 181-й абр. 1-га УФ.

ЯСКЕВІЧ Андрэй Васілевіч, н. ў 1901, сярж. 16-га асобнага арт. дывізіёна.

ЯФРЭМЕНКА Пётр Дарафеевіч, н. ў 1920, маёр 242-га гв. сп 82-й гв. сд.

Дакументы сведчаць

Выпіска з пратакола № 5 пасяджэння выканкома Аршанскага гарсавета

12 жніўня 1944 г.

РЕШИЛИ:

Для руководства работой по установлению и расследованию злодеяний немецко-фашистских захватчиков и причиненного ими ущерба на территории г. Орши, создать городскую комиссию в следующем составе:

1) Председателем комиссии тов. Петкевича Г.В. (Предисполкома)
2) Членами комиссии тов. Василевского С.Д. (предгорплана)
3) «—» тов. Даниленко (Горком КП(б)Б)
4) «—» тов. Сенчило И. (Горкомхоз)
5) «—» тов. Дудкина (Военком)
6) «—» тов. Адашкевича (Горздрав)
7) «—» тов. Шумского (Гороно)

Філіял Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці ў г. Орша, ф. 27, воп. 1, спр. 1, л. 16.

З акта Аршанскай гарадской камісіі аб знішчэнні мірных грамадзян г. Орша нямецка-фашысцкімі захопнікамі

20 верасня 1944 г.

... В течение всего периода временной окупации на территории гор. Орша немецко-фашистские захватчики производили массовые систематические истребления советских военнопленных и мирных граждан.

На территории еврейского кладбища обнаружено две ямы длиной 23 м и шириной 6 м, глубиной 3 м и 24 ямы-чана бывшего засолочного пункта. Перед каждой (ямой) находится пепелище диаметром 4—5 м, на котором по свидетельским показаниям производилось сжигание извлеченных из ям трупов. При осмотре пепелищ обнаружены остатки обгоревших костей. Следствием установлено, что на еврейском кладбище расстреляно около 6 тыс. чел. мирных жителей гор. Орша. Трупы были сожжены немцами с целью скрытия следов фашистских злодеяний...

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 845, воп. 1, спр. 7, л. 10—13.

ЗМЕСТ

Да чытача 21

Орша. Аршанскі раён 22

Населеныя пункты Аршанскага раёна 24

Населеныя пункты Аршанскага раёна, якія не існуюць 25

З гісторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу Аршанскага раёна . . 25

Зямля нашых продкаў 28

Першабытныя паселішчы Аршаншчыны (28). Першабытныя стаянкі ў Оршы (29). Археалагічныя помнікі Аршаншчыны жалезнага веку (30). Археалагічныя даследаванні ў Аршанскай акрузе (35). Шляхамі далёкіх продкаў (37).

У складзе Полацкага і Смаленскага княстваў 40

Аршаншчына ў часы Усяслава Полацкага (40). Аршанскае Падняпроўе пад уладай Глеба Менскага (42). У складзе Полацкай зямлі і Смаленскага княства (43). Орша і яе воласць у 12—13 ст. (45). Летапіс сведчыць (47). Вучоныя мяркуюць (48). Аршанскае Евангелле (48). «...а цар яго жыве ў Артыі» (49).

У складзе Вялікага княства Літоўскага 54

Аршанскі замак (62). Дакументы сведчаць (64). Браня з Оршы (64).

У складзе Рэчы Паспалітай 66

Пётр Вялікі руку прыклаў (74). Дакументы сведчаць (75). З гісторыі Аршанскай мытні (77). Вучоныя мяркуюць (77). Аршанская шляхта (78). Аршанскія дзяржаўцы і старосты (79). Аршанскі староста Філон Кміта (80). Куцеінскі манастыр (83). Выданні Куцеінскага манастыра (87). Выданні куцеінскіх манахаў у Іверскім манастыры (88). Паэты куцеінскай школы (88). Гімн майстрам (90). Іверскі манастыр (92). «Аршанскі кодэкс» (93). «Аршанскі зборнік» (94). Аршанскі езуіцкі калегіум (95). Кальвінізм у Оршы (99).

Іх імёны засталіся ў гісторыі 100

Труцэвіч Іаіль (100). Собаль Спірыдон Багданавіч (102). Вучоныя мяркуюць (106). Бярында Памва (107). Філіповіч Афанасій (107). Іяўлевіч (Яўлевіч) Ігнацій (109).

У складзе Расійскай імперыі 109

Дакументы сведчаць (122). Орша ў вайне 1812 г. (124). Падзеі паўстання 1863 года на Аршаншчыне (133). Дакументы сведчаць (133). Прамысловыя прадпрыемствы Аршаншчыны 2-й палавіны 19— пачатку 20 ст. (136). Як «завязвалі» аршанскі вузел (138). Іх памятаюць... (142). Мелісіна Аляксей Пятровіч (142). Арля-Ашмянец Фердынанд Францавіч (142). Мусніцкі Нікодым (142). Падалінскі Міхаіл (143). Трухачоў Міхаіл Мітрафанавіч (143). Насовіч Іван Іванавіч (143). Дзеружынскі Францішак (144). Шумахер Пётр Васілевіч (145). Хлудзінская-Баржэнцкая Цэліна (147). Рэвалюцыйны рух на Аршаншчыне у 1900—1917 гг. (147). Дакументы сведчаць (151). Незабыўнае (162). Орша ў гады першай сусветнай вайны (164).

На крутым павароце гісторыі 167

Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўстанаўленне ўлады Саветаў (167). Аршаншчына ў 1918—1920 гг. (170). Аршанскі павятовы рэвалюцыйны камітэт (175). Дакументы сведчаць (175). Разгром «дзікай» дывізіі (181). Нараджэнне Чырвонай гвардыі (183). Гэтых дзён не змоўкне слава (183). Камандзір Першага Аршанскага (184). Разгром акупантаў (185). Эшалон з хлебам (186). Паведамленне пра разгром мяцяжу левых эсэраў у г. Орша (187). Настаўнік (188). Сустрэчы жыхароў Аршаншчыны з М.І. Калініным (189). З успамінаў А.Камінскай, былой рабочай саўгаса «Межава» (190). З Леніным у сэрцы (190). Яны змагаліся за ўладу Саветаў на Аршаншчыне (191). На мірных рэйках (192). Ахова здароўя (200). Асвета (201). Культура (203). Калектывізацыя на Аршаншчыне (206). Калектывізацыя ў Барздоўцы (207). Па старонках раённай газеты «Набат» за 13 мая 1920 г. (207). «Даеш Лепель да Кастрычніка!» (208). Зорка над балотам (209). Дакументы сведчаць (212). З любоўю да роднага краю (212). «Вулканілась жыццё на рубяжы вякоў» (213). Вучыў жыццю рабфак (215). Нас вадзіла маладосць (216). Орша ў 1920-я (217). Подзвіг І.П.Кірпічова (219).

Воіны-землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак у савецка-фінляндскую вайну 1939—40 гг 222

Вернутыя імёны 223

Ахвяры палітычных рэпрэсій (223). Спіс жыхароў Аршанскага раёна, выселеных у адміністрацыйным парадку (паводле звестак Аршанскага райвыканкома) (299).

Ішла вайна народная 300

У гады выпрабаванняў (300). Дакументы сведчаць (306). Акупацыйны рэжым (307). Генацыд беларускага насельніцтва (308). Падпольны і партызанскі рух (311). Дакументы сведчаць (334). Партызанскія фарміраванні, якія дзейнічалі на Аршаншчыне (335). Бараньскае падполле (342). Сям'я патрыётаў (346). Бясстрашныя патрыёты (348). Свае партызаны (349). Партызанскія біяграфіі (375). Вызваленне Аршанскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (358). Дакументы сведчаць (362). Крылатыя дзяўчаты (364). Імёны савецкіх лётчыкаў сталі вядомы (365). Яны вызвалялі Аршаншчыну (365). Героі Савецкага Саюза — аршанцы (370). Землякі на франтах Вялікай Айчыннай вайны (375). Аршанцы — удзельнікі штурму Берліна (375). Дакументы сведчаць (378).

СУПРАЦОЎНІКІ РЭДАКЦЫЙ І СЛУЖБАЎ ВЫДАВЕЦТВА, ЯКІЯ ПРАЦАВАЛІ НАД КНІГАЙ

Група картаграфіі: В.Ф. Надзененка, Г.Р. Шыкунова.

Рэдакцыя мастацка-тэхнічнага афармлення выданняў:
У.М. Жук, В.Г. Загародні.

Рэдакцыя навуковага і літаратурнага кантролю:
І.П. Хаўратовіч (заг. рэдакцыі), А.А. Федасеева.

Рэдакцыя фотаздымак і фотаілюстрацый:
Г.М. Бажанкоў (заг. рэдакцыі), А.П. Дрыбас, С.А. Жукавень, І.У. Каваленка, В.У. Харчанка.

У кнізе выкарыстаны здымкі з музеяў Оршы і Аршанскага раёна, архіва БелЭн, асабістых архіваў, а таксама С.М. Асіноўскага.

У пошуку, зборы і падрыхтоўцы матэрыялаў для кнігі прымалі ўдзел:

Л.П. Аляксеева, В.А. Безенсон, У.С. Багамазаў, В.В. Барысава, Т.М. Вадзянская, М.М. Дземідовіч, Г.І. Дулеба, Н.Л. Жолудзева, А.В. Зількоў, І.К. Ігнацьева, Т.Г. Ігнацьева, Г.А. Каралёў, Ю.А. Коцік, А.М. Кудзін, А.І. Лакотка, М.А. Лугавіер, Р.П. Лясота, В.М. Ляўко, А.С. Нічыпарук, А.М. Палітаў, В.Г. Пячонкін, А.Г. Рабушаў, Л.Дз. Радомская, М.Ф. Раманюк, Г.Т. Распопава, В.М. Самуйлава, В.М. Сцяпанаў, А.І. Ціханскі, Б.Ф. Шалуха, Р.С. Шарай, А.П. Шаўцоў, Л.І. Шыдлоўскі, А.М. Шынкевіч, І.А. Яршоў, Л.В. Яршова. Рэдакцыйная калегія выказвае ім шчырую падзяку.

Навукова-папулярнае выданне

ПАМЯЦЬ

Гісторыка-дакументальная хроніка Оршы і Аршанскага раёна
У 2 кнігах. Кніга 1-я

Мастацкі рэдактар:
В.Г. Загародні.

Тэхнічныя рэдактары:
М.І. Грыневіч,
Н.М. Шэвель.

Карэктары:
Н.У. Бохан,
С.В. Рабец,
А.В. Семенчукова,
В.П. Спірыдонава,
В.М. Чудакова.

Машынапісныя работы:
Г.Л. Анісімава.

Набор і камп'ютэрная падрыхтоўка арыгінала-макета:
С.А. Макаёнак
(загадчык рэдакцыі камп'ютэрнай падрыхтоўкі рукапісаў);
інжынеры:
І.В. Касцюкевіч,
І.М. Кузьмянкова;
аператары:
І.У. Грыцэль,
А.У. Гурыновіч,
Р.У. Дзявочка,
С.М. Хаўстовіч.

ISBN 985-11-0156-7

9 789851 101562

Падпісана да друку з арыгінала-макета 19.10.99. Фармат 70×100 1/16. Гарнітура Кудрашэўская. Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 31,2. Ум. фарб.-адб. 40,2. Ул.-выд. арк.42,06. Тыраж 3000 экз. Заказ 3477.

Дзяржаўнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ № 10 ад 31.12.97. Рэспубліка Беларусь. 220072, г.Мінск, вул. Акадэмічная, 15а.

Надрукавана з арыгінала-макета на ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінаце ВПП імя Я. Коласа. Рэспубліка Беларусь. 220005, г. Мінск, вул. Чырвоная, 23.

Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Оршы і Аршанскага раёна: У 2 кн.
П 15 Кн.1. Рэд. кал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; Маст. Э.Э. Жакевіч. — Мн.: БелЭн, 1999. —384 с.: іл.

ISBN 985-11-0156-7

Кніга — гісторыка-дакументальная хроніка, у якой на падставе архіўных даных, замалёвак, артыкулаў, успамінаў непасрэдных удзельнікаў падзей расказваецца пра гісторыю Оршы і Аршаншчыны, яе знакамітых людзей, герояў ратнай і працоўнай славы. Асаблівая ўвага ўдзелена падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Прыводзяцца спісы воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі і пахаваны на тэрыторыі Оршы і Аршанскага раёна, воінаў-землякоў, партызан, падпольшчыкаў, мірных жыхароў, якія аддалі жыццё ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ці сталі ахвярамі фашысцкага тэрору. Змешчаны таксама спіс жыхароў Оршы і Аршанскага раёна, якія былі беспадстаўна рэпрэсіраваны і рэабілітаваны. Кніга багата ілюстравана. Для масавага чытача.

УДК 947.62
ББК 63.3 (4 Беи)